Расчоскі, альбо аднабаковыя грабяні (гэта значыць нарэзаныя частымі зубцамі толькі з аднаго боку) належаць да катэгорыі «Бытавыя вырабы», групы «Прадметы туалету». Тут праяўляецца іх асноўная практычная функцыя як прадметаў асабістай гігіены. Грабяні былі, звычайна, невялікіх памераў, часта добра арнаментаваны, знаходзіліся ў футаралах і бытавалі ў межах IX–XI стст. Прымянялі іх часцей за ўсё мужчыны, напэўна, для расчэсвання валасоў, вусоў і барады, а таксама ўсе жыхары ў гігіенічных мэтах. Выраб такіх прадметаў быў складаны і патрабаваў шырокага асартыменту інструментаў (сякеры, розныя пілкі і нажы, напільнікі, свердзелы, долаты, цыркулі і інш.), а таксама значных навыкаў іх выпрацоўкі і высокай кваліфікацыі майстра, таму рабілі іх, менавіта, касцярэзы-прафесіяналы [13, с. 67–70; 19, с. 80–82; 21, с. 78–89].

Акрамя побытавай раскрываецца і рэгіянальная функцыя гэтых рэчаў. Выяўлены аднабаковыя грабяні на тэрыторыі Беларусі ў 25 месцах паўсюдна – Полацкая і Тураўскія землі, Панямонне і Падняпроўе (гл. табліцу). Расчоскі найбольш характэрны для тэрыторый Віцебскай, Мінскай і Гомельскай

абласцей, што звязана з арэалам пражывання крывічоў і радзімічаў. Знойдзены дадзеныя прадметы на розных відах археалагічных помнікаў: у гарадах (на дзяцінцах, пасадах, тэрыторыі вакольных гарадоў), а таксама на гарадзішчах, селішчах, у курганных могільніках. Усяго на тэрыторыі Беларусі на дадзены момант вядома 122 экз. расчосак (цэлых і фрагментаваных), іх накладак і футаралаў.

Большасць расчосак знойдзена пры археалагічных даследаваннях на тэрыторыі Полацкай зямлі: у 12 месцах – 83 экз. Напрыклад, у Полацку выяўлена 37 экз., Віцебску – 18, Прудніках – 8, Дрысвятах – 5, Лукомлі – 3, Мінску – 2, Браславе – 1, а таксама ў курганных могільніках каля в. Чарневічы Глыбоцкага р-на, Глінішча Полацкага р-на, Навасёлкі Мядзельскага р-на – па 1 экз., Дарахі Гарадоцкага р-на (2), Ізбішча Лагойскага р-на (4) [28, с. 212–213, мал. 1: *2*, 2: *1–3, 5*, табл. 1; 31, с. 254–255]. У Тураўскай зямлі аднабаковыя грабяні вядомы з 5 месцаў – 10 экз.: Тураў (3), Пінск (2), Клецк (1), курганы каля в. Гарадзішча Пінскага р-на (2) і Надаткі Мазырскага р-на (2). На тэрыторыі Панямоння знойдзена 20 расчосак у гарадах: Гродна (3), Ваўкавыск (7), Навагрудак (10). У Падняпроўі аднабаковыя грабяні выяўлены на 5 помніках – 9 экз.: Гомель (2), Мсціслаў (1), а таксама ў курганных могільніках каля вв. Гадзілавічы Рагачоўскага р-на (2), Мохаў Лоеўскага р-на (2), пас. Усход Магілёўскага р-на (2) [27, с. 71–72].

Расчоскі маюць агульнаеўрапейскае распаўсюджванне, але радзімай іх паходжання лічыцца Скандынавія, дзе яны з'явіліся ў III–IV стст. і адкуль распаўсюдзіліся на тэрыторыі Заходняй, Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ў VI–VII стст. [26, с. 193–197]. На тэрыторыю Беларусі яны трапілі ў IX ст. і гэта была Полацкая зямля. Тут спачатку выкарыстоўвалі прывазныя прадметы, імпартнага паходжання (мал. 2: *1, 2*; 3: *8*; 7: *7*; 9: *6*), якія выраблялі ў большасці з трубчастых костак буйной рагатай жывёлы, рагоў паўночных аленяў, маржовых іклаў. Замежныя грабяні былі вялікіх памераў (даўжынёй 14–25 см, вышынёй да 5 см), канцавыя часткі з відарысамі жывёл, дэкор вельмі складаны, амаль заўсёды камбінаваны (адметнасцю з'яўляліся S-падобныя ўзоры). На тэрыторыю Полацкай зямлі яны траплялі з балтыйска-скандынаўскіх цэнтраў, аднак хутка была запазычана іх ідэя і наладжана мясцовая вытворчасць падобных узораў, частка якіх распаўсюджвалася на іншыя землі Беларусі. Мясцовыя вырабы адрозніваліся ад сваіх прататыпаў па сыравіне (выкарыстоўваліся, у асноўным, рогі ласёў), па памерах (былі даўжынёй 8–12 см, вышынёй 2–3 см), форме (простая, без канцавых аздабленняў), арнаментацыі (без арнаменту, ці вочкава-геаметрычны). Аб тым, што расчоскі выраблялі мясцовыя майстры, сведчаць знаходкі рагоў са слядамі апрацоўкі, нарыхтоўкі накладак і пласцін з намечанай нарэзкай зубцоў, а таксама іх паўфабрыкаты. Хаця не выключана, што некаторая частка аднабаковых грабянёў была прывезена з балтыйска-скандынаўскіх тэрыторый.

На тэрыторыі Беларусі грабяні-расчоскі, у асноўнай сваёй масе, у напластаваннях пазней XI ст. не сустракаюцца, таму яны з'яўляюцца дастаткова надзейнай крыніцай для стратыграфічнага датавання помнікаў.

Расчоскі падзяляюцца на два тыпы: цэльныя і састаўныя (трохслойныя).

Тып А **–** аднабаковыя грабяні цэльныя вузкія (IX–XI стст.). Дадзеных вырабаў знойдзена 10 экз. (Полацк і Гомель – па 2, Віцебск, Мінск, Прудні́кі, Гродна, Клецк, Мсціслаў – па 1 экз.) (мал. 1; 10: *4*) [33, с. 298, мал. 17: *2*; 24, с. 47, рис. 24: *8*; 34, мал. 65: *3*; 41, мал. 63: *2*; 42, с. 72, мал. 104: *8*; 45, с. 270, рис. 4: *3*]. Такія расчоскі былі зроблены з адной рогавай пласціны, у большасці – высокія, вузкія. У верхняй частцы ці збоку мелі скразную адтуліну для прывешвання. Як лічыла В. І. Давідан, такія грабяні служылі, напэўна, для замацавання, сколвання і ўпрыгожвання прычоскі [4, с. 102, рис. 4: *1–3*]. Па меркаванні іншых даследчыкаў, некаторыя з іх маглі таксама прымяняць для расчэсвання воўны ці ільну, альбо выкарыстоўваць у ткацтве.

Грэбень з Полацка (мал. 1: *1*) – гэта высокі (10 см), вузкі (2,0–3,5 см) і тонкі (0,2 см) выраб падтрапецыяпадобнай формы. У верхняй частцы ёсць невялікая прадаўгаватая (0,2 × 0,5 см) скразная адтуліна для замацавання. Грэбень не арнаментаваны і датаваны IX–X стст.

Аднабаковы грэбень з Прудні́каў (мал. 1: *4*) знойдзены на селішчы і датаваны IX ст. Зроблены з адной пласціны даўжынёй 5,0 см, вышынёй 5,7 см, таўшчынёй 0,6 см, збоку мае скразную адтуліну для прывешвання дыяметрам 0,5 см. Знізу нарэзаны частыя, тоўстыя зубцы, каля зубцоў і зверху грэбень аздоблены тонкімі палоскамі геаметрычнага сеткавага арнаменту.

Расчоска з Мінска (мал. 1: *5*) з захаванай даўжынёй 9,5 см, таўшчынёй 0,5 см, з абламанымі рэдкімі вялікімі зубцамі, таму вышыню вызначыць немагчыма. З абодвух бакоў аздоблена вочкавым арнаментам і датавана X ст.

Падобныя расчоскам з Полацка, Прудні́каў, Гродна і Мсціслава прадметы вядомы ў Белай Вежы і Старой Ладазе (IX – першая палова X ст.), а аналагічны полацкаму грэбеню знойдзены ў Звянігарадзе, дзе выкарыстоўваўся для расчэсвання прадзіва, у Калабжэгу і Вроцлаве (Польшча), якія датаваны X–XIII стст. і якія прымянялі для расчэсвання ільну, ці ў ткацтве, а таксама ў Рызе, Таліне, Шлезвігу, Даргуне (Германія, XI ст.), Швецыі і іншых месцах [1, рис. 12: *7*; 37, с. 147, рис. 2: *3*; 50,

s. 352, taf. XVII: *3*; 51, p. 14, 2.att.: *12*; 53, s. 231, rys. 27: *q*, rys. 44: *q*; 57, s. 157–159].

Тып Б – аднабаковыя грабяні-расчоскі састаўныя – 112 экз. (мал. 2–5, 8–11). Расчоскі гэтага тыпу былі складзены з некалькіх (ад 6 да 8) пласцін з зубцамі з аднаго боку і замацаваны з двума накладкамі пры дапамозе металічных ці касцяных цвічкоў, штыфтоў, заклёпак. Накладкі мелі дугападобную спінку, рознае афармленне канцавых частак і часта былі добра аздоблены (мал. 6). Захоўваліся такія грабяні ў футаралах, упрыгожаных цыркульна-лінейным ці геаметрычным арнаментам, з якімі расчоскі былі злучаны спецыяльным шарнірам (мал. 7, 11). У адносінах арнаментацыі раскрываецца яшчэ адна функцыя грабянёў – эстэтычная. Па форме, памерах і арнаменту дадзеныя вырабы можна падзяліць на падтыпы.

Падтып а. Прамыя, не арнаментаваныя альбо слаба аздобленыя грабяні-расчоскі (мал. 2) (9 экз., Полацк, Мінск, Віцебск), якія датаваны IX–X стст. [32, с. 89, мал. 7: *1–4*; 33, с. 298, мал. 17: *1*; 47, с. 91, рис. 48: *1, 2*]. Грабяні гэтага падтыпу былі зроблены па замежных (скандынаўскіх) аналагах, аднак ад апошніх у асобных экзэмпляраў захаваліся толькі блізкія памеры (14 см), форма ж была мясцовая. Магчыма, некаторыя з іх былі прывазнымі. Характэрнай рысай такіх расчосак з'яўляецца альбо поўная адсутнасць арнаментацыі, або яна была слаба адлюстравана, а таксама прамавугольная форма грабянёў, накладак і ў большасці невялікія памеры (8–12 см). У той час як іх паўночна-заходнія аналагі былі часта мудрагелістай, даволі складанай формы, заўсёды добра аздоблены камбінаванымі арнаментамі і вялікіх памераў (14–25 см). Расчоскі без арнаменту сведчаць аб спрашчэнні іх апрацоўкі, як вынік большай таннасці і даступнасці вырабаў.

Вызначальнымі і адметнымі з гэтага падтыпу з'яўляюцца расчоскі з Полацка. Тры з іх (мал. 2: *1, 2*; 3: *8*) бліжэй да скандынаўскіх прататыпаў: даўжынёй 13–14 см, вышынёй 3,0–3,5 см, аднак з прамымі бакамі і вузкімі амаль прамымі верхнімі накладкамі без арнаменту, змацаванымі штыфтамі. Іншыя па ўсіх параметрах мясцовыя: даўжынёй 8–10 см, вышынёй 2,5 см, з прамымі бакамі і не аздобленымі накладкамі.

Падтып б. Масіўны грэбень з рэдкімі зубцамі (мал. 5: *1*) (Віцебск, X–XI стст.). Ад грэбеня дадзенага падтыпу захавалася толькі частка даўжынёй 9 см, вышынёй 4,5 см. Сам грэбень масіўны, тоўсты і гэткія ж вялікія рэдкія зубцы (0,2–0,6 см). Крыху дугападобная накладка з краю арнаментавана чатырма вертыкальнымі палоскамі [2, с. 106, рис. 95: *1*].

Падтып в. Гэта самы масавы падтып, да якога адносіцца асноўная большасць аднабаковых грабянёў з такіх гарадоў, як Полацк, Віцебск, Прудніки, Браслаў, Дрысвяты, Лукомль, Ваўкавыск, Навагрудак, Тураў, Пінск і інш. (мал. 3–5, 8–10) [2, с. 106, рис. 95: *2–7*; 3, табл. 21, рис. 5: *4, 5, 8*, 8: *5, 6*; 7, мал. 19: *5*; 8, с. 51, 53, рис. 16: *1*, 18: *1–4*; 9, с. 95–96, мал. 66: *1, 2*; 10, с. 59, мал. 3: *13*; 22, с. 59, рис. 11: *1*; 23, с. 162; 29, с. 273, мал. 2: *7*; 30, с. 9; 32, с. 89, мал. 7: *5–7*; 45, с. 270, рис. 4: *8, 9*; 48, с. 50, рис. 7: *1*]. Грабяні гэтага падтыпу прамыя, арнаментаваныя, з дугападобнымі накладкамі і на канцах бывае маюць невялікія выступы. Храналагічна яны былі распаўсюджаны ў X – першай палове XI ст. Прапорцыі такіх вырабаў складалі ў асноўным 7–10 см у даўжыню пры вышыні 2–3 см. Усе яны арнаментаваны цыркульным, лінейным, геаметрычным арнаментамі, або іх спалучэннямі. Дадзеныя прадметы часта былі ў футаралах, аздобленых такім жа арнаментам, што і накладкі спінак (мал. 7). Часцей сустракаецца геаметрычны дэкор у выглядзе ромбаў, выкананых парнымі нарэзкамі і калі-нікалі заштрыхаваных. Такі малюнак запаўняе ўсю сярэднюю частку накладак, а канцы ўпрыгожаны папярочнымі лініямі. На некаторых грабянях прысутнічаюць арнаменты ў выглядзе сеткі, а таксама вочкавыя, якія складаюцца з круга з кропкай усярэдзіне (мал. 6).

Аналіз рэчавых знаходак з сярэдневяковых пахавальных помнікаў на тэрыторыі Беларусі дазваляе канстатаваць, што сярод пахавальнага інвентару асобая роля належыць грабяням. Пры археалагічных даследаваннях у курганных могільніках выяўлена 17 расчосак з дзевяці месцаў (гл. табліцу). Усе яны знойдзены ў футаралах, толькі чатыры з іх цэлыя, астатнія – фрагментаваныя (мал. 11). Датаваны прадметы X–XI стст., і большасць з іх знойдзена ў мужчынскіх шматінвентарных пахаваннях. Арыенціроўка пахаваных у асноўным заходняя па абраду трупапалажэння. Тапаграфія размяшчэння грабянёў каля касцякоў розная: каля пояса, каля тазавых костак, каля ног, пад чэрапам, каля сценкі ямы [28, с. 212–217; 46, с. 134, мал. 70: *11*, 83: *7*]. У першых выпадках распалажэнне гэтых рэчаў суадносіцца з найбольш традыцыйнымі спосабамі іх нашэння: прывешвання каля грудзей, або да пояса – і сведчыць аб тым, што яны з'яўляліся асабістай уласнасцю памерлых. Пакладанне ж грэбеня каля сценкі – гэта дараванне ад родзічаў, каб ён служыў і ахоўваў свайго гаспадара і ў іншым жыцці. Як бачна, утылітарная функцыя грабянёў дапаўняецца іх магічнай функцыяй і выкарыстаннем гэтых рэчаў у розных аспектах жыццядзейнасці чалавека, таму што ў іх праяўляецца адзінства практычнага і сімвалічнага [15, с. 21–22; 16, с. 37–42; 19, с. 80–88; 49, с. 316].

Знаходжанне расчосак у пахаваннях сведчыць аб іх рытуальным характары і дастаткова ўстойлівай традыцыі выкарыстання ў пахавальнай абраднасці. Абрадавая функцыя грабянёў вынікае яшчэ з язычніцкіх часоў і значэнне іх як рытуальных

прадметаў захоўвалася на працягу многіх стагоддзяў. Па словах расійскай даследчыцы В. А. Кандрацьевай: «Сам факт нахождения гребня в захоронении свидетельствует о ритуальном характере предмета, его назначении "сопутствовать" человеку в иной потусторонней жизни. Характерно при этом, что в этих ритуалах гребень рассматривается как носимый, так сказать походный предмет – индивидуальная собственность покойного или же он является напутственным приношением или даром, по-видимому, от семьи и родственников умершего» [15, с. 22; 16, с. 40; 19, с. 85]. Трэба адзначыць, што грабяні шырока выкарыстоўвалі і ў вясельнай абраднасці, аб чым пазначана нават у этнаграфічных даных [19, с. 84–85].

Аналогіі расчоскам вельмі шырокія і маюцца на вялікіх тэрыторыях і шмат у якіх месцах (Расія, Украіна, Польшча, Германія, Швецыя, Нарвегія і г.д.) [4, с. 95–108; 5, с. 54–63; 6, с. 167–174; 14; 20, с. 94–98; 25, с. 218–225, рис. 186–190; 35, с. 152–154; 36, с. 21, табл. 11: *1–5*, 13: *1–7*; 38, с. 86–88, табл. 31–32; 39, с. 70–80; 40, с. 176–182; 43, с. 39–42, рис. 2; 44, с. 164–169; 52; 54, s. 87–140; 55, s. 366–379; 56, s. 205–217; 57, s. 288–296; 58, taf. 37–40, 121–122, 192, 292; 59, s. 23–24, 42–43, 58–59, 81–82; 60, s. 41–144; 61, s. 301–328; 62, s. 419–428; 63, s. 485–533; 64, s. 199–222; 65, s. 159–181; 66, s. 161–193; 67, tabl. XXXII: 2 *a–f*].

Такім чынам, магчыма канстатаваць, што грабяні-расчоскі служаць у якасці рознабаковай гістарычнай крыніцы і асвятляюць многія напрамкі і сферы жыццядзейнасці сярэдневяковага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі: гаспадарчую дзейнасць, побыт, культуру, абрады, міжнародныя сувязі і інш.

Як бачна, пры вытворчасці аднабаковых грабянёў на тэрыторыі Беларусі існавалі два ўзроўні майстэрства: запазычанае (пераймальнае) і мясцовае, якое не падпарадкоўвалася агульнаеўрапейскім прынятым канонам. На змену прадметам паўночнаеўрапейскіх форм усё часцей прыходзілі ўзоры мясцовай выпрацоўкі. Гісторыя вытворчасці гэтай масавай групы касцяных вырабаў дэманструе запазычанне жыхарамі сярэдневяковай Беларусі разглядаемага атрыбуту заходнееўрапейскай культуры, наступнае яго засваенне і пераход да ўласнай вытворчасці, аб чым сведчаць нарыхтоўкі, паўфабрыкаты і незакончаныя апрацоўкай экзэмпляры. Неабходна адзначыць, што менавіта імпартных рэчаў выяўлены адзінкі (два фрагменты расчоскі з Полацка і адзін фрагмент з Навагрудка) (мал. 7: *7*; 9: *6*), магчыма, прывазнымі былі і некаторыя іншыя грабяні з Полацка і Віцебска (мал. 2: *1, 2, 9*; 3: *8*). Таму гісторыя развіцця касцяных вырабаў з тэрыторыі Беларусі хаця і дэманструе ў некаторых выпадках запазычанне асобных навыкаў заходнееўрапейскай культуры і наступнае іх засваенне, усё ж такі асноўная маса прадметаў мае менавіта мясцовае паходжанне. Трэба таксама звярнуць увагу на тое, што сярэдневяковае насельніцтва Беларусі запазычвала матэрыяльныя носьбіты, аднак у большасці запазычанай была ідэя, або некаторыя элементы і арнаменты расчосак. Падабенства аднабаковых грабянёў з тэрыторыі Беларусі з такімі ж заходнееўрапейскімі прадметамі ў адносінах да іх формы, арнаменту, тэхнікі выканання сведчыць пра культурныя, эканамічныя і гандлёвыя сувязі, што існавалі паміж землямі Беларусі і іншымі тэрыторыямі.

Літаратура

1. Артамонов, М. И. Белая Вежа / М. И. Артамонов // СА. – 1952. – Вып. 16. – С. 42–76.

2. Бубенько, Т. С. Средневековый Витебск. Посад – Нижний замок (X – первая половина XIV в.) / Т. С. Бубенько. – Витебск : Вит. гос. ун-т, 2004. – 276 с.

3. Гуревич, Ф. Д. Древний Новогрудок (посад – окольный город) / Ф. Д. Гуревич. – Л. : Наука, 1981. – 160 с.

4. Давидан, О. И. Гребни Старой Ладоги / О. И. Давидан // АСГЭ / Государственный ордена Ленина Эрмитаж. – Л., 1962. – Вып. 4 : Славянские древности. – С. 95–108.

5. Давидан, О. И. К вопросу о происхождении и датировке ранних гребенок Старой Ладоги / О. И. Давидан // АСГЭ / Государственный ордена Ленина Эрмитаж. – Л., 1968. – Вып. 10 : Материалы и исследования по археологии СССР. – С. 54–63.

6. Давидан, О. И. Новые находки гребней в Старой Ладоге / О. И. Давидан // РА. – 1999. – № 1. – С. 167–174.

7. Дук, Д. У. Ляпная кераміка і рэчавы комплекс вакольнага горада старажытнага Полацка (па выніках раскопак 2008 г.) / Д. У. Дук // Беларускае Падзвінне : вопыт, методыка і вынікі палявых даследаванняў (да 80-годдзя пачатку археалагічных раскопак у г. Полацку): зб. навук. прац рэсп. навук.-практ. семінара, Полацк, 20–21 лістап. 2008 г. / пад агульн. рэд. Д. У. Дука, У. А. Лобача. – Наваполацк : ПДУ, 2009. – С. 9–30.

8. Зверуго, Я. Г. Древний Волковыск (X–XIV вв.) / Я. Г. Зверуго. – Минск : Наука и техника, 1975. – 144 с.

9. Іоў, А. В. Старажытнае паселішча на Ясельдзе / А. В. Іоў, В. С. Вяргей. – Мінск : Беларус. навука, 2012. – 175 с. : іл.

10. Клімаў, М. В. Асобныя аспекты развіцця паўночнай часткі Вялікага пасада г. Полацка (па выніках археалагічных даследаванняў 2009 г. на вул. Ф. Скарыны) / М. В. Клімаў // Беларускае Падзвінне : вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навук. прац Міжнар. навук. канф., прысв. 160-годдзю з дня нараджэння А. П. Сапунова, Полацк, 21–23 крас. 2011 г. : у 2 ч. / пад агульн. рэд. Д. У. Дука, У. А. Лобача. – Наваполацк, 2011. – Ч. 1. – С. 55–64.

11. Кондратьева, О. А. Отражение славяно-балто-финских этнокультурных связей в изделиях древнерусского художественного косторезного ремесла (по материалам роговых гребней IX–XI вв.) / О. А. Кондратьева // Вопросы финно-угроведения. Этнография, антропология, археология, фольклористика, литературоведение :

тез. докл. на XVI Всесоюз. конф. финно-угроведов, Сыктывкар, июнь 1979 г. – Сыктывкар, 1979. – Ч. II. – С. 16–17.

12. Кондратьева, О. А. Древнерусские гребни IX–XI вв. как источник для изучения межэтнических и культурных контактов / О. А. Кондратьева // Тез. докл. сов. делегации на V МКСА. – М., 1985. – С. 127–128.

13. Кондратьева, О. А. Технология производства средневековых односторонних наборных гребней / О. А. Кондратьева // Археология и история Пскова и Псковской земли : материалы науч. семинара. – Псков, 1986. – С. 67–70.

14. Кондратьева, О. А. Изделия косторезного ремесла Руси IX–XI вв. как исторический источник (по материалам гребней) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.06 / О. А. Кондратьева ; Лен. отд. Ин-та археологии АН СССР. – Л., 1986. – 23 с.

15. Кондратьева, О. А. Гребень в погребальном обряде (по материалам восточноевропейских могильников X–XI вв.) / О. А. Кондратьева // Археология и история Пскова и Псковской земли : тез. докл. к предстоящей науч. конф. по теме: «Древнерусское язычество и его традиции». – Псков, 1988. – С. 21–22.

16. Кондратьева, О. А. Гребень в погребальном обряде (по материалам древнерусских могильников X–XI вв.) / О. А. Кондратьева // Язычество восточных славян : сб. науч. тр. – Л., 1990. – С. 37–42.

17. Кондратьева, О. А. Древнерусские гребни. Источниковедческий аспект / О. А. Кондратьева // VI Междунар. конгресс славянской археологии : тез. докл. сов. делегации, г. Прилеп, Югославия, 1990 г. – М., 1990. – С. 161–162.

18. Кондратьева, О. А. Древнерусские гребни IX–XI вв. : местное производство и общеевропейские традиции / О. А. Кондратьева // Памятники старины. Концепции. Открытия. Версии : памяти В. Д. Белецкого (1919–1997). – СПб., Псков, 1997. – Т. 1. – С. 300–308.

19. Кондратьева, О. А. «Язык» гребня. К вопросу о семиотическом статусе вещи / О. А. Кондратьева // Раннесредневековые древности Северной Руси и ее соседи. – СПб., 1999. – С. 80–88.

20. Кондратьева, О. А. Новые находки гребней из Псковского городища / О. А. Кондратьева, С. В. Белецкий // Старая Ладога и проблемы археологии Северной Руси : сб. статей, посвящ. памяти Ольги Ивановны Давидан. – СПб., 2002. – С. 94–98.

21. Кондратьева, О. А. Некоторые вопросы производства односторонних наборных гребней в IX–XI вв. на Руси и их европейские параллели / О. А. Кондратьева // Археология, история, нумизматика, этнография Восточной Европы : сб. статей, посвящ. памяти проф. И. В. Дубова / Гос. ун-т, ист. ф-т ИИМК РАН, Рос. этнограф. музей ; под ред. проф. А. Н. Кирпичникова, доц. В. Н. Седых. – СПб., 2004. – С. 78–89.

22. Лысенко, П. Ф. Города Туровской земли / П. Ф. Лысенко. – Минск : Наука и техника, 1974. – 200 с.

23. Лысенко, П. Ф. Древний Пинск XI–XIII вв. / П. Ф. Лысенко. – Минск : БелАДИ, 1997. – 192 с.

24. Макушников, О. А. В поисках древнего Гомия / О. А. Макушников. – Гомель, 1994. – 64 с.

25. Меснянкина, С. В. Изделия из кости и рога / С. В. Меснянкина // Археология севернорусской деревни X–XIII веков : средневековые поселения и могильники на Кубенском озере : в 3 т. / отв. ред. Н. А. Макаров. – М. : Наука, 2008. – Т. 2 : Материальная культура и хронология. – С. 215–253.

26. Минасян, Р. С. О скандинавском компоненте в древнерусском производстве / Р. С. Минасян // АСГЭ / Государственный Эрмитаж. – СПб., 1999. – Вып. 34 : К 100-летию со дня рождения Михаила Илларионовича Артамонова. – С. 193–198.

27. Мядзведзева, В. У. Касцяныя грэбні з курганоў X–XII стст. Рагачоўшчыны / В. У. Мядзведзева // Старажытнасці Рагачоўшчыны : матэрыялы навук.-практ. канф., Рагачоў, сак. 2000 г. / Ін-т гісторыі НАН Беларусі, Рагачоўскі краязн. музей ; уклад. Г. В. Цітовіч [і інш.]. – Мінск ; Рагачоў, 2000. – С. 71–72.

28. Мядзведзева, В. У. Грэбні ў пахаваннях X–XII стст. на тэрыторыі Беларусі / В. У. Мядзведзева // Гіст.-археалаг. зб. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 2002. – № 17. – С. 212–217.

29. Мядзведзева, В. У. Касцяныя вырабы з сярэднявечных гарадоў (па матэрыялах раскопак М. А. Ткачова) / В. У. Мядзведзева // Castrum, urbis et bellum : зб. навук. прац. / навук. рэд. Г. Семянчук, А. Мяцельскі. – Баранавічы, 2002. – С. 272–285.

30. Мядзведзева, В. У. Майстэрства касцярэзаў Лукомля і яго акругі X–XIII стст. / В. У. Мядзведзева // Лепельскія чытанні : навук.-практ. канф., прысвеч. 565-годдзю г. Лепеля, Лепель, 27 кастр. 2004 г. / Установа культуры «Лепельскі раённы краязнаўчы музей»; уклад. А. У. Стэльмах. – Лепель, 2004. – С. 7–10.

31. Мядзведзева, В. У. Расчоска / В. У. Мядзведзева // Археалогія Беларусі : энцыкл. : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2 : Л–Я. – С. 254–255.

32. Мядзведзева, В. У. Касцярэзнае рамяство Полацка X–XVIII стст. / В. У. Мядзведзева // Беларускае Падзвінне : вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навук. прац Міжнар. навук. канф., прысвеч. 160-годдзю з дня нараджэння А. П. Сапунова, Полацк, 21–23 крас. 2011 г. : у 2 ч. / пад агульн. рэд. Д. У. Дука, У. А. Лобача. – Наваполацк, 2011. – Ч. 1. – С. 83–94.

33. Мядзведзева, В. У. Матэрыяльная культура Мінска XI–XVIII стст. (касцярэзны аспект) / В. У. Мядзведзева // Гіст.-археалаг. зб. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 2012. – № 27. – С. 297–324.

34. Пазднякоў, В. С. Клецк X–XVIII стст. : матэрыяльная і духоўная культура беларускага феадальнага горада / В. С. Пазднякоў. – Мінск : БелНДІДАС, 2008. – 287 с.

35. Понсов, В. А. Односторонние костяные составные гребни из раскопок в Новгороде / В. А. Понсов // Древнее производство, ремесло и торговля по археологическим данным : тез. докл. IV конф. молодых ученых ИА АН СССР. – М., 1988. – С. 152–154.

36. Рыбина, Е. А. Гребни, расчески / Е. А. Рыбина, Р. Л. Розенфельдт // Археология. Древняя Русь : Быт и культура / под общ. ред. акад. Б. А. Рыбакова. – М., 1997. – С. 19–22.

37. Свешников, И. К. Исследование пригорода древнерусского Звенигорода / И. К. Свешников // Труды V МКАС : в 4 т., Киев, 18–25 сент. 1985 г. / Междунар. Уния Славян. археол., Ин-т археол. АН СССР, Ин-т археол. АН УССР ; редкол.: П. П. Толочко [и др.]. – Киев, 1988. –

Т. 2 : Секция III. Жизнь и быт средневекового города. – С. 142–147.

38. Сергєєва, М. С. Косторізна справа у Стародавньому Києві / М. С. Сергєєва. – Київ : КНТ, 2011. – 256 с.

39. Смирнова, Л. И. Новгородские гребни из моржового клыка / Л. И. Смирнова // Новгород и Новгородская земля. История и археология : материалы науч. конф., Новгород, 23–25 янв. 1996 г. / Новгород. госуд. объедин. музей-заповедник ; редкол.: П. Г. Гайдуков [и др.]. – Новгород, 1996. – Вып. 10. – С. 70–80.

40. Смирнова, Л. И. К вопросу о верхней границе бытования односторонних составных гребней в Новгороде / Л. И. Смирнова // Новгород и Новгородская земля. История и археология : материалы науч. конф., Новгород, 28–30 янв. 1997 г. / Новгород. госуд. объедин. музей-заповедник; редкол.: П. Г. Гайдуков [и др.]. – Новгород, 1997. – Вып. 11. – С. 176–182.

41. Тарасаў, С. В. Полацк IX–XVII стст. : Гісторыя і тапаграфія / С. В. Тарасаў. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 183 с.

42. Трусаў, А. А. Стары замак у Гродне XI–XVIII стст. : гіст.-археалаг. нарыс / А. А. Трусаў, В. Е. Собаль, Н. І. Здановіч ; навук. рэд. Г. В. Штыхаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 152 с.

43. Флёрова, В. Е. Резная кость юго-востока Европы IX–XII веков : Искусство и ремесло. По материалам Саркела – Белой Вежи из коллекции Государственного Эрмитажа / В. Е. Флёрова. – СПб. : Алетейя, 2001. – 252 с. : ил.

44. Цнотливы, Э. Зарождение костеобрабатывающего ремесла в прибалтийском районе в IX–X вв. / Э. Цнотливы // Труды V Междунар. конгр. археологов-славистов. – Киев, 1988. – Т. 2. – С. 164–169.

45. Шадыро, В. И. Городище и селище Прудники / В. И. Шадыро // Lietuvos archeologija 21. – Vilnius, 2001. – P. 267–274.

46. Штыхаў, Г. В. Крывічы : па матэрыялах раскопак курганоў у Паўночнай Беларусі / Г. В. Штыхаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 191 с.

47. Штыхов, Г. В. Древний Полоцк (IX–XIII вв.) / Г. В. Штыхов. – Минск : Наука и техника, 1975. – 136 с.

48. Штыхов, Г. В. Города Полоцкой земли (IX–XIII вв.) / Г. В. Штыхов. – Минск : Наука и техника, 1978. – 160 с.

49. Шуклина, Ю. К. Волосы и гребни в традиционных представлениях народов Западной Сибири в конце I тысячелетия н. э. / Ю. К. Шуклина // Культура Сибири и сопредельных территорий в прошлом и настоящем : материалы Всерос. 43-й археол.-этногр. конф. молодых ученых, Томск, 1–3 апр. 2003 г. – Томск, 2003. – С. 315–316.

50. Aus, T. Vorläufige ausgrabungsergebnisse von der Harju-strasse in Tallinn / T. Aus, B. Dubovik // Toimetised Eesti NSV Teaduste Akadeemia. Ühiskonnateadused. – Tallinn, 1989. – 38. – P. 349–354.

51. Caune, A. Arheologiskie izrakumi Rīgā, Trokšņa un L. Pils ielā / A. Caune // Zinātniskās atskaites sesijas. Materiāli par arheologu un etnogrāfu 1973 gada pētījumu rezultātiem. – Rīga : Zinātne, 1974. – P. 12–17.

52. Chmielowska, A. Grzebienie starożytne i średniowieczne z ziem polskich / A. Chmielowska // Acta Archaeologica Lodziensia. – Łódź, 1971. – Nr. 20. – 160 s.

53. Cnotliwy, E. Rzemiosło rogownicze na Pomorzu wczesnośredniowiecznym / E. Cnotliwy. – Wroclaw ; Warszawa ; Kraków ; Gdańsk : PAN, 1973. – 331 s.

54. Cnotliwy, E. Wczesnośredniowieczne grzebienie z Kruszwicy / E. Cnotliwy // Slavia Antigua 34. – Warszawa, Poznan, 1994. – S. 87–140.

55. Cnotliwy, E. Grzebienie w kulturze wczesnosłowiańskiej na terenie południowej i środkowej Polski / E. Cnotliwy // Kraje słowiańskie w wiekach średnich. Profanum i Sacrum. – Poznań, 1998. – S. 366–379.

56. Dulinicz, M. Grzebień z osady w Poświętnem w woj. mazowieckim / M. Dulinicz, M. Natuniewicz-Sekula // Hereditatem cognoscere. Studia i szkice dedykowane Profesor Marii Miśkiewicz. – Warszawa, 2004. – S. 205–217.

57. Eketorp–III. Den medeltida befästningen på Öland. Artefakterna. – Almqvist & Wiksell International, Stocholm, 1998. – 371 s.

58. Herman, B. Die Vendelzeit Gotlands im auftrage der Kungl. Vitterhets historie och Antikvitets Akademien / B. Herman. – Stockholm, 1969. – II. Tafeln. – 500 s.

59. Herman, B. Die Vendelzeit Gotlands im auftrage der Kungl. Vitterhets historie och Antikvitets Akademien / B. Herman. – Stockholm, 1975. – I : 1 Text. – 200 s.

60. Hilczerówna, Z. Rogownictwo gdańskie w X–XIV wieku / Z. Hilczerówna // Gdańsk wczesnośredniowieczny. – Gdańsk, 1961. – T. IV. – S. 41–144.

61. Hilczerówna, Z. Wczesnośredniowieczne grzebienie zdobione motywami zwierzęcymi z ziem polskich / Z. Hilczerówna // Slavia Antiqua. – 1962. – T. 9. – S. 301–328.

62. Jaworski, K. Uwagi o grzebiennictwie dolnośląskim na przełomie X i XI wieku. Na marginesie rozważań nad dwoma zabytkami z Niemczy i Wrocławia / K. Jaworski // Kraje słowiańskie w wiekach średnich. Profanum i Sacrum. – Poznań, 1998. – S. 419–428.

63. Luik, H. Kahepoolsed kokkupandud luukammid Eestis / H. Luik // Proceedings of the Estonian Academy of Sciences / Humanities and social Sciences. – 1996. – T. 45, N 4. – S. 485–533.

64. Szurkowska, K. Wczesnośredniowieczne grzebienie z Gniezna / K. Szurkowska // Studia i Materiału Historyczne 3. – Gniezno, 1990. – S. 199–222.

65. Tilko, S. Kaula ķemmes no 10.–13. gs. Daugavas Lejteces kapulaukiem / S. Tilko // Arheologija un Etnogrāfija. – Riga, 2011. – L. XXV. – P. 159–181.

66. Thunmark-Nylén, L. Churhyard Finds from Gotland (11th–12th centuries) / L. Thunmark-Nylén // Archaeology East and West of the Baltic. Papers from the Second Estonian-Swedish Archaeological Symposium Sigtuna, May 1991 / ed. by Ingmar Jansson. – Stockholm, 1995. – S. 161–193.

67. Żak, J. Grzebienie z wystrojem zwierzęcym z ziem polskich i zachodnio-słowiańskich / J. Żak // Wiadomości Archeologiczne. Bulletin archéologiqtee Polonais. – Warszawa, 1955. – T. XXII. – Z. 2. – S. 180–185.

Касцяныя аднабаковыя грабяні (расчоскі) на тэрыторыі Беларусі

№ п/п	Помнік	Месца знаходкі	Аўтар раскопак	Год знаходжання	Датаванне	Колькасць
Гарады, гарадзішчы, селішчы						
1.	г. Полацк	Верхні замак	М. К. Каргер	1957	IX–X	1
		Верхні замак	В. Р. Тарасенка	1959–1960	IX–X	7
		Верхні замак	Г. В. Штыхаў	1967	X–XI	2
		Вялікі пасад, Ніжні замак	С. В. Тарасаў	1986–1989	IX–XI	20
		Вялікі пасад	Д. У. Дук	2000, 2003, 2008, 2010	X–XI	5
		Вялікі пасад	М. В. Клімаў	2009	XI	2
2.	г. Віцебск	Ніжні замак	Г. В. Штыхаў	1964, 1966	X–XI	3
		Ніжні замак, Узгорскі астрог	В. М. Ляўко	1976, 2003	X–XI	3
		Верхні замак	Л. У. Калядзінскі	1979, 1988	X–XI	5
		Ніжні замак	Т. С. Бубенька	1984, 1987, 1997	IX–XI	7
3.	г. Мінск	Замчышча, Пасад	Г. В. Штыхаў	1974, 1976	XI	2
4.	г. Лукомль	Пасад	Г. В. Штыхаў	1970	X–XI	3
5.	г. Браслаў	Гарадзішча	Л. В. Аляксееў	1966	x–xi	1
6.	в. Дрысвяты, Браслаўскі р-н	Гарадзішча	М. А. Ткачоў	1976, 1980	XI	3
			Г. М. Семянчук	2001	XI	2
7.	в. Прудніки Міёрскі р-н	Гарадзішча, селішча	В. І. Шадыра	1983–1984, 1987, 1990, 1994	X–XI	8
8.	г. Гродна	Стары Замак	З. Дурчэўскі	1938	X–XI	1
			А. А. Трусаў	1985, 1987	X–XI	2
9.	г. Ваўкавыск	Гарадзішча	Я. Г. Звяруга	1967–1968	XI	7
10.	г. Навагрудак	Дзяцінец, Вакольны горад	Ф. Д. Гурэвіч	1957–1958, 1960, 1963, 1965	X–XI	10
11.	г. Тураў	Гарадзішча	В. В. Сядоў	1961	X–XI	3
12.	г. Пінск	Гарадзішча	П. Ф. Лысенка	1964		2
13.	г. Клецк	Вакольны горад	Т. С. Бубенька, В. С. Пазднякоў	1986	XI	1
14.	в. Гарадзішча, Пінскі р-н	Селішча	В. С. Вяргей	1990	IX–XI	2
15.	г. Гомель	Вакольны горад	А. А. Макушнікаў	1987	X–XI	2
16.	г. Мсціслаў	Пасад	А. А. Трусаў	1984	XI	1
	Разам:	–	–	–	–	105
Курганныя могільнікі						
17.	в. Чарневічы, Глыбоцкі р-н	Курганны могільнік-1	Г. Цэгак-Галубовіч	1938	IX–XI	1
18.	в. Гадзілавічы, Рагачоўскі р-н	Курган 5	Г. Ф. Салаўёва	1963	X–XI	2
19.	в. Глінішча, Полацкі р-н	Курган	Г. В. Штыхаў	1967	X	1
20.	в. Дарахі, Гарадоцкі р-н	Курган 4	Г. В. Штыхаў	1973	X–XI	2
21.	в. Надаткі, Мазырскі р-н	Курган 2	Г. М. Залашка	1982	X–XI	2
22.	в. Ізбішча, Лагойскі р-н	Курганы 34, 64	В. У. Казей	1988	X–XI	4
23.	в. Навасёлкі, Мядзельскі рн	Курган 12	В. Н. Рабцэвіч	1989	XI	1
24.	пас. Усход, Магілёўскі р-н	Курган 46	І. А. Марзалюк	2008	X–XI	2
25.	в. Мохаў, Лоеўскі р-н	Курган 78	А. А. Макушнікаў	2011	X	2
	Разам:	–	–	–	–	17
	Усяго:	–	–	–	–	122



Мал. 1. Аднабаковыя грабяні (расчоскі) з тэрыторыі Беларусі: *1, 2* – Полацк; *3* – Віцебск; *4* – Прудніки; *5* – Мінск; *6, 9* – Гомель; *7* – Гродна; *8* – Мсціслаў



Мал. 2. Расчоскі з тэрыторыі Полацкай зямлі: *1–6* – Полацк; *7* – Мінск; *8, 9* – Віцебск



Мал. 3. Расчоскі з тэрыторыі Полацкай зямлі: *1–9* – Полацк; *10* – Дрысвяты



Мал. 4. Расчоскі з тэрыторыі Полацкай зямлі: *1–6* – Прудніки; *7, 8* – Віцебск



Мал. 5. Расчоскі з тэрыторыі Полацкай зямлі: *1–8* – Віцебск



Мал. 6. Накладкі ад расчосак і футаралаў з тэрыторыі Полацкай зямлі: *1–13* – Полацк; *14* – Дрысвяты; *15* – Віцебск; *16* – Браслаў



Мал. 7. Футаралы расчосак з тэрыторыі Полацкай зямлі: *1–2, 7* – Полацк; *3* – Віцебск; *4, 5* – Лукомль; *6* – Прудніки



Мал. 8. Расчоскі і накладкі ад іх з тэрыторыі Панямоння: *1–7* – Ваўкавыск; *8, 9* – Гродна



Мал. 9. Расчоскі, іх накладкі і футаралы з тэрыторыі Панямоння: *1–10* – Навагрудак



Мал. 10. Расчоскі і накладкі з тэрыторыі Тураўскай зямлі: *1* – Тураў; *2–3* – Пінск; *4* – Клецк; *5, 6* – в. Гарадзішча Пінскага р-на



Мал. 11. Расчоскі з курганных могільнікаў, размешчаных на тэрыторыі Беларусі: *1* – в. Гадзілавічы Рагачоўскага р-на; *2* – в. Дарахі Гарадоцкага р-на; *3, 7–9* – в. Ізбішча Лагойскага р-на; *4* – в. Надаткі Мазырскага р-на; *5* – пас. Усход Магілёўскага р-на; *6* – в. Навасёлкі Мядзельскага р-на; *10* – в. Глінішча Полацкага р-на

Резюме

О. В. Медведева

Изделия косторезного ремесла IX–XI вв. на территории Беларуси как исторический источник (по материалам односторонних гребней)

Рассмотрена и проанализирована одна со значимых групп костяных предметов – односторонние гребни. На их основе можно проследить взаимоотношения населения территории Беларуси в IX–XI вв. как с ближайшими соседними землями, так и с отдаленными территориями. Кроме того, гребни-расчески – изделия, в которых заключен значительный объем исторической и культурной памяти, а информационная характеристика этих вещей широка и разнообразна. Являясь предметами бытовой принадлежности, они, тем не менее, обладали набором различных функций – практической, сословной, магической, эстетической, региональной, ритуальной. Расчески служат и в качестве разностороннего исторического источника, а также освещают многие направления и сферы жизнедеятельности средневекового населения на территории Беларуси: хозяйственную деятельность, быт, культуру, обряды, международные связи и др.

Summary

O. V. Medvedeva

Products of bone carving crafts of the IX–XI centuries at the territory of Belarus as a historical source (on materials of one-side ridges)

The article devotes to analyzing one of the significant group of bone items one – side ridges. It is possible to reconstruct the relationships between the territory of Belarus and the nearest neighboring lands and remote territories at the 9th–11th centuries on this basis. In addition such ridges concentrated a huge amount of historical and cultural memory. Characteristics of these things were broad and diverse. Being the objects of household accessories, they nevertheless had a set of different functions – practical, magical, esthetical, ritual, pointed to the stratifical and regional belongings. Combs were historical sources and covered many directions and spheres of medieval life at the territory of Belarus: economic activity, model of life, culture, ceremonies, international relations, etc.

Паступіў 22.05.2013 г.

УДК [903.01/08:658.5](477.47)«653»

А. В. Петраускас, *Институт археологии НАН Украины, старший научный сотрудник, кандидат исторических наук (г. Киев, Украина);*
В. В. Янченко, *Институт археологии НАН Украины, младший научный сотрудник (г. Киев, Украина)*

Экспериментальное моделирование в Институте археологии НАН Украины и возможности его использования для развития музея «Парк «Киевская Русь»

Формирование государства и национальной идеи невозможно без изучения исторического достояния, которое досталось стране от прошлого. Особенно, если государство не имеет непрерывного исторического опыта суверенного развития, что характерно именно для Украины. Отсутствие такого опыта невероятно актуализирует задачу изучения и популяризации того фрагмента исторического наследия, связанного с существованием государственных образований на территории Украины, особенно если эти образования, в той или иной степени, связаны с современной Украиной процессом непрерывного историко-суверенного развития.

Научные исследования Киевской Руси – это история европейской гуманитарной науки на протяжении последних двух столетий. За этот период было открыто огромное количество памятников, проанализирован большой объем источников, предложены бесчисленные версии и ответы на них. И данный процесс, очевидно, бесконечен – это специфика любого научного познания. Не менее важной областью приложения исследовательского внимания, с нашей точки зрения, является «непосредственное воспроизведение предмета исторической действительности».

Это дает потомкам возможность почувствовать «живое прикосновение предков», ощутить атмосферу их жизни, самим провести время в ней, т. е. дать возможность понять специфику Киевской Руси «с обратной стороны музейного витринного стекла» с изнанки. Единственной возможностью добиться этого является «воссоздание образа», но не на мониторах и макетах, а в оригинале, в реальных размерах, причем с возможностью «глубокого погружения» в воссозданную действительность Киевской Руси.

Опытом комплексного решения проблемы воссоздания образа и атмосферы Киевской Руси является проект «Парк «Киевская Русь» (далее – ПКР). Проект создает образный комплексный фрагмент исторической реальности в современной урбанизированной среде, хотя и в максимально удобном для создания образа месте. В 34 км от Киева, в исторической местности (между древнерусскими Василевом и Витичевом, на левом берегу реки Стугна), с максимальной достоверностью проект воспроизводит архитектурный и культурный облик киевского Детинца (укрепленного городища) X–XIII вв. и атмосферу средневекового государства – Киевской Руси. Однако при этом авторы хотят особо подчеркнуть, что Детинец планируется как безусловно узнаваемый образ древнего Киева по образу и духу размерно-пространственной структуры, контуров, комплексов зданий и цветовой гамме. В то же время планируется создание современного градостроительного комплекса по своим функциям. Его создание нормировано рядом условий и правил современного градостроительства, а также наличием ряда функций, неизвестных древнему оригиналу (водопровод, канализация, энергоснабжение, техника безопасности). Функциональная необходимость заставляет ввести в состав Детинца ряд технологических объектов, которые будут визуально закрыты или технологически замаскированы. Так что образ Детинца не претерпит существенных изменений вследствие влияния современного урбанизированного века. Для решения задачи воспроизведения средневековой атмосферы предлагается восстановить не только образ древнего города-крепости, но и инфраструктуры Киеворусского государства, что позволяет на ограниченном пространстве, фактически, создать образ киевской Руси в целом. В том числе в плановых проектах ПКР много внимания уделяется экспериментальному моделированию процессов древнерусского производства и промыслов. Подобные работы были бы невозможны без сотрудничества со специалистами по экспериментальной археологии, научными сотрудниками Института археологии НАН Украины, которые уже давно занимаются данной проблематикой.

Отечественными и зарубежными учеными проводится достаточно большое количество исследований по экспериментальной археологии. Вспомним работу чешских исследователей Ренаты Малинова и Ярослава Малина [38], которые характеризуют историю экспериментальных исследований Европы, изучение жилищного строительства, эксперименты в области гончарства и металлургии, лесохимических промыслов, каменной индустрии [19]. Реконструкцию прошлого мы можем видеть и в так называемом Koelner Versuehen – воспроизведении похода легионеров [40, s. 55−57].

Рис. 1. М. М. Иевлев при проведении экспериментов по сыродутному получению железа. Выдубичи. 1978 г.

Характеризуя древнее железоделательное производство, стоит упомянуть работы английских, немецких, бельгийских ученых – по моделированию сыродутного процесса; польских исследователей – от добычи сырья до получения железа; российских специалистов – по воссозданию всех звеньев черной металлургии [14, с. 60; 17; 23, с. 5–28; 24, с. 76]. Новейшие разработки в данном направлении привлекают внимание как экспериментальная деятельность по использованию материала в домостроении, воспроизведение полного технологического цикла на примере раннеславянского поселения в Бжезно, освещенная в докладе И. Плейнеровой на международной археологической конференции «Новые технологии в археологии» [15, с. 133]; физическое моделирование металлообрабатывающего и керамического производства эпохи бронзы [33, с. 70–72] и многие другие. Отдельного внимания заслуживает перспективное направление сочетания исследования и экспонирования древних объектов: создание археопарков, скансенов археодромов. С 2005 г. в Украине таким полигоном исторической реконструкции часто выступает ПКР. В скансене можно проводить отдых так называемым первичным способом, учиться познавать процессы изготовления той или иной вещи.

Исследования в области экспериментальной археологии на территории постсоветского пространства также имеют многолетнюю историю. По мнению специалистов по истории археологической науки, формирование данного научного направления начинается на базе совместной работы представителей гуманитарных наук естественников и ученых технологов уже в начале XX в. Уже в 1920-е годы лаборатория Института археологической технологии (г. Ленинград) провела ряд исследований технологической природы трипольской керамики с использованием метода воспроизведения образцов этой керамики из материалов, отобранных на местах обнаружения археологических находок (Подольская, Волынская губ., Галичина). Полученные таким образом образцы имели все признаки трипольской керамики [18, с. 239–251].

В середине 1920-х годов начались экспериментальные опыты по технологии керамического производства силами ученых Одесского историко-археологического музея (А. Драгоев). Были проведены технологические наблюдения «за сопротивлением керамических материалов атмосферным воздействиям».

В течение 1932–1933 гг., как считают В. Колесникова и А. Яненко в рамках ВУАН произошла институализация экспериментально-технологического направления археологии, когда по инициативе В. Козловской в составе ВУАК начала разворачиваться деятельность Бригады технологического исследования. Одной из исследовательских задач было поставлено экспериментально-технологическое определение технологии производства артефактов в лабораторных условиях. В 1930-х годах был проведен ряд опытов по экспериментальному исследованию строительных смесей, которые могли применять носители трипольской культуры при строительстве сооружений [18, с. 239–251].

В 1960–70-е годы исследования технологического направления были сконцентрированы в отделе физико-естественных методов Института археологии НАН Украины. Важные результаты были получены в ходе натурного моделирования сыродутного способа получения железа: воспроизведения металлургического горна и мехов, проведения металлургического процесса (рис. 1) [24, с. 76, 91, 92].

Рис. 2. Проковка крицы. Международный семинар по экспериментальной археологии. г. Олевск. 2012 г.

Сегодня продолжаются опыты по моделированию раскалывания кремня и изготовления палеолитических каменных орудий труда [36, с. 144–155].

Специалисты по палеоботанике изучают зерновки, семена и их отпечатки на древней керамике. Результаты таких исследований используют для воспроизведения характера хозяйствования древнего человека. Некоторые вопросы древнего земледелия исследуют путем проведения экспериментальных посевов зерновых на опытных площадках [25, с. 119–123; 26, с. 150–163].

В научно-технической лаборатории Института археологии НАН Украины проводят изучение цветной металлургии с привлечением методов экспериментальной археологии (рис. 2), получены интересные результаты относительно особенностей химического состава изделий из цветных металлов, использования различных приспособлений и орудий труда в литье, особенностей изготовления изделий с использованием литья по восковой модели [11, с. 93–103; 12, с. 201–206].

В направлении исследования древнерусских ремесел и промыслов в Институте археологии НАН Украины положительные результаты получены в ходе моделирования сыродутного способа получения железа, гончарства и бортничества, которые имеют не только научную ценность, но и могут быть использованы во время строительства археологических музеев под открытым небом, поэтому остановимся на их характеристике более подробно.

Железоделательное производство обеспечивало средневековое общество сырьем для изготовления бытовых предметов, орудий труда, оружия и т.п. В древнерусское время происходят существенные изменения в видовом составе железных изделий, их количественных и качественных показателях. Соответственно, трансформируется и сама система древнерусской черной металлургии. Появляются новые объекты, связанные с сыродутным способом получения железа, увеличивается общий объем производства, образуются крупные специализированные центры металлургического производства. Создаются предпосылки для кардинальных сдвигов в черной металлургии, которые начнут развиваться в последующий период – при изготовлении чугуна и использованием механизированных устройств.

Основным источником для изучения указанных проблем выступают археологические материалы, поскольку письменные сообщения по данному виду производства одиночны и отрывочны. Особенностью источников археологической базы можно считать ее определенную фрагментарность: лишь отдельные звенья технологического процесса представлены в археологических находках. Поэтому использование экспериментальной археологии для изучения древнерусской черной металлургии может существенно дополнить наши познавательные возможности. Опыт ученых Западной, Центральной и Восточной Европы показывает, что создание действенной натурной модели сыродутного металлургического производства может быть эффективным орудием для изучения древней металлургии и позволит более точно и аргументировано понять роль и особенности известных археологических артефактов в долгой и сложной технологической цепочке металлургического процесса [3, с. 79–81; 13, с. 104–118; 17; 39].

Сотрудники Института археологии НАН Украины в течение последних лет при моделировании металлургического производства изучали особенности поиска и подготовки сырья, постройки теплотехнического сооружения, конструктивных особен-

ностей дополнительных приспособлений и непосредственно процесса получения железа в горне [5, с. 52–65; 21, с. 29−92].

Был проведен комплекс исследований сырьевой базы. Главным образом обследовали месторождения лимонита – наиболее распространенного вида железной руды на территории южнорусских земель. Изучали особенности залегания породы на территории Киевского и Житомирского Полесья, особенности ее механического состава, внешние и химические изменения при агломерации породы, пригодность для изготовления железа [5, с. 52–65; 7, с. 165–177].

Поиски руды проводили на территориях, прилегающих к памятникам с остатками производства, на которых планировали создание музейных археологических комплексов под открытым небом и проводили опыты натурного моделирования на оборудованных полевых экспериментальных площадках. Зафиксированы выходы руды на поверхность в вертикальных обнажениях рек (р. Уборть), озер (о. Вырлица) и залегания руды на небольшой глубине от поверхности на низменной местности (с. Марьяновка-Колонщина). Обследованиями масштабных разрезов береговой правобережной террасы Днепр на Киевщине зафиксировано наличие породы, которая имеет ряд общих признаков с некоторыми разновидностями железной руды – буро-красный цвет, относительно высокий удельный вес и плотность. Она представляет собой разновидность метаморфизированных песчаников и нижнего горизонта пестрых глин, которые насыщены окислами железа и имеют иногда очень яркую окраску. Часто в научной литературе находки кусков данной породы на археологических памятниках ошибочно относят к железной руде, воспринимая их как свидетельство местного изготовления железа [31, с. 12−16].

Во многих случаях при непосредственном участии в археологических раскопках славянских жилищ второй половины 1-го тысячеления н. э. находки кусков данной породы в большом количестве были зафиксированы в конструкции глинобитных печей. Куски породы выполняли роль камня для предоставления прочности конструкции тела печи и шли в использование как наиболее распространенное и доступное на данной территории каменное сырье.

При моделировании сооружения металлургического горна в качестве прототипов были использованы наиболее сохранившиеся и хорошо документированные археологические объекты, расположенные максимально близко к местам проведения натурного моделирования, – горны из древнерусских поселений Кременище и Григоровка. Для изготовления строительной смеси использовали местные залежи глинистого материала: лессовидные суглинки (Ходосовка, Пирогово), легкие слабопластические суглинки (Коростень), пластичные глины с большим количеством естественного обломочного материала (дресвы) (Олевск) [21, с. 29−92]. На возведение горна силами одного человека при разных условиях уходило от нескольких часов до нескольких дней [7, с. 165−177].

Подготовку шихты для загрузки горна проводили на основе археологических, этнографических и экспериментальных данных, свидетельствующих, что в ее состав должны входить подготовленная (агломерированная) руда, древесный уголь и, возможно, флюс [24, с. 73−75]. Агломерация руды включала в себя механическое освобождение от органических остатков, удаление примесей песка и почвы, просушки, обжига различными способами (в печи и на открытом огне) и разбивание крупных кусков до нужных размеров. В качестве флюса по археологическим данным в древнерусское время могли использовать измельченные кости животных, известь. Кости животных предварительно выжигали, что позволяло размолоть их на мелкие частицы [7, с. 165−177].

5. Самойлов, К. Г. К вопросу о локализации древнейшего ядра Старой Руссы (относительно гипотезы Я. Е. Водарского и К. А. Аверьянова) / К. Г. Самойлов, Е. В. Торопова, И. А. Воронков // Новгород и Новгородская земля. История и археология : материалы XXVI науч. конф., посвящ. 1150-летию российской государственности. – Великий Новгород, 2012. – Вып. 26. – С. 178–192.

6. Иллюстрированный историческо-статистический очерк города Старой Руссы и Старорусского уезда / сост. М. И. Полянский. – Новгород, 1885. – 494 с.

7. Археологические исследования. Новгородская губерния // Отчет Археологической Комиссии за 1913 и 1915 годы. – Пг., 1918. – С. 165.

8. Строков, А. А. Отчет об археологических работах в Старой Руссе в 1939 г. / А. А. Строков // Новгородский ист. сб. – Новгород, 1940. – Вып. 7. – С. 19–31.

9. Медведев, А. Ф. Новые данные о Старой Руссе / А. Ф. Медведев // Археологические открытия 1967 года. – М. : Наука, 1968. – С. 19–20.

10. Торопова, Е. В. Археологические исследования в Старой Руссе / Е. В. Торопова, К. Г. Самойлов, С. Е. Торопов // Вестн. Рос. гуманит. науч. фонда. – 2011. – Вып. 1(62). – С. 155–167.

11. Миронова, В. Г. История археологического изучения Старой Руссы / В. Г. Миронова // Материалы по археологии Новгорода. 1988. – М., 1990. – С. 202–220.

12. Миронова, В. Г. Начальная топография Старой Руссы / В. Г. Миронова, В. Н. Суховаров // Становление европейского средневекового города / Ин-т археологии АН СССР ; [отв. ред. В. В. Седов]. – М. : Наука, 1989. – С. 56–79.

13. Торопова, Е. В. Модель распространения и мощности культурного слоя Старой Руссы / Е. В. Торопова, И. А. Воронков // Вестн. НовГУ. Сер., Гуманит. науки. – Великий Новгород, 2011. – № 63. – С. 66–70.

14. Торопова, Е. В. Очень старая Старая Русса // Родина : рос. ист. журн. (спец. вып.). – 2012.– № 9. – С. 48–51.

15. Давидан, О. И. Гребни Старой Ладоги / О. И. Давидан // Археолог. сб. Гос. Эрмитажа. – Л., 1962. – Вып. 4. – С. 95–108.

16. Львова, З. А. Стеклянные бусы Старой Ладоги / З. А. Львова // Археолог. сб. Гос. Эрмитажа. – Л. 1968. – Вып. 10, ч. I : Способы изготовления, ареал, время распространения. – С. 64–94.

17. Пушкина, Т. А. Изделия косторезного ремесла из Гнездова / Т. А. Пушкина // Средневековые древности Восточной Европы / Труды ГИМ. – М., 1993. – Вып. 82. – С. 57–68.

18. Мядзведзева, В. У. Зааморфныя вастрыі-амулеты / В. У. Мядзведзева // Археалогія эпохі сярэднявечча. Да 80-годдя з дня нараджэння Г. В. Штыхава / Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск : «ДНУ Інстытут гісторыі НАН Беларусі», 2008. – Вып. 15. – С. 168–172.

19. Ениосова, Н. В. Подвеска с изображением хищной птицы из Гнездова / Н. В. Ениосова, С. С. Зозуля // Образы времени : из истории древнего искусства. К 80-летию С. В. Студзицкой (Труды ГИМ). – М., 2012. – Вып. 189. – С. 138–148.

Рэзюмэ

А. У. Торапава, С. Я. Торапаў, К. Г. Самойлаў, П. П. Каласніцын

Новыя даныя аб сярэдневяковай Русе (па выніках даследаванняў 2012 г.)

Артыкул прысвечаны вынікам археалагічных даследаванняў у Старой Русе (да XVI ст. – Руса) – адным са старажытнейшых гарадоў Наўгародскай зямлі. Выкладзена кароткая характарыстыка помніка і вынікі яго вывучэння (з 1939 г. па цяперашні час). У 2012 г. даследаванні праводзілі на двух участках. На Пятніцкім-I раскопе былі вывучаны старажытнейшыя напластаванні, якія датаваны першай трэццю XI – першай паловай XII ст. Адначасова з першапачатковай забудовай (у другой трэці XI ст.) тут зафіксавана актыўная рамесная дзейнасць – солевараны промысел, кастарэзная і ювелірная вытворчасць. На Курортным раскопе даследавалі пласты XIV–XV стст. Важнейшым вынікам прац стала калекцыя сфрагістычных матэрыялаў, якая ўключае 22 актавыя свінцовыя булы, чатыры нарыхтоўкі і адну прыкладную касцяную пячатку.

Summary

E. V. Toropova, S. E. Toropov, K. G. Samoilov, P. P. Kolosnitsyn

New findings about medieval Russa (according to the results of investigation in 2012)

The article is devoted to the results of the archaeological research in Staraya Russa (it was called Rusa until the 16th century) which is one of the most ancient towns of the Novgorodian land. The short characteristic of the archaeological site and the resume of its study (from 1939 till present day) are given. The most ancient strata were studied at the Pyatnitskiy-I excavation. They are dated from the first third of the 11th century till the second half of the 12th century. Active handicraft activities such as salt production, bone carving craft and jeweller's art are dated to the same time as the initial buildings (the second third of the 11th century). At the Kurortny excavation the layers of the 14th–15th centuries were studied. The most important result of the research was the sphragistic collection which includes 22 lead seals, 4 seal bars and one bone stamp.

Поступила 24.05.2013 г.

УДК 903/904(476)«634»:930.1

С. С. Юрэцкі, *Інстытут гісторыі НАН Беларусі, аспірант, магістр гістарычных навук (г. Мінск, Беларусь)*

Да праблемы культурнай ідэнтыфікацыі неалітычных старажытнасцей Беларускага Панямоння (гістарыяграфічны агляд)

Уступ. Гісторыя археалагічнага вывучэння неалітычных старажытнасцей Беларускага Панямоння налічвае звыш 150 гадоў, але асвятленне гістарыяграфіі па дадзенай праблематыцы яшчэ досыць няпоўнае. М. М. Чарняўскі зрабіў першае падсумаванне гісторыі вывучэння Беларускага Панямоння, вылучыўшы у ім два этапы, мяжой якіх абраў сярэдзіну XX ст. – пачатак сістэматычных палявых даследаванняў. У той жа час археолаг зрабіў агляд гістарыяграфіі па панёманскім неаліце на Беларусі [30, с. 3–5]. Даволі значным айчынным выданнем у галіне гістарыяграфіі па археалогіі Беларусі з'яўляецца «Белорусская археология: достижения археологов за годы Советской власти» 1987 г., адзін з раздзелаў якога прысвечаны каменнаму і бронзавым вякам Панямоння і Падзвіння і напісаны М. М. Чарняўскім [45, с. 37–47]. Дадзеная праца ўтрымлівае даволі падрабязную інфармацыю па гісторыі археалагічнага вывучэння мясцовых старажытнасцей, а таксама гістарыяграфію. Належнае месца гісторыі археалагічнага вывучэння і гістарыяграфіі надаў у сваёй манаграфіі В. Л. Лакіза. Гісторыя археалагічнага вывучэння рэгіёну пададзена даволі падрабязна, з параўнаннем дасягненняў археолагаў на сумежных з Панямоннем тэрыторыях [37, с. 10–21]. У працы пры разглядзе гістарыяграфіі асноўная ўвага была звернута даследчыкам на старажытнасці позняга неаліту і пачатку бронзавага веку, што тлумачыцца навуковымі інтарэсамі аўтара. А. У. Зуева зрабіла абзор гістарыяграфіі па культуры шарападобных амфар на тэрыторыі Беларусі, вылучыўшы асноўныя праблемныя моманты [8, с. 3–7]. Даволі падрабязны разгляд гістарыяграфіі, прысвечанай нёманскай культуры, зрабіў у сваёй манаграфіі Б. Юзвяк [53, s. 69–76].

На сучасны момант паўстае неабходнасць гістарыяграфічнага абзору па неаліту ўсяго Беларускага Панямоння: ад разгляду навуковай літаратуры, прысвечанай ранняму неаліту рэгіёна да пытанняў, звязаных з развіццём чалавечай супольнасці ў познім неаліце – пераходзе да эпохі бронзы на дадзенай тэрыторыі. Разгляд навуковай літаратуры, прысвечанай эпохе неаліту Беларускага Панямоння, прыводзіць да вылучэння шэрагу праблемных месцаў у гістарыяграфіі па згаданай тэматыцы. Сярод асноўных такіх момантаў варта назваць пытанні, звязаныя з культурнай ідэнтыфікацыяй неалітычных старажытнасцей. Менавіта разгляду гэтай праблемы і прысвечаны дадзены артыкул.

Даследаванне. Перад тым, як разглядаць пытанні гістарыяграфіі, прысвечанай культурнай ідэнтыфікацыі мясцовых старажытнасцей, неабходна звярнуцца да некаторых аспектаў археалагічнай метадалогіі. Менавіта, варта спыніцца на вызначэнні асноўнымі даследчыкамі рэгіёна паняцця «археалагічная культура».

М. М. Чарняўскі, асноўны даследчык неалітычных старажытнасцей Беларускага Панямоння, абгрунтоўваючы вылучэнне нёманскай культуры, першапачаткова звярнуўся да адметнасцей керамікі, крамянёвага інвентару, а таксама да размяшчэння помнікаў з такімі артэфактамі на пэўнай тэрыторыі – Панямонні [30, с. 47–48]. Адзначым і тое, што навуковец дапускаў: археалагічны матэрыял можа сведчыць пра этнічныя працэссы ў старажытнасці [30, с. 79–80]. Дадзены падыход у разуменні самога паняцця «археалагічная культура» адносіцца да так званага этнізуючага вызначэння [14, с. 145; 21, с. 71].

Атаясамленне паняццяў «археалагічная культура» і «этнас», што прысутнічае яшчэ ў працах польскіх даследчыкаў міжваеннага часу [48, с. 106–107; 49, с. 15–16], характэрна для прадстаўнікоў беларускай савецкай археалогіі, развіццё якой ішло ў фарватары савецкай археалогіі наогул. Так, згаданы падыход адлюстраваны ў працах П. Н. Трацякова [29, с. 3–13, 45], Н. М. Гурынай [2, с. 203; 3, с. 170–199], У. Ф. Ісаенкі [11, с. 116–123], Э. М. Загарульскага [5, с. 33–70], Э. М. Зайкоўскага [6, с. 17–18].

Пасля распаду СССР і звязанага з ім паслаблення ідэалагічнага ўціску на навукоўцаў у літаратуры з'явіўся шэраг публікацый, у якіх паслядоўна крытыкуецца згаданы вышэй падыход [14, с. 145–149; 15, с. 43–44]. Сярод беларускіх даследчыкаў дадзеная праблема асветлена ў працах М. М. Крывальцэвіча [19, с. 33–53; 21, с. 95–96].

Пэўнае значэнне для айчынных даследчыкаў ў справе адыходу ад састарэлых уяўленняў пра працэссы ўзаемадзеяння культурных традыцый у неаліце мелі працы польскіх даследчыкаў М. Шмыт [57, p. 111], А. Коські [56, s. 95], Я. Чабрашука [41, с. 34–42; 50, s. 133–135], якія ў сваіх разважаннях непасрэдна закранаюць неалітычныя старажытнасці Беларускага Панямоння. Згодна з іх поглядамі, змены пэўных археалагічных культур не абавязкова з'яўляюцца сведчаннем міграцый насельніцтва ў мінулым, бо новыя культурныя з'явы маглі перадавацца не толькі непасрэдна але і апасродкавана (праз асобныя альбо сінтэзаваныя элементы). Так-

сама археолагі абыходзяць у сваіх працах пытанні этнічнага вызначэння насельніцтва ў эпоху неаліту.

Таму на мяжы XX–XXI стст. з'яўляецца шэраг прац айчынных даследчыкаў неаліту Беларускага Панямоння, у якіх разуменне паняцця «археалагічная культура» ўжо пазбаўлена этнічнай нагрузкі. Гэты падыход знайшоў сваё адлюстраванне ў манаграфіі В. Л. Лакізы [24]. А. У. Зуева, што засяродзіла свае даследаванні на старажытнасцях культуры шарападобных амфар, зыходзіць з уяўлення аб археалагічнай культуры з пункту гледжання політэтычнай канцэпцыі Д. Кларка (рысы адной культуры могуць распаўсюджвацца на іншыя) [9, с. 5].

Яшчэ ў 1930-я гады з'явіўся шэраг прац археолагаў, у якіх неалітычныя старажытнасці Паўночна-Заходняй Беларусі звязваліся з так званымі прафінамі, ці прафінскімі паляўнічымі [48, s. 107; 49, s. 15–16]. Гіпотэзы, згодна з якімі неалітычныя старажытнасці Усходняй Еўропы і Заўралля звязвалі з продкамі фіна-вуграў, былі даволі папулярныя ў археалагічнай навуцы ў першай палове XX ст., дзякуючы працам фінскіх навукоўцаў [29, с. 15–16]. Аднак ужо напрыканцы 1950-х гадоў польскі археолаг А. Гардаўскі аднёс басейн Нёмана да тэрыторыі распаўсюджвання дняпроўска-эльбскай культуры, вызначальная рыса якой звязвалася з адсутнасцю панавання грабянёвай керамікі. Гэтая культура, на думку А. Гардаўскага, займала тэрыторыю ад Сярэдняга Дняпра да Эльбы і межавала з культурай ямкава-грабеньчатай керамікі [51, с. 312]. Трэба пазначыць, што ўсе пералічаныя вышэй высновы былі зроблены на падставе вельмі беднай крыніцазнаўчай базы, якая ў тыя часы папаўнялася шляхам паверхневых збораў.

З сярэдзіны XX ст. распачаліся актыўныя палявыя даследаванні на тэрыторыі рэгіёну, якія далі трывалы археалагічны матэрыял – падмурак тэарытычных распрацовак. Ф. Д. Гурэвіч у працы 1962 г., разглядаючы публікацыі археолагаў даваеннай пары і неапублікаваныя матэрыялы разведак Л. С. Клейна і палявых прац Н. М. Гурынай, зрабіла папярэднія высновы аб тым, што на тэрыторыі Панямоння ў часы неаліту існавалі плямёны паляўнічых і збіральнікаў, блізкіх па сваёй культуры да неалітычных насельнікаў лясной зоны Усходняй Еўропы [1, с. 14].

П. М. Траццякоў у сваёй манаграфіі за 1966 г. не згадзіўся з А. Гардаўскім на конт вылучэння дняпроўска-эльбскай культуры і зрабіў здагадку аб тым, што тэрыторыю Літвы і Паўночна-Заходняй Беларусі ў неаліце насялялі плямёны паляўнічых і збіральнікаў са спецыфічнай матэрыяльнай культурай. Абапіраючыся на вынікі палявых прац Р. Рыманцене, археолаг прыйшоў да высновы, што адной з такіх асаблівасцей мясцовага неаліту з'яўляецца панаванне на стаянках крамянёвага інвентару пераважткавага мезалітычнага выгляду і параўнальна рэдкія па колькасці знаходкі старажытнай керамікі [29, с. 45].

Н. М. Гурына, якая абагульніла вынікі палявых даследаванняў на тэрыторыі Панямоння, выказала думку аб тым, што разглядаемая ёй тэрыторыя не ўваходзіла ў рэгіён распаўсюджвання ямкава-грабеньчатай керамікі і выказала гіпотэзу аб тым, што Паўночна-Заходняя Беларусь, Літва і Усходняя Польшча ў неаліце ўяўлялі сабой «этнакультурнае» адзінства [2, с. 203].

Далейшае вырашэнне праблемы культурнай ідэнтыфікацыі неалітычных помнікаў Беларускага Панямоння звязана з дзейнасцю М. М. Чарняўскага. Менавіта ён на працягу 1960–70-х гадоў абгрунтаваў вылучэнне асобнай нёманскай неалітычнай культуры [30, с. 47–67; 32, с. 462; 42, с. 94; 44, с. 84–87]. Асноўныя рысы нёманскай культуры вызначаліся М. М. Чарняўскім на аснове вывучэння неалітычнай керамікі, а таксама, у меньшай ступені, крамянёвага інвентару. Даследчык вылучыў тры группы керамікі [42, с. 87–93], што і стала падставай для перыядызацыі нёманскай культуры [30, с. 50–64; 33, с. 462; 34]. Сярод адметнасцей нёманскай культуры ў кераміцы даследчыкам былі названы: пасудзіны са лёгку адагнутай шыйкай, аздобленыя наколамі, насечкамі, прачэрчанымі лініямі і інш. – для ранняга (дубічайскага) этапу нёманскай культуры; вастрадонныя пасудзіны, што маюць завужаную шыйку, адагнутае ці лейкападобнае венца, дамешкі ў цесце расліннасці і жарствы, малую колькасць грабянёвых узораў, пераважна гарызантальную арнаментацыю ў верхняй частцы пасудзін і інш. – для сярэдняга (лысагорскага) і позняга (дабраборскага) этапаў нёманскай культуры [30, с. 47–48].

Крамянёвы інвентар нёманскай культуры, згодна з меркаваннем М. М. Чарняўскага, характарызуецца захаваннем пэўных мезалітычных традыцый (свідэроідныя наканечнікі стрэл, мікраліты і інш.), наяўнасцю лінзападобных каменных сякер, скрабкоў розных форм, нажоў з гарбатай спінкай, а таксама з'яўленнем ў познім неаліце трохкутных наканечнікаў стрэл і інш. [30, с. 47].

Канцэпцыя нёманскай культуры з цягам часу зведала пэўныя змяненні. М. М. Чарняўскі ўжо на рубяжы XX/XXI ст. прыйшоў да высновы аб магчымасці вылучэння ранняга этапу нёманскай культуры (дубічайскага) у якасці асобнай культуры. Зыходзячы з арэала, а таксама таму, што прыпяцкія матэрыялы датаваны больш раннім часам [11, с. 113], дадзеная культура атрымала назву прыпяцка-нёманскай [37, с. 240; 38, с. 235]. Дарэчы, трэба заўважыць, што літоўскі археолаг А. Гірынінкас вылучае ў раннім неаліце паўднёвай Літвы дубічайскую культуру [52, s. 134–141]. Зыходзячы з супадзення тэрыторый



Мал. 1. Межы распаўсюджвання ранненеалітычнай керамікі на тэрыторыі Заходняй Беларусі згодна з М. М. Чарняўскім [37, с. 237, мал. 4]: *1* – прыпяцка-нёманская культура (кераміка дубічайскага тыпу); *2* – ранні «лясны» неаліт Польшчы; *3* – кераміка з валакністымі раслінными дамешкамі; *4* – кераміка з зубчатымі расчэсамі паверхняў сценак; *5* – паўночная мяжа заходнепалескага варыянта прыпяцка-нёманскай культуры

распаўсюджвання прыпяцка-нёманскай (мал. 1) і дубічайскай культур (мал. 2), а таксама з еднасці іх культурна-вызначальных прыкмет, трэба лічыць іх адной археалагічнай культурай, толькі пад рознымі назвамі.

Пры разглядзе гістарыяграфіі, прысвечанай прыпяцка-нёманскай культуры, звяртаюць на сябе ўвагу наступныя праблемныя моманты. Па-першае, існуюць разыходжанні ў назве сярод беларускіх і літоўскіх даследчыкаў (прыпяцка-нёманская паводле М. М. Чарняўскага [37, с. 240; 38, с. 235] і дубічайская згодна з А. Гірынінкасам [52, s. 134–141]). Розныя назвы адной і той жа археалагічнай культуры пры тым, што абодва даследчыка надаюць ёй аднолькавыя характарыстыкі, прывядзе да пэўных недарэчнасцей. Відавочнай з'яўляецца неабходнасць замацавання за ранненеалітычнымі старажытнасцямі Заходняй Беларусі, Усходняй Літвы і Паўночнай Украіны наступнай назвы: «прыпяцка-нёманская культура», бо дадзенае вызначэнне, як і яго характарыстыкі, былі сфармуляваны М. М. Чарняўскім раней за літоўскага даследчыка. Па-другое, выклікае пытанні разгляд прыпяцка-нёманскай культуры ў складзе днепра-данецкай этнакультурнай агульнасці [39, с. 29]. Сутнасць днепра-данецкай этнакультурнай агульнасці ў тым, што ранейшыя лакальныя групы днепра-данецкай культуры, вылучанай на пачатку 1960-х гадоў Дз. Я. Цялегіным, пачалі разглядацца ў канцы 1990-х гадоў як самастойныя, аб'яднаныя агульным паходжаннем па прыкмеце грабеньчата-накольчатай керамікі, утвараючы такім чынам этнакультурную агульнасць [28, с. 8]. Спрэчнай з'яўляецца сама назва «этнакультурная агульнасць»: 1) як адзначалася, сучасныя даследчыкі эпохі неаліту пазбягаюць этнічных інтэрпрэтацый археалагічнага матэрыялу, з-за суб'ектыўнага характару такіх заключэнняў; 2) само існаванне днепра-данецкай этнакультурнай агульнасці крытыкуецца шэрагам навукоўцаў. З аднаго пункту гледжання лакальныя культуры дадзенага таксону разглядаюцца як цалкам самастойныя. Для тэрыторыі Беларусі яскравым прыкладам такога стаўлення з'яўляецца гістарыяграфія, прысвечаная верхнедняпроўскай культуры, якую Дз. Я. Цялегін уключаў у днепра-данецкую этнакультурную агульнасць [13, с. 170–190; 46, с. 78–79]. З другога пункту гледжання навукоўцы разглядаюць днепра-данецкую культуру з лакальнымі варыянтамі, фактычна вяртаючыся да першапачатковай версіі яе вылучэн-



Мал. 2. Тэрыторыя распаўсюджвання дубічайскай культуры згодна з А. Гірынінкасам [52, p. 135, pav. 87]

ня Дз. Я. Цялегіным. Сярод айчынных навукоўцаў такі падыход выкарыстоўвае ў сваіх даследаваннях Дняпроўска-Бярэзінскага неаліту І. М. Язэпенка [4, с. 164; 47, с. 24].

Таму сёння і патрэбна інтэнсіфікацыя вывучэння старажытнасцей ранненеалітычнай прыпяцка-нёманскай культуры з адначасовай карэляцыяй атрыманых дадзеных з вынікамі даследаванняў мясцовых познамезалітычных помнікаў. У сваю чаргу, гэта прывядзе і да новых даследаванняў крамянёвага інвентару.

Разглядаючы гістарыяграфію, прысвечаную нёманскай культуры на тэрыторыі Беларускага Панямоння, трэба ў першую чаргу спыніцца на эвалюцыі поглядаў яе асноўнага даследчыка М. М. Чарняўскага. Фактычна можна вылучыць дзве канцэпцыі навукоўца па згаданай культуры. Першая канцэпцыя разглядае нёманскую культуру як развіццё трох яе этапаў (дубічайскага, лысагорскага, дабраборскага). Фармаванне культуры бачылася даследчыкам на мясцовым мезалітычным субстраце (нёманская мезалітычная культура) [30, с. 50]. М. М. Чарняўскі падкрэсліваў ролю культуры лейкападобных кубкаў пры фармаванні лысагорскага этапу на базе дубічайскага [30, с. 57]. Фармаванне ж дабраборскага этапу, на думку археолага, ішло на базе лысагорскага пры ўплыве культур шарападобных амфар і шнуравой керамікі [30, с. 63].

Другая канцэпцыя нёманскай культуры была выказана М. М. Чарняўскім на пачатку XXI ст. Дубічайскі этап культуры пачаў разглядацца ім як асобная ранненеалітычная культура [38, с. 25–33]. У складзе ўласна нёманскай культуры засталіся два этапы: лысагорскі і дабраборскі. На думку М. М. Чарняўскага, нёманская культура пачала фарміравацца ў міжрэччы Сярэдняй Одры і Ніжняга Буга ў раннім неаліце. Затым носьбіты нёманскай культуры перанялі пэўныя дасягненні неалітычнай рэвалюцыі ад сваіх заходніх суседзяў, што прывяло да дэмаграфічных зрухаў, якія выклікалі неабходнасць міграцый, пашырэння арэала існавання культуры. М. М. Чарняўскі лічыў, што менавіта гэтыя акалічнасці і прывялі да экспансіі носьбітаў нёманскай культуры з тэрыторыі Польшчы ў Заходнюю Беларусь, дзе ў той час існавала прыпяцка-нёманская культура. Даследчык назваў дзве хвалі такой міграцыі: у выніку першай утварыўся лысагорскі этап нёманскай культуры на тэрыторыі Беларусі (мігранты прынеслі з сабой элементы культуры лейкападобных кубкаў і пачалі ўзаемадзейнічаць з тубыльцамі), а ў выніку другой хвалі мігрантаў утварыўся дабраборскі этап нёманскай культуры на Беларусі ці «класічная нёманская культура» (находнікі прынеслі з сабою элементы культуры шарападобных амфар). На фармаванне дабраборскага этапу, згодна з М. М. Чарняўскім, аказалі ўплыў і шнуравікі [40, с. 84–85].

Параўноўваючы прыведзеныя канцэпцыі М. М. Чарняўскага па нёманскай культуры, можна заўважыць наступнае. Першая канцэпцыя з'яўляецца яскравым прыкладам стадыяльнага бачання развіцця культур ляснога неаліту – неалітызацыя на мясцовым мезалітычным субстраце, адсутнасць дакладных сведчанняў вытворчай гаспадаркі, пераход да новага этапу як вынік самастойнага развіцця пры ўплывах з боку іншых культур. Другая ж канцэпцыя выглядае больш распрацаванай, у ёй выкарыстоўваюцца такія паняцці, як «дэзінтэграцыя», «метысацыя» (аднак, на жаль, не прыводзяцца факты ў доказ існавання такіх з'яў

у старажытнасці). Падаецца таксама штучным, з-за недастатковасці даных палеагістарычных рэканструкцый, дэкларавание «дэмаграфічных зрухаў» у носьбітаў нёманскай культуры на тэрыторыі Польшчы. Спрэчным бачыцца і разуменне помнікаў нёманскай культуры на тэрыторыі Польшчы як больш старажытных за матэрыялы з тэрыторыі Заходняй Беларусі: даных абсалютнага датавання на сучасным узроўні даследаванняў недастаткова, а адносная храналогія досыць няпэўная.

Супрацьлеглую пазіцыю наконт старажытнасцей нёманскай культуры займала польскі археолаг Е. Кемпісты, адпаведна поглядам якой польскі «лясны неаліт» з'яўляецца прышлым з усходніх тэрыторый [55, s. 66–67]. Такім чынам, накірунак уплыву нёманскай культуры ўяўляўся даследчыцы не з захаду на ўсход, а з усходу на захад.

Новую канцэпцыю нёманскай культуры распрацаваў польскі даследчык Б. Юзвяк. Ён прапанаваў класіфікаваць матэрыялы нёманскай культуры на тэрыторыі Польшчы наступным чынам: вучоны вылучыў у ёй пяць састаўных частак (матэрыялы класічнай нёманскай культуры і чатыры гарызонты лінінскіх) [53, s. 215, 218; 54, s. 91]. Старажытнасцям класічнай нёманскай культуры па Б. Юзвяку адпавядаюць па сваім асноўным характарыстыкам матэрыялы дабраборскага этапу нёманскай культуры, згодна з М. М. Чарняўскім, на што таксама звяртае ўвагу польскі археолаг А. Ваўрусевіч [58, s. 19]. З'яўленне нёманскай культуры, згодна з поглядам Б. Юзвяка, адбывалася на тэрыторыі басейнаў рэк Бугу, Верхняга і Сярэдняга Нёмана, а таксама Верхняй Прыпяці [53, s. 71].

Дакладныя звесткі аб прысутнасці старажытнасцей культуры шарападобных амфар на Беларускім Панямонні былі атрыманы на самым пачатку 1970-х гадоў у выніку адкрыцця яе могільнікаў у левабярэжжы каля пас. Краснасельскі і в. Малыя Ёдкавічы, аднак інтэнсіфікацыя даследаванняў згаданай культуры пачалася фактычна з 1990-х гадоў [8, с. 3]. На працягу 1990-х гадоў з'явіўся шэраг прац М. М. Чарняўскага, прысвечаных старажытнасцям дадзенай культуры на тэрыторыі Беларусі [31, 35]. Матэрыялы з названых пахаванняў на Гарадзеншчыне даследчык звязаў са старажытнасцямі мазавецка-мадляшскай групы культуры шарападобных амфар. Падставай для гэтага сталі падабенствы ў пахаваннях (выкарыстанне каменных скрынь, альбо пахаванняў, абкладзеных невялікімі камянямі, прамавугольная форма магіл і іх арыентацыя па лініі ўсход–захад, пахаванні з жывёламі ці толькі жывёл, няпоўнае спаленне памерлага), а таксама тоеснасць посуду [35, с. 215].

Матэрыялы культуры шарападобных амфар з тэрыторыі Беларусі ў сваіх даследаваннях аналізуе і М. Шмыт. Першапачаткова даследчыца пагадзілася з М. М. Чарняўскім у тым, што пранікненне носьбітаў разглядаемай культуры на тэрыторыю Беларускага Панямоння адбывалася з тэрыторыі мазавецка-падляшскай групы [57, p. 194]. У больш позняй публікацыі М. Шмыт адзначыла таксама падабенствы беларускіх пахавальных комплексаў з матэрыяламі валынскай падгрупы культуры шарападобных амфар [41, с. 37].

У апошнія гады сярод айчынных даследчыкаў сваю ўвагу на матэрыялах культуры шарападобных амфар засяродзіла А. У. Зуева [7, 9, 10]. У выніку разгляду паўночна-ўсходніх пахавальных комплексаў (Браньск–Хоева, Краснасельскі, Малыя Ёдкавічы, Турыншчына) археолаг вызначыла месца беларускіх матэрыялаў у рамках разглядаемай культуры. Згодна з ёй, прыток носьбітаў культуры шарападобных амфар на тэрыторыю Беларускага Панямоння адбываўся з тэрыторыі Люблінскага ўзвышша [7, с. 99]. А. У. Зуева пагадзілася з думкай М. Шмыт аб тым, што носьбіты прышлай культуры, апынуўшыся ў атачэнні насельніцтва аўтахтонных культур «лясного» неаліту, імкнуліся падкрэсліць сваю адметнасць [7, с. 89; 57, p. 198]. Гэтай акалічнасцю між іншым і тлумачыцца асаблівасць Краснасельскага археалагічнага комплексу, у якім утрымліваецца пахаванне жывёл, пасыпанае чырвонай вохрай, што не з'яўляецца тыповай рысай дадзенай культуры [7, с. 92].

Згодна з А. У. Зуевай, прысутнасць культуры шарападобных амфар на разглядаемай тэрыторыі характарызуецца наяўнасцю помнікаў, адзінкавых артэфактаў, а таксама асобных прыкмет ў матэрыялах мясцовых культур. Даследчыцай таксама была больш канкрэтна вызначана роля носьбітаў культуры шарападобных амфар ў выпрацоўцы Краснасельскіх крэмнездабыўных шахтаў і майстэрань пры іх. Увага была звернута на эксплуатацыю Карпаўскіх майстэрань, якія спецыялізаваліся, згодна з меркаваннем археолага, на вытворчасці чатырохбаковых сякер і долатаў [9, с. 17–18].

Сур'ёзнай праблемай вывучэння дадзенай культуры на тэрыторыі Беларускага Панямоння, як і Беларусі наогул, застаецца адсутнасць выяўленых і даследаваных пасяленчых помнікаў. Малая колькасць матэрыялаў пакідае адкрытымі пытанні вызначэння арэалу і храналогіі культуры шарападобных амфар на разглядаемай тэрыторыі.

Першым, хто звярнуў увагу на старажытнасці шнуравой керамікі на тэрыторыі Паўночна-Заходняй Беларусі, быў В. Антаневіч. Ён звязаў знаходкі гэтай культуры са старажытнымі індаеўрапейцамі і згадаў адну з іх галоўных асаблівасцей – так званыя баявыя сякеры [48, s. 109]. Аднак першыя навуковыя даследаванні старажытнасцей гэтай культурнай з'явы на тэрыторыі Беларускага Панямоння пачаліся з 1960-х гадоў. М. М. Чарняўскі аднёс помнікі са шнуравой керамікай Панямоння да пры-



Мал. 3. Карта апорных помнікаў тыпу Бершты–Русакова кола культур шнуравой керамікі згодна з В. Л. Лакізам [23, с. 179, 181] і дапаўненнямі С. С. Юрэцкага

балтыйскай (вісла-нёманскай) культуры адзінкавых пахаванняў [43, с. 125]. Дадзеная выснова грунтавалася на адзіным пахаванні ў Краснасельскай шахце і распаўсюджвалася археолагам на ўсё Беларускае Панямонне хутчэй гіпатэтычна. Знаходкі з паселішча Лысая Гара былі аднесены М. М. Чарняўскім да помнікаў з так званай невысветленай культурнай прыналежнасцю [43, с. 126] У. Ф. Ісаенка таксама разглядаў шнуравыя старажытнасці Панямоння як тэрыторыю распаўсюджвання вісланёманскай (прыбалтыйскай культуры) [12, с. 10, 20]. Дз. А. Крайноў аднёс тэрыторыю Паўночна-Заходняй Беларусі да прыбалтыйскай культуры «ладьевидных» сякер [16, с. 61, рис. 6], адным з лакальных варыянтаў якой лічылася жуцаўская культура [17, с. 53].

У канцы 1990-х гадоў М. М. Чарняўскі выказаў думку аб тым, што дакладна вызначыць культурную прыналежнасць помнікаў, звязаных са шнуравымі традыцыямі і якія ён адносіў да бронзавага веку, на гэтай тэрыторыі досыць складана. Пры гэтым даследчык усё ж такі быў схільны прылічаць Беларускае Панямонне да зоны ўплыву жуцаўскай культуры, адзначаючы ўздзеянне шнуравых культур Падняпроўя і Палесся [36, с. 311].

Я. Чабрашук і М. Шмыт аднеслі старажытнасці басейна Нёмана да жуцаўскай культуры [41, рис. 1]. Асноўныя характарыстыкі жуцаўскай культуры (іншыя яе назвы: вісла-нёманская ці прыбалтыйская): еўрапейскі тып А «ладьевидных» сякер, разнастайныя формы сякер-молатаў; разнастайныя кубкі (з S-падобнай прафіліроўкай, з выцягнутым тулавам, з акруглым тулавам і выцягнутай шыйкай, з шырокім тулавам і вузкай шыйкай; лейкападобныя пасудзіны; амфары з вушкамі на плечыках); міскі буйных памераў; арнамент у выглядзе шнуравых адбіткаў, трохкутнікаў, наразных ліній, нарэзак у выглядзе елачак; буйныя пасудзіны аздабляліся наляпнымі валікамі і вушкамі; пахаванні ў выглядзе трупапалажэнняў у скорчаным стане на баку, адзіночныя і групавыя; разнастайныя бурштынавыя ўпрыгажэнні [17, с. 52–54].

М. М. Крывальцэвіч бачыць уплыў на Панямонне з боку Цыркумбалтыйскага культурнага кола шнуравой керамікі. Даследчык называе адметныя рысы матэрыяльнай культуры, якія пра гэта сведчаць: знаходкі пасудзін са скошаным унутр венцам; аздабленне посуду ў выглядзе заштрыхаваных, сутыкаючыхся бакамі трохвугольнікаў; распаўсюджванне бескурганных, адзіночных ці з невялікіх груп з трупапалажэннямі пахаванняў; вялікая колькасць знаходак свідраваных сякер і пэўныя іх тыпы («ладьевидные», утулкавыя, тыпу Карлава) [20, с. 266–267]. М. М. Крывальцэвіч адзначаў таксама прысутнасць на тэрыторыі Беларускага Панямоння і прыкмет, якія можна звязаць з сярэднедняпроўскай культурай [18, с. 20]. Аднак на той час (сярэдзіна–канец 1990-х гадоў) дадзеная заўвага была яшчэ досыць гіпатэтычнай і папярэдняй з-за недастатковасці археалагічных даных.

З сярэдзіны 1990-х гадоў на тэрыторыі Беларускага Панямоння засяродзіў свае даследаванні



Мал. 4. Карта апорных помнікаў падгорнаўскай групы кола культур шнуравой керамікі згодна з В. Л. Лакізам [24, с. 154, мал. 60]

В. Л. Лакіза, які звярнуў асноўную ўвагу на матэрыялы кола культур шнуравой керамікі, а таксама тшцінецкага культурнага кола. У выніку праведзеных работ даследчык ужо на пачатку XXI ст. прыйшоў да высновы аб немагчымасці разглядаць гэты рэгіён у межах адной культуры ці варыянта і вылучыў сярод старажытнасцей, што вывучаў, пэўныя групы помнікаў. Важнейшым крытэрыем для вылучэння згаданых таксонаў стала вывучэнне керамікі эпох позняга неаліту–эпохі бронзы з першабытных помнікаў Беларускага Панямоння, якая была падзелена археолагам на дзве групы з адпаведнымі тыпамі. Першая група керамікі была аднесена даследчыкам да кола культур шнуравой керамікі і датавана познім неалітам, а другая звязвалася з тшцінецкімі традыцыямі. Вывучэнне керамікі першай групы з трыма яе тыпамі і суправаджаючых яе рэчаў стала падставай для вылучэння В. Л. Лакізам на тэрыторыі Беларускага Панямоння матэрыялаў агульнаеўрапейскага А-гарызонту, а таксама наступных таксонаў кола культур шнуравой керамікі: помнікаў тыпу Бершты–Русакова і падгорнаўскай групы помнікаў [22; 23; 24, с. 146–155; 25–27].

Кераміка першай групы першага тыпу вылучана археолагам на падставе таўстасценнасці, шчыльнасці яе фрагментаў без прысутнасці істотных дамешкаў, аздабаванасці венцаў пальцавымі зашчыпамі і пад імі гарызантальным валікам ці конусападобнымі прасвідраванымі адтулінамі. Па сваім асноўным характарыстыкам дадзеныя фрагменты керамікі маюць тоеснасць з матэрыяламі агульнаеўрапейскага А-гарызонту кола культур шнуравой керамікі [24, с. 146].

Да першай групы другога тыпу В. Л. Лакізам была аднесена кераміка, якая ўтрымлівае мінеральныя дамешкі ў цесце (дробназярністая жарства ці пясок). Сярод асноўных форм керамікі даследчыкам названы пасудзіны з S-падобнай прафіліроўкай, лейкападобнымі шыйкамі і злёгку зведзенымі ўнутр венцамі, а таксама кубкі і міскі. Дадзеная кераміка аздабавана разнастайнай шнуравой, наразной і накольчатай арнаментацыяй (адбіткі прамавугольнага штампа, матывы ялінкі, зігзагу, заштрыхаваных трохвугольнікаў). Своеасаблівасць дадзенай керамікі, а таксама суправаджаючых яе крамянёвых артэфактаў дазволіла археолагу вылучыць групу помнікаў тыпу Бершты–Русакова і звязаць яе с жуцаўскай культурай. Арэал дадзенай групы акрэслены даследчыкам паўночна-заходнім і заходнім Панямоннем, а таксама поўднем Літвы (мал. 3) [24, с. 147–150; 25].

Своеасаблівасць керамікі першай групы трэцяга тыпу вылучаецца В. Л. Лакізам, галоўным чынам, па прысутнасці дамешак шамоту ў фармовачным цесце пасудзін, альбо наогул без прысутнасці ў ім атлушчальнікаў. Паверхні такіх пасудзін звычайна гладкія, аднак могуць утрымліваць сляды загладжвання знешняй і ўнутранай паверхняў, а таксама можа назірацца і падгарызантальная штрыхоўка. Сярод асноўных форм керамікі дадзенай групы даследчык называе наступныя: з S-падобнай прафіліроўкай, посуд з кароткімі шыйкамі і бочач-

кападобным тулавам, адагнутымі вонку падоўжанымі венцамі, цюльпанападобная кераміка. Пераважнымі формамі арнаментацыі з'яўляліся, згодна з археолагам, лінейныя і шнуравыя адбіткі з перавагай першых, таксама посуд аздабляўся зубчастымі і вусеневымі штампамі. На падставе вывучэння дадзенай керамікі В. Л. Лакіза вылучыў падгорнаўскую групу помнікаў на тэрыторыі паўднёва-ўсходняга Панямоння (мал. 4). Пры гэтым даследчык падкрэсліваў, што дадзеная група помнікаў фарміравалася пад моцным уплывам прыпяцкага варыянта сярэднедняпроўскай культуры, а таксама пры ўдзеле групы помнікаў тыпу Берштыі–Русакова і культуры палескай шнуравой керамікі [24, с. 150–155; 26].

У справе вывучэння старажытнасцей кола культур шнуравой керамікі на тэрыторыі Беларускага Панямоння перспектыўным бачыцца далейшы пошук матэрыялаў агульнаеўрапейскага А-гарызонту з мэтай больш поўнага вывучэння працэсу ранняга пранікнення традыцый згаданай культурнай з'явы на разглядаемую тэрыторыю. Мэтазгодным з'яўляецца далейшае вывучэнне помнікаў тыпу Берштыі-Русакова, а таксама падгорнаўскай групы помнікаў з адначасовай карэляцыяй атрыманых даных з вынікамі вывучэння старажытнасцей культур «лясного» неаліту на познім этапе існавання апошніх.

Заключэнне. Да канца XX ст. у беларускай археалогіі панавала канцэпцыя, згодна з якой неаліт Беларускага Панямоння быў прадстаўлены нёманскай культурай з трыма этапамі развіцця. Да бронзавага веку адносілася мясцовая культура са шнуравой керамікай, вывучэнне якой знаходзілася яшчэ ў пачатковым стане. З 1990-х гадоў пачалося актыўнае вывучэнне бронзавага веку Беларускага Панямоння, у выніку чаго мясцовыя групы «шнуравікоў» былі пераканаўча аднесены В. Л. Лакізам да позняга неаліту.

З пачатку XXI ст. паступова змяняліся ўяўленні і аб супольнасцях «лясного» неаліту. Так, М. М. Чарняўскі вылучыў у асобную культуру першы ранненеалітычны этап нёманскай культуры. Археолаг аднёс вылучаную прыпяцка-нёманскую культуру да днепра-данецкай этнакультурнай агульнасці. Аднак само існаванне днепра-данецкай этнакультурнай агульнасці ставіцца многімі даследчыкамі пад сумненне. Фарміраванне ж ўласна нёманскай культуры М. М. Чарняўскі звязваў з пранікненнем на захад Беларусі носьбітаў «лясного» неаліту з тэрыторыі Польшчы, Павіслення, а таксама традыцый культур лейкападобных кубкаў, шарападобных амфар, а пазней і кола культур шнуравой керамікі. Праблемнымі застаюцца моманты, звязаныя з вызначэннем зыходнага кірунка ўплыву, арэалу зараджэння нёманскай культуры. У справе вывучэння старажытнасцей культуры шарападобных амфар і кола культур шнуравой керамікі перспектыўным з'яўляецца пошук пасяленчых помнікаў вышэйпералічаных таксонаў, вылучэнне матэрыялаў агульнаеўрапейскага А-гарызонту, а таксама комплекснае вывучэнне мясцовых познанеалітычных супольнасцей «лясного» і «цэнтральнаеўрапейскага» неаліту.

Даследчыкі вылучаюць згаданыя ў артыкуле археалагічныя культуры, тыпы і групы помнікаў пераважна на падставе вывучэння керамічных комплексаў. Таму вырашэнне названых праблем трэба здзяйсняць праз усебаковае вывучэнне калекцый неалітычнай керамікі, бо сярод неалітычных старажытнасцей менавіта кераміка вылучаецца сваёй найбольшай распрацаванасцю з крыніцазнаўчага і метадалагічнага пункту гледжання.

Літаратура

1. Гуревич, Ф. Д. Древности Белорусского Понеманья / Ф. Д. Гуревич. – М. ; Ленинград : Изд-во Акад. наук СССР, 1962. – 222 с.

2. Гурина, Н. Н. Новые данные по каменному веку Северо-Западной Белоруссии / Н. Н. Гурина // Материалы и исследования по археологии СССР. – 1965. – № 131. – С. 141–203.

3. Гурина, Н. Н. Из истории древних племен западных областей СССР / Н. Н. Гурина // Материалы и исследования по археологии СССР. –1967. – № 144. – 206 с.

4. Езепенко, И. М. Новые результаты исследований днепро-донецкой культуры в междуречье Березины и Днепра / И. М. Езепенко // Матэрыялы па археалогіі Беларусі // Даследаванні каменнага і бронзавага вякоў. – 2010. – Вып. 18. – С. 161–169.

5. Загорульский, Э. М. Древняя история Белоруссии. Очерки этнической истории и материальной культуры (до IX в.) / Э. М. Загорульский. – Минск : Изд-во БГУ им. В. И. Ленина, 1977. – 136 с.

6. Зайковский, Э. М. Неолит и бронзовый век Белорусского Подвинья : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.06 / Э. М. Зайковский. – Вильнюс, 1985. – 21 с.

7. Зуева, А. У. Паўночна-ўсходнія могільнікі культуры шарападобных амфар і іх месца ў «амфарнай» культурнай прасторы / А. У. Зуева // Гіст.-археалаг. зб. – 2007. – Вып. 23. – С. 82–100.

8. Зуева, А. У. Вывучэнне культуры шарападобных амфар на тэрыторыі Беларусі ў канцы XX – пачатку XXI ст. / А. У. Зуева // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. – Сер. 3, Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. – 2009. – № 2. – С. 3–7.

9. Зуева, А. У. Культура шарападобных амфар на тэрыторыі Беларусі і яе роля ў развіцці супольнасцей III – пачатку II тысячагоддзя да н. э.: аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.06 / А. У. Зуева. – Мінск, 2011. – 24 с.

10. Зуева, А. У. Шарападобных амфар культура / А. У. Зуева // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. /

рэдкал.: Т. У. Бялова [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – Т. 1.– С. 414–415.

11. Исаенко, В. Ф. Неолит Припятского Полесья / В. Ф. Исаенко. – Минск : Наука и техника, 1976. – 128 с.

12. Исаенко, В. Ф. Памятники бронзового века / В. Ф. Исаенко // Археологическая карта Белоруссии. – Минск : Полымя, 1976. – Вып. 3. – 150 с.

13. Калечыц, А. Г. Верхнедняпроўская культура / А. Г. Калечыц // Археалогія Беларусі : у 4 т. – Мінск : Беларус. навука, 1997. – Т. 1 : Каменны і бронзавы вякі. – С. 170–190.

14. Клейн, Л. С. Археологическая типология / Л. С. Клейн. – Ленинград : Изд-во акад. наук СССР, 1991. – 448 с.

15. Клейн, Л. С. Феномен советской археологии / Л. С. Клейн. – СПб. : Фарн, 2003. – 128 с.

16. Крайнов, Д. А. Фатьяновская культура / Д. А. Крайнов // Археология СССР. Эпоха бронзы лесной полосы СССР. – М. : Наука, 1987. – С. 58–76.

17. Крайнов, Д. А. Культуры шнуровой керамики и ладьевидных топоров в Восточной Прибалтике / Д. А. Крайнов, И. А. Лозе // Археология СССР. Эпоха бронзы лесной полосы СССР. – М. : Наука, 1987. – С. 51–57.

18. Крывальцэвіч, М. М. Азярное 1 – паселішча эпохі бронзы на поўначы Палесся / М. М. Крывальцэвіч // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 1999. – Вып. 2. – 108 с.

19. Крывальцэвіч, М. М. Археалёгія і палітыка / М. М. Крывальцэвіч // Шуфляда. Часопіс найноўшай гісторыі. – 1999. – № 1. – С. 33–54.

20. Крывальцэвіч, М. М. «Шнуравы гарызонт» на Беларусі : праблемы ідэнтыфікацыі і генэзіса / М. М. Крывальцэвіч // Od neolityzacji do początków epoki brązu : przemiany kulturowe w międzyrzeczu Odry i Dniepru między VI i II tys. przed Chr. / red. J. Czebreszuk, M. Kryvaltsevič, P. Makarowicz. – Poznań, 2001. – S. 259–274.

21. Крывальцэвіч, М. М. Могільнік сярэдзіны III – пачатку II тысячагоддзяў да н. э. на Верхнім Дняпры – Прорва 1 / М. М. Крывальцэвіч. – Мінск : Ін-т гісторыі НАН Беларусі, 2006. – 202 с.

22. Лакіза, В. Л. Культурна-храналагічная класіфікацыя старажытнасцей бронзавага веку Беларускага Панямоння / В. Л. Лакіза // Od neolityzacji do początków epoki brązu. Przemiany kulturowe w międzyrzeczu Odry i Dniepru między VI i II tys. przed Chr. / pod red. J. Czebreszuka, M. Kryvalceviča, P. Makorowicza. – Poznań : Wydawnictwo Poznańskie, 2001. – S. 291–314.

23. Лакіза, В. Позні неаліт, ранні і сярэдні перыяды бронзавага веку Паўночна-Заходняй Беларусі. Стан і перспектывы даследаванняў / В. Лакіза // Wspólnota dziedzictwa kulturowego ziem Białorusi i Polski. – Warszawa : Ośrodek Ochrony Dziedzictwa Archeologicznego, 2004. – S. 99–119.

24. Лакіза, В. Л. Старажатнасці позняга неаліту і ранняга перыяду бронзавага веку Беларускага Панямоння / В. Л. Лакіза. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 343 с.

25. Лакіза, В. Л. Бершты-Русакова / В. Л. Лакіза // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1. – С. 107–108.

26. Лакіза, В. Л. Падгорнаўскага тыпу помнікі / В. Лакіза // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2. – С. 155–156.

27. Лакиза, В. Л. К проблеме позднего неолита и начала бронзового века северо-западной Беларуси / В. Л. Лакиза // Человек. Адаптация. Культура. – М. : Ин-т археологии РАН, 2008. – С. 388–399.

28. Телегин, Д. Я. Поселения днепро-донецкой этнокультурной общности эпохи неолита : свод археологических источников / Д. Я. Телегин, Е. Н. Титова. – Киев : Наук. думка, 1998. – 142 с.

29. Третьяков, П. П. Финно-угры, балты и славяне на Днепре и Волге / П. П. Третьяков. – М. ; Ленинград : Наука, 1966. – 309 с.

30. Чарняўскі, М. М. Неаліт Беларускага Панямоння / М. М. Чарняўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 144 с.

31. Чарняўскі, М. Могільнікі культуры шарападобных амфар на Гродзеншчыне / М. Чарняўскі // З глыбіні вякоў. Наш край : гіст.-культ. зб. – Мінск : Крок уперад, 1992. – С. 5–15.

32. Чарняўскі, М. М. Нёманская культура / М. М. Чарняўскі // Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: В. В. Гетаў [і інш.]. – Мінск : Беларус. энцыклапедыя, 1993. – С. 462.

33. Чарняўскі, М. М. Эвалюцыя неалітычных культур на Беларускім Панямонні і Падзвінні / М. М. Чарняўскі // Час. Помнікі. Людзі : тэз. дакладаў Міжнар. канф. памяці рэпрэсаваных археолагаў. – Мінск, 1993. – С. 153–155.

34. Чарняўскі, М. М. Нёманская культура / М. М. Чарняўскі, У. Ф. Ісаенка // Археалогія Беларусі : у 4 т. – Мінск : Беларус. навука, 1997. – Т. 1 : Каменны і бронзавы вякі. – С. 145–170.

35. Чарняўскі, М. М. Культура шарападобных амфар / М. М. Чарняўскі // Археалогія Беларусі : у 4 т. – Мінск : Беларус. навука, 1997. – Т. 1 : Каменны і бронзавы вякі. – С. 211–219.

36. Чарняўскі, М. М. Помнікі са шнуравой керамікай Панямоння / М. М. Чарняўскі // Археалогія Беларусі : у 4 т. – Мінск: Беларус. навука, 1997. – Т. 1 : Каменны і бронзавы вякі. – С. 307–311.

37. Чарняўскі, М. М. Неаліт з грабеньчата-накольчатай керамікай Заходняй Беларусі. Асаблівасці эвалюцыі / М. М. Чарняўскі // Od neolityzacji do początków epoki brązu. Przemiany kulturowe w międzyrzeczu Odry i Dniepru między VI i II tys. przed Chr. / pod red. J. Czebreszuka, M. Kryvalceviča, P. Makorowicza. – Poznań : Wydawnictwo Poznańskie, 2001. – S. 231–240.

38. Чарняўскі, М. М. Да пытання вылучэння прыпяцка-нёманскай ранненеалітычнай культуры / М. М. Чарняўскі // Гіст.-археалаг. зб. – 2003. – № 18. – С. 25–33.

39. Чарняўскі, М. М. Неаліт Беларусі : праблемы перыядызацыі і храналогіі / М. М. Чарняўскі // Wspolnota dziedzictwa kulturowego ziem Bialorusi i Polski. – Warszawa : Ośrodek Ochrony Dziedzictwa Archeologicznego, 2004. – S. 99–119.

40. Чарняўскі, М. М. Нёманская неалітычная культура ў Беларусі : генезіс і эвалюцыя / М. М. Чарняўскі // Na rubiezy kultur. Badania nad okresem neolitu i wczesna epoka brazu / pod red. U. Stankiewicz, A. Wawrusiewicza. – Bialystok : Instytucja kultury woj. Podlaskiego, 2011. – S. 77–86.

41. Чебрешук, Я. К исследованию среднеевропейских факторов культурных перемен в лесной зоне Восточной

Европы в III тысячелетия до н. э. / Я. Чебрешук, М. Шмит // Гіст.-археалаг. зб. – 2003. – Вып. 18. – С. 34–57.

42. Чернявский, М. М. Некоторые итоги изучения неолитических поселений Белорусского Понеманья / М. М. Чернявский // Древности Белоруссии. – Минск : Ин-т истории АН БССР, 1966. – С. 83–97.

43. Чернявский, М. М. Бронзовый век / М. М. Чернявский // Очерки по археологии Белоруссии. – Минск : Наука и техника, 1970. – С. 109.

44. Чернявский, М. М. Неманская культура / М. М. Чернявский // Очерки по археологии Белоруссии. – Минск : Наука и техника, 1970. – С. 84–87.

45. Чернявский, М. М. Каменный и бронзовый века Понеманья и Подвинья / М. М. Чернявский // Белорусская археология : достижения археологов за годы Советской власти / редколл.: Г. В. Штыхов, В. Ф. Исаенко, Л. Д. Поболь. – Минск : Наука и техника, 1988. – С. 37–48.

46. Юрэцкі, С. С. Верхнедняпроўская неалітычная культура : пытанні гістарыяграфіі / С. С. Юрэцкі // Романовские чтения-8 : сб. статей Междунар. науч. конф. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2011. – С. 78–79.

47. Язэпенка, І. Да пытання аб інтэрпрэтацыі матэрыялаў неалітычных паселішчаў Беларускага Падняпроўя / І. Язэпенка // Гіст.-археалаг. зб. – 1994. – № 3. – С. 10–26.

48. Antoniewicz, W. Czasy przedhistoryczne i wczesnodziejowe ziemi Wileńskiej / W. Antoniewicz // Wilno i ziemia Wileńska. – Wilno : Wydawnictwo wojewodzkiego komitetu regionalnego, 1930. – T. 1. – S. 103–126.

49. Cehak-Hołubowiczowa, H. Zabytki archeologiczne województwa Wileńskiego i Nowogródskiego / H. Cehak-Hołubowiczowa. – Wilno : Dziennik urzedowej K.O.S. Wil., 1936. – 40 s.

50. Czebreszuk, J. Z zachodu na wschod i ze wschodu na zachod : kultury pucharowe i ugrupowania lesno-wschodnioeuropejskie na przelomie epok / J. Czebreszuk // Wspólnota dziedzictwa kulturowego ziem Białorusi i Polski. – Warszawa : Ośrodek Ochrony Dziedzictwa Archeologicznego, 2004. – S. 119–136.

51. Gardawski, A. Zagadnienie kultury «ceramiki grzebykowej» w Polsce / A. Gardawski // Wiadomości Archeologiczne. – 1958. – T. XXV. – Z. 4. – S. 287–313.

52. Girininkas, A. Akmens amzius / A. Girininkas // Lietuvos archeologia. – 2009. – T. 1. – P. 134–141.

53. Józwiak, B. Społesnosci subneolitu wschodnioeuropejskiego na Niżu Polskim w międzyrzeczu Odry i Wisły / B. Józwiak. – Poznań : Instytut Prahistorii Universitetu im. Adama Mickiewicza, 2003. – 449 s.

54. Józwiak, B., Domaradzka, J. Studia nad osadnictwem spolecnosci subneolitycznych w Polsce polnocno-wschodniej / B. Jozwiak, J. Domaradzka // Na rubiezy kultur. Badania nad okresem neolitu i wczesna epoka brazu / pod red. U. Stankiewicz, A. Wawrusiewicza. – Bialystok : Instytucja kultury woj. Podlaskiego, 2011. – S. 87–101.

55. Kempisty, E. Kultura ceramiki grzebykowo-dolkowej na Mazowszu i Podlasiu / E. Kempisty // Wiadomości Archeologiczne. – 1973. – T. XXXVIII. – Z. 1. – S. 3–76.

56. Kosko, A. Problem wschodniej rubieży kultur neolitycznych Niżu Środkowoeuropejskiego : VI–III tys. BC / A. Kosko, M. Szmyt // Wspólnota dziedzictwa kulturowego ziem Białorusi i Polski. – Warszawa : Ośrodek Ochrony Dziedzictwa Archeologicznego, 2004. – S. 80–98.

57. Szmyt, M. Between West and East. People of the Globular Amphora Culture in Eastern Europe. 2960–2350 B.C. / M. Szmyt // Baltic–Pontic Studies. – Poznan, 1999. – Vol. 6. – 349 p.

58. Wawrusiewicz, A. Okres neolitu i wczesnej epoki brazu na Podlasiu. Stan i perspekywy badan / A. Wawrusiewicz // Na rubiezy kultur. Badania nad okresem neolitu i wczesna epoka brazu / pod red. U. Stankiewicz, A. Wawrusiewicza. – Bialystok : Instytucja kultury woj. Podlaskiego, 2011. – S. 87–101.

Резюме

С. С. Юрецкий

К проблеме культурной идентификации неолитических древностей Белорусского Понеманья (историографический обзор)

Рассмотрена одна из основных проблем в изучении неолита Белорусского Понеманья – культурная идентификация местных неолитических древностей. Проанализирована научная литература, связанная с выделением в данном регионе следующих археологических культур: припятско-неманской, неманской, шаровидных амфор и круга культур шнуровой керамики. Рассмотрена концепция М. М. Чернявского, касающаяся неманской культуры, ее генезиса и развития, а также концепция В. Л. Лакизы о выделении на территории Белорусского Понеманья таксонов круга культур шнуровой керамики (группы памятников типа Бершты–Русаково и подгорновской группы памятников). Определены основные перспективные направления для дальнейшего исследования эпохи неолита рассматриваемого региона.

Summary

S. S. Yuretsky

The problem of the cultural identification of the Neolithic antiquities of Belarusian Neman (river flow)

The article is devoted to the problem of the cultural identification of the Neolithic antiquities. The author analyzes scientific literature, devoted to the archeological cultures of this region: Neman culture, Pripyat-Neman culture, Globular Amphora Culture and Corded Ware culture. Also the attention is paid to the concepts of M. M. Cherniavskij about genesis of the Neman culture. The author analyzes scientific approaches of V. L. Lakiza about taxa of the Corded Ware culture: group of sites Bershty–Rusakovo and Podgornovskoj group of sites. The writer also identifies the main prospective directions for further research of the topic.

Паступіў 28.10.2013 г.

МАТЭРЫЯЛЫ І МЕТАДЫ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

УДК [903.1+903.21](4)«633»:930.2

В. У. Ашэйчык, *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, аспірант, магістр гістарычных навук (г. Мінск, Беларусь)*

Крамянёвы інвентар яніславіцкай культуры: асноўныя накірункі вывучэння і некаторыя праблемы таксанамічнага падзелу

1. Уводзіны

З яніславіцкай культурай (далей – ЯнК) звязваецца развіццё чалавечай супольнасці позняга мезаліту на значных абшарах Польшчы, Украіны, Беларусі і Літвы. Сёння практычна ўсе вядомыя помнікі ЯнК – гэта стаянкі-паселішчы ці стаянкі-майстэрні. Выключэнне складаюць адзінкавыя пахавальныя комплексы. Сярод іх пахаванне з Яніславіц [52, 53, 62, 129] і пахаванне на паселішчы ў Возьнай Всі [128; 76, s. 48, 84][1]. З эпанімнага пахавання паходзіць і адзіны дакладна яніславіцкі комплекс вырабаў з арганічных матэрыялаў[2]. Часам у літаратуры да ЯнК адносяць некаторыя выпадковыя знаходкі (касцяныя наканечнікі з двума пазамі, арнаментаваныя рагавыя «магічныя жэзлы»[3]) з тэрыторыі паўночна-ўсходняй Польшчы, Літвы і Калінінградскай вобласці Расіі [67, s. 295; 80, s. 236–237; 88, s. 143–144; 92, s. 150–152]. Выказвалася таксама меркаванне пра верагоднасць прыналежнасці да ЯнК часткі рагавых прылад са Смаргонскага кар'ера, сярод якіх было арнаментаванае «жазло шамана» [39, с. 73–76; 41]. Аднак сувязь гэтых артэфактаў з ЯнК толькі гіпатэтычная.

Абсалютную ж большасць ідэнтыфікаваных з моманту выдзялення і на працягу апошніх 50 гадоў старажытнасцей ЯнК складаюць крамянёвыя матэрыялы, што робіць іх галоўным відам крыніц у даследаваннях яніславіцкай праблематыкі. У дадзеным артыкуле аўтар прапануе гістарыяграфічны агляд асноўных падыходаў да вывучэння крамянёвага інвентару і аналіз некаторых найбольш дыскутаваных даследчых праблем, што ўздымаліся ў сувязі з гэтым.

2. Гісторыя вылучэння ЯнК і базавая характарыстыка таксону

Упершыню паняцце яніславіцкай культуры для ідэнтыфікацыі мезалітычных помнікаў выкарыстаў польскі археолаг С. К. Казлоўскі ў 1964 годзе [81, s. 338–343]. Даследчык звярнуў увагу на падабенства паміж матэрыяламі некаторых стаянак Малапольшчы і інвентаром пахавання каля Яніславіц [52], ад якога ЯнК і атрымала сваю назву. Адначасова Х. Венцкоўска адзначыла тыпалагічнае адзінства некаторых мезалітычных комплексаў з тэрыторыі Мазовіі [141, 142]. Крыху пазней на іх падставе даследчыца сумесна з М. Марчак вылучыла вісляньскі індустрыяльны цыкл [148, s. 22–32; 149, s. 28–40]. У хуткім часе выявілася, што абедзьве назвы акрэсліваюць адну і тую ж з'яву [83, s. 33, 44; 92, s. 120]. Нягледзечы на розныя падыходы ў вылучэнні, абодва тэрміны «яніславіцкая культура» і «вісляньскі цыкл»[4] выкарыстоўваюць у археалагічнай

[1] Некаторыя даследчыкі схіляюцца да думкі пра прыналежнасць да ЯнК двух пахаванняў з Перкунова [72] у паўночна-ўсходняй Польшчы і некаторых пахаванняў на могільніках Дуанкальніс і Спігінас на воз. Біржуліс [49–51] у заходняй Літве [67, s. 296–297; 80, s. 237; 92, s. 153–154; 128, s. 54; 113]. Тым не менш культурная атрыбуцыя гэтых аб'ектаў з'яўляецца дыскусійнай і іх прыналежнасць да ЯнК пераканаўча не абгрунтавана.

[2] Шкілет пахаванага ў сядзячым становішчы мужчыны суправаджаў 41 крамянёвы артэфакт (7 яніславіцкіх вастрый са зламанай асновай, 14 яніславіцкіх трохвугольнікаў, 11 пласцін, 3 аднапляцовачныя нуклеусы ад рэгулярных пласцін, 2 нуклеусы ў пачатковай фазе эксплуатацыі, 2 прануклеусы, 1 фрагмент канкрэцыі з уступнай апрацоўкай, 1 крамянёвы адбойнік) і каля 50 касцяных і рагавых знаходак, сярод якіх 3 прылады з касцей тура і аленя (штылеты ? наканечнікі дзідаў ? элементы капальных прылад ?), некалькі прылад з рагоў аленя, нажы-скрабачы з іклаў дзіка, нашыйнік з зубоў аленя (захавалася 20 яго элементаў) і інш.

[3] Названыя знаходкі не былі прадстаўлены ў Яніславіцкім пахаванні.

[4] Схема культурнага падзелу польскага мезаліту Х. Венцкоўскай і М. Марчак заснавана на прынцыпах і з выкарыстаннем тэрміналогіі, прапанаваных С. Крукоўскім і пазней дапрацаваных Р. Шыльдам. Мінімальнай адзінкай культурнага падзелу служыць «індустрыя» (przemysł). Індустрыя аб'ядноўвае крамянёвыя комплексы, што з'яўляюцца аднолькавымі з пункту гледжання тыпалагічнага складу і структуры (выражанай у працэнтных суадносінах паміж групамі тыпалагічных прылад). Шэраг індустрый, тыпалагічна падобных адна да адной, аб'ядноўваюцца ў «індустрыяльныя цыклы» (cykle przemysłowe). Прамежкавым звяном паміж індустрыяй і цыклам служыць «група індустрый» (grupa przemysłów). Важнае месца ў гэтай схеме займае таксама паняцце «міжіндустрыяльных элементаў» (elementy międzyprzemysłowe) [120, s. 132–134; 121; 145, s. 350]. С. К. Казлоўскі ў якасці базавага таксону выкарыстоўвае паняцце «археалагічная культура». Больш дробнай адзінкай служыць «культурная група» (grupa kulturowa). Адзінкамі вышэйшага ад археалагічнай культуры ўзроўню з'яў-

літаратуры. Пры гэтым ва ўсходнееўрапейскіх працах найчасцей можна сустрэць тэрмін, які прапанаваў С. К. Казлоўскі.

Пачатковая распрацоўка канцэпцыі ЯнК у якасці аднаго з таксонаў еўрапейскага мезаліту адбывалася на працягу другой паловы 1960-х – пачатку 1970-х гадоў галоўным чынам намаганнямі С. К. Казлоўскага [82; 83; 87; 89; 90] і Х. Венцкоўскай [143; 144; 148; 149], і ў адносна завершаным выглядзе была прадстаўлена ў дзвюх манаграфіях згаданых аўтараў [92; 145]. Асноўны вынік пералічаных даследаванняў: базавая тыпалагічная характарыстыка ЯнК, вызначэнне асноўнай тэрыторыі распаўсюджання культуры і першыя версіі яе датавання.

Своеасаблівасць і адметнасць ЯнК вызначаецца наступным наборам крамянёвага інвентару [92, s. 136–150; 145, s. 378–379]:

спецыфічныя мікраліты, звычайна блізкай да трохвугольнай формы, зробленыя з рэгулярных пласцін. Адзін іх бок часткова альбо спрэс рэтушаваўся, вастрыё афармлялася з дапамогай мікраразцовага прыёму, а аснова магла апрацоўвацца рэтушшу, утварацца зломам альбо заставацца натуральнай. Такія вырабы атрымалі назву «яніславіцкія вастрыі», паводле тыпалогіі С. К. Казлоўскага, ці «вастрыі тыпу Вялішаў», паводле Х. Венцкоўскай;

няроўнабокія, прамавугольныя ці амаль прамавугольныя трохвугольнікі выцягнутых прапорцый[1];

аднапляцовачныя нуклеусы ад рэгулярных пласцін з плоскай ці злёгку закругленай адшчэпняй і адпаведныя сколы-нарыхтоўкі;

скрабачы (скрабкі нерэгулярных формаў), звычайна вельмі шматлікія ў комплексах.

Да характэрных элементаў крамянёвага інвентару ЯнК таксама аднесены сярэдневысокія, нізкія і высокія сіметрычныя трапецыі, пласціны са скошаным рэтушшу канцом, скрабкі на пласцінах і адшчэпах, укладышы з сячэнняў рэгулярных пласцін. Сярод іншых прылад – шматлікія рэтушаваныя пласціны і адшчэпы, а таксама даволі рэдкія разцы, цёслы, праколкі і пракруткі.

На падставе картаграфавання элементаў мікралітычнага набору С. К. Казлоўскі вызначыў арэал кампактнага размяшчэння помнікаў ЯнК, які распаўсюджваўся на басейны верхняй і сярэдняй Віслы, Буга, верхняй Прыпяці, Нарава і Нёмана [92, s. 155–157, мара 19]. Пазнейшыя даследаванні дазволілі пашырыць яго на ўвесь басейн Прыпяці (гл. напр. [12]), а таксама ніжняе цячэнне Бярэзіны і Сажа [23, с. 114–123; 18; 19].

С. К. Казлоўскі прапанаваў датаваць ЯнК пачынаючы ад першай паловы барэальнага і да канца атлантычнага перыядаў [92, s. 159–161]. Пытанне аб ніжняй і верхняй храналагічных межах ЯнК дагэтуль з'яўляецца дыскусійным, аднак усе даследчыкі згаджаюцца з познамезалітычнай (у рамках атлантычнага перыяду) храналогіяй пераважнай большасці яніславіцкіх комплексаў [8, с. 41; 9, с. 8; 10, с. 190–192; 11, с. 88; 12, с. 137–138; 21, с. 188; 22, с. 61; 67, s. 297–298; 96, p. 156–158; 99, s. 52; 113; 133, s. 128; 145, s. 379–380][2].

3. Асноўныя накірункі вывучэння крамянёвага інвентару ЯнК

Асноўнае месца ў большасці прац, якія прысвечаны ЯнК, займаюць тыпалагічна-параўнаўчыя штудыі. У межах традыцыйнай метадалогіі, характэрнай для прац у тым ліку С. К. Казлоўскага і практычна ўсіх усходнееўрапейскіх даследчыкаў,

ляюцца «культурная супольнасць» (wspólnota kulturowa; у англійскамоўнай версіі – «група культур») і «культурнае кола» (krąg kulturowy; у англійскамоўнай версіі – «тэхнакомплекс») [79; 92, s. 224; 93, s. 8, 86]. У практычным ужытку польскай археалогіі тэрміны абедзвюх схем з'яўляюцца ўзаемазамяняльнымі, хоць і не заўсёды цалкам сінанімічнымі (гл. напр. [70, s. 10–11]). Бясспрэчнымі сінонімамі выступаюць «цыкл» і «культура». Паняцце ж культурнага кола (ці тэхнакомплексу), наогул, можа выкарыстоўвацца прыхільнікамі абедзвюх тэрміналагічных канцэпцый (гл. напр. [145, s. 438]).

Па-за тэрміналагічнымі прэферэнцыямі, адрозненні паміж двума «лагерамі» даследчыкаў польскага мезаліту ў 1960-х гадах праяўляліся ў падыходах да крыніцазнаўчых падмуркаў канцэпцый. Х. Венцкоўска і М. Марчак абапіраліся выключна на «чыстыя» матэрыялы, атрыманыя ў выніку метадычна праведзеных раскопак, С. К. Казлоўскі шырока выкарыстоўваў і матэрыялы паверхневых збораў (гл. [92, s. 14]).

[1] Паводле метрычных характарыстык, С. К. Казлоўскі падзяліў гэтую катэгорыю на чатыры тыпы (гл. [92, s. 26–29]), два з якіх акрэсліў назвай «яніславіцкія трохвугольнікі» – вялікія (шырынёй больш за 6 мм і даўжынёй больш за 25 мм) і малыя (шырынёй больш за 5 мм і даўжынёй да 25 мм). Менавіта яніславіцкія трохвугольнікі даследчык лічыў характэрнымі для ЯнК.

[2] Разважанні наконт храналогіі ЯнК заснаваны ў першую чаргу на аргументах тыпалогіі. Найважнейшым храналагічным індыкатарам лічацца трапецыі з рэгулярных пласцін, час распаўсюджвання якіх у мезаліце Еўропы адносяць да атлантыку альбо ў пераходны перыяд паміж барэалам і атлантыкам (гл. [84]).

Усе нешматлікія датаванні 14С, атрыманыя для комплексаў ЯнК, прыпадаюць на атлантычны перыяд: Руды Востраў – 7875 ± 50 BP (Ki-6261), 7800 ± 60 BP (Ki-6260) [11, с. 162; 12, с. 137]; Дэнбы 29 – 7250 ± 100 BP (Gd-2278), 7140 ± 120 BP (Gd-2555), 6760 ± 70 BP (KN-3764) [64, s. 48; 65, s. 40]; Крыніца 4 – 7210 ± 40 BP (ГИН-5843) [8, с. 41]; Яніславіцы – 6580 ± 80 BP (Gd-2432) [129]; Тамашоў II – 6555 ± 45 BP (GrN-7051) [107, s. 185]; Возьна Весь 1 – 5900 ± 100 BP (Gd-2431) [128, s. 51]. На стаянцы Кабляй 2 у Літве для торфу, які перакрываў пласт з яніславіцкімі знаходкамі, атрымана дата 7060 ± 150 BP (Ta-2610) (гл. [114, p. 56–57; 116, p. 71–76]).

асноўнай мэтай з'яўлялася рэканструкцыя «гістарычнага працэсу». Сродкам дасягнення гэтай мэты служылі вылучэнне і спробы высвятлення змен у распаўсюджанні ў часе і прасторы «археалагічных культур» – адзінак таксанаміі археалагічнага матэрыялу. Лічылася, што апошнія адлюстроўваюць этнакультурныя супольнасці людзей, якія рэальна існавалі ў старажытнасці. Вылучэнне таксонаў адбывалася на падставе вывучэння фармальных (марфалагічных і колькасных) параметраў выбраных крамянёвых вырабаў, прызнаных «вядучымі» тыпамі. Праблематыка тыпалагічных даследаванняў ЯнК, выкананых у традыцыйным ключы, акрамя апісання складу асобных яе комплексаў і фармулявання абагульненай характарыстыкі крамянёвага інвентару ўсяго таксона ці яго геаграфічна вылучанай часткі, зводзіцца да разгляду наступных пытанняў: унутраны падзел і таксанамічны статус ЯнК, наяўнасць слядоў уплыву з боку іншых таксанамічных адзінак, храналогія, паходжанне і гістарычны лёс. Такі набор пытанняў складае асноўны змест практычна любога абагульняючага даследавання і, пераважна ў скарочаным варыянце, з'яўляецца стандартам аналітычнай часткі амаль кожнай публікацыйнай працы.

Некаторыя з пералічаных пытанняў будуць больш падрабязна разглядацца ніжэй (гл. пункт 4). Перад гэтым аўтар хацеў бы спыніцца на шэрагу аспектаў, што датычацца практыкі правядзення тыпалагічнага аналізу крамянёвага інвентару, а таксама прапанаваць гістарыяграфічны агляд асноўных нетыпалагічных даследаванняў ЯнК.

3.1. Некаторыя аспекты тыпалагічнага аналізу крамянёвага інвентару

Прынцыпы фармальнай сістэматыкі прылад працы шырока абмяркоўваліся ў польскай археалагічнай літаратуры 1960–1970-х гадоў. Вынікам стала распрацоўка даволі сталай наменклатуры і класіфікацыйных схем крамянёвых вырабаў. Няма сэнсу пералічаць тут усе працы, што закранаюць згаданую праблематыку, аднак варта звярнуць увагу на манаграфію Р. Шыльда і яго калег [124]. Прапанаваны ў ёй тыпаліст стаў узорным для многіх пазнейшых даследаванняў польскіх аўтараў. Неабходна таксама адзначыць, што ў мезалітазнаўчых працах асноўная ўвага звярталася на класіфікацыю мікралітаў [87, s. 73–78; 92, s. 17–36; 144, s. 56–60; 149, s. 12–15]. Менавіта апошнім адводзілася роля культуравызначальных элементаў. Арыгінальную і грунтоўную тыпалогію мікралітаў, якая выходзіць па-за рэгіянальныя межы, распрацаваў С. К. Казлоўскі [92, s. 17–36; 95, p. 13–31; 96, p. 57–79]. Яго тыпалогія набыла вялікую папулярнасць і выкарыстоўваецца ў якасці базавай большасцю польскіх даследчыкаў мезаліту і сёння. Сваю версію агульнаеўрапейскага тыпаліста прапанаваў Т. Галіньскі [67, s. 19–43].

Усходнееўрапейскія даследчыкі стварылі ўласныя класіфікацыйныя схемы. Тут неабходна назваць тыпалогію «наканечнікаў» Р. Рыманцене [29, с. 152–156; 31], а таксама ўніверсальныя тыпалогіі крамянёвых вырабаў фінальнага палеаліту–неаліту, прадстаўленыя Д. Я. Цялегіным [33; 34; 35, с. 7–13] і У. Ф. Ісаенкам [16]. Зрэшты, згаданыя тыпалагічныя распрацоўкі не набылі шырокага практычнага значэння. У параўнанні з заходнімі, спецыялісты з усходу праяўляюць меншую «метадычную дысціплінаванасць» і вельмі часта пакідаюць без тлумачэння падыходы да тых ці іншых сваіх сістэм класіфікацыі. Гэтая акалічнасць часам істотна ўскладняе параўнанне публікаваных матэрыялаў з тэрыторыі Украіны ці Беларусі з польскімі матэрыяламі, а таксама стварае цяжкасці для ўпэўненага ўспрымання зробленых на іх падставе высноў. Неабходна таксама звярнуць увагу на фактычнае розначытанне многіх тэрмінаў ва ўсходне-еўрапейскай літаратуры і параўнальна аднародную тэрміналагічнасць у працах польскіх калег.

Для вывучэння ЯнК важнае значэнне мае тыпалогія яніславіцкіх вастрый і няроўнабокіх прамавугольных трохвугольнікаў. Базавымі ў дадзеным выпадку з'яўляюцца напрацоўкі С. К. Казлоўскага. Яго вызначэнне і падзел на падтыпы яніславіцкіх вастрый цалкам прымаецца польскімі даследчыкамі. Альтэрнатыўны ж варыянт назвы – вастрыі тыпу Вялішаў – поўны сінонім, за якім не стаіць ніякага змястоўнага адрознення.

Усходнееўрапейскія аўтары не заўсёды прытрымліваліся арыгінальнай дэфініцыі гэтых вырабаў. Так, Д. Я. Цялегін яніславіцкімі называў толькі вастрыі з рэтушаванай асновай. Ён таксама вылучыў тып так званых «данецкіх вастрый», вызначэнне якіх адпавядае яніславіцкім вастрыям са зламанай асновай ([34, с. 53; 35, с. 10]; гл. таксама [33, с. 38]). Л. Л. Залізняк прапаноўваў тыпалогію яніславіцкіх вастрый, якая фактычна паўтарае класіфікацыйную схему С. К. Казлоўскага [6, с. 94]. Аднак у сваіх галоўных працах па мезаліце Палесся ён дзеліць гэтыя вырабы на дзве групы – з рэтушаванай і нерэтушаванай асновай, улічваючы іх як асобныя катэгорыі мікралітаў пры параўнаўчым аналізе комплексаў ЯнК з Украіны і Польшчы [7, с. 58, 70–73, 78; 8, с. 6–7]. Пэўным чынам такі падыход супярэчыць меркаванням С. К. Казлоўскага. Апошні, абапіраючыся на картаграфічныя аргументы, лічыў усе тры асноўныя разнавіднасці яніславіцкіх вастрый з папярочнай асновай (рэтушаванай, зламанай ці натуральнай) раўназначнымі для культурнай інтэрпрэтацыі [92, s. 140–142]. Р. Рыманцене залічвае яніславіцкія вастрыі да роз-

ных тыпаў і відаў «ланцэпадобных наканечнікаў (ланцэтаў)». У межах гэтага паняцця даследчыца разглядае і ўсе трохвугольнікі [31, с. 27–30].

Няроўнабокія трохвугольнікі С. К. Казлоўскі падзяліў на тыпы, сярод якіх два атрымалі назву «яніславіцкіх» і былі залічаныя да характэрных элементаў аднайменнай культуры (гл. вышэй заўвагу ў пункце 2). Іншыя даследчыкі ЯнК у сваіх працах альбо выкарыстоўвалі схему класіфікацыі трохвугольнікаў С. К. Казлоўскага без змен (напр. [65, s. 31; 99; 113]), альбо прымянялі ўласныя, аднак вельмі набліжаныя да яе [66; 111; 124]. Х. Венцкоўска і М. Марчак ужывалі спрошчаную схему падзелу трохвугольнікаў на раўнабедраныя і няроўнабокія, не падзяляючы на падтыпы, аднак звяртаючы асноўную ўвагу на іх прапорцыі [144, s. 70; 146; 149, s. 14]. Аналагічным чынам – на сіметрычныя нізкія (раўнабедраныя шырокія) і асіметрычныя высокія (няроўнабокія вузкія) – падзяліў трохвугольнікі Д. Я. Цялегін [33, с. 37–38; 34, с. 53; 35, рис. 1: *24*, *26*]. У працах Л. Л. Залізняка выкарыстоўваецца тэрмін «яніславіцкія трохвугольнікі», аднак без канкрэтызацыі значэння (гл. [7, 8]). Фактычна, у яго гэта катэгорыя аб'ядноўвае ўсе няроўнабокія трохвугольнікі выцягнутых прапорцый. Падобным чынам, мадыфікаваным у параўнанні з арыгінальнай канцэпцыяй С. К. Казлоўскага, ужывалі гэту назву і некаторыя іншыя ўсходнееўрапейскія даследчыкі (гл. напр. [22, 39]).

Заўважаныя розначытанні ў тыпалагічнай атрыбуцыі асобных катэгорый мікралітаў не надта прынцыповыя, аднак могуць мець уплыў на інтэрпрэтацыю матэрыялаў помнікаў ЯнК у межах аўтарскіх канцэпцый яе таксанамічнага падзелу, што больш падрабязна будзе разгледжана ніжэй.

Пэўная разнастайнасць адзначаецца і ў аналітычных працэдурах, скіраваных на тыпалагічнае параўнанне комплексаў ЯнК. Таксанамічныя пабудовы С. К. Казлоўскага грунтуюцца на прысутнасці альбо адсутнасці асобных элементаў мікралітычнага набору і на картаграфаванні гэтых элементаў [92]. На іншыя кампаненты крамянёвага інвентару даследчык звяртаў менш увагі. Х. Венцкоўска і М. Марчак [149, 144, 145] надавалі большае значэнне колькасным паказчыкам і тыпалагічнай структуры ўсяго комплексу. Большая вага катэгорый звычайных прылад (не мікралітаў) характэрна для інтэрпрэтацыйных разважанняў усходнеерапейскіх археолагаў.

Былі зроблены спробы выкарыстання статыстычных метадаў для апрацоўкі матэрыялаў. Так, С. К. Казлоўскі для ілюстрацыі сваіх высноў выкарыстоўваў кумуляцыйныя графікі (метад заснавальніка французскай тыпалагічнай школы Ф. Борда), складзеныя на падставе тыпаліста мікралітаў [87, s. 77–78]. Д. Я. Цялегін прапаноўваў ужываць для аналізу крамянёвых калекцый «метад дадавання адзнак» [33; 35, с. 14], у аснову якога быў пакладзены метад амерыканскіх даследчыкаў У. Робінсана і Дж. Брэйнарда [118; 17, с. 26–27]. На падставе гэтай методыкі Л. Л. Залізняк абгрунтаваў культурны падзел мезаліту Палесся [7, с. 67–83; 8, с. 5–10], а Т. Астраўскас – Літвы [113]. Статыстычныя метады (у першую чаргу непараметрычны тэст Калмагорава-Смірнова) выкарыстоўвалі Р. Шыльда і яго калегі для параўнання крамянёвага інвентару некаторых помнікаў ЯнК басейна Віслы [124].

3.2. Нетыпалагічныя даследаванні крамянёвага інвентару ЯнК: тэхналогія, сыравіна, функцыянальнае прызначэнне

У першай палове 1970-х гадоў, галоўным чынам намаганнямі Р. Шыльда і відавочна пад уплывам ідэй англасаксонскай «новай археалогіі», у польскай археалагічнай навуцы выкрышталізавалася новая канцэпцыя даследавання помнікаў мезалітычнай эпохі. Указваючы на непрадуктыўнасць, значную абмежаванасць інтэрпрэтатыўных магчымасцей «культурнай» таксаноміі, а таксама на метадычныя хібы ў практычным выкарыстанні традыцыйных сродкаў тыпалагічнага аналізу, калектыў даследчыкаў пад кіраўніцтвам Р. Шыльда прапанаваў «шматаспектны аналіз адкрытых пясчаных стаянак» [124]. Гэты падыход прадугледжвае камбінаванае выкарыстанне ў ходзе даследавання разнастайных метадаў: аналізу агульнай структуры крамянёвага інвентару (дынамічнай тэхналагічнай класіфікацыі), марфалагічнага аналізу рэтушаваных форм, спалучанага са статыстычным аналізам колькасных параметраў, трасалагічнага аналізу прылад працы, аналізу прасторавай структуры распаўсюджвання знаходак на помніку (планіграфіі) і палеагеаграфічнага аналізу. Такое па магчымасці поўнае і ўсебаковае вывучэнне крамянёвага інвентару і кантэксту яго залягання дазволіла выйсці на больш грунтоўны ўзровень інтэрпрэтацыі археалагічных фактаў. У цытаванай працы даследчыкі апублікавалі вынікі аналізу шэрагу познамезалітычных комплексаў, якія залічваліся пераважна да ЯнК, і прыйшлі да высновы, што пэўныя адрозненні ці падабенства паміж імі ў тыпалагічным і тэхналагічным плане абумоўлены разнастайнымі чыннікамі – не толькі «культурнай традыцыяй» і храналогіяй, але і ў вельмі значнай ступені фактарамі функцыянальнага характару і асаблівасцямі сацыяльна-гаспадарчай сістэмы чалавечых груп, што пакінулі пасля сябе гэтыя помнікі [124, s. 114–126].

Цытаваная тут праца вельмі моцна паўплывала на польскіх даследчыкаў мезаліту. Да поўнага заняпаду тыпалагічна-параўнаўчых даследаванняў і культурнай праблематыкі справа не дайшла, аднак акцэнты ў даследчай праблематыцы значна змясціліся ў бок тэхналогіі крэмнеапрацоўкі, а таксама аспекту выкарыстання сыравінных рэсурсаў.

3.2.1. Вывучэнне тэхналогіі крэмнеапрацоўкі ЯнК

Першыя спробы характарыстыкі элементаў тэхналогіі крэмнеапрацоўкі ЯнК рабіліся яшчэ да вылучэння гэтай адзінкі і прадстаўлены ў артыкуле, які прысвячаўся публікацыі пахавальнага комплексу ў Яніславіцах [52]. М. Хмялеўска, паралельна вельмі падрабязнаму апісанню марфалогіі крамянёвых вырабаў (нуклеусаў, пласцін-нарыхтовак і мікралітаў), адзначае і пэўныя тэхналагічныя асаблівасці апрацоўкі крэменю – падрыхтоўку і падпраўку пляцовак знойдзеных нуклеусаў, прышліфоўку карнізаў, востры працоўны вугал, – а таксама спрабуе вызначыць метад атрымання сколаў-нарыхтовак [52, s. 26–34, 44–45].

С. К. Казлоўскі, у першым манаграфічным даследаванні ЯнК, закрануў і некаторыя тэхналагічныя аспекты яе індустрыі. Даследчык апісаў нуклеусы, прызнаўшы ў якасці характэрных для ЯнК аднапляцовачныя экзэмпляры ад рэгулярных пласцін з плоскай ці злёгку выпуклай адшчэпняй, адзначыў асаблівасці іх уступнай апрацоўкі, даў агульную характарыстыку пласцін з яніславіцкіх комплексаў, указаў на асаблівасці стратэгіі выбару нарыхтовак для розных тыпаў прылад, а таксама агучыў меркаванне пра тэхніку атрымання пласціністых сколаў-нарыхтовак (удар праз пасярэднік) і вызначыў характэрныя тэхнічныя прыёмы другаснай апрацоўкі [92, s. 136–140].

На працягу другой паловы 1970-х – пачатку 1980-х гадоў больш паглыблена, хоць і не сістэматычна, да праблематыкі тэхналогіі ЯнК звяртаўся шэраг польскіх даследчыкаў. Так, працэс падрыхтоўкі і эксплуатацыі нуклеусаў і вырабу прылад, звязаных з ЯнК, быў прааналізаваны Б. Гінтэрам у артыкуле, які прысвячаўся публікацыі матэрыялаў стаянкі Данброўка 3 [69].

Дэталёвы паўторны аналіз інвентару пахавання з Яніславіц дазволіў К. Цырэку ахарактарызаваць прыёмы падрыхтоўкі і эксплуатацыі нуклеусаў і працэс атрымання пласцін-нарыхтовак [53, s. 216–220]. Таксама даследчык прапанаваў цікавую версію рэканструкцыі спосабу вытворчасці яніславіцкіх мікралітаў – вастрый і трохвугольнікаў [53, s. 220–223; 54; 61]. Гэтае пытанне пазней дыскутавалася ў літаратуры [147, 58]. На пэўныя характэрныя рысы тэхналогіі ЯнК і яе асобных помнікаў К. Цырэк звяртаў увагу яшчэ ў адной публікацыі [55, s. 22–50, 85].

К. Шымчак на аснове морфаметрычнага аналізу паспрабаваў вызначыць асаблівасці «тэхналагічнага стылю» ЯнК у вытворчасці пласціністых нарыхтовак [132].

Важным крокам у тэхналагічных даследаваннях ЯнК стаў распрацаваны Р. Шыльдам метад так званай дынамічнай тэхналагічнай класіфікацыі [124, s. 12–21; 123]. Гэты метад прадугледжвае класіфікацыю ўсіх элементаў крамянёвых комплексаў паводле спецыяльна падрыхтаваных тыпалістоў і ў межах груп, што адпавядаюць розным этапам тэхналагічнага працэсу – ад выбару сыравіны і ўступнай апрацоўкі канкрэцый да завершаных марфалагічных прылад, – і статыстычны аналіз выяўленай такім чынам агульнай структуры інвентару. У выніку праведзенай дынамічнай класіфікацыі для аналізу матэрыялаў вялікай групы яніславіцкіх помнікаў Польшчы, была прасочана залежнасць розніцы паміж комплексамі ад асаблівасцей арганізацыі гаспадарання сыравіннымі рэсурсамі і функцыянальнага прызначэння стаянак [124, s. 62–74, 114–126]. Пэўныя назіранні за тэхналагічнымі асаблівасцямі крамянёвай індустрыі ЯнК, у прыватнасці морфаметрычны аналіз дэбітажу ці інтэрпрэтацыя тэхнікі атрымання нарыхтовак, у названай працы зроблены і па-за межамі аналізу вынікаў дынамічнай класіфікацыі і прадстаўлены паралельна апісанню матэрыялаў [124, s. 127–202].

Метад дынамічнай класіфікацыі атрымаў шырокае прызнанне сярод польскіх даследчыкаў (гл. напр. [78]), неаднаразова выкарыстоўваўся для вывучэння матэрыялаў яніславіцкіх помнікаў (гл. напр. [65, 102, 125]), а яго пазнавальныя магчымасці для тэхналагічных рэканструкцый абмяркоўваліся ў літаратуры [48, s. 22, 31–33; 137].

Фундаментальнае даследаванне тэхналогіі крэмнеапрацоўкі ЯнК было здзейснена М. Вонсам у пачатку XXI стагоддзя [136–138]. З дапамогай метаду складанак[1] і канцэпцыі «ланцужка аперацый»[2] (*châine opératoire*) даследчык рэканструяваў стратэгіі крэмнеапрацоўчай вытворчасці на трох яніславіцкіх стаянках басейна Віслы – Дэнбы 29, Гвозьдзец 9 і Вістка Шляхэцка III/60. Аналіз атрыманых складанак, дапоўнены морфаметрычным аналізам артэфактаў, дазволіў апісаць характэрныя прыёмы і метады падрыхтоўкі нуклеусаў, атрымання нарыхтовак, вырабу прылад працы, а таксама ахарактарызаваць агульную тэхналагічную канцэпцыю крамянёвай індустрыі ЯнК. Даследчыкам была выяўлена паўтаральнасць апошняй для розных комплексаў ЯнК, спародненасць якіх вызначалася да гэтага толькі на падставе тыпалагічных крытэрыяў [137]. Аналітычнае даследаванне М. Вонса дапаўнялася эксперыментальным мадэляваннем эксплуатацыі ў націскной тэхніцы алоўкападобнага нуклеуса ад мікрапласцін, аналагічнага вырабам са стаянкі Дэнбы 29. Эксперыменты праводзіліся сумесна з В. Мігалем [106].

[1] Падрабязней пра метад складанак, ці рэмантажны метад, гл. напр. [63, 135]. Складанкі яніславіцкіх матэрыялаў падбіраліся і спарадычна выкарыстоўваліся даследчыкамі пры аналізе прасторавай арганізацыі помнікаў і для апісання элементаў тэхналогіі і раней (гл. [52, 69, 124, 125, 102, 65]).

[2] Пра канцэпцыю *châine opératoire* гл. напр. [73, 105, 126].

3.2.2. Сыравінны аспект

Важным аспектам вывучэння розных відаў першабытнай супольнасці з'яўляецца сістэма гаспадарчага выкарыстання сыравінных рэсурсаў. Пытанні, звязаныя са здабычай і распаўсюджваннем крамянёвай сыравіны, трапілі ў поле зроку польскіх археолагаў яшчэ ў першыя дзесяцігоддзі XX стагоддзя (напр. [97, 98]), а з канца 1960 – пачатку 1970-х гадоў даследаванні ў гэтым накірунку пачалі набываць сістэмны характар (гл. [46, 75, 122, 47]).

Названая праблематыка, аднак, у абагульняючых працах па ЯнК практычна не прадстаўлена і разглядаецца толькі мімаходзь [12, с. 134; 92, s. 138, 154; 96, p. 33, 157; 145, s. 410]. Значная ўвага ролі сыравіннага фактару пры аналізе яніславіцкіх комплексаў, як ўжо адзначалася вышэй, была нададзена ў працы Р. Шыльда і суаўтараў 1975 г. [124].

Грунтоўнае манаграфічнае вывучэнне пытанняў, звязаных з выкарыстаннем разнастайных гатункаў крэменю мезалітычнымі супольнасцямі, у тым ліку і ЯнК, на тэрыторыі Польшчы, здзейсніў К. Цырэк. Вынікі гэтага даследавання былі прадстаўлены аўтарам у канцы 1970-х ггадоў у якасці доктарскай дысертацыі і публікаваліся ў пачатку 1980-х гадоў [55, 56].

К. Цырэк выявіў асаблівасці сыравіннай структуры крамянёвых комплексаў у розных рэгіёнах даследаванага абшару – басейнах Віслы і верхняй Варты. На падставе гэтага даследчык прапанаваў вылучэнне шэрагу так званых сыравінных правінцый – тэрыторый з асаблівымі наборамі гатункаў крэменю, што выкарыстоўваліся ў мезаліце. Была зроблена спроба рэканструяваць шляхі і механізмы распаўсюджвання шакаладнага, свецяхоўскага, юрскага, балтыйскага крэменю[1] і некаторых іншых гатункаў сыравіны. Даследчык прасачыў асаблівасці марфалогіі крамянёвых вырабаў і тэхналогіі крэмнеапрацоўкі розных яніславіцкіх комплексаў у залежнасці ад гатунку выкарыстанага крэменю. Была выяўлена схільнасць носьбітаў ЯнК да выкарыстання па магчымасці добраякаснай сыравіны – шакаладнага і свецяхоўскага крэменю. Апошні выкарыстоўваўся актыўна, але лакальна, у наваколлі (да 70 км) выхадаў. Шакаладны крэмень сустракаецца на многіх яніславіцкіх помніках па ўсім басейне верхняй і сярэдняй Віслы, яго высокая ўдзельная вага сярод іншых гатункаў адзначаецца ў радыусе да 160 км ад выхадаў, хаця ёсць выпадкі і больш дальняга распаўсюджвання.

У сярэдзіне 1980-х гадоў пабачыла свет манаграфія, падрыхтаваная калектывам Р. Шыльда і прысвечаная вынікам вывучэння цэнтра па здабычы шакаладнага крэменю ў Тамашове. У працы публікаваліся матэрыялы стаянкі Тамашоў 2, якую даследчыкі вызначылі ў якасці крэмнеапрацоўчай майстэрні ЯнК, дзе вялася першасная апрацоўка сыравіны і падрыхтоўка прануклеусаў [125, s. 123–157, 171–184].

Пытанне аб асаблівай ролі шакаладнага крэменю ў крамянёвай індустрыі ЯнК даволі падрабязна разглядалася К. Цырэкам (вышэй цытаваны артыкул і [57]). Распаўсюджванне шакаладнага і іншых так званых усходнелысагорскіх гатункаў крэменю ў мезалітычных інвентарах паўднёва-ўсходняй Польшчы вывучаў Е. Лібэра [99, s. 23–24; 100, s. 43–44; 101, s. 26–29].

У выніку даследавання тэхналогіі крэмнеапрацоўчай вытворчасці ЯнК, якое ажжыццявіў М. Вонс, была выяўлена пэўная залежнасць стратэгіі крэмнеапрацоўкі на асобных помніках культуры ад сыравіны, якая выкарыстоўвалася [137, s. 209–210, 220–227; 138]. Тэхналагічная перспектыва дазволіла даследчыку прыйсці да цікавых высноў аб механізмах распаўсюджвання крамянёвай сыравіны (у першую чаргу шакаладнага крэменю) у межах яніславіцкай супольнасці [139, 140].

Праблемы дальняга распаўсюджвання неарганічных сыравінных матэрыялаў (крэменю, абсадыяну, гематыту і інш.) на тэрыторыі Польшчы і прылеглых рэгіёнаў у эпохі палеаліту і мезаліту даследавала З. Сульгастоўска [130, 131]. Аналізуючы вырабы з імпартных гатункаў, якія адзначаліся на адлегласці больш за 200 км ад радовішчаў, даследчыца спрабавала асвятліць пытанні сацыяэканамічных кантактаў у першабытным грамадстве [130].

3.2.3. Функцыянальны аналіз

Практычна не аналізаванымі на дадзены момант застаюцца матэрыялы ЯнК з пункту гледжання функцыянальнага даследавання з дапамогай трасалогіі – метаду, які актыўна развіваецца ў расійскай, амерыканскай і заходнееўрапейскай археалогіі, пачынаючы з сярэдзіны XX ст. Першая спроба вывучэння слядоў ужывання і інтэрпрэтацыі функцыі крамянёвых прылад ЯнК, была зроблена яшчэ ў 1970-я гады [124, s. 32–36], аднак, дала вельмі абмежаваныя вынікі. Больш грунтоўныя трасалагічныя даследаванні былі праведзены толькі для некаторых знаходак з помнікаў тэрыторыі Беларусі, Украіны і Польшчы – асобных матэрыялаў са стаянкі Дэнбы 29 [190], а таксама адзінкавых артэфактаў ЯнК з імпартаваных гатункаў крэменю [151]. З прычыны адзінкавасці прэцэдэнтаў, вынікі гэтых прац пакуль не даюць сур'ёзных інтэрпрэтацыйных магчымасцей.

[1] Пра гатункі крэменю, што распаўсюджаны на тэрыторыі Польшчы гл. працы [70, s. 16–28; 56; 127, s. 29–35; 130, s. 19–28].

4. Некаторыя праблемы таксанамічнай атрыбуцыі і падзелу крамянёвых комплексаў ЯнК

Да найчасцей разглядаемых праблем у даследаваннях ЯнК адносяцца наступныя: унутраны падзел і таксанамічны статус ЯнК, храналогія, паходжанне і гістарычны лёс яе носьбітаў. Падрабязны аналіз усіх гэтых пытанняў у межах дадзенага артыкула не падаецца магчымым. Таму для апошніх трох аўтар абмяжуецца толькі адсылкамі да літаратуры. Больш дэталёва будзе разгледжана праблематыка таксанамічнага ўпарадкавання крамянёвых комплексаў ЯнК[1]. Нельга абысці ўвагай і некаторыя пытанні, звязаныя з прадстаўленымі ў літаратуры альтэрнатыўнымі варыянтамі культурнай атрыбуцыі яніславіцкіх старажытнасцей.

4.1. Гістарыяграфічны агляд праблем унутранага падзелу і таксанамічнага статуса ЯнК[2]

Даследчыкі звярталі ўвагу на некаторыя адрозненні ў складзе крамянёвага інвентару комплексаў ЯнК. Пэўным тыпалагічным адрозненням, у першую чаргу ў мікралітычным наборы, надавалася значэнне розніцы храналагічнага і філагенетычнага характару. А ў адпаведнасці з заўважанымі заканамернасцямі геаграфічнага распаўсюджання асобных тыпаў вырабаў і іх ўзаемасустракальнасці былі зроблены спробы рэгіянальнага падзелу ЯнК. Паралельна вялася дыскусія пра таксанамічны статус яніславіцкай супольнасці і яе лакальных груп.

С. К. Казлоўскі вызначыў у складзе крамянёвага інвентару так званы базавы кампанент (*człon podstawowy*) – першасныя культуравызначальныя элементы. Яніславіцкі базавы кампанент складалі яніславіцкія вастрыі з папярочнымі асновамі і вялікія яніславіцкія трохвугольнікі. Іншым характэрным для ЯнК мікралітам адводзілася роля храналагічных індыкатараў альбо вызначальнікаў прыналежнасці да адной з тэрытарыяльных адзінак, названых «культурнымі групамі» [92, s. 140–146]. У складзе ЯнК даследчык вылучыў тры культурныя групы [92, s. 157–158, mapa 19]:

Група Вістка (ад стаянкі Вістка Шляхэцка III/60) характарызуецца наяўнасцю малых яніславіцкіх трохвугольнікаў і нізкіх трапецый. Вістэцкія помнікі канцэнтруюцца ў левабярэжжы сярэдняга цячэння Віслы і на поўначы Малапольшчы, адзінкава прадстаўлены ў сярэднім цячэнні Нарава і Буга, а таксама на сярэдняй Варце.

Усходняя група вылучаецца сталай прысутнасцю высокіх трапецый і значнай колькаснай перавагай яніславіцкіх вастрый над трохвугольнікамі пры адсутнасці малых яніславіцкіх трохвугольнікаў і нізкіх трапецый. Яе комплексы знаходзілі ў Малапольшчы, у басейнах сярэдняй Віслы, Буга, верхняй Прыпяці і Нёмана.

Група Максімоніс (ад стаянкі Максімоніс 4 у Літве) мае ўсе характэрныя рысы ўсходняй групы і адрозніваецца наяўнасцю ў складзе інвентару яніславіцкіх вастрый з падрэзанымі рэтушшу асновамі. Яе арэал абмяжоўваецца да сярэдняга цячэння Нёмана і, магчыма, часткова распаўсюджваецца на тэрыторыю паўночна-ўсходняй Польшчы.

Наяўнасць комплексаў (пры гэтым даволі шматлікіх – гл. [92, mapa 19]), у якіх прысутнічаюць элементы, характэрныя і для вістэцкай, і для ўсходняй груп, была патлумачана існаваннем кантактнай зоны на памежжы кампактных арэалаў гэтых груп.

Найбольш ранняй С. К. Казлоўскі лічыў групу Максімоніс, якую ўключаў у скандынаўскую супольнасць паўночнага культурнага кола [92, s. 223][3]. Яе храналогія вызначалася ў межах барэальнага перыяду. Паводле даследчыка, у канцы барэалу, у выніку міграцыі носьбітаў групы Максімоніс на паўднёвы захад, узніклі ўсходняя і, пад моцным другасным уплывам паўночных (маглемозкіх) традыцый, вістэцкая групы, якія існавалі пазней на працягу атлантычнага часу [92, s. 161, 162, 225].

Таксама С. К. Казлоўскі звярнуў увагу на знаходкі яніславіцкіх вастрый у сярэднім і ніжнім цячэнні Прыпяці, Сярэднім Падняпроўі і над Северскім Данцом. Даследчык выказаў меркаванне аб магчымым існаванні на гэтай тэрыторыі «культурнай адзінкі, роднаснай яніславіцкай культуры», прадстаўленай комплексамі «тыпу Каменная» (ад стаянкі Каменная I на Валынскім Палессі, гл. [119, s. 145–146, tabl. II: *53–84*, III: *85–152*]). Пад гэтай назвай былі аб'яднаны стаянкі, у інвентары якіх яніславіцкім вастрыям спадарожнічаюць «постсвідэрскія» наканечнікі стрэл («кундскія» паводле

[1] У дыскусіі аб паходжанні ЯнК распрацоўваюцца дзве асноўныя версіі: паўночна-заходняя, звязаная з культурай Маглемозэ, і паўднёва-ўсходняя – вытокі ЯнК шукаюць у культурных імпульсах з Прычарнамор'я (падрабязней гл. [7, с. 101–102; 8, с. 38–39; 10, с. 191; 11, с. 84–88; 12, с. 135–137; 21, с. 190; 64, s. 44–46; 67, s. 356–362; 68; 92, s. 161–162; 96, p. 163; 113; 145, s. 389]). Праблема знікнення ці трансфармацыі ЯнК звязана з працэсам неалітызацыі і з'яўлення першых керамічных культур у лясной зоне цэнтральна-ўсходняй Еўропы. Пра сувязь яніславіцкага крамянёвага інвентару і керамікі «ляснога» тыпу глядзі [10, с. 191–192; 12, с. 138; 13; 59; 60; 92, s. 226–229; 96, p. 164; 113]). Зрэшты, падобныя меркаванні крытыкаваліся [66; 77, s. 86; 133, 128–129], і сёння немагчыма лічыць праблему хоць у нейкай ступені вырашанай.

[2] Гэтую тэму даволі дэталёва разглядаў К. Шымчак у адным са сваіх артыкулаў [134]. Аднак, з улікам малой даступнасці цытаванай публікацыі для айчыннага чытача, аўтар лічыць мэтазгодным падрабязна разгледзець гістарыяграфію названага пытання і ў дадзенай працы.

[3] Гл.: [92, s. 223–224; 93; 79].

тыпалогіі С. К. Казлоўскага) пры адсутнасці яніславіцкіх трохвугольнікаў [91, s. 68; 92, s. 158].

Асноўныя палажэнні адносна ЯнК, сфармуляваныя ў пачатку 1970-х гадоў, С. К. Казлоўскі неаднаразова паўтараў у пазнейшых працах, хоць і з невялікімі карэкціроўкамі [79, s. 318–321; 80, s. 232–240; 93, p. 74–75]. У прыватнасці, ён выключыў ЯнК з культур паўночнага кола і разглядаў яе ў якасці «незалежнай адзінкі, якая не мае сувязі з ніводным культурным колам, сярод разгледжаных у кнізе» [80, s. 232].

Х. Венцкоўска прапанавала свой варыянт разумення яніславіцкіх старажытнасцей. У складзе вісляньскага цыклу яна вылучыла дзве індустрыі – бялкоўскую і вістэцкую [145, s. 380–383]. Характарыстыка гэтых індустрый адлюстроўвала адрозненні ў колькасных суадносінах паміж асобнымі катэгорыямі крамянёвых вырабаў у складзе інвентару дзвюх стаянак – Вялішаў XIII і Вістка Шляхэцка III/60, паводле матэрыялаў якіх яны вылучаліся. Сутнасць гэтых адрозненняў не тлумачылася, за выключэннем дапушчэння аб магчымай больш ранняй храналогіі бялкоўскай індустрыі. Прапановы Х. Венцкоўскай наконт унутранага падзелу вісляньскага цыклу не атрымалі далейшага развіцця.

Пад уплывам прац польскіх даследчыкаў на яніславіцкую праблематыку звярнулі ўвагу і іх усходнееўрапейскія калегі. Маскоўскі археолаг Л. У. Кальцоў вылучыў помнікі з яніславіцкімі элементамі на тэрыторыі Літвы, Беларусі і Украіны [20]. Ён прапанаваў свой пункт гледжання на падзел ЯнК, згодна з якім уласна яніславіцкай культурай з'яўляецца толькі вістэцкая група. На яго думку, групы ўсходняя і Максімоніс, у крамянёвым інвентары якіх ён бачыў выразныя сляды «эпісвідэрскіх» уплываў, значна «адрозніваюцца і ўтвараюць як быццам асобную культуру (яе можна было б назваць культурай Максімоніс)». Абедзве культуры (уласна яніславіцкая і Максімоніс) былі аб'яднаны ў межах «яніславіцкай культурнай вобласці» [20, с. 66–67]. Аднак ужо ў наступнай сваёй працы – аглядзе фінальнага палеаліту і мезаліту Паўднёвай і Усходняй Прыбалтыкі – Л. У. Кальцоў не згадваў свае ранейшыя прапановы, а пісаў пра немагчымасць вылучэння тэрытарыяльных і храналагічных груп (апроч стаянкі Максімоніс 4) у межах ЯнК [21, с. 190–192]. Гэтыя асцярожныя меркаванні ён паўтарыў і пазней [22].

У другой палове 1970-х гадоў кіеўскі даследчык Л. Л. Залізняк вылучыў шэраг комплексаў з тэрыторыі паўднёва-ўсходняга Палесся, у матэрыялах якіх прысутнічаюць характэрныя для ЯнК элементы. Спачатку ён разглядаў іх як помнікі тыпу ДВС, а пазней як рудаастроўскую культуру [4, с. 30–34; 5; 7, с. 44–58, 78–81, 97–104]. За кошт апошняй (назву атрымала ад стаянкі Руды Востраў на Кіеўшчыне) Л. Л. Залізняк пашырыў прапанаванае Л. У. Кальцовым [20] паняцце яніславіцкай культурнай вобласці. У яе складзе даследчык вылучаў тры асобныя культуры [7, с. 100–101, рис. 39]: яніславіцкую у басейнах Віслы, Буга і верхняй Прыпяці (большы ўдзел у інвентарах яніславіцкіх трохвугольнікаў, нізкіх і сярэдневысокіх трапецый, наяўнасць чатырохвугольнікаў); Максімоніс у паўночна-ўсходняй Польшчы і басейне Нёмана (распаўсюджанасць ромбападобных яніславіцкіх вастрый з падрэзанай асновай, выразныя серыі разцоў і цёслаў); і рудаастроўскую ў Кіева-Жытомірскім Палессі, ніжнім цячэнні Прыпяці і на прылеглым участку даліны Дняпра (слабы ўдзел яніславіцкіх трохвугольнікаў і вастрый з рэтушаванай асновай, вялікая роля трапецый, асабліва высокіх, прысутнасць наканечнікаў на пласцінах і выразных серый скрабкоў правільнай формы, знаходкі кукрэкскіх укладышаў, адносна нізкі паказчык пласціністасці комплексаў і няўстойлівыя формы нуклеусаў). На думку Л. Л. Залізняка фармаванне познамезалітычных яніславіцкай і рудаастроўскай культур звязана з міграцыяй у паўднёвым кірунку носьбітаў культуры Максімоніс, якая існавала яшчэ ў раннім мезаліце. А наканечнікі стрэл на пласцінах і кукрэкскія ўкладышы ў складзе інвентару рудаастроўскай культуры павінны сведчыць адпаведна пра яе «постсвідэрскі» і «постарэнсбурскі» субстрат і культурныя ўплывы з поўдня [7, с. 101–102].

У канцы 1980-х гадоў С. К. Казлоўскі прапанаваў абноўленую версію сваіх поглядаў на мезаліт Польшчы, у тым ліку і ў дачыненні да ЯнК [96, p. 154–167]. Услед за Л. У. Кальцовым [20] і Л. Л. Залізняком [7] ён вызначыў яніславіцкую супольнасць як тэхнакомплекс, які ўключаў тры культуры – яніславіцкую (з вістэцкай і ўсходняй групамі), Максімоніс і рудаастроўскую. Характарыстыка гэтых таксонаў у цэлым паўтарае прапанаваныя раней, хоць і з некаторымі карэкціроўкамі. Так, у якасці адметных рыс усходняй групы С. К. Казлоўскі дадаткова пералічыў сталую прысутнасць укладышаў тыпу Боркі і адзінкавыя знаходкі цёслаў і пласцінак з прытупленай спінкай. Рудаастроўскую культуру, у вылучэнні якой даследчык бачыў развіццё сваіх ранейшых прапаноў наконт «комплексаў тыпу Каменная», мусіць характарызаваць наяўнасць разам з яніславіцкімі вастрыямі чаранковых наканечнікаў стрэл і вастрый з прытупленай спінкай – ланцэтападобных і тыпу Ставінога [96, p. 160–161]. Да рудаастроўскай культуры С. К. Казлоўскі залічыў і помнікі з яніславіцкімі вастрыямі з-над Северскага Данца. Яго меркаванне разыходзіцца з поглядамі ўкраінскіх даследчыкаў, якія вылучалі на згаданай тэрыторыі своеасаблівую данецкую культуру [1; 10, с. 192–198; 11, с. 89–92; 35, с. 179–185; 36, с. 103–105]. Наяўнасць жа ў складзе яе інвентару яніславіцкіх вастрый (данецкіх, паводле тэрміналогіі

Д. Я. Цялегіна) тлумачыцца культурнымі ўплывамі з боку ЯнК.

Яшчэ адзін польскі аўтар, Л. Даманьска, у дачыненні да яніславіцкіх старажытнасцей уводзіць уласнае паняцце – яніславіцка-рудаастроўскае кола (у цэлым сінанімічнае «яніславіцкаму тэхнакомплексу» С. К. Казлоўскага), якое складаецца з яніславіцкай, рудаастроўскай, данецкай культур і культуры Максімоніс [64, s. 39]. Даследчыца прыняла для яніславіцкай культуры характарыстыку, прапанаваную С. К. Казлоўскім [92, 96], для рудаастроўскай – Л. Л. Залізняка [7], данецкай – Д. Я. Цялегіна [35]; а таксама адзначыла досыць слабы ўзровень даследаванасці данецкай культуры і культуры Максімоніс, што не дазваляе ўпэўнена казаць аб іх храналогіі, генэзісе і тэрытарыяльным распаўсюджанні [64, s. 39–44].

Схему рэгіянальнага падзелу яніславіцкай супольнасці перапрацаваў К. Шымчак. У сваёй манаграфіі, якая прысвячалася каменнаму веку паўночна-ўсходняй Польшчы, ён прымаў канцэпцыю яніславіцкага культурнага кола, у межах якога ўслед за Л. Л. Залізняком [7] вылучаў тры меншыя адзінкі з рангам культуры: 1) уласна яніславіцкую культуру ў цэнтральнай і паўднёва-ўсходняй Польшчы, якая збольшага адпавядае групе Вістка; 2) рудаастроўскую культуру на поўдні Беларусі і поўначы Украіны, у асноўным адпаведнік «комплексаў тыпу Каменная» С. К. Казлоўскага; 3) паўночнаяніславіцкую культуру ў паўночна-ўсходняй Польшчы, Літве і паўночна-заходняй Беларусі, уведзеную замест «культуры Максімоніс», якая, аднак, на думку К. Шымчака, у большай ступені адпавядае ранейшай «усходняй групе» С. К. Казлоўскага, чым «групе Максімоніс» [133, s. 121–122, 127].

Своеасаблівасць паўночнаяніславіцкай культуры вызначаюць вастрыі тыпу Вялішаў з падрэзанай асновай, ромбы, мікралітычныя пласцінкі з дробнарэтушаванымі бакамі, цёслы, разцы, даволі значны ўдзел скрабкоў, а таксама шэраг элементаў, якія даследчык звязвае з уплывамі кундскай культуры – укладышы тыпу Боркі, аднапляцовачныя нуклеусы ад вельмі рэгулярных пласцін і адзінкавыя наканечнікі стрэл на пласцінах, – і кудлаеўскай культур – мікралітычныя пласцінкі з прытупленым рэтушшу краем, у тым ліку вастрыі тыпу Ставінога [133, s. 126]. У межах паўночнаяніславіцкай культуры К. Шымчак вылучыў дзве групы помнікаў, што мусяць адпавядаць дзвюм храналагічным фазам у развіцці культуры. Малодшая з іх вылучаецца значным змяншэннем удзелу ў складзе інвентару вастрый тыпу Вялішаў, яніславіцкіх трохвугольнікаў, пласцінак з прытупленым рэтушшу краем і адначасовым узрастаннем ролі пласцінак са скошаным канцом, трапецый, пласцінак з дробнарэтушаванымі бакамі, ромбаў. Пры гэтым адзначаецца выразная мікралітоіднасць апошніх катэгорый вырабаў, як і змяншэнне памераў скрабкоў і скрабачоў. Такая асаблівасць тлумачыцца зменай стратэгіі выбару сыравіны – замест выкапнёвага ці старанна адабранага марэннага крэменю ўжываліся дробныя канкрэцыі абломачнага матэрыялу [133, s. 127–128].

Тым часам Л. Л. Залізняк таксама працягваў распрацоўку праблематыкі ЯнК. У манаграфіі мезаліту Палесся, выдадзенай у 1991 г., аўтар раскрытыкаваў канцэпцыю культурных колаў і выказаўся аб адсутнасці дастатковых падстаў для выдзялення ў складзе, у тым ліку яніславіцкай супольнасці, асобных археалагічных культур [8, с. 10, 38]. Тым не менш даследчык вылучыў некалькі лакальных варыянтаў у межах «адзінай» ЯнК [8, с. 38]: цэнтральны (усходняя група паводле С. К. Казлоўскага), паўночны (група Максімоніс), заходні (група Вістка) і ўсходні (рудаастроўская культура, паводле Л. Л. Залізняка, альбо днепра-прыпяцкая паводле Д. Я. Цялегіна). У сваіх пазнейшых працах Л. Л. Залізняк пакідае гэты варыянт схемы рэгіянальнага падзелу ЯнК практычна без змен [9, с. 6; 10, с. 185–187; 11, с. 84; 12, с. 134–135].

На пачатку 2000-х гадоў выйшла грунтоўная манаграфія польскага даследчыка Т. Галіньскага, прысвечаная мезаліту Еўропы, у тым ліку ліку і ЯнК [67]. Яніславіцкі тэхнакомплекс, паводле Т. Галіньскага, аб'ядноўвае «класічныя комплексы ў басейне Віслы і верхняй Варты, комплексы групы Максімоніс, значную частку інвентароў, якія Л. Л. Залізняк залічваў да "рудаастроўскага варыянта", інвентары з вастрыямі тыпу Вялішаў з тэрыторыі Валыні, а таксама частку інвентароў, якія С. К. Казлоўскі звязвае з пянькоўскай групай хойніцка-пянькоўскай культуры» [67, s. 276]. У межах яніславіцкай супольнасці Т. Галіньскі вылучыў чатыры групы помнікаў [67, s. 280–289]: 1) комплексы групы Максімоніс (у Літве, заходняй Беларусі, заходняй Украіны, паўночна-ўсходняй Польшчы, Мазовіі і Падляшшы, на захадзе максімальна да Віслы і сярэдняга Буга); 2) класічныя яніславіцкія комплексы (на тэрыторыі цэнтральнай Польшчы, Куявіі, у прывісленскім Памор'і, у Мазовіі, на Падляшшы і ў Малапольшчы, з максімальным распаўсюджаннем на захад да тэрыторыі ўсходняй і цэнтральнай Вялікапольшчы і ва ўсходнім кірунку – на Валыні); 3) комплексы тыпу Старыя Баракі (на Мазовіі, у цэнтральнай і Малапольшчы); 4) комплексы, у якіх дамінуюць трапецыі. Першыя дзве, у сваю чаргу, падзяляюцца на ранія комплексы, у якіх адсутнічаюць трапецыі, і познамезалітычныя помнікі з трапецыямі. «Класічныя» комплексы адрозніваюцца ад помнікаў тыпу Максімоніс адсутнасцю яніславіцкіх вастрый з падрэзанай асновай і значна большым удзелам трохвугольнікаў у мікралітычным наборы (у групе Максімоніс яніславіцкія вастрыі пераважаюць

над трохвугольнікамі). Комплексы тыпу Старыя Баракі даследчык характарызуе моцным развіццём тэхналагічна-тыпалагічнага стылю C[1]. Чацвёртая з вылучаных Т. Галіньскім груп, у інвентарах якой мікраліты прадстаўлены пераважна ці выключна трапецыямі, мусіць адлюстроўваць фінальны этап развіцця яніславіцкага тэхнакомплексу. Арэал распаўсюджвання яе помнікаў аўтар не акрэслівае, але ў спісе вайжнейшых комплексаў фігуруюць стаянкі з Мазовіі, Малапольшчы і Украінскага Палесся.

Як відаць з вышэйпрыведзенага агляду, даследчыкі прапанавалі даволі стракатую палітру канцэпцый рэгіянальнага падзелу ЯнК. З аднаго боку, усе яны развіваюць ідэі, сфармуляваныя С. К. Казлоўскім у манаграфіі 1972 г., з другога – ў пэўных момантах супярэчаць ім і адна адной.

4.2. Крытычны аналіз канцэпцый тыпалагічнага і таксанамічнага падзелу крамянёвых комплексаў ЯнК

Найбольш спрэчнай выглядае ***група Максімоніс***. Першапачаткова, пры яе вылучэнні С. К. Казлоўскі выказваў пэўныя перасцярогі. Зрэшты, назва замацавалася ў літаратуры. Існуюць разыходжанні ў вызначэнні яе арэалаў. С. К. Казлоўскі абмяжоўваў яго да сярэдняга цячэння Нёману (тэрыторыя Літвы) і, магчыма, суседняй часткі паўноўчна-ўсходняй Польшчы. Л. Л. Залізняк распаўсюджвае яе на тэрыторыю ўсяго Панямоння, у тым ліку беларускага – частку тэрыторыі ўсходняй групы. Т. Галіньскі таксама адзначаў помнікі тыпу Максімоніс у арэале ўсходняй групы С. К. Казлоўскага. У дачыненні да тыпалагічнай характарыстыкі даследчыкі больш-менш пагаджаюцца адзін з адным. Галоўная рыса, паводле якой вылучаецца група Максімоніс, – яніславіцкія вастрыі з падрэзанай асновай. Астатнія элементы яе крамянёвага інвентару аналагічныя складу комплексаў усходняй групы.

Сапраўды, яніславіцкія вастрыі з падрэзанай асновай сустракаюцца ў Літве, у паўночна-ўсходняй Польшчы і на Беларускім Панямонні. Яны ёсць на помніках Дубічай 2, Максімоніс 4 [29, рис. 92: *4*, 107: *2*], Варэна 1, Ёнёніс [117, pav. 40: *7*, 46: *7*, *8*], Дрэняй [112, pav. 8: *2*], Сосьня 1, Сосьня «Шведзкі мост» [145, tabl. CXXXII: *26*, CXXXIII: *4–6*], Возьна Весь 2 [76, tabl. XLVI: *3*], Беліца 1, Ліхачы ур. «Востраў Ліхацкі», Любча 3, Сверынава ур. «Куцец» [111, tabl. XXI: *21*, CIX: *14*, CXV: *6*, CLXXV: *7*] і на некаторых іншых помніках (гл. [92, мара 14, 19; 95, p. 147]).

Аднак, па-першае, у пералічаных комплексах яны саступаюць па колькасці іншым тыпам яніславіцкіх вастрый. Па-другое, пункты з такімі вырабамі знаходзяцца ў абсалютнай меншасці сярод помнікаў ЯнК на названай тэрыторыі (гл. [133, s. 120–126; 113; 109–111]). Больш за тое, геаграфія гэтых вырабаў выходзіць далёка за прапанаваныя межы групы Максімоніс. Яны сустракаюцца па ўсім Палессі – як на помніках усходняй групы, так і на рудаастроўскіх: Абалонь [12, рис. 112: *5*; 13, рис. 2: *5*], Барадзянка 3в [7, рис. 24: *1*], Камень 3 [111, tabl. LVIII: *7*], Сенчыцы 5а [8, рис. 15: *13–15*, *17*; 12, рис. 81: *13–15*, *17*], Перавалока 2 [12, рис. 91: *2*, *7*], Прыборск 3 [7, рис. 26: *1*]. Адзінкавыя падобныя мікраліты адзначаюцца ў верхнім і сярэднім цячэнні Віслы – Бжэзіны [92, s. 235, 288], Вількова [87, tabl. XXXVIII: *13*] і Варшава-Вавэр [94, s. 179, tabl. XV: *16*].

Дадатковыя кампаненты комплексаў групы Максімоніс, якія адрозніваюць іх ад іншых помнікаў ЯнК, гэта – рубячыя прылады (цёслы ці сякеры; [7, с. 101; 10, с. 185; 12, с. 134–135; 67, s. 283; 80, s. 239; 93, p. 75; 96, p. 161] і разцы [7, с. 101; 10, с. 185; 12, с. 134–135; 39; 67, s. 283]. Аднак, арэал прылад для сячэння ў ЯнК таксама вельмі шырокі. Яны распаўсюджаны на ўсім Панямонні, на Заходнім Палессі, у паўночна-ўсходняй Польшчы, сустракаюцца ў басейне Віслы [8, с. 37; 12, с. 134; 92, s. 149; 96, p. 161; 113; 109], – не толькі на тэрыторыі групы Максімоніс, але і практычна ва ўсёй ўсходняй групе. Іх можна знайсці і ў паўднёва-ўсходнім Палессі, на рудаастроўскіх помніках [7, с. 58, 99; 8, с. 34]. Разцы таксама не з'яўляюцца выключна паўночна-ўсходняй адметнасцю. Яны, хоць і не адносяцца да ліку характэрных прылад і звычайна нешматлікія, але даволі часта сустракаюцца па ўсім арэале ЯнК [7; 8; 64, s. 9; 67, s. 293; 92, s. 149; 102; 124, s. 85; 145, s. 380–387].

Такім чынам, з улікам прыведзеных акалічнасцей, наўрад ці можна лічыць вылучэнне групы Максімоніс апраўданым. Помнікі і тэрыторыі, што залічваліся да групы Максімоніс, варта разглядаць у кантэксце ўсходняй групы, калі зыходзіць з канцэпцыі С. К. Казлоўскага. Аналагічнае меркаванне выказваў Т. Астраўскас, які ўключыў комплексы ЯнК з тэрыторыі Літвы ў цэнтральную (паводле Л. Л. Залізняка; усходнюю паводле С. К. Казлоўскага) групу культуры [113]. У пэўнай ступені да такой высновы прыйшоў і К. Шымчак, які аб'яднаў у межах паўночна-яніславіцкай культуры групы Максімоніс і ўсходнюю [133, s. 121–128].

[1] Т. Галіньскі вылучыў у еўрапейскім мезаліце чатыры «тэхналагічна-тыпалагічныя стылі вытворчасці прылад» (A, B, C, D), якія праяўляюцца «ў тыпах і формах нуклеусаў, характары нарыхтовак, з якіх вырабляліся найважнейшыя формы прылад, г. зн. мікраліты, у элементах выкарыстання розных тэхнік іх вырабу, і, часткова, у формах саміх мікралітаў» і якія «маюць характар тэхналагічна-тыпалагічных трэндаў, што ў рознай ступені ахопліваюць усе мезалітычныя комплексы» [67, s. 65]. На думку даследчыка распаўсюджанне гэтых стыляў адлюстроўвае тры храналічныя этапы развіцця крэмнеапрацоўчай вытворчасці ў мезалітычнай Еўропе (падр. гл. [67, s. 65–72]).

Пэўныя сумненні выклікаюць і падставы выдзялення яшчэ адной рэгіянальнай адзінкі ЯнК – ***рудаастроўскай культуры***. Л. Л. Залізняк і С. К. Казлоўскі вызначылі яе арэал у сярэднім і ніжнім цячэннях Прыпяці. К. Шымчак пад гэтай назвай аб'ядноўвае яніславіцкія помнікі ва ўсім беларуска-ўкраінскім Палессе, ніяк не каментуючы сваё меркаванне. Відавочна, што падстаў для такога пашырэння тэрыторыі рудаастроўскай культуры ў любым выпадку няма.

С. К. Казлоўскі ў якасці адмысловых рыс помнікаў усходняга Палесся называў практычна поўную адсутнасць трохвугольнікаў і наяўнасць наканечнікаў стрэл на пласцінах і вастрый з прытупленай спінкай. Аднак наканечнікі стрэл, якія часам суправаджаюць яніславіцкія матэрыялы [7, рис. 21: *9–11*, рис. 25: *14*, *37*, рис. 31: *56–58*], відавочна з'яўляюцца механічнай дамешкай і адносяцца да фінальнага палеаліту. Варта адзначыць, што ў сваіх ранніх працах Л. Л. Залізняк адносіў іх да характэрных асаблівасцей рудаастроўскай культуры [4, с. 30–34; 5, с. 18; 7, с. 100], але ва ўсіх пазнейшых – абмінаў [8, 10–12]. Вастрыі з прытупленай спінкай на Палессі характэрны для кудлаеўскай культуры. Найбольш верагодна, што ў выпадку прысутнасці на рудаастроўскіх помніках яны таксама з'яўляюцца механічнай дамешкай [13, с. 46]. Л. Л. Залізняк ніколі не называў іх у складзе рудаастроўскіх помнікаў. Што тычыцца рэдкасці яніславіцкіх трохвугольнікаў, апошні цалкам падтрымліваў гэты аргумент, дадаючы да яго яшчэ і поўную адсутнасць трохвугольнікаў з трэцім рэтушаваным бокам, а таксама чатырохвугольнікаў. Зрэшты, гэтыя заўвагі патрабуюць адпаведнага каментара.

Нешматлікасць трохвугольнікаў у параўнанні з яніславіцкімі вастрыямі – ўвогуле характэрная з'ява для комплексаў усходняй групы ЯнК. Больш за тое, С. К. Казлоўскі адзначаў, што многія з іх могуць увогуле не ўтрымліваць трохвугольнікаў, замест якіх выступаюць высокія трапецыі [92, s. 156–157]. Акрамя таго, трохвугольнікі ўсё ж такі сустракаюцца на помніках усходняга Палесся [8, рис. 10: *12–19*, рис. 12: *5*, 6; 12, рис. 110: *26*, *27*, рис. 112: *9*, *10*]). З улікам гэтага можна меркаваць, што ў дадзеным выпадку рудаастроўская культура ў цэлым не адрозніваецца ад усходняй групы.

Трохвугольнікі з трэцім рэтушаваным бокам не з'яўляюцца характэрным элементам для ЯнК. Калі і сустракаюцца, то ў першую чаргу ў комплексах групы Вістка, іх знаходкі на іншых помніках культуры вельмі рэдкія. Акрамя таго, адзін такі выраб усё ж такі вядомы на рудаастроўскім помніку Пратарэб [8, рис. 10: *16*]. Што датычыцца чатырохвугольнікаў (ці прамавугольнікаў, паводле польскіх археолагаў), неабходна звярнуць увагу на дзве акалічнасці. Папершае, гэтая катэгорыя прысутнічае не ва ўсіх тыпалагічных схемах. Х. Венцкоўска і М. Марчак вылучалі прамавугольнікі як асобны тып вырабаў, а С. К. Казлоўскі разглядаў іх у межах катэгорыі «яніславіцкіх трохвугольнікаў». Пры гэтым апошні звяртаў увагу на той факт, што форма вялікіх яніславіцкіх трохвугольнікаў у сваёй большасці нагадвае абрысы геаметрычнага чатырохвугольніка, бо іх доўгія бакі практычна паралельныя, а самі вырабы не маюць вострага заканчэння [88, s. 76; 124, s. 28]. Па-другое, нават калі прамавугольнікі разглядаць як асобную катэгорыю, іх знаходкі ў арэале ЯнК вельмі рэдкія [96, p. 78]. Такім чынам, трохвугольнікі з трэцім рэтушаваным бокам і чатырохвугольнікі/прамавугольнікі наўрад ці варта разглядаць у якасці важкіх аргументаў на карысць адметнасці рудаастроўскіх комплексаў.

Паводле Л. Л. Залізняка, яшчэ адна асаблівасць рудаастроўскіх помнікаў – перавага ў мікралітычным наборы яніславіцкіх вастрый са зламанай і натуральнай асновамі над вастрыямі з рэтушаванай асновай. Тут варта адзначыць, што ў рудаастроўскіх комплексах, якія публікуе Л. Л. Залізняк, яніславіцкія вастрыі прадстаўлены невялікімі серыямі – ад 3 да 6 экзэмпляраў [7, с. 58, 65]. Пры гэтым на трох з шасці помніках прысутнічаюць вастрыі з рэтушаванымі асновамі, папярочнымі і адно з падрэзанай [7, рис. 25: *7*, рис. 26: *1*, рис. 31: *2*, *3*]. Вастрыё з рэтушаванай асновай знойдзена і на стаянцы Красноўка 1Б на ніжняй Бярэзіне [23, рис. 63: *4*], якую таксама адносяць да рудаастроўскіх [8, с. 35; 23, с. 121–122]. Пры гэтым у цэлым нельга сказаць, што вастрыі з рэтушаванай асновай дамінуюць (хутчэй наадварот) ці нават прысутнічаюць ва ўсіх комплексах ЯнК на іншых тэрыторыях [92, s. 121; 99, s. 96; 108, tabl. II]. Такім чынам, сукупнасць комплексаў, якія залічваюцца да рудаастроўскіх па прыкмеце суадносін паміж разнавіднасцямі яніславіцкіх вастрый, не вылучаецца сярод іншых тэрытарыяльных адзінак ЯнК.

Выклікаюць сумненні і іншыя абазначаныя Л. Л. Залізняком асаблівасці рудаастроўскіх помнікаў, якія павінны на яго думку адрозніваць апошнія ў межах ЯнК. Даследчык указваў на меншую ролю пласцін у рудаастроўскіх комплексах, выкарыстоўваючы для яе вызначэння так званы індэкс пласціністасці. У працах Л. Л. Залізняка змест гэтага паняцця не раскрываецца, аднак калі улічыць метадалогію разліку, прынятую ва ўсходнееўрапейскай літаратуры (гл. [34, с. 41; 35, с. 14–15; 32, с. 30]), і параўнаць даныя з рудаастроўскіх стаянак [7, с. 58, 68] і помнікаў басейна Віслы (напр. [124, s. 66–67]; гл. таксама заўвагі [67, s. 293]), то вынікі будуць адрозніваццa не вельмі значна[1].

[1] Неабходна мець на ўвазе, што польскія аўтары раздзяляюць катэгорыі адшчэпаў, лусак (дробных адшчэпаў, менш) і абломкаў, не звяртаючы ўвагу на апошнія дзве ў

Украінскі даследчык таксама ўказваў на нерэгулярнасць вялікай колькасці рудаастроўскіх нуклеусаў. Аднак на даследаваных раскопкамі помніках ЯнК сустракаюцца разнастайныя формы нуклеусаў, у тым ліку ад: пласцін са зменай арыентацыі; пласцін і адшчэпаў; адшчэпаў (параўн. [65; 67, s. 289–290; 102; 124]), пры гэтым цэлыя нуклеусы ад рэгулярных пласцін не абавязкова колькасна пераважаюць [137, s. 127–128, 164]. Разам з гэтым на рудаастроўскіх стаянках прысутнічаюць «класічныя формы» яніславіцкіх нуклеусаў [7, рис. 20: *23–25*; 8, рис. 10: *106–109*, рис. 12: *65*; 10, рис. 71: *58*, *59*; 12, рис. 109: *23*, *25*, *26*], што адзначаў і сам Л. Л. Залізняк [8, с. 31].

Яшчэ адна асаблівасць рудаастроўскіх комплексаў, на думку Л. Л. Залізняка, – меншая роля скрабачоў, пры наяўнасці выразных серый канцавых скрабкоў. Сапраўды, скрабачы звычайна пераважаюць у групе скрабучых прылад на помніках ЯнК, аднак канцавыя скрабкі складаюць ста́лы, і часам шматлікі, элемент комплексаў ва ўсім арэале культуры [65, s. 9, 26; 67, s. 292; 92, s. 146–148; 109; 124, s. 85; 133, s. 122–128]. На чатырох рудаастроўскіх помніках, звесткі пра якія прыводзіў ў сваёй манаграфіі Л. Л. Залізняк, доля «скрабкоў няправільнай формы на адшчэпах» сярод усёй катэгорыі скрабкоў складае ад 42,3 да 53,3%, і толькі на адным меншая – 30,0% [7, с. 58]. Пры гэтым неабходна адзначыць, што ва ўсходнееўрапейскай традыцыі адсутнічае вызначэнне катэгорыі «скрабачы», характэрнай для польскай тэрміналогіі [70, s. 127; 124, s. 22]. У асноўным скрабачам адпавядаюць названыя вышэй «скрабкі няправільнай формы», аднак не выключана, што да скрабачоў можа залічвацца і частка вырабаў, якія трапілі пад вызначэнне канцавых і, асабліва, акруглых і падакруглых скрабкоў. Варта браць пад увагу таксама той факт, што матэрыялы помнікаў, залічаных да рудаастроўскіх, у большасці выпадкаў утрымліваюць іншакультурныя дамешкі (фінальнапалеалітычныя, неалітычныя, часам мезалітычныя). У выпадку полікультурнага характару помніка практычна немагчыма вызначыць дакладную таксанамічную атрыбуцыю «банальных» крамянёвых прылад, такіх, як скрабкі. Таму неабходна вельмі асцярожна падыходзіць да параўнання змешаных комплексаў паводле колькасных параметраў. Тым не менш відавочна, што для рудаастроўскіх, як і для іншых комплексаў ЯнК, характэрны вялікія серыі скрабачоў.

Адзіным неабвержным аргументам на карысць вылучэння рудаастроўскіх помнікаў застаецца факт прысутнасці ў іх складзе крамянёвага інвентару адзінкавых кукрэцкіх элементаў – спецыфічных укладышаў і разцоў з плоскімі разцовымі сколамі. Аднак і іх інтэрпрэтацыя таксама можа аказацца неадназначнай – кукрэкскія элементы сустракаюцца ў паўднёва-ўсходнім Палессі на помніках, дзе прысутнічае днепра-данецкая неалітычная кераміка [7, с. 108–109; 8, с. 42–44]. Сувязь гэтых знаходак менавіта з яніславіцкімі комплексамі патрабуе дадатковай праверкі, бо не выключана, што яны таксама могуць з'яўляцца механічнай дамешкай.

Улічваючы ўсе прыведзеныя вышэй акалічнасці можна канстатаваць, што вылучэнне рудаастроўскай групы помнікаў у межах ЯнК не выглядае пераканаўчым. Крамянёвыя комплексы стаянак з яніславіцкімі матэрыяламі цэнтральнага і ўсходняга Палесся вельмі блізкія комплексам ЯнК заходняга Палесся, Панямоння, паўночна- і паўднёва-ўсходняй Польшчы і ў цэлым упісваюцца ў межы канцэпцыі ўсходняй групы С. К. Казлоўскага.

Заходнія помнікі ЯнК С. К. Казлоўскі, як ужо адзначалася вышэй, адносіў да ***групы Вістка***. Мяжа паміж асноўнымі арэаламі канцэнтрацыі помнікаў вістэцкай і ўсходняй груп, паводле даследчыка, праходзіла «ад сярэдняй Нарвы, праз ваколіцы Варшавы, у накірунку Свентакшыскіх гор, і далей праз Нідзянскую катлавіну і Кракаўска-Чанстахоўскае ўзвышша на поўдзень» [92, s. 157]. Мяжа гэта даволі ўмоўная, бо ў многіх рэгіёнах канцэнтрацыі вістэцкіх помнікаў – у Нідзянскай катлавіне, басейне Бзуры, ваколіцах Варшавы – прысутнічаюць помнікі, якія залічваюцца да ўсходняй групы [92, mapa 19]. Акрамя таго, ва ўсіх названых рэгіёнах, а таксама ў басейне Буга, адзначаецца даволі вялікая колькасць комплексаў са змешаным «вістэцка-ўсходнім» складам мікралітаў. Аб наяўнасці такіх комплексаў, як адзначалася вышэй, пісаў і С. К. Казлоўскі. Аднак звяртае на сябе ўвагу той факт, што на складзенай ім карце помнікаў ЯнК колькасць «вістэцка-ўсходніх» інвентароў амаль роўная колькасці вістэцкіх [92, mapa 19]. Да гэтага неабходна дадаць, што вызначальныя элементы групы Вістка – малыя яніславіцкія трохвугольнікі і нізкія трапецыі – сустракаюцца значна шырэй, чым меркавалася на пачатку 1970-х гадоў. Яны нешматлікія, але прысутнічаюць на помніках ЯнК на значнай тэрыторыі па-за межамі гіпатэтычнага арэалу вістэцкай групы – у паўночна-ўсходняй Польшчы, на Панямонні і на Палессі [8, XLVII: *10*; 8, рис. 10: *12*, *14*, *15*, *94*, рис. 15: *45*, *46*, *63*; *12*, рис. 83: *6*, рис. 91: *42*, *43*, рис. 92: *49*, рис. 110: *26*, *27*; 27, рис. 1: *9*, *10*; 111, tabl. XXI: *6*; 29, рис. 123: *36*; 76, tabl. XXI: *9*, tabl. XXX: *133*, tabl. XLVI: *25*, *26*, *30*; 77, s. 67, tabl. III: *10*]. Гэтыя акалічнасці ставяць пад пэўны сумненне абгрунтаванасць вылучэння заходніх помнікаў ЯнК у тым выглядзе, у якім С. К. Казлоўскі сфармуляваў канцэпцыю групы Вістка.

аналізе структуры крамянёвых комплексаў. У адрозненні ад іх, усходнееўрапейскія даследчыкі разглядаюць усе вышэйпералічаныя вырабы ў межах адной катэгорыі (гл. напр. [34, с. 36; 7, с. 58]).

Неабгрунтаваным выглядае прапанаванае Т. Галіньскім вылучэнне ў складзе ЯнК ***помнікаў тыпу Старыя Баракі***. Так, на эпанімнай стаянцы Старыя Баракі 2 быў выяўлены змешаны мезалітычны інвентар [104]. Адзін з даследчыкаў гэтага помніка, Е. Лібэра, лічыць магчымым з дапамогай планіграфічнага аналізу раздзяліць яго на два асобныя комплексы, што адлюстроўваюць незалежныя этапы засялення стаянкі носьбітамі камарніцкай і яніславіцкай культур [101, s. 25]. Е. Лібэра даследаваў яшчэ адзін помнік, што мусіць належыць да названай групы – Старыя Баракі 14. Па яго сведчанні, у інвентары стаянкі прысутнічаюць тыповыя камарніцкія элементы пры поўнай адсутнасці яніславіцкіх вастрый [Libera, 2003, s. 25]. Астатнія тры з пяці пералічаных Т. Галіньскім у спісе помнікаў тыпу Старыя Баракі – Плазувка, Свідры Малыя «Пенькі» 3, Сукув – былі залічаны С. К. Казлоўскім да пянькоўскай групы хойніцка-пянькоўскай культуры [92, s. 174, мapa 20]. Матэрыялы гэтых стаянак [86; 87, XXXIII: *3–24*; 1972, s. 169, 174, tabl. XLIV, XLV: *1–13*] як і іншыя комплексы згаданага таксону, выразна адрозніваюцца ад тыпова яніславіцкіх[1].

Таксама Т. Галіньскі вылучыў у межах ЯнК ***«комплексы з дамінуючымі трапецыямі»***. У якасці найважнейшых помнікаў даследчык пералічыў пяць з басейна Віслы (Вістка Шляхэцка V/1960, Вістка Шляхэцка VI/1960, Вістка Шляхэцка I/1963 [124, s. 140–164, tabl. VII–XVI], Вялішаў 12-XIV/1960 [146, s. 90–92, tabl. XL: *7–17*, XLI, XLII: *1–10*], Старыя Баракі 13 [103]) і тры з украінскага Палесся (Барадзянка 3а [7, с. 50–53, рис. 23, 24], Нэпірэц, Пратэрэб [8, рис. 10, 11, 13; 12, рис. 94, 99, 100]). Варта адзначыць, што названыя помнікі не складаюць аднароднай групы з пункту гледжання тыпалагічнага складу іх інвентару. Ва ўсіх палескіх комплексах добра прадстаўлена група яніславіцкіх вастрый, якія цалкам адсутнічаюць у адзначаных комплексах з-над Віслы.

Праблема інтэрпрэтацыі помнікаў, характэрнай рысай крамянёвага інвентару якіх з'яўляецца прысутнасць толькі трапецый ці іх абсалютная перавага ў мікралітычным наборы, неаднаразова разглядалася польскімі даследчыкамі. У літаратуры такія помнікі (вядомыя, зрэшты, і па-за арэалам ЯнК) фігуруюць пад рознымі назвамі – «культурна нявызначаныя матэрыялы позняга атлантычнага перыяду» [145, s. 403–406), «бабжаньская група» [43, s. 89–112], «какроўская індустрыя» [99, s. 48; 146, s. 102, 110, 116], «постяніславіцкая культура» [44, s. 91–93, 111] «познаатлантычныя (постяніславіцкія ?) інвентары з дамінуючымі трапецыямі і скрабачамі» [101, s. 26]. Пры гэтым большасць даследчыкаў згаджаецца з датаваннем такіх комплексаў познім атлантыкам і звязвае іх з фінальным этапам мезаліту. С. К. Казлоўскі лічыў іх распаўсюджанне на тэрыторыі Польшчы праявай дэзінтэграцыі мезалітычных супольнасцей і стандартызацыі крамянёвай індустрыі пад уплывам ранненеалітычных культур Дунайскага кола [96, p. 205]. З другога боку, выказвалася меркаванне, што названыя рысы крамянёвага інвентару могуць адлюстроўваць не храналагічную пазіцыю комлексаў, а іх функцыянальную ролю [124, s. 125].

Падсумоўваючы, можна адзначыць, што дыскусію аб унутраным падзеле ЯнК, якую распачаў С. К. Казлоўскі і падтрымала цэлая група даследчыкаў, нельга лічыць завершанай. Працы, у якіх асноўная ўвага звярталася на вывучэнне помнікаў усходняй часткі арэалу культуры [7, 8, 108, 109, 113, 133], з аднаго боку, сведчаць аб значным падабенстве крамянёвых комплексаў ЯнК на большай частцы яе тэрыторыі, а з другога – даюць падставы для пэўнай карэкціроўкі яе першапачатковай тыпалагічнай характарыстыкі. Аднак вылучэнне прапанаваных на дадзены момант лакальных адзінак культуры не выглядае пераканаўча абгрунтаваным (за выключэннем хіба ўсходняй групы, пад характарыстыку якой трапляе асноўная маса яніславіцкіх комплексаў). Большасць элементаў і рыс, якімі адрозніваюцца рудаастроўскія помнікі і помнікі групы Максімоніс, не маюць лакальнага абмежавання. Першапачатковае меркаванне С. К. Казлоўскага аб тэрытарыяльнай зменлівасці тыпалагічных рыс, якія павінны былі служыць адзнакамі вістэцкай і ўсходняй групы, – распаўсюджанасць і ўдзельная вага двух тыпаў яніславіцкіх трохвугольнікаў, нізкіх і высокіх трапецый – у асноўным застаецца правільным, але і яно патрабуе верыфікацыі з улікам усіх даступных на дадзены момант крыніц.

4.3. Некаторыя альтэрнатыўныя падыходы да таксанамічнай атрыбуцыі крамянёвых комплексаў ЯнК

Характэрныя для ЯнК матэрыялы сустракаюцца на шматлікіх археалагічных помніках на тэрыторыі Літвы, Беларусі і Украіны. Аднак не ўсе аўтары атаясамлівалі яніславіцкія элементы гэтых рэгіёнаў з аднайменнай культурай. Часткова гэта звязана з тым, што ў 1960-я гады ўзрасла ўвага да мезалітычнай праблематыкі сярод мясцовых археолагаў. Усходнееўрапейскія даследчыкі паралельна працам польскіх калег, у ходзе якіх была вылучана ЯнК, праводзілі аналагічныя даследаванні. Іх вынікам сталі ўласныя схемы культурна-храналагічнай інтэрпрэтацыі матэрыялаў раннегалацэнавага часу.

[1] У межах паняцця хойніцка-пянькоўскай культуры аб'ядноўваюцца шматлікія познамезалітычныя комплексы так званай маглемозкай, ці постмаглемозкай, традыцыі, распаўсюджаныя на большай частцы тэрыторыі Польшчы (у першую чаргу на захад ад Віслы) [43; 45; 92, s. 165–205; 96, p. 138–148; 99, s. 47; 145, s. 398–403]

Літоўская даследчыца Р. Рыманцене ў 1963 г. правяла раскопкі на стаянцы Максімоніс 4 [74]. Помнік быў аднесены да культуры Маглемозэ, а час існавання апошняй на тэрыторыі Літвы вызначаны на канец прэбарэалу – барэальны перыяд [29, с. 118–125; 117, p. 64–69]. Большасць даследчыкаў, аднак, адназначна звязвае комплекс стаянкі Максімоніс 4, што паслужыў С. К. Казлоўскаму для вылучэння эпанімнай культурнай групы, з ЯнК [12, с. 133; 21, с. 169; 92, s. 134].

У працах, прысвечаных мезаліту Літвы, Р. Рыманцене таксама прапанавала вылучэнне мікралітамакралітычнай культуры [29, с. 125–172; 42], якую пазней назвала нёманскай мезалітычнай культурай [30; 117, p. 69–86, 313]. Арэал гэтай культуры, што павінна была існаваць з канца барэалу і на працягу атлантычнага перыяду, займаў паўднёвую і ўсходнюю Літву, захад Беларусі, Калінінградскую вобласць і паўночна-ўсходнюю Польшчу [30, с. 68, рис. 2; 117, p. 82–85, pav. 43]. Р. Рыманцене лічыла, што нёманская мезалітычная культура склалася на аснове трох кампанентаў: 1) мясцовых палеалітычных традыцый, выяўленых у першую чаргу ў наканечніках стрэл «эпісвідэрскіх» формаў на пласцінах; 2) элементаў уплыву паўночнага мезаліту – культуры Маглемозэ (макралітычныя прылады для сячэння, ланцэты[1], касцяныя вырабы); 3) міжкультурны мікралітычны кампанент – рэтушаваныя ўкладышы, у тым ліку пласцінкі з прытупленай спінкай, і трапецыі [30, с. 66–68; 117, p. 72, 313].

Аналагічным чынам разважалі і некаторыя іншыя навукоўцы, характарызуючы мезаліт заходняй часткі Усходнееўрапейскай раўніны. Так, У. Ф. Ісаенка вылучаў у мезаліце Беларусі тры гісторыка-культурныя вобласці: макралітычную – у Верхнім Падняпроўі, мікралітычную – ва ўсходнім Палессі, і мікра-макралітычную – у басейне Нёмана і на верхняй Прыпяці [14, с. 56–64]. На думку даследчыка, заходнепалескі і панямонскі мезаліт (з заходнім Палессем генетычна звязвалася і нёманская мезалітычная культура) склаўся на мясцовай свідэрскай аснове і развіваўся часткова пад уплывам паўднёвых і заходніх культур з мікралітамі. У. Ф. Ісаенка адзначаў наяўнасць на мясцовых помніках вырабаў, тыповых для ЯнК, аднак не пагаджаўся з меркаваннем аб распаўсюджанні самой культуры на тэрыторыі Палесся [15, с. 59].

Л. У. Кальцоў таксама вылучаў на тэрыторыі Беларусі, паўднёва-ўсходняй Літвы і паўночна-ўсходняй Польшчы «помнікі мезаліту свідэрскай традыцыі», існаванне якіх датаваў ад другой паловы прэбарэалу і да сярэдзіны атлантыку [21, с. 95–119]. Гэтыя помнікі даследчык дзяліў на дзве групы – пасожскую і нёманска-прыпяцка-бужскую. Апошнюю, у інвентары якой ён бачыў сляды ўплываў ЯнК, даследчык называў нёманскай культурай і цалкам атаясамліваў з мікраліта-макралітычнай культурай Р. Рыманцене [21, с. 117].

Распрацоўку канцэпцыі нёманскай культуры працягнуў С. К. Казлоўскі, які ў шматлікіх працах канца 1960 – пачатку 1970-х гадоў аб'яднаў помнікі з чаранковымі наканечнікамі стрэл на пласцінах з тэрыторыі паўднёва-ўсходняй Прыбалтыкі і Усходнееўрапейскай раўніны спачатку пад назвамі «комплексы тыпу Боркі» [85, s. 242–245], «комплексы тыпу Кунда-Боркі» [90, p. 19–22], а потым і «кундская культура» [91; 92, s. 92–119], разглядаючы апошнюю як адну з таксанамічных адзінак «паўночна-ўсходняга культурнага кола (паўночна-ўсходняга тэхнакомплексу)». Прысутнасць у інвентарах помнікаў заходняй часткі кундскай культуры – на тэрыторыі Літвы, Беларусі і паўночна-ўсходняй Польшчы – яніславіцкіх элементаў (вастрый, высокіх трапецый, скрабачоў) першапачаткова тлумачылася існаваннем кантактаў паміж дзвюма культурамі ў зоне стыку іх арэалаў[2] [85, s. 245–246; 91, s. 67, 72], а пазней паслужыла падставай для вылучэння літоўскай групы кундскай культуры [92, s. 111–112]. Аднак гэтыя погляды польскага даследчыка ў хуткім часе змяніліся: кундская ультура была пераўтворана ім ў кундскую супольнасць паўночна-ўсходняга культурнага кола мезаліту, размежаваную на верхневолжскую, уласна кундскую і нёманскую культуры. З апошняй атаясамліваліся помнікі ранейшай літоўскай групы і, адпаведна, мікраліта-макралітычная культура Р. Рыманцене [79; 80, s. 242–245; 93, p. 138–141; 96, p. 167–173]. Характарыстыка нёманскай культуры С. К. Казлоўскага ў цэлым паўтарае прапанаваную Р. Рыманцене з пэўнымі адрозненнямі, што датычыцца паходжання кампанентаў яе крамянёвага інвентару. У прыватнасці, даследчык акцэнтуе ўвагу на ўдзеле яе ў складванні ЯнК.

Даволі распаўсюджаным з'яўлялася меркаванне, што ў другой палове атлантычнага перыяду крамянёваму інвентару нёманскай мезалітычнай культуры пачынае спадарожнічаць кераміка, і, такім чынам, нёманская неалітычная культура з'яўляецца генетычнай спадкаемніцай яе мезалітычнай папярэдніцы [2, с. 156; 37, с. 50; 96, p. 173; 117, p. 123, 315].

Нягледзячы на тое, што нёманская мезалітычная культура была прызнана многімі ўсходнееўрапейскімі археолагамі, а таксама атрымлівае падтрымку і ў сучасных працах [71, p. 92–103], было вы-

[1] Пад гэтай назвай Р. Рыманцене аб'ядноўвае розныя вастрыі з прытуплеными спінкамі і/альбо скошанымі канцамі, у тым ліку разнастайныя трохвугольнікі, вастрыі тыпу Вялішаў, вастрыі тыпу Ставінога, сегменты і г. д. [31, с. 27–30].

[2] Пры гэтым С. К. Казлоўскі не лічыў, што гэта дае падставы для вылучэння на тэрыторыі Літвы асобнай «мікраліта-макралітычнай» культуры [91, s. 67].

казана нямала і адваротных меркаванняў. Польскія даследчыцы Э. Кэмпісты і Х. Венцкоўска звярнулі ўвагу на змешаны характар комплексаў нёманскай мезалітычнай культуры і адсутнасць дастатковых падстаў для яе вылучэння, а таксама на не да канца высветленую яе сувязь з ранненеалітычнымі комплексамі [77, s. 90]. Такія ж высновы прагучалі ў пазнейшай працы Э. Кэмпістай і З. Сульгастоўскай, якія заклікалі да таго, каб назву «нёманская культура» пакінуць за неалітычным таксонам і адмовіцца ад яе выкарыстання ў дачыненні да мезалітычных матэрыялаў [76, s. 91]. Неабгрунтаваным лічыць вылучэнне гэтай адзінкі і К. Шымчак, указваючы на тое, што частка залічаных да яе стаянак суадносіцца з кундскай культурай, а частка – з апісанай ім паўночна-яніславіцкай культурай. Не згаджаецца даследчык і з трактоўкай нёманскай мезалітычнай культуры як дакерамічнай фазы нёманскай культуры ўсходнееўрапейскага неаліту [133, s. 129]. Л. Л. Залізняк, хоць і з пэўнымі невялікімі агаворкамі, выказвае меркаванні, што большасць комплексаў гэтай адзінкі ўяўляюць з сябе механічную сумесь матэрыялаў свідэрскай, кундскай, яніславіцкай і кудлаеўскай культур [12, с. 12; 152, p. 36]. Да аналагічных высноў прыйшоў і даследчык мезаліту Літвы Т. Астраўскас, які ў сваёй дысертацыі пераканаўча даказаў змешаны полікультурны характар інвентароў стаянак, што залічваліся да нёманскай мезалітычнай культуры [113].

З тэрыторыі паўночна-заходняй Беларусі вядома яшчэ некалькі пунктаў, дзе выразныя яніславіцкія элементы знойдзены ў не зусім ясным культурным кантэксце – Кусеўшчына [38] і Сосенка 3 [40]. Мезалітычныя комплексы гэтых стаянак М. М. Чарняўскі і У. П. Ксяндзоў аднеслі да вылучанага ў пачатку 1990-х гадоў У. П. Ксяндзовым на падставе матэрыялаў стаянкі Стругалапы 1 [3; 25, с. 75–77, рис. 75–79] нарачанскага тыпу помнікаў [26]. Характарыстыка гэтай адзінкі[1] была значна перапрацавана і ўдакладанена В. С. Абухоўскім, які прапанаваў вылучэнне нарачанскай культуры [28]. Паводле даследчыка, крамянёвы інвентар нарачанскай культуры, помнікі якой канцэнтруюцца ў ваколіцах Нарачанскіх азёр і ў басейне верхняй Віліі і датуюцца атлантычным перыядам, склалі яніславіцкі (яніславіцкія вастрыі і трохвугольнікі, трапецыі, скрабачы) і кундскі (чаранковыя наканечнікі стрэл на пласцінах, пласціны-ўкладышы, разцы на зломе пласцін) кампаненты пры наяўнасці культурна неідэнтыфікаваных элементаў (ромбы, асіметрычныя трапецыі, вастрыі са скошанымі канцамі). Да нарачанскай культуры В. С. Абухоўскі залічыў і мезалітычныя рагавыя вырабы са Смаргонскага кар'ера, якія М. М. Чарняўскі раней звязваў з ЯнК [41].

Прапановы даследчыкаў, і, асабліва, удакладненні В. С. Абухоўскага, заслугоўваюць увагі, аднак узнікае шмат пытанняў у сувязі з вылучэннем нарачанскай культуры. Па-першае, сумненне выклікае «культурная чысціня» комплексаў, прынятых за ўзорныя для гэтай адзінкі. На немагчымасць выкарыстання ў якасці культуравызначальных матэрыялаў стаянкі Стругалапы 1 па прычыне практычнай адсутнасці ў складзе яе інвентару элементаў мікралітычнага набору і іншых характэрных форм указваў В. С. Абухоўскі [28, с. 12]. Мезалітычны комплекс Сосенкі 3 вылучаны даследчыкам са змешанай калекцыі, у якой прадстаўлены матэрыялы розных этапаў нарвенскай неалітычнай культуры [40].

Па-другое, пад пэўным сумненнем знаходзіцца таксанамічная атрыбуцыя элементаў, што мусяць адрозніваць крамянёвую індустрыю нарачанскай культуры ад ЯнК. Так, разцы на зломе пласцін і рэтушаваныя ўкладышы з фрагментаваных пласцін, якія ў дадзеным кантэксце інтэрпрэтуюцца як элементы кундскага паходжання і якія, безумоўна, з'яўляюцца характэрнымі элементамі інвентару ўласна кундскай культуры [24, 115], В. С. Абухоўскім называліся ў якасці характэрных форм і ЯнК басейна верхняга Нёмана [109, s. 85]. Нешматлікія знаходкі ромбаў і асіметрычных трапецый [109, s. 84–85, ryc. 8: *8*, 13: *8*, *11*; 110, s. 37, ryc. 33: *7*, *8*] з захаду Беларусі таксама звязваліся даследчыкам з ЯнК. Неабходна нагадаць, што і К. Шымчак пералічваў ромбы, разнастайныя трапецыі (у тым ліку нізкія і асіметрычныя формы), укладышы з рэтушаванымі краямі і вастрыі са скошанымі канцамі ў складзе крамянёвага інвентару паўночна-яніславіцкай культуры [133, s. 126–128]. Адзіным элементам, які нельга суадносіць з індустрыяй ЯнК, з'яўляюцца лістападобныя наканечнікі стрэл. Зрэшты, той жа К. Шымчак, дапускае магчымасць прысутнасці такіх вырабаў у комплексах паўночна-яніславіцкай культуры [133, s. 126, tabl. XLVIII: 5, 20, L: 13, 26, 27].

Такім чынам, ёсць пэўныя падставы для таго, каб звязваць непасрэдна з ЯнК басейна Нёмана і паўночна-ўсходняй Польшчы помнікі, якія прылічваюцца даследчыкамі да нарачанскіх. З іншага боку, аўтар не выключае магчымасці існавання ў познім мезаліце нейкай іншай таксанамічнай адзінкі, ідэнтычнай альбо падобнай да ахарактарызаванай даследчыкамі нарачанскай культуры, на прасторах не толькі верхняй Віліі, але і на больш шырокіх суседніх тэрыторыях. У любым выпадку, станоўчае альбо адмоўнае вырашэнне пытання аб вылучэнні гэтага таксону патрабуе больш грунтоўных даследаванняў мезаліту Павілля.

[1] Л. Л. Залізняк у сваёй нядаўняй манаграфіі мезаліту захаду Усходняй Еўропы таксама звярнуў увагу на гэтыя помнікі, аб'яднаўшы іх пад назвай «помнікі тыпу Кусеўшчына». Даследчык лічыць іх генетычна звязанымі з ЯнК і выказвае меркаванне аб іх фінальнамезалітычнай ці ранненеалітычнай (услед за М. М. Чарняўскім, які ўказваў на падабенства матэрыялаў Кусеўшчыны крамянёваму інвентару стаянак ранняй нарвенскай культуры) храналогіі [12, с. 138–139].

5. Заключэнне

Паняцце яніславіцкай культуры ўпершыню з'явілася ў сярэдзіне 1960-х гадоў у польскай археалагічнай літаратуры. Яе базавая канцэпцыя ў завершаным выглядзе была сфармулявана на працягу наступных дзесяці гадоў, галоўным чынам дзякуючы працам С. К. Казлоўскага і Х. Венцкоўскай. Ад гэтага часу да даследавання ЯнК далучыліся многія навукоўцы, пераважна з Польшчы, Украіны, Беларусі і Літвы, намаганнямі якіх істотна пашырылася крыніцазнаўчая база для вывучэння культуры, разгарнуліся дыскусіі па цэлым спектры агульных і спецыяльных праблем даследавання яніславіцкіх старажытнасцей. Вывучэнне апошніх праводзілі ў некалькіх накірунках. Большасць археолагаў засноўвала свае даследаванні на тыпалагічна-параўнальных метадах у рамках традыцыйнай метадалогіі. Адной з цэнтральных тэм тыпалагічных даследаванняў ЯнК з'яўляецца праблема яе таксанамічнага падзелу. Рознымі даследчыкамі была прапанавана даволі стракатая палітра канцэпцый рэгіянальнага падзелу ЯнК. Аднак нават беглы іх аналіз паказвае, што ніводная з іх на дадзены момант дастаткова не абгрунтавана, а пэўная тыпалагічная неаднароднасць крамянёвых комплексаў патрабуе альтэрнатыўных тлумачэнняў.

Развіццё нетыпалагічных даследаванняў, якое даволі актыўна пачалося з сярэдзіны 1970-х гадоў, значна пашырыла даследчыя перспектывы. На дадзены момант даволі дэталёва ахарактарызавана тэхналагічная канцэпцыя крэмнеапрацоўчай вытворчасці ЯнК, раскрыты некаторыя аспекты распаўсюджвання і выкарыстання разнастайных гатункаў крамянёвай сыравіны. На жаль, даследаванні такой скіраванасці ахопліваюць толькі частку арэала ЯнК у басейне Віслы.

Літаратура і крыніцы

1. Горелик, А. Ф. Новые мезолитические памятники с яниславицкими вкладышевыми элементами на Северском Донце / А. Ф. Горелик // Сов. археология. – 1987. – № 3. – С. 146–160.

2. Гурина, Н. Н. Неманская культура / Н. Н. Гурина // Археология. Неолит Северной Евразии. – М.: Наука, 1996. – С. 155–162.

3. Зайковский, Э. М. Мезолитический памятник Струголапы 1 // Э. М. Зайковский, В. П. Ксензов // Гіст.-археалаг. зб. – Мінск, 1994. – № 5. – С. 3–8.

4. Зализняк, Л. Л. Мезолит Восточной Волыни и Киевского Поднепровья в свете новых исследований / Л. Л. Зализняк // Новые исследования археологических памятников на Украине. – Киев : Наук. думка, 1977. – С. 23–44.

5. Залізняк, Л. Л. Рудоострівска мезолітична культура / Л. Л. Залізняк // Археологія. – Київ, 1978. – № 25. – С. 12–21.

6. Зализняк, Л. Л. Об остриях с микрорезцовым сколом в мезолите северной Украины / Л. Л. Зализняк // Орудия каменного века / ред. кол.: Д. Я. Телегин (отв. ред.) [и др.]. – Киев : Наук. думка, 1978. – С. 89–97.

7. Зализняк, Л. Л. Мезолит Юго-Восточного Полесья / Л. Л. Зализняк. – Киев : Наук. думка, 1984. – 120 с.

8. Зализняк, Л. Л. Население Полесья в мезолите / Л. Л. Зализняк. – Киев : Наук. думка, 1991. – 160 с.

9. Залізняк, Л. Л. Пізній мезоліт України / Л. Л. Залізняк // Археологія. – Київ, 1995. – № 4. – С. 3–16.

10. Залізняк, Л. Предісторія України X–V тис. до н. е. / Л. Залізняк – Київ : Бібліотека українця, 1998. – 305 с.

11. Залізняк, Л. Л. Фінальний палеоліт і мезоліт континентальної України / Л. Л. Залізняк. – Київ : Шлях, 2005. – 185 с.

12. Залізняк, Л. Л. Мезоліт заходу Східної Європи / Л. Л. Залізняк. – Київ : Шлях, 2009. – 278 с.

13. Залізняк, Л. Л. Яніславицькі культурні традиції в неоліті Правобережного Полісся / Л. Л. Залізняк, С. А. Балакін // Археологія. – 1985. – Вип. 49. – С. 41–49.

14. Исаенко, В. Ф. Мезолит / В. Ф. Исаенко // Очерки по археологии Беларуси. – Минск: Наука и техника, 1970. – Ч. I. – С. 49–66.

15. Исаенко, В. Ф. Мезолит Припятского Полесья / В. Ф. Исаенко // Краткие сообщения Института археологии. – Москва, 1977. – Вып. 149 : Памятники эпохи мезолита. – С. 53–59.

16. Исаенко, В. Ф. Основные типы кремневых орудий Южной Белоруссии / В. Ф. Исаенко // Орудия каменного века / ред. кол.: Д. Я. Телегин (отв. ред.) [и др.]. – Киев : Наук. думка, 1978. – С. 70–89.

17. Ковалевская, В. Б. Количественные методы оценки степени близости памятников по процентному содержанию массового материала / В. Б. Ковалевская, И. Б. Погожев, А. П. Погожева (Кусургашева) // Совет. археология. – 1970. – № 3. – С. 26–39.

18. Колосов, А. В. Финальный палеолит и мезолит Белорусского Посожья / А. В. Колосов // Русский сборник. – Брянск, 2008. – Вып. 4. – С. 23–31.

19. Колосов, А. В. Финальный палеолит и мезолит Посожья / А. В. Колосов // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2010. – Вып. 18 : Даследаванні каменнага і бронзавага вякоў. – С. 77–85.

20. Кольцов, Л. В. Памятники с яниславицкими элементами на территории СССР / Л. В. Кольцов // Памятники древнейшей истории Евразии. – М. : Наука, 1975. – С. 63–67.

21. Кольцов, Л. В. Финальный палеолит и мезолит Южной и Восточной Прибалтики / Л. В. Кольцов. – М. : Наука, 1977. – 216 с.

22. Кольцов, Л. В. Яниславицкая культура / Л. В. Кольцов // Археология СССР. Мезолит СССР. – М. : Наука, 1989. – С. 60–62.

23. Ксензов, В. П. Палеолит и мезолит Белорусского Поднепровья / В. П. Ксензов. – Минск : Наука и техника, 1988. – 134 с.

24. Ксензов, В. П. Культура Кунда / В. П. Ксензов // Гіст.-археалаг. зб. – Мінск, 2001. – Вып. 16. – С. 20–35.

25. Ксензов, В. П. Мезолит Северной и Центральной Беларуси / В. П. Ксензов // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2006. – Вып. 13. – 170 с.

26. Ксяндзоў, У. П. Помнікі нарачанскага тыпу / У. П. Ксяндзоў, М. М. Чарняўскі // Археалогія Беларусі : у 4 т. / рэдкал. М. В. Біч (старшыня) [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 1997–2001. – Т. 1 : Каменны і бронзавы вякі / Э. М. Зайкоўскі [і інш.]. – 1997. – С. 81–87.

27. Кудряшов, В. Е. Мезолитический комплекс стоянки Моисеевичи в низовьях р. Уборти / В. Е. Кудряшов // Гіст.-археалаг. зб. – Мінск, 1996. – Вып. 9. – С. 43–48.

28. Обуховский, В. Поздний мезолит бассейна верхней Вилии / В. Обуховский // Acta Archaeologica Albaruthenica. – Мінск, 2010. – Vol. VI. – С. 9–21.

29. Римантене, Р. К. Палеолит и мезолит Литвы / Р. К. Римантене. – Вильнюс : Минтис, 1971. – 203 с.

30. Римантене, Р. К. Основные черты мезолита Литвы / Р. К. Римантене // Краткие сообщения Института археологии. – М., 1977. – Вып. 149 : Памятники эпохи мезолита. – С. 66–69.

31. Римантене, Р. К. Типология палеолитических и мезолитических наконечников Прибалтики / Р. К. Римантене // Орудия каменного века / ред. кол.: Д. Я. Телегин (отв. ред.) [и др.]. – Киев : Наук. думка, 1978. – С. 20–31.

32. Сорокин, А. Н. Бутовская мезолитическая культура / А. Н. Сорокин. – М. : Институт археологии АН СССР, 1990. – 220 с.

33. Телегін, Д. Я. Про номенклатурний список крем'яных виробів доби мезоліту–неоліту / Д. Я. Телегін // Археологія. – 1976. – Вып. 19. – С. 21–45.

34. Телегин, Д. Я. К методике составления типологостатистической таблицы кремневых изделий мезо-неолитической эпохи / Д. Я. Телегин // Орудия каменного века / редкол.: Д. Я. Телегин (отв. ред.) [и др.]. – Киев : Наук. думка, 1978. – С. 35–57.

35. Телегін, Д. Я. Мезолітичні пам'ятки України (IX–VI тисячоліття до н. е.) / Д. Я. Телегін. – Київ : Наук. думка, 1982. – 256 с.

36. Телегин, Д. Я. Мезолитическая эпоха / Д. Я. Телегин // Археология Украинской СССР : в 3 т. / редкол.: И. И. Артеменко (глав. ред.) [и др.]. – Киев : Наук. думка, 1985–1986. – Т. 1 : Первобытная археология / редкол.: Д. Я. Телегин (отв. ред.) [и др.]. – 1985. – С. 83–108.

37. Чарняўскі, М. М. Неаліт Беларускага Панямоння / М. М. Чарняўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 144 с.

38. Чарняўскі, М. М. Мезалітычная стаянка Кусеўшчына на Мядзельшчыне / М. М. Чарняўскі // Гіст.-археалаг. зб. – Мінск, 1996. – Вып. 9. – С. 48–56.

39. Чарняўскі, М. М. Яніславіцкая культура / М. М. Чарняўскі // Археалогія Беларусі : у 4 т. / рэдкал. М. В. Біч (старш.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 1997–2001. – Т. 1 : Каменны і бронзавы вякі / Э. М. Зайкоўскі [і інш.]. – 1997. – С. 67–76.

40. Чарняўскі, М. М. Стаянка Сосенка-3 на Віліі / М. М. Чарняўскі // Гіст.-археалаг. зб. – Мінск, 1999. – Вып. 14. – С. 83–97.

41. Чернявский, М. М. Древнейшие роговые орудия из-под Сморгони / М. М. Чернявский // Lietuvos archeologija. – 1992. – Т. 9. – С. 116–120.

42. Яблонските-Римантене, Р. К. Периодизация мезолитических памятников Литвы / Р. К. Яблонските-Римантене // Материалы и исследования по археологии СССР. – М. ; Л., 1966. – Вып. 126 : У истоков древних культур (эпоха мезолита). – С. 75–87.

43. Bagniewski, Z. Społeczności myśliwsko-rybackie w okresie od IX do III tysiąclecia p. n. e. na terenie Polski południowo-zachodniej (część 2 : kultura chojnicko-pieńkowska i grupa bobrzańska) / Z. Bagniewski // Acta Universitatis Wratislaviensis. Studia Archeologiczne. – Wrocław, 1982. – T. XI (No. 501). – S. 41–116.

44. Bagniewski, Z. Mezolityczne społeczności myśliwsko-rybackie południowej części Pojezierza Kaszubskiego / Z. Bagniewski // Acta Universitatis Wratislaviensis. Studia Archeologiczne. – Wrocław, 1987. – T. XVII (No. 901). – 141 s.

45. Bagniewski, Z. Wczesnoholoceńskie ugrupowania mezolityczne na terenie zachodniej Polski / Z. Bagniewski // Fontes Archaeologici Posnanienses. – Poznań, 2001. – Vol. 39. – S. 75–94.

46. Balcer, B. Position and Stratigraphy of Flint Deposits, Development of Exploitation and Importance of the Świeciechów Flint in Prehistory / B. Balcer // Acta Archaeologica Carpathica. – 1976. – T. XVI. – P. 179–199.

47. Budziszewski, J. Stan badań nad występowaniem i pradziejową eksploatacją krzemieni czekoladowych / J. Budziszewski // Krzemień czekoladowy w pradziejach. Materiały z konferencji w Orońsku, 08–10.10.2003/ pod red. W. Borkowskiego [i in.]. – Warszawa ; Lublin : Państwowe Muzeum Archeologiczne w Warszawie, Instytut Archeologii UMCS, 2008. – S. 33–106.

48. Burdukiewicz, J. M. Problematyka paleolitu dolnego i środkowego w świetle badań archeologów polskich / J. M. Burdukiewicz // Archeologia i prahistoria Polska w ostatnim półwieczu / pod red. M. Kobusiewicza i S. Kurnatowskiego. – Poznań : Wydawnictwo PTPN, 2000. – S. 27–37.

49. Butrimas, A. Duonkalnis: vėlyvojo neolito gyvenvietė, alkas ir kapinynas. Archeologiniai tyrimai // Lietuvos archeologija. – 1985. – T. 4. – P. 30–49.

50. Butrimas, A. Spigino mezolito kapai / A. Butrimas // Lietuvos archeologija. – 1992. – T. 8. – P. 4–10.

51. Butrimas, A. Donkalnio ir Spigino mezolito–neolito kapinynai: seniausi laidojimo paminklai Lietuvoje / A. Butrimas. – Vilnius: Vilniaus dailės akademijos leidykla, 2012. – 256 p.

52. Chmielewska, M. Grób kultury tardenoaskiej w Janisławicach, pow. Skierniewice / M. Chmielewska // Wiadomości Archeologiczne. – 1954. – T. XX, Z. 1. – S. 54–96.

53. Cyrek, K. Nieznane zabytki z grobu w Janisławicach woj. Skierniewickie i nowe obserwacje nad tym zespołem / K. Cyrek // Wiadomości Archeologiczne. – 1978. – T. XLIII, Z. 2. – S. 213–225.

54. Cyrek, K. Eine bisher unbekannte Methode der Mikrolithenproduktion / K. Cyrek // Veröffentlichungen des Museums für Ur- und Frühgeschichte Potsdam. – 1981. – Band 14/15. Mesolithikum in Europa. 2. Internationales Symposium, Potsdam, 3. bis 8. April 1978 Bericht. – P. 285–288.

55. Cyrek, K. Uzyskiwanie i użytkowanie surowców krzemiennych w mezolicie dorzeczy Wisły i górnej Warty / K. Cyrek // Prace i Materiały Muzeum Archeologicznego i Etnograficznego w Łodzi. Seria Archeologiczna. – 1981 (1983). – Nr. 28. – S. 5–108.

56. Cyrek, K. Surowce krzemienne w mezolicie dorzeczy Wisły i górnej Warty / K. Cyrek // Człowiek i środowisko w pradziejach / pod red. J. K. Kozłowskiego, S. K. Kozłowskiego. – Warszawa : Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1983. – S. 106–113.

57. Cyrek, K. On the distribution of chocolate flint in Late Mesolithic of the Vistula basin / K. Cyrek // Archaeologia Polona. – 1995. – Vol. 33. – P. 99–109.

58. Cyrek, K. W odpowiedzi Hannie Więckowskiej / K. Cyrek // Archeologia Polski. – 1999. – T. XLIV, Z. 1–2. – S. 144–146.

59. Cyrek, K. Mezolit ceramiczny w środkowej i północno-wschodniej Polsce i jego związki z neolitycznymi kulturami niżowymi / K. Cyrek, R. Grygiel, K. Nowak // Prace i Materiały Muzeum Archeologicznego i Etnograficznego w Łodzi. Seria Archeologiczna. – 1982 (1985). – Nr. 29. – S. 5–70.

60. Cyrek, K. The Basics for Distinguishing the Ceramic Neolithic in the Polish Lowland / K. Cyrek, R. Grygiel, K. Nowak // Archaeologia Interregionalis. – Warszawa, 1986. – Nr. 7 : Problems of the Stone Age in Pomerania / ed. T. Malinowski. – P. 95–125.

61. Cyrek, M. Nowy sposób produkcji zbrojników / M. Cyrek, K. Cyrek // Sprawozdania Archeologiczne. – 1978. – T. XXX. – S. 275–279.

62. Cyrek, M. La sépulture Mésolithique de Janisławice / M. Cyrek, K. Cyrek // Inventaria Archaeologica : Pologne. – Warszawa ; Łódź : Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1980. – Fasc. XLIV, pl. 273.

63. On reffiting of stone artefacts / E. Cziesla // The Big Puzzle. International Symposium on Refitting Stone Artefacts / eds. E. Cziesla [et. al.]. – Bonn : Holos Verlag, 1990. – P. 9–43.

64. Domańska, L. Kaukasko-nadczarnomorskie wzorce kulturowe w rozwoju późnomezolitycznych społeczeństw niżu strefy pogranicza Europy Wschodniej i Środkowej / L. Domańska. – Inowrocław : UAM w Poznaniu, Uniwersytet Łódzki, 1990. – 127 s.

65. Domańska, L. Obozowisko kultury janisławickiej w Dębach, woj. włocławskie, stanowisko 29 / L. Domańska. – Poznań ; Inowrocław : UAM w Poznaniu, Uniwersytet Łódzki, 1991. – 121 s.

66. Galiński, T. Uwagi na temat mezolitu ceramicznego i neolitu strefy leśnej na Niżu Polskim / T. Galiński // Archeologia Polski. – 1991. – T. XXXVI, Z. 1–2. – S. 5–71.

67. Galiński, T. Społeczeństwa mezolityczne. Osadnictwo, gospodarka, kultura ludów łowieckich w VIII–IV tys. p. n. e. na terenie Europy / T. Galiński. – Szczecin : Muzeum Narodowe w Szczecinie, 2002. – 406 s.

68. Ginter, B. Remarks on the Origin of Some Mesolithic Cultures in Poland / B. Ginter // Mesolithic in Europe. – Warszawa, 1973. – P. 177–186.

69. Ginter, B. Stanowisko mezolityczne odkryte we wsi Dąbrówka, pow. Włoszczowa / B. Ginter // Światowit. – 1975. – T. XXXIV. – S. 245–285.

70. Ginter, B. Technika obróbki i typologia wyrobów kamiennych paleolitu i mezolitu / B. Ginter, J. K. Kozłowski. – Wyd. drugie popr. i uzup. – Warszawa : Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1975. – 224 s.

71. Girininkas, A. Lietuvos archeologija / A. Girininkas ; [redkol.: A. Bliujinė [et al.]; Klaipėdos universiteto Baltijos regiono Istorijos ir archeologijos institutas. – Vilnius : Versus aureus, 2009. – T. 1 : Akmens amžius. – 2009. – 328 p.

72. Głosik, J. Groby szkieletowe barwione ochrą z Pierkunowa, pow. Giżycko nad jeziorem Kisajno / J. Głosik // Wiadomości Archeologiczne. – 1969. – T. XXXIV, Z. 2. – S. 189–203.

73. Grace, R. The «châine opératoire» approach to lithic analysis / R. Grace // Internet Archaeology [Electronic resource]. – 1997. – Iss. 2. – Mode of access : http://dx.doi.org/10.11141/ia.2.3. – Date of access : 08.06.2013.

74. Jablonskytė-Rimantienė, R. Maglemozine stovykla Maksimonys (Varenos raj. Merkines apyl.) / R. Jablonskytė-Rimantienė // Lietuvos TSR Mokslų akademijos darbai. Ser. A. – 1966. – T. 3 (22). – P. 43–54.

75. Kaczanowska, M. Studia nad surowcami krzemiennymi południowej części Wyżyny Krakowsko-Częstochowskiej / M. Kaczanowska, J. K. Kozłowski // Acta Archaeologica Carpathica. – 1976. – T. XVI. – S. 201–219.

76. Kempisty, E. Osadnictwo paleolityczne, mezolityczne i paraneolityczne w rejonie Woźnej Wsi, woj. Łomżyńskie / E. Kempisty, Z. Sulgostowska. – Warszawa : Semper, 1991. – 158 s.

77. Kempisty, E. Osadnictwo z epoki kamienia i wczesnej epoki brązu na stanowisku 1 w Sośni, woj. Łomżyńskie / E. Kempisty, H. Więckowska. – Wrocław ; Warszawa ; Kraków ; Gdańsk ; Łódź : Ossolineum, 1983. – 124 s.

78. Kobusiewicz, M. Polskie badania mezolitu w półwieczu 1947–1997 / M. Kobusiewicz // Archeologia i prahistoria Polska w ostatnim półwieczu / pod red. M. Kobusiewicza i S. Kurnatowskiego. – Poznań : Wydawnictwo PTPN, 2000. – S. 53–61.

79. Kozłowski, J. K. Pradzieje Europy od XL do IV tysiąclecia p. n. e. / J. K. Kozłowski, S. K. Kozłowski. – Warszawa : Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1975. – 504 s.

80. Kozłowski, J. K. Epoka kamienia na ziemiach polskich / J. K. Kozłowski, S. K. Kozłowski. – Warszawa : Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1977. – 388 s.

81. Kozłowski, S. K. Uwagi o późnym paleolicie i mezolicie wschodniej części Kotliny Sandomierskiej / S. K. Kozłowski // Archeologia Polski. – 1964. – T. IX, Z. 2. – S. 325–350.

82. Kozłowski, S. K. Z problematyki polskiego mezolitu / S. K. Kozłowski // Archeologia Polski. – 1965. – T. X, Z. 1. – S. 151–177.

83. Kozłowski, S. K. Niektóre uwagi o polskim mezolicie (na marginesie referatu H. Więckowskiej i M. Marczak) / S. K. Kozłowski // II Konferencja poświęcona problematyce prahistorii pleistocenu i wczesnego holocenu Polski, Warszawa, 3–5.V.1965 r. – Warszawa, 1965. – S. 33–54.

84. Kozłowski, S. K. Z problematyki polskiego mezolitu (cz. 2). O podziale chronologicznym / S. K. Kozłowski // Materiały do prahistorii plejstocenu i wczesnego holocenu Polski / pod red. W. Chmielewskiego. – Wrocław ; Warszawa ; Kraków : Ossolineum, 1967. – S. 46–75.

85. Kozłowski, S. K. Z problematyki polskiego mezolitu, cz. 4. O mezolicie Polski północno-wschodniej i terenów sąsiednich / S. K. Kozłowski // Archeologia Polski. – 1967. – T. XII, Z. 2. – S. 219–256.

86. Kozłowski, S. K. Materiały mezolityczne ze stanowiska II we wsi Płazówka, pow. Kolbuszowa (przysiółek Przewóz) / S. K. Kozłowski // Światowit. – 1968. – T. XXIX. – S. 29–57.

87. Kozłowski, S. K. Z problematyki polskiego mezolitu. Wybrane zagadnienia z pradziejów dorzecza górnej i środkowej Wisły we wczesnym holocenie / S. K. Kozłowski // Wiadomości Archeologiczne. – 1969. – T. XXXIV, Z. 1. – S. 70–149.

88. Kozłowski, S. K. Z problematyki polskiego mezolitu (cz. 10). Kościane harpuny i ostrza mezolityczne / S. K. Kozłowski // Światowit. – 1969. – T. XXX. – S. 135–152.

89. Kozłowski, S. K. Les civilisations mésolithiques en Pologne / S. K. Kozłowski // Geographia Polonica. – 1969. – Vol. 17. – P. 415–428.

90. Kozłowski, S. K. Le Mésolithique de la Pologne / S. K. Kozłowski // Archaeologia Polona. – 1969. – Vol. XI. – P. 7–33.

91. Kozłowski, S. K. Północno-wschodni krąg kultur mezolitycznych / S. K. Kozłowski // Z polskich badań nad epoką kamienia / pod red. W. Chmielewskiego. – Wrocław ; Warszawa ; Kraków ; Gdańsk : Ossolineum, 1971. – S. 27–102.

92. Kozłowski, S. K. Pradzieje ziem polskich od IX do V tysiąclecia p. n. e. / S. K. Kozłowski – Warszawa : Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1972. – 322 s.

93. Kozłowski, S. K. Cultural Differentiation of Europe from 10th to 5th Millennium B. C. / S. K. Kozłowski. – Warsaw : University Press, 1975. – 259 p.

94. Kozłowski, S. K. Ważniejsze mezolityczne materiały powierzchniowe z terenu Warszawy i województwa warszawskiego / S. K. Kozłowski // Światowit. – 1975. – T. XXXIV. – S. 149–188.

95. Kozłowski, S. K. Atlas of the Mesolithic in Europe (First Generations Maps) / S. K. Kozłowski. – Warszawa : Warsaw University Press, 1980. – 211 p.

96. Kozłowski, S. K. Mesolithic in Poland. A New Approach / S. K. Kozłowski. – Warszawa : Wydawnictwa Uniwersytetu Warszawskiego, 1989. – 246 s.

97. Krukowski, S. Pierwociny krzemieniarskie górnictwa, transportu i handlu w holocenie Polski. Wnioski z właściwości surowców i wyrobów / S. Krukowski // Wiadomości Archeologiczne. – 1920. – T. V, Z. 3–4. – S. 185–206.

98. Krukowski, S. Pierwociny krzemieniarskie górnictwa, transportu i handlu w holocenie Polski. Wnioski z właściwości surowców i wyrobów. Cz. II / S. Krukowski // Wiadomości Archeologiczne. – 1922. – T. VII. – S. 34–57.

99. Libera, J. Późny paleolit i mezolit środkowowschodniej Polski. Część pierwsza. Analiza / J. Libera. – Lublin : Wydawnictwo UMCS, 1995. – 181 s.

100. Libera, J. Wykorzystanie krzemienia świeciechowskiego i gościeradowskiego w paleolicie schyłkowym i mezolicie w międzyrzeczu Wisły i Bugu oraz w dorzeczu Sanu (zarys problematyki) / J. Libera // Krzemień świeciechowski w pradziejach. Materiały z konferencji w Ryni, 22–24.05.2000 / pod red. B. Matraszek, S. Salacińskiego. – Warszawa : Semper, 2002. – S. 29–49.

101. Libera, J. Badania nad kulturą janisławicką w międzyrzeczu Wisły i Bugu oraz dorzeczu Sanu / J. Libera // Kultura janisławicka w Polsce północno-wschodniej i na terenach sąsiednich / red. E. Kawałkowa. – Ostrołęka, 2003. – S. 19–41.

102. Libera, J. Obozowisko kultury janisławickiej w Gwoździcu, stan. 9, gm. Bojanów, woj. Tarnobrzeg, w świetle badań 1966–1967 / J. Libera, A. Talar // Sprawozdania Archeologiczne. – 1990. – T. XLII. – S. 9–67.

103. Libera, J. Późnomezolityczne stanowisko 13 w Barakach Starych, gm. Zaklików, woj. Tarnobrzeg / J. Libera, D. Tymczak // Sprawozdania Archeologiczne. – 1990. – T. XLII. – S. 69–93.

104. Libera, J. Mezolityczne stanowisko w Barakach Starych, gm. Zaklików, woj. Tarnobrzeg / J. Libera, A. Zakościelna // Sprawozdania Archeologiczne. – 1986. – T. 38. – S. 9–30.

105. Martinón-Torres, M. Chaîne opératoire : The concept and its applications within the study of technology / M. Martinón-Torres // Gallaecia. – 2002. – N. 21. – P. 29–43.

106. Migal, W. Microblade pressure technique at the Late Mesolithic site Dęby 29. Experimental approach / W. Migal, M. Wąs // The Stone : Technique and Technology / eds. A. Wiśniewski, T. Płonka, J. M. Burdukiewicz. – Wrocław : Institute of Archaeology, University of Wrocław, 2006. – P. 179–188.

107. Mook, W. G. Datowanie C14 próbek węgla z Tomaszowa / W. G. Mook // Kopalnia krzemienia czekoladowego w Tomaszowie / R. Schild, H. Królik, M. Marczak. – Wrocław ; Warszawa ; Kraków ; Gdańsk ; Łódź : Ossolineum, 1985. – S. 185.

108. Obuchowski, W. Shyłkowy paleolit i mezolit prawobrzeżnej strefy dorzecza górnego Niemna : maszynopis pracy magisterskiej / W. Obuchowski ; Instytut Archeologii Uniwersytetu Warszawskiego. – Warszawa, 1998. – 167 s.

109. Obuchowski, W. Materiały kultury janisławickiej z obszaru prawobrzeżnej strefy górnego Niemna / W. Obuchowski // Kultura janisławicka w Polsce północno-wschodniej i na terenach sąsiednich / red. E. Kawałkowa. – Ostrołęka, 2003. – S. 83–100.

110. Obuchowski, W. Zabytki krzemienne i kamienne od paleolitu do wczesnej epoki żelaza z terenów Białorusi w zbiorach Państwowego Muzeum Archeologicznego w Warszawie / W. Obuchowski. – Warszawa : Państwowe Muzeum Archeologiczne, 2003. – 207 s.

111. Obuchowski, W. Materiały paleolityczne i mezolityczne z Zachodniej Białorusi / W. Obuchowski. – Warszawa : Uniwersytet Warszawski, 2009. – 296 s.

112. Ostrauskas, T. Vakarų Lietuvos mezolitas / T. Ostrauskas // Lietuvos archeologija. – 1996. – T. 14. – P. 192–212.

113. Ostrauskas, T. Lietuvos mezolito gyvenviečių periodizacija : Daktaro disertacijos santrauka. Humanitariniai mokslai, istorija (05 H) / T. Ostrauskas ; Lietuvos istorijos institutas. – Vilnius, 1998. – 40 p.

114. Ostrauskas, T. Kabelių akmens amžiaus 2-oji gyvenvietė / T. Ostrauskas // Lietuvos archeologija. – 1999. – T. 16. – P. 31–66.

115. Ostrauskas, T. Mesolithic Kunda Culture. A Glimpse from Lithuania / T. Ostrauskas // Muinasaja teadus 8. De temporibus antiquissimis ad honorem Lembit Jaanits. – Tallinn, 2000. – P. 167–180.

116. Ostrauskas, T. Kabeliai 2 Stone Age Site / T. Ostrauskas // Archaeologia Baltica. – 2002. – Vol. 5. – P. 51–82.

117. Rimantienė, R. Akmens amžius Lietuvoje / R. Rimantienė. – Vilnius : Mokslas, 1984. – 343 p.

118. Robinson, W. S. A Method for Chronologically Ordering Archaeological Deposits / W. S. Robinson // American Antiquity. – 1951. – Vol. XVI, N 4. – P. 293–301.

119. Sawicki, L. Przyczynek do znajomości prehistorji Polesia / L. Sawicki // Ziemia. – 1925. – Nr. 6–7–8. – S. 136–148.

120. Schild, R. Paleolit końcowy i schyłkowy / R. Schild // Materiały do prahistorii ziem polskich. Część I. Paleolit i mezolit / pod red. W. Chmielewskiego. – Warszawa, 1964. – S. 129–238.

121. Schild, R. Remarques sur les principes de la systématique culturelle du Paléolithique (Surtout du paléolithique final) / R. Schild // Archaeologia Polona. – 1965. – Vol. VIII. – P. 67–81.

122. Schild, R. Flint mining and trade in Polish prehistory as seen from the perspective of the chocolate flint of Central Poland. A second approach / R. Schild // Acta Archaeologica Carpathica. – 1976. – T. XVI. – S. 147–177.

123. Schild, R. Introduction to Dynamic Technological Analysis of Chipped Stone Assemblages / R. Schild // Unconventional Archaeology. New Approaches and Goals in Polish Archaeology. – Wrocław ; Warszawa ; Kraków ; Gdańsk : Ossolineum, 1980. – P. 57–85.

124. Schild, R. Późny mezolit. Próba wieloaspektowej analizy otwartych stanowisk piaskowych / R. Schild, M. Marczak, H. Królik. – Wrocław ; Warszawa ; Kraków ; Gdańsk : Ossolineum, 1975. – 263 s.

125. Schild, R. Kopalnia krzemienia czekoladowego w Tomaszowie / R. Schild, H. Królik, M. Marczak. – Wrocław ; Warszawa ; Kraków ; Gdańsk ; Łódź : Ossolineum, 1985. – 247 s.

126. Sellet, F. Chaîne opératoire: the concept and its applications / F. Sellet // Lithic Technology. – 1993. – Vol. 18. No. 1–2. – P. 106–112.

127. Sulgostowska, Z. Prahistoria międzyrzecza Wisły, Niemna i Dniestru u schyłku plejstocenu / Z. Sulgostowska. – Warszawa : Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1989. – 255 s.

128. Sulgostowska, Z. Pochówek mezolityczny z okresu atlantyckiego w Wóźnej Wsi, woj. Łomżyńskie / Z. Sulgostowska // Archeologia Polski. – 1990. – T. XXXV, Z. 1. – S. 47–56.

129. Sulgostowska, Z. The Janisławice Burial from Poland: Radiocarbon Dating / Z. Sulgostowska // Mesolithic Miscellany. – 1990. – Vol. 11, N 2. – P. 2–5.

130. Sulgostowska, Z. Kontakty społeczności późnopaleolitycznych i mezolitycznych między Odrą, Dźwiną i Górnym Dniestrem / Z. Sulgostowska. – Warszawa : IAiE PAN, 2005. – 344 s.

131. Sulgostowska, Z. Szczególna pozycja krzemienia czekoladowego wśród społeczności między Odrą, Dźwiną i Dniestrem u schyłku paleolitu i w późnym mezolicie / Z. Sulgostowska // Krzemień czekoladowy w pradziejach. Materiały z konferencji w Orońsku, 08–10.10.2003/ pod red. W. Borkowskiego [i in.]. – Warszawa ; Lublin : Państwowe Muzeum Archeologiczne w Warszawie, Instytut Archeologii UMCS, 2008. – S. 151–170.

132. Szymczak, K. Styl technologiczny wiórów krzemiennych. Badania na przykładzie późnomezolitycznych zespołów kultur janisławickiej i chojnicko-pieńkowskiej / K. Szymczak // Wiadomości Archeologiczne. – 1982. – T. XLVII, Z. 2. – S. 131–142.

133. Szymczak, K. Epoka kamienia Polski północno-wschodniej na tle Środkowoeuropejskim / K. Szymczak. – Warszawa : Wydawnictwa Fundacji «Historia pro futuro», 1995. – 191 s.

134. Szymczak, K. Kultura janisławicka/krąg kultur janisławickich – rozwój poglądów i stan badań / K. Szymczak // Kultura janisławicka w Polsce północno-wschodniej i na terenach sąsiednich / red. E. Kawałkowa. – Ostrołęka, 2003. – S. 7–17.

135. Tomaszewski, A. J. Metoda składanek wytworów kamiennych i jej walory poznawcze / A. J. Tomaszewski // Archeologia Polski. – 1986. – T. XXXI, Z. 2. – S. 239–277.

136. Wąs, M. Składanki mezolitycznych materiałów krzemiennych ze stanowiska Gwoździec 9, woj. Podkarpackie / M. Wąs // Krzemień świeciechowski w pradziejach. Materiały z konferencji w Ryni, 22–24.05.2000 / pod red. B. Matraszek i S. Salacińskiego. – Warszawa : Semper, 2002. – S. 71–87.

137. Wąs, M. Technologia krzemieniarstwa kultury janisławickiej / M. Wąs. – Łódź ; Instytut Archeologii Uniwersytetu Łódzkiego, 2005. – 271 s.

138. Wąs, M. Raw material and flint processing strategy in the Late Mesolithic in Poland. Results of refitting / M. Wąs // The Stone : Technique and Technology / eds. A. Wiśniewski, T. Płonka and J. M. Burdukiewicz. – Wrocław : Institute of Archaeology, University of Wrocław, 2006. – P. 173–178.

139. Wąs, M. Some remarks on contacts between Late Mesolithic hunter-gatherer societies as reflected in their flint technology: a case study from Central Poland / M. Wąs // Skilled Production and Social Reproduction. Aspects on Traditional Stone-Tool Technologies / eds. J. Apel and K. Knutsson. – Uppsala : Societas Archaeologica Upsaliensis, 2006. – P. 315–321.

140. Wąs, M. O dystrybucji «czekolady» w kulturze janisławickiej z perspektywy technologii krzemieniarstwa / M. Wąs // Krzemień czekoladowy w pradziejach. Materiały z konferencji w Orońsku, 08–10.10.2003 / pod red. W. Borkowskiego [i in.]. – Warszawa ; Lublin : Państwowe Muzeum Archeologiczne w Warszawie, Instytut Archeologii UMCS, 2008. – S. 171–183.

141. Więckowska, H. Mezolit / H. Więckowska // Materiały do prahistorii ziem polskich. Część I. Paleolit i mezolit / pod red. W. Chmielewskiego. – Warszawa, 1964. – S. 240–270.

142. Więckowska, H. Problem mezolitu na Mazowszu / H. Więckowska // Archeologia Polski. – 1964. – T. IX, Z. 1. – S. 30–38.

143. Więckowska, H. Le Mésolithique tardif en Pologne (avec considération particulière de la Mazovie) / H. Więckowska // Geographia Polonica. – 1969. – Vol. 17. – P. 395–414.

144. Więckowska, H. Zagadnienie zróżnicowań kulturowych w mezolicie Polski / H. Więckowska // Światowit. – 1969. – T. XXX. – S. 23–115.

145. Więckowska, H. Społeczności łowiecko-rybackie wczesnego holocenu / H. Więckowska // Prahistoria ziem polskich. T. I–V / pod red. W. Hensla. – Wrocław ; Warszawa ; Kraków ; Gdańsk : Ossolineum, 1975–1981. – T. I : Paleolit i mezolit / pod red. W. Chmielewskiego i W. Hensla. – 1975. – S. 339–438.

146. Więckowska, H. Osadnictwo późnopaleolityczne i mezolityczne nad dolną Narwią / H. Więckowska. – Wrocław ; Warszawa ; Kraków ; Gdańsk : Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1985. – 171 s.

147. Więckowska, H. Jeszcze raz o sposobach wykonywania zbrojników / H. Więckowska // Archeologia Polski. – 1998. – T. XLIII, Z. 1–2. – S. 167–174.

148. Więckowska, H. Próba podziału kulturowego mezolitu Mazowsza / H. Więckowska, M. Marczak // II Konferencja poświęcona problematyce prahistorii plejstocenu i wczesnego holocenu Polski. Warszawa, 3–5.V.1965 r. – Warszawa, 1965. – S. 1–32.

149. Więckowska, H. Próba podziału kulturowego mezolitu Mazowsza / H. Więckowska, M. Marczak // Materiały do prahistorii plejstocenu i wczesnego holocenu Polski / pod red. W. Chmielewskiego. – Wrocław ; Warszawa ; Kraków : Ossolineum, 1967. – S. 9–45.

150. Willis, R. Deby 29 – The Functional Analysis of a Late Mesolithic Site in Poland, and its Significance in the Polish Context / R. Willis // Contributions to the Mesolithic in

Europe. Papers presented at the Fourth International Symposium «The Mesolithic in Europe», Leuven 1990 / ed. P. M. Vermeersch and P. Van Peer. – Leuven : Leuven University Press, 1990. – P. 295–297.

151. Winiarska-Kabacińska, M. Analiza funkcjonalna wybranych do studiów nad dystrybucją surowców krzemiennych u shyłku paleolitu i mezolicie / M. Winiarska-Kabacińska // Sulgostowska, Z. Kontakty społeczności późnopaleolitycznych i mezolitycznych między Odrą, Dźwiną i Górnym Dniestrem / Z. Sulgostowska. – Warszawa : IAiE PAN, 2005. – S. 271–292.

152. Zaliznyak, L. R. Rimantienė as a Founder of the Periodization of the Final Palaeolithic of North-West Eastern Europe / L. Zaliznyak // Lietuvos archeologija. – 2000. – T. 19. – P. 31–45.

Резюме

В. В. Ашейчик

Кремневый инвентарь яниславицкой культуры: основные направления изучения и некоторые проблемы таксономического деления

Древности яниславицкой культуры, с которой связывают памятники позднего мезолита в бассейне Вислы, Немана и Припяти, представлены почти исключительно кремневым инвентарем. Рассмотрены некоторые аспекты практики применения типологического анализа, а также сделан обзор нетипологических исследований яниславицких кремневых комплексов. Детально проанализирована одна из центральных тем, обсуждаемая в историографии, – проблема территориального деления культуры.

Summary

V. V. Asheichyk

Flint Inventories of Janisławice Culture: Main Aspects of Research and Some Issues of Taxonomic Division

The article discusses some aspects of typological analyses on flint assemblages of Janisławice culture, which was spreading over the Vistula, Neman and Prypiat rivers basins in the Late Mesolithic. Overview of non-typological studies on Janisławice flint industry (technology, use of raw material) is presented as well. An issue of regional division is thoroughly analysed.

Паступіў 24.05.2013 г.

УДК 903/904(476.1)

В. У. Ашэйчык, *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, аспірант, магістр гістарычных навук (г. Мінск, Беларусь);*
А. У. Зуева, *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, старшы выкладчык, кандыдат гістарычных навук (г. Мінск, Беларусь);*
М. М. Чарняўскі, *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, дацэнт, кандыдат гістарычных навук (г. Мінск, Беларусь)*

Новыя матэрыялы каменнага веку з вярхоўяў Нёмана

Вясной 2012 г. аўтары артыкула абследавалі два раней вядомыя помнікі каменнага веку – Мікалаеўшчына-1 і Русаковічы-4 (Мікалаеўшчынскі сельсавет Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці)[1].

Мікалаеўшчына-1. Стаянка памерамі 150 × 40 м размешчана на краі правабярэжнай тэрасы р. Нёман, на паўднёвай ускраіне аднайменнай вёскі, праз 0,65 км на паўднёвы ўсход ад моста ў бок вёскі Шахноўшчына. Паўночная частка помніка моцна пашкоджана сучаснай земляной канструкцыяй (верагодна, стрэльбішчам), цэнтральная частка – знішчана трасай газаправода, пракладзенага восенню 2011 г.

Стаянка была выяўлена ў 1975 г. М. М. Чарняўскім. У тым жа годзе даследчык заклаў на помніку шурф, а ў 1986 г. – паўторна абследаваў тэрыторыю паселішча і сабраў пад'ёмны матэрыял [4, с. 15–16; 5, с. 37]. У выніку згаданых прац была атрымана параўнальна шматлікая калекцыя крамянёвых вырабаў і фрагментаў посуду, у якой М. М. Чарняўскі, а пазней і В. Л. Лакіза вылучылі артэфакты прыпяцка-нёманскай і нёманскай культур, кола культуры шнуравой керамікі [2, с. 218; 3, с. 73; 6].

У 2012 г. аўтары правялі збор пад'ёмнага матэрыялу і шурфоўку помніка. Знаходкі сустракаліся на незадзірванелых участках па ўсёй плошчы стаянкі. Шурф памерамі 1 × 2 м быў закладзены ў сярэдняй частцы паселішча, на схіле тэрасы. Магутнасць культурнага слою дасягала 0,6 м.

У выніку праведзеных прац была атрымана прадстаўнічая калекцыя крамянёвых артэфактаў (274 адзінкі) і керамікі (111 фрагментаў).

Асноўную частку крамянёвага інвентару (гл. табліцу) складаюць прадукты дэбітажу: пласціны і іх фрагменты – 14,2%, адшчэпы і іх фрагменты (разам з лускавінкамі) – 62,8, абломкі і фрагменты неазначальных сколаў – 15,3%. Марфалагічныя прылады і іх фрагменты нешматлікія – 7,7% ад агульнай колькасці крамянёвых артэфактаў.

Крамянёвы інвентар, атрыманы на помніку, змешаны. На падставе тэхніка-марфалагічнага аналізу матэрыялаў былі вылучаны два комплексы:

познамезалітычны (звязаны, верагодна, з яніславіцкай культурай), да якога аднесены асіметрычная трапецыя з рэгулярнай пласціны (мал. 1: *17*), мікраліт са скошаным рэтушшу канцом (мал. 1: *15*), фрагмент вастрыя са скошаным рэтушшу канцом (мал. 1: *16*), рэтушны адзінарны разец на шырокай падскарыністай рэгулярнай пласціне (мал. 1: *14*), скрабок з дугападобнай скрабніцай і адным рэтушаваным краем на дробным падскарыністым адшчэпе (мал. 1: *12*), двухбаковы скрабач на адшчэпе (мал. 1: *11*), а таксама серыя рэгулярных пласцін, рэтушаваных і без апрацоўкі;

познанеалітычны, прадстаўлены двума фрагментамі наканечнікаў стрэл з біфацыяльнай апрацоўкай (мал. 1: *13*).

Керамічны комплекс, атрыманы на помніку ў 2012 г., складаецца з 93 фрагментаў ляпнога посуду, 17 фрагментаў кругавога посуду і фрагмента неазначальнага глінянага вырабу.

Уся ляпная кераміка датавана эпохай неаліту і можа быць падзелена на наступныя групы.

Кераміка прыпяцка-нёманскай ранненеалітычнай культуры (58 фрагментаў, з іх 17 – арнаментаваныя).

Кераміка мае руды і шэра-руды колер. Пераважная большасць фрагментаў паходзіць ад гладкасценага посуду, у пяці выпадках унутраныя паверхні апрацаваны рознанакіраванымі расчосамі грэбеня. Таўшчыня сценак складае 6–12 мм.

У залежнасці ад выкарыстаных адтлушчальнікаў кераміка падзелена на дзве групы: 1) кераміка з параўнальна вялікай колькасцю раслінных дамешак, дробнай жарствай, пяском; 2) кераміка з вялікай колькасцю раслінных дамешак, невялікай колькасцю шамоту, нешматлікімі ўключэннямі дробнай жарствы.

Частка керамікі аздоблена. Найбольш распаўсюджаныя арнаментальныя матывы – гарызантальныя пасы нахіленых адбіткаў грэбеня (мал. 1: *8*), авальнага штампа. Выяўлены таксама фрагменты посуду, арнаментаванага акруглымі ўвагнутасцямі (мал. 1: *2*); «елачкай», утворанай грабеньчатымі адбіткамі (мал. 1: *4*); «капыткамі» (мал. 1: *3*). У адным выпадку гарызантальныя пасы нахіленых адбіткаў грэбеня спалучаліся з пасам ямкавых уціскання ў (мал. 1: *1*).

[1] У даследаваннях прымалі ўдзел студэнты 3-га і 4-га курсаў спецыялізацыі «Археалогія» гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Агульная структура крамянёвага інвентару помнікаў Русаковічы-4 і Мікалаеўшчына-1. Даследаванні 2012 г.

Марфалагічная група*	Катэгорыя	Русаковічы-4		Мікалаеўшчына-1		
		Паверхневыя зборы	Усяго ў групе	Шурф	Паверхневыя зборы	Усяго ў групе
I	Абломкі канкрэцый з адзінкавымі сколамі і нуклеападобныя абломкі	7	7	–	–	–
	Нуклеусы ад пласцін і іх фрагменты, аднапляцовачныя	6	14	–	–	–
	Нуклеусы ад пласцін, двухпляцовачныя	8		–	–	
	Нуклеус ад адшчэпаў і пласцінак, двухпляцовачны	1	1	–	–	–
	Нуклеусы ад адшчэпаў, аднапляцовачныя	3	11	–	–	–
	Нуклеусы ад адшчэпаў, двухпляцовачныя	2		–	–	
	Нуклеусы ад адшчэпаў, са шматразовай зменай арыентацыі	6		–	–	
	Неазначальныя нуклеусы (фрагменты)	7	7	–	–	–
	Лушчні і іх фрагменты	3	3	–	–	–
	Пласціны з захлыстам і іх фрагменты	4	16	–	–	–
	Рабрыстыя пласціны і іх фрагменты	12		–	–	
II	Пласціны скарыністыя і іх фрагменты	6	82	1	3	39
	Пласціны падскарыністыя і іх фрагменты	30		4	9	
	Пласціны без скарынкі і іх фрагменты	46		7	15	
	Адшчэпы скарыністыя	27	347	4	8	149
	Адшчэпы падскарыністыя	78		7	17	
	Адшчэпы са скарынкай (фрагменты)	28		5	8	
	Адшчэпы без скарынкі	167		14	45	
	Адшчэпы без скарынкі (фрагменты)	46		15	26	
	Адшчэп з лушчня	1		–	–	
	Разцовы скол	1	56	–	–	65
	Лускавінкі (< 1,5 см)	21		9	14	
	Дробныя фрагменты неазначальных сколаў	9		4	8	
	Абломкі неазначальныя	25		13	17	
III	Наканечнік стралы на пласціне	1	32	–	–	11
	Трапецыі	1		–	1	
	Вастрыі са скошаным канцом і іх фрагменты	–		–	2	
	Укладыш	1		–	–	
	Наканечнікі з біфацыяльнай апрацоўкай і іх фрагменты	1		–	2	
	Разцы	3		1	–	
	Скрабкі	11		1	1	
	Скрабачы	4		2	–	
	Скрэблы	2		–	–	
	Раклет	1		–	–	
	Камбінаваныя прылады (разец + скрабок)	2		–	–	
	Праколка	1		–	–	
	Нож на адшчэпе	1		–	–	
	Прылада са скоблепадобнай выемкай	1		–	–	
	Цёслы	2		–	–	
	Макралітычны выраб з біфацыяльнай апрацоўкай	–		1	–	
	Скол аднаўлення пляцоўкі нуклеуса з рэтушшу	1	52	–	–	10
	Рабрыстая пласціна з рэтушшу	–		–	1	
	Рэтушаваныя пласціны і іх фрагменты	10		2	5	
	Рэтушаваныя адшчэпы і іх фрагменты	40		–	2	
	Неазначальная прылада (фрагмент)	1		–	–	
	Усяго	***628***		*90*	*184*	***274***

* I – нуклеусы і тэхнічныя формы, звязаныя з іх падрыхтоўкай і эксплуатацыяй; II – прадукты дэбітажу; III – марфалагічныя прылады.



Мал. 1. Кераміка (*1–10*) і крамянёвыя вырабы (*11–17*). Мікалаеўшчына-1. 2012 г. Малюнак А. У. Зуевай

Кераміка лысагорскага этапу нёманскай культуры (28 фрагментаў, з іх 13 – арнаментаваныя).

Кераміка мае руды і шэра-руды колер. Усе абломкі паходзяць ад гладкасценнага посуду, 16 фрагментаў вылучаюцца надзвычай добра загладжанымі, нібы ангабаванымі, знешнімі паверхнямі. Таўшчыня сценак дасягае 5–11 мм.

У залежнасці ад выкарыстаных адтлушчальнікаў кераміка падзелена на дзве групы: 1) кераміка з невялікай колькасцю раслінных дамешак, параўнальна вялікай колькасцю розназярністай жарствы і пяска; 2) кераміка з невялікай колькасцю раслінных дамешак, параўнальна вялікай колькасцю дробназярністай жарствы і невялікай колькасцю шамоту.

Каля паловы фрагментаў паходзіць ад арнаментаванага посуду. Вылучаны такія арнаментальныя матывы, як гарызантальныя пасы нахіленых адбіткаў грэбеня (мал. 1: *7*) альбо авальнага штампа (мал. 1: *6*), гарызантальныя пасы ямкавых уціскання ў (мал. 1: *5*). У адным выпадку пасы, утвораныя рознымі элементамі, спалучаліся, утвараючы адмысловую кампазіцыю (мал. 1: *9*).

Неазначальная кераміка «ляснога» неаліту. У гэту групу ўключаны шэсць дробных фрагментаў неарнаментаванага посуду з дамешкамі расліннасці і розназярністай жарствы.

Кераміка позняга неаліту (дабраборскі этап нёманскай культуры / кола культуры шнуравой керамікі) прадстаўлена фрагментам сценкі таўшчынёй 6 мм. У цеста дададзена вялікая колькасць буйназярністай жарствы, знешняя паверхня захоўвае сляды прыцірання. Пасудзіна была арнаментавана зігзагам, утвораным нерэгулярнымі адбіткамі лінейнага штампа (мал. 1: *10*).

Кругавы посуд (17 фрагментаў неарнаментаванай керамікі, у тым ліку два фрагменты паліванага посуду) датаваны *эпохай позняга сярэдневякоўя–Новага часу.*

Такім чынам, абследаванне помніка Мікалаеўшчына-1, праведзенае ў 2012 г., паказала наступнае: 1) тэрыторыя помніка была заселена не толькі ў неалітычны час [6; 2, с. 218; 3, с. 73], але і ў эпоху позняга мезаліту; 2) стаянка амаль цалкам знішчана; культурны слой захаваўся выключна ў паўднёвай частцы паселішча.

Русаковічы-4. Стаянка знаходзіцца праз 0,2 км на поўнач ад вёскі, адразу за кар'ерам, уздоўж краю высокай правабярэжнай тэрасы р. Нёман, у месцы

яе плаўнага паніжэння і пераходу ў поплаў. Артэфакты сустракаюцца на ўчастку памерамі каля 0,5 × 0,1 км. Тэрыторыя помніка разворваецца, паўднёвая частка стаянкі забудоўваецца дачамі.

Паселішча выявіў у 1975 г. М. М. Чарняўскі [4, с. 17]. У 2011 г. ён паўторна абследаваў помнік [9, с. 15, мал. 39]. Сабраныя артэфакты дазволілі даследчыку датаваць стаянку эпохай мезаліту [7, 8].

У 2012 г. аўтары артыкула правялі на помніку збор пад'ёмнага матэрыялу. Была атрымана калекцыя, якая складаецца з 628 крамянёў, двух каменных вырабаў, двух фрагментаў ляпной керамікі, 76 фрагментаў кругавой керамікі і аднаго фрагмента кафлі.

Крамянёвы інвентар помніка змешаны (гл. табліцу). На падставе тэхніка-марфалагічнага аналізу артэфактаў былі вылучаныя тры этапы засялення тэрыторыі помніка.

Фінальнапалеалітычны этап існавання паселішча звязаны з тэхнакомплексам з чаранковымі наканечнікамі стрэл. У калекцыі прадстаўлены двухпляцовачны нуклеус ад нерэгулярных пласцін з часткова супадаючымі паверхнямі сколвання і без дадатковай апрацоўкі бакоў і контрфронту (мал. 2: *1*), які мае рысы, характэрныя для традыцый крэмнеапрацоўкі валкушанскай культуры [1, с. 51–52].

Некаторыя артэфакты адпавядаюць прыкметам свідэрскай культуры. Да гэтага комплексу аднесены лазалісты наканечнік стралы на пласціне з насадам, сфармаваным паўстромкай краявой рэтушшу з боку брушка (мал. 2: *2*), і два монафрантальныя двухпляцовачныя нуклеусы ад пласцін (мал. 2: *4, 6*). У ад-



Мал. 2. Крамянёвыя вырабы (*1–7*). Русаковічы-4. 2012 г. Малюнак А. У. Зуевай



Мал. 3. Крамянёвыя вырабы (*1–12*). Русаковічы-4. 2012 г. Малюнак А. У. Зуевай

наго нуклеуса бакі і контрфронт цалкам апрацаваныя, у другога – на контрфронце захаваліся ўчасткі скарынкі.

Асобныя знаходкі – разцы, прадстаўленыя рэтушным сярэдзінным на шырокай пласціне (мал. 2: *7*), адзіночным падоўжным на пласціне (мал. 2: *3*) і двухгранным бакавым здвоеным на супрацьлеглых канцах; дзве камбінаваныя прылады (разец + скрабок) (мал. 2: *5*), большасць знойдзеных канцавых скрабкоў на пласцінах і адшчэпах (мал. 3: *1–4*), моцна спрацаваныя двухпляцовачныя нуклеусы ад пласцін – маюць несумненна фінальнапалеалітычны характар, аднак іх дакладная культурна-храналагічная ідэнтыфікацыя выклікае цяжкасці.

Мезалітычны этап засялення стаянкі прадстаўлены матэрыяламі яніславіцкай культуры. З гэтай таксанамічнай адзінкай звязаны наступныя артэфакты: высокая трапецыя (мал. 3: *8*), укладыш з сячэння рэгулярнай пласціны (мал. 3: *9*), праколка на рэгулярнай пласціне (мал. 3: *12*), мікралітычны скрабок на зламанай рэгулярнай пласціне (мал. 3: *7*), чатыры скрабачы (мал. 3: *6*) і раклет (мал. 3: *5*), дзве цёслы, выкананыя з фрагментаў крамянёвых канкрэцый (мал. 3: *11*), тры фрагменты аднапляцовачных нуклеусаў ад вельмі рэгулярных пласцін (мал. 3: *10*), серыя рэгулярных пласцін, знятых з аднапляцовачных нуклеусаў.

Да эпохі ***неаліту*** (нёманская культура) аднесены трохвугольны наканечнік стралы, апрацаваны краявой біфацыяльнай зубчатай рэтушшу (мал. 4: *2*).

Каменныя вырабы прадстаўлены адным каменным адшчэпам і адной каменнай цяслой (4: *1*). Апошні артэфакт датаваны ў межах шырокага храналагічнага дыяпазону – ад эпохі неаліту да ранняга жалезнага веку.

Ляпная кераміка, знойдзеная ў 2012 г., датавана *неалітычным часам*. Адзін фрагмент – абломак неарнаментаванай сценкі з дамешкамі жарствы і расліннасці ў цесце – належыць да нёманскай культуры. Другі фрагмент адносіцца да кола культуры



Мал. 4. Каменны (*1*) і крамянёвы (*2*) артэфакты, кераміка (фрагмент) (*3*). Русаковічы-4. 2012 г. Малюнак А. У. Зуевай

шнуравой керамікі. Пасудзіна мела высокае адхіленае вонкі венца са скругленым зрэзам. У якасці адтлушчальніка была выкарыстана розназярністая жарства з перавагай часцінак дробных і сярэдніх памераў. Кераміка гладкасценная, таўшчыня сценкі – 8 мм. Фрагмент аздоблены трыма гарызантальнымі пасамі адбіткаў шнура (мал. 4: *3*).

Кругавы посуд (72 фрагменты неарнаментаванай керамікі, 4 фрагменты пасудзін з палівай), а таксама фрагмент шчытка пячной кафлі датаваны *эпохай позняга сярэдневякоўя–Новага часу.*

Такім чынам, у выніку прац, праведзеных на помніку Русаковічы-4 у 2012 г., устаноўлена наступнае: 1) стаянка функцыянавала не толькі ў эпоху мезаліту, як меркаваў раней М. М. Чарняўскі [7, 8], але і ў больш ранні (фінальны палеаліт) і больш позні (неаліт) час; 2) тэрыторыя стаянкі была асвоена таксама ў перыяд позняга сярэдневякоўя–Новага часу; 3) асноўнай частцы помніка ў самай блізкай будучыні пагражае знішчэнне ў сувязі з інтэнсіўным будаўніцтвам на дачных ўчастках.

Літаратура

1. Калечиц, Е. Г. Этапы заселения Мотольского микрорегиона в каменном и бронзовом веках : по материалам поселения Мотоль-17 / Е. Г. Калечиц, В. С. Обуховский // Lietuvos archeologija. – 2004. – Т. 25. – P. 48–78.

2. Лакіза, В. Л. Старажытнасці позняга неаліту і ранняга перыяду бронзавага веку Беларускага Панямоння / В. Л. Лакіза. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 343 с.

3. Лакіза, В. Л. Мікалаеўшчына / В. Л. Лакіза, М. М. Чарняўскі // Археалогія Беларусі : энцыкл.: у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2 : Л–Я. – С. 73–74.

4. Чарняўскі, М. М. Справаздача аб археалагічных даследаваннях у 1975 г. / М. М. Чарняўскі // ААНД Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Арх. № 513. – 54 с.

5. Чарняўскі, М. М. Справаздача аб археалагічных даследаваннях у 1986 г. / М. М. Чарняўскі // ААНД Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Арх. № 963. – 70 с.

6. Чарняўскі, М. М. Мікалаеўшчына. 2967. Паселішча / М. М. Чарняўскі // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць. – Мінск : БелСЭ, 1987. – Кн. 2. – С. 241.

7. Чарняўскі, М. М. Русаковічы. 2979б. Паселішча-4 / М. М. Чарняўскі // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць. – Мінск : БелСЭ, 1987. – Кн. 2. – С. 244.

8. Чарняўскі, М. М. Русаковічы / М. М. Чарняўскі // Археалогія Беларусі : энцыкл.: у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2 : Л–Я. – С. 262.

9. Чарняўскі, М. М. Справаздача аб археалагічных даследаваннях у 2011 г. / М. М. Чарняўскі // ААНД Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 2012. – Арх. № 2837. – 43 с.

Резюме

В. В. Ашейчик, А. В. Зуева, М. М. Чернявский

Новые материалы каменного века из верховьев Немана

Представлены материалы, полученные в ходе разведочных работ 2012 г. в окрестностях деревень Миколаевщина и Русаковичи Столбцовского района Минской области. В результате шурфовки (2 м^2) и сборов с поверхности на стоянке Миколаевщина-1 получены 274 кремневые находки и 93 фрагмента лепных сосудов. В кремневом инвентаре выделяются материалы мезолитического облика, вероятно, связанные с индустрией яниславицкой культуры, и находки неолитического возраста. Лепная керамика соотносится с припятско-неманской культурой раннего неолита, лысогорским этапом неманской культуры (средний неолит) и поздним неолитом (доброборский этап неманской культуры / круг культур шнуровой керамики). Основную часть коллекции подъемного материала, собранного на стоянке Русаковичи-4, составляют кремневые изделия (628 ед.). Технико-морфологический анализ разновременного инвентаря позволяет выделить несколько этапов заселения памятника в финальном палеолите (волкушанская и свидерская культуры), мезолите (яниславицкая культура ?) и неолите. Два фрагмента лепной керамики принадлежат горшкам неманской культуры и культуры круга шнуровой керамики. Также на обоих памятниках собрана круговая керамика, датированная поздним средневековьем–Новым временем.

Summary

V. U. Asheichyk, A. U. Zuyeva, M. M. Charniauski

New Materials of the Stone Age from the Basin of Upper Nioman

The article discusses the materials obtained during archaeological prospection near Mikalayeushchyna and Rusakovichy villages (Staubcy district, Minsk region) in 2012. 274 flint artifacts and 93 hand-made pottery shards come from test pit (2 sq. m) and surface collection on Mikalayeushchyna-1 site. Flint inventory contains materials of the Mesolithic (Janislawice Culture ?) and Neolithic periods. Pottery is related to Prypiat-Nioman Culture of the early Neolithic, to Lysaya Hara phase of Nioman Culture (the middle Neolithic) and to the late Neolithic (Dobry Bor phase of Nioman Culture / Corded Ware Culture). Mainly flint finds (628 pieces) were obtained in the course of fieldwalk on Rusakovichy-4 site. There are artifacts of the Final Palaeolithic (Wolkusz and Swidry Cultures), the Mesolithic (Janislawice Culture ?) and the Neolithic periods among them. Two shards of ceramics belong to hand-made pots of Nioman Culture and Corded Ware Culture.

Паступіў 24.05.2013 г.

УДК 903.53(476.7)

В. Г. Белявец, *Інстытут гісторыі НАН Беларусі, аддзел археалогіі першабытнага грамадства, кандыдат гістарычных навук (г. Мінск, Беларусь)*

Даследаванні на грунтовым могільніку вельбарскай культуры Пятровічы–Белая Гара ў 2011–2012 гадах

Першыя звесткі аб наяўнасці каля в. Пятровічы грунтовага могільніка рымскага часу з'явіліся ў даваенны час. У 1939 г., верагодна падчас устаноўкі новай трыянгуляцыйнай вежы, тут былі разбураны некалькі пахаванняў грунтовага могільніка. У жніўні таго ж года невялікая калекцыя рэчаў, сабраная на помніку, была перададзена ў фонды Дзяржаўнага Археалагічнага музея ў Варшаве (Państwowe Muzeum Archeologiczne w Warszawie, № каталога PMA IV-1090), дзе захоўваецца і сёння [8, s. 19–20, Tab. 1: *c–i*].

Помнік знаходзіцца каля 400 м на паўднёвы захад ад месца ўпадзення р. Асіпаўка ў р. Мухавец і каля 80–100 м на поўнач ад шашы Варшава–Масква. Вёска Пятровічы месціцца на супрацьлеглым, правым беразе р. Асіпаўкі. Помнік размешчаны ва ўрочышчы Белая Гара, якое ўяўляе з сябе рэшткі дастаткова высокага, да 4–5 м над узроўнем мясцовасці, пясчанага ўзвышша. Белая Гара некалі з'яўлялася найбольш высокай, паўночна-ўсходняй часткай вялікай пасляледавіковай пясчанай дзюны, якая была амаль цалкам знішчана напрыканцы 1970-х гадоў падчас будаўніцтва шашы Варшава–Масква. Першапачаткова яе даўжыня складала каля 1100 м, а максімальная шырыня – да 300 м. Дзюна была выцягнута па лініі паўднёвы захад – паўночны ўсход. Па словах мясцовых жыхароў, яна мела няроўную, «гарбамі», паверхню, доўгі час была пазбаўлена лесу і раздувалася. Згодна з картай пачатку 1930-х гадоў, уласна Белая Гара першапачаткова мела авальную форму, каля 300 м у даўжыню і да 120–150 м у шырыню. Ад разбурэння ацалела паўночна-ўсходняя яе частка, пляцоўка на вяршыні якой сёння мае плошчу каля 800 м^2. На месцы той часткі дзюны, якая была знішчана кар'ерам, з'явілася сажалка глыбінёй да 2 м.

Раскопкі на грунтовым могільніку Пятровічы–Белая Гара былі распачаты ў 2000 г. разведачным шурфам і працягваліся шэсць сезонаў да 2006 г. У гэты час была ўскрыта плошча ў 565 м^2, даследаваны 74 пахаванні (пахаванні № 1–68, 17/а, 21/а, аб'екты № 4–7) ды шэраг іншых аб'ектаў могільніка (мал. 1). Асноўная маса атрыманых матэрыялаў належыць да вельбарскай культуры. Акрамя перыяду рымскіх уплываў, помнік утрымлівае культурныя адкладанні іншых эпох. Тут наяўны гарызонт каменнага і бронзавага вякоў – пачынаючы з фінальнага палеаліту, – калі Белая Гара выкарыстоўвалася пад кароткачасовыя стаянкі. Таксама выразна прадстаўлены матэрыялы часоў Першай і Другой сусветных войнаў. Клеймы на ружэйных гільзах сведчаць, што баявыя дзеянні тут адбываліся падчас савецка-польскай кампаніі 1920 г. і ў 1944 г. Атрыманыя падчас раскопак даныя адпавядаюць паведамленням мясцовых жыхароў. У паўночнай, усходняй, але перадусім – у паўднёвай частках Белай Гары былі выяўлены рэшткі жылых і лёгкіх абарончых ваенных канструкцый: бліндажоў, акопаў, стралковых ячэек ды інш.

Помнік мае даволі спецыфічную стратыграфію. За дзве тысячы год рэльеф Белай Гары істотна змяніўся. Старажытная яе вяршыня знішчана ветравой эрозіяй. Тут непасрэдна пад слоем перамяшанага грунту таўшчынёй каля 0,20–0,25 м залягае мацерыковы пласт жоўтага пяску. Старажытная паверхня (культурны слой помніка) захавалася па перыферыі ўзвышша. Яна перакрыта адкладаннямі наноснага пяску, магутнасць якіх на розных участках вагаецца, дасягаючы на ўсходнім схіле ўзвышша, – раёне найбольш інтэнсіўнага ўтварэння эолавых адкладанняў, – звыш 2 м.

У 2011 г. пасля чатырохгадовага перапынку раскопкі на помніку былі адноўлены і працягнуты ў 2012 г. Напрацягу двух апошніх палявых сезонаў на ім даследавана плошча 440 м^2 (мал. 1). Мэтай гэтых прац з'яўлялася вывучэнне ускраінных участкаў грунтовага могільніка па заходнім, паўночным і ўсходнім схілах Белай Гары, а таксама даследаванне паўднёвай, моцна пашкоджанай падчас Другой сусветнай вайны, часткі ўзвышша, дзе ў старажытнасці знаходзілася вяршыня ўзвышша.

Найбольш цікавым вынікам раскопак, з ліку тых, якія не маюць непасрэднага дачынення да гарызонту рымскага часу, стала адкрыццё слядоў старажытнай воркі Белай Гары. Яны прасочаны па заходнім, паўночным і ўсходнім яе схілах, дзе пахаваны культурны пласт не быў знішчаны ветравой эрозіяй, а таксама ў мінімальнай ступені быў пашкоджаны сучаснымі ямамі невядомага паходжання Найноўшага часу. Паглыбленні ад барознаў воркі мелі выгляд паралельных палос, запоўненых грунтам бураватага колеру, якія заглыбляліся ў перадмацерыковы пясок на 5–8 см. Прасочаны сляды як мінімум двухкратнага разворвання схілаў ўзвышша. Большая частка барознаў была арыентавана ў напрамку поўнач–поўдзень з нязначным у 5–8° адхіленнем да паўночнага ўсходу. Адлегласць паміж імі складала каля 15 см. Эпізадычна прасочваліся сляды другой воркі, барозны якой цягнуліся па лініі паўночны захад–паўднёвы ўсход. Назіранні за



Мал. 1. План даследаванай часткі грунтовага могільніка Пятровічы. Жабінкаўскі раён

стратыграфічнымі суадносінамі барознаў і аб'ектаў грунтовага могільніка сведчаць, што пахаванні рымскага часу былі ўкапаныя ў сляды воркі. Такім чынам, схілы Белай Гары араліся перад здзяйсненнем тут першых пахаванняў насельніцтвам вельбарскай культуры – да другой паловы II ст. да н. э.

Вынікі вывучэння грунтовага могільніка вельбарскай культуры Пятровічы за перыяд 2000–2006 гг. у абагульненай форме былі прадстаўлены ў двух артыкулах [2; 3, с. 310–330]. Паводле наяўных на 2006 г. даных, перыяд яго выкарыстання замыкаецца ў межах фаз B_2/C_1–C_{1a} – C_2/(пачатку?)C_3 перыяду правінцыйнарымскіх уплываў, што ў абсалютных датах прыблізна адпавядае часу з апошняй чвэрці II – рубяжа II/III стст. да рубяжа III/IV – першых дзесяцігоддзяў IV ст. [2, с. 85,92; 3, с. 313–314, 326]. Адметнай асаблівасцю пахавальнай абраднасці абшчыны, якая выкарыстоўвала могільнік на Белай Гары, з'яўляўся выразны бірытуалізм: па даных на 2006 г. суадносіны даследаваных на ім інгумацый і крэмацый складалі 41 да 33 адпаведна. Такім чынам, пятровіцкі могільнік у сэнсе пахавальнай абраднасці каардынальна адрозніваецца ад аднакультурнага помніка ў Брэст-Трышын, дзе былі выяўлены толькі пахаванні па абрадзе крэмацыі [6, 4]. Параўнаўчы аналіз матэрыялаў могільніка Пятровічы на фоне іншых помнікаў вельбарскай і гоцкага кола культур, дазволіў сфармуляваць тэзіс аб наяўнасці ў межах гэтай культурнай агульнасці некалькіх сацыяльна-палітычных аб'яднанняў гістарычных готаў, а таксама – аб іх верагодных адрозненнях у сацыяльнай арганізацыі [2, с. 97–99; 3, с. 64–65; 4, с. 327–330].

Раскопамі 2011–2012 гг. вывучана 17 пахаванняў грунтовага могільніка (№ 69–84, 70/а). Суадносіны пахаванняў, выкананых па розных абрадах (10 інгумацый і 7 крэмацый), пацвярджаюць зробленыя раней высновы аб выразным бірытуалізме пахавальнага абраду, які практыкавала пятровіцкая абшчына.

Атрыманы новыя даныя аб планіграфіі помніка. Перадусім, выяўлена яго мяжа на ўсходзе (пахаванне № 80). На ўсход ад гэтага аб'екта ў старажытнасці пачынаўся стромкі схіл Белай Гары, які ў да-



Мал. 2. Планы і профілі пахаванняў № 75 і № 77: *I* – першая зачыстка; *II* – другая зачыстка; *1* – месца знаходкі ў пахаванні № 75 срэбнай пацеркі. Грунтовы могільнік Пятровічы. Жабінкаўскі раён

дзены час перакрыты больш чым двухметровымі напластаваннямі наноснага пяску. Помнік працягваецца ў паўночна-заходнім накірунку, дзе таксама добра захавалася старажытная паверхня ўзвышша і культурны пласт рымскага перыяду. У выяўленых тут аб'ектах былі пахаваны пераважна дзеці рознага ўзросту, перадусім – немаўляты, што падкрэслівае перыферыйны характар дадзенага ўчастка могільніка. Паўднёвым раскопам 2012 г. часткова даследавана старажытная вяршыня Белай Гары, дзе грунтовы могільнік аказаўся практычна знішчаны пабудовамі лясніцтва рубяжа XIX/XX стст. і катлаванамі ад бліндажоў ды гаспадарчых пабудоў блокпаста венгерскай тылавой часткі, якая базіравалася тут у 1943–1944 гг.

Сярод асноўных вынікаў вывучэння аб'ектаў грунтовага могільніка вельбарскай культуры, атрыманых па выніках сезонаў 2011–2012 гг., спынімся на двух, ілюструючы іх прыкладамі трох пахаванняў. Рэчавы інвентар двух з іх (№ 75 і 77) нясе новыя даныя для ўдакладнення храналагічных рамак функцыянавання помніка. Матэрыялы ж, атрыманыя ў трэцім пахаванні (№ 76), дазваляюць падмацаваць і развіць раней ужо выказаныя назіранні аб асаблівасцях сацыяльнай арганізацыі абшчыны, якая выкарыстоўвала могільнік на Белай Гары.

Пахаванні № 75 і № 77. Выяўлены ў 2011 г. у паўночна-заходняй частцы ўзвышша. Контуры аб'ектаў прасочаныя 0,20–0,24 м ніжэй старажытнай паверхні помніка. У паўднёвую частку пахавання № 75, выкананага па абраду інгумацыі (косткі не захаваліся), было ўкапана пахаванне № 77 з рэшткамі крэмацыі; паўночна-заходняя частка ямы пахавання № 75 была ў старажытнасці пашкоджана ямай невядомага паходжання, альбо выватрнем (мал. 2). Аб'екты даследаваны двума сячэннямі накрыж (мал. 2: А–Б, В–Г). Планы зафіксаваны на двух узроўнях: першая зачыстка выканана на глыбіні 0,20–0,24 м ад старажытнай паверхні (мал. 2: *I*), другая – 0,25 м ніжэй, на ўзроўні залягання знаходак (мал. 2: *II*).

Пахаванне № 77 (мал. 2*: 1*) здзейснена ў яме акруглай у плане формы дыяметрам каля 0,50 м. Сценкі амаль вертыкальныя роўныя, дно пляскатае.



Мал. 3. Знаходкі з пахаванняў № 75 (*1*), № 77 (*2–9*) і размяшчэнне інвентару (*А*) у пахаванні № 77: *1, 2* – срэбра; *3* – шкло; *4–7* – сплаў медзі; *8* – камень; *9* – косць (рог). Грунтовы могільнік Пятровічы. Жабінкаўскі раён

Глыбіня – каля 0,65 м ад узроўню старажытнай паверхні. Аб'ект запоўнены аднародным гумусіраваным пяском светла-карычневага колеру з лінзамі больш цёмна афарбаванага грунту. Запаўненне было святлейшым у прыдоннай частцы, дзе яно па колеры амаль не адрознівалася ад жоўтага мацерыковага пяску. На дне пахавальнай ямы, у паўднёва-заходняй яе частцы, выяўлена вялікая колькасць старанна ачышчаных ад попелу кальцынірараваных костак. Група костак мела форму блізкую да прамавугольнай, з закругленымі вуглямі, памерамі прыблізна 25 × 18 см, каля 8 см у вышыню і была арыентавана па баках свету. Разам кальцынірараныя косткі захавалі форму арганічнай ёмістасці, у якой былі змешчаны ў пахавальнай яме, – пляцёнага корабу альбо драўлянай скрынкі. Вага сабраных костак – 275 г.

Антрапалагічнае вызначэнне[1]: жанчына, хутчэй за ўсё маладога ўзросту (adultus).

Сярод рэшткаў крэмацыі знаходзіўся наступны пахавальны інвентар[2] (мал. 3, *А*).

1. Фібула IV групы О. Альмгрэна [7] блізкая да тыпу А. 93 (мал. 3: *7*), са сплаву медзі. Аплаўленая, страчаны кончык іголкі.

2. Фібула вытворная ад моцна прафіляваных, блізкая да тыпу А. IV-93 (мал. 3: *6*), са сплаву медзі. Аплаўленая, страчана частка іголкі і прыёмніка. Да правага плечука спружыннай гільзы прыпякліся рэшткі аплаўленых пацерак з чырвонага і зялёнага (?) шкла.

Грабеньчыкі абедзвюх фібул першапачаткова былі інкруставаны дротам з іншага металу, магчыма срэбным.

3. Фібула тыпу А. V-130 (мал. 3: *4*) са сплаву медзі. Аплаўленая, страчана частка іголкі.

4. Фібула тыпу А. V-130 (мал. 3: *5*) са сплаву медзі. Аплаўленая, страчаны спружынны апарат і кромка прыёмніка.

[1] Посткраніяльны антрапалагічны аналіз выкананы доктарам біялагічных навук, дацэнтам, галоўным навуковым супрацоўнікам аддзела антрапалогіі і экалогіі Інстытута гісторыі НАН Беларусі І. І. Салівон.

[2] Расчыстка і кансервацыя металічных вырабаў з пахаванняў № 75 і № 77 выканана мастаком-рэстаўратарам музея Гісторыі Вялікай Айчыннай вайны В. І. Пчэльнікавым, за што аўтар артыкула яму шчыра ўдзячны.

5. S-падобная срэбная скрэпа тыпу B паводле А. фон Мюлера [15] з дапаўненнямі А. Какоўскага [13] (мал. 3: *2*). Нясе сляды тэрмічнага ўздзеяння, страчаны адзін з плечукоў ніжэй пацеркі. На корпус з круглага ў сячэнні дроту надзета полая вітая пацерка з навітага дроту. Галоўка скрэпы мае пірамідальную форму, складаецца з пяці шарыкаў, з якіх чатыры размешчаны па перыметры, а адзін над імі па цэнтры; на кожны з іх, у сваю чаргу, напаяны па чатыры гранулы: тры ўнізе, адна на вяршыні. Пад галоўкай і па краі пацеркі змешчаны накладныя колцы з псеўдаграналяванага дроту. Такі ж дрот пушчаны ўздоўж корпуса са знешняга боку.

6. Двухчасткавы грабеньчык тыпу B паводле С. Томас [20] (мал. 3: *9*) з рогу, змацаваны двума касцянымі прадольнымі штыфтамі. Перапалены, фрагментаваны. З абодвух бакоў пракрэслены арнамент: уздоўж верхняга краю спінкі змешчаны сем кружкоў з кропкай у цэнтры; вышэй асновы зубчыкаў пушчаны дзве паралельныя палосы з кропкавых наколаў.

7. Пацерка аплаўленая дэфармаваная, з пурпурнага празрыстага шкла, спеклася з фрагментам кальцыніраванай косткі (мал. 3: *3*).

8. Галька каменная, белага колеру, са слядамі абпалу (мал. 3: *8*), магчыма – прылада для загладжвання паверхні глінянага посуду.

Пахаванне № 75. Пахавальная яма мела форму, блізкую да прамавугольнай, з закругленымі вуглямі. Яе памеры ў верхняй частцы запаўнення складалі прыблізна 1,20 × 0,50 м. Была арыентавана па лініі паўночны захад–паўднёвы ўсход з адхіленнем каля 15° у бок поўначы. Сценкі прамыя нахіленыя ўнутр, дно пляскатае. Максімальная глыбіня – каля 0,70 м ад узроўню старажытнай паверхні. Запаўненне аднастайнае, утворана слаба гумусіраваным пяском светла-карычневага колеру. У паўночнай частцы ямы па яе цэнтральнай восі знойдзена срэбная пацерка (мал. 2: *1*).

Інвентар: пацерка біканічнай формы ў «барочным» стылі, скручаная з тонкага срэбнага дроту (мал. 3: *1*), часткова захавалася срэбная грануляцыя.

Значную ролю ў датаванні гэтых аб'ектаў мае рэчавы комплекс пахавання № 77, перадусім – засцежкі з яго. У ім пара фібул, вытворных ад моцна прафіляваных IV групы О. Альмгрэна, выступае з дзвюма засцежкамі тыпу A. V-130, на падставе чаго комплекс павінен суадносіцца з фазай B2/C1 рымскага часу [11, s. 37; 12, S. 161–162; 14, S. 190, 192; 21, s. 24]. Канструкцыя і характар арнаментацыі першай пары засцежак нясуць рысы, характэрныя для позных фібул IV групы О. Альгрэна, якія мы можам назіраць у тыпах A. 93 і A. 80: адносна вузкія спінкі і ножкі, багатая арнаментацыя грабеньчыкаў. Яны маюць таксама прыкметы фібул V групы: выразна зазначаныя шырокія грабеньчыкі ды вузкія высокія прыёмнікі. У працы Т. Хаўптмана, які развівае і ўдакладняе тыпалогію фібул V групы О. Альмгрэна, блізкія адпаведнікі да гэтых фібул мы можам знайсці як сярод прататыповых форм, так і засцежак, якія вылучаюцца даследчыкам у 1-ы варыянт 1-й серыі V группы [12, S. 161–162, Abb. 2, Abb. 3]. Больш сціслае вызначэнне тыпалагічнай прыналежнасці пары засцежак, што мы разглядаем, у межах існуючых класіфікацый можа прымацца даволі ўмоўна. Па сутнасці, яны могуць служыць добрай ілюстрацыяй да ўсёй складанасці працэсу развіцця позніх варыяцый моцна прафіляваных засцежак IV групы ў асяроддзі насельніцтва вельбарскай культуры ў перыяд фарміравання яе «барочнага» стылю.

У кантэксце гэтага артыкула для нас істотнай з'яўляецца, перадусім, храналогія комплексу з пахавання № 77. Яна дазваляе зрабіць наступныя высновы.

1. Комплекс безумоўна належыць да фазы B2/C1; на падставе стратыграфічных суадносін аналагічным чынам павінна датавацца пахаванне № 75. Гэтыя два аб'екты вызначаюць пачатак функцыянавання могільніка Пятровічы сярэднярымскім перыядам, што робіць абсалютную храналогію помніка старэйшай на 2–3 дзесяцігоддзі.

2. Комплекс пахавання № 77 з парай засцежак, вытворных ад моцна прафіляваных IV групы О. Альмгрэна, фібуламі тыпу A. V-130 і S-падобнай скрэпай з'яўляецца стылістычна найбольш раннім комплексам вельбарскай культуры з вядомых аўтару дадзенага артыкула на тэрыторыі не толькі Беларусі, але і Усходняй Еўропы ў цэлым. Засцежкі IV групы О. Альмгрэна не адзначаны таксама ў аднакультурных матэрыялах Усходняй Мазовіі і Падляшша [9, s. 229–234].

У цэлым комплекс пахаванняў № 77 і № 75 сведчыць, што абшчына, якая выкарыстоўвала могільнік на Белай Гары, належала да ліку найбольш ранніх вельбарскіх каланістатаў, якія ў апошняй чвэрці II ст. н. э. рассяляліся па землях сярэдняга цячэння р. Вісла і па цячэнню р. Заходні Буг.

Пахаванне № 76. Пахаванне па абраду інгумацыі. Косткі шкілета не захаваліся.

План расчышчаны 0,20–0,22 м ніжэй узроўню старажытнай паверхні. Яма мела форму блізкую да авальнай, памерамі 0,75 × 0,40 м, была арыентавана па лініі поўнач–поўдзень з адхіленнем каля 18° у бок усходу. Сценкі прамыя, дно пляскатае. Глыбіня аб'екта складала 0,32–0,33 м ад пахаванай паверхні. Даследавана папярочным сячэннем (мал. 4, *А*). Запаўненне ямы ўтварыў гумусіраваны пясок рудавата-светла-карычневага колеру. Цямнейшы грунт назіраўся ў паўночнай яе частцы, дзе быў выяўлены пахавальны інвентар: пара фібул і каралі, якія складаліся з 27 падвесак і пацерак.



Мал. 4. План і профіль пахавання № 76 (*А*), размяшчэнне ў пахаванні інвентару (*Б*), знаходкі (*В*): *1–3* – срэбра; *4–15* – бурштын; *16–27* – шкло; *28* – акамянеласць (?); рэканструкцыя караляў (*Г*). Грунтовы могільнік Пятровічы. Жабінкаўскі раён

Інвентар: 1, 2. Пара срэбных фібул тыпу A. VI–168 (мал. 4: *1*, *3*) – з «мёртвымі» надстаўнымі спружынкамі па плечуках і каленчатым выгінам трохвугольнай у сячэнні спінкі. Прыёмнік адной з засцежак быў абламаны ў старажытнасці, а новы зачэп сфарміраваны з раскляпанага і загнутага ў кручок канца ножкі (мал. 4: *3*).

3. Падвеска вядзерцападобная (мал. 4: *2*) з нізкім шырокім корпусам, скручаным з тонкай срэбнай бляхі. Часткова дэфармаваная, дужка знішчана карозіяй. Пры расчыстцы ў палявых умовах унутры падвескі назіраліся дробныя рэшткі нейкага прадмета з арганічнага рэчыва.

4–11. Восем буйных бурштынавых падвескак тыпу 471e па класіфікацыі М. Тэмпельман-Маньчыньскай [16] (мал. 4: *4–11*) – васьмёркападобныя, з вылучанымі галоўкамі і фрызамі.

12–15. Чатыры маленькія бурштынавыя падвескі тыпу TM-471d (мал. 4: *12–15*) – васьмёркападобныя, з вылучанай галоўкай.

16. Пацерка тыпу TM-338a (мал. 4: *16*) – пляската-акруглай формы, аснова з чорнага, накладная нітка з жоўтага непразрыстага шкла.

17. Пацерка тыпу TM-40 (мал. 4: *17*) – пляската-акруглай формы, з чорнага непразрыстага шкла.

18. Пацерка тыпу TM-1 (мал. 4: *18*) – акруглай формы, з белага глухога шкла, рассыпалася на дробныя фрагменты падчас расчысткі.

19. Пацерка тыпу TM-148 (мал. 4: *19*) – падцыліндрычнай формы з порыстага непразрыстага шкла аранжавага колеру.

20. Пацерка блізкая да тыпу TM-120 і тыпу 104 па класіфікацыі Е. М. Аляксеевай [1] (мал. 4: *20*) – мае ў папярочным сячэнні форму выцягнутага шасцівугольніка, з глухога белага шкла.

21. Пацерка, групы TM XIV (мал. 4: *21*) – масіўная 14-гранная, выцягнутай формы, з празрыстага бясколернага, зеленаватага шкла. Не мае дакладных адпаведнікаў сярод вылучаных М. Тэмпельман-Маньчыньскай тыпаў. Адна пацерка гэтага тыпу вядома ў пахаванні № 4 могільніка чарняхоўскай культуры Ружычанка, якое належыць да ранняй фазы гэтага помніка. У класіфікацыі А. В. Гапкала яна вылучана ў тып XVII/5 [5, с. 40]. Таксама яна блізкая да пацеркі тыпу 136 у класіфікацыі А. М. Аляксеевай з тэрыторыі Паўночнага Прычарнамор'я, дзе яны датаваны II ст. да н. э. – I ст. н. э. [1, с. 70].

22. Пацерка тыпу TM-126 (мал. 4: *22*) – масіўная 14-гранная з празрыстага блакітнага шкла.

23–25. Тры пацеркі блізкія да тыпу TM-128 (мал. 4: *23*) – сярэдніх памераў, 14-гранная сплошчаная, з празрыстага шкла вінна-фіялетавага колеру. У зломах унутры выразна бачна шкло жаўтаватага колеру. Верагодна, у іх фіялетавае шкло было пакладзена на ядро іншага колеру [16, s. 12–13].

26–29. Чатыры пацеркі тыпу TM-57 (мал. 4: *24–27*) – маленькія, біканічнай формы з папярочнай адтулінай, празрыстае шкло сіняга колеру.

30. Пры прасейванні грунту выяўлена маленькая пацерка (?) дыскападобнай формы, магчыма зробленая з акамянеласці (мал. 4: *28*). Верагодна, яна выпадкова патрапіла ў запаўненне пахавальнай ямы з культурнага пласта[1].

Назіранні за характарам размяшчэння выяўленых у пахаванні падвесак і пацерак (мал. 4, *Б*) дазваляюць рэканструяваць каралі наступным чынам. У іх цэнтры знаходзілася срэбная вядзерцападобная падвеска. Аснова ўпрыгажэння была ўтворана чаргаваннем бурштынавых падвесак са шклянымі пацеркамі. Пры гэтым больш масіўныя пацеркі і падвескі размяшчаліся ў франтальнай частцы караляў (мал. 4, *Г*).

Датаванне: фаза C2 познарымскага перыяду (каля 260–300 гг. н. э.). Вызначэнне храналагічнай пазіцыі комплексу абапіраецца, перадусім, на датаванні фібул тыпу A. VI–168 у матэрыялах вельбарскай культуры [10, S. 63–64; 11, s. 38–39; 21, s. 25; гл. таксама: 17, s. 468–470]. Датаванне падмацоўваецца храналогіяй выкарыстання позніх тыпаў 8-падобных падвесак з пахавання № 77 [16, s. 84–85].

Як адзначалася вышэй, гэтае пахаванне дазваляе дапоўніць і развіць раней высунутыя тэзісы аб характары сацыяльнай арганізацыі абшчыны, якая выкарыстоўвала могільнік на Белай Гары.

У сваім аналізе аўтар дадзенага артыкула зыходзіць з параўнання параметраў аб'екта і інвентару, які быў выяўлены ў ім.

Калі меркаваць па памерах магільнай ямы, у ёй было змешчана цела дзіцяці. Улічваючы характар размяшчэння інвентару, яно было пакладзена на спіну: фібулы, выяўленыя на аднолькавай глыбіні, верагодна, знаходзіліся на плячах; цэнтральная частка караляў засталася на месцы (у раёне грудной клеткі), але апусціўшыся ніжэй рэшты пацерак на 8–9 см у выніку раскладу рабрын і ключыц. Такім чынам, рост пахаванай асобы не павінен быў перавышаць 0,45–0,50 м. Нягледзячы на прысутнасць срэбных вырабаў, вокіслы ад якіх добра кансервуюць косткі, у яме не выяўлены рэшткі шкілета, перадусім – зубныя каронкі, якія на гэтым помніку часам захоўваюцца нават у пахаваннях, пазбаўленых металічных упрыгажэнняў. Гэта сведчыць аб малых памерах, крохкасці костак і, хутчэй за ўсё, адсутнасці ў дзіцяці зубоў. У цэлым прыведзеныя назіранні ўказваюць на тое, што ў пахаванні было змешчана немаўля, альбо дзіця ва ўзросце да года–палутара. На карысць гэтай высновы сведчыць таксама выключная мініяцюрнасць знойдзеных тут фібул.

Разам з тым пахаванне № 76 суправаджаецца дастаткова багатым для развітога познарымскага

[1] Аналагічныя вырабы з акамянеласцей (?), якія нагадваюць пацеркі каменнага веку, выяўлены ў шэрагу іншых пахаванняў могільніка.

часу інвентаром. У фазе С2 жаночая двухфібульная мадэль строю з кара́лямі з'яўляецца дастаткова пашыранай, але срэбныя падвескі ў ім сустракаюцца выключна рэдка; больш шырока наяўнасць срэбных вырабаў у касцюме прызнаецца для развітога познарымскага перыяду адной з прыкмет высокай сацыяльнай пазіцыі пахаванага (19, s. 210; 18, s. 73–74, 94). Тут варта звярнуць увагу яшчэ на адзін момант: абламаны прыёмнік адной з фібул (мал. 4: *3*). Характар злому (у месцы пераходу ножкі ў ложышча – на адносна трывалым участку прыёмніка, у якім часцей ламаліся падвязкі), указвае на тое, што ўпрыгажэнне павінна было выкарыстоўвацца пры жыцці самога дзіцяці, альбо яго сваякамі параўнальнага ўзросту. Для патрэб пахавальнай цырымоніі засцежка была змацавана «наглуха»: яна была адрамантавана такім чынам, што знешне выглядала па-ранейшаму рэпрэзентатыўна, але ёй ўжо немагчыма было карыстацца (прышпільваць ці адшпіляць).

Планіграфія могільніка Пятровічы сведчыць, што гэты помнік, як і параўнальны па ступені даследаванасці ды аб'ёму атрыманых матэрыялаў вельбарскі могільнік Брэст-Трышын[1], выкарыстоўваўся некалькімі групамі людзей, верагодна сем'ямі. На могільніку Пятровічы занятыя імі ўчасткі былі вызначаны ўжо на раннім этапе існавання могільніка, і, хутчэй за ўсё, абазначаны на паверхні з дапамогай наземных каменных і драўляных канструкцый [3, с. 312–313]. Паміж пахаваннямі гэтых груп назіраюцца пэўныя адрозненні ў выкарыстанні элементаў абраднасці, якія суправаджалі пахаванні розных ўзроставых груп. Пры гэтым на брэст-трышынскім могільніку найбольш багаты і разнастайны інвентар выступае ў пахаваннях дарослых жанчын; пераважна з імі звязаны абрад пахавання ў урнах з чыстым запаўненнем ям – найбольш складаны і варыянтны ў дэталях абраднасці; асноўная ж маса дзіцячых пахаванняў пазбаўлена інвентару. У Пятровічах у пахаваннях з крэмацыямі назіраецца падобная да гэтай карціна: найбольш багаты інвентар утрымліваюць пахаванні дарослых. Аднак у тым, што тычыцца інгумацый, тэндэнцыя прама супрацьлеглая: багаццем інвентару вылучаюцца менавіта пахаванні дзяцей. У шэрагу выпадкаў іх высокі сацыяльны статус падкрэслены прэстыжнымі дэталямі касцюму і элементамі абраднасці: у пахаванні № 1 цела было змешчана ў драўлянай канструкцыі, памеры і глыбіня ям у пахаваннях № 1, 6, 36 істотна большыя, чым у сярэднім па могільніку.

Карэляцыя ўзросту дзіцяці з пахавання № 76 і характарыстык яго касцюма, з'яўляецца чарговым сведчаннем таго, што ў абшчыне, якая выкарыстоўвала могільнік на Белай Гары, дзеці з багатых і ўплывовых сем'яў атрымлівалі высокі сацыяльны статус ужо па адным сваім праве нараджэння – незалежна ад узросту. На падставе матэрыялаў, атрыманых на могільніку за ўвесь перыяд яго даследавання, гэтая асаблівасць сацыяльнай арганізацыі пятровіцкай абшчыны адзначаецца з ранніх этапаў яго функцыянавання і знаходзіць сваё праяўленне не толькі ў рэчавым інвентары, але таксама ў памерах, асаблівасцях упарадкавання магільных ям ды шэрагу іншых элементаў пахавальнай абраднасці.

[1] Да пытання аб планіграфіі брэст-трышынскага могільніка глядзі працу [4, с. 59, 66–69, 70].

Літаратура

1. Алексеева, Е. М. Античные бусы Северного Причерноморья / Е. М. Алексеева // Археология СССР. Свод археологических источников / АН СССР, Ин-т археологии. – М., 1978. – Вып. Г1–12. – С. 1–94.

2. Белявец, В. Г. Папярэднія вынікі вывучэння грунтовага могільніка вельбарскай культуры Пятровічы (Белая Гара) / В. Г. Белявец // Гіст.-археалаг. зб. – Мінск, 2006. – № 23. – С. 79–101.

3. Белевец, В. Г. К изучению памятников вельбарской культуры в Беларуси / В. Г. Белевец // Nowe materialy i interpretacje: stan dyskusji na temat kultury wielbarskiej / Muzeum Archeol. w Gdańsku; pod red. M. Fudzińskiego, H. Panera. – Gdańsk, 2007 – S. 293–344.

4. Белевец, В. Могильник Брест-Тришин: 30 лет по окончании раскопок / В. Белевец // Acta Archaeologica Albaruthenica. – Мінск, 2007. – Вып. 1. – С. 49–85.

5. Гопкало, О. В. Бусы и подвески черняховской культуры / О. В. Гопкало. – Киев, 2008 – 252 с.

6. Кухаренко, Ю. В. Могильник Брест-Тришин / Ю. В. Кухаренко; отв. ред. А. К. Амброз; Акад. наук СССР, Ин-т археологии. – М. : Наука, 1980. – 128 с.

7. Almgren, O. Studien über nordeuropäischen Fibelformen der ersten nachchristlichen Jahrhunderte mit Berücksichtigung der provinzialrömischen und südrussischen Formen / O. Almgren // Mannus-Bibliotek. – Leipzig, 1923. – № 32. – S. 1–254.

8. Andrzejowski, J. Wykaz stanowisk z okresu rzymskiego / J. Andrzejowski // Zabytki z okresu wpływów rzymskich, średniowiecza i czasów nowożytnych z Białorusi w zbiorach Państwowego Muzeum Archeologicznego w Warszawie / J. Andrzejowski [et al.] ; pod red. A. Piotrowskiego ; Państwowe Muzeum Archeol. w Warszawie, Ośrodek Ochrony Dziedzictwa Archeol. – Warszawa, 2005. – S. 17–31.

9. Andrzejowski, J. Pod wodzą Felimera, czyli osadnicy wielbarscy na Mazowszu i Podlasiu / J. Andrzejowski // Nowe materiały i interpretacje : stan dyskusji na temat kultury wielbarskiej / Muzeum Archeol. w Gdańsku ; pod red. M. Fudzińskiego, H. Panera. – Gdańsk, 2007. – S. 229–258.

10. Ciesliński, A. Kulturelle Veränderungen und Besidlungsläufe im Gebit der Wielbark-Kultur an Łyna, Pasłęka und Oberer Drwкca / A. Ciesliński – Berliner Beiträge zur vor- und frühgeschichte. Neue Folge. – Berlin, 2010. – Bd. 17. – 321 S.

11. Godłowski, K. Chronologia okresu późnorzymskiego i wczesnego okresu wędrówek ludów w Polsce Północno-

Wschodniej / K. Godłowski // Rocznik Białostocki. – Białystok, 1974. – T. XII. – S. 9–109.

12. Hauptmann, T. Studien zu den Dreisprossenfibeln / T. Hauptmann // 100 Jahre Fiebelformen nach Oskar Almgren : Intern. Arbeitstagung, 25–29 Mai, 1997 : Forschungen zur Archäologie im Land Brandenburg / hrsg. von J. Kunow. – Wünsdorf, 1998. – T. 5. – S. 159–173.

13. Kokowski, A. Grupa masłomęcka: z badań nad przemianami kultury Gotów w młodszym okresie rzymskim / A. Kokowski. – Lublin : Wydaw. UMCS, 1995. – 334 s.

14. Machajewski, H. Die Fibeln der Gruppe V, Serie 8, im östlichen Teil Mitteleuropas / H. Machajewski // 100 Jahre Fibelformen nach Oskar Almgren : Intern. Arbeitstagung, 25–29 Mai, 1997 : Forschungen zur Archäologie im Land Brandenburg / hrsg. von J. Kunow. – Wünsdorf, 1998. – T. 5. – S. 187–196.

15. A. von Müller. Formenkreise der ältesten römischen Kaiserzeit im Raum zwischen Havelsplatte und Ostsee / A. von Müller. – Berlin, 1957. – 65 S.

16. Tempelmann-Mączyńska, M. Die Perlen der römischen Kaiserzeit und der frühen Völkerwanderungszeit im mitteleuropäischen Barbaricum / M. Tempelmann-Mączyńska // Römisch-Germanische Forschungen. – Mainz am Rhein, 1986. – Bd. 43. – 339 s.

17. Szymański, P. Grób z Nowej Boćwinki. Kilka uwag i dygresji na temat niektórych cech późnorzymskich zapinek bałtyjskich / P. Szymański // Seminarium bałtyjskie, T. II. – Bałtowie i ich sąsiedzi. Marian Kaczyński in memoriał. / red. A. Bitner-Wróblewska, G. Iwanicka. – Warszawa, 2009. – S. 463–478.

18. Tempelmann-Mączyńska, M. Das Frauentrachtzubehör des mittel – und osteuropäischen Barbaricums in der römischen Keiserzeit / M. Tempelmann-Mączyńska. – Kraków : Jagiellonen-Universitet, 1989. – 178 s.

19. Tempelmann-Mączyńska, M. Strój kobiecy ludności kultury wielbarskiej i jego powiązania z sąsiednimi obszarami / M. Tempelmann-Mączyńska // Kultura wielbarska w młodszym okresie rzymskim : (materiały z konf.) / pod red. J. Gurby, A. Kokowskiego ; Uniw. M. Curie-Skłodowskiej w Lublinie, Katedra Archeologii. – Lublin, 1989. – T. 2. – S. 205–218.

20. Thomas, S. Studien zu den germanischen Kämmen der römischen Keiserzeit / S. Thomas // Arbeits- und Forschungsberichte zur sächsischen Bodendenkmalpflege. – Bonn, 1960. – № 8. – S. 104–110.

21. Wołągiewicz, R. Ceramika kultury wielbarskiej między Bałtykiem a Morzem Czarnym / R. Wołągiewicz. – Szczecin : Muzeum Narodowe, 1993. – 202 s.

Резюме

В. Г. Белевец

Исследования на грунтовом могильнике вельбарской культуры Петровичи–Белая Гора в 2011–2012 годах

На примере трех погребений рассмотрены наиболее интересные результаты раскопок последних двух сезонов.

По результатам раскопок 2000–2006 гг. начальный этап функционирования памятника соотносится с «широкой» фазой B_2/C_1–C_{1a} периода римских влияний. Материалы из погребений № 75 и № 77 позволили сузить эту датировку до фазы B_2/C_1. Погребение № 77 (кремация молодой женщины) принадлежит к числу стилистически наиболее ранних комплексов, известных в настоящее время в зоне экспансии населения вельбарской культуры на цэцэльской фазе ее развития.

Погребение № 76, принадлежащее ребенку в возрасте, вероятнее всего, одного–полутора лет, выделяется на фоне подобных детских погребений могильника богатством элементов костюма. Миниатюрные фибулы, одна из которых была отремонтирована специально для погребальной церемонии, несомненно, использовали при жизни ребенка: он или его близкие родственники схожего возраста. В предыдущие сезоны на могильнике Петровичи уже была исследована серия погребений детей в возрасте 3,0–6,7 лет, костюм которых выделяется особым богатством. Порой такие погребения также имеют большие размеры погребальных ям и их особое устройство. Погребение № 76 является новым свидетельством того, что в общине, которая использовала могильник на Белой Горе, дети из привилегированных семей занимали высокую социальную позицию по праву рождения. Противоположная ситуация наблюдается на могильнике Брест-Тришин, где погребения детей, как правило, лишены инвентаря.

Summary

V. G. Beljavec

Investigations on the Piatrovichy–Belaya Hara Flat Cemetery of Wielbark Culture in 2011–2012

The article discusses preliminary results of excavations held on Piatrovichy–Bielaya Hara cemetery during the last two field seasons.

The investigations of 2000–2006 allow dating the beginning of functioning of the cemetery back to the «broad» phase B_2/C_1–C_{1a} of the Roman Age. The materials of graves 75 and 77, explored in 2011, make it possible to define more precisely this dating – to phase B_2/C_1. The cremation burial of female adultus from grave 77 belongs to the earliest complexes known in the area of Wielbark Culture population expansion during Cecele phase.

The burial of infant of estimated age to 1,5 years (grave 76) stands out against similar children's burial from the cemetery by richness of dress equipment. Tiny fibulae (one of which was repaired specially for funeral ceremony) was in use during the child's life – by him or his nearest relatives of similar age. The series of children's burials with reach sets of metal, glass and amber ornaments have already been explored at the cemetery during previous seasons. Sometimes such burials are notable for large sizes of pits and their particular construction. The grave 76 is one more evidence of special social status of children from privileged families of community used Piatrovichy cemetery.

Паступіў 23.05.2013 г.

УДК [903.1+903.22](476)«633»+069.5:903(476)

А. М. Вашанаў, *Інстытут гісторыі НАН Беларусі, аддзел археалогіі першабытнага грамадства, аспірант, магістр гістарычных навук (г. Мінск, Беларусь)*

Мезалітычныя касцяныя вастрыі ў зборах Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь

Сёння ў межах Беларусі вядома шэсць пунктаў са знаходкамі касцяных і рагавых прылад мезалітычнага часу. Так, эпохай мезаліту датавана частка рагавых вырабаў, знойдзеных у Смаргонскім кар'еры (мал. 1: *1*) [24, 30–32, 41, s. 232, tabl. CLXVI]. Мезалітычныя касцяныя і рагавыя прылады працы выяўлены ў воз. Вячэра (Азярное 2 Б; мал. 1: *2*) у Любанскім раёне Мінскай вобласці [17, 18]. У Археалагічным музеі Кракава захоўваецца касцяное вастрыё з в. Ліцвінкі Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці (мал. 1: *3*) [34]. Сякеры з рогу высакароднага аленя знойдзены каля в. Гожа (?) Гродзенскага раёна (мал. 1: *4*) і в. Морына Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці (мал. 1: *5*) [31]. Верагодна, да мезалітычнага часу адносіцца і фрагмент рагавой сякеры з дзвюма прасвідраванымі адтулінамі, які знайшлі ў 1920-х гадах на тэрыторыі былога Рагачоўскага павета [23, с. 244–246].

У фондах Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь (Мінск) захоўваюцца тры касцяныя вастрыі. Дадзеныя вырабы вядомы ў археалагічнай літаратуры з канца 1960-х гадоў па працах У. Ф. Ісаенкі, дзе пададзена кароткая інфармацыя аб месцазнаходжаннях вастрый і зроблена прамалёўка знаходак з вёсак Сваяцічы і Гадзілавічы [10, с. 31, 52, рис. 12: 52, 53; 11].

Мэтамі цяперашняй публікацыі з'яўляюцца дакладнае вызначэнне памераў дадзеных артэфактаў, тыпу, а таксама іх культурна-храналагічная ідэнтыфікацыя[1].

1. Іголкападобнае вастрыё (КП 40428/50) – вёска Залешаны, Клецкі раён, Мінская вобласць (мал. 1: *6*).

Паводле запісу ў акце прыёму, музей набыў выраб у 1963 г. Абставіны, пры якіх быў знойдзены артэфакт, невядомыя.

Прыладу (мал. 2) зрабілі з расшчапанай трубчастай косткі. Паверхня цёмна-карычневага колеру, гладкая навобмацак, запаліраваная. Тронкавая частка вырабу адсутнічае. Артэфакт акруглы ў папярочным сячэнні. Даўжыня захаванай часткі вастрыя – 17 см, дыяметр папярочнага сячэння – 0,8 см, вага – 14,4 гр.

Падобныя формы вастрый адносяцца да тыпу 1 паводле тыпалогіі Дж. Кларка [33]; тыпу гладкіх з акруглым альбо сплошчаным папярочным сячэннем, паводле Т. Галіньскага [37, s. 43, rys. 17: *1*]; простых іголкападобных вастрый (тып 1), паводле М. Г. Жыліна [4, с. 9; 5, с. 55; 6]; гладкіх вузкіх вастрый з акруглым сячэннем (тып $I1B_2$), паводле І. А. Загорскай [8]; да тыпу 01.02, паводле Л. Верхарта [46, 142–143, fig. 1].

Іголкападобныя вастрыі былі распаўсюджаны на абшарах ад Заходняй Еўропы да Урала ў шырокім храналагічным дыяпазоне – ад фінальнага палеаліту да канца неаліту [2; 5, с. 225; 6; 9; 26; 27; 40, s. 205; 45, p. 201, fig. L]. Такія вастрыі атрымалі самае шырокае распаўсюджанне ў мезаліце Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, дзе яны сустракаюцца сярод матэрыялаў кундскай, бутаўскай, анежскай культур, а таксама культуры Вярэцце [3, с. 239, табл. 32: *2*; 5, с. 268–272; 7; 17, с. 152, мал. 3: *2*; 47].

2. Гладкае сплошчанае вастрыё з адным пазам (КП 40428/49) – вёска Сваяцічы, Ляхавіцкі раён, Брэсцкая вобласць (мал. 1: *7*).

Вастрыё знойдзена ў 1960 г. у тарфяніку, на левабярэжжы р. Ведзьма (басейн р. Нёман) [10, с. 31].

Прылада (мал. 3) зроблена з расшчапанай трубчастай косткі. Паверхня вастрыя светла-карычневага колеру. Адна з франтальных паверхняў запаліравана па ўсёй даўжыні, другая – толькі па вастрыі і насадзе. Верагодна, падчас захавання выраб быў пашкоджаны, пра што сведчыць расколіна ў медыяльнай частцы і рэшткі клею, якія засталіся на паверхні ў выніку рэстаўрацыі вастрыя. У верхняй частцы паза захаваліся рэшткі рэчыва чорнага колеру, з дапамогай якога прымацоўваліся крамянёвыя ўкладышы. У якасці вязкага клейкага замацавальніка маглі выкарыстоўваць дзёгаць, хваёвую смалу, альбо сумесь смалы, дзёгцю і іншых дадатковых кампанентаў (напрыклад, пчаліны воск)[2] [4, с. 21; 38; 43].

Агульная даўжыня вастрыя – 19,8 см, максімальная шырыня – 1,0, максімальная таўшчыня – 0,7 см, вага – 11,1 гр. Даўжыня паза – 18,6 см. Шырыня паза вагаецца ад 0,2 см у верхняй і цэнтральнай да 0,3 см у ніжняй частках. Пасярэдзіне глыбіня паза складае 0,2 см, па краях – каля 0,15 см.

Такія вастрыі адносяцца да тыпу 21_1, у адпаведнасці з класіфікацыяй Дж. Кларка [33]; тыпу 21А паводле С. К. Казлоўскага [39]; тыпу Цінтэн, паводле Т. Галіньскага [37, s. 45, rys. 17: *13*]; вузкіх

[1] Аўтар выказвае шчырую падзяку супрацоўнікам НГМ Рэспублікі Беларусь А. Арабей і В. Каташынскай за дапамогу ў зборы інфармацыі пра згаданыя артэфакты.

[2] Дакладная ідэнтыфікацыя рэчыва магчыма толькі ў выпадку правядзення хімічнага аналізу.



Мал. 1 Месцазнаходжанні касцяных і рагавых вырабаў эпохі мезаліту: *1* – Смаргонскі кар'ер; *2* – Азярное 2Б; *3* – Ліцвінкі; *4* – Гожа; *5* – Морына; *6* – Залешаны; *7* – Сваяцічы; *8* – Гадзілавічы

сплошчаных бястронкавых наканечнікаў з пазам па адным краі (тып 10.2), паводле М. Г. Жыліна [5, с. 72]; прамых доўгіх вастрый з адным пазам (тып I3A), паводле І. А. Загорскай [8]; тыпу 07.05, паводле Л. Верхарта [46, с. 142–143, fig. 1].

Аднапазавыя вастрыі вядомы ў матэрыялах з тэрыторыі Усходняй Прыбалтыкі [7; 29, с. 56, 240, табл. 33: *28*; 42, fig. 4: *1*, *2*; 45, p. 82, fig. XVIII: 6, 11], паўночна-заходняй Расіі [5, 6], Урала і Зауралля [26, 27], паўночна-ўсходняй Польшчы [35, 37, 39, 43, 44, s. 96, 99, tabl. XXXVI: *11*], паўднёвай Беларусі [17, с. 152, мал. 3: *2*], дзе сустракаюцца на помніках кундскай, бутаўскай, камарніцкай культур і культуры Вярэцце.

Паводле меркавання М. Г. Жыліна, дадзеныя вастрыі ўжывалі ў прэбарэальным і барэальным перыядах [5, с. 229; 6]. На думку С. К. Казлоўскага, аднапазавыя вастрыі былі пашыраны ў барэальным і атлантычным перыядах і спарадычна сустракаліся на неалітычных помніках Усходняй Еўропы [39].

3. Гладкае сплошчанае вастрыё з двума пазамі (КП 12218) – вёска Гадзілавічы, Рагачоўскі раён, Гомельская вобласць (мал. 1: *8*).

У акце прыёму адзначана, што артэфакт выпадкова знайшлі ў 1964 г. каля в. Гадзілавічы, у торфе, на глыбіні 2–3 м.

Вастрыё (мал. 4) зроблена з расшчапанай трубчастай косткі. Паверхня цёмна-карычневага колеру, гладкая навобмацак, запаліраваная. У лёзавай частцы выраб мае акруглае і злёгку сплошчанае сячэнне, што становіцца амаль круглым бліжэй да насаду, ніжняя частка якога абламаная.

Захаваная даўжыня вырабу – 21,1 см, максімальная шырыня – 1,0, максімальная таўшчыня – 0,8 см, вага – 16,4 гр. Даўжыня пазоў – 11,7 см. Шырыня пазоў вагаецца ад 0,15 да 0,30 см, а іх глыбіня – ад 0,1–0,5 см па краях вырабу і да 0,2 см у цэнтральнай частцы. У адным з пазоў прылады захаваўся замацаваны крамянёвы ўкладыш і рэшткі рэчыва чорнага колеру, пры дапамозе якога ён мацаваўся. Укладыш



Мал. 2. Іголкападобнае вастрыё: *а* – фотаздымак; *б* – прарысоўка. в. Залешаны. Клецкі раён. Мінская вобласць



Мал. 3. Гладкае сплошчанае вастрыё з адным пазам: *а* – фотаздымак; *б* – прарысоўка. в. Сваяцічы. Ляхавіцкі раён. Брэсцкая вобласць



Мал. 4. Гладкае сплошчанае вастрыё з двума пазамі: *а* – фотаздымак; *б* – прарысоўка. в. Гадзілавічы. Рагачоўскі раён. Гомельская вобласць

выкананы з мікрапласцінкі, якую знялі з аднапляцовачнага нуклеуса. На вонкавым краі ўкладыш не мае слядоў другаснай апрацоўкі. У якасці сыравіны выкарыстоўвалі крэмень светла-шэрага колеру, празрысты на прасвет. Даўжыня ўкладыша – 1,5 см; шырыня часткі, якая выступае над пазам, – 0,3; таўшчыня – 0,5 см.

У адпаведнасці з класіфікацыяй Дж. Кларка, адносіцца да тыпу 21_2 [33, p. 117. fig. 41]; тыпу 21B, паводле С. К. Казлоўскага [39]; тыпу Ментуррен, паводле Т. Галіньскага [37, s. 45, rys. 17: 14]; вузкіх сплошчаных бястронкавых наканечнікаў з пазамі па абодвух краях (тып 10.3), паводле М. Г. Жыліна [5, с. 73; 6]; прамых доўгіх вастрый з двума пазамі (тып I3B), паводле І. А. Загорскай [8]; тыпу 07.02, паводле Л. Верхарта [46, с. 142–143, fig. 1].

Знаходкі двухпазавых вастрый вядомы на тэрыторыі Паўднёвай Даніі і Швецыі [38], Усходняй Прыбалтыкі [3, с. 239, табл. 32: *8*, *15*; 7; 29, с. 56, 240, табл. 33: 35; 39; 42, fig. 4: *3–5*], паўночна-заходняй Расіі [25, с. 22; 5; 6], Урала і Зауралля [26–28], паўночна-ўсходняй Польшчы [37; 43; 44, s. 126, 127, 130, tabl. XLIV: *17*], а таксама паўднёвай Беларусі [17, с. 152, мал. 3: *1*, *4–6*]. На згаданых тэрыторыях двухпазавыя вастрыі ўваходзілі ў склад паляўнічага

ўзбраення маглемозскай, кундскай, бутаўскай культур і культуры Вярэцце.

Двухпазавыя вастрыі атрымалі шырокае распаўсюджванне ў прэбарэальным і барэальным перыядах [5, с. 229; 6]. С. К. Казлоўскі, аднак, дапускае верагоднасць іх існавання і ў атлантычны перыяд [40].

Вынікі параўнаўча-тыпалагічнага аналізу касцяных вастрый са збораў НГМ Рэспублікі Беларусь, паказваюць, што яны аналагічныя і блізкія па тыпу з адпаведнымі мезалітычнымі вастрыямі з суседніх тэрыторый. Пакуль даволі цяжка адказаць на пытанне, са старажытнасцямі якой культуры (альбо культур) неабходна звязваць дадзеныя вырабы на тэрыторыі Беларусі. Гэта задача яшчэ больш ускладняецца па той прычыне, што ўсе тры артэфакты знаходзілі выпадкова, яны пазбаўлены адпаведнага культурна-храналагічнага кантэксту. Колер і ступень захаванасці вырабаў сведчаць аб тым, што артэфакты доўгі час знаходзіліся ў торфе, альбо на нізкім, забалочаным участку поплава. Гэта робіць актуальным абследаванне гэтых месцазнаходжанняў з мэтай пошуку там тарфянікавых паселішчаў мезалітычнага часу.

На тэрыторыі суседніх з Беларуссю рэгіёнаў такія касцяныя вастрыі найбольш часта сустракаюцца сярод матэрыялаў кундскай і бутаўскай культур. На тэрыторыі Беларусі помнікі апошніх выяўлены ў басейнах Заходняй Дзвіны, Нёмана, Дняпра і Сажа [1, 12, 14–16, 19, 41]. Знаходка фрагмента гладкага аднапазавага вастрыя вядома на помніку камарніцкай культуры Дудка 1 з тэрыторыі паўночна-ўсходняй Польшчы [35]. Разам з тым не выключана верагоднасць сувязі гэтых артэфактаў са старажытнасцямі кудлаеўскай і яніславіцкай культур. Менавіта з гэтымі культурамі даследчыкі звязваюць частку касцяных і рагавых вырабаў, у тым ліку і вастрый згаданых тыпаў, якія знаходзілі на дне воз. Вячэра [17; 20, с. 81]. Помнікі гэтых таксанамічных адзінак вядомы ў басейнах Заходняга Буга, Нёмана, Прыпяці, Сажа і Дняпра [13, 14, 16, 41].

Літаратура

1. Абухоўскі, В. Засяленне тэрыторыі Беларускага Панямоння ў X–V тыс. да н. э / В. Абухоўскі // Культура Гродзенскага рэгіёна : праблемы развіцця ва ўмовах поліэтнічнага сумежжа : зб. навук. пр. / адк. рэд. А. М. Пяткевіч. – Гродна : ГрДу, 2003, – С. 182–188.

2. Гурина, Н. Н. Оленестровский могильник / Н. Н. Гурина // Материалы и исследования по археологии СССР. – М. ; Л., 1956. – № 47. – 432 с.

3. Гурина, Н. Н. Мезолит Литвы и Белоруссии / Н. Н. Гурина // Археология СССР. Мезолит СССР. – М. : Наука, 1989. – С. 55–60.

4. Жилин, М. Г. Костяное вооружение древнейшего населения Верхнего Поволжья / М. Г. Жилин. – М., 1993. – 54 с.

5. Жилин, М. Г. Костяная индустрия мезолита лесной зоны Восточной Европы / М. Г. Жилин. – М., 2001. – 326 с.

6. Жилин, М. Г. Костяные наконечники стрел в мезолите лесной зоны Восточной Европы / М. Г. Жилин // Предметы вооружения и искусства из кости в древних культурах Северной Евразии (технологический и функциональный аспекты) : Замятнинский сб. – СПб. : Наука, 2011. – Вып. 2. – С. 113–152.

7. Загорска, И. Мезолит Латвии / И. Загорска, Ф. Загорскис // Краткие сообщения Института археологии. Памятники эпохи мезолита. – 1977. – Вып. 149. – С. 69–75.

8. Загорская, И. А. Костяные и роговые острия и гарпуны каменного века из Восточной Прибалтики / И. А. Загорская // Орудия каменного века. – Киев : Навук. думка, 1978. – С. 122–134.

9. Загорская, И. А. Костяные и роговые орудия охоты и рыболовства каменного века на территории Латвии : автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.06 / Ин-т истории АН Лит ССР. – Вильнюс, 1983. – 24 с.

10. Исаенко, В. Ф. Археологическая карта Белоруссии. Памятники каменного века / В. Ф. Исаенко. – Минск : Полымя, 1968. – 128 с.

11. Исаенко, В. Ф. Мезолит / В. Ф. Исаенко // Очерки по археологии Белоруссии. – Минск : Наука и техника, 1970. – Ч. I. – С. 49–66.

12. Колосов, А. В. Памятники бутовской культуры на территории Белорусского Посожья // Романовские чтения-3 : сб. тр. Междунар. науч. конф., Могилев, 23–24 нояб. 2006 г. / под ред. И. А. Марзалюка. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2007. – С. 154–156.

13. Колосов, А. В. Древности кудлаевской мезолитической культуры Верхнего Поднепровья / А. В. Колосов // Романовские чтения-4 : сб. тр. Междунар. науч. конф., Могилев, 22–23 нояб. 2007 г. / под ред. Я. Г. Риера. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2008. – С. 96–98.

14. Колосов, А. В. Финальный палеолит и мезолит Белорусского Посожья / А. В. Колосов // Русский сборник : труды кафедры Отечественной истории древности и средневековья Брянского гос. ун-та им. И. Г. Петровского. – Брянск, 2008. – Вып. 4. – С. 23–31.

15. Колосов, А. В. Мезолитическая стоянка Дедня / А. В. Колосов // Acta Archeologia Albaruthenica. – Минск, 2008. – Vol. III. – С. 42–66.

16. Колосов, А. В. Финальный палеолит и мезолит Посожья / А. В. Колосов // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2010, – Вып. 18. – С. 77–89.

17. Крывальцэвіч, М. М. Касцяныя і рагавыя вырабы каменнага веку з возера Вячэра / М. М. Крывальцэвіч // З глыбі вякоў. Наш край. – Мінск, 1996. – Вып. 1. – С. 147–168.

18. Крывальцэвіч, М. М. Гравіраваныя выявы і арнаментальнае аздабленне на касцяных вырабах з возера Вячэра / М. М. Крывальцэвіч // Na pograniczu światów. Studia z pradziejów międzymorza bałtycko-pontyjskiego ofiarowane Profesorowi Aleksandrowi Kośko w 60. Rocznicę urodzin. – Poznań : Wydawnictwo Poznańskie, 2008. – С. 265–276.

19. Ксензов, В. П. Мезолит Северной и Центральной Беларуси / В. П. Ксензов // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2006. – Вып. 13. – 170 с.

20. Кудрашоў, В. Я. Кудлаеўская культура / В. Я. Кудрашоў // Археалогія Беларусі : у 4 т. / рэдкал. М. В. Біч (старш.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 1997–2001. – Т. 1 : Каменны і бронзавы вякі / Э. М. Зайкоўскі [і інш.]. – 1997. – С. 67–76.

21. Лозе, И. А. Некоторые мезолитические находки на территории Латвии / И. А. Лозе // Материалы и исследования по археологии СССР. У истоков древних культур мезолита. – М. : Наука, 1966. – № 126. – С. 108–113.

22. Лозовский, В. М. Костяное охотничье вооружение первобытного населения Волго-Окского междуречья / В. М. Лозовский // Российская археология. – 1993. – № 2. – С. 5–15.

23. Ляўданскі, А. Розныя знаходкі / А. Ляўданскі // Працы секцыі археалогіі. – Менск, 1932. – Т. 3. – С. 244–246.

24. Обуховский, В. Поздний мезолит бассейна верхней Вилии / В. Обуховский // Acta Archaeologica Albaruthenica. – Мінск, 2010. – Vol. VI. – С. 9–21.

25. Ошибкина, С. В. Мезолит Восточного Прионежья. Культура Веретья / С. В. Ошибкина. – М. : Гриф и К, 2006. – 322 с.

26. Савченко, С. Н. Костяные наконечники стрел с пазами в Среднем Зауралье / С. Н. Савченко // Российская археология. – М., 2011. – № 1. – С. 27–37.

27. Савченко, С. Н. Костяные наконечники стрел в мезолите Урала / С. Н. Савченко // Предметы вооружения и искусства из кости в древних культурах Северной Евразии (технологический и функциональный аспекты) : Замятнинский сб. – СПб. : Наука, 2011. – Вып. 2. – С. 153–181.

28. Сериков, Ю. Б. Микропластинчатый комплекс святилища на Камне Дыроватом / Ю. Б. Сериков // Российская археология. – М., 2008. – № 3. – С. 5–15.

29. Тимофеев, В. И. Мезолит Калининградской области / В. И. Тимофеев // Археология СССР. Мезолит СССР. – М. : Наука, 1989. – С. 56, 240.

30. Чарняўскі, М. М. Рагавыя прылады працы са Смаргонскага месцазнаходжання / М. М. Чарняўскі, П. Ф. Каліноўскі // Беларускія старажытнасці. – Мінск, 1972. – С. 26–32.

31. Чарняўскі, М. М. Рагавыя сякеры Панямоння / М. М. Чарняўскі // Археалагічны зб. – Мінск, 2006. – Вып. 1. – С. 5–10.

32. Чернявский, М. М. Древнейшие роговые орудия из-под Сморгони / М. М. Чернявский // Lietuvos archeologija. – 1992. – Т. 9. – С. 116–120.

33. Clark, J. D. The Mesolithic Settlement of Northern Europe / J. D. Clark. – Cambrige, 1936. – 284 p.

34. Chochowska, E. Nieznane łopatkowate ostrze kościane z Litwinek na Polesiu / E. Chochowska // Materiały archeologiczne. – 2010. – T. XXXVIII. – S. 35–45.

35. Fedorczuk, J. Mesolithic finds at Dudka 1, Great Masufian Lakeland and their chronological taxonomic relations / J. Fedorczuk // Przegląd Archeologiczny. – 1995. – Vol. 43. – P. 47–60.

36. Galiński, T. Mezolit Pomorza / T. Galiński. – Szczecin : Muzeum Narodowe w Szczecinie, 1992. – 356 s.

37. Galiński, T. Społeczeństwa mezolityczne. Osadnictwo, gospodarka, kultura ludów łowieckich w VIII–IV tys. p. n. e. na terenie Europy / T. Galiński. – Szczecin : Muzeum Narodowe w Szczecinie, 2002. – 406 s.

38. Kośko, A. Z badań nad wytwarzaniem i użytkowaniem dziegciu w neolice / A. Kośko, J. Langer // Kwartalnik Historii Kultury Materialnej. – 1986. – № 4. – S. 587–600.

39. Kozłowski, S. K. Z problematyki polskiego mezolitu (cz. 10). Kościane harpuny i ostrza mezolityczne / S. K. Kozłowski // Światowit. – 1969. – T. XXX. – S. 135–152.

40. Kozłowski, J. K. Epoka kamienia na ziemiach polski / J. K. Kozłowski, S. K. Kozłowski. – Warszawa : Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1977. – 388 s.

41. Obuchowski, W. Materiały paleolityczne i mezolityczne z zachodniej Białorusi / W. Obuchowski. – Warszawa : Uniwersytet Warszawski, 2009. – 296 s.

42. Ostrauskas, T. Lietuvos mezolito gyvenviečių periodizacija : Daktaro disertacijos santrauka. Humanitariniai mokslai, istorija (05 H) / T. Ostrauskas ; Lietuvos istorijos institutas. – Vilnius, 1998. – 40 p.

43. Sulgostowska, Z. 1993. Kościane ostrze mezolityczne z wkładkami krzemiennymi z Tłokowa, woj. olsztyńskie – aspekt technologiczny / Z. Sulgostowska, M. J. Hoffmann // Archeologia Polski. – 1993. – T. 38, z. 1. – S. 75–88.

44. Szymczak, K. Epoka kamienia Polski północnowschodniej na tle Środkowoeuropejskim / K. Szymczak. – Warszawa : Wydawnictwa Fundacji «Historia pro futuro», 1995. – 191 s.

45. Vankina, L. The collection of stone age bone and antler artefacts from lake Lubana. Catalogue / L. Vankina. – Riga : N. I. S. M., 1999. – 290 p.

46. Verhart, L. B. M. Stone Age Bone and Antler Points as Indicators for «Social Territories» in the European Mesolithic / L. B. M. Verhart // Contributions to the Mesolithic in Europe / eds. P. M. Vermeersch, Ph. Van Peer. – Leuven, 1990. – P. 139–151.

47. Zagorska, I. Das Frühmesolithikum in Lettland / I. Zagorska // Veröffentlichungen des Museums für Ur- und Frühgeschichte Potsdam. – 1981. – Band 14/15. Mesolithikum in Europa. 2. Internationales Symposium, Potsdam, 3. bis 8. April 1978, Bericht. – P. 73–81.

Резюме

А. М. Вашанов

Мезолитические костяные острия в собраниях Национального исторического музея Республики Беларусь

Представлены находки трех костяных острий эпохи мезолита из фондов Национального исторического музея Республики Беларусь (г. Минск): игловидное острие из окрестностей д. Залешаны Клецкого района, гладкое плоское острие с одним пазом из д. Сваятичи Ляховичского района и гладкое плоское острие с двумя пазами из д. Гадзилови-

чи Рогачевского района. На территории Беларуси подобные артефакты могут быть связаны с древностями кундской, бутовской, каморницкой культур. Не исключена возможность их связи с кудлаевской и янославицкой культурами.

Summary

A. M. Vashanau

Mesolithic bone point in the collection of the National Museum of History of the Republic of Belarus

The article discusses three bone tip of the Mesolithic period. They are stored in the collections of the National Museum of History of the Republic of Belarus (Minsk). Needle-shaped bone arrow-head from the vicinity of the Zaljezhany village Kljeck district, slotted point with one slot from the Svajatichy village Ljakhavichy distric, slotted point with two slots from the Gadzilavichy village Rogachov district. In Belarus these artifacts can be connected with the antiquities Kunda, Butovo, Komornica, Kudlaevka and Janislawice Cultures.

Паступіў 16.08.2013 г.

УДК 903.4(476.2)

В. С. Вяргей, *кандыдат гістарычных навук (г. Мінск, Беларусь);*
А. Ф. Касюк, *Інстытут гісторыі НАН Беларусі, аддзел археалогіі сярэдніх вякоў і Новага часу, малодшы навуковы супрацоўнік (г. Мінск, Беларусь)*

Даследаванні паселішчаў каля вёскі Снядзін Петрыкаўскага раёна ў 2012 годзе

Палявая праца летам 2012 г. праводзілася ў сувязі з распрацоўкай праблемы засялення Прыпяцкага Палесся ў жалезным веку і раннім сярэдневякоўі, а таксама ў адпаведнасці з інавацыйным праектам па даследаванні археалагічных помнікаў на тэрыторыі Нацыянальнага парка «Прыпяцкі». Археалагічныя даследаванні здзяйсняліся на падставе Дазволу № 2425 і былі сканцэнтраваныя на раскопках паселішча Снядзін-3 і правядзенні магнітаразведкі на паселішчы Снядзін-2.

Археалагічны комплекс каля в. Снядзін Петрыкаўскага раёна адкрыты В. С. Вяргей у 1992–1993 гг. Ён складаецца з чатырох паселішчаў і грунтовага могільніка (мал. 1). Размешчаны на правым беразе р. Прыпяць на краі надабалоннай тэрасы на вышыні 2,5–3,5 м над узроўнем вады. З захаду і паўночнага захаду яго тэрыторыя абмежавана старычнымі азёрамі Барацкое і Уходнае (Входнэе). Паселішчы Снядзін-1 і Снядзін-3 размешчаны на выцягнутай з захаду на ўсход пясчанай градзе даўжынёй да 1 км. На самай высокай кропцы грады паміж паселішчамі 1 і 3 размешчаны грунтовы могільнік. Паселішча Снядзін-2 займае паўночнае становішча адносна паселішчаў 1, 3 і аддзелена ад іх забалочанай нізінай. Паселішча Снядзін-5, размешчанае паміж паселішчамі Снядзін-2 і -3, выявіў у 2010 г. В. Г. Белявец. У мінулыя гады раскопкі праводзілі на паселішчах 1, 2, 3 і могільніку [1–4].

Паселішча Снядзін-3 займае заходні ўчастак доўгай пясчанай грады і абмежавана з заходняга боку старычным возерам Барацкое (мал. 1). Знаходкі на паверхні прадстаўлены абломкамі ляпнога посуду, кавалкамі балотнай руды і жужалю і сустракаюцца на плошчы прыкладна 250 × 250 м. У 1997 г. тут былі закладзены два разведачныя шурфы, таўшчыня культурнага пласта ў якіх дасягала 0,6–0,8 м. У 2005–2006 і 2011–2012 гг. на тэрыторыі гэтага паселішча былі праведзены стацыянарныя раскопкі. Паверхня яго задзірванелая, даволі роўная, з невялікім паніжэннем на захад, у бок возера, і на поўнач, у бок нізіны, за якой размешчана паселішча Снядзін-2. Раскоп 4 памерам 14 × 4 м закладзены ўстык да паўночных сценак раскопу 3 (2011 г.). Доўгімі сценкамі раскоп арыентаваны па лініі усход–захад, ён разбіты на квадраты плошчай 2 × 2 м. Нумарацыя квадратаў лічбавая, ад 71 да 84, і працягвае нумарацыю раскопаў 1–3. Нумарацыя аб'ектаў раскопу 4 таксама працягвае нумарацыю аб'ектаў папярэдніх раскопаў.

Дзённая паверхня практычна роўная, перапады не перавышаюць 20 см, а перапад вышыні на ўзроўні мацерыка вагаецца ў межах каля 10 см. Верхнюю частку культурнага слоя складае ворыўны пласт шэра-карычневага супеску, таўшчыня якога дасягае 0,25–0,28 м. Ніжэй гэтага пласта залягае пласт чорна-карычневай зямлі, які прасочаны на ўсёй плошчы раскопу. Яго таўшчыня не аднолькавая ў розных месцах і вагаецца ад 0,45 да 0,15 м. Ніжэй яго назіраўся пласт жоўта-шэрага, месцамі з карычневым адценнем супеску. На профілі ўсходняй сценкі раскопу 4 паміж пластамі чорна-карычневага і шэра-жоўтага супеску прасочаны прапластак шэра-карычневага колеру. Мацярык складаўся з жаўтаватага пяску з рэдкімі артзандамі і залягаў на глыбіні 0,60–0,65 м. У культурным пласце раскопу і мацерыку выяўлены шэсць гаспадарчых ям, глінабітная пляцоўка, паўднёвыя часткі двух жытлаў. Ямы ў плане блізкія да круга альбо авала, іх сценкі звужаліся да нізу, дно мелі лінзападобнае. Яны дасягалі ў дыяметры 0,55–0,95 м і глыбіні 0,24–0,43 м. У іх запаўненні знойдзены фрагменты ляпной керамікі, косткі рыб, свойскіх і дзікіх жывёл і птушак, металургічныя шлакі.

У кв. 74 і 81 на глыбіні 0,35 м выяўлена пляцоўка абпаленай гліны памерам 1,10 × 1,15 м і таўшчынёй 10–12 см (мал. 2, *а*). Яе маглі выкарыстоўваць як летнюю кухню альбо ў нейкіх вытворчых мэтах.

Жытло 2. У кв. 79 і 80 выяўлены рэшткі пабудовы, якая найбольш верагодна з'яўлялася жытлом. Даследавана яго паўднёвая частка, а паўночная частка, дзе звычайна змяшчалася ацяпляльнае збудаванне, выходзіла за межы раскопу (мал. 2, *а*). Запаўненне жытла больш цёмнай плямай нерэгулярных абрысаў пачало выяўляцца ў культурным пласце на глыбіні 0,35–0,40 м. Больш упэўнена контуры жытла прасочаны на глыбіні 0,6 м. Яно арыентавана з усходу на захад, выяўленая частка мае памеры 3,5 × 1,5 м. Яго катлаван падпрамавугольнай у плане формы паглыблены ў мацярык на 15–12 см, а ў заходняй частцы часткова перакрыты ямай 74, якая мае даўжыню да 2,6 м. Запаўненне жытла мае чорна-карычневы колер. Дно катлавана пясчанае, няроўнае, амаль у яго цэнтры прасочана неглыбокая, падпрамавугольнай у плане формы ямка, памерам 0,6 × 0,6 м і глыбінёй каля 0,1 м, перакрытая зверху пластом перапаленай гліны, які дасягаў таўшчыні 0,10–0,12 м. Глыбіня жытла ад дзённай паверхні складала 0,80–0,85 м. У яго запаўненні

выяўлена 140 фрагментаў ляпнога гладкасценнага посуду, 1 раннеганчарнага, 1 глянцаванага, 45 кавалкаў жужалю, 34 косткі жывёл, 8 пячын, 1 крамянёвы выраб, 1 каваны жалезны цвік (мал. 3).

Жытло 3 выяўлена ў кв. 83 і 84, даследавана часткова, выходзіць за паўночную і заходнюю сценкі раскопу 4 (мал. 2, *а*). Больш цёмнае запаўненне пачало прасочвацца з глыбіні 0,35–0,40 м ад дзённай паверхні. Дастаткова выразна яго абрысы прасочаны на глыбіні 0,55–0,60 м. Арыентавана сценамі па лініі ўсход–захад, падпрамавугольны ў плане катлаван пабудовы апушчаны ў мацярык на 0,2–0,3 м. Падлога пясчаная, няроўная, мае ўхіл у заходнім накірунку. Запоўнена чорна-карычневым супескам з лінзамі чорнай зямлі, насычанай вуголлем і попелам. Гэты пласт у заходняй частцы месцамі падсцелены шэра-жоўтым супескам. У цэнтральнай частцы жытла, у яго падлозе, назіраецца авальных абрысаў ямка глыбінёй каля 0,15 м і памерамі 0,4 × 0,5 м, перакрытая ў верхняй частцы пластом перапаленай гліны. Запоўнена ямка шэра-карычневым супескам. У жытле 3 знойдзены 112 фрагментаў ляпной гладкасценнай керамікі (мал. 4: *1–8*), 1 глянцаванай, 2 з падштрыхоўкай, 30 кавалкаў жужалю, 107 костак жывёл, 12 абломкаў пячыны, 2 фрагменты раннеганчарнага посуду, абломак ляза жалезнай сякеры (мал. 5: *10*). Неабходна адзначыць, што пераважная большасць фрагментаў ляпнога посуду, якія былі выяўлены ў жытлах 2 і 3, належаць да керамічнага комплекса пражскай раннеславянскай культуры. У нязначнай колькасці знойдзены абломкі посуду перыяду рымскіх уплываў, а ў верхняй частцы над катлаванам сустракаецца кераміка Лука-Райкавецкай культуры (мал. 4: *9–14*).

У культурным пласце і аб'ектах раскопу знойдзена 67 фрагментаў ганчарнай керамікі, 12 абломкаў посуду эпох неаліту і бронзы, 1610 грубаляпнога гладкасценнага, 8 глянцаванага, 9 з падштрыхоўкай, 165 костак жывёл, 863 кавалкі жужалю, 12 крамянёвых артэфактаў, 55 кавалкаў пячыны альбо абмазкі.



Умоўныя адзнакі:

- палявая дарога
- забалочаная тэраса
- кустоўе
- поплаў
- лугавая расліннасць
- ліставыя дрэвы

Мал. 1. Сітуацыйны план размяшчэння археалагічных помнікаў каля в. Снядзін. 2012 г.



Мал. 2. План мацерыка раскопу 4 на паселішчы Снядзін-3 (*а*); план і профіль паўночнай сценкі шурфа 3 на паселішчы Снядзін-2 (*б*); план і профіль паўночнай сценкі шурфа 4 на паселішчы Снядзін-2 (*в*). 2012 г.



Мал. 3. Ляпны посуд (*1–3, 5–14)* і жалезны цвік (*4*) (фрагменты). Запаўненне жытла 2. Пласты 3, 4. Паселішча Снядзін-3. 2012 г.

Ганчарная кераміка пераважае ў ворным пласце, у другім механічным пласце (глыбіня 0,2–0,4 м) яе значна менш, а ніжэй яна практычна адсутнічае. Апрацоўку і замалёўку артэфактаў, якія адносяцца да эпох неаліту і бронзы, выканаў старэйшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі М. М. Крывальцэвіч, за што мы выказваем яму шчырую падзяку. Ён адзначыў наяўнасць у калекцыі фрагментаў посуду ўсходнепалескага варыянта днепра-данецкай неалітычнай культуры. У ганчарнай масе назіраюцца дамешкі шамоту, арганікі і жарствы. Прымянялі такія спосабы арнаментацыі, як грабенчатыя адбіткі, ямкі, насечкі, наколы. Іншая група керамікі адносіцца да позняга неаліту – пачатковага бронзавага веку, менавіта, да культуры шнуравой керамікі палескага тыпу. Паверхню посуду аздаблялі адбіткамі лінейнага штампа, шнуравым арнаментам. Таўшчыня сценак – у межах 0,5–1,0 см, найчасцей – 0,5–0,7 см, у якасці адтлушчальных дамешак у ганчарнай масе выкарыстаны шамот і дробная жарства. Прымянялі прыціранне знешняй і ўнутранай паверхняў альбо іх загладжванне. Адметнай марфалагічнай прыкметай шнуравой керамікі з'яўляецца каўнерыкавае патаўшчэнне на шыйцы. Крамянёвыя артэфакты прадстаўлены адшчэпамі, адшчэпамі з участкамі рэтушы, скрабком, абламаным вырабам з участкамі зробленай строма рэтушы, краявым сколам.

На падставе марфалагічных прыкмет сярод раннеганчарнага посуду вылучаюцца фрагменты гаршкоў, характэрных для X–XII стст. Найбольшая колькасць абломкаў посуду, выяўленых у раскопе, належыць да грубаляпных гладкасценных гаршкоў. Па марфалагічных і тэхналагічных прыкметах і нешматлікіх арнаментаваных экзэмплярах, у масіве названай керамікі можна вылучыць посуд класічнай зарубінецкай культуры палескага варыянта, постзарубінецкага гарызонту з традыцыямі лясной зоны, раннеславянскіх пражскай і Лука-Райкавецкай культур. У культурным пласце абломкі



Мал. 4. Ляпная кераміка: *1–8* – жытло 2, пласт 3; *9–14* – Лука-Райкавецкая культура, раскоп 4; *15, 16* –пасудзіны (фрагменты), яма № 73. Паселішча Снядзін-3. 2012 г.

зарубінецкай керамікі прадстаўлены ў нязначнай колькасці.

Да постзарубінецкай культурна-храналагічнай групы належаць фрагменты сасудаў з паверхняй, упрыгожанай расчэсам трэскай і лёгкай падштрыхоўкай. Да перыяду рымскіх уплываў належаць таксама фрагменты гаршкоў розных памераў (дыяметр венца 12–22 см) з адхіленай вонкі рознай даўжыні шыйкай, упрыгожаныя па знешнім краі венца касымі наколамі, насечкамі, ямкамі (мал. 3: *6*), а таксама таўстасценны посуд без арнаментацыі. Паверхня іх бугрыстая альбо добра загладжаная, у складзе керамічнай масы ў якасці адтлушчальных дамешак выкарыстаны жарства і шамот альбо толькі жарства. Пераважае карычневы колер розных адценняў, часам даволі светлы – жаўтаваты. Таўшчыня сценак вагаецца ў межах 0,7–1,5 см. Частка сасудаў мае глянцаваную паверхню чорнага, шэрага, альбо карычневага колеру.

Кераміка, характэрная для раннеславянскай пражскай культуры, прадстаўлена ў асноўным абломкамі гаршкоў. Па характары апрацоўкі паверхні пражскі комплекс распадаецца на дзве групы: з бугрыстымі і шурпатымі сценкамі. Шурпатую паверхню атрымоўвалі ў выніку дабаўлення ў керамічную масу значнай дамешкі дробнай жарствы. Гэтая дамешка дамінавала ў пражскім посудзе. Асаблівасцю снядзінскай калекцыі пражскай керамікі, выяўленай у ранейшых раскопах і ў 2012 г., з'яўляецца прысутнасць у керамічнай масе шэрагу фрагментаў не

толькі жарствы, але і шамоту. Падобная з'ява не прасочвалася ў кераміцы на іншых помніках пражскай культуры Палесся. Колер сценак разнастайны, часта плямісты, пераважае розных адценняў карычневая афарбоўка – ад светлых да цёмных тонаў. Частка сасудаў мае карычневата-чырвоны (цагляны) або жаўтаваты колер.

Пражскі тып у раскопе прадстаўлены пераважна слабапрафіляванымі гаршкамі з прамымі альбо крыху адагнутымі вонкі шыйкамі і найбольшым пашырэннем у верхняй палове іх вышыні. Дыяметры венцаў вагаюцца ў межах 12–24 см, таўшчыня сценак дасягае 0,5–0,9 см. Абрэз венца гарызантальны, плазаваты, бывае закруглены альбо скошаны вонкі. Сустракаюцца сасуды з падрэзанай унутры ў верхняй частцы шыйкай, альбо знешнім выступам пад венцам. Адзін фрагмент пражскага гаршка цаглянага колеру ўпрыгожаны па плечуках прачэрчаным арнаментам у выглядзе касога крыжа, які ў асобных месцах зліваецца ў краты. Упершыню падобным чынам арнаментаваная кераміка была выяўлена ў мінулым годзе ў раскопе 3. У культурным пласце і верхняй частцы запаўнення пабудоў выяўлены фрагменты сасудаў Лука-Райкавецкай культуры, упрыгожаныя па венцах пальцавымі ўцісканнямі, насечкамі і ўразной хваляй па тулаве (мал. 4: *12, 13*).

Акрамя глінянага посуду ў раскопе і яго аб'ектах знойдзены асобныя рэчы з гліны, каменя і металаў. Выяўлены тры цэлыя і тры фрагментаваныя гліняныя праселкі. Яны маюць акруглабокую, біканічную і жорнападобную формы (мал. 5: *12–14, 16–18*). Іх дыяметр – 3,0–3,2 см, вышыня – 1,7, дыяметр адтуліны – 0,7–0,8 см. Каля пабудовы 3 знойдзены вялікі кавалак пячыны цаглянага колеру. Франтальны бок гэтай пячыны ўпрыгожаны кропкавымі наколамі, пад якімі змешчана дуга, утвораная дзвюма прачэрчанымі лініямі з насечкамі ўнутры (мал. 5: *19*).

У пабудове 3 знойдзены тачыльны камень (мал. 5: *11*) – плазаваты выраб даўжынёй 9,0 см і шырынёй 3,8 см. У раскопе 4 выяўлены цэлы і фрагментаваны жалезныя нажы (мал. 5: *1, 2*). Агульная даўжыня цэлага экзэмпляра – 14,1 см, даўжыня ляза – 10,0, шырыня ляза – 1,8 см. У абодвух нажоў лязо ад тронак аддзелена ўступамі. У жытле 3 знойдзены фрагмент ляза жалезнай сякеры (мал. 5: *10*),



Мал. 5. Вырабы з жалеза (*1–10*), каменя (*11*), гліны (*12–14, 16–19*), шкла (*15*). Паселішча Снядзін-3. 2012 г.

а ў жытле 2 – будаўнічы цвік (мал. 3: *4*) і побач з ім цвік ад падковы (мал. 5: *7*). У культурным пласце выяўлены яшчэ адзін цвік (мал. 5: *4*), жалезныя стрыжні (мал. 5: *3, 5*) і іншыя нявызначаныя абломкі жалезных вырабаў (мал. 5: *8, 9*). На краі ямы 73 ляжаў масіўны рыбалоўны кручок, на ім захаваліся бародка і пятля для лескі даўжынёй 7 см, шырынёй цэўя 4,5 см (мал. 5: *6*). У яме 71 знойдзены фрагмент сіняй з глухога шкла пацеркі, аздобленай белым вочкам (мал. 5: *15*).

Магнітаразведка на паселішчах Снядзін-2, -3. У кастрычніку 2012 г. па ініцыятыве навуковых супрацоўнікаў Гёцінгенскага універсітэта (Германія) Енса Шнеевайса, Людмілы Шумілоўскіх і прадстаўніцы Берлінскага ўніверсітэта Ганны Бартроу, з дапамогай прывезенага імі абсталявання была праведзена магнітаразведка на паселішчах Снядзін-2, -3 і на грунтовым могільніку Снядзін-4. Для правядзення вымярэнняў, тэрыторыі археалагічных помнікаў разбівалі на квадраты памерам 40 × 40 м. Лініі квадратаў былі арыентаваны па баках свету. Праверка атрыманых вынікаў здзейснена шляхам закладкі двух кантрольных шурфоў на паселішчы Снядзін-2 на месцах зафіксаваных аб'ектаў.

Шурф 3 памерам 2 × 2 м закладзены на паўночным участку паселішча Снядзін-2 на беразе возера Уходнае (мал. 1). Паверхня помніка задзірванелая, крыху няроўная, на даследаваным участку мае перапады да 0,1 м. Культурны пласт у шурфе дасягаў таўшчыні да 0,67 м. Верхнюю яго частку складаў ворыўны пласт шэра-карычневага супеску магутнасцю да 0,30–0,35 м. Ніжэй залягаў пласт чорна-карычневага супеску таўшчынёй 0,28–0,34 м. Ва ўсходняй частцы шурфа перад мацерыком прасочваўся пласт шэрага супеску, насычаны артштэйнамі. Таўшчыня гэтага пласта месцамі дасягала 6–8 см. Мацярык складаўся з жаўтаватага пяску з артзандамі (мал. 2, *б*). Каля паўночнай сценкі шурфа выяўлены развал печы-каменкі, якая была складзена з камянёў дыяметрам ад 7 да 20 см і кавалкаў шлаку. У якасці бакавых сценак выкарыстаны вялікія плазаватыя кавалкі руды, пастаўленыя вертыкальна. Чарэнь печы ўяўляў з сябе перапалены пясок, насычаны вуголлем і попелам. У развале печы знойдзены фрагменты ляпнога посуду пражскай культуры, ніжнюю частку гаршка ўдалося рэканструяваць (мал. 6: *25*). Каля ўсходняй сценкі шурфа выяўлена заходняя частка авальнай у плане ямы памерам 0,97 × 0,30 м. Яна запоўнена шэрым супескам з артштэйнамі, знаходак няма. Усяго ў шурфе 3 знойдзена 160 фрагментаў ляпнога гладкасценнага посуду, 1 глянцаванага, 5 эпохі позняга неаліту; 7 крамянёвых артэфактаў; 14 кавалкаў жужалю; 53 косткі жывёл; 7 кальцыніраваных костак; глінянае біканічнае праселка, упрыгожанае прачэрчаным геаметрычным арнаментам (мал. 6: *3*); лязо жалезнага нажа, даўжыня якога складае каля 10 см, а шырыня 1,3 см (мал. 6: *4*). Сярод крамянёвых вырабаў прысутнічаюць: асіметрычны трохвугольны наканечнік стралы з двухбаковай апрацоўкай (мал. 6: *1*); трапецыя, рэтушаваная па бакавым краі; адшчэп; пласціна, апрацаваная стромай рэтушшу па бакавых краях і на дыстальнай частцы (мал. 6: *2*); пласціністы рабрысты адшчэп з участкамі рэтушы па краях, нанесенай з брушка і спінкі; абломак крэменю са скарынкай белага колеру. Ляпная гладкасценная кераміка дробнафрагментаваная, у якасці адтлушчальных дамешак у асноўным выкарыстоўвалі жарству, часам слюдзяністую. У масіве керамікі вылучаюцца абломкі посуду перыяду правінцыйна-рымскіх уплываў (мал. 6: *6*), у тым ліку і місак (мал. 6: *16–18*), пражскай раннесярэднявечнай культуры (мал. 6: *11, 20, 24, 25*).

Шурф 4 закладзены на краі ўсходняй часткі паселішча Снядзін-2. Яго памеры 2 × 2 м (мал. 2, *в*). Дзённая паверхня задзірванелая, яе перапады ў межах шурфа дасягаюць 0,1 м. Верхняя частка культурнага пласта таўшчынёй 0,22–0,30 м уяўляла з сябе ворыва з шэра-карычневага супеску, ніжэй залягаў пласт цёмна-карычневага супеску магутнасцю 0,10–0,16 м, які быў падсцелены слоем шэражоўтага супеску. Мацярык складаўся з жаўтаватага пяску з артзандамі і знаходзіўся на глыбіні 0,47–0,56 м (мал. 2, *в*). У паўночна-заходнім кутку шурфа 4 выяўлены агмень, які быў змешчаны адразу пад ворыўным пластом на глыбіні 0,3 м і ў паўночным накірунку выходзіў за межы раскопу. Памеры выяўленай часткі агменю прыкладна 0,75 × 0,60 м. Паўднёвая частка аб'екта, блізкая ў плане да падковападобнай формы, складалася з перапаленай гліны і шлакаў. У паўночнай частцы назіралася скапленне шлакаў з рэдкімі ўключэннямі кавалкаў пячыны. Цёмна-карычневы супесак у межах аб'екта быў насычаны попелам і вуголлем. У ворыўным пласце знойдзены 4 дробныя фрагменты ляпнога гладкасценнага посуду і 1 ганчарнага, таксама ў шурфе 4 выяўлены 51 кавалак шлака, 4 кавалкі пячыны, 1 моцна каразіраваны абломак жалезнага вырабу і артштэйн кулепадобнай формы. Невялікая колькасць матэрыялаў, знойдзеных у шурфе 4, можа сведчыць аб тым, што выяўлены ў ім агмень не звязаны з жылой пабудовай.

У 2012 г. на паселішчы Снядзін-3 даследавана 56 м^2 культурнага пласта. Выяўлена сем ям рознага прызначэння, пераважна гаспадарчага, паўднёвыя часткі двух жытлаў, глінабітная пляцоўка. На падставе аналізу рэчавага матэрыялу прасочваюцца перыяды засялення паселішча. Пачатковы перыяд функцыянавання помніка звязаны з эпохай позняга неаліту – з насельніцтвам днепра-данецкай культуры і культуры кола шнуравой керамікі. На фінальным этапе функцыянавання класічнай зару-



Мал. 6. Знаходкі: *1, 2* – крамянёвыя артэфакты; *3* – праселка; *4* – жалезны нож (фрагмент); *5–25* – ляпная кераміка (фрагменты). Шурф 3. Паселішча Снядзін-2. 2012 г.

бінецкай культуры, тут, хутчэй за ўсё, месціўся грунтовы могільнік. У керамічным комплексе выразна прадстаўлены посуд перыяду правінцыйна-рымскіх уплываў. Па тэхналогіі і марфалагічных параметрах ён блізкі да керамікі постзарубінецкага гарызонту, у першую чаргу такіх груп, як Грыні–Ваўкі і Люцеж, а таксама раннекіеўскай культуры тыпу Абідні, заўважана пэўная пераклічка з зубрэцкай групай Валыні. Значная колькасць матэрыялаў, выяўленых на паселішчы, адносіцца да ранняга сярэдневякоўя і адклалася падчас пражывання тут насельніцтва пражскай культуры. Перыяд VIII–IXстст. прадстаўлены фрагментамі ляпной керамікі, у тым ліку арнаментаванай пальцавымі ўцісканнямі і насечкамі па венцы, а таксама ўразной хваляй па тулаве. Раннедзяржаўная фаза фунцыянавання паселішча (X–XII стст.) адлюстравана нешматлікімі знаходкамі абломкаў раннеганчарнага посуду. Сабраныя падчас даследаванняў паселішча Снядзін-3 матэрыялы, уяўляюць значную цікавасць з пункту погляду вырашэння часу і ўмоў фарміравання раннепражскіх старажытнасцей, а таксама іх паходжання. Тут назіраецца стык пражскай культуры і папярэдніх старажытнасцей з традыцыямі лясной зоны. Магнітаразведка, праведзеная на паселішчах Снядзін-2 і -3, была эфектыўнай і паказала наяўнасць у культурным пласце шэрагу аб'ектаў рознага кшталту, што засведчана і кантрольнымі шурфамі.

Літаратура

1. Вяргей В. Раннеславянскае селішча Снядзін-2 / В. Вяргей, В. Трымер // Славяне и их соседи : Археология, нумизматика, этнология / под ред. А. А. Егорейченко. – Минск : Веды, 1998. – С. 27–35.

2. Вяргей В. С. Металургічны комплекс на раннеславянскім паселішчы Снядзін-2 // Славянский мир Полесья в древности и средневековье : Материалы Междунар. ист.-археолог. конф., Гомель, 19–20 окт. 2004 г. / редкол.: О. А. Макушников [и др.]. – Гомель : УО «ГГУ им. Ф. Скорины», 2004. – С. 34–39.

3. Вяргей В. С. Жытло і культавы аб'ект гарызонту пражскай культуры на паселішчы Снядзін-3 на р. Прыпяць у Петрыкаўскім раёне // Древняя история Восточной Европы. – Мінск : БГУ, 2009. – С. 21–32.

4. Вяргей В. С. Гарызонт эпохі жалеза на паселішчы Снядзін 3 на рацэ Прыпяць // Acta Archaeologica Albaruthenica / уклад. М. А. Плавінскі, В. М. Сідаровіч, М. І. Лашанкоў. – Мінск : І. П. Логвінаў, 2011. – Vol. VII (Вып. 7). – С. 34–50.

Резюме

В. С. Вергей, Е. Ф. Касюк

Исследования поселений около древни Снядин Петриковского района в 2012 году

В 2012 г. на поселении Снядин-3 исследовано 56 м^2 культурного слоя и совместно с сотрудниками Гёттингенского университета проведена магниторазведка на поселениях Снядин-2 и -3.

На поселении Снядин-3 исследованы южные части двух жилищ населения пражской культуры, глинобитная площадка и шесть хозяйственных ям. В вещевом комплексе поселения выделяются материалы поздненеолитических днепро-донецкой культуры и культуры круга шнуровой керамики. На рубеже эр появляются носители классической зарубинецкой культуры и поселение без хронологических лакун развивается до XII в. Представлена лепная посуда постзарубинецкого периода типа Курадово и ранней Абидни, пражской (IV–VII вв.), Лука-Райковецкой (VIII–X вв.) культур и раннегончарные сосуды эпохи Туровского княжества.

В контрольных шурфах на поселении Снядин-2 выявлены печь, сложенная из камней и крупных кусков болотной руды, а также очаг, сконструированный из глины и кусков металлургических и кузнечных шлаков.

Summary

V. S. Vjargei, A. F. Kasjuk

Research of the settlements near the village Snyadin in Petricau district in 2012

In 2012 on the settlement Snyadin-3 was 56 sq. m. of the cultural layer investigated. On the settlements Snyadin-2 and -3 together with the staff of the University of Gottingen was magnetic survey carried out.

In Snyadin-3 was the southern part of the two dwellings of the population of Prague culture, area of clay and 6 household pits explored. In the complex of things on the settlement stand materials late Neolithic Dnieper-Donets Culture and the Corded Pottery Culture. At the turn of the 1st B.C. – 1st A.D. there are carriers of classical Zarubinetskaya Culture and the settlement developed to the 12th century without any chronological breaks. Its ceramic complex consists of hand-made pottery of types Kuradava, early Abidnya, the Prague (the 4th–7th centuries), the Luka-Raikovetskaya (the 8th–10th centuries) Cultures and the wheel made pottery of the early period of Turov princedom.

In the test pits at the settlement Snyadin-2 was revealed oven, built of stones, large pieces of bog ore and hearth made of clay and pieces of metal and forging slags.

Паступіў 22.05.2013 г.

УДК 904:725.826(476.5)«10/14»

Д. У. Дук, *прарэктар Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар гістарычных навук, дацэнт (г. Наваполацк, Беларусь)*

Размяшчэнне вечавай плошчы ў Полацку (па выніках археалагічных раскопак у 2011 г.)[1]

Адной з галоўных роляў у арганізацыі самакіравання сярэдневяковага Полацка адводзілася вечу. Веча функцыянавала ў Полацку з XII ст. (не выключана, што і з XI ст.) і з пэўнымі трансфармацыямі працягвала існаванне фактычна да надання Полацку магдэбургскага права [11].

Мэта працы – разгледзіць пытанне аб месцазнаходжанні вечавай плошчы ў Полацку як важнага аб'екта сацыятапаграфічнай структуры горада.

Пісьмовыя крыніцы не даюць адказа на пытанне аб размяшчэнні ў Полацку месца вечавых сходаў. Вечавыя плошчы існавалі ва ўсіх гарадах Русі, аб'яднаных у так званую Сафійную прастору (Кіеў, Ноўгарад, Полацк). Згодна летапісам, вядома, што кіеўляне і наўгародцы ў XII ст. збіраліся на веча на княжацкіх Яраслававых дварах каля сабораў Святой Сафіі [9, с. 223–224, 231]. Пры гэтым у Ноўгарадзе існавала некалькі месцаў вечавых сходаў, асноўным месцам для правядзення якіх з'яўлялася тэрыторыя Дворышча каля княжацкага сабора св. Мікалая. Памеры ўласна вечавай плошчы ў Ноўгарадзе складалі 1200–1500 м^2 (стандартны памер баярскай сядзібы). Плошча была абсталявана лавамі і мела «сцепень» (трыбуну для пасаднікаў і кіраўнікоў вечавых сходак) [10, с. 80].

У Полацку двор князя да пачатку XIV ст. размяшчаўся на гарадзішчы. Тэрыторыя Верхняга замка ў XI–XIII стст. з'яўлялася сакральным цэнтрам. Гіпатэтычна вечавыя сходы палачан маглі адбывацца на Чорнай гары, якая ў першай палове XIV ст. набыла статус замкавай і пасля 1563 г. атрымала назву «Верхні замак». Тым не менш асаблівы сакральны статус Чорнай гары і тэрыторыі каля Сафійскага сабора ў XI–XIII стст. дазваляе выказаць меркаванне аб тым, што вечавая плошча была размешчана не на тэрыторыі будучага Замчышча.

У гістарыяграфіі гісторыі Полацка пытанне аб размяшчэнні вечавай плошчы практычна не разглядалася. Паколькі пісьмовыя крыніцы не дэталізуюць парадак арганізацыі вечавых сходаў у Полацку, а таксама не даюць адказ на пытанне аб месцы іх правядзення, існуе думка аб размяшчэнні вечавай плошчы недалёка ад Сафійскага сабора [7, с. 284]. З-за адсутнасці звестак у пісьмовых крыніцах вызначэнне месцапалажэння вечавай плошчы ў Полацку з'яўляецца кампетэнцыяй археалагічнай навукі.

Археалагічным маркёрам размяшчэння плошчы для грамадскіх сходаў будзе культурны пласт, які не ўтрымлівае слядоў будаўніцтва і сведчанняў рамеснай дзейнасці. На плошчы, якая з'яўлялася незабудаваным месцам для грамадскіх сходаў, інтэнсіўнасць будаўнічай дзейнасці і, адпаведна, хуткасць утварэння культурных адкладаў не маглі быць вялікімі.

Падчас археалагічных раскопак у 2011 г. была зафіксавана незвычайная для культурнага пласта цэнтральнай гістарычнай частцы Полацка стратыграфічная сітуацыя.

Раскопкі ў 2011 г. былі праведзены на тэрыторыі гісторыка-культурнай каштоўнасці – Вялікім пасадзе г. Полацка. Тэрыторыя, на якой быў зроблены раскоп, размешчана паблізу ад Чорнага ручая. Гэты ручай утварыў роў, які аддзяляе Верхні замак ад Вялікага пасада. Работы прадугледжвалі археалагічны нагляд за будаўнічымі работамі (нівеліроўкай паверхні зямельнага ўчастка) і правядзенне раскопак на месцы ўзвядзення жылога дома.

Пляцоўка пад будаўніцтва размешчана каля так званай царквы на рове (адкрыта П. А. Рапапортам у 1976–1977 гг. і лічыцца помнікам мураванага дойлідства XII ст.) [6, с. 155]. Гэтая царква па пісьмовых крыніцах XVII ст. згадваецца пад назвай Ражаства Хрыстовага. У другой палове XVI ст. яна ўжо была драўляная. Пры ёй у XVII ст. знаходзіўся цвінтар (яго рэшткі былі выяўлены падчас раскопак у 2011 г.). Царква існавала да трэцяй чвэрці XVII ст., час яе разбурэння прыпадае дзесьці на 1660–70-я гады. У грамаце Яна III аб зацвярджэнні прывілея гарбарнаму і кушнерскаму цэху Полацка ад 26 сакавіка 1683 г. цэхавая брація была абавязана даваць па 3 фунты воску ў царкву св. Сафіі замест «разоренной церкви Рождества» [5, с. 80].

Тэрыторыя раскопак размешчана ў некалькіх дзесятках метраў ад буйнога мураванага комплексу XVIII–XX стст. – полацкага калегіума езуітаў. Калегіум быў заснаваны ў 1581 г.

Згадкі пра размяшчэнне на месцы калегіума гарадскіх сядзіб (пляцаў) паводле Даравальнай Граматы Стэфана Баторыя ад 20 студзеня 1582 г. адсутнічаюць [3, с. 73]. Магчыма, калегіум быў заснаваны на незабудаванай частцы плошчы, якая мела назву «Великий Торгъ» [2, с. 39]. Пасля ўзвядзення калегіума гандлёвая плошча была перанесена на ўсход у раён сучаснай плошчы Свабоды.

Фундаментныя рвы царквы на рове былі адкрыты і даследаваны П. А. Рапапортам шляхам прарэзкі пляцоўкі каля былога рэальнага вучылішча

[1] Работа выканана ў межах тэмы «Сацыяльная тапаграфія, гаспадарка, культура і антрапалогія насельніцтва Полацка і Полацкай зямлі ў IX–XVIII стст.», дзяржаўная рэгістрацыя № 20111102 ад 30.05.2011 г.



Мал. 1. План размяшчэння раскопу 1: *1* – царква на рове (Ражаства Хрыстова); *2* – будынак былога рэальнага вучылішча; *3* – раскоп 1 на ўчастку будучага дома № 4. Вялікі пасад. г. Полацк. 2011 г.

(у 1976 г. – будынка сярэдняй школы № 8) [6, с. 155]. Было высветлена, што ў пачатку XX ст. падчас будаўніцтва будынка вучылішча падмуркі храма былі практычна цалкам знішчаны.

У 1967 г. М. К. Каргер выявіў паблізу ад падмуркаў храма два цагляныя саркафагі, суадносіны якіх з храмам дагэтуль не высветлены.

Археалагічныя даследаванні на поўнач ад храма праводзіў С. В. Тарасаў у 1990 г. Раскоп плошчай 80 м^2 быў закладзены каля ўсходняга схілу пагорка да так званага Чорнага ручая, непадалёк ад храма. Мэтай раскопак была верыфікацыя гіпотэзы *аб размяшчэнні ў дадзенай частцы колішняга Вялікага пасада старажытнай гандлёвай плошчы* [8, с. 5–6]. Быў адкрыты стратыграфічна аднародны культурны пласт магутнасцю 1,6 м, які ўтварыўся не раней за XVI–XVII стст. У гэтым пласце былі знойдзены асобныя фрагменты керамікі XII ст. Аўтар раскопак



Мал. 2. Планіграфія пластоў 1 і 2. Раскоп 1. Вялікі пасад. г. Полацк. 2011 г.

не прыводзіць пэўных высноў адносна размяшчэння плошчы. Аднак адсутнасць стратыграфічнага пласта, ранейшага за XVI ст., на беразе Чорнага ручая сведчыць пра магчымасць размяшчэння вечавай плошчы менавіта тут.

Паводле генеральнага плана пад забудову дома адводзілася пляцоўка памерамі 21,00 × 9,96 м (мал. 1). Перапад вышынь з поўначы на поўдзень да пачатку земляных работ складаў каля 1,3 м (129,30 супраць 128,05 м па балтыйскай шкале). На гэтай пляцоўцы верхні (баластны) пласт зямлі быў зняты экскаватарам з мэтай нівеліроўкі паверхні. У паўночнай частцы было знята да 1,5 м зямлі, у паўднёвай – да 0,4 м. Нівеліроўку паверхні ажыццяўлялі пад наглядам археолага. Зямля была перамешчана ніжэй будаўнічай пляцоўкі – на поўдзень ад будучага дома.

Пасля нівеліроўкі праводзілі археалагічныя раскопкі на ўчастку, дзе быў выяўлены культурны пласт. Быў закладзены раскоп 1 у форме літары «Г» плошчай 92 м^2. На гэтай плошчы раскопкі праводзілі ўручную. Раскоп 1 быў размешчаны на адлегласці каля 30 м ад паўднёвай сцяны царквы на рове.

Стратыграфія культурных напластаванняў раскопу 1. Дадзены раскоп быў разбіты наступным чынам: з усходу на захад[1] – падзелены на квадраты А, Б, В, Г, Д, Е, Ж, з поўначы на поўдзень – на квадраты 2, 3, 4, 5, 6. У межах кв. А–В зроблены на ўсю шырыню дома паводле генплана: кв. 2–6 (10 м). У межах кв. Г–Ж – на шырыню кв. 5–6 (4 м). Сумарная плошча раскопу склала 92 м^2. Да глыбіні 0,2 м на ўсёй плошчы раскопу быў прыняты ўмоўны пласт 1, у межах лініі А–Ж кв. 6 культурны пласт ніжэй глыбіні 0,2 м да мацерыка – пласт 2.

На астатняй частцы пляцоўкі пад будаўніцтва да самага мацерыка быў зафіксаваны выключна баластны пласт. Пры гэтым у межах першай і другой ліній кв. Е і Ж да глыбіні 1 м зафіксаваны тысячы костак буйной рагатай жывёлы, пахаваных у другой палове XX ст.

Верхні пласт, які быў зняты экскаватарам, ўяўляў з сябе развал будаўнічых матэрыялаў (цэгла, драўляныя канструкцыі, камяні) і побытавага смецця. Магутнасць пласта максімальная ў паўночнай

[1] Фактычна мела месца адхіленне ад лініі поўдзень–поўнач на 20° на захад. (Дзеля спрашчэння апісання ў тэксце тут і далей вызначаецца лінія па баках свету.)



Мал. 3. Стратыграфія і план мацерыка раскопу 1. Вялікі пасад. г. Полацк. 2011 г.

частцы – 1,5 м і змяншаецца да паўднёвай частцы пляцоўкі пад дом – 0,4 м. Утварыўся гэты баластны пласт падчас разбурэння драўляных дамоў на каменна-цагляных падмурках, якія былі ўзведзены на дадзенай тэрыторыі ў пасляваенны час, а разбураны былі ў 1980-я гады. На большай частцы раскопу культурны пласт, ранейшы за XX ст., быў знішчаны да мацерыка.

Мацярык прадстаўлены чырвонай вельмі шчыльнай і аднароднай глінай.

На ўсёй плошчы раскопу, за выключэннем шостай і часткова пятай ліній квадратаў, рэшткі культурнага пласта, ранейшага за XX ст., захаваліся ў межах мацерыковых ям ад пахаванняў цвінтара царквы.

Сумарная магутнасць захаванага культурнага пласта на большай частцы раскопу не перавы-

шала 0,2 м. Па шостай лініі квадратаў адбывалася рэзкае ўзрастанне магутнасці культурнага пласта ў сярэднім да 0,8–1,0 м, месцамі ў межах мацерыковых ям – да 2,0 м.

Паверхня раскопу пасля нівеліроўкі роўная, перапад вышынь па лініі поўнач–поўдзень ва ўсходняй частцы складае каля 0,2 м, у заходняй частцы – да 0,4 м (адзнакі 69–101, 82–126) (мал. 2).

Культурны пласт раскопу 1 аднародны. Прадстаўлены цёмна-шэрай камкаватай зямлёй карычневага адцення з вуголлем, камянямі і рэшткамі драўляных валокнаў. Месцамі мае прапласткі вугалю магутнасцю да 0,1 м, лінзы чырвонай аднароднай гліны магутнасцю да 0,3 м, развалы цаглянага друзу (кв. В6–Д6) (мал. 3). Абсалютная большасць знаходак прадстаўлена керамічным посудам і кафляй XVII–XIX стст., значна меншая колькасць посуду датавана XVI ст. Індывідуальныя знаходкі прадстаўлены гаспадарчымі прадметамі (акоўка рыдлёўкі, сякера, нажы і ключы ад замкоў і інш.), а таксама дэталямі адзення (жалезныя абутковыя падкоўкі, бронзавая завушніца, гузікі і інш.). Гэтыя знаходкі датаваны XVII–XIX стст. Знойдзены толькі адзін артэфакт, які датаваны больш раннім часам – гэта фрагмент шклянога бранзалета XII – першай паловы XIII ст. (мал. 4: *8*).

У межах адзначанага культурнага пласта было выяўлена 11 пахаванняў, аднак на плане іх пазначана 12. Гэта адбылося з-за таго, што за скапленне чалавечых костак пахавання 4 былі памылкова прыняты косткі жывёл. Усе пахаванні былі пераадкладзеныя і прадстаўлены фрагментамі чарапоў ці скапленнем костак шкілета з фрагментамі чарапоў. Ад некаторых пахаванняў засталіся толькі мацерыковыя ямы ад трун. Таму рэальная колькасць знойдзеных астанкаў вызначана падчас антрапалагічнай экспертызы.

Пахаванне 1 размешчана на мяжы кв. Б3 і В3, ад пахавання засталася мацерыковая яма ад труны. Разрэз ямы О'–О зроблены практычна па лініі поўдзень–поўнач (мал. 3). Шырыня ямы – 0,8–0,9 м, даўжыня – 1,6, глыбіня – 0,2 м. Сценкі паката нахіленыя, дно плоскае. У паўднёвай частцы каля сценкі ямы размешчаны камень дыяметрам каля 0,3 м. Яма запоўнена шэрай камкаватай зямлёй карычневага адцення з вуголлем, камянямі і рэшткамі драўляных валокнаў. Знаходкі адсутнічалі.

Пахаванне 2 размешчана на мяжы кв. А3 і А4, ад пахавання засталася мацерыковая яма ад труны. Разрэз ямы Н'–Н зроблены практычна па лініі поўдзень–поўнач (мал. 3). Шырыня ямы – 0,6 м, даўжыня – 1,8, глыбіня – да 0,2 м. Сценкі вертыкальныя, дно плоскае. Яма запоўнена шэрай камкаватай зямлёй карычневага адцення з вуголлем, камянямі і рэшткамі драўляных валокнаў. Знаходкі адсутнічалі.



Мал. 4. Вырабы з каляровых металаў, шкла і косці: *1* – спражка; *2* – завушніца; *3, 5* – пласцінкі; *4* – пярсцёнак; *6* – пломба таварная; *7* – куля з літнікам; *8* – бранзалет; *9* – накладка на дзяржанне нажа; *1–5* – бронза; *6, 7* – свінец; *8* – шкло; *9* – косць. XII–XVIII стст. Раскоп 1. Вялікі пасад. г. Полацк. 2011 г.

Пахаванне 3 размешчана на мяжы кв. В5, ад пахавання застаўся чэрап і мацерыковая яма ад труны. Разрэз ямы М'–М зроблены практычна па лініі поўдзень–поўнач (мал. 3). Шырыня ямы – 0,6 м, даўжыня – 1,2, глыбіня – да 0,2 м. Чэрап размешчаны ў паўночнай частцы ямы на адлегласці 0,2 м ад паўночнай сценкі. Сценкі ямы вертыкальныя, дно плоскае. Яма запоўнена шэрай камкаватай зямлёй карычневага адцення з вуголлем, камянямі і рэшткамі драўляных валокнаў. Знаходкі адсутнічалі.

Пахаванне 4 пазначана на плане пасярэдзіне кв. Е5 каля яго паўднёвай сценкі (мал. 2). У працэсе антрапалагічнай экспертызы было высветлена, што косткі, прынятыя за чалавечыя, належалі жывёлам. Косткі размешчаны бессістэмна (адзнака глыбіні залягання 106). Таму ў сапраўднасці пахавання 4 не існуе.

Пахаванне 5 выяўлена пасярэдзіне кв. Д6, каля яго заходняй сценкі (мал. 2). Прадстаўлена фрагментамі чарапоў і фрагментамі патрушчаных костак каля іх (адзнака глыбіні залягання 105). Косткі размешчаны бессістэмна.

Пахаванне 6 выяўлена пасярэдзіне кв. Е5 каля яго заходняй сценкі (мал. 2). Прадстаўлена фрагментамі чарапоў і фрагментамі патрушчаных костак каля іх (адзнака глыбіні залягання 70). Косткі размешчаны бессістэмна.

Пахаванне 7 выяўлена на адлегласці 0,3 м на ўсход ад чэрапа пахавання 6 (мал. 2). Прадстаўлена фрагментам чэрапа і фрагментамі патрушчаных костак каля чэрапа (адзнака глыбіні залягання 71). Косткі размешчаны бессістэмна.

Пахаванне 8 выяўлена пасярэдзіне кв. Д6 на адлегласці 0,5 м ад яго заходняй сценкі (мал. 2). Прадстаўлена фрагментам чэрапа (адзнака глыбіні залягання 142). Косткі размешчаны бессістэмна.

Пахаванне 9 выяўлена пасярэдзіне кв. Г5 на адлегласці 0,2 м ад яго паўднёвай сценкі (мал. 2). Прадстаўлена фрагментамі чэрапа (адзнака глыбіні залягання 143). Косткі размешчаны бессістэмна.

Пахаванне 10 выяўлена ў паўднёва-заходняй частцы кв. Б6 на адлегласці 0,3 м ад яго ўсходняй сценкі (мал. 2). Прадстаўлена фрагментамі патрушчаных костак каля чэрапа (адзнака глыбіні залягання 229). Косткі размешчаны бессістэмна.

Пахаванне 11 выяўлена ў паўднёва-ўсходняй частцы кв. Б6 на адлегласці 0,6 м ад яго ўсходняй сценкі (мал. 2). Прадстаўлена фрагментамі чарапоў і фрагментамі патрушчаных костак каля іх (адзнака глыбіні залягання 180). Косткі размешчаны бессістэмна.

Пахаванне 12 выяўлена ў паўднёва-ўсходнім вуглу частцы кв. Г6 (мал. 2). Прадстаўлена фрагментамі чарапоў і фрагментамі патрушчаных костак каля іх (адзнака глыбіні залягання 258). Косткі размешчаны бессістэмна.

Канструкцыя кв. Б2 і В2 ўяўляла сабой вырытае на 0,2 м у мацерыковай гліне паглыбленне з роўнымі вертыкальнымі сценкамі і плоскім дном. Сценкі абкладзены дошкамі, пастаўленымі на тарэц. Таўшчыня дошак – каля 3 см. Канструкцыя ў плане квадратная, памерам 2,2(поўдзень–поўнач) × 2,0 м, размешчана ў межах кв. Б2 і В2, а таксама у сумежных кв. Б3 і В3 (на адлегласці 0,2 м ад сценкі) (мал. 2). З паўночнага боку выходзіць за межы раскопу. Унутры канструкцыі на мацерыку дысперсна размяшчаліся камяні дыяметрам 0,1–0,3 м. Запаўненне культурнага пласта аналагічна вышэйапісанаму. Знаходкі прадстаўлены двадцаццю фрагментамі вырабаў са шкла і керамікі (гаршкі, накрыўкі, размаляваная талерка) канца XVIII – XIX ст.

У раскопе разабрана 14 мацерыковых ям. Знаходкі з ям прадстаўлены сямью вырабамі XVI–XVII стст.: венцамі і сценкамі керамічных гаршкоў і місак, кавалкамі аконнага шкла і кафлі.

Археалагічныя знаходкі. Абсалютная большасць знаходак прадстаўлена керамічным посудам і кафляй XVII–XIX стст.

Посуд з'яўляецца тыповым для XVII–XVIII стст., пераважная большасць гаршкоў зроблена на нажным ганчарным крузе (мал. 5: *1–6*; 6: *1*) [4, с. 103–104]. Адзінкавыя гаршкі датаваны XVI ст. (мал. 6: *3, 6–8*). Знойдзены тыповыя для XVII ст. паліваныя збаны (мал. 5: *7, 8*), кружкі і куфлі (мал. 7) [4, с. 126–127].

Адна цэлая кафля прадстаўлена каронкай (мал. 6: *10*), аналагічныя каронкі выяўлены пры даследаванні езуіцкага калегіума.

Індывідуальныя знаходкі прадстаўлены гаспадарчымі прадметамі: акоўкай рыдлёўкі (мал. 8: *2*), сякерай (мал. 8: *3*), ключамі ад замкоў (мал. 9: *3, 4*), нажамі (мал. 10: *1, 2, 4*), крэсівам (мал. 10: *5*). Гэтыя вырабы тыповыя для XVI–XVIII стст.

Крэсіва (мал. 10: *5*) мае аналогіі з вырабамі, знойдзенымі ў іншых частках Полацка ў пластах XVI–XVII стст. [4, мал. 54: *13*]. Нажы чаранковыя (мал. 10: *2*) і з накладнымі тронкамі (мал. 10: *1, 4*). На адным нажы захаваліся фрагменты драўлянага дзяржання (мал. 10: *1*). Чаранковыя нажы бытавалі ў Полацку да пачатку XVI ст., у далейшым выкарыстоўвалі толькі нажы з накладнымі тронкамі [4, с. 148]. Знойдзены дэталі аддзення (бронзавая



Мал. 5. Венцы гаршкоў. XVI–XVIII стст. Раскоп 1. Вялікі пасад. г. Полацк. 2011 г.



Мал. 6. Венцы гаршкоў (*1, 5, 7–9*) і місак (*2, 4*), гаршчок (*3*), донца гаршка (*6*), кафля-каронка (*10*). XVI–XVII стст. Раскоп 1. Вялікі пасад. г. Полацк. 2011 г.



Мал. 7. Керамічныя кружка (*1*) і куфель (*2*). XVI–XVII стст. Раскоп 1. Вялікі пасад. г. Полацк. 2011 г.



Мал. 8. Вырабы з жалеза: *1* – патэльня; *2* – акоўкі рыдлёвак; *3* – сякера. XVI–XVIII стст. Раскоп 1. Вялікі пасад. г. Полацк. 2011 г.



Мал. 9. Вырабы з жалеза: *1* – кручок для пляцення; *2* – зубіла; *3, 4* – ключы; *5* – выраб невядомага прызначэння. XVI–XVIII стст. Раскоп 1. Вялікі пасад. г. Полацк. 2011 г.

завушніца (мал. 4: *2*), жалезныя абутковыя падкоўкі (мал. 11: *1–4*)). Бронзавая завушніца стратыграфічна датавана канцом XVII – XVIII ст., аднак яна магла паходзіць з жаночага пахавання першай паловы XVII ст. Аналагічныя завушніцы XVI–XVIII стст. вядомы і ў іншых рэгіёнах Беларусі [1, с. 416], таксама як і бронзавы пярсцёнак (мал. 4: *3*) [4, с. 416]. Свінцовая куля-паўфабрыкат (мал. 4: *7*) сведчыць аб вытворчасці зброі.

Знойдзены фрагмент жалезнай патэльні дыяметрам 34 см (мал. 8: *1*). Прылады працы прадстаўлены таксама жалезнымі кручком для пляцення і зубілам (мал. 9: *1, 2*).

Такім чынам, большасць знаходак з раскопу 1 бытавалі ў межах XVI–XVIII стст. Выключэннем з'яўляецца фрагмент шклянога бранзалета XII – першай паловы XIII ст. (мал. 4: *8*).

Заключэнне. Вынікі раскопак дазваляюць з упэўненасцю канстатаваць факт адсутнасці на месцы раскопу культурных напластаванняў, якія можна аднесці да часу раней за XVI ст. Фактычна культурны пласт стаў утварацца ў канцы XVII ст., калі на былым цвінтары царквы Ражаства Хрыстова пачалі будаваць драўляныя дамы на падклетах. Адсутнасць культурных напластаванняў,



Мал. 10. Вырабы з жалеза: *1–4* – нажы; *5* – крэсіва. XVI–XVIII стст. Раскоп 1. Вялікі пасад. г. Полацк. 2011 г.



Мал. 11. Вырабы з жалеза: *1–4* – падковы абутковыя; *5* – падкова. XVI–XVIII стст. Раскоп 1. Вялікі пасад. г. Полацк. 2011 г.

ранейшых за XVI ст., было адзначана археолагамі з паўночнага боку ад царквы. Гэтаму існуюць наступныя тлумачэнні.

Першае – царква была манастырскай і вельмі нязначны культурны пласт XII–XVI стст. не захаваўся. Падобная стратыграфічная карціна характэрна, напрыклад, для Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра, дзе культурны пласт раней XV ст. адсутнічае.

Другое – каля царквы на поўнач і поўдзень ад на працягу XII(XI?)–XVII стст. быў размешчаны цвінтар і па гэтай прычыне тэрыторыя была не забудавана.

Трэцяе зыходзіць з факта наяўнасці ў даследаванай частцы Вялікага пасада ў XVI ст. гандлёвай плошчы – Вялікага торгу. Магчыма, тэрыторыя вакол храма на рове (у XVI–XVII стст. царквы Ражаства Хрыстова) з'яўлялася ў XII(XI?)–XV стст. месцам вечавых сходаў і па гэтай прычыне была незабудаванай. Паколькі звесткі ў пісьмовых крыніцах аб дзейнасці манастыра каля царквы адсутнічаюць, найбольш верагодна прыняць другое і трэцяе меркаванні.

Ключавымі ў вырашэнні праблемы з'яўляюцца археалагічныя даныя. Два цагляныя саркафагі, выяўленыя М. К. Каргерам, як быццам бы могуць сведчыць пра магчымасць размяшчэння каля царквы старажытнага цвінтара. Аднак раскапаныя ў 2011 г. пахаванні не з'яўляюцца старажытнымі. Па гэтай прычыне гіпотэза аб размяшчэнні вечавай плошчы каля царквы на рове застаецца больш абгрунаванай археалагічна.

Літаратура

1. Археалогія Беларусі : у 4 т. / В. М. Ляўко [і інш.] ; пад. рэд. В. М. Ляўко і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – Т. 4 : Помнікі XIV–XVIII ст. – 597 с.

2. Варонін, В. Тэстамент полацкага бурмістра Давыда Панкова 1559 г. / В. Варонін // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі : матэрыялы IV Міжнар. навук. канф., Полацк, 2003. – Полацк : НПГКМЗ, 2003. – С. 32–40.

3. Витебская старина / сост. А. Сапунов. – Витебск : Типолитография Г. А. Малкина, 1888. – Т. V. – 670 с. + 40 л. : ил.

4. Дук, Д. У. Полацк XVI–XVIII стагоддзяў : нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада / Д. У. Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2007. – 268 с. : іл.

5. Дук, Д. У. Полацк і палачане (IX–XVIII стст.) / Д. У. Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2010. – 180 с. : [22 л. іл.].

6. Раппопорт, П. А., Полоцкое зодчество XII века / П. А. Раппопорт // Сов. археология. – 1980. – № 3. – С. 143–163.

7. Русь в IX–X веках : археологическая панорама / Ин-т археологии РАН ; отв. ред. Н. А. Макаров. – М. ; Вологда : Древности Севера, 2012 – 496 с. ; ил.

8. Тарасаў, С. В. Справаздача аб археалагічных доследах у Полацку і полацкай акрузе ў 1990 г. / С. В. Тарасаў // Архіў Ін-та гісторыі Нац. акад. навук Беларусі. – Воп. 1. – Спр. 1205.

9. Тихомиров, М. Н. Древнерусские города / М. Н. Тихомиров. – М. : Государственное издательство политической литературы, 1956. – 478 с.

10. Янин, В. Л. Средневековый Новгород : Очерки археологии и истории / В. Л. Янин ; Отд. ист.-филолог. наук. – М. : Наука, 2004. – 416 с.

11. Rohdewald, S. Ot veçe k gorodskomu sovetu : o razvitii organov polotskich gorozhan do naçala XIV veka / S. Rohdewald // Беларускі горад у часе і прасторы : 500 гадоў Полацкай магдэбургіі : зб. навук. прац. – Наваполацк : ПДУ, 2001. – С. 15–25.

Резюме

Д. В. Дук

Расположение вечевой площади в Полоцке (по итогам археологических раскопок в 2011 г.)

Обосновывается гипотеза о расположении древнейшей вечевой площади на территории западной окраины Великого посада в Полоцке на примере итогов археологических раскопок в 2011 г. Представлена характеристика стратиграфии культурного слоя раскопа 2011 г., дана характеристика археологических находок XVI–XIX вв. и антропологического материала. Сделан вывод о возможности расположения вечевой и торговой площади XI–XV вв. на территории Великого посада, у подножия Верхнего замка. Территория расположения вечевой площади примыкала к так называемому храму на рву XII в., который в XVI–XVII вв. называли церковью Рождества Христового. В XVII в. на данной территории располагался погост, а в XVIII–XIX вв. были построены жилые деревянные дома.

Summary

D. V. Duk

Popular assembly location in Polotsk (according to the archeological excavations in 2011)

The hypothesis about an ancient popular assembly location on the territory of the western outskirts of Velikiy Posad in Polotsk is proved on the basis of archeological excavations examples in 2011. Characteristics of cultural layer stratigraphy of excavation 2011 are given, as well as characteristics of archeological findings of 16th–19th centuries and anthropological material. A conclusion is made about the possibility of popular assembly location and trade square of the 11th–15th centuries on the territory of Velikiy Posad downhill the Upper castle. The territory of popular assembly location, bordered with so-called temple on the ditch 12th century, which in 16th–17th centuries was called the Church of the Nativity. In 17th century on this territory a graveyard was situated, in 17th–19th centuries wooden houses were built.

Паступіў 21.05.2013 г.

УДК 902.674

М. В. Ермохин, *Институт экспериментальной ботаники имени В. Ф. Купревича НАН Беларуси, ведущий научный сотрудник, кандидат биологических наук (г. Минск, Беларусь)*

Результаты дендрохронологического исследования материалов с территории Минского замчища (по раскопкам 2009 г.)

Годичные кольца деревьев в интегрированной форме регистрируют все изменения, происходящие в окружающей среде. На ширину годичного кольца оказывают влияние как внешние (количество света, тепла, влаги, богатство почвы и др.), так и внутренние (возраст, индивидуальные особенности дерева, его положение в насаждении и др.) факторы. Причем деревья одной породы из близких регионов и произрастающие в схожих почвенно-грунтовых условиях одинаково реагируют на внешние факторы, что обусловливает высокую синхронность в изменчивости их годичного прироста. Это позволяет оценить влияние экологических и антропогенных факторов на формирование прироста деревьев, реконструировать и прогнозировать климатические изменения, а в археологических исследованиях – определить (с точностью до одного года и даже сезона года) дату рубки дерева, использованного для строительства зданий и сооружений, изготовления различных предметов, имеющих историческую ценность.

В 2009 г. в двух раскопах на территории Минского замчища для дендрохронологических исследований были отобраны образцы древесины из остатков различных конструкций и сооружений (дома, частоколы, сваи, мостовые и др.).

Материалы и методы исследования. В раскопе № 1 отобрано 14 образцов древесины (поперечные спилы) из бревен настила (8) и свай (6) различного диаметра, характеристика которых приведена в табл. 1. Все отобранные образцы представлены древесиной сосны обыкновенной.

В раскопе № 2 отобрано 39 образцов древесины из досок настила, мостовой (32) и бревен построек (7) различного диаметра. Характеристика отобранных образцов приведена в табл. 2. Все отобранные образцы представлены древесиной сосны обыкновенной.

Величину радиального прироста древесины измеряли под микроскопом, либо по отсканированному изображению с использованием программного обеспечения ArcGIS с точностью до 0,01 мм. Для каждого образца из двух измеренных серий годичных колец получали усредненный ряд. Перекрестное датирование, выявление ложных и выпавших колец проведено с использованием кросскорреляционного анализа [3], который показывает тесноту связи (с заданным шагом сдвига) между рядами.

Для оценки взаимосвязи между образцами использовали коэффициент синхронности [5] и *t*-критерий [1].

Расчеты кривых для элиминирования возрастных трендов, индексов прироста и авторегрессионное моделирование выполнены в программном пакете DPL-99 [2–5]. Формирование массивов информации, их верификацию, статистическую обработку и графическое отображение результатов исследований осуществляли в программных пакетах Statistica, Microsoft Excel, ArcGIS.

Результаты и их обсуждение. ***Раскоп № 1.*** Для строительства исследованного настила использовали тонкомерную древесину диаметром 11,0–14,5 см. Причем часть бревен была получена из сухостойных деревьев. На образце № 11n5 обнаружен ход малого соснового лубоеда (*Blastophagus minor* Hart.) – насекомого, заселяющего сильно ослабленную, свежую сухостойную и валежную древесину сосны. Ориентация хода позволяет говорить о том, что в момент заселения лубоедом дерево находилось в вертикальном положении (рис. 1).

Максимальное количество годичных колец в бревнах настила – 34, что не позволяет использовать их для абсолютной датировки.

Сваи различного диаметра (19,4–38,0 см) представляют собой остатки возможно более поздней

Таблица 1. **Краткая характеристика образцов древесины, отобранных раскопе № 1 Минского замчища**

Номер образца	Диаметр, см	Количество годичных колец
Конструкция – настил		
11n1	14,3	26
11n2	14,2	18
11n3	14,5	32
11n4	11,5	24
11n5	10,5 (~21,0)*	32
11n6	14,1	23
11n7	13,3	22
11n8	11,0	34
Конструкция – сваи		
11sv1	23,4	31
11sv2	27,3	33
11sv3	19,4	32
11sv4	16,0 (~38,0)*	87
11sv5	27,2	57
11sv6	20,9	31

* Первое число – сохранившаяся часть образца, второе число – экстраполированный исходный диаметр образца.

Таблица 2. **Краткая характеристика образцов древесины, отобранных в раскопе № 2 Минского замчища**

Номер образца	Конструкция	Диаметр, см	Количество годичных колец
1	Доска настила (поперечная)	18,6 (37,2)*	61
2	Доска настила (поперечная)	13,9 (?)*	59
3	Доска настила (поперечная)	7,2 (?)*	97
3x	Доска настила (поперечная)	5,8 (?)*	90
4	Доска настила (поперечная)	14,1 (28,2)*	64
5	Доска настила (поперечная)	25,7	52
6	Доска настила (поперечная)	6,2 (?)*	36
7	Доска настила (продольная опора)	19,0	72
8	Доска настила (продольная опора)	14,9	36
9	Доска настила (продольная)	15,1	48
11	Доска настила (продольная)	13,2 (26,4)*	77
13	Доска настила (продольная)	4,5 (30,0)*	22
14	Стена постройки	17,4	50
15	Доска настила (продольная)	13,6	38
16	Доска настила (продольная)	19,1	48
17	Столб	14,8	35
18	Доска настила (поперечная)	4,1 (49,0)*	25
19	Доска настила (продольная)	12,6 (?)*	57
20	Отдельная доска	20,3	45
21	Отдельная доска	5,5 (25,0)*	22
22	Отдельная доска	13,1	38
23	Стена постройки	25,4	63
23x	Стена постройки	21,6	48
24	Стена постройки	19,8	67
25	Доска настила (продольная)	9,2	27
26	Доска настила (продольная)	10,2 (41,0)*	45
27	Доска настила (продольная)	6,7 (?)*	26
31	Стена постройки	16,4	26
32	Настил	13,5	30
33	Настил	15,4	35
34	Настил	15,3	35
35	Стена постройки	17,8	46
36	Стена постройки	17,9	42
37	Доска настила (продольная)	6,8 (39,0)*	30
38	Доска настила (продольная)	9,9	50
1L	Доска настила (продольная)	4,8 (?)*	23
2L	Доска настила (продольная)	20,9	39
3L	Доска настила (продольная)	13,7 (27,4)*	37
4L	Доска настила (продольная)	32,5	53
5L	Доска настила (продольная)	29,8	66

* Первое число – сохранившаяся часть образца, второе число – экстраполированный исходный диаметр образца.

постройки. Однако, несмотря на больший диаметр, количество годичных колец на образцах осталось небольшим. Исключение составляют два образца с количеством годичных колец 87 и 57. Хорошо синхронизированы между собой образцы 11sv1, 11sv2, 11sv3 и 11sv6. Причем сваи 11sv1 и 11sv2 сделаны из одного древесного ствола, а сваи 11sv3 и 11sv6 – из другого. Не удалось достоверно синхронизировать эти образцы с наиболее длинными рядами, полученными со свай 11sv4 и 11sv5. Здесь возможны варианты заимствования древесины из более ранних построек, либо постройку возводили частями в разные периоды, либо использовали древесину деревьев, произрастающих в несхожих местообитаниях.

Раскоп № 2. Вся отобранная древесина относится к постройкам начала XIV – начала XV в. (по археологическим датировкам). 12 деревьев имели возраст более 50 лет (рис. 2), что позволило их увязать

Рис. 1. Ход малого соснового лубоеда. Образец № 11n5

в единую шкалу и добавить в нее более короткие ряды годичных колец. По результатам анализа была построена плавающая шкала продолжительностью 83 года, включающая 26 деревьев (рис. 3, 4). Оставшиеся 13 деревьев не удалось достоверно увязать со шкалой либо из-за малого количества годичных колец, либо за счет индивидуальных особенностей дерева или заимствования его из более ранних построек (например, образец № 38, имеющий 50 годичных колец).

К настоящему времени не удалось абсолютно датировать построенную шкалу из-за отсутствия для территории Беларуси достоверных дендрохронологических шкал для изучаемого периода. Дальнейшие исследования позволят заполнить этот пробел.

В пределах построенной шкалы появилась возможность относительной датировки деревянных сооружений раскопа № 2.

В рассматриваемом периоде наиболее старой оказалась большая постройка, занимающая несколько квадратов раскопа (образцы № 31, 35, 36). На всех образцах сохранились наружные годичные кольца, а образцы № 31 и 35 дают один год рубки. Образец № 36 дает более раннюю (на 3 года) дату рубки, что, возможно, связано с заимствованием дерева из других построек, либо с использованием в постройке сухостойного дерева.

Через 9 лет после большой постройки рядом с ней появился небольшой настил (образцы № 32–34). В шкале образцы объединены под № 32n поскольку оказалось, что настил сооружен из одного древесного ствола.

Через 27 лет после настила на месте разрушенной большой постройки появилась еще одна постройка схожего размера (образцы № 23, 23x, 24). Образцы № 23 и 24 дают одинаковый год рубки, а № 23x – на год раньше.

В промежутке между строительством этих двух построек был положен настил переулка рядом с большой постройкой. Весь материал, собранный с этого



Рис. 2. Расположение образцов древесины в дендрохронологической шкале. Раскоп № 2. Минское замчище. (Черным цветом выделены образцы, у которых сохранились наружные годичные кольца.)



Рис. 3. Распределение образцов древесины по количеству годичных колец. Раскоп № 2. Минское замчище

Рис. 4. Плавающая дендрохронологическая шкала. Раскоп № 2. Минское замчище

настила, расположен на разной глубине и не дает четких дат его сооружения. Вероятнее всего, на него шли доски, оставшиеся от разных сооружений, а настил периодически подновляли.

Наиболее поздние образцы древесины (№ 1, 3, 3х) представлены остатками толстых досок, на которых не сохранились наружные годичные кольца. Деревья, из которых они были сделаны, срублены не ранее чем через 8 лет (образец № 3х) и 14 лет (образец № 1) после сооружения поздней большой постройки.

Литература

1. A 7272-year tree-ring chronology for western Europe / J. R. Pilcher [et al.] // Nature. – 1984. – Vol. 312. – P. 150–152.

2. Cook, E. User's manual for computer program ARSTAN / E. Cook, R. Holmes // Tree ring chronologies of western North America : California, eastern Oregon and northern Great Basin / ed. by R. L. Holmes, R. K. Adams, H. C. Fritts. – Tucson, 1986. – P. 50–56.

3. Holmes, R. L. Computer-assisted quality control in tree-ring dating and measurement / R. L. Holmes // Tree-Ring Bull. – 1983. – № 44. – P. 69–75.

4. Holmes, R. L. Dendrochronology program library. Users manual / R. L. Holmes. – Tucson ; Arizona, 1984. – 51 p.

5. Huber, B. Über die Sicherheit jahrringchronologischer Datierung / B. Huber. – Holz als Roh und Werkstoff, 1943. – P. 263–268.

6. Methodes of Dendrochronology. Applications in the Environmental Sciences / ed. E. R. Cook, L. A. Kairiukstis. – Dordrecht ; Boston ; London : Kluwer Acad. Publ, 1990. – 394 p.

Рэзюмэ

М. В. Ермохін

Вынікі дэндрахраналагічнага даследавання матэрыялаў з тэрыторыі Мінскага замчышча (па раскопках 2009 г.)

Прыведзены вынікі дэндрахраналагічнага аналізу драўляных канструкцый на тэрыторыі Мінскага замчышча, ўскрытых пры раскопках 2009 г. Пабудавана плаваючая драўняна-кальцавая храналогія на працягу 83 гадоў, якая ўключае 26 узораў. Атрыманы адносныя даты высечкі дрэў, выкарыстаных у розных пабудовах.

Summary

M. V. Yermokhin

Results of dendrochronological investigations on the territory of the Minsk castle in 2009

The results of dendrochronological analysis of wooden structures uncovered during excavations in 2009 on the territory of Minsk castle is present in article. The floating tree-ring chronology 83 years long (26 samples) was built. Relative dates the samples from the various construction were obtained.

Поступила 12.09.2013 г.

УДК [903.4+572.71+572.781](476.2)

О. В. Иов, *Институт истории НАН Беларуси, отдел археологии средних веков и Нового времени, старший научный сотрудник, кандидат исторических наук (г. Минск, Беларусь);*
Н. Н. Помазанов, *Институт истории НАН Беларуси, отдел антропологии и экологии, научный сотрудник (г. Минск, Беларусь);*
В. А. Шипилло, *Институт истории НАН Беларуси, отдел антропологии и экологии, аспирант (г. Минск, Беларусь)*

Результаты археологических и антропологических исследований на городище Снядин в 2012 году

Летом 2012 г. под руководством О. В. Иова были продолжены работы на территории городища летописного Смедина (д. Снядин Голубицкого с/с) в Петриковском районе Гомельской области [1]. Работы проводили по Открытому листу № 2390 (форма № 1) и финансировали из средств Института истории НАН Беларуси по плановой теме «Малые города Белорусского Полесья XI–XIV вв.» и личных сбережений руководителя раскопок. В исследованиях принимал участие научный сотрудник отдела антропологии и экологии Института истории НАН Беларуси Н. Н. Помазанов.

В этом сезоне были заложены шурф № 7 (4 × 4 м) и раскоп № 6 площадью 48 м^2. Как и раскоп № 1 1996 г., они ориентированы на 50º. Шурф № 7 был прирезан к раскопу № 5 с западной стороны, а раскоп № 6 – с восточной.

Поверхность раскопа и шурфа ровная, задернована. В раскопе уровень высот с севера на юг повышается на 0,3 м. Максимальная разница высот составляет 0,38 м. Мощность культурного слоя в этой части поселения составляет 0,90–1,14 м. Под дерном толщиной до 0,2 м на всей площади раскопа залегает плотный слой темно-серого цвета мощностью до 0,4 м. Ниже плотного темно-серого слоя залегает рыхлый слой темно-серого цвета мощностью до 0,35 м. Под ним расположен плотный серо-коричневый слой погребенной почвы без находок. Последний подстилает материк – мелкозернистый желтый песок.

Как и в предыдущие годы, в исследованной части поселения в культурном слое полностью и частично расчищены 6 позднесредневековых погребений. На этом же уровне и выше на площади раскопа и шурфа выявлены остатки разрушенных могил – человеческие кости, фрагменты черепов, вещи погребенных. Контуры этих погребений в однородном черном слое не прослеживаются.

Материковых ям древнерусского времени не выявлено.

Погребение № 1. В кв. 3 шурфа № 7 расчищены нижние конечности скелета, верхняя половина которого была изучена в 1996 г. как погребение 18, яма 18. Они были обнаружены почти на материке, на глубине 1,05 м. Яма углублена в материк всего на 0,03 м. Ее длина с учетом раскопок 1996 г. составляет 1,68 м, ширина – 0,68 м. Рядом с костяком найдены 4 гвоздя.

Погребение № 2. В кв. 2 шурфа № 7 расчищен череп и грудная часть погребенного, нижняя часть которого вскрыта в кв. 1 раскопа 2011 г. (погребение № 6). Контуры ямы прослежены в верхней части погребенной почвы на глубине 0,82 м. Костяк ориентирован на 268º, в положении «лежа на спине», верхние конечности согнуты в локтях. Погребение безинвентарное. Найдено несколько гвоздей от гроба.

Погребение № 3. Расчищено почти в центре шурфа, в кв. 1–4 на глубине 0,87 м. Контуры ямы прослеживаются в верхней части погребенной почвы. Костяк ориентирован на 270°, в положении «лежа на спине», верхние конечности согнуты в локтях, кости левой кисти находились в области поясничного отдела позвоночника, кости правой кисти – в области грудного отдела. Погребение безинвентарное.

Погребение № 4. Расчищены кости правой голени в кв. 4 раскопа № 6 на глубине 0,76 м. Большая часть этого костяка была расчищена в кв. 6 раскопа № 5 2011 г. Контуры ямы прослежены в верхней части погребенной почвы. Костяк ориентирован на 269º в положении «лежа на спине», кости верхних конечностей согнуты в локтях, кости кистей находились в области поясничного отдела позвоночника. Череп повернут вправо. Погребение безинвентарное. Найдено 6 гвоздей от гроба.

Над костяком, возле костей нижних конечностей погребенного, на глубине 0,43 м найдена горизонтально лежащая надмогильная стела овальной формы размерами 0,80 × 0,35 × 0,25 м. Без каких-либо надписей и знаков.

Погребения № 5, 6. Два нарушенных погребения, расположенные одно чуть выше другого, найдены в кв. 1, 2 на глубине 0,71 м. Вскрыты частично, ориентация – на 232º. От одного костяка расчищены череп и грудная часть, кости правой верхней конеч-



Рис. 1. Индивидуальные находки из железа: *1, 7* – наконечники стрел; *2, 3* – ключи; *4* – дужка цилиндрического замка; *5, 6* – кресала; *8* – поясная пряжка; *9* – изделие из железа (фрагмент); *10* – язычок от пряжки; *11* – обувной ледоходный шип; *12* – звено грызла от удил; *13* – запирающее устройство. Раскоп 6. д. Снядин. Голубицкий сельсовет. Петриковский район. Гомельская область. 2012 г.

ности (согнутой в локте), часть костей таза и правая бедренная кость. Левая бедренная кость и кости голеней были извлечены при захоронении второго костяка, у которого расчищены только часть черепа и кости правой верхней конечности. Найдены несколько гвоздей от гробов.

Очевидно, данные захоронения датированы XVIII в., так как в соседнем раскопе 1996 г. в могиле был найден пятак Екатерины II.

Всего в 2012 г. на городище был найден 9531 фрагмент гончарных сосудов, 3 – лепных, 654 кости животных, 1 фрагмент стеклянной посуды, 37 необработанных кусочка розового сланца, 3 фрагмента изразцов, десятки гвоздей и деталей от гробов. В коллекцию отобраны 1646 фрагментов керамики, в том числе 255 венчиков гончарных сосудов и 1 фрагмент красноглиняной причерноморской амфоры, 20 костей животных, 27 кусков сланца, шлак, фрагмент крицы, 2 фрагмента изразцов, 2 венчика лепной керамики.

Из 255 отобранных в коллекцию венчиков один принадлежит зеленополивной с внутренней стороны тарелке (№ 521), один – миске (№ 1175), остальные – горшкам. Типология последних в целом остается аналогичной сосудам из раскопок 2011 г. [1].

Индивидуальных находок зафиксировано 114 экз. Некоторые из них найдены в разрушенных погребениях (3 перстня). Среди древнерусских предметов выделяются: стеклянные браслеты (29 экз.), бусы (2 экз.), вставка в перстень и пуговица; железные ножи (23 экз.), удила, обручи от ведер (4 экз.), пряжка, ледоходный обувной шип, наконечники стрел (3 экз.), ключи (2 экз.), кресала (2 экз.), шило и др. (рис. 1); каменные пряслица (4 экз.), крестик-«корсунчик» (рис. 2), точильные бруски, бусина (горный хрусталь); глиняная игрушка-свистулька, серебряные и медные монеты XVI–XVII вв., бубенчик, свинцовые рыболовные грузила и др.

Некоторые из этих изделий на территории Беларуси встречаются впервые. К ним относятся миниатюрный равноконечный крестик, изготовленный из камня бурого цвета с белыми вкраплениями. В сечении его перекладины имеют форму прямоугольника. Четыре конца имеют треугольную форму с ос-



Рис. 2. Индивидуальные находки из камня, кости и глины: *1, 2, 10* – точильные камни; *3* – крестик-«корсунчик»; *4* – наконечник стрелы; *5–9* – пряслица, *1–3, 5–8, 10* – камень; *4* – кость; *9* – глина. д. Снядин. Голубицкий сельсовет. Петриковский район. Гомельская область. 2012 г.

нованием в перекрестье. Вероятно, хозяин тельника очень дорожил им. После того, как просверленное отверстие в одном из концов было с внутренней стороны обломано, он просверлил еще одно – с противоположной стороны. Внешняя сторона крестика при этом оставалась не поврежденной.

Вторая редкая находка – стеклянная пуговица. Она имеет округлую головку в виде шара с приплюснутыми полюсами. Ушко овальное, из железной проволоки. Стекло головки полупрозрачное желтое. Диаметр головки – 0,67 см, ширина ушка – 0,55, общая длина находки – 1,3 см.

Таблица 1. **Возрастная характеристика мужских погребений XVIII в. с территории городища Снядин**

Погребение	Возраст, лет
№ 1	25–30
№ 2	20–30
№ 3	25–30
№ 4	50–60
№ 5	40–50
№ 6	50–60
№ 7 (разрушено)	50–60

Как уже отмечалось выше, в ходе археологических раскопок был получен костный материал, относящийся к погребениям XVIII в. при православной церкви на месте городища Снядин (Смедынь, Смедин) древнерусского периода.

Половая идентификация на основе краниологических данных [2] показала, что погребения принадлежали индивидам мужского пола. Данные по их возрастной характеристике на момент смерти приведены в табл. 1.

Костные останки из погребений № 1–3 относятся к индивидам молодого (Adultus) возраста, из погребения № 5 – принадлежат индивиду зрелого (Maturus I) возраста, из оставшихся погребений № 4, 6, 7 – индивидам зрелого (Maturus II) и старческого (Senilis) возраста.

В табл. 2 представлена морфологическая характеристика мозгового черепа, как числовая, так и номинальная.

Данная краниологическая серия в трех проекциях (фронтальной – вид спереди, латеральной – вид сбоку и вертикальной – вид сверху) характеризуется как брахи-, хаме-, тапейнокранная, т. е. короткоголовая низкая. Такая характеристика яв-

Таблица 2. **Статистические параметры мозгового отдела черепов XVIII вв. с территории городища Снядин**

Признак	Численность	Средняя арифметическая, мм	Категория размера
1. Продольный диаметр от глабеллы	7	175,6	Малый
8. Поперечный диаметр		140,6	Средний
17. Высотный диаметр (базион-брегма)	6	128,2	Малый
Указатели, ед.			
8:1. Черепной	7	80,5	Брахикрания (короткий)
17:1 Высотно-продольный	6	64,3	Хамекрания (низкий)
17:8 Высотно-поперечный		77,7	Тапейнокрания (низкий)

Таблица 3. **Статистические параметры лицевого отдела мужских черепов XVIII в. с территории городища Снядин**

Признак	Численность	Средняя арифметическая	Категория размера
Линейные размеры, мм			
48. Верхняя высота лица	3	64,0	Очень малый
45. Скуловая ширина (ширина лица)	2	129,0	Малый
51. Ширина орбиты (от *mf.* левая)	3	40,3	Малый
52. Высота орбиты	3	31,3	Малый
54. Ширина носа	3	23,3	Малый
55. Высота носа	3	49,3	Средний
DC Дакриальная ширина (49а)	3	21,3	Средний
DS Дакриальная высота	3	12,2	Очень большой
SC Симотическая ширина (57)	6	9,1	Средний
SS Симотическая высота	6	3,8	Большой
Угловые размеры, градусы			
72. Общий лицевой угол (угол профиля лица общий)	3	81,3	Средний
73. Угол средней части лица	3	86,0	Средний
74. Угол альвеолярной части	3	68,8	Средний
75(1). Угол выступания носа	3	22,3	Средний
77. Назомалярный угол	1	131	Очень малый
Зигомаксиллярный угол	1	115	Очень малый

Таблица 4. **Указатели лицевого отдела мужских черепов XVIII в. с территории городища Снядин**

Указатель	Численность	Среднее значение, ед.	Категория размера
48:45 Верхний лицевой	2	48,9	Малый
52:51 Орбитный (от *mf.* левая)	3	77,7	Малый
54:55 Носовой	3	47,4	Малый
DS:DC Дакриальный	3	57,3	Большой
SS:SC Симотический	6	42,4	Большой

ляется следствием сочетания малых значений продольного, высотного диаметров и среднего значения поперечного диаметра черепа на групповом уровне.

Средние групповые размеры лицевого отдела приведены в табл. 3.

Для снядинской краниологической серии XVIII в. (мужская выборка) характерны малые высотно-широтные параметры верхней части лица на уровне орбит. Значения носовых размеров (признаки № 55, 49а, 57 по Р. Мартину) находятся в среднем диапазоне. Значение общего лицевого угла указывает на мезогнатность. Среднее групповое значение ширины носа принадлежит диапазону малой категории размера. Значения дакриальной и симотической высот характеризуются категорией «очень большой» и «большой» соответственно.

В табл. 4 содержатся показатели формы лица, орбит и носа.

По средним групповым указателям лицевого скелета краниологическую серию можно охарактеризовать как широколицую (эуриен), среднеорбитную (мезоконхия), средненосую (мезориния) с высоким переносьем.

На основе регрессионных формул [3] нами реконструирована длина тела нескольких индивидов. В табл. 5 приведены индивидуальные значения длины тела по погребениям.

Полученные индивидуальные данные длины тела в мужской выборке указывают на наличие в ло-

Таблица 5. **Длина тела (рост) мужских индивидов из погребений XVIII в. с территории городища Снядин**

Погребение, возрастная характеристика индивида	Наибольшая длина кости, мм	Длина тела (по М. Троттер и Г. Глезер), см
№ 1, 25–30 лет	Бедренной – 416, большой берцовой – 316	155–161
№ 4, 50–60 лет	Бедренной – 474	171–177
№ 5, 40–50 лет	Плечевой – 330	168–176

Таблица 6. **Средние групповые указатели и углы черепов из Снядина XVIII в., других могильников Полесья и с остальной территории Беларуси XVIII–XIX вв.**

Признак	Снядин		Полесье*		Остальная территория**	
	Численность	Средняя	Численность	Средняя	Численность	Средняя
Черепной	7	80,5	47	81,5	90	81,8
Верхний лицевой	2	48,9	23	50,9	72	52,3
Орбитный	3	77,7	45	78,4	89	77,2
Носовой	3	47,4	41	49,4	85	51,6
Дакриальный	3	57,3	36	60,6	81	58,5
Симотический	6	42,4	43	52,2	82	49,1
Угол профиля лица общий	3	81,3	24	85,3	77	85,6
Угол средней части лица	3	86,0	24	86,2	76	86,4
Угол альвеолярной части лица	3	68,8	24	82,6	74	83,0
Угол выступания носа	3	22,3	18	28,8	68	27,7
Назомалярный угол	1	131	47	138,4	90	138,5
Зигомаксиллярный угол	1	115	33	127,3	76	127,0

*Сборная выборка д. Камень и Погост-Загородский Пинского района, д. Мокиши Хойникского района XVIII–XIX вв. [4, с. 54–56].

**Сборная выборка с территорий Витебской, Гродненской и Минской обл. XVIII–XIX вв. [4, с. 62–63], представляющих три историко-этнографических региона Беларуси: Поозерье, Понеманье и Центральный регион.

кальной популяции людей, к которой принадлежало и население Снядина XVIII в., достаточно высокорослых индивидов.

Табл. 6 содержит средние групповые параметры снядинской серии в сравнении со статистическими параметрами (средняя взвешенная) суммарных групп Полесья и остальной территории, за исключением Могилевской области (Поднепровье).

Мужская выборка черепов из Снядина XVIII в. характеризуется как грацильная брахикранная, низкоголовая, широколицая со средними орбитами и средней ширины носом (по абсолютным и относительным величинам) и высоким переносьем. Она довольно близка к сериям черепов с низкими орбитами и узким носом, что характерно для северных групп. Особенностью мужской серии является сочетание мезогнатности и ослабленного выступания носовых костей.

От западно- и восточнополесских мужских краниологических серий снядинская серия отличается тенденцией к меньшей брахикранности, к относительной широколицести и мезогнатности, а также более слабым выступанием носовых костей при общей грацильности черепов.

Численность краниологической серии в количестве семи единиц можно признать недостаточной. Ее пополнение в результате последующих археологических раскопок и краниологическое изучение серии большей численности даст основание для более обстоятельных выводов, касающихся антропологических особенностей выборки населения Снядина XVIII в., представляющей часть одной из локальных популяций историко-этнографического региона Восточное Полесье.

Литература

1. Иов, О. В. Раскопки древнерусских памятников в Припятском Полесье / О. В. Иов // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Вып. 24 : Даследаванне сярэдневяковых старажытнасцей Цэнтральнай Беларусі (памяці Ю. А. Заяца). – Мінск : Беларус. навука, 2013. – С. 349–354.

2. Алексеев, В. П. Краниометрия. Методика антропологических исследований / В. П. Алексеев, Г. Ф. Дебец. – М. : Наука, 1964. – 128 с.

3. Алексеев, В. П. Остеометрия. Методика антропологических исследований / В. П. Алексеев. – М. : Наука, 1966. – 251 с.

4. Саливон, И. И. Очерки по антропологии Белоруссии / И. И. Саливон, Л. И. Тегако, А. И. Микулич. – Минск : Наука и техника, 1976. – 262 с.

Рэзюмэ

А. В. Іоў, М. М. Памазанаў, У. А. Шыпіла

Вынікі археалагічных і антрапалагічных даследаванняў на тэрыторыі гарадзішча Снядзін у 2012 годзе

У выніку археалагічных раскопак былі знойдзены рэчы XII–XIII стст. і XVIII ст., а таксама сем мужчынскіх чарапоў, якія датаваны XVIII ст. Краніялагічная серыя характарызуецца грацыльнасцю, брахікраніяй, шырокатвараcцю, мезаконхіяй, мезарыніяй, высокім пераносcем і мезагнатнасцю.

Summary

O. W. Iov, N. N. Pomazanov, V. A. Shipillo

Anthropological and archaeological investigatigation on the territory Snyadin hill-fort in 2012

As a result of archaeological excavations have found things 12th –13th and 18th centuries, as well as seven male skulls dated to the 18th century. The kraniological series are characterised by gracility, brachycrania, broad face, medium orbits, medium nose, a high bridge of nose and medium protrusion nose.

Поступила 13.09.2013 г.

УДК 902/904(476.6)

Н. А. Кізюкевіч, *УК «Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей», аддзел археалогіі, загадчык (г. Гродна, Беларусь);*
Г. М. Семянчук, *Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я. Купалы, дацэнт (г. Гродна, Беларусь)*

Папярэднія вынікі даследавання тэрыторыі Новага замку ў Гродне

У чэрвені–ліпені 2010 г. на тэрыторыі Новага замка ў Гродне былі праведзены археалагічныя даследаванні.

Для правядзення даследаванняў Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі быў выдадзены Дазвол № 2131 ад 28 мая 2010 г. па Форме № 2 на імя загадчыка аддзела археалогіі УК ГДГАМ Н. А. Кізюкевіч. Акрамя таго, працы на гісторыка-культурнай каштоўнасці былі ўзгоднены з Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь: таксама быў выдадзены Дазвол № 11-01-08/274 ад 14 чэрвеня 2010 г. на права правядзення работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці .

Археалагічнае вывучэнне тэрыторыі Новага Замка было вельмі эпізадычным: у сваёй манаграфіі М. М. Варонін узгадвае, што ў 1926 г. пры земляных работах на тэрыторыі Новага замка на глыбіні 1,9 м былі знойдзены драўляныя пабудовы [2, с. 17]. Аднак характар гэтых прац не раскрываецца. Больш да пачатку Вялікай Айчыннай вайны працы тут не праводзілі. У савецкі час толькі ў канцы 1980-х гадоў Абласны камітэт КПБ даў дазвол на правядзенне раскопак.

У 1987–1988 гг. А Краўцэвічам у паўднёва-заходняй частцы ўзвышша было даследавана 40 м^2 [4, с. 264]. Культурны пласт тут дасягаў да 3,3 м. Амаль на самым мацерыку прасочваліся сляды пажару. Былі выяўлены фрагменты керамічнага посуду XII–XIII ст., вялікая колькасць прамавугольнай і фігурнай плінфы, чатыры фрагменты маёлікавых плітак падлогі, блокі плінфы на вапнавай рошчыне. Астатнія матэрыялы датаваны XV–XVIII ст. [4, с. 264].

Як лічыць А. К. Краўцэвіч, Гародня пачыналася з невялікага ўмацаванага паселішча эпохі сярэдневякоўя. На працягу XI–XII ст. тут сфарміравалася тыповая для ўсходнеславянскіх гарадоў планіровачная структура, менавіта трохчасткавая: дзядзінец (месца жыхарства князя, умацаваны адміністрацыйны цэнтр – Стары замак) – вакольны горад (умацаваны пасад – Новы замак) – неўмацаваныя пасады (сягалі да сучаснай Савецкай плошчы і вуліцы Падольнай) [5, с. 8].

На тэрыторыі Новага замка ў XII ст. размяшчаўся вакольны горад. З XIV ст. гэта месца вядома як Гродзенскі Ніжні замак, які быў ужо мураваны. З пабудоў гэтага часу вядома Васкрасенская царква, якая магла быць пабудавана яшчэ ў XII ст. Аднак дакладная яе лакалізацыя пакуль што невядома.

Гісторыя дадзенай тэрыторыі на падставе пісьмовых і графічных крыніц выглядае наступным чынам.

У часы панавання Казіміра (1440–1492 г.) на месцы Новага замка быў створаны так званы Каралеўскі двор, дзе галоўным будынкам з'яўляўся Каралеўскі дом. Як ён выглядаў у XVI ст., можна ўбачыць на гравюры 1568 г. Мацея Цюндта, якую ён стварыў на падставе малюнка Ганса Адэльгаузера 1567 г.

У 80-х гадах XVI ст. забудова змянілася, што адлюстравана на гравюры Т. Макоўскага 1600 г. Па інвентары 1633 года ў той час на каралеўскім двары, які называецца парканам, знаходзілася мураваная царква, вялікі аднапавярховы дом (у ім праводзілі сеймікі шляхты Гродзенскага павета і пасяджэнні суда каралеўскай адміністрацыі), дом начальніка варты, кухня, пякарня, памяшканні для вартавых і каралеўскай чэлядзі.

Звесткі аб Васкрасенскай царкве змешчаны ў грамаце Уладзіслава IV ад 1633 г., з якой вядома, што царква існавала ўжо ў часы праўлення Аляксандра (1495–1506 г.). Згодна з апісаннем Гродзенскага каменнага замка ад 1650 г. «Вышедши из каменного замка на паркан, от моста подавшись вправо церковь каменная, под ней подвал, к нему двери двойные» [3, с. 20]. Вядома, што ў 1613 г. царква згарэла і была пазней адбудавана на Мерніцкай вуліцы [1, с. 60].

На сейме 1726 г. было прынята рашэнне аб будаўніцтве ў Гродне новага каралеўскага палаца. Было выбрана месца – узвышша насупраць Старога замка, дзе ад пабудоў Каралеўскага двара XIV–XVII стст. амаль нічога не засталося. На планах пачатка XVIII ст. на гэтым месцы пазначаны тры будынкі, аднім з каторых быў драўляны палац Асалінскага, захавальніка каралеўскіх рэгалій і каштоўнасцей пры карале Аўгусце II Моцным.

Будаўніцтва новага палаца пачалі ў 1738 г. Аўтарам праекта быў архітэктар Карл Фрыдрых Пёпельман. Праект палаца прадугледжваў выкарыстанне старых пабудоў, што знаходзіліся на гэтым месцы. У 1742 г. палац быў гатовы да прыёму гасцей.

Галоўны будынак палаца быў двухпавярховы, вытрыманы ў выглядзе літары «П» са строга прамымі вугламі і ствараў парадны ўнутраны двор – курданёр, які замыкаўся дзвюма аднапавярховымі пабудовамі з высокімі чатырохсхільнымі дахамі. Паміж апошнімі пабудовамі была агароджа і брама. Палац меў сем уваходаў: два з вонкавага боку

і пяць ад курданёра. Галоўны ўваход знаходзіўся ў сярэдзіне цэнтральнага корпуса.

Побач з левым крылом і паралельна яму быў узведзены доўгі двухпавярховы будынак, які звычайна называлі Маршалкоўскай кухняй.

У 1753 г. побач з цэнтральным корпусам была пабудавана капліца.

У 1797 г. пасля ад'езду Станіслава Аўгуста палац быў перададзены ў распараджэнне расійскага ваеннага ведамства. Менавіта ў гэты час за ім трывала замацавалася назва Новы замак. У Новым замку зрабілі вайсковы шпіталь і ўсё XIX і пачатак XX ст. яго выкарыстоўвалі без змен.

Падчас Вялікай Айчыннай вайны ў 1944 г. палац быў моцна пашкоджаны. Яго адбудова цягнулася да 1952 г. З гэтага часу і да 1991 г. у Новым замку быў змешчаны Гродзенскі абласны камітэт КПБ.

У 1991 г. Новы замак быў перададзены пад установы культуры. Сёння правае крыло палаца займае Гродзенская абласная бібліятэка імя Я. Карскага, цэнтральны і левы корпус – Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей.

Пасля больш чым дваццацігадовага перапынку на тэрыторыі Новага замку ізноў распачаліся археалагічныя даследаванні, мэтай якіх з'яўлялася папярэдняе вывучэнне культурнага слоя на тэрыторыі Новага замка: яго глыбіня, характар, верагоднасць выяўлення пабудоў XII–XVIII ст., а таксама планіроўкі тэрыторыі Новага Замка. Для дасягнення вышэйадзначаных мэт была закладзена траншэя памерамі 2 × 6 м у цэнтральнай частцы ўзвышша, перпендыкулярна крылам замка насупраць цэнтральнага ўвахода. Такім чынам, даследаваная ў 2010 г. на тэрыторыі Новага Замка плошча склала 12 м^2.

На даследаванай тэрыторыі былі выяўлены некалькі аб'ектаў.

Першы аб'ект быў знойдзены амаль адразу пасля зняцця дзірвану: на глыбіні 20 см ад дзённай паверхні ў кв. 2 і 3 была выяўлена каменная брукоўка. Яна была вельмі шчыльная, выкладзеная з натуральнага неапрацавага каменя памерамі ад 10 × 10 см да 40 × 50 см. Прамежкі паміж вялікімі камянямі былі запоўнены камянямі больш дробнымі па сваіх памерах (4 × 4 см). Каменная брукоўка была пакладзена на спецыяльна падрыхтаваную «падушку».

Датаванне брукоўкі – канец XIX – пачатак XX ст.

Пад падсыпкай у кв. 3 і 2 знаходзіўся слой шэра-карычневай зямлі, перамяшанай з бітай цэглай і каменьчыкамі. У гэтым слоі былі знойдзены фрагменты кухоннага і сталовага посуду XVII–XVIII ст., фрагмент кафлі XVII–XVIII ст., фрагменты касцей жывёл. У кв. 1, дзе брукоўка адсутнічала, слой быў перамяшаны, а знаходкі розначасовыя – XVIII–XX стст.

У пл. 3, кв. 1 (ад 35 да 55 см) было выяўлена скапленне цэглы, кафлі. Памеры аб'екта складалі 76 × 164 см. Аб'ектам з'яўляліся рэшткі развалу печы, часткай якога засыпалі яму. Фактычна глыбіня аб'екта склала каля 10 см. Час узнікнення аб'екта – XX ст.

У кв. 1 пад слоем светла-шэрай зямлі знаходзіўся слой зямлі цёмна-шэрага колеру (ад 28–38 да 42–98 см) з кавалкамі бітай цэглы, кафлі XIX–XX ст., керамікі, касцей жывёл.

Такі ж самы слой – цёмна-шэрая зямля з дробнымі камянямі з кавалкамі бітай цэглы – пачынаўся і ў кв. 2 і 3 пад слоем шэра-карычневай зямлі (ад 50–60 да 58–72 см). У гэтых квадратах у слоі таксама былі знойдзены вырабы XX ст., акрамя таго былі выяўлены фрагменты кафлі, посуду XVII–XVIII ст., косці жывёл.

Пад слоем цёмна-шэрай зямлі ў кв. 2 і 3 знаходзіўся невялікі слой светла-шэрага колеру (ад 58–72 да 60–90 см).

Пад слоем светла-шэрага колеру ў кв. 2 і 3 знаходзіўся слой цёмна-шэрай зямлі, які ўтымліваў невялікую колькасць бітай цэглы і камянёў. Глыбіня слоя – ад 60–90 да 108–142 см.

У кв. 1 гэты слой (ад 30–60 да 116–142 см) знаходзіўся адразу пад слоем светла-шэрага колеру і ўключаў праслойку жоўтага пяску. У паўднёвай частцы кв. 1 пад слоем светла-шэрай зямлі пачынаўся добра выражаны перакоп (ад 50 да 180 см), які быў ўтвораны ў выніку закладкі трубы.

Пры зачыстцы слоя 6 (ад 95 да 115 см) высветлілася, што ў кв. 3 на адлегласці 1 м на паўднёвы ўсход пачынаўся слой будаўнічага друзу: вапна, кавалкі бітай цэглы, вялікая колькасць касцей жывёл. У паўночнай частцы квадрата слой меў іншы характар: цёмна-шэрая зямля з рэшткамі спарахнелага дрэва, невялікімі вугольчыкамі і камякамі гліны. Мяжа паміж слоем будаўнічага друзу і вышэйадзначанага слоя вельмі выразная – вугаль і попел. Паўночную частку квадрата было вырашана назваць аб'ектам 3.

У аб'екце 3 былі выяўлены фрагменты дошак, а таксама цэгла-пальчатка памерамі 25,7 × 8,5 × 12,5 см.

Пласт 7 (ад 115 да 135 см) – слой будаўнічага друзу, які ўтрымліваў выключна фрагменты плінфы, галаснікоў, цамянку. Слой утварыўся ў выніку разбурэння пабудовы XII ст. На даследаванай тэрыторыі не былі выяўлены блокі плінфы і падмуркі падобных пабудоў, таму можна меркаваць, што слой 7 утварыўся ў першай палове XVII ст. у выніку нівеліроўкі паверхні ўзвышша, пасля таго як у 1613 г. згарэла Васкрасенская царква.

Пад слоем будаўнічага друзу ў пласце 8 з'явіўся новы слой зямлі – чорны, моцна насычаны вуглём.

Яшчэ ў пластах 7 і 8 каля мяжы кв. 2 і 3 былі выяўлены камяні, якія не былі замацаваны паміж сабой, пад імі ў пл. 9 (ад 155 да 175 см) знаходзіўся ўжо трэці рад камянёў, якія былі пакладзены на гліну

і замацаваны паміж сабой таксама глінай. Падчас зачысткі выяўленых камянёў у пл. 9 была выяўлена частка пабудовы. Да яе належалі падмуркі пабудовы, выкладзеныя з камянёў. Падмуркі пачыналіся на мяжы кв. 2 і 3 і перпендыкулярна перасякалі траншэю. Шырыня падмуркаў складала 60 см, яны былі выкладзены з камянёў памерамі ад 40 × 30 да 10 × 8 см. Паміж сабой камяні былі звязаны спецыяльна падрыхтаванай глінай.

На адлегласці 60 см ад паўночна-ўсходняга профілю траншэі знаходзілася вялікая колькасць маленькіх камянёў, якія былі замацаваны паміж сабой глінай. Камяні неапрацаваны, моцна пакрыты сажай.

На адлегласці 1,2 м ад паўночна-ўсходняга вугла траншэі і каля падмуркаў была знойдзена «яма» – пляма памерамі 40 × 80 см, абмежаваная з двух бакоў камянямі, з усходняга боку – сцяной траншэі, з заходняга боку – праслойкай гліны таўшчынёй 8 см, якая знаходіцца паміж слаямі вугалю (верагодна, абпаленых драўляных дошак). Запаўненне гэтай плямы – вугаль і попел. Верагодна, дадзены аб'ект з'яўляўся падмуркам печы.

Паколькі ў кв. 2 і 3 была ўскрыта толькі частка пабудовы, далейшая яе распрацоўка была спынена.

Верагоднай датай закладання падмуркаў пабудовы можна лічыць канец XVI – першую чвэрць XVII ст.

На адлегласці 4–6 см ад падмуркаў на глыбіні каля 185 см ад дзённай паверхні быў выяўлены аб'ект памерамі 74–94 × 180 см, які уяўляў з сябе драўляныя дошкі, што ляжалі на шэрай зямлі перпендыкулярна траншэі ўздоўж падмуркаў. Захаваліся фрагменты ад васьмі дошак, астатнія ж ад часу спарахнелі і ператварыліся ў труху.

Паколькі ў рамках даследаванняў было немагчыма высветліць характар аб'екта і яго сувязь з ускрытай пабудовай, было вырашана закансерваваць вышэйузгаданыя аб'екты ў кв. 2 і 3 да наступных даследаванняў (аб'екты былі прысыпаны жоўтым пяском, а пасля засыпаны).

Фактычна да мацерыка (да 3,0–3,6 м) быў распрацаваны толькі кв. 1. Слой ў ім быў перамешаны, паколькі ў XX ст. на глыбіні 165 см была закладзена труба. Таксама сляды перакопаў прасочваліся да мацерыка. У кв. 1 былі выяўлены сляды геалагічнай свідравіны, а таксама яма, якая была зафіксавана і на профіле, і на мацерыку. Фрагменты гаршкоў, выяўленыя ў кв. 1 ў пл. 10–13, датаваны ад XI да XV ст., у пл. 14–15 – пераважна XI–XII ст.

У пл. 14 (ад 255 да 275 см) у паўночнай частцы кв. 1 былі выяўлены рэшткі згарэлага дрэва, а на адлегласці 12 см ад колышка – кавалак згарэлага бервяна. Гэтае бервяно было вырашана ўзяць для правядзення радыёвугляроднага аналізу (вызначэнне ўзросту пробы было зроблена ў лабараторыі Беларускага навукова-даследчага геолагаразведачнага інстытута: 1105 ± 100 г. т. н.).

На мацерыку былі зафіксаваны два аб'екты – ў паўднёвай частцы квадрата знаходзілася пляма памерамі 50 × 54 см. Запаўненне аб'екта – зямля шэрага колеру, знаходкі ў ёй поўнасцю адсутнічалі. Аб'ект быў створаны ў выніку перакопу.

На глыбіні каля 285 см (у пл. 15) у кв. 1 была выяўлена частка другога аб'екта – яма, запаўненне якой складалася з шэрй зямлі з вугольчыкамі, гліны і невялікіх каменьчыкаў. Памеры ўскрытага аб'екта складалі 128 × 86 см. Аб'ект уяўляў з сябе паглыбленую ў мацярык яму (глыбіня яе складала 63 см). Сценкі ямы па ўсім перыметры былі амаль вертыкальныя, дно плоскае. У запаўненні аб'екта канструкцыі з камянёў альбо дрэва не былі выяўлены. Знаходкі: фрагменты глінянага посуду XI–XII стст. і косці жывёл.

Мацярык на даследаванай тэрыторыі пачынаўся на глыбіні 3,04–3,06 м.

Пасля даследавання частка пабудовы і канструкцыя з дрэва былі закансерваваны, а ўся траншэя засыпана.

Праведзеныя ў 2010 г. даследаванні дазволілі ўдакладніць стратыграфію вакольнага горада ў цэнтральнай частцы, магутнасць культурнага слоя, а таксама выявілі наяўнасць рэшткаў архітэктурнага шкілета забудовы тэрыторыі Новага замка. Несумненна, што дадзеная частка ўзвышша з'яўляецца даволі перспектыўнай для далейшага археалагічнага вывучэння.

Літаратура

1. Акты издаваемые комиссиею, Высочайше учрежденною для разбора древних актов в Вильне.– Вильна : Типографии А. К. Киркора, 1965. – Том 1 : Акты Гродненскаго земскаго суда. – С. 60–62.

2. Воронин, Н. Н. Древнее Гродно (по материалам археологических раскопок 1932–1949 гг.) / Н. Н. Воронин // Материалы и исследования по археологии древнерусских городов.– М. : Изд-во Академии Наук СССР, 1954. – Т. III. – 240 с.

3. Квитницкая, Е. Д. Планировка Гродно в XVI–XVIII вв. / Е. Д. Квитницкая // Архитектурное наследство. – № 17. – М. : Стройиздат, 1964. – С. 11–38.

4. Краўцэвіч, А. К. Гродзенскі вакольны горад / А. К. Краўцэвіч // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2008. – Т. 1 : А–К. – С. 264.

5. Краўцэвіч, А. Фарміраванне гістарычнага цэнтру Гародні / А. Краўцэвіч // Гарадзенскі палімпсест. XII–XX стст. : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Гародня, 7 ліст. 2008 г. / пад рэд. А. Ф.Смаленчука, Н. У. Сліж. – Гародня ; Беласток, 2008. – С. 8–16.

Резюме

Н. А. Кизюкевич, Г. Н. Семенчук

Предвательные итоги исследования территории Нового замка в Гродно

В июне–июле 2010 г. на территории Нового замка в Гродно были проведены археологические исследования. Как считает автор исследований этого места в 1987–1988 гг. А. К. Кравцевич, город начинался с небольшого укрепленного поселения эпохи средневековья, на протяжении XI–XII вв. тут сформировалась типичная для восточнославянских городов планировочная структура: детинец (Замковая гора) – окольный город (Новый замок) – неукрепленные посады (доходили до современной Советской площади и улицы Подольной). С XIV в. территория Нового замка известна как Гродненский Нижний замок.

На исследованной территории были выявлены несколько объектов: фрагмент каменной мощеной дорожки конца XIX – начала XX в.; развал печи, которым засыпали яму в XX в.; на глубине 115–135 см от современной дневной поверхности находился слой, состоящий из битой плинфы, фрагментов голосников, цемянки (строительного материала XII в.), который датирован первой половиной XVII в. и был образован в результате нивелировки поверхности, после того как в 1613 г. сгорела Воскресенская церковь. На глубине 155–175 см была обнаружена постройка с остатками печи конца XVI – первой четверти XVII ст. На самом материке (глубина 3,04–3,06 м) была обнаружена яма глубиной 63 см с почти вертикальными стенками, в заполнении которой были обнаружены фрагменты керамики XI–XII вв.

Summary

N. A. Kizjukevich, G. N. Semenchuk

The previous results of research on the territory of the New Castle in Grodno

The archeological researches were carried out on the territory of the New Castle in Grodno in June–July, 2010. According to A. K. Kravtsevich who conducted investigations in 1987–1988 the place started as small settlement of the Middle Ages, during the 11th–12th centuries the typical structure of the eastern Slavonic settlements was developed. The territory of the New Castle is known as the Nizhni Castle of Grodno since the 14th century.

Some fragments of pottery of the 11th–12th centuries, stove of late 16th – early 17th century, layer of broken bricks and lime of the first half of the 17th century, the part of stone path which dated back to late19th – early 20th century; fragments of stove in the pit of the 20th century were fond out in the excavation area.

Паступіў 17.09.2013 г.

УДК 903.5(476.5)«09»

А. В. Костюкевич, *Институт истории НАН Беларуси, отдел сохранения и использования археологического наследия, аспирант, магистр исторических наук (г. Минск, Беларусь)*

Фрагмент скандинавского псалия из Полоцка (новое поступление Витебского областного краеведческого музея)

В 2013 г. в Витебский областной краеведческий музей художником и краеведом А. И. Мемусом была передана случайная находка (ВОКМ, КП 26282/404) – фрагмент богато декорированного псалия, найденного на берегу р. Западной Двины в Заполотье в г. Полоцке. Данное изделие выполнено из бронзового сплава в стиле «Борре» и представляет собой причудливо изогнувшегося дракона (коня ?), прикрепленного к дуге обломанного кольца (рис. 1). Для территории Беларуси данная находка является уникальной. В публикациях отечественных исследователей аналогий ей не имеется.

На территории России находок псалиев или их фрагментов данного типа также сравнительно немного – всего восемь. Два подобных псалия происходят из известного Супрутского клада, найденного в Тульской области в 1969 г. в ходе раскопок под руководством С. А. Изюмовой [2, с. 50]. Они входят в состав удил и являются единственной на территории Руси находкой такого рода, полностью сохранившейся с грызлом и псалиями. Изделие, псалии которого изготовлены из медного сплава, датировано X в. А. Н. Кирпичников рассматривает эти удила как скандинавские [1, с. 17]. (Второй полностью сохранившийся экземпляр удил происходит из захоронения в Борре). Псалии из Супрутского клада богато позолочены, и мы можем предположить, что полоцкая находка, судя по ее внешнему виду, тоже когда-то была покрыта позолотой. Супрусткий клад был подробно рассмотрен В. В. Мурашевой в одноименной монографии [3]. Еще один поврежденный псалий сходного типа происходит из Вологодской области (район Белоозера) и так же, как и полоцкий, является случайной находкой. Известны также два фрагментированных псалия из Гнездова, найденные В. И. Сизовым в дореволюционный период. В 1970 г. в Гнездово в ходе раскопок Д. А. Авдусиным был найден еще один фрагмент псалия в стиле борре. Два подобных изделия (также фрагментированные) происходят из Тимерево Ярославской области и с Рюрикова городища Новгородской области. Они тоже являются случайными находками.

а

б

Рис. 1. Скандинавский псалий (фрагмент; КП 26282/404, ВОКМ): *а* – фото, *б* – прорисовка. X в. Художник Т. Зинченко

Таким образом, получается, что подобные изделия сосредоточены в северных регионах Древней Руси. Судя по всему, такие удила были достаточно дорогостоящими и принадлежали представителям элитарной дружинной культуры. Следует отметить, что эти находки, обнаруженные на территории Древней Руси, происходят не из погребальных комплексов, так как такие предметы, вероятнее всего, были слишком дорогостоящими и редкими для данной территории, чтобы быть положенными в могилу, хотя на территории Скандинавии они встречаются и в захоронениях. Три из восьми данных изделий принадлежат к категории случайных находок, а два были обнаружены в составе клада.

Аналогия полоцкому псалию происходит с острова Готланд (Швеция) (рис. 2) [4, с. 110–111]. Как на полоцкой, так и на готландской находках туловище дракона украшено простой плетенкой, тогда как узор на супрутском псалии более сложный. Благодаря аналогиям, мы можем восстановить полный облик псалия, найденного в Полоцке. Он состоял из кольца, судя по всему, разделенного трехлопастным элементом, и двух декорированных плетеным орнаментом фигур драконов, симметрично расположенных на дуге кольца. На территории Скандинавии подобные удила были распространены в IX–X вв. [4, с. 108]. К сожалению, находка из Полоцка не может

Рис. 2. Скандинавский псалий. о. Готланд. Швеция. X в. [4]

быть привязана к археологическому комплексу или слою, и мы уже никогда не сможем ответить, каким путем она попала на наши земли: как личная вещь, подарок или трофей, – но с большой долей вероятности можно предположить, что она оказалась на территории Беларуси не позднее X в., т. е. во время наиболее оживленных контактов со Скандинавией.

Учитывая тот факт, что в Полоцке встречаются находки скандинавского происхождения, датированные X в., можно предположить, что рассмотренный нами псалий принадлежал кому-то из скандинавских дружинников, находившихся в то время в Полоцке, что подтверждает наличие культурно-экономических связей Северной Европы и Полоцкой земли в X в.

Литература

1. Кирпичников, А. Н. Снаряжение всадника и верхового коня на Руси 9–13 вв. / А. Н. Кирпичников. – Л., 1973. – (САИ; Вып. Е1–36.)

2. Меч и златник. К 1150-летию зарождения Древнерусского государства : каталог выставки. – М. : Кучково поле. – 2012. – 320 с. : ил.

3. Мурашева, В. В. Супрутский клад из раскопок 1969 г. / В. В. Мурашева. – М., 2008. – 48 с.

4. Новиков, В. В. Об одном типе скандинавских оголовий X века с территории Древней Руси и Скандинавии / В. В. Новиков // Археологические Вести. – 2012. – № 12. – С. 108–123.

Рэзюмэ

А. У. Касцюкевіч

Фрагмент скандынаўскага псалія з Полацка (новае паступленне Віцебскага абласнога краязнаўчага музея)

Разгледжана выпадковая знаходка скандынаўскага псалія, які паходзіць з тэрыторыі г. Полацка. Псалій разглядваецца у параўнанні з іншымі падобнымі вырабамі, знойдзенымі на тэрыторыі старажытнай Русі. Вызначана аналогія полацкаму псалію з о. Готланд (Швецыя). Магчыма, што полацкая знаходка таксама мае скандынаўскае паходжанне. Яна, як і яе аналаг, датавана X ст. Гэта з'яўляецца пацвярджэннем таго, што паміж Полацкай зямлёй і Паўночнай Еўропай ў X ст. існавалі культурна-эканамічныя сувязі.

Summary

A. V. Kostukevich

The fragment of the Scandinavian cheeckpeece from Polotsk (new receipt of the Vitebsk regional museum)

In this paper a casual find of the fragment of Scandinavian cheekpiece on territory of Polotsk is considered. Eight finds of the similar cheeckpieses of Borre style from Old Russian territory are taken in consideration also. The Sweden analogy of the Polotsk find is found and regarded. The Polotsk cheeckpiese has Scandinavian, perhaps, Sweden origin and dated to 10th century. It proves that economical and cultural relations had excited between Scandinavian region and Polotsk Land during medieval period.

Поступила 25.10.2013 г.

УДК 902/904(476)«2012»

В. Л. Лакіза, *Інстытут гісторыі НАН Беларусі, намеснік дырэктара па навуковай рабоце, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (г. Мінск, Беларусь)*

Вынікі археалагічных даследаванняў першабытных помнікаў Беларускага Панямоння ў 2012 годзе

У 2012 г. на тэрыторыі Гродзенскага і Слонімскага раёнаў Гродзенскай вобласці (Беларускае Панямонне) былі праведзены археалагічныя даследаванні, накіраваныя на пошук і вывучэнне першабытных паселішчаў, а таксама на інвентарызацыю помнікаў археалогіі, уключаных у «Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь»[1].

Гродзенскі раён[2]. Верагодная зона будаўніцтва Нямноўскай ГЭС. Адной з галоўных задач палявых даследаванняў на тэрыторыі Гродзенскага раёна ў ліпені 2012 г. (мал. 1) стала абследаванне зоны верагоднага будаўніцтва яшчэ адной ГЭС на р. Нёман (у адпаведнасці з першапачатковым праектам, прадстаўленым у РУП «Гроднаэнерга»). Першыя разведкі на асобных участках амаль дваццацікіламетровага адрэзка Нёмана ад в. Плебанскія, дзе па праекце будзе размешчана плаціна Нямноўскай гідраэлектрастанцыі, да самага Гродна (в. Пышкі), якія праводзіліся пад кіраўніцтвам аўтара ў мінулым годзе, далі падставу для выпрацоўкі методыкі сёлетніх даследаванняў [5, с. 296]. Акрамя суцэльнага візуальнага абследавання і пошукаў пад'ёмнага матэрыялу яны дапаўняліся мэтанакіраванай шурфоўкай залесенай і моцна задзірванелай тэрыторыі.

Асаблівая ўвага была звернута на левабярэжную ніжнюю моцна задзірванелую тэрасу (шырыня – 90–100 м, даўжыня – 900–1000 м) Нёмана каля в. Плебанскія, на якой у розных месцах былі закладзены сем пошукавых шурфоў: шурф № 1 – 4 м^2 (2 × 2), шурф № 2 – 3 м^2 (1 × 3), шурф № 3 – 4 м^2 (1 × 4), шурф № 4 – 3 м^2 (1 × 3), шурф № 5 – 3 м^2 (1 × 3), шурф № 6 – 3 м^2 (1 × 3), шурф № 7 – 2 м^2 (1 × 2) (мал. 2). Аднак і шурфоўка, пакуль што не дала дакладнага адказу на пытанне аб наяўнасці тут археалагічных помнікаў. Несумненна, што на гэтым узроўні тэрасы вялі актыўную гаспадарчую дзейнасць. Наяўнасць у шурфах галькі, гравію, пяску з ракушкамі, вялікай колькасці неапрацаванага і моцна абкатанага крэменю, канкрэ-



Мал. 1. Карта Беларускага Панямоння ад г. Гродна да в. Пальніца Гродзенскага раёна з лакалізацыяй помнікаў, даследаваных у 2012 г. (тэрыторыя верагоднага будаўніцтва Нямноўскай ГЭС)

[1] Археалагічныя даследаванні былі праведзены ў адпаведнасці з заданнем 1.1.01 «Археалагічныя помнікі першабытнай і сярэднявечнай эпох на тэрыторыі Беларусі: этнагенэз, дзяржаўнасць, матэрыяльная і духоўная культура» (кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар В. М. Ляўко, намеснік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт В. Л. Лакіза) падпраграмы № 1 «Гісторыя, духоўная і матэрыяльная культура беларускага народа» (кіраўнікі – доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Каваленя, кандыдат гістарычных навук, дацэнт В. В. Даніловіч) ДПНД на 2011–2015 гг. «Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава».

[2] У ліпені 2012 г. ў даследаваннях на тэрыторыі Гродзенскага раёна прымалі ўдзел студэнты БрДУ імя А. С. Пушкіна, ГрДУ імя Я. Купалы, аспіранты Інстытута гісторыі НАН Беларусі А. Вашанаў і С. Ліневіч.

цый сведчыць аб значных земляных работах на тэрасах і аб моцных павадках, якія маглі затапліваць нават яе сярэдні ўзровень (месца закладкі шурфа № 2 у лесапаласе) (мал. 2). Яскравым прыкладам своеасаблівай стратыграфіі з вялікай колькасцю розных па колеры і складзе прапласткаў, якія чаргуюцца, з'яўляецца шурф № 5 (мал. 3). З усіх шурфоў, толькі ў ім быў знойдзены фрагмент моцна абкатанага венчыка з мінеральнымі дамешкамі ў цесце (ганчарнай керамікі ?) [6]. Разам з тым ваколіцы в. Плебанскія нельга выключаць з планаў далейшых даследаванняў. Візуальны агляд мясцовасці паказвае перспектыўнасць пошукавай працы на сярэдняй і верхняй тэрасах на паўночнай ускраіне вёскі і на поўнач ад шурфа № 5 на ніжняй тэрасе.

Яшчэ чатыры шурфы былі закладзены на высокай правабярэжнай тэрасе Нёмана паміж в. Гожа і в. Пальніца, непадалёк ад дачнага пасёлка (насупраць в. Плебанскія): шурф № 8 – 3 м^2 (1 × 3), шурф № 9 – 3 м^2 (1 × 3), шурф № 10 – 3 м^2 (1 × 3), шурф № 11 – 3 м^2 (1 × 3) (мал. 2). Адзначым, што ў гэтым месцы будучага будаўніцтва ГЭС на пясчаных дарогах сустракаецца вялікая колькасць натуральнага расшчапанага крэменю, розных па памерах канкрэцый (паходжанне застаецца пакуль што загадкавым). Цікава, але ў даследаваных шурфах археалагічныя знаходкі не трапілі [6]. Між тым і на дадзеным ўчастку патрэбна працягваць пошукавыя работы, асабліва пасля пачатка непасрэднага будаўніцтва плаціны ГЭС.

Дадаткова шурфоўкай былі вывучаны вядомыя помнікі каля в. Баля Сольная, Гожа, Астравок.

Стаянка Баля Сольная-1 размешчана на левабярэжнай тэрасе р. Нёман, на паўночна-ўсходняй ускраіне вёскі, праз 0,30–0,35 км на паўднёвы захад ад вусця рэчкі Зарэчанка (назва на карце Зарэчан ?, мясцовая жанчына называла проста Рэчка ?). Займае частку кліна чатырохмятровай тэрасы Нёмана, забудаванай жылымі і гаспадарчымі пабудовамі вёскі і занятай вясковымі агародамі. Культурны пласт – да 0,4 м. На момант абследавання часткова задзірванелы, часткова разворваецца. Дакладныя памеры не ўстаноўлены. Прыкладныя памеры – каля 1,0 га (да 200 м на 50 м – па лініі паўночны ўсход–паўднёвы ўсход, паўночны захад–паўднёвы ўсход).

Помнік выявіў і абследаваў у 1975 г. М. М. Чарняўскі. Былі знойдзены крамянёвыя адшчэпы і аднапляцовачны нуклеус, што дало падставу датаваць стаянку каменным і бронзавым вякамі [11]. У 2011 г. помнік абследаваў аўтар дадзенага артыкула, аднак з-за задзірванеласці дзённай паверхні новай калекцыі артэфактаў атрымаць не ўдалося [5].

У 2012 г. была праведзена шурфоўка на плошчы 3 м^2. Шурф № 1 памерамі 1 × 3 м быў закладзены на схіле тэрасы, побач з агароджай вясковай



Мал. 2. Спадарожнікавы здымак басейна р. Нёман каля в. Плебанскія Гродзенскага раёна (месца верагоднага будаўніцтва Нямноўскай ГЭС) з планам размяшчэння шурфоў 2012 г.

хаты, непадалёк ад студні [6]. Ён быў даследаваны на глыбіню да 0,7 м. Выразны культурны пласт не зафіксаваны, выяўлены толькі адзін крамянёвы артэфакт – масіўны адшчэп.

Важна улічваць, што пры пад'ёме вады пасля будаўніцтва Нямноўскай ГЭС з'явіцца пагроза паступовага разбурэння стаянкі цячэннем ракі.

Стаянка Баля Сольная-2 размешчана на высокай левабярэжнай тэрасе р. Нёман на паўночнай ускраіне вёскі праз 0,3 км на захад ад вусця р. Зарэчанка, праз 0,3 км на поўнач ад стаянкі Баля Сольная-1. Займае частку кліна дзевяцімятровай тэрасы, утворанай левым берагам р. Нёман і правым берагам р. Зарэчанка. На плошчы стаянкі, якая зарастае кустамі і дрэвамі, устаноўлена металічная апора для высакавольтнай лініі электраперадач. На схіле тэрасы – гаспадарчыя пабудовы вёскі і агароды. Клін

Мал. 3. Выгляд шурфа № 5 каля в. Плебанскія Гродзенскага раёна, у якім быў выяўлены фрагмент венчыка

верхняй тэрасы мае шырыню да 50 м і даўжыню да 150 м. Уся плошча стаянкі з верхняй і ніжняй часткамі можа дасягаць 1,8 га (каля 120 м на 150 м – па лініі поўнач–поўдзень, захад–усход).

Помнік выявіў і абследаваў у 1975 г. М. М. Чарняўскі. Былі знойдзены разнастайныя крамянёвыя вырабы, у тым ліку адшчэпы, сколы, пласціны, нуклеусы, разцы, скрабло, скрабкі, праколкі, наканечнік дроціка, сякера і прылады для сячэння, што належаць да фінальнага палеаліту і мезаліту (9–6-е тысячагоддзі да н. э.) [3, с. 150; 11]. Культурны пласт – ад 0,3 м да 0,4 м. Археалагічныя раскопкі на стаянцы не праводзілі. У 2011 г. помнік абследаваў В. Л. Лакіза. З прычыны задзірванеласці яго дзённай паверхні на верхняй тэрасе пад'ёмны матэрыял не збіралі, на схіле і на ніжняй частцы стаянкі (на агародах) была выяўлена калекцыя крамянёвых вырабаў каменнага веку [5].

У 2012 г. на верхняй пляцоўцы помніка быў закладзены шурф № 1 – 3 м^2 (1 × 3) [6]. У ім зафіксаваны культурны пласт шэрага, жаўтавата-шэрага колеру магутнасцю да 0,55 м, інтэнсіўна насычаны шматлікімі крамянёвымі вырабамі фінальнапалеалітычнага часу: нуклеусамі, прадуктамі першаснага расшчаплення, адшчэпамі, пласцінамі, абломкамі, прыладамі працы (мал. 4). Папярэдні аналіз матэрыялаў дае падставу казаць аб выяўленні на помніку крэмнеапрацоўчай майстэрні.

Стаянка і селішча Баля Сольная-3 была выяўлена ў 2012 г. у выніку абследавання ваколіц вёскі і шурфоўкі мясцовасці. Яна размешчана на той жа левабярэжнай тэрасе р. Нёман, што і стаянка Баля Сольная-1, праз 0,25 км на паўночны ўсход ад яе (уніз па цячэнні ракі за ЛЭП), праз 0,15–0,18 км амаль на ўсход ад скрыжавання цэнтральных вуліц вёскі, на своеасаблівым мысападобным



Мал. 4. Крамянёвы інвентар (*1–7*). Фінальнапалеалітычная стаянка Баля Сольная-2. Гродзенскі раён

двухузроўневым выступе тэрас (паміж імі ямы, у якіх вяскоўцы бралі пясок), утвораным р. Зарэчанка і р. Нёман [6].

На розных узроўнях былі закладзены два шурфы. У шурфе № 1 памерамі 1 × 3 м (3 м^2), на верхнім узроўні тэрасы, засаджанай дрэвамі, пад дзёрнам быў зафіксаваны выразны культурны пласт магутнасцю да 0,6 м, складзены з шэра-жоўтага пяску, затым пахаванага пласта цёмна-шэрага колеру таўшчынёй да 0,15 м, пасля якога пачынаўся жаўтаваты пясок з крамянёвымі знаходкамі. Сярод выяўленых у шурфе матэрыялаў маюцца шматлікія крамянёвыя артэфакты (прадукты першаснага расшчаплення, прылады працы), фрагменты ляпной і ганчарнай керамікі [6].

У шурфе № 2 памерамі 1 × 3 м (3 м^2), на ніжнім узроўні, адразу пад дзёрнам пачынаўся пласт буйназярністага жаўтавата-шэрага пяску з вялікай колькасцю камянёў розных памераў, якія з глыбіні 0,3 м ад дзённай паверхні ўтваралі практычна суцэльны пласт. Нягледзячы на гэта была выяўлена прадстаўнічая калекцыя крамянёвых вырабаў, сярод якіх нуклеус, нажы, пракрутка, канцавы скрабок на пласціне, вастрыё, трапецыя. Верагодна, верхняя частка культурных напластаванняў у дадзеным месцы помніка была знішчана падчас гаспадарчай дзейнасці жыхароў вёскі (?).

Шматкультурны помнік Баля Сольная-3 з'яўляецца перспектыўным для далейшых археалагічных даследаванняў. Неабходна улічваць, што яго месцаразмяшчэнне ў вусці р. Зарэчанка, якое па праекце будзе добраўпарадкавацца і затапляцца пры пад'ёме вады пасля будаўніцтва Нямноўскай ГЭС, патрабуе абавязковага ажыццяўлення мер па яго ахове (археалагічнага вывучэння).

Стаянка і селішча Гожа-1 размешчана на высокай правабярэжнай тэрасе р. Нёман, за паўднёвай прырэчнай ускраінай в. Гожа, праз 0,2–0,4 км на паўночны захад ад вусця р. Гажанка. Займае пляцоўку высокай тэрасы р. Нёман і ніжэйшай правабярэжнай тэрасы р. Гажанка, краямі якіх помнік і абмежаваны. Забудавана вясковымі хатамі і гаспадарчымі пабудовамі, разворваецца пад вясковыя агароды. Па прырэчным краі праходзіць дарога. У паўднёва-ўсходняй частцы помніка на вялікай плошчы пабудавана новая хата з прысядзібнымі гаспадарчымі пабудовамі і агароджай. Прынёманская частка помніка задзірванела. Культурны пласт – звыш 0,6 м, месцамі пашкоджаны ці разворваецца, павольна падмываецца р. Нёман. У агаленнях культурнага пласта сустракаюцца археалагічныя артэфакты. Дакладныя памеры не ўстаноўлены. Прыкладныя памеры – да 6,0–7,0 га (каля 300 м уздоўж р. Гажанка і да 250 м – уздоўж цячэння р. Нёман, па лініі паўночны ўсход–паўднёвы захад, паўночны захад–паўднёвы ўсход).

Помнік вядомы з канца XIX ст. У 1958 г. яго абследавала Ф. Д. Гурэвіч, у 1973–1975 гг. – Я. Г. Звяруга, у 1976 г. – М. М. Чарняўскі, у 2011–2012 гг. – В. Л. Лакіза. На паверхні былі знойдзены крамянёвыя вырабы, у тым ліку фінальнапалеалітычны крамянёвы нуклеус, ганчарная кераміка [2, с. 184; 3, с. 153; 5; 12]. Археалагічныя раскопкі не праводзілі. Датавана стаянка (і селішча) Гожа-1 каменным векам (фінальным палеалітам ці 10–8-м тысячагоддзямі да н. э.) і сярэдневякоўем (XI–XIV стст.).

У 2012 г. на помніку паміж дарогай і краем тэрасы быў закладзены шурф № 1 – 6 м^2 (2 × 3). У ім зафіксаваны характэрны для помніка культурны пласт магутнасцю да 0,5–0,6 м цёмна-шэрага і жаўтавата-шэрага колеру, які неаднаразова парушаўся ў выніку інтэнсіўнай гаспадарчай дзейнасці. Выяўленыя ў шурфе артэфакты, крамянёвыя вырабы і дробныя фрагменты керамікі падцвярджаюць яго ранейшае датаванне [6].

Стаянка і селішча Гожа-2 размешчана на высокай правабярэжнай тэрасе р. Нёман, праз 0,5 км на паўднёвы ўсход ад паўднёвай ўскраіны вёскі, праз 0,25 км на поўдзень ад вусця р. Гажанка, праз 0,3 км на паўднёвы захад ад аўтазаправачнай станцыі на дарозе Гожа–Гродна. Займае практычна роўную пляцоўку высокай тэрасы р. Нёман, якая засаджана лесам і ў пераважнай большасці задзірванела. Заходні край помніка падмываецца р. Нёман. У паўночнай частцы помніка арганізавана месца для адпачынку мясцовых жыхароў. Культурны пласт – да 0,4 м, месцамі пашкоджаны супрацьпажарнымі барознамі. Дакладныя памеры не ўстаноўлены. Прыкладныя памеры – да 1,0 га (каля 200 м уздоўж цячэння р. Нёман пры шырыні да 40–50 м, па лініі поўнач–поўдзень, захад–усход).

Помнік стаў вядомы з канца XIX ст. пасля абследаванняў З. Глогера. У пачатку XX ст. яго абследаваў Ю. Ядкоўскі, у 1976 г. М. М. Чарняўскі, у 1996 г. В. Л. Лакіза і В. С. Абухоўскі, у 2011 г. В. Л. Лакіза. На пясчаных агаленнях на паверхні помніка былі знойдзены крамянёвыя вырабы (лістападобныя наканечнікі стрэл, скрабкі на пласцінах, разцы, прылады для сячэння, двухпляцовачныя прызматычныя нуклеусы). Археалагічныя раскопкі не праводзілі. Папярэдне стаянка Гожа-2 была датавана каменным векам (фінальным палеалітам і раннім мезалітам ці 10–7-м тысячагоддзямі да н. э.) [3, с. 153; 5; 12].

У 2012 г. на помніку паміж дрэў былі закладзены тры шурфы: шурф № 1 – 3 м^2 (1 × 3), шурф № 2 – 2 м^2 (1 × 2), шурф № 3 – 3 м^2 (1 × 3), а таксама праведзена зачыстка двух участкаў абрыву стромкай тэрасы: № 1 (1 м^2), № 2 (1 м^2). У розных месцах помніка, у шурфах і зачыстках, зафіксаваны культурны пласт магутнасцю ад 0,6 м да 1,1 м цёмна-шэрага і жаўтавата-шэрага колеру, даволі слаба насычанага артэфактамі (крамянёвыя вырабы

Мал. 5. Асаблівасці стратыграфіі шматкультурнага помніка Гожа-2 Гродзенскага раёна з выразным перакрытым культурным пластом

і фрагменты ганчарнай керамікі). Менавіта кераміка дазваляе казаць, што тэрыторыю стаянкі каменнага веку на высокай тэрасе р. Нёман засялялі і ў сярэдневякоўі [6]. Самае галоўнае, што на помніку зафіксаваны выразны пахаваны культурны пласт, які асабліва добра прасочваўся у шурфе № 3 і зачыстках. Ён пачынаецца з глыбіні каля 0,7 м ад сучаснай дзённай паверхні і мае таўшчыню да 0,30–0,35 м (мал. 5). Падаецца таксама, што значная прырэчная частка помніка разбурылася пад ўздзеяннем цячэння ракі (?).

Акрамя таго, у 2012 г. на ніжэйшым узроўні правабярэжнай тэрасы р. Нёман (і левабярэжнай тэрасы р. Гажанка) на практычна роўнай прыбярэжнай пляцоўцы паміж вусцем Гажанкі і помнікам Гожа-2 і паміж запраўкай «Лукойл» і Нёманам былі закладзены тры разведачныя шурфы: шурф № 1 – 2 м^2 (1 × 2), шурф № 2 – 2 м^2 (1 × 2), шурф № 3 – 2 м^2 (1 × 2) [6]. У кожным з іх зафіксаваны культурны пласт (перыядычна разворваецца), выяўлена невялікая колькасць крамянёвых вырабаў і фрагментаў ганчарнай керамікі, што паказвае на неабходнасць уключэння і дадзенага ўчастка ў планы далейшых археалагічных даследаванняў.

Стаянка Астравок-1, якая была выяўлена ў 2011 г., размешчана прыкладна праз 0,7–0,9 км на паўночны ўсход ад ніжняй ускраіны в. Астравок Гродзенскага раёна на правабярэжнай тэрасе р. Нёман, засаджанай лесам і даволі моцна задзірванелай [5, с. 296]. У 2012 г. побач з мінулагоднім шурфом № 1 былі закладзены яшчэ тры: шурф № 2 – 3 м^2 (1 × 3), шурф № 3 – 3 м^2 (1 × 3), шурф № 4 – 2 м^2 (1 × 2). Толькі ў другім шурфе трапіліся крамянёвыя знаходкі: скарыністы абломак і нарыхтоўка цяслападобнай прылады. Устаноўлена, што на стаянцы культурны пласт невыразны і вельмі слаба насычаны крамянёвымі артэфактамі (прылады працы і культуравызначальныя вырабы не выяўлены). Аднак стаянку Астравок-1 нельга выключаць з планаў далейшых даследаванняў, тым больш калі пачнецца будаўніцтва вадасховішча Нямноўскай ГЭС. Археалагічны нагляд за ходам земляных работ па выкарчоўцы дрэў дазволіць акрэсліць дакладныя межы помніка, лакалізаваць яго цэнтральную і перыферыйную часткі.

Гродна. У выніку разведак 2012 г. выяўлена пяць новых стаянак каменнага веку ў гарадской мяжы г. Гродна на ўчастку левабярэжжа р. Нёман ад яўрэйскіх могілак да вусця р. Ласасянка (насупраць лесапарку Пышкі): Гродна-1–5 (мал. 1) [6]. Згаданая тэрыторыя залесена, задзірванена, што перашкаджала візуальнаму абследаванню і пошуку пад'ёмнага матэрыялу. Між тым на высокай тэрасе р. Нёман, каля хаты даглядчыка яўрэйскіх могілак, на пясчаным агаленні лясной дарогі (Гродна-1), у лесе перад паваротам ракі (Гродна-3), побач з будынкамі на дарозе да вусця р. Ласасянка (Гродна-4), на мысе пры ўпадзенні р. Ласасянка ў р. Нёман (Гродна-5), а таксама на ніжняй тэрасе побач з гарадскім пляжам і будынкамі выратавальнай службы (Гродна-3) былі знойдзены крамянёвыя вырабы першаснага расшчаплення, у тым ліку правільныя ножападобныя пласціны. Нягледзячы на адсутнасць у калекцыі культуравызначальных прылад працы можна канстатаваць, што дадзены ўчастак ракі быў заселены ў фінальным палеаліце і мезаліце, а выяўленыя археалагічныя аб'екты вартыя далейшых даследаванняў.

Гродзенскі раён. Крэйдавыя кар'еры Пышкі і «Старавіна». У 2012 г. былі абследаваны раней вядомы крэйдавы кар'ер каля в. Пышкі, а таксама новы – «Старавіна» каля в. Зарэчанка Гродзенскага раёна на левабярэжжы р. Нёман. Першы ўжо не дзейнічае і паступова зарастае. У другім зафіксаваны таўшчыня марэнных адкладаў над крэйдай, асаблівасці выхаду крэйдавай пароды, залягання крамянёвых жалвакоў і канкрэцый, абследаваны сам кар'ер, магчымасці здабычы крамянёвай сыравіны (мал. 6). Былі сабраныя ўзоры для банка даных крамянёвай сыравіны, які ствараецца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі, і для далейшага выкарыстання крэменю пры вырабе прылад працы (сучасных рэканструкцый), параўнання якасных характарыстык крамянёвай сыравіны з «Старавіны» з канкрэцыямі і гатовымі прыладамі працы з іншых рэгіёнаў Панямоння. Непадалёку ад дадзенага месца выхаду крэйды і крамянёвай сыравіны разме-

Мал. 6. Абследаванне крэйдавага кар'ера «Старавіна» каля в. Зарэчанка Гродзенскага раёна з выразнымі прапласткамі крамянёвых канкрэцый (на здымку А. Вашанаў)

шчаны шэраг першабытных стаянак: каля в. Бераждны, Баля Сольная, Пышкі, пры вусці р. Ласасянка, у г. Гродна. Лакалізавана і новая крэмнеапрацоўчая майстэрня на тэрыторыі стаянкі Баля Сольная-2. Такім чынам, паступова назапашваецца дадатковы матэрыял для вывучэння крамянёвай індустрыі насельніцтва каменнага веку Гродзенскага ўзвышша.

Па выніках праведзеных даследаванняў у зоне верагоднага будаўніцтва Нямноўскай ГЭС на р. Нёман папярэдне вымалёўваецца наступная сітуацыя: чым ніжэй па цячэнні ад Гродна (в. Пышкі, в. Баля Сольная, ур. Пышкі і былая в. Грандзічы) да в. Плебанскія і в. Пальніца, тым менш вядома помнікаў археалогіі. Тлумачэнняў гэтаму некалькі: недастатковы стан даследаванняў (?), недасканалая методыка пошуку помнікаў (?) ці нязручныя для жыцця мясціны (?). Ніжнія тэрасы на гэтым участку ракі выражаны слаба і, верагодна, практычна не выкарыстоўваліся для засялення. На верхніх тэрасах, там дзе маюцца археалагічныя помнікі, выяўляюцца пераважна матэрыялы каменнага веку (фінальны палеаліт, мезаліт). Важна і тое, што назіраюцца ўжо характэрныя для шэрагу помнікаў з зоны будаўніцтва Гродзенскай ГЭС (вышэй Гродна) стратыграфічныя асаблівасці з наяўнасцю пахаванага (перакрытага) культурнага пласта, як, напрыклад, на стаянцы (і селішчы) Гожа-2 (мал. 5).

Гродзенскі раён. Возера Рыбніца. На тэрыторыі Гродзенскага раёна адметна вылучаюцца колькасцю вядомых помнікаў археалогіі ваколіцы в. Азёры і ўзбярэжжы азёр Белае і Рыбніца [5, 6, 13]. У 2012 г. чарговы раз быў абследаваны заходні бераг воз. Рыбніца. Пры гэтым разаранасць ўзбярэжжа і мэтанакіраваная шурфоўка дазволілі ўдакладніць межы помнікаў Азёры-1–4 (мал. 7), на якіх пакуль што не праводзілі стацыянарныя раскопкі.

Стаянка і селішча Азёры-1 размешчана на заходнім беразе паўночнай часткі воз. Рыбніца, праз 0,4 км на поўдзень ад шашы Гродна–Шчучын, адразу за апошнімі будынкамі заходняй ускраіны

Мал. 7. Спадарожнікавы здымак воз. Рыбніца з лакалізацыяй помнікаў Азёры-1–4 і планам размяшчэння шурфоў 2012 г.



Мал. 8. Крамянёвы інвентар (*1–7*). Шматкультурная стаянка Азёры-1. Гродзенскі раён

вёскі. Усходні край помніка прымыкае да возера, паўночны – забудаваны вёскай, па паўночна-заходнім праходзіць вясковая вуліца, якая пераходзіць ў палявую дарогу. Культурны пласт інтэнсіўна разворваецца. Помнік выявіў у канцы 1950-х гадоў Л. С. Клейн. Абследавалі гэты помнік ў 1986 г. М. М. Чарняўскі, у 1996 г. В. Л. Лакіза і В. С. Абухоўскі, у 2011 г. В. Л. Лакіза [5, 6, 13].

У 2012 г. на разаранай паверхні помніка была сабрана прадстаўнічая калекцыя з разнастайных крамянёвых вырабаў (нуклеусы, адшчэпы і пласціны, нажы, скрабкі і праколкі) (мал. 8), ляпной і ганчарнай керамікі [6]. Датаваны стаянка і селішча Азёры-1 перыядамі фінальнага палеаліту і мезаліту, неалітам і бронзавым векам, эпохай сярэдневякоўя і Новага часу (ад 9–8-га тысячагоддзя да н. э. да XV–XVII стст. н. э.). Дакладныя памеры помніка, паранейшаму, вызначыць складана. Больш верагодна, што іх патрэбна значна павялічыць амаль да мяжы стаянкі Азёры-2.

Стаянка і селішча Азёры-2 размешчаны на паўднёва-заходнім беразе паўночнай часткі воз. Рыбніца, праз 0,5–0,7 км на поўдзень ад апошніх будынкаў заходняй ускраіны вёскі і стаянкі Азёры-1, на ўсход ад белага цаглянага дома. Паўднёвы і паўднёва-заходні край помніка часткова забудава-

ны, задзірванелы, паўночна-ўсходні і ўсходні прымыкае да возера. Помнік выявіў і абследаваў у 1972, 1986, 1994 г. М. М. Чарняўскі, абследавалі ў 1996 г. В. Л. Лакіза і В. С. Абухоўскі, у 2011 г. В. Л. Лакіза. Культурны пласт ад 0,3 м да 0,5 м, на большай частцы (цэнтральнай) разворваецца. Дакладныя памеры помніка ўстанавіць складана. На паверхні археалагічныя артэфакты сустракаюцца на плошчы каля 1,3 га (каля 110 м на 120 м па лініі паўночны ўсход–паўднёвы захад, паўночны захад–паўднёвы усход) [5, 6, 13].

У 2012 г. праведзены зборы пад'ёмнага матэрыялу, сабрана калекцыя крамянёвых артэфактаў, сярод якіх скол ажыўлення пляцоўкі нуклеуса, скрабок, а таксама фрагменты ганчанай керамікі. Датаваны помнік Азёры-2 перыядам ад фінальнага палеаліту, неаліту і бронзавага веку (ад 9-га да 2-га тысячагоддзя да н. э.) да сярэдневякоўя і Новага часу (XV–XVII стст.) [6].

Стаянка і селішча Азёры-3 размешчаны на заходнім беразе цэнтральнай часткі воз. Рыбніца (у месцы яго звужэння), праз 0,9 км на поўдзень–паўднёвы ўсход ад апошніх будынкаў заходняй ускраіны вёскі і стаянкі Азёры-1, праз 0,2–0,3 км на паўднёвы ўсход ад стаянкі Азёры-2. Культурны пласт да 0,5 м разворваецца ў заходняй палове помніка. Усходняя палова помніка задзірванела, яна часткова засаджана кустарнікамі і асобнымі дрэвамі і прымыкае да возера. Помнік выявіў і абследаваў у 1972, 1986, 1994 г. М. М. Чарняўскі, абследавалі ў 1996 г. В. Л. Лакіза і В. С. Абухоўскі, у 2011 г. В. Л. Лакіза [5, 6].

У 2012 г. на разаранай паверхні заходняй паловы помніка была сабрана новая калекцыя крамянёвых вырабаў мезаліту і неаліту, ляпной керамікі неаліту і ганчарнай керамікі эпохі сярэдневякоўя [6]. Для ўдакладнення характару культурных напластаванняў і межаў помніка на яго задзірнаванай паверхні былі закладзены тры шурфы: шурф № 1 – 3 м^2 (1 × 3), шурф № 2 – 2 м^2 (1 × 2), шурф № 3 – 4 м^2 (1 × 4) (мал. 7). Пры гэтым адмыслова былі выбраны ўчасткі, якія прыпадалі на тры розныя ўзроўні вышыні над возерам. Пакуль складана адназначна сцвярджаць, што стаянка ахоплівала і мысападобную частку берага (своеасаблівы выступ ці паўвостраў, месца адпачынку вяскоўцаў і пляжа), якая была даследавана шурфамі № 1 і № 2. Культурны пласт ў шурфах шэрага колеру таўшчынёй да 0,3–0,4 м падсцелены жаўтаватым ці светлым



Мал. 9. Крамянёвы інвентар (*1–10*). Шматкультурная стаянка Азёры-4. Гродзенскі раён

дробназярністым пяском з невялікай насычанасцю крамянёвымі артэфактамі (ці не трапілі яны з верхніх участкаў помніка ?). У шурфе № 1 (на пляжы, практычна пры самай вадзе) на глыбіні каля 0,25 м ад сучаснай дзённай паверхні быў выяўлены касцяк пахаванага чалавека без суправаджальнага інвентару (арыентацыя – галавой на захад). З той прычыны, што інфармацыя аб наяўнасці тут могільніка была не вядома, на месца пахавання мы выклікалі прадстаўнікоў Гродзенскага РУУС. Пасля дадатковых кансультацый, фотафіксацыі і раскопак касцяка намаганнямі студэнтаў, яго парэшкі былі перададзены супрацоўнікам міліцыі [6]. Шурф № 3 прыпадаў на цэнтральную і самую высокую кропку помніка. У ім зафіксаваны культурны пласт магутнасцю да 0,8–1,0 м, насычаны дробнымі вугольчыкамі цёмна-шэрага і нават чарнаватага (на перадмацерыковым узроўні) колеру з дастаткова вялікай колькасцю разнастайных артэфактаў: крамянёвых вырабаў каменнага веку, дробных сценак ад ляпнога посуду і ганчарнай керамікі эпохі сярэдневякоўя.

Стаянка і селішча Азёры-4 размешчана на заходнім беразе цэнтральнай часткі воз. Рыбніца (адразу за месцам яго звужэння), праз 1,1–1,3 км на поўдзень ад апошніх будынкаў заходняй ускраіны вёскі і стаянкі Азёры-1, праз 0,2–0,3 км на поўдзень ад стаянкі Азёры-3. Помнік выявіў і абследаваў у 1972, 1986, 1994 г. М. М. Чарняўскі, абследавалі ў 1996 г. В. Л. Лакіза і В. С. Абухоўскі, у 2011 г. В. Л. Лакіза [5, 6, 13]. Паўднёва-ўсходняя, паўднёвая і паўднёва-заходнія ўскраіны задзірванелі, часткова засаджаны кустарнікамі і дрэвамі, прымыкаюць да возера і ручая, які ў яго ўпадае. Культурны пласт – да 0,5 м, на большай частцы помніка ён інтэнсіўна разворваецца (утварыўся насычаны пласт ворнай глебы да 0,20–0,25 м).

У 2012 г. на разаранай паверхні заходняй паловы помніка была сабрана новая калекцыя крамянёвых вырабаў мезаліту і неаліту (нуклеусы, нажы, скрабкі, скобелі, мікраліты, яніславіцкія вастрыі, сякеркі) (мал. 9), ляпной неалітычнай керамікі. Для ўдакладнення характару культурных напластаванняў і межаў помніка на ім былі закладзены два шурфы: шурф № 1 – 3 м^2 (1 × 3), шурф № 2 – 3 м^2 (1 × 3) (мал. 7) [6]. Знаходак у іх значна менш, чым на паверхні. Аднак, у шурфе № 1 сярод закончаных прылад працы маюцца два разцы, скрабок і праколка, а ў шурфе № 2 сярод выяўленых артэфактаў – нуклеус, разец, скрабло, пласціна са скошаным рэтушшу канцом, мезалітычная трапецыя, трохвугольны познанеалітычны наканечнік стралы і фрагменты ляпной неалітычнай керамікі.

Слонімскі раён. Інвентарызацыя помнікаў археалогіі. Па-ранейшаму, па колькасці вядомых помнікаў каменнага і бронзавага вякоў на тэрыторыі Беларускага Панямоння вылучаецца басейн р. Шчары. Даследаванні 2012 г. на тэрыторыі Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці яшчэ раз падцвердзілі гэта. Нават нягледзячы на шматгадовыя пошукі і зборы пад'ёмнага матэрыялу, сельскагаспадарчую дзейнасць і змены ландшафта, удалося выявіць новыя аб'екты і матэрыялы, як, напрыклад, каля в. Ферадкі (пры гэтым колькасць атрыманых на іх крамянёвых артэфактаў і керамікі вылічаецца сотнямі) [1, 2, 4, 7–9].

Асноўная задача згаданых палявых прац – завяршыць інвентарызацыю вядомых помнікаў археалогіі Слонімскага раёна, якую пачалі ў мінулым годзе. Неабходна было адшукаць на мясцовасці, абследаваць сучасны стан захаванасці, дакладна прывязаць да карт землекарыстання і спадарожнікавых здымкаў некаторыя розначасовыя помнікі, удакладніць іх лакалізацыю, межы. У выніку на кожны абследаваны помнік археалогіі, узяты на ўлік як гісторыка-культурная каштоўнасць, падрыхтавана ўліковая і навуковая дакументацыя, распрацаваны матэрыялы для праектаў зон аховы. Шэраг зніклых, разбураных помнікаў археалогіі прапанавана выключыць з «Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь», а некаторыя новыя ўключыць.

Усяго за два гады на тэрыторыі раёна было абследавана 49 гісторыка-культурных каштоўнасцей з уласнымі шыфрамі[1]. Археолагі ажыццяўлялі іх фотафіксацыю, збор пад'ёмнага матэрыялу, пры неабходнасці зачыстку і шурфоўку. Пасля палявых абследаванняў, вывучэння архіўных крыніц і літаратуры, аналізу новых атрыманых матэрыялаў былі зроблены ўдакладненні ў культурна-храналагічнай ідэнтыфікацыі практычна ўсіх гісторыка-культурных каштоўнасцей раёна, у іх назвах, апісаннях лакалізацыі. Аб гэтым у двух спецыяльных Актах было даведзена Слонімскаму райвыканкаму і Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь.

Напрыклад, па выніках праведзеных вясной 2012 г. палявых абследаванняў устаноўлены факты поўнага разбурэння ці моцнага пашкоджання:

– селішча перыяду жалезнага веку і сярэдневякоўя каля в. Парэчча, якое ўвайшло ў склад вёскі, забудавана жылымі і гаспадарчымі пабудовамі, актыўна выкарыстоўваецца ў сельскагаспадарчых мэтах;

– селішча каля в. Вялікія Шылавічы, якое таксама ўвайшло у склад вёскі і выкарыстоўваецца ў сельскагаспадарчых мэтах;

– гарадзішча каля в. Вялікія Шылавічы, якое цалкам разбурана кар'ерам падчас будаўніцтва аўтамабільнай дарогі;

[1] Рыхтуецца да друку асобны артыкул з абагульненай інфармацыяй аб выніках інвентарызацыі помнікаў археалогіі Слонімскага раёна.



Мал. 10. Спадарожнікавы здымак месцаразмяшчэння гарадзішча Ніз Слонімскага раёна (*А*), сучасны выгляд засаджанай лесам пляцоўкі гарадзішча (*Б*) і ахоўны знак, які быў пастаўлены побач з гарадзішчам яшчэ ў часы БССР (*В*)

– стаянкі ў паўночнай частцы в. Талькаўшчына, якая разбурана падчас будаўніцтва калгасных гаспадарчых будынкаў;

– селішча на паўднёвай ускраіне в. Талькаўшчына, якое забудавана вясковымі жылымі і гаспадарчымі пабудовамі і занята вясковымі могілкамі.

Разам з тым было дакладна лакалізавана на мясцовасці гарадзішча Ніз (Ніз-2), якое размешчана праз 1,7 км на паўночны захад ад паўночнай ускраіны вёскі, праз 0,1 км на паўднёвы захад ад краю тэрасы і 0,25 км на паўднёвы захад ад левага берагу р. Шчара, праз 0,25 км на паўднёвы ўсход ад апоры высакавольтнай лініі электраперадачы і просекі, на высокай гары, засаджанай лесам (мал. 10, *А, Б*). Яно ўзведзена на другой тэрасе, мае абарончы вал з напольнага боку і грушападобнай формы верхнюю пляцоўку памерамі прыблізна 50 × 25 м. Вышыня над узроўнем першай тэрасы з поўначы – 11,0 м, з поўдня – 8,5 м. Найбольшая стромкасць схілаў гарадзішча – з усходу і з поўдня. Схілы гарадзішча і вал засаджаны лесам. Цэнтральная пляцоўка таксама зарастае асобнымі дрэвамі і кустарнікамі, моцна задзірванена. На ёй выразна прасочваюцца сляды ад траншэй і ям. Прыкладныя памеры гарадзішча – да 0,84 га ад падножжа схілаў і да 0,125 га на верхняй пляцоўцы (120/50 × 70/25 м па лініі поўнач–поўдзень, захад–усход). Гарадзішча ўпершыню было абследавана Е. Міхайлоўскім у канцы XIX ст. У 1955 г. яго абследаваў Славяна-Літоўскі атрад Прыбалтыйскай археалагічнай экспедыцыі пад кіраўніцтвам Ф. Д. Гурэвіч. Датавана другой паловай 1-га тысячагоддзя н. э. [2, с. 178, рис. 37; 6–8]. Адзначым, што побач з гарадзішчам захаваўся ахоўны знак, які быў устаноўлены на краі левабярэжнай тэрасы р. Шчара яшчэ у часы БССР (мал. 10, *В*).

Быў абследаваны таксама каменны могільнік Рудаўка-2, які размешчаны праз 1,2 км на паўночны ўсход–усход (амаль на ўсход) ад паўночнай ускраіны в. Рудаўка, праз 1,8 км на поўнач ад калгасных гаспадарчых пабудоў пры грунтовай дарозе ў в. Клепачы, праз 1,8 км на ўсход ад правага берагу р. Зальвянка, на дзюнападобным марэнным узгорку, засаджаным лесапасадкамі (мал. 11). Яго цэнтральная, амаль квадратнай формы, частка засаджана дрэвамі і кустарнікамі, моцна задзірванена. На паверхні ўзвышаецца некалькі дзесяткаў (па бібліяграфічнай інфармацыі каля 70) каменных надмагілляў. На момант абследавання ў красавіку 2012 г. некаторыя магілы былі моцна пашкоджаны «чорнымі капальнікамі» (мал. 11, *Б*) [6, 8]. Па перыметры да самага краю помніка тэрыторыя інтэнсіўна разворваецца. На кожным з чатырох краёў помніка маюцца нагрувашчанні камянёў, сабраных на палях.

Каля в. Ферадкі былі дакладна лакалізаваны і нанесены на карты тры гісторыка-культурныя



Мал. 11. Спадарожнікавы здымак месцаразмяшчэння каменнага могільніка Рудаўка-2 Слонімскага раёна (*А*) і фотафіксацыя разбурэння могільніка «чорнымі капальнікамі» (*Б*)



Мал. 12. Крамянёвы інвентар: *1–5* – Ферадкі-3; *6, 7* – Ферадкі-2. Шматкультурныя стаянкі каля в. Ферадкі. Слонімскі раён

каштоўнасці (Ферадкі-1–3), на якіх сабрана новая прадстаўнічая калекцыя крамянёвых вырабаў, сярод якіх нуклеусы, разцы, праколкі, скрабкі, сякеры і інш. (мал. 12).

Такім чынам, вынікамі археалагічнай навукова-даследчай працы 2012 г. сталі: мэтанакіраваныя абследаванні значнай, раней не вядомай у археалагічным плане, тэрыторыі Беларускага Панямоння; вывучэнне помнікаў археалогіі, якія могуць трапіць у зону будаўніцтва новай Нямноўскай ГЭС на р. Нёман; інвентарызацыя помнікаў, уключаных у «Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей». Важна, што былі выяўлены і новыя археалагічныя помнікі ў гарадской мяжы г. Гродна, каля в. Баля Сольная, в. Плебанскія.

На вялікі жаль, як і ў мінулыя гады, падчас разведак і інвентарызацыі гісторыка-культурных каштоўнасцей Слонімскага раёна, мы зноў сутыкнуліся з фактамі іх пашкоджання «чорнымі капальнікамі» (мал. 11, *Б*), якія не спыняюцца перад разбурэннем нават выразных помнікаў – каменных могільнікаў позняга сярэдневякоўя і Новага часу.

Літаратура

1. Абухоўскі, В. С. Матэрыялы каменнага і бронзавага вякоў з ваколіц маёнтка Антонава былога Слонімскага павета / В. С. Абухоўскі // Слонімшчына вачыма навукоўцаў і краязнаўцаў (1252–2002) : матэрыялы рэгіянальнай гіст.-краязн. канф., прысв. 750-годдзю г. Слоніма і 70-годдзя заснавання Слонімскага раённага краязнаўчага музея імя І. І. Стаброўскага. – Слонім : Слонімская друкарня, 2002. – С. 44–48.

2. Гуревич, Ф. Д. Древности Белорусского Понеманья / Ф. Д. Гуревич. – М. ; Ленинград, 1962.

3. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобласць. – Мінск : БелСЭ, 1986.

4. Лакіза, В. Л. Археалагічныя даследаванні 1997 г. на Слонімшчыне / В. Л. Лакіза // Слонімшчына вачыма навукоўцаў і краязнаўцаў (1252–2002) : Матэрыялы рэгіянальнай гіст.-краязн. канф., прысв. 750-годдзю г. Слоніма і 70-годдзя заснавання Слонімскага раённага краязнаўчага музея імя І. І. Стаброўскага. – Слонім : Слонімская друкарня, 2002. – С. 73–84.

5. Лакіза, В. Л. Папярэднія вынікі археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 2011 годзе / В. Л. Лакіза // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – Вып. 24 : Даследаванне сярэдневяковых старажытнасцей Цэнтральнай Беларусі (памяці Ю. А. Заяца).– С. 293–302.

6. Лакіза, В. Л. Справаздача аб археалагічных даследаваннях на тэрыторыі Беларускага Панямоння ў 2012 годзе / В. Л. Лакіза // ААНД ДНУ «Ін-т гісторыі НАН Беларусі». – Мінск, 2013.

7. Михайловский, Е. Археологические очерки Слонимского Уезда Гродненской губернии / Е. Михайловский // Труды Виленского Отделения предварительного Комитета по устройству IX Археологического съезда. – Вильна, 1893. – С. 165–186.

8. Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Слонімскага раёна. – Мінск : БЕЛТА, 2004.

9. Супрун, В. Г. Памятники каменного века и эпохи бронзы в бассейне среднего течения р. Щары / В. Г. Супрун // Древности Белоруссии. – Минск, 1966. – С. 101–110.

10. Чарняўскі, М. М. Справаздача аб археалагічных даследаваннях у 1975 годзе / Архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі. – Спр. № 513. – 1975. – 45 с. : іл.

11. Чарняўскі, М. М. Справаздача аб археалагічных даследаваннях у 1976 годзе / Архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі. – Спр. № 550. – 1976. – 22 с. : іл.

12. Чарняўскі, М. М. Неаліт Беларускага Панямоння / М. М. Чарняўскі – Мінск, 1979. – 144 с.

13. Чарняўскі, Міх. М. Азёры / Міх. М. Чарняўскі // Археалогія Беларусі : у 2 т. – Мінск : БелЭН, 2009. – Т. 1. – С. 23.

Резюме

В. Л. Лакиза

Итоги археологических исследований первобытных памятников Белорусского Понеманья в 2012 году

В 2012 г. автор провел археологические исследования на территории Белорусского Понеманья в Гродненском и Слонимском районах.

Автором статьи целенаправленно изучена зона будущего строительства Немновской ГЭС на р. Неман – побережье реки от Гродно до д. Плебанские (место строительства плотины ГЭС), от д. Польница до д. Островок, от Грандич до лесопарка Пышки. Проведена масштабная шурфовка местности, в том числе уже известных памятников около д. Гожа, Баля Сольная, Пышки, Островок. Обнаружены новые археологические объекты, среди которых пять стоянок каменного века на левобережной террасе р. Неман в городской черте Гродно (от еврейского кладбища до устья р. Лососянка).

На оз. Рыбница в Гродненском районе проведены сборы подъемного материала и шурфовка памятников Озеры-1–4. Выявлены новые артефакты финального палеолита, мезолита и неолита.

В Слонимском районе завершена инвентаризация памятников археологии, включенных в «Государственный список историко-культурного наследия Республики Беларусь», найдены новые первобытные памятники около д. Феродки на р. Щара.

Summary

V. L. Lakiza

Results of archaeological research on primeval monuments of Belarussian Ponemanye in 2012

In 2012 the author carried out archaeological research in the territory of Belarussian Ponemanye in Grodno and Slonim districts.

A special attention was given to the prospective construction area of Nemnovskaya HPP on the Neman – that is from the riverside near Grodno to Plebanskiye village (the construction site of a hydroelectric dam), from Polnitsa village to Ostrovok village, from Grandichy to Pyshki woodland park. A large-scale pitting was conducted in the course of investigation including on already known monuments nearby villages Gozha, Balya Solnaya, Pyshki, Ostrovok. We revealed new archaeological objects, among which there are five Stone Age sites on the left-bank terrace of the Neman river within the city limits of Grodno (from Jewish cemetery to the mouth of the Lososyanka river).

Near lake Rybnitsa in Grodno district we gathered some surface material and conducted pitting on monuments Ozery-1–4. We uncovered new artefacts of final Paleolithic, Mesolithic and Neolithic ages.

In Slonim district we finished the inventory of archaeological monuments included in «The State List of historical and cultural heritage of the Republic of Belarus», in addition new primitive monuments were found near Ferodki village, the Shchara river.

Паступіў 30.10.2013 г.

УДК 904(476.2)(045)»653»

О. А. Макушников, *Гомельский государственный университет имени Ф. Скорины, кафедра истории славянских и специальных исторических дисциплин, доцент, доктор исторических наук (г. Гомель, Беларусь);*
А. А. Гусев, *Гомельский государственный университет имени Ф. Скорины, магистрант (г. Гомель, Беларусь);*
А. А. Меркуль, *Гомельский государственный университет имени Ф. Скорины, студент (г. Гомель, Беларусь);*
Д. Н. Линденков*, Государственное историко-культурное учреждение «Гомельский дворцово-парковый ансамбль», сектор археологии, научный сотрудник (г. Гомель, Беларусь)*

Исследование средневековых памятников на юго-востоке Гомельщины в 2011 году

Археологический отряд Гомельского государственного университета им. Ф. Скорины при поддержке Гомельской организации Общества охраны памятников и студенческого объединения «ТАмГА» продолжил в 2011 г. исследование средневековых памятников юго-восточной Гомельщины. В настоящем сообщении представлены итоги раскопок археологического комплекса, расположенного на юго-восточной окраине д. Мохов Лоевского р-на Гомельской обл. в правобережье Днепра. Работы экспедиции ведутся здесь с 2003 г. Часть материалов исследований опубликована [1, с. 78–95].

Памятник стал известен благодаря курганным раскопкам В. З. Завитневича конца XIX в. (им было изучено 26 курганов) [2, с. 11–72]. В ходе наших исследований установлено, что комплекс состоит из крупнейшего в Беларуси могильника (по подсчетам В. З. Завитневича он насчитывал более 600 насыпей; сохранилось, включая раскопанные и разрушенные, – немногим более 300) и сложносоставного (городище, посады) поселения общей площадью свыше 20 га, возникшего на месте ранних памятников (эпох неолита, бронзы, позднезарубинецкой, пражской культур и, вероятно, последних веков 1-го тысячелетия н. э.). Расцвет его жизни относится к X–XI вв. В это время здесь располагалось военизированное многофункциональное поселение, родственное древностям Руси типа открытых торгово-ремесленных поселений (дружинных лагерей), получивших известность благодаря исследованиям в Гнездове под Смоленском, Шестовице под Черниговом, Тимереве в Ярославском Поволжье и др. По мнению О. А. Макушникова, Мохов периода расцвета использовала великокняжеская власть для подчинения радимичей и дреговичей и последующего контроля над ними. Выполнив эти и иные исторические задачи, военизированное поселение (как и его типологические аналоги) прекратило существование. Финал Мохова древнерусского периода был обусловлен логикой истории и, в первую очередь, развитием феодализма. Он был связан с раздачей государственных земель выходцам из дружинного сословия – боярству [3, с. 130–138]. Археология свидетельствует, что к XII в. площадь Моховского комплекса резко сократилась. По-видимому, с этого времени здесь существовало небольшое село, характерное для Гомельского Поднепровья рассматриваемой эпохи.

Интересно расположение Мохова. Культурные отложения периода интенсивной жизни поселения зафиксированы, начиная от уреза воды в Моховском озере и на песчаных гривах в пойме (ур. Подгорье и Богданова Пристань), до отметок 17–18 м над озером (городище в ур. Причелок (Дед-Курган), селища-посады в ур. Высокое Поле). Необычна топография могильника, аналоги которой в Гомельском Поднепровье неизвестны. Курганы «шлейфом» поднимаются по склону коренной террасы, причем многие размещаются не только на ровной местности, но и на крутых косогорах, а некоторые насыпи находятся на заливаемой части луга. Перепад высотных отметок между крайними точками могильника составляет не менее 10 м (рис. 1). Во время раскопок прошлых лет исследованы основные части памятника. На городище открыта «подушка» вала X–XI вв., на посадах – слой того же периода, остатки крупного производственного сооружения по обжигу керамики. Среди находок – шпора, пряслица, сопла. Выявлено несколько кусков тонкоформатной желтой плинфы. На могильнике, по 2011 г. включительно, экспедицией ГГУ им. Ф. Скорины были исследованы 39 курганов. Памятник демонстрирует разнообразие обрядности с преобладанием кремаций и ингумаций на горизонте. Кроме господствующей западной ориентировки костяков выявлены случаи восточной и меридиональной. Прослеживаются следы сгоревших деревянных конструкций,



Рис. 1. Моховский курганный могильник: *1* – раскопанный курган; *2* – курган. Съемка археологического отряда Гомельского госуниверситета имени Ф. Скорины

признаки ритуального использования камней в обустройстве могил и насыпей. Последний обычай в курганах Гомельского Поднепровья не зафиксирован. Погребальный инвентарь Мохова разнообразен. В женских погребениях найдены бусы, проволочные кольца, перстни, браслеты, шейная гривна, нательный крест с «грубым» изображением Распятия и др. В мужских захоронениях встречаются топоры, копье, ножи, кресала, детали воинских поясных наборов и пр. Повсеместно присутствуют круговые сосуды, как целые, так и разбитые. В числе уникальных находок – монеты. Это денарий-подвеска чешского короля Болеслава II Благочестивого Пржемысловича (бит в Праге в 972/973–999 гг.), фрагменты двух сребреников Владимира Святославича (чеканены между 1011 и 1015 г.), обломки подвески-брактеата [4, с. 77–82]. Примечательно отсутствие в Мохове этноопределяющих украшений местного населения – радимичских семилучевых височных колец и дреговичских крупнозерненых бус, – хотя и те, и другие найдены в сельских курганах в радиусе от 7 км и далее от Мохова на Днепре и Соже. Наблюдение корректно, поскольку в Мохове В. З. Завитневич и О. А. Макушников исследовали более полусотни курганов. В то же время в инвентаре могил рассматриваемого памятника присутствуют вещи не местного, а преимущественно «северного» происхождения. Показательны женские захоронения с типично кривичскими браслетообразными височными кольцами. Достоверно кривичские комплексы (несмотря на сотни раскопанных погребений) в Гомельском Поднепровье не были отмечены, а информация начала прошлого века о находке кривичских колец в кургане под Рогачевом не подтверждена документально. Один из самых ранних курганов Мохова с погребением по обряду кремации находит более чем полные аналогии в инвентаре и обрядности с кривичским курганом могильника Вышадки в Северной Беларуси [5, с. 155–167].



Рис. 2. Инвентарь: *1–5* – цветной металл; *6* – черный металл; *7–18* – стекло. Курган 27. Мохов. 2011 г.

В 2011 г. раскопано 4 кургана (№ 27, 65, 78, 79А). Они располагаются на высоте от 5 до 14 м над урезом воды в Моховском озере. Курганы имеют блинообразную форму, деформированы оползаниями по склону террасы. Их диаметр составляет 4–7 м, высота – 0,3–0,7 м. Насыпи возведены из песка с включениями золы и угольков. В них отмечены артефакты (преимущественно обломки лепной керамики), связанные с ранними поселениями.

В кургане 27 насыпь образована из переотложенных остатков ранних поселений. В северо-восточном секторе найдена бронзовая игла, не связанная с курганным комплексом. В основании кургана залегает зольно-угольный горизонт мощностью до 0,20 м.

По центру кургана под дерново-почвенным слоем на зольно-угольном горизонте найдены остатки ингумации (часть черепной крышки и обломок плечевой кости). Скелет был ориентирован на запад–юго-запад. В 0,25 м к западу от черепа обнаружен железный нож (рис. 2: *6*). У черепа расчищены три бронзовых браслетообразных круглопроволочных височных кольца кривичского типа. Два кольца располагались по правую сторону от черепа, одно – по левую. Кольца имеют завязанные и крючкообразные концы, диаметр изделий – 8–10 см. В 0,60–0,70 м на юго-восток от черепа найдены два бронзовых круглопроволочных перстнеобразных височных кольца. Лучше сохранившееся изделие имеет сомкнутые концы (рис. 2: *1–5*). В погребении найдены 342 бусины – стеклянные и, в меньшем количестве, низкокачественного стекла – пастовые (рис. 2: *7–18*). Абсолютное большинство бус отмечено возле черепа. Зона их максимальной концентрации – область истлевших шейного и грудного отделов костяка. Небольшие скопления бусин (по несколько экземпляров в каждом) расчищены в стороне от зоны максимальной концентрации находок такого рода. Первое выявлено в 1,0–1,2 м к юго-востоку от черепа, возле условного нуля (6 бусин). Второе небольшое скопление отмечено в 2,5 м к востоку–юго-востоку от черепа (в 1,4 м от условного нуля). Здесь выявлено 5 бусин. Размещение последнего скопления может свидетельствовать о деформациях погребения, скорее, о его поздней распашке. В бусинном материале преобладает бисер синего и желтого цветов, в основном рубленый. Прочие бусы единичны. Представлены круглая винтообразная синяя, круглая тройная молочная, ребристая бирюзовая, ребристая цилиндрическая синяя, круглая полосатая, битрапецоидные синие (3 шт.), зонные двойные синие (2 шт.), круглая зонная синяя. Показательны находки лимонных желтых бус (3 шт.). Согласно новгородской хронологии, датировка «лимонок» в основном не выходит за рамки 20-х годов XI в. [6, с. 173–174].



Рис. 3. Инвентарь: *1* – цветной металл, кость, стекло; *2, 3* – цветной металл; *4* – черный металл; *5* – круговая керамика. Курган 65. Мохов. 2011 г.

Вскрыты околокурганные ямы, выкопанные при создании кургана. На материке также обнаружены три ямы, не связанные с основным комплексом. Курган 27 относится к концу X – началу XI в.

В насыпи кургана 65 встречено несколько камней с поперечником до 0,20 м, разрозненные фрагменты круговой керамики, включая венчик сосуда X в. На границе насыпи с дерново-почвенным горизонтом выявлены два венчика сосудов X–XI вв. и стенка кругового горшка. В насыпи встречена бронзовая лировидная пряжка с железным язычком (рис. 3: *2*). Последняя находка стратиграфически связана с поздней вспашкой и, вероятно, относится к инвентарю нарушенного погребения 2. В юго-западном секторе под дерново-почвенным горизонтом прослежено погребение 1 по обряду сожжения, поврежденное вспашкой. Оно вытянуто овалом с юга на север, имеет размеры 1,55 × 0,85 м. Пятно насыщено углем, золой, большим количеством



Рис. 4. Круговая керамика: *1–3* – курган 78; *4* – курганы 78, 79А; *5* – курган 79А. Мохов. 2011 г.

пережженных костей. Собраны венчик кругового сосуда второй половины X – начала XI в., две стенки круговых горшков, шесть стенок раннекруговых сосудов (все обломки маловыразительны). Погребение 2 по обряду кремации находится в 0,4 м к востоку от условного нуля. Пятно, интенсивно насыщенное костями, углем и золой, имеет по верхней зачистке подквадратную форму размерами около 1,2 × 1,0 м и мощность до 0,35 м. Оно ориентировано длинной осью по линии северо-восток–юго-запад. В толще пятна расчищены остатки семи сгоревших бревнышек поперечником 5–7 см и длиной 20–40 см. Инвентарь представлен железным ножом (рис. 3: *4*), обломками двух бронзовых височных колец и конкрециями оплавленной стеклянной массы (остатками бус). Кольца относятся к разновидности



Рис. 5. Инвентарь: *1, 4–7, 9, 10, 12, 18, 19* – цветной металл; *2, 3, 8, 11, 13–17, 20–23* – рог. Курган 78. Мохов. 2011 г.

круглопороволочных с заходящими концами. Первое кольцо сохранилось с остатками прикипевших костей черепной крышки и стеклянной массы. Оно сильно деформировано (рис. 3: *1*). Второе кольцо складывается из обломков. Его диаметр составляет 4,0–4,5 см (рис. 3: *3*). В погребении найден развал кругового горшка X в. с клеймом на донной части (рис. 3: *5*). Сосуд деформирован температурным воздействием. По периметру основания кургана прослежено разомкнутое «кольцо» из песка, насыщенного золой и углем. Стратиграфически оно связано с впущенными в материк околокурганными ямами. На материке открыто несколько ям, часть из которых может быть связана с курганом. Курган отнесен к середине–второй половине X в.

Курганы 78 и 79А изучены общим раскопом. В насыпи кургана 78 зафиксировано несколько камней диаметром 7–20 см. Во всех секторах найдены разрозненные пережженные кости. В насыпи есть единичные фрагменты лепной и круговой керамики. В основании кургана отмечается зольно-угольный горизонт мощностью до 0,40 м. В плане он образует овал размером 4,8 × 6,0 м, вытянутый с запада на восток. В центральной части зольно-угольного



Рис. 6. Инвентарь: *1, 2, 4, 7, 9–18* – цветной металл; *3, 5, 6, 8* – рог. Курган 78. Мохов. 2011 г.

горизонта расчищено погребение по обряду кремации. Оно выделяется черным цветом, отдельными крупными кусками угля, большим количеством кальцинированных костей. Пятно захоронения на уровне верхней зачистки имеет округлую форму размерами 1,3 × 1,2 м, максимальные размеры – 1,4 × 1,3 м. В месте расположения захоронения наблюдается увеличение мощности зольно-угольного горизонта. Мощность слоя концентрации костей – до 0,35 м. На одном уровне с погребением, в 0,7 м к северу от него, найден развал кругового горшка X в. Он был преднамеренно разбит устроителями кургана. На дне – клеймо в виде равностороннего креста, вписанного в круг (рис. 4: *1*). Среди пережженных костей находятся фрагменты двух разбитых при совершении погребальных действий круговых горшков X в., которые поддаются реставрации. Черепки залегают хаотично по всей толще сажистого слоя захоронения. На дне одного из сосудов – клеймо в виде пяти лучей, вписанных в круг (рис. 4: *2*). У небольшого горшочка на дне также имеется клеймо. Это – некая черточка, вписанная в круг (рис. 4: *3*). В области плечика просматриваются две горизонтальные линии. В погребении есть

и несколько круговых черепков, которые принадлежали иным сосудам, а также невыразительные стенки лепных горшков. Последние, вероятно, относятся к бронзовому веку и попали в могилу случайно. В погребальный инвентарь входят бронзовые элементы воинского пояса: пряжка, девять бляшек, четыре поясных наконечника-«хвостовика», четыре обоймицы, два поясных кольца, наконечник пояса и фибула. Здесь же найдены остатки неопределенного бронзового тонкопроволочного изделия, а также обломки роговой расчески с бронзовыми заклепками (рис. 5, 6). Все предметы в той или иной степени испытали действие огня.

Прослежен околокурганный ровик подковообразной формы, развернутый «устьем» на юго-запад и заполненный песком с углем и золой. Он распадается на отдельные ямы. Найдены маловыразительные фрагменты круговой и лепной керамики. В заполнении ровика собраны обломки кругового горшка с вертикальным венчиком (рис. 4: *4*). Фрагменты этого же сосуда были найдены и под дерном в кургане 79А. Сосуд был разбит после сооружения насыпей. Курган 78 можно датировать X в.

В насыпи кургана 79А встречены единичные кальцинированные кости. На границе дерново-почвенного горизонта и насыпи найдено несколько обломков круговых сосудов конца X – начала XI в. Погребение-кремация совершено к западу от условного нуля в верхней части подошвенного зольно-угольного горизонта. Пятно по верхней зачистке имеет форму овала. Вытянуто по оси северо-запад–юго-восток на 0,80 м при ширине до 0,60 м. Максимальное расширение пятна наблюдается несколько ниже, где его размеры достигают 1,50 × 1,10 м. Мощность слоя с костями, золой и углем – до 0,20 м. В толще пятна выявлен развал донной части кругового сосуда с клеймом в виде свастики в круге (рис. 4: *5*). В погребении найдено 18 стеклянных бусин и два бронзовых круглопроволочных височных кольца. Все предметы имеют следы высокого температурного воздействия. Некоторые из них оплавились или даже утратили часть первоначальной формы. Бусы представлены 15 зонными экземплярами (большинство из них одинарные, 4 экз. двучастные). Они изготовлены из синего непрозрачного и полупрозрачного стекла, одна – из зеленого непрозрачного. Две бусины комплекса являются призматическими шестигранными из полупрозрачного и непрозрачного синего стекла. Височные кольца относятся к разновидности круглопроволочных перстнеобразных. Удовлетворительно сохранившееся изделие имеет заходящие концы, второе – представлено в обломке. Погребение кургана 79А совершено в X в.

Материалы последних раскопок еще раз подтверждают уникальность комплекса, который относится к начальному этапу формирования восточнославянской государственности. Археологические работы в Мохове дают значимую научную информацию о характере военно-политических и этнокультурных процессов на порубежье современных Беларуси и Украины в период создания государства Русь.

Литература

1. Макушников, О. А. Гомельское Поднепровье в V–середине XIII вв. : Социально-экономическое и этнокультурное развитие / О. А. Макушников ; М-во образования Респ. Беларусь, Гомельский гос. ун-т им. Ф. Скорины. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2009. – 218 с.
2. Завитневич, В. З. Вторая археологическая экскурсия в Припятское Полесье / В. З. Завитневич // Чтения в Историческом Обществе Нестора-летописца. – Киев, 1892. – Кн. VI. – С. 11–72.
3. Макушников, О. А. Между Гнездово и Киевом : Моховский археологический комплекс X – XI вв. на юго-востоке Беларуси / О. А. Макушников // Гіст.-археалаг. зб. – Вып. 22. – Мінск, 2006. – С. 130–138.
4. Макушников, О. А. Моховские курганы с находками монет / О. А. Макушников, Н. А. Курашова, А. Г. Тимофеенко // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны. – Мінск, 2008. – Вып. 4. – С. 77–82.
5. Макушников, О. А. Моховский курган 77 (к вопросу о «кривичском присутствии» на юго-востоке Беларуси в период становления государственности) / О. А. Макушников // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Вып. 15. – Мінск, 2007 – С. 155–167.
6. Щапова, Ю. Л. Стеклянные бусы древнего Новгорода / Ю. Л. Щапова // Тр. Новгород. археолог. экспедиции. – М. : Изд-во АН СССР, 1956. – Т. I. – С. 173–174.

Рэзюмэ

А. А. Макушнікаў, А. А. Гусеў, А. В. Меркуль, Д. М. Ліндзянкоў

Даследаванне сярэдневяковых помнікаў на паўднёвым ўсходзе Гомельшчыны ў 2011 годзе

Паблізу ад г. Лоева Гомельскай вобласці у д. Мохаў на правым беразе Дняпра размешчана вялікае па памерам старажытнарускае паселішча з самым значным ў Беларусі могільнікам (налічвае звыш 600 курганоў). Перыяд інтэнсіўнага жыцця паселішча (X–XI вв.) супадае з раннімі этапамі станаўлення Русі. Вялікія князі выкарыстоўвалі Мохаў дзеля падпарадкавання радзімічаў і дрыгавічоў. Гэта паселішча было заселена ўзброенымі людзьмі, якія мелі «паўночнае» паходжанне (ў першую чаргу, крывічамі). Усяго экспедыцыяй Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скары-

ны даследавана 39 курганоў і невялікія участкі паселішча. У 2011 г. вывучаны чатыры курганы X – пачатку XI ст. з інгумацыяй і чатырма крэмацыямі. Інвентар прадстаўлены кругавымі гаршкамі, скроневымі колцамі (у тым ліку крывіцкімі), шклянымі бусамі, нажамі, рогавым грэбенем, бронзавымі дэталямі паса воіна і інш.

Summary

O. A. Makushnikov, A. A. Gusev, A. V. Merkul, D. N. Lindenkov

Research of medieval sites in the south-east of Gomel Region in 2011

The village of Mokhov is situated near the town of Loev in Gomel region on the right bank of the Dnieper River. The large-size Old Rus' settlement with barrow burials is located nearby. The last with more than 600 burial mounds is considered as one of the most numerous in Belarus. Period of intense function of this complex dated back to the 10th–11th centuries and indicated the early stages of formation of Rus. It might be regarded as the place which was connected with the Grand Dukes' attempts to subdue the Radimichy and Dregovichy. Obviously, it was settled by the armed men who were the Krivichy first of all. A smaller part of the settlement so as 39 burial mounds were investigated by the expedition of Gomel State University named after F. Skaryna. Four inhumations and cremations of the 10th – early 11th century were studied in 2011. The grave goods are presented by wheel-made pottery, temple rings, glass beads, knives, combs, parts of bronze belt-set, etc.

Поступила 24.10.2013 г.

УДК 903.4(476.5)

З. А. Харытановіч, *Інстытут гісторыі НАН Беларусі, аддзел археалогіі першабытнага грамадства, навуковы супрацоўнік (г. Мінск, Беларусь)*

Археалагічныя даследаванні на гарадзішчы Бірулі ў 2012 годзе

У палявым сезоне 2012 г. на падставе Дазволу № 2370 па форме № 1, які быў выдадзены інстытутам гісторыі НАН Беларусі, былі праведзены даследаванні на тэрыторыі Докшыцкага, Лепельскага, Чашніцкага і Вушацкага раёнаў Віцебскай вобласці. Падчас работ у Докшыцкім раёне былі праведзены раскопкі на гарадзішчы каля в. Бірулі, абследаваннеішурфоўкастаянкікаменнага–бронзавага вякоў на беразе возера Медзазол. У Лепельскім раёне працягвалі работы на гарадзішчы Верабкі (шурф); ва Ушацкім раёне абследавалі ўжо вядомыя і праводзілі пошук новых помнікаў жалезнага веку; у Чашніцкім раёне было ўдакладнена месца і абставіны знаходкі скарба (?) рэчаў круга выемчатых эмаляў з берага Лукомльскага возера.

Гарадзішча Бірулі (Парэчча), размешчанае ў 2 км на паўднёвы–паўднёвы–захад ад в. Бірулі Туміловіцкага с/с, на стрэлцы доўгага пагорку ў лесе (мал. 1, *а*). Вышыня ад падножжа дасягае 10 м. Умацаванае валамі і равамі. Унутраны вал мае дугападобную форму і размяшчаецца на паўночным краі пляцоўкі. Яго максімальная шырыня каля падножжжа – 7 м, вышыня – 0,6–0,7 м. Яшчэ два валы ўмацоўваюць гарадзішча з паўночнага захаду і паўночнага ўсходу. Яны ўтвараюць своеасаблівы калідор, які, верагодна, служыў месцам уваходу. Шырыня валоў каля падножжа – 10–12 м, вышыня – 1,5–2,0 м. Паміж пляцоўкай і валамі выкапаны роў шырынёй да 12–13 м (мал. 1, *б*).

У 2011 г. на гарадзішчы было даследавана 32 м^2 (раскоп 1) у паўднёвай частцы пляцоўкі. У 2012 г. раскопкі на гарадзішчы былі працягнуты. Раскоп 2, плошчай 48 м^2, быў размешчаны каля ўсходняга краю пляцоўкі на поўнач ад раскопу 1 (мал. 1, *б*).

Культурны пласт у раскопе прадстаўлены супескам, які меў колер ад шэрага ў верхніх пластах да амаль чорнага ў ніжніх. Пласт вельмі насычаны дробнымі каменчыкамі і часткова пашкоджаны карэннем сосен і хмызняку. У першым пласце аб'ектаў не выяўлена, у заходняй частцы раскопу бліжэй да цэнтра пляцоўкі зафіксаваны выхад на мацерык. Ва ўсходняй частцы раскопу ў пласце 2 назіраецца пераход ад цёмна-шэрага ў перамешаны пласт, які пераважна сканцэнтраваны ў кв. 3, 4, 7, 8. На мяжы кв. 3 і 4 адзначана пляма супеску шэрага колеру з дамешкам пяску, да яе прымыкае прапластак шэрага колеру. Уздоўж усходняй сценкі, па цэнтры кв. 4 і 8 ідзе паласа перамяшанага з попелам пласта, а каля самой сценкі – супесак карычнева-шэрага адцення. У паўднёва-ўсходнім куце адзначаны пласт, больш насычаны вуголлем. Запаўненне другога пласта таксама ўтрымлівае шмат дробных і сярэдніх каменьчыкаў.

Пры разборцы пласта зафіксавана пяць аб'ектаў, якія залягалі на розных узроўнях. Гэта пераважна вялікая колькасць камянёў, якія сканцэнтраваны ўздоўж мяжы фіксацыі мацерыку (аб'екты 1–3). Ва ўсходняй частцы пляцоўкі расчышчаны вялікі бессістэмны россып камянёў, які меў два ўзроўні (аб'екты 4). Варта адзначыць аб'ект 5 – рэшткі вогнішча, якое складалася з дзвюх плям супеску чорнага колеру, насычанага вуголлем, рэшткаў доўгага перапаленага бервяна, і двума фрагментамі перапаленых бярвенняў.

У трэцім пласце культурны пласт захаваўся толькі ва ўсходняй частцы раскопу і часткова ў кв. 12. Ён мае неаднастайны колер: асноўную частку займае шэры пласт, перамяшаны з пяском, адзначаюцца плямы карычнявата-шэрага колеру. У пласце 3 зафіксаваны чатыры аб'екты – вялікая колькасць камянёў і каменныя выбрукоўкі, якія таксама канцэнтраваліся ўздоўж мяжы мацерыка. Пры разборцы пластоў 4 і 5 зафіксаваны яшчэ па дзве групы камянёў, якія былі выяўлены ўздоўж мяжы мацерыка (мал. 1, *г*) і служылі, верагодна, для ўмацавання схілаў пры пашэрэнні пляцоўкі.

У мацерыковым слоі зафіксаваны 41 аб'ект: слупавыя і гаспадарчыя ямы. Аб'екты, сканцэнтраваныя ва ўсходняй частцы раскопу, з'яўляюцца часткамі пабудовы слупавой канструкцыі, якая размешчана ў кв. 3, 4, 7, 8 і арыентавана па лініі паўночны захад–паўднёвы ўсход (мал. 1, *в*). У сярэдзіне канструкцыі размешчана аморфная гаспадарчая яма, запоўненая чорным супескам і дробнымі камянямі. Яе памеры – 1,70 × 1,04 м, максімальная глыбіня – 0,52 м. У запаўненні знойдзена 10 кавалкаў костак і 9 фрагментаў ляпной керамікі, касцяное долата. Пасля выбаркі асноўнай часткі аб'екта была расчышчана слупавая яма акруглай формы, дыяметрам 0,26 м, глыбіня яе склала ад 0,40 да 0,52 м. Памеры пабудовы – 2,8 × 2,4 м. Яна, верагодна, мела жылое прызначэнне: слупавая канструкцыя з вогнішчам у яме і цэнтральным слупам.

Стратыграфія раскопу 2 выглядае наступным чынам: адразу пад пластом лясного падзолу ідзе пласт лёгкага чорнага супеску, насычанага дробнымі каменьчыкамі, з вялікай колькасцю карэння ад хмызняку, які расце на ўсёй пляцоўцы помніка. Магутнасць гэтага пласта складае ад 0,16 м у заходняй частцы да 0,7 м па паўднёвым профілі. У заходняй частцы раскопу іншых прапласткаў не выяўлена. Паглыбленні адзначаліся толькі ў аб'ектах. Больш



Мал. 1. Гарадзішча Бірулі: *а* – размяшчэнне, *б* – сітуацыйны план з адзначанымі раскопамі, *в* – план жылой пабудовы, *г* – план мацерыковай паверхні з накладзенымі каменнымі выбрукоўкамі



Да жалезнага веку таксама можна аднесці поліэдрычную пацерку з халцэдону (мал. 3: *1*). Пацерка дванаццацігранная, падпрамавугольная ў плане, мае памеры 1,4 × 1,1 × 0,6 см. Падобныя знаходкі пацерак вядомы на разбураным могільніку, які да сярэдзіны 2000-х гадоў знаходзіўся на тэрасе левага берага р. Лясная на паўднёвай ускраіне в. Дружба (Скорбічы) [1, с. 294–295]. Даследчыкі датуюць іх

[1] Аўтар выказвае шчырую падзяку навуковаму супрацоўніку Інстытута гісторыі НАН Беларусі кандыдату гістарычных навук В. Г. Беляўцу і студэнту III курса Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна А. Дацкевічу за дапамогу ў арганізацыі і правядзенні разведак, малодшаму навуковаму супрацоўніку Інстытута гісторыі НАН Беларусі А. Ю. Ткачову і аспіранту Інстытута гісторыі НАН Беларусі А. М. Вашанаву за дапамогу ў вызначэнні і апрацоўцы крамянёвага матэрыялу, старшаму навуковаму супрацоўніку ДУ «Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь» кандыдату гістарычных навук М. А. Плавінскаму за дапамогу ў вызначэнні матэрыялаў эпохі сярэдневякоўя.



Мал. 1. Лакалізацыя селішчаў і месцазнаходжанняў, якія былі абследаваны падчас разведак на тэрыторыі Брэсцкага раёна ў 2012 годзе: *1* – Ставішча; *2* – Дружба-1; *3* – Дружба-2; *4* – Дружба-4; *5* – Нясвіла-2; *6* – Нясвіла-1



Мал. 2. Матэрыялы з разведак на тэрыторыі Брэсцкага раёна ў 2012 годзе: *1–3, 6, 7* – нуклеусы (крэмень); *4, 5* – пласціны (крэмень); *1, 2* – Ставішча; *3–5* – Дружба-4; *6, 7* – Нясвіла-2



Мал. 3. Матэрыялы з разведак на тэрыторыі Брэсцкага раёна ў 2012 годзе: *1* – пацерка (халцэдон); *2–7* – ляпная кераміка (гліна); *1–6* – Дружба-4; *7* – Нясвіла-2

ранняй фазай перыяду перасялення народаў (фаза C1–C3/D цэнтральнаеўрапейскай сістэмы адноснай храналогіі) [4, s. 29, tab. 5w].

Эпоха сярэдневякоўя прадстаўлена шасцю фрагментамі кругавой керамікі, чатыры з якіх упэўнена можна датаваць старажытнарускім часам (XI–XIII стст.) (мал. 3: *5, 6*).

Таксама падчас разведак былі абследаваны два вядомыя паселішчы на паўночны захад ад в. Дружба (Скорбічы) (мал. 1: *2, 3*). Іх у 1966 г. адкрыла і даследавала І. П. Русанава, а ў 1980 і 1985 г. абследавала Т. М. Каробушкіна [3, с. 315]. На момант агляду плошча абодвух паселішчаў была моцна задзірванелая.

Нясвіла-2. Месцазнаходжанне размешчана прыкладна ў 400 м на поўдзень ад в. Нясвіла (Чарнаўчыцкі сельсавет), на невялікім узвышшы на левым беразе р. Лясная, каля яе старыцы, справа ад дарогі з в. Дружба (Скорбічы) (мал. 1: *5*). На момант правядзення паверхневых збораў узвышша было разарана па ўсёй плошчы.

На паверхні ўзвышша і паабал яго былі сабраны розначасовыя матэрыялы (усяго 98 адз.).

Найбольш шматлікай катэгорыяй знаходак з'яўляецца крэмень са слядамі апрацоўкі (усяго 79 адз.): скрабкі (3 адз.), нуклеусы двухпляцовачныя (6 адз.), аднапляцовачныя (5 адз.) і са шматразовай зменай арыентацыі (1 адз.), фрагменты нуклеусаў (9 адз.), сколы падпраўкі пляцоўкі нуклеусаў (2 адз.), пласціны і іх фрагменты (12 адз.), адшчэпы і іх фрагменты (26 адз.), лускі (2 адз.), крамянёвыя сколы (3 адз.) і абломкі (9 адз.). Большасць гэтых матэрыялаў датавана вельмі шырока – каменным і бронзавым вякамі. Да фінальнага палеаліту, а менавіта да свідэрскай культуры, адносіцца нуклеус ад пласцін і адшчэпаў з дзвюма косаскошанымі ўдарнымі пляцоўкамі (мал. 2: *6*). Мезалітам можна датаваць аднапляцовачны нуклеус ад пласцін (мал. 2: *7*).

Другой па колькасці катэгорыяй знаходак з'яўляюцца фрагменты ляпнога посуду жалезнага веку (усяго 9 адз.).

1. Фрагмент верхняй часткі пасудзіны з добра заглажанымі ў гарызантальным накірунку паверхнямі. Месца пераходу ад шыйкі да тулава дадаткова падкрэслена гарызантальнай пракрэсленай лініяй (мал. 3: *7*). Таўшчыня фрагмента – 0,8 см. Знешняя паверхня карычневага колеру, унутраная – цёмна-шэрага. Абедзве паверхні добра заглажаны ў гарызантальным накірунку. У якасці дамешкі ў керамічнай масе выкарыстоўвалі дробную жарству белага колеру. Абпал якасны, злом аднакаляровы.

2. Фрагмент сценкі грубаляпной пасудзіны з бугрыстай паверхняй. Таўшчыня фрагмента – 1,1–1,2 см. Знешняя паверхня цёмна-шэрага колеру, унутраная – карычневага. У якасці дамешкі ў керамічнай масе выкарыстоўвалі жарству белага колеру да 0,5 см у папярочніку, якая праступае на абедзвюх паверхнях фрагмента. Абпал якасны, злом аднакаляровы.

3. Фрагмент сценкі ляпной пасудзіны пясочнага колеру з добра заглажанымі паверхнямі. Таўшчыня фрагмента – 0,7–0,8 см. У якасці дамешкі ў керамічнай масе выкарыстоўвалі жарству шэрага і бежавага колераў да 0,3 см у папярочніку. На зломе прасочваецца шэрая праслойка.

4. Шэсць невялікіх фрагментаў сценак ляпных пасудзін карычневага ці шэравата-карычневага колеру з заглажанымі паверхнямі. Таўшчыня вагаецца ад 0,5 да 0,9 см. У якасці дамешкі ў керамічнай масе выкарыстоўвалі жарству белага і шэрага колераў да

0,4 см у папярочніку. Абпал якасны, злом аднакаляровы.

Таксама ў матэрыялах з паверхневых збораў прысутнічае кругавая кераміка (фрагмент венца, фрагмент донца і пяць фрагментаў сценак).

Падчас разведкі ў ваколіцах в. Нясвіла было праведзена абследаванне селішча Нясвіла-1, якое знаходзіцца ў накірунку прыкладна 500 м на захад ад вёскі на высокай надпоймавай тэрасе па левым беразе р. Лясная (мал. 1: *6*).

Помнік быў выяўлены ў 1991 г. падчас разведак, якія праводзілі В. С. Вяргей, М. М Крывальцэвіч і А. В. Іоў ў басейне р. Лясная, і даследаваны ў 1997, 2006 і 2007 г. В. С. Вяргей і В. Г. Беляўцом. Даследчыкамі было высветлена, што помнік функцыяніраваў у перыяд правінцыйнарымскіх уплываў (з другой паловы II ст.) і раннім сярэдневякоўі, найбольш інтэнсіўна выкарыстоўваўся ў XVII–XVIII стст. [2, с. 7–9].

У верасні 2012 г. большая частка селішча была занята калгасным полем, на якім праводзілі ўборку бульбы. На паўднёвай і цэнтральнай частках помніка былі праведзены паверхневыя зборы, у выніку якіх былі знойдены шэсць невыразных фрагментаў керамікі. Тры грубаляпныя фрагменты з дамешкамі жарствы ў цесце, верагодна, можна звязваць з жалезным векам. Яшчэ тры фрагменты паходзяць ад познаганчарнага посуду.

Маршрут разведкі на тэрыторыі Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці ўключаў абследаванне тэрыторыі ў наваколлях вёсак Вялікая Турна і Малая Турна Відамлянскага сельсавета, а таксама на тэрыторыі паабапал аўтамабільнай дарогі Р-83 на ўчастку ад уезду ў вёску Малая Турна да скрыжавання з аўтамабільнай дарогай з в. Сколдычы ў в. Чарнаўчыцы Брэсцкага раёна. Падчас правядзення разведак у гэтай мясцовасці не ўдалося выявіць археалагічныя помнікі ці месцазнаходжанні.

Літаратура

1. Белявец, В. Г. Скорбічы / В. Г. Белявец // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2 : Л–Я. – С. 294–295.

2. Белявец, В. Г. Справаздача аб даследаваннях 2007 г. на тэрыторыі Брэсцкага, Камянецкага раёнаў Брэсцкай вобласці і Нацыянальнага парку Белавежская Пушча / В. Г. Белявец // ААНД ДНУ «Ін-т гісторыі Нац. акад. навук Беларусі». – Арх. № 2505. – 14 с., 10 с. кал. воп., 55 с. : іл.

3. Каробушкіна, Т. М. Дружба, Скорбічы / Т. М. Каробушкіна // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1 : А–К. – С. 315.

4. Andrzejowski, J. Skorbicze / J. Andrzejowski // Zabytki z okresu wpływow rzymskich, średniowiecza i czasów nowożytnych z Białorusi w zbiorach Państwowego Muzeum Archeologicznego w Warszawie ; [red. A. Piotrowskiego]. – Warszawa : DEKA, 2005. – S. 22–29.

Резюме

А. С. Арабей

Археологические разведки на территории Брестского и Каменецкого районов в 2012 году

Представлены результаты разведок, которые были проведены в сентябре 2012 г. на территории Брестского и Каменецкого районов Брестской области. В Брестском районе были выявлены три новых местонахождения материалов каменного и железного веков, средневековья: Ставище, Дружба-4, Несвило-2. Также было проверено состояние уже известных памятников археологии: Дружба-1, -2 и Несвило-1.

Summary

A. S. Arabei

Archaeological prospecting on the territory of Brest and Kamenets districts in 2012

The article introduces the results of reconnaissances, which were held in september 2012 on the territory of Brest and Kamenetz districts. Three new sites with the materials of Stone age, Iron age and Middle Ages were detected: Stavishe, Druzhba-4 and Nesvilo-2. Also the condition of already known archaeological sites was checked: Druzhba-1, -2 and Nesvilo-1.

Паступіў 22.10.2013 г.

УДК 902/904(476.1)

В. У. Ашэйчык, *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, аспірант, магістр гістарычных навук (г. Мінск, Беларусь);*
А. У. Зуева, *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, старшы выкладчык, кандыдат гістарычных навук (г. Мінск, Беларусь)*

Археалагічныя даследаванні ў ваколіцах вёскі Дразды Стаўбцоўскага раёна ў 2012 годзе

У палявым сезоне 2012 г. аўтары праводзілі археалагічныя разведкі ў верхнім цячэнні р. Нёман – каля вёскі Дразды Старасвержанскага сельсавета Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці.

Першыя археалагічныя помнікі ў наваколлі гэтай вёскі былі выяўлены Л. Д. Побалем у канцы 1950-х – 1960-я гады [10, с. 312; 11, с. 321]. У перыяд з 1981 г. па 2011 г. тут неаднаразова праводзіў разведкі М. М. Чарняўскі. У выніку яго шматгадовых даследаванняў у ваколіцах Драздоў было зафіксавана 13 розначасовых помнікаў (мал. 1: *1–13*) [2, с. 18; 3, с. 3–4, мал. 2, 3, 9; 4, с. 6–7, 17–22, мал. 9–19; 7, с. 7–8, мал. 3, 14, 15; 8, с. 5, мал. 18–21; 5, с. 280; 6, с. 38–39; 9, с. 181; 10; 11, с. 321][1].

Падчас даследаванняў 2012 г., якія вяліся ў далі-не Нёмана на поўнач ад вёскі – на ўчастку ад рэчкі Залужка да аўтамагістралі М1, – аўтарамі вырашаліся наступныя задачы: 1) удакладненне лакалізацыі і вызначэнне сучаснага стану ўжо вядомых пунктаў; 2) пошук новых стаянак каменнага і бронзавага вякоў; 3) выкананне разведачных земляных работ на паселішчах Дразды-9 і Дразды-12.

Работы праводзіліся ў некалькі этапаў. Вясеннія выезды былі арганізаваныя па ініцыятыве і ажыццяўляліся сумесна з М. М. Чарняўскім. Летам даследаванні адбываліся ў межах правядзення археалагічнай практыкі студэнтаў гістарычнага факультэта БДУ. У восеньскіх разведках прымаў удзел аспірант інстытута гісторыі НАН Беларусі Аляксандр Вашанаў. У выніку археалагічныя работы былі праведзены на 14 першабытных помніках.

Дразды-1. *Стаянка каменнага – бронзавага вякоў, селішча жалезнага веку (?).* Праз 1,1–1,2 км на поўнач ад жывёлагадоўчага комплексу вёскі, на палявой дарозе, якая ідзе ўздоўж заходняга берага старыцы па краі нізкай левабярэжнай тэрасы, на ўчастку даўжынёй каля 250 м сустракаюцца крамянёвыя вырабы. Паводле М. М. Чарняўскага, на гэтым месцы «у 1960 г. Л. Д. Побаль сабраў расшчэпленыя крэмені і кераміку жалезнага веку» [11, с. 321]. Сам М. М. Чарняўскі праводзіў паверхневыя зборы на помніку ў 1981 г. [2, с. 18]. У 2012 г. аўтарамі было знойдзена 9 крамянёвых артэфактаў (гл. табліцу), два з якіх – пласціна са струменістай рэтушшу і незавершаны наканечнік стралы з біфацыяльнай апрацоўкай (мал. 2: *1*) – датаваны перыядам неаліту–ранняга бронзавага веку.

Дразды-8. *Стаянка каменнага веку.* Праз 0,65 км на поўнач ад жывёлагадоўчага комплексу вёскі, на паўднёвым выступе нізкай левабярэжнай тэрасы, пад лініяй электраперадачы, на плошчы 60 × 30 м сустракаюцца крамянёвыя артэфакты. Згодна з М. М. Чарняўскім, які абследаваў гэты ўчастак у 2003 г. [4, с. 6, мал. 9, 10: *А*, 16: 7], помнік быў выяўлены Л. Д. Побалем у 1950-я гады [10, с. 312; 11, с. 321]. У 2012 г. былі знойдзеныя 33 крамянёвыя вырабы (гл. табліцу), два з якіх – праксімальны мікраразец (мал. 2: *6*) і 3 фрагменты рэгулярных пласцін з «ужытковай» рэтушшу па краях – адносяцца да эпохі мезаліту.

Дразды-9. *Стаянка каменнага–бронзавага вякоў.* Помнік плошчай каля 70 × 50 м размешчаны праз 0,8 км на паўночны захад ад жывёлагадоўчага комплексу вёскі, на паўночным выступе нізкай



Мал. 1. Археалагічныя помнікі, вядомыя ў ваколіцах вёскі Дразды Стаўбцоўскага раёна. (Нумары на карце адпавядаюць нумарацыі помнікаў.)

[1] У ранейшых справаздачах і публікацыях М. М. Чарняўскага назіраецца непаслядоўнасць у іх нумарацыі. У сувязі з гэтым звесткі пра выяўленыя да 2012 г. археалагічныя аб'екты былі сістэматызаваны, іх нумарацыя ўпарадкавана, і падрабязная інфармацыя з поўнай бібліяграфіяй па гэтым пытанні змешчана ў палявой справаздачы В. У. Ашэйчыка за 2012 г. [1].

Археалагічныя помнікі ў ваколіцах в. Дразды. Даследаванні 2012 г.
Агульная структура археалагічных калекцый

Марфалагічная група*	Катэгорыя	Дразды-1	Дразды-8	Дразды-9				Дразды-12	Дразды-14	Дразды-15	Дразды-17	Дразды-20	Дразды-21
				Паверхневыя зборы	Шурф	Свідравіны.	Разам						
0	Канкрэцыі і іх фрагменты	–	–	–	1	–	1	10	–	–	–	–	–
	Крамянёвыя абломкі	–	–	–	–	–	–	605	–	9	–	–	1
I	Абломкі з адзінкавымі сколамі	–	–	–	1	1	2	–	–	–	–	–	–
	Нуклеусы і іх фрагменты	–	–	–	2	–	2	7	1	–	–	1	1
	Лушчні	–	–	–	–	–	–	1	–	–	–	1	–
	Рабрыстыя пласціны і іх фрагменты	–	1	1	2	1	4	4	–	–	–	–	–
II	Пласціны і іх фрагменты	–	3	3	56	2	61	179	–	1	2	4	1
	Адшчэпы і іх фрагменты	5	18	10	267	29	306	452	9	9	3	7	15
	Лускавінкі	–	–	2	68	34	104	146	1	–	1	–	3
	Неазначальныя фрагменты сколаў	1	4	4	79	27	100	917	1	–	–	–	–
III	Наканечнікі стрэл і іх фрагменты	1	–	–	1	–	1	2	–	–	–	–	–
	Мікраліты і іх фрагменты	–	–	–	2	–	2	12	–	–	–	–	1
	Разцы і іх фрагменты	–	–	–	1	–	1	2	–	–	–	–	–
	Скрабкі і іх фрагменты	–	–	–	3	–	3	3	–	–	–	–	–
	Скрабачы і іх фрагменты	–	–	–	–	–	–	1	–	1	–	–	1
	Скрэблы і іх фрагменты	–	–	–	1	–	1	–	–	–	–	–	–
	Серпападобныя нажы	–	–	–	1	–	1	–	–	–	–	–	–
	Праколкі	–	–	–	1	–	1	4	–	–	–	–	–
	Выемчатыя прылады	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–	1	1
	Камбінаваныя прылады	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–	–	1
	Тэхнічныя формы з рэтушшу	–	–	–	1	–	1	–	–	1	–	–	–
	Пласціны і іх фрагменты з рэтушшу	1	4	–	4	1	5	13	–	1	–	1	–
	Адшчэпы і іх фрагменты з рэтушшу	1	1	–	1	2	3	6	–	–	–	2	2
	Крамянёвыя абломкі з рэтушшу	–	–	–	–	–	–	4	–	–	–	2	–
	Нявызначаныя вырабы (фрагменты)	–	–	–	–	–	–	8	–	–	–	–	–
IV	Мікраразцы	–	1	–	2	–	2	1	–	–	–	–	–
	Разцовыя сколы	–	1	–	1	–	1	1	–	–	–	–	–
К	Ляпная кераміка (фрагменты)	–	–	–	9	–	9	327	1	–	–	–	–
	Ганчарная кераміка (фрагменты)	–	–	1	15	–	16	34	1	8	2	–	–
	Керамічны друз (фрагменты)	–	–	–	2	7	9	2185	–	–	–	–	–
Ін	Гліняныя вырабы і іх фрагменты	–	–	–	–	–	–	2	–	–	–	–	–
	Кафля (фрагменты)	–	–	–	–	–	–	5	–	–	–	–	–
	Металічныя вырабы і іх фрагменты	–	–	–	–	–	–	6	–	–	–	–	–
	Косткі (фрагменты)	–	–	–	–	–	–	8	–	–	–	–	–
	Усяго:	9	33	21	521	104	646	4946	14	30	8	19	27

* 0 – сыравіна без апрацоўкі; I – нуклеусы і тэхнічныя формы, звязаныя з іх падрыхтоўкай і эксплуатацыяй; II – прадукты дэбітажу; III – марфалагічныя прылады; IV – характэрныя адыходы ад вытворчасці прылад; К – кераміка; Ін – іншыя катэгорыі знаходак.

левабярэжнай нёманскай тэрасы, на ўсходняй ускраіне лесу.

Паводле інфармацыі М. М. Чарняўскага, помнік быў адкрыты Л. Д. Побалем у канцы 1950-х гадоў [10, с. 312]. У 2003 г. М. М. Чарняўскі абследаваў стаянку і заклаў шурф памерамі 0,5 × 1,0 м, у якім зафіксаваў наяўнасць культурнага слоя магутнасцю да 0,4 м і выявіў нешматлікія крамянёвыя артэфакты [4, с. 6, мал. 9, 10, *Б*].

Праграма даследаванняў 2012 г. уключала ў сябе паверхневыя зборы на незадзірванелых участках помніка, разведачнае свідраванне і шурфоўку.

Сістэматычныя зборы з фіксацыяй матэрыялу ажыццяўляліся ў межах сеткі квадратаў памерамі 10 × 10 м.

Разведачнае свідраванне праводзілі з мэтай атрымання стратыграфічных калонак для тэрыторыі помніка; выяўлення патэнцыяльных канцэнтрацый археалагічнага матэрыялу і, на падставе гэтага, – вызначэння месцаў, перспектыўных для раскопак. У паўночнай частцы выступу тэрасы на плошчы каля 400 м^2 з дапамогай геалагічнага свідра было зроблена 40 свідравін, якія закладаліся паводле прынцыпу сістэматычнай выбаркі. Глыбіня свідравін дасягала 0,37 м – 0,64/0,74 м. У працэсе свідравання выявіліся непрадугледжаныя цяжкасці: 1) свідраванне на жвіровай глебе аказалася вельмі працаёмкім; 2) структурныя асаблівасці глебы не дазволілі, як папярэдне планавалася, скласці дакладныя стратыграфічныя профілі помніка; 3) знаходкі, выяўленыя ў свідравінах, былі параўнальна малалікімі. У межах даследаванай плошчы яны размяркоўваліся нераўнамерна, у сувязі з чым выразныя канцэнтрацыі артэфактаў зафіксаваныя не былі.

У межах адной з умоўных канцэнтрацый знаходак, размешчанай у цэнтральнай частцы стаянкі, быў закладзены шурф памерамі 1 × 6 м. Яго разборка была скончана на узроўні 0,65–0,7 м ад дзённай паверхні. Зафіксавана наступная стратыграфія: гумусаваны апясчанены жвір шэрага колеру магутнасцю ад 0,15 да 0,4 м; жвір жоўта-рудага адцення, які на глыбіні 0,55–0,62 м падсцілаўся бела-жоўтым дробназярністым пяском. Знаходкі сустракаліся на глыбіні да 0,6 м, аднак асноўная колькасць артэфактаў была сканцэнтравана на ўзроўні да 0,3 м.

У выніку даследаванняў 2012 г. на помніку атрымана калекцыя, якая налічвае 612 крэменяў і 34 фрагменты керамікі (гл. табліцу).

На падставе тэхніка-марфалагічнага аналізу прылад і характэрных адыходаў ад іх вытворчасці (мал. 2: *11–20*) у існаванні першабытнага паселішча Дразды-9 былі вылучаны тры асноўныя культурна-храналагічныя гарызонты:

фінальны палеаліт (свідэрская культура) – прадстаўлены наканечнікам стралы на пласціне са слабавылучаным чаранком, аформленым паўстромкай рэтушшу па краях і плоскай рэтушшу з брушка (мал. *2: 11*);

мезаліт – гэтым часам датаваны мікраліты з прытупленым краем (мал. 2: *13, 14*) і 2 мікраразцы (мал. 2: *15, 18*);

позні неаліт–ранні бронзавы век – вызначаны па наяўнасці ў калекцыі серпападобнага нажа на вялікім пласціністым адшчэпе (мал. 2: *17*).

Да апошняга са згаданых перыядаў адносяцца і 9 фрагментаў ляпнога посуду з мінеральнымі дамешкамі ў цесце. Кругавая кераміка, знойдзеная на помніку, датаваны познім сярэдневякоўем–Новым часам.

Дразды-11. *Стаянка каменнага веку.* Праз 2,5 км на паўночны захад ад вёскі і праз 0,75 км на паўднёвы ўсход ад моста праз Нёман, на палявой дарозе ўздоўж краю тэрасы, ва ўрочышчы Перцы, на ўчастку даўжынёй каля 200 м сустракаюцца крамянёвыя артэфакты. Стаянка была выяўлена і абследавана М. М. Чарняўскім у 2005 г. [7, с. 7, мал. 3: *9*, мал. 14][1]. У 2012 г. помнік быў паўторна агледжаны аўтарамі, збор пад'ёмнага матэрыялу не праводзілі.

Дразды-12*. Стаянка каменнага–бронзавага вякоў, паселішча жалезнага веку.* Помнік знаходзіцца праз 2,9 км на паўночны захад ад вёскі Дразды і праз 2 км на паўднёвы ўсход ад вёскі Суднікі, праз 0,6 км на паўднёвы ўсход ад шашы М1. Паселішча размешчана ў левабярэжжы Нёмана, у паўночным прывусці невялікага левага прытока, на задзірванелай поплаўнай дзюне памерамі каля 55 × 45 м. Помнік быў выяўлены ў 2005 г. М. М. Чарняўскім [7, с. 7–8; 9, с. 181][2].

У 2012 г. у цэнтральнай частцы дзюны аўтары разбілі шурф плошчай 20 м^2. Раскопкі вяліся натуральнымі і механічнымі пластамі; пачынаючы з узроўню пласта 3, усе выяўленыя знаходкі фіксаваліся ў трохмернай сістэме каардынат. У шурфе, які даследаваўся на глыбіні да 0,85 м, была прасочана наступная стратыграфія: пласт дзярніны і глебавага покрыва магутнасцю 0,05–0,08 м; слой цёмна-шэрага дробназярністага гумусаванага супеску таўшчынёй да 0,3–0,5 м; слой буйназярністага супеску жоўтага колеру магутнасцю 0,1–0,2 м, які падсцілаўся шчыльным белым пяском.

Падчас раскопак было выяўлена 2378 крамянёвых артэфактаў і 2546 фрагментаў керамікі (гл. таб-

[1] У справаздачы даследчыка стаянка прывязана да вёскі Суднікі Старасвержанскага с/с і мае назву «паўднёва-ўсходняе (правае) прывусце». Улічваючы, што помнік знаходзіцца каля в. Дразды, і па прапанове М. М. Чарняўскага (гл. таксама [11, с. 321]), мы падаем прывязку да Драздоў.

[2] У справаздачы даследчыка стаянка мае назву «Суднікі. Паўночна-заходняе (левае) прывусце». Пазней у справаздачным артыкуле М. М. Чарняўскі даў помніку новую назву – «Дразды-12» [11, с. 321].



Мал. 2. Крамянёвыя вырабы (*1–20*): *1* – Дразды-1; *2, 3* – Дразды-15; *4, 5* – Дразды-21; *6* – Дразды-8; *7, 8, 10* – Дразды-20; *9* – Дразды-22; *11–20* – Дразды-9. 2012 г. Малюнак А. У. Зуевай

ліцу; мал. 3). Знаходкі сустракаліся на ўсіх узроўнях, аднак асноўная частка калекцыі была атрымана на глыбіні да 0,45–0,50 м.

Агульная структура крамянёвага інвентару адлюстравана ў табліцы. На падставе тэхніка-марфалагічнага аналізу матэрыялаў былі вылучаны тры культурна-храналагічныя гарызонты:

ранні мезаліт (кундская культура) – прадстаўлены фрагментам чаранковага наканечніка стралы (мал. 3: *23*);

позні мезаліт (яніславіцкая культура) – у калекцыі выяўлены яніславіцкае вастрыё (мал. 3: *11*), фрагменты яніславіцкіх трохвугольнікаў (мал. 3: *13, 14*), пласціны з прытупленым краем (мал. 3: *16–19*), мікраразец (мал. 3: *12*), скрабач (мал. 3: *20*), серыя рэгулярных пласцін і іх фрагментаў, неапрацаваных і з апрацоўкай (мал. 3: *21–22*).

позні неаліт–ранні бронзавы век – гэтым часам датаваны фрагмент трохвугольнага наканечніка стралы (мал. 3: *15*) і адшчэп са шліфаванай спінкай (мал. 3: *24*).

З 2546 фрагментаў посуду, выяўленых на помніку, толькі 361 фрагмент быў прыдатны для ідэнтыфікацыі. У калекцыі вылучаны наступныя комплексы:

прыпяцка-нёманская культура (22 фрагменты, з іх 2 арнаментаваныя);

нёманская культура – прадстаўленая матэрыяламі лысагорскага (16 фрагментаў керамікі, з іх 8 арнамен-



Мал. 3. Кераміка (*1–7, 9, 10*), крамянёвыя вырабы (*11–24*), гліняная пацерка (*8*). *1–24* – Дразды-12. 2012 г. Малюнак А. У. Зуевай

таваныя, (мал. 3: *6*) і дабраборскага (98 фрагментаў, з іх 13 арнаментаваныя, (мал. 3: *1, 5*) этапаў;

кола культуры шнуравой керамікі – ідэнтыфікаваныя 9 фрагментаў посуду, з іх 4 арнаментаваныя (мал. 3: *2–4*);

жалезны век – было выяўлена 140 фрагментаў (у тым ліку 2 арнаментаваныя) гладкасценнага посуду, які адносіцца да ранняга жалезнага веку (мал. 3: *10*). Штрыхаваная кераміка, прадстаўленая 16 фрагментамі, адносіцца да позніх этапаў культуры штрыхаванай керамікі / культуры позняй штрыхаванай керамікі (мал. 3: *7*). На помніку знойдзены таксама развал гаршка (15 фрагментаў), які датаваны трэцяй чвэрцю 1-га тысячагоддзя н. э. і можа быць звязаны з банцараўскай культурай (мал. 3: *9*).

Кругавая кераміка датавана познім сярэдневякоўем–Новым часам.

Акрамя крамянёвых артэфактаў і керамікі падчас шурфоўкі было атрымана каля 20 іншых знаходак (гл. табліцу), у тым ліку гліняная пацерка (мал. 3: *8*).

Такім чынам, у выніку даследаванняў 2012 г. былі вылучаны дзевяць этапаў засялення тэрыторыі помніка Дразды-12, якія ахопліваюць час ад ранняга мезаліту да позняга сярэдневякоўя–Новага часу.

Дразды-14. *Стаянка каменнага веку.* Помнік размешчаны праз 0,15 км на ўсход ад паўночна-ўсходняй ускраіны вёскі, на мысе нізкай левабярэжнай тэрасы, які з захаду абмежаваны каналізаваным рэчышчам рэчкі Залужка, а з усходу – поплавам Нёмана. У выкідах з кратавін знойдзены нешматлікі пад'ёмны матэрыял (гл. табліцу), у тым ліку дробны фрагмент пасудзіны нёманскай культуры.

Дразды-15. *Стаянка каменнага веку, месцазнаходжанне кругавой керамікі.* Праз 0,7 км на поўнач

ад жывёлагадоўчага комплексу вёскі і праз 0,18 км на ўсход ад пункта Дразды-8, на паўночнай ускраіне поплаўнай дзюны, амаль цалкам выбранай кар'ерам, на раздуве плошчай каля 30 × 30 м сабрана 30 артэфактаў (гл. табліцу), два з якіх – скрабач (мал. 2: *2*) і ўкладыш з сячэння рэгулярнай пласціны (мал. 2: *3*) – датаваны эпохай мезаліту.

Дразды-16. *Стаянка каменнага – бронзавага вякоў.* Праз 0,6 км на поўнач ад жывёлагадоўчага комплексу вёскі і праз 0,3 км на ўсход ад пункта Дразды-8, на левабярэжным поплаве Нёмана зна-ходзіцца авальная дзюна памерамі 100 × 50 м, на незадзірванелых участках якой былі знойдзены скрабач на адшчэпе, рабрыстая пласціна і адшчэп. У паўднёва-заходняй частцы дзюны быў закладзены шурф плошчай 1 × 1 м, у якім атрыманы адзін фрагмент керамікі неаліту – ранняга бронзавага веку і адна выліваная круглая куля (XVIII–XIX стст.).

Дразды-17. *Стаянка каменнага веку, месцазнаходжанне кругавой керамікі.* Помнік размешчаны праз 0,55 км на поўнач ад жывёлагадоўчага комплексу вёскі і праз 0,05 км на поўдзень ад пункта Дразды-8, на невялікім павяшэнні на краі левабярэжнай нізкай нёманскай тэрасы. На плошчы каля 90 × 40 м быў сабраны нешматлікі пад'ёмны матэрыял (гл. табліцу).

Дразды-18. *Месцазнаходжанне крамянёвых артэфактаў.* Праз 1 км на поўнач ад жывёлагадоўчага комплексу вёскі і праз 0,2 км на поўнач ад пункта Дразды-8, на палявой дарозе, якая ідзе ўздоўж лесу і краю тэрасы, знойдзены 2 крамянёвыя адшчэпы.

Дразды-19. *Месцазнаходжанне крамянёвага артэфакта.* Праз 1,75 км на паўночны захад ад жывёлагадоўчага комплексу вёскі, на грунтовай дарозе, якая ідзе ўздоўж краю тэрасы і ў гэтым месцы праходзіць праз ускраек лесу, знойдзены двухгранны разец на нуклеападобным абломку. Выраб датаваны фінальна-палеалітычным – мезалітычным часам.

Дразды-20. *Стаянка каменнага веку.* Праз 1,8 км на паўночны захад ад жывёлагадоўчага комплексу вёскі і праз 0,55 км на паўночны захад ад пункта Дразды-1, у месцы рэзкага выгіну тэрасы, на ўчастку даўжынёй каля 60 м сустракаецца расшчапаны крэмень. Сярод артэфактаў, сабраных у 2012 г. (гл. табліцу), вылучаны вырабы ранняга мезаліту (мал. 2: *10*), позняга мезаліту–неаліту (мал. 2: *8*), неаліту–бронзавага веку (мал. 2: *7*).

Дразды-21. *Стаянка каменнага веку.* Праз 1,8 км на паўночны захад ад жывёлагадоўчага комплексу вёскі і праз 0,12 км на паўднёвы захад ад пункта Дразды-20, на лясной дарозе ўздоўж краю тэрасы на ўчастку даўжынёй каля 150 м сустракаюцца крамянёвыя знаходкі. Частка артэфактаў, сабраных у 2012 г. (гл. табліцу), высокая трапецыя (мал. 2: *4*), укладыш (мал. 2: *5*), камбінаваная прылада (разец + скрэбла), скрабач, – датаваны мезалітычным часам.

Дразды-22. *Месцазнаходжанне крамянёвых артэфактаў.* Праз 1,75 км на паўночны захад ад жывёлагадоўчага комплексу вёскі і праз 0,6 км на паўночны захад ад аздараўленчага лагера імя Я. М. Чайкі, на лясной палянцы на краі тэрасы былі знойдзены канцавы скрабок на пласціне (мал. 2: *9*) і адшчэп.

Такім чынам, у выніку разведак, праведзеных у 2012 г. у ваколіцах в. Дразды, было выяўлена 9 новых археалагічных помнікаў каменнага і бронзавага вякоў (Дразды-14 – Дразды-22). Акрамя таго, былі паўторна агледжаны пяць раней вядомых помнікаў, а два з іх – Дразды-9 і Дразды-12 – даследаваны шляхам свідравання і шурфоўкі.

Літаратура

1. Ашэйчык, В. У. Справаздача аб археалагічных разведках на Панямонні ў 2012 г. / В. У. Ашэйчык// ААНД ДНУ «Ін-т гісторыі НАН Беларусі».

2. Чарняўскі, М. Справаздача аб археалагічных даследаваннях Нёманскага неалітычнага атрада ў 1981 годзе / М. Чарняўскі // ААНД ДНУ «Ін-т гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 724. – 39 с.

3. Чарняўскі, М. Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях у 2001 годзе / М. Чарняўскі // ААНД ДНУ «Ін-т гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 1930. – 67 с.

4. Чарняўскі, М. М. Справаздача аб археалагічных даследаваннях у Паўночна-Заходняй Беларусі ў 2003 годзе / М. М. Чарняўскі // ААНД ДНУ «Ін-т гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 2091. – 66 с.

5. Чарняўскі, М. М. Археалагічныя даследаванні ў паўночна-заходняй Беларусі ў 2003 г. / М. М. Чарняўскі // Гіст.-археалаг. зб. – Мінск, 2004. – № 19. – С. 280.

6. Чарняўскі, М. М. Археалагічныя помнікі Стаўбцоўскага раёна / М. М. Чарняўскі // Памяць : гіст.-дакумент. хроніка Стаўбцоўскага раёна / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2004. – С. 38–43.

7. Чарняўскі, М. М. Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях у басейнах Нёмана, Віліі і Дзвіны ў 2005 г. / М. М. Чарняўскі // ААНД ДНУ «Ін-т гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 2270. – 67 с.

8. Чарняўскі, М. М. Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях на тэрыторыі Стаўбцоўскага, Вілейскага, Мядзельскага і Бешанковіцкага р-наў у 2006 г. / М. М. Чарняўскі // ААНД ДНУ «Ін-т гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 2387. –74 с.

9. Чарняўскі, М. М. Археалагічныя работы ў басейнах Нёмана, Дзвіны і Віліі / М. М. Чарняўскі // Гіст.-археалаг. зб. – Мінск, 2006. – № 21. – С. 181–182.

10. Чарняўскі, М. М. Дразды / М. М. Чарняўскі // Археалогія Беларусі : энцыкл. : у 2 т. – Мінск : БелЭН імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1 : А–К / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – С. 312–313.

11. Чарняўскі, М. М. Даследаванні на Панямонні і Падзвінні ў 2011 г. / М. М. Чарняўскі // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – Вып. 24. – С. 319–322.

Резюме

В. В. Ашейчик, А. В. Зуева

Археологические исследования около деревни Дрозды Столбцовского района в 2012 году

Представлены предварительные результаты полевых работ 2012 г. в левобережье верхнего Немана около деревни Дрозды. В ходе разведок было обследовано пять ранее известных и выявлено девять новых памятников первобытной эпохи. На двух памятниках проведены более масштабные земляные работы. В результате разведочного бурения и шурфовки (6 м^2) на поселении Дрозды-9 получены материалы финального палеолита, мезолита, позднего неолита–раннего бронзового века. Материалы из пробных раскопок (20 м^2) на поселении Дрозды-12 позволяют выделить в существовании последнего девяти культурно-хронологических горизонтов в мезолите (кундская и яниславицкая культуры), неолите (припятско-неманская и неманская культуры, круг культур шнуровой керамики), железном веке (начальные периоды раннего железного века, культура поздней штрихованной керамики, банцеровская культура) и позднем средневековье–Новом времени.

Summary

V. V. Asheichyk, A. V. Zuyeva

Archaeological Investigations near Drazdy village in Staubcy District in 2012

The article deals with the preliminary results of archaeological investigations conducted by the authors in the upper course of Nioman river in 2012. During surface surveys we explored 5 previously known prehistoric sites and revealed 9 new ones. Exploratory drilling and test excavation (6 m2) was conducted on Drazdy-9 settlement. Here we obtain materials of the Terminal Palaeolithic, the Mesolithic and the Neolithic/Early Bronze Age periods. The materials from test excavations (20 sq. m) indicate 9 cultural and chronological horizons (from the Early Mesolithic to the Late Middle Ages/the Early Modern Period) on Drazdy-12 settlement.

Паступіў 18.09.2013 г.

УДК 902.21(476.6)

В. У. Ашэйчык, *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, аспірант, магістр гістарычных навук (г. Мінск, Беларусь);*
А. У. Зуева, *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, старшы выкладчык, кандыдат гістарычных навук (г. Мінск, Беларусь)*

Археалагічныя разведкі на тэрыторыі Лідскага раёна ў 2012 годзе

Восенню 2012 г. аўтары праводзілі разведкі ў правабярэжнай частцы басейна р. Дзітва[1]. Асноўная ўвага была звернута на археалагічнае вывучэнне ваколіц вёсак Ганчары і Даржы Ганчарскага с/с, Вялікія Канюшаны і Агароднікі Тарноўскага с/с Лідскага раёна Гродзенскай вобласці (мал. 1). Задачы даследаванняў заключаліся: 1) ва ўдакладненні лакалізацыі і вызначэнні сучаснага стану ўжо вядомых пунктаў; 2) у пошуку новых помнікаў каменнага і бронзавага вякоў.

Вёска Агароднікі, Тарноўскі сельсавет

Агароднікі-1. *Стаянка каменнага–бронзавага вякоў.* Знаходзіцца праз 1,4 км на паўночны ўсход ад вёскі, на тэрасе р. Дзітва, праз 0,15 км на захад ад каналізаванага рэчышча яе невялікага прытоку. Стаянка была выяўлена М. М. Чарняўскім у 2002 г. [5, с. 23, мал. 27: *1*, мал. 36; 6, с. 256]. У 2012 г. на ўчастку памерамі каля 100 × 50 м былі знойдзены шэсць крамянёвых адшчэпаў і адна пласціна з захлыстам.

Агароднікі-2. *Месцазнаходжанне крамянёвых артэфактаў.* Праз 1,5 км на ўсход ад вёскі і праз 0,14 км на поўдзень ад пункта Агароднікі-1, на краі надтэраснага вала, пад лініяй электраперадачы захаваліся рэшткі хутара памерамі каля 70 × 50 м. Тут, на невялікіх раздувах, былі знойдзены два крамянёвыя адшчэпы.

Вёска Вялікія Канюшаны, Тарноўскі сельсавет

Вялікія Канюшаны-1. *Стаянка каменнага веку.* Знаходзіцца праз 1,45 км на паўночны ўсход ад вёскі, на выступе нізкай правабярэжнай тэрасы р. Дзітва. Помнік быў выяўлены М. М. Чарняўскім у 2002 г. [5, с. 23, мал. 27: *5*]. У 2012 г. у выкідах з кратавін на ўскрайку лесу былі знойдзеныя 6 крамянёвых адшчэпаў.

Вялікія Канюшаны-2. *Стаянка каменнага веку.* Размешчана праз 1,5 км на паўночны ўсход ад вёскі і праз 0,3 км на паўночны захад ад папярэдняга пункта, на наступным выступе той жа тэрасы, на павышэнні, перарэзаным лясной дарогай. Помнік быў выяўлены М. М. Чарняўскім у 2002 г. [5, с. 23, мал. 27: *4*, мал. 34]. У 2012 г. на агаленнях сцежкі на ўскрайку лесу былі знойдзеныя 3 фрагменты крамянёвых пласцін і 6 адшчэпаў.

Вялікія Канюшаны-3. *Месцазнаходжанне крамянёвых артэфактаў.* Знаходзіцца праз 1,5 км на паўночны ўсход ад вёскі, праз 0,65 км на паўночны захад ад пункта 2, на выступе тэрасы, на ўсход ад лініі газаправода і газавай падстанцыі. Помнік выявіў М. М. Чарняўскі ў 2002 г. На разорынах свежай лесапасадкі па самым краі хвойніку ён сабраў некалькі апрацаваных крэменяў [5, с. 23, мал. 27: *2*, мал. 35]. У 2012 г. падчас паўторнага агляду помніка артэфакты не былі выяўлены.

Вялікія Канюшаны-4. *Крэмнездабыўныя выпрацоўкі і крэмнеапрацоўчыя майстэрні.* Помнік, размешчаны на ўсходнім крэйдавым адорвені, які знаходзіцца праз 0,8 км на паўночны ўсход ад в. Вялікія Канюшаны і на паўднёвы захад ад поля каля в. Даржы, выявіў у 2002 г. М. М. Чарняўскі [5, с. 23–24, мал. 27: *3*; мал. 38–41; 6, с. 256]. У 2004 г. даследчык зачысціў «крэйдавую сценку на паўночным краі паўночна-ўсходняга кута кар'ера» і сабраў нешматлікія крамянёвыя артэфакты [7, с. 15–16, мал. 31–39; 8, с. 217; 9, с. 187–189, мал. 2: *3*, мал. 3–7]. Аўтарамі была зроблена спроба лакалізаваць пункт, зафіксаваны М. М. Чарняўскім. Аднак у сувязі з тым, што адорвень быў распрацаваны вялікай колькасцю кар'ераў, праведзеныя працы станоўчых вынікаў не далі.

У 2012 г. на гэтым адорвені быў выяўлены помнік ***Вялікія Канюшаны-4А.*** На стромкім схіле кар'ера ў паўночнай частцы адорвеня знойдзены фрагмент крамянёвай пласціны і сем адшчэпаў.

Вялікія Канюшаны-5. *Стаянка і крэмнеапрацоўчая майстэрня каменнага веку.* Размешчаны на так званым паўночным адорвені, які знаходзіцца праз 1 км на паўночны ўсход ад вёскі, праз 0,45 км на паўночны захад ад усходняга кар'ера, на полі. Помнік быў зафіксаваны ў 2004 г. М. М. Чарняўскім [7, с. 16, мал. 31; 8, с. 217; 9, с. 188, мал. 2: *2*]. У 2012 г. знаходкі не былі выяўлены.

Вялікія Канюшаны-6. *Стаянка каменнага веку і месцазнаходжанне кругавой керамікі.* На ворным полі, якое размешчана праз 1 км на паўночны ўсход ад вёскі, на ўсход ад паўночнага крэйдавага кар'ера (пункт 5), на ўчастку памерамі каля 400 × 200 м сустракаецца шматлікі пад'ёмны матэрыял. У 2012 г. тут сабрана 69 крамянёвых артэфактаў (3 нуклеусы

[1] Выказваем сваю ўдзячнасць трэцяму ўдзельніку экспедыцыі – студэнту гістфака Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Яўгену Солтысу.

Мал. 1. Археалагічныя помнікі, абследаваныя ў 2012 г.: А – Агароднікі; Г – Ганчары; Д – Даржы; К – Вялікія Канюшаны. (Нумары на карце адпавядаюць нумарацыі помнікаў.)

ад адшчэпаў, 1 нуклеус ад пласцін, 2 лушчні, 2 рабрыстыя пласціны, 3 сколы з захлыстам, 9 пласцін і іх фрагментаў, 44 адшчэпы і іх фрагменты, 3 неазначальныя фрагменты сколаў, 2 рэтушаваныя адшчэпы), а таксама 6 неарнаментаваных фрагментаў кругавога посуду.

Вялікія Канюшаны-7. *Месцазнаходжанне крамянёвага артэфакта*. Праз 1,4 км ад вёскі і праз 0,1 км на паўночны ўсход ад пункта 6, на лясной дарозе быў знойдзены двухпляцовачны нуклеус ад пласцін, які датаваны эпохай фінальнага палеаліту.

Вялікія Канюшаны-8. *Месцазнаходжанне крамянёвага артэфакта.* Праз 1,55 км ад вёскі і праз 0,25 км на паўночны ўсход ад пункта 6, на лясной дарозе знойдзены шматпляцовачны нуклеус ад адшчэпаў.

Вялікія Канюшаны-9. *Месцазнаходжанне крамянёвых артэфактаў.* У 2010 г. М. М. Чарняўскі адзначаў, што ў кар'еры, якім быў выбраны так званы заходні адорвень, размешчаны праз 0,4 км на паўночны ўсход ад вёскі, крамянёвыя артэфакты не сустракаліся [9, с. 188]. Падчас разведак 2012 г. у гэтым моцна зарослым кар'еры знаходкі таксама не былі выяўлены. Аднак на полі, размешчаным з паўночна-ўсходняга боку кар'ера, былі знойдзены рабрысты скол і адшчэп.

У ваколіцах вёскі Вялікія Канюшаны – на крэйдавых адорвенях і на разараных участках паміж імі – сустракаецца вялікая колькасць неапрацаванага крэменю. Канкрэцыі пакрыты зямліста-мучністымі і парцэлянападобнымі скарынкамі. Частка крэменяў мае аднародную тэкстуру (колер крамянёвай масы чорны, цёмна- ці светла-шэры). Сустракаюцца крэмені занальнай тэкстуры (светла-шэрае ядро канкрэцыі акружана чорнай масай таўшчынёй да 5 см). Некаторыя жаўлакі маюць пустоты, украпіны крэйды ці крэменязёму.

Вёска Ганчары, цэнтр сельсавета

Ганчары-1, ур. Ціхановічаў Брод. *Стаянка каменнага веку.* Знаходзіцца праз 1,5 км на паўночны ўсход ад в. Ганчары, на краі правабярэжнай тэрасы р. Дзітва. Помнік выяўлены і часткова даследаваны М. М. Чарняўскім у 1962 г. У раскопе плошчай 38 м^2 быў атрыманы крамянёвы і керамічны матэрыял мезалітычнага і неалітычнага часу [10, с. 15, табл. 9: *6–11, 13, 14*, табл. 10; 4, с. 23–24, рыс. 21: *12–20*]. На момант абследавання 2012 г. тэрыторыя стаянкі была задзірванелая, часткова зарослая лесам і хмызняком. На ўчастку даўжынёй каля 150 м – у выкідах з рабаўніцкіх ям і кратавін – знойдзены два крамянёвыя адшчэпы і чатыры фрагменты кругавога посуду.

Ганчары-7. *Месцазнаходжанне крамянёвых артэфактаў і кругавой керамікі.* Размешчана праз 1,25 км на паўночны ўсход ад вёскі, на невысокім павышэнні правабярэжнай тэрасы р. Дзітва. На плошчы памерамі 130 × 50 м у выкідах з кратавін былі выяўлены фрагмент пласціны, лускавінка і тры фрагменты кругавога посуду.

Ганчары-8. *Месцазнаходжанне крамянёвых артэфактаў і кругавой керамікі.* Знаходзіцца праз 0,7 км на поўнач ад вёскі, на заходні бок ад асфальтавай шашы, насупраць невялікага лесу. Тут, на ворным полі, на плошчы памерамі 350 × 150 м сабраны нешматлікі пад'ёмны матэрыял: два нуклеусы ад адшчэпаў, нарыхтоўка біфацыяльнага вырабу, фрагмент пласціны, шэсць адшчэпаў і іх фрагментаў, два фрагменты позняга кругавога посуду.

Вёска Даржы, Ганчарскі сельсавет

Даржы-1. *Стаянка каменнага і бронзавага вякоў.* Знаходзіцца на краі правага берагу р. Дзітва,

на захад ад моста, праз 40 м на захад ад шашы М11/Е85, адразу на поўнач ад ільнозавода ААТ «Лідлён». Помнік быў выяўлены М. М. Чарняўскім у 1962 г. [10, с. 14]. У 1998 г. яго абследаваў В. Л. Лакіза [2, с. 13, мал. 3, 4: *14–16*, фота 4], у 2003 г. – В. Л. Лакіза сумесна з В. С. Абухоўскім [1, с. 8, мал. 15, 16: *3*]. У выніку разведак 2012 г. выяўлена, што тэрыторыя стаянкі інтэнсіўна падмываецца ракой. На адхоне абрыву і на палявой дарозе ўздоўж ракі на ўчастку даўжынёй 150 м быў сабраны пад'ёмны матэрыял. Калекцыя крамянёвых артэфактаў уключае бакавы рэтушны разец (мал. 2: *3*), дзве цёслы (мал. 2: *4*), 14 адшчэпаў і іх фрагментаў, лускавінку, дробны неазначальны крамянёвы абломак. Ляпная кераміка прадстаўлена фрагментам нелітычнай пасудзіны, трыма фрагментамі керамікі тшцінецкага культурнага кола (мал. 2: *1*), фрагментам посуду эпохі позняй бронзы. Знойдзены таксама тры фрагменты позняй кругавой керамікі.

Даржы-4, ур. Боркава гара. *Стаянка каменнага і бронзавага вякоў.* Знаходзіцца праз 1,2 км на паўночны захад ад вёскі, на высокай пясчанай дзюне ў правабярэжным поплаве р. Дзітва, ва ўрочышчы Боркава гара. Помнік быў выяўлены ў 1962 г. і абследаваны ў 2002 г. М. М. Чарняўскім. На падставе знаходак фрагментаў посуду і крамянёвых вырабаў даследчык датаваў стаянку перыядам ранняга неаліту–бронзавага веку [10, с. 14; 4, с. 73–74; 5, с. 22, мал. 27: *7*, мал. 29, 32, 33; 6, с. 255–256; 9, с. 189, мал. 7, А]. У 2012 г. помнік быў агледжаны аўтарамі. На раздувах памерамі 100 × 50 м былі сабраны восем адшчэпаў і іх фрагментаў, а таксама фрагмент пласціны, фрагмент ляпной керамікі і фрагмент кругавога посуду.

Даржы-5, ур. Боркава гара. *Крэмнеапрацоўчая майстэрня каменнага веку.* Праз 1,3 км на паўночны захад ад вёскі, на невялікім павышэнні адразу за паўночна-заходняй ускраінай дзюны з пунктам Даржы-4 у 1962 г. М. М. Чарняўскі зафіксаваў рэшткі крэмнеапрацоўчай майстэрні. У траншэі плошчай 12 м^2 ён выявіў каля 3000 крамянёвых артэфактаў, пераважная большасць якіх з'яўлялася прадуктамі дэбітажу. Быў знойдзены таксама фрагмент ляпной керамікі, на паставе якога даследчык датаваў майстэрню неалітычным часам [10, с. 14; 4, с. 74; 9, с. 189]. У 1977 г. помнік вывучала В. Л. Ліпніцкая. Была праведзена шурфоўка, якая дала нешматлікі матэрыял (нарыхтоўка нуклеуса, адшчэпы) [3, с. 10]. На момант абследавання 2012 г. тэрыторыя майстэрні была задзірванелая. У выкідах з кратавіны быў знойдзены крамянёвы адшчэп.

Даржы-6. *Стаянка каменнага і бронзавага вякоў.* Размешчана на краі высокай надпоймавай тэрасы р. Дзітва, на ўсход на моста, праз 40 м на ўсход ад шашы М11/Е85. Помнік быў выяўлены ў 1962 г. М. М. Чарняўскім [10, с. 14–15]. У 2012 г. на плошчы памерамі 150 × 50 м былі знойдзены 17 крамянёвых артэфактаў (двухпляцовачны нуклеус ад пласцін, які датаваны фінальным палеалітам (мал. 2: *5*), чатыры фрагменты пласцін, дзесяць адшчэпаў і іх фрагментаў, фрагмент неазначальнага сколу, дробны неазначальны крамянёвы абломак) і два фрагменты кругавога посуду.

Даржы-7. *Месцазнаходжанне крамянёвага артэфакта.* На поўнач ад рабочага пасёлка каля в. Даржы, праз 0,45 км на паўднёвы ўсход ад моста на дарозе М11/Е85 і праз 70 м на ўсход ад пункта Даржы-6 на грунтовай дарозе знойдзены двухбаковы скрабач на адшчэпе.

Даржы-8. *Стаянка каменнага веку.* На ўсходняй ускраіне старой часткі в. Даржы, на высокім беразе р. Дзітва на плошчы памерамі 80 × 40 м былі сабраны нешматлікія крамянёвыя вырабы (двухбаковы скрабач на адшчэпе, фрагмент пласціны, чатыры адшчэпы і іх фрагменты, лускавінка, фрагмент неазначальнага сколу).

Даржы-9. *Стаянка каменнага і бронзавага вякоў.* На заходняй ускраіне старой часткі в. Даржы, на ўсход ад чыгуначнага насыпу, на мысе правабя-



Мал. 2. Знаходкі з разведак 2012 г.: *1*, *3*, *4* – Даржы-1; *2* – Даржы-9; *5* – Даржы-6. Малюнак А. У. Зуевай

рэжнай тэрасы р. Дзітва сустракаюцца крамянёвыя вырабы і кераміка. Крамянёвыя артэфакты, атрыманыя ў 2012 г., прадстаўленыя рабрыстым сколам, 17 адшчэпамі і іх фрагментамі, трыма лускавінкамі, чатырма неазначальнымі крамянёвымі абломкамі і фрагментам наканечніка стралы з біфацыяльнай апрацоўкай (мал. 2: *2*), які датаваны познім неалітам–раннім бронзавым векам. Да гэтага часу адносяцца і два фрагменты керамікі. Яшчэ адзін фрагмент ляпнога посуду датаваны эпохай позняй бронзы.

Даржы-10. *Стаянка каменнага веку.* Размешчана праз 0,55 км на захад ад старой часткі в. Даржы, на выступе залесенай правабярэжнай нізкай тэрасы р. Дзітва. Ва ўсходняй частцы помніка быў закладзены шурф памерамі 1 × 1 м. У слоі, магутнасць якога дасягала 0,3 м, былі выяўленыя чатыры адшчэпы і іх фрагменты, рабрыстая пласціна, пласціна з рэтушшу. Адзін фрагмент пласціны быў знойдзены ў выкідах з кратавіны.

Даржы-11. *Стаянка каменнага веку.* Размешчана праз 1 км на паўночны захад ад вёскі і праз 70–80 м на ўсход ад высокай дзюны «Боркава гара», на плоскім павышэнні ў правабярэжным поплаве р. Дзітва. На плошчы памерамі каля 140 × 50 м быў сабраны нешматлікі пад'ёмны матэрыял (фрагмент кругавой керамікі і тры крамянёвыя адшчэпы). У заходняй частцы помніка даследаваны шурф памерамі 1 × 1 м. Знаходкі (шэсць адшчэпаў і лускавінка) трапляліся на глыбіні да 0,45 м.

Такім чынам, у выніку разведак, праведзеных аўтарамі на тэрыторыі Лідскага раёна ў 2012 г. (мал. 1), былі выяўленыя 12 новых помнікаў каменнага–бронзавага вякоў (Агароднікі-2, Вялікія Канюшаны-4А, -6–8, Ганчары-7, -8, Даржы-7–11) і абследаваныя 11 раней вядомых пунктаў.

Літаратура

1. Абухоўскі, В. С. Справаздача аб археалагічных даследаваннях на Панямонні ў 2003 г. / В. С. Абухоўскі // ААНД ДНУ «Ін-т гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 2099. – 28 с.
2. Лакіза, В. Л. Справаздача аб археалагічных даследаваннях на Панямонні ў 1998 г. / В. Л. Лакіза // ААНД ДНУ «Ін-т гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 1733. – 70 с.
3. Липницкая, О. Л. Отчет об археологических исследованиях Могилевской, Брестской и Гомельской областей за 1977 г. / О. Л. Липницкая // ААНД ДНУ «Ін-т гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 819. – 29 с.
4. Чарняўскі, М. М. Неаліт Беларускага Панямоння / М. М. Чарняўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 144 с.
5. Чарняўскі, М. М. Справаздача аб палявых археалагічных работах на тэрыторыі Панямоння і Падзвіння ў 2002 годзе / М. М. Чарняўскі // ААНД ДНУ «Ін-т гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 2011. – 89 с.
6. Чарняўскі, М. Археалагічныя работы ў басейнах Нёмана і Дзвіны ў 2002 г. / М. Чарняўскі // Гіст.-археалаг. зб. – Мінск, 2003. – № 18. – С. 255–256.
7. Чарняўскі, М. М. Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях у 2004 годзе / М. М. Чарняўскі // ААНД ДНУ «Ін-т гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 2199. – 96 с.
8. Чарняўскі, М. Археалагічныя работы на Панямонні і Падзвінні / М. Чарняўскі // Гіст.-археалаг. зб. – Мінск, 2005. – № 20. – С. 217–218.
9. Чарняўскі, М. М. Новы тып крэмнездабыўных выпрацовак на Беларускім Панямонні / М. М. Чарняўскі // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – Вып. 18. – С. 187–196.
10. Чернявский, М. М. Отчет об археологических исследованиях памятников эпохи неолита и бронзы в бассейне р. Неман в 1962–63 гг. / М. М. Чернявский // ААНД ДНУ «Ін-т гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 227. – 48 с.

Резюме

В. В. Ашейчик, А. В. Зуева

Археологические разведки на территории Лидского района в 2012 году

Отражены результаты археологических исследований, проведенных авторами в 2012 г. в бассейне р. Дитва. В окрестностях деревень Огородники, Великие Конюшаны, Гончары и Доржи было обследовано 23 археологических памятника каменного–бронзового веков, в том числе 12 ранее неизвестных пунктов.

Summary

V. U. Asheichyk, A. U. Zuyeva

Archaeological Explorations on the Territory of Lida District in 2012

The article deals with the results of archaeological explorations in the Dzitva river basin in 2012. The investigations were concentrated in the vicinity of the villages Aharodniki, Vialikija Kaniushany, Hanchary, Darzhy. As a result, 23 sites of the Stone and Bronze Ages were surveyed, 12 of which were previously unknown.

Паступіў 19.09.2013 г.

УДК 903.43(476.2)

***Н. Н. Дубицкая**, Институт истории НАН Беларуси, отдел археологии первобытного общества, кандидат исторических наук (г. Минск, Беларусь)*

Раскопки городища Красная Горка в 2011 году

В 2011 г. были продолжены исследования на городище у д. Красная Горка Жлобинского района Гомельской области. Городище расположено в лесу, на правом коренном берегу р. Днепр, в урочище Городок, или Круча. Размеры площадки городища составляют 66 × 29 м, с напольной стороны оно укреплено валом и рвом (рис. 1). На площадке был разбит небольшой раскоп 12 м^2. Мощность культурного слоя – до 0,6 м. Материк – желтый песок с линзами красноватой глины. Всего на городище изучено 60 м^2.

В 2011 г. на городище Красная Горка найдено несколько индивидуальных находок: поясная накладка, обломок тигля, человеческая кальцинированная косточка. Накладка и косточка происходят из культурного слоя (гл. 0,4 м), обломок тигля найден в яме (гл. 0,6 м). Обломок поясной накладки с заклепкой изготовлен из цветного металла, возможно, с высоким содержанием свинца (рис. 2: *5*). Накладка побывала в огне. В этом же квадрате и на той же глубине выявлена человеческая кальцинированная косточка (пястная) (определение И. И. Саливон). Также в этом же квадрате выявлены еще три кремированные косточки, из них две косточки обнаружены на глубине 0,3–0,4 м, третья косточка найдена несколько выше – на глубине 0,2 м. Следует отметить, что кремированные человеческие косточки в культурном слое городища встречались и в предыдущие годы. Предположительно можно сказать, что накладка и пястная косточка могут происходить из одного погребения. Не исключено, что остальные три косточки также могут относиться к погребениям. Грунтовые погребения на площадке городищ зафиксированы на ряде милоградских памятников (Горошков, Любны, Мохов-1) [1, с. 37]. Однако там речь идет о погребениях в ямах, отмеченных в материке. На городище Красная Горка такие погребения не зафиксированы. Можно, конечно, предположить, что мы имеем дело с погребальными ямами, не заглубленными в материк. Как было отмечено, накладка и косточка найдены на глубине 0,4 м при средней мощности культурного слоя на данном участке 0,5–0,6 м.

Основной археологический материал – обломки керамической посуды. Вся посуда изготовлена вручную, без использования гончарного круга. Отдельные обломки посуды ошлакованы. Всего в 2011 г. найдено 212 обломков посуды, из них 27 венчиков, 182 стенки, 3 днища.

Вся посуда изготовлена из озерно-аллювиальных глинистых пород, преимущественно гидрослюдистого минерального состава. В керамической массе, судя по визуальным наблюдениям, присутствуют дресва кристаллических пород, измельченный керамический бой (шамот). По-видимому,



Рис. 1. План-схема размещения раскопов. Городище Красная Горка. Жлобинский район. Гомельская область. 2011 г.



Рис. 2. Керамика (*1–5*). Городище Красная Горка. Жлобинский район. Гомельская область. 2011 г.

с ритуальными целями в состав керамических масс местные гончары добавляли зерна культурных злаков. На городище Красная Горка, как и на городище Отрубы, для этих целей использовали в основном мелкие зерна проса. Обжиг сосудов – костровой – происходил в условиях окислительной и редукционной газовой среды. Преобладал редукционный обжиг. Температуры обжига варьировали в диапазоне 550–750 ºС.

Большинство посуды относится к милоградской археологической культуре. По способам обработки поверхности вся керамика делится на гладкостенную нелощеную посуду и посуду, покрытую штриховкой. В 2004 г. выявлена керамика с лощением.

Керамика со штриховкой из раскопок 2011 г. составляет 13,2% от общего количества обломков посуды (28 фр.). Для сравнения в 2004 г. керамика со штриховкой составляла 18,3%, в 2006 г. – 9, в 2007 г. – 11,6%. Это значительно больше, чем на более южных памятниках. Например, на городище Отрубы доля штрихованной посуды не превышает 4–6%.

Милоградская посуда на городище представлена горшками разных размеров. Как правило, это кухонные горшки. На городище Красная Горка также известны миниатюрные сосуды, которые отличаются своей исключительной миниатюрностью, в частности диаметр верхней части сосудиков равен 2–3 см. Всего на городище выявлены обломки четырех таких сосудиков (2004 г. – 3 экз., 2007 г. – 1 экз.). Толщина стенок сосудов – 0,3–1,0 см. Встречены как округлые, так и плоские днища сосудов.

По профилировке верхней части для милоградской посуды городища Красная Горка характерны развитые профилированные формы с отогнутым наружу венчиком и хорошо выраженной шейкой (рис. 2: *1–4*; 3: *1–2*).

Часть милоградских сосудов на городище Красная Горка орнаментирована. Чаще всего элементы декора наносили на шейку сосуда, иногда выше шейки. Для милоградского керамического комплекса на городище характерны следующие виды орнамента: жемчужный, ямочный, тычковый, насечки. Наиболее ранним (VI–IV вв. до н. э.) является жемчужный орнамент. Его наносили путем выдавливания круглой палочкой изнутри еще необожженного сосуда (рис. 2: *3*). Орнамент, как правило, наносили ниже края венчика, но выше шейки. Керамика с «жемчужным» орнаментом выявлена в 2002, 2004, 2007, 2011 г. Самым распространенным видом орнамента на милоградских горшках на городище Красная Горка является ямочный орнамент по шейке сосуда (рис. 2: *2*; 3: *1–2*), а также его разновидность – ямочно-тычковый орнамент (рис. 2: *4*). Ямки имеют, преимущественно, круглую форму, иногда удлиненную форму. Для нанесения ямок использовали палочки или трубчатые кости. Диаметр ямок – 0,4–0,7 см. Менее распространенный элемент декора – насечки. Зоной его нанесения также являет-



Рис. 3. Керамика (*1–3*). Городище Красная Горка. Жлобинский район. Гомельская область. 2011 г.

ся шейка сосуда. Обломки таких сосудов найдены и в 2011 г. (рис. 2: *1*).

В культурном слое городища Красная Горка встречаются немногочисленные обломки постзарубинецких горшков. Часть посуды орнаментирована. Зоной нанесения орнамента является край венчика (насечки, пальцевые вдавления) (рис. 3: *3*). Постзарубинецкая посуда встречена в 2004, 2006, 2011 г., в 2007 г. такой посуды не встречено. В 2004 г. найдены обломки подлощеных сосудов.

Полученный археологический материал 2011 г. подтверждает результаты исследований 2002, 2004, 2006, 2011 г. Городище уд. Красная Горка было сооружено населением милоградской культуры в VI–IV вв. до н. э. на месте поселения эпохи бронзы и неолита (материалы неолита и бронзы выявлены в 2004 и 2006 г.). На раннюю дату (VI–IV вв. до н. э.) указывают, прежде всего, находки керамики с «жемчужным» орнаментом. Городище Красная Горка является самым северным памятником в Восточном Полесье, содержащим ранние материалы и относящимся к кругу классических милоградских памятников типа Милоград–Горошков.

Интересным является находки в культурном слое городища кремированных человеческих косточек (2007, 2011 г.). Находка пястной кремированной косточки вместе с обломком поясной накладки свидетельствует о возможном происхождении их из одного погребения. К сожалению, погребальные ямы, если они действительно являлись таковыми, не были углублены в материк, а проследить их в толще культурного слоя не представляется возможным. Как упоминалось выше, на милоградских памятниках Белорусского Поднепровья известны грунтовые погребения на площадках городищ (Горошков, Любны, Мохов-1). Однако все они зафиксированы в материковых погребальных ямах, преимущественно, круглой формы [1, с. 37]. Известно, что в настоящее время на территории Беларуси в эпоху раннего железного века только для милоградской культуры выявлены погребальные памятники. Для соседней культуры штрихованной керамики погребальные объекты не известны. С определенной долей вероятности можно предположить, что «штриховики» могли кремированный прах своих одноплеменников развеивать по площадке городища. Кремированные косточки вместе с остатками погребального инвентаря оседали на почву и постепенно перемешивались с культурным слоем. Не исключено, что подобный обряд погребения, заимствованный у соседей-«штриховиков», мог иметь место и на городище Красная Горка.

На городище Красная Горка присутствует небольшой горизонт, относящийся к первой половине 1-го тысячелетия н. э. Он представлен обломками лепных горшков, некоторые из которых декорированы насечками и вдавлениями по краю венчика. Отмечена подлощеная керамика (2004 г.).

Литература

1. Лашанкоў, М. І. Археалагічныя помнікі мілаградскай культуры / М. І. Лашанкоў // Мілаградская і паморская культуры // Жалезны век і ранняе сярэднявечча // Археалогія Беларусі : у 4 т. – Мінск : Беларус. навука, 1999. – Т. II. – С. 29–39.

Рэзюмэ

Н. М. Дубіцкая

Раскопкі гарадзішча Чырвоная Горка ў 2011 годзе

Падведзены вынікі палявых даследаванняў на гарадзішчы Чырвоная Горка ў 2011 г. Атрыманы ў 2011 г. археалагічны матэрыял пацвярждае вынікі папярэдніх гадоў. Аднак высвятляюцца некаторыя новыя моманты, якія звязаны з пахавальнай абраднасцю мясцовага насельніцтва. У прыватнасці, ёсць меркаванне, што знойдзеныя ў культурным пласце гарадзішча крэміраваныя чалавечыя косткі сумесна з асобнымі рэчамі, на якіх таксама захаваліся сляды абпалу, паходзяць з пахаванняў, рэшкі якіх складана выявіць у культурным пласце, альбо, магчыма, гэта пахавальны абрад, калі крэміраваныя рэшкі развейвалі над пляцоўкай гарадзішча.

Summary

N. N. Dubitskaya

Excavation of the hill-fort of Krasnaya Gorka in 2011

The article sums up the results of excavations on the hill-fort of Krasnaya Gorka in 2011. The archeological material of this year confirms the previous results. However some new moments connected with funeral tradition of local population were given. In particular, there are bases to assume, that the cremated human bones with burnt artifacts in some parts of the layer could be pointed to remains of burials or to the funeral ceremony when the cremations were blown above the place of hill-fort.

Поступила 20.09.2013 г.

УДК [902/904+908](476)

Л. У. Калядзінскі, *Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, старшы навуковы супрацоўнік, кандыдат гістарычных навук (г. Минск, Беларусь);*
М. С. Мароз*, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы, суіскальнік (г. Минск, Беларусь);*
В. Я. Родзін*, краязнавец (г. Минск, Беларусь)*

Курганная група Садкі

Курганная група Садкі размешчана ў 400–500 м на паўднёвы ўсход ад в. Садкі Слабада-Кучынскага сельсавета Капыльскага раёна Мінскай вобласці, у лясным масіве пад назвай «Дзедаў лес», ва ўрочышчы «Пагулянка». Адносна Капыля гэтая група знаходзіцца ў 18 км на паўночны ўсход. Лясны масіў «Дзедаў лес» і курганная група нанесены на карце РККА 1936 г., складзенай ў маштабе 1 : 500. Праўда, курганная група пазначана як прыродныя пагоркі. На гэтай карце в. Садкі, каля якой сёння знаходзяцца курганы, мае назву «Старыя Садкі». Акрамя як на гэтай карце яна больш нідзе не зафіксавана.

Курганная група Садкі ўпершыню была выяўлена ў чэрвені 2011 г. Вячаславам Яўгенавічам Родзіным, жыхаром г. Мінска, які цікавіцца помнікамі культуры Капыльскага раёна і раз-пораз наведвае гэты раён. У ліпені таго ж года па прапанове В. Родзіна гэтую курганную групу аглядалі Л. У. Калядзінскі, М. І. Лашанкоў, М. С. Мароз, калі накіроўваліся ў Капыльскі раён для работы з калекцыяй артэфактаў з раскопак Капыльскага замчышча. Інфармацыя пра выяўлены помнік была перададзена ў Капыльскі краязнаўчы музей і аддзел культуры Капыльскага райвыканкама. Тады і ўзнікла думка зафіксаваць помнік з мэтай ўнесці яго ў «Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь». Для гэтага неабходна было правесці на гэтым помніку папярэднія даследаванні: зняць план могільніка, зрабіць яго апісанне і фотафіксацыю, і раскапаць 2–3 курганы з мэтай высвятлення датавання помніка і яго культурнай прыналежнасці[1]. У красавіку 2012 г. кіраўніцтва Капыльскага раёна звярнулася з хадатайніцтвам у Інстытут гісторыі НАН Беларусі аб выдачы Дазволу на імя Л. Калядзінскага на археалагічныя даследаванні гэтага помніка.

Быў зняты план курганнай групы, зроблена яе апісанне і фотафіксацыя, а таксама раскапаны адзін з курганоў [5].

Курганная група Садкі выцягнута ў накірунку захад–усход. Колькасць курганоў у групе – 90. Дыяметр іх у аснове складае 6–14 м, вышыня – 1,0–1,8 м, але сустракаюцца і зусім невысокія курганы – 0,3 м. Прыемна адзначыць, што курганы абсалютна цэлыя, не пашкоджаныя аматарскімі раскопкамі ці гаспадарчымі работамі. На большасці з іх растуць дрэвы: граб, бяроза, ёлка. Адзін з курганоў, паводле палявой дакументацыі за № 50, невялікі па памерах і свабодны ад дрэў, быў абраны намі для раскопак.

Гэты курган меў паўсферычную форму і ў плане быў блізкі да круга. Вышыня кургана – 60 см, дыяметр у аснове – 4,9–5,0 м. Раскопкі кургана ажыццяўлялі па сектарах, размешчаных адзін адносна другога па дыяганалі. Распрацоўку насыпу вялі пластамі таўшчынёй 20 см і ажыццяўлялі зверху ўніз (ад вяршыні насыпу да яго асновы). Грунт з насыпу кургана праглядалі і празванівалі металадэтэктарам «Deus».

Што паказалі раскопкі? Зверху на таўшчыню ад 20 да 10 см курганны насып пакрывае гумусаваны рыхлы пласт светла-шэрага колеру, які ўтварыўся ў выніку паступовага сезоннага адкладання раслінных рэшткаў: травы і лісця дрэў. Затым да самай асновы кургана, да мацерыка, ідзе слой светлажоўтага дробназярністага пяску, у якім дзе-нідзе сустракаліся драбнюткія ўключэнні вугалю.

У паўднёва-заходнім сектары кургана, на глыбіні 50 см ад дзённай паверхні яго насыпу, сустрэты вугаль памерамі 1,5 × 2,0 см. У гэтым жа сектары на глыбіні 20 см сустрэты і камень памерамі 13 × 14 см. У паўночна-ўсходнім сектары кургана на глыбіні ад 10 да 20 см на ўзроўні дзённай паверхні насыпу сустрэты шэсць камянёў памерамі ад 10 × 15 да 13 × 20 см. Якой-небудзь канструкцыі гэтыя камяні не ўтвараюць. Аснова кургана – мацярык, супесак жаўтаватага колеру, шчыльны і троху цямнейшы па колеры за насып кургана. Наўкола насыпу кургана, амаль па ўсёй яго акружнасці, прасочаны равок. Яго глыбіня складае ад 80 да 90 см, а шырыня – ад 60 да 80 см. Запоўнены равок падгумусаваным жоўтым пяском. Перамычка ровіка прыпадае на паўночны схіл насыпу кургана.

Ровікі, якія ахопліваюць аснову насыпу кургана, – з'ява даволі распаўсюджаная [1, с. 11–16]. Адносна паходжання і прызначэння ровікаў наўкола курганоў адназначнай думкі няма. Па сцвярджэнні адных даследчыкаў, ровікі ўтвараліся ў выніку выемкі грунту для ўзвядзення насыпу кургана, таму шукаць тут якое-небудзь рэлігійнае дзеянне не варта [3, с. 221–235]. На думку іншых, ровікі стара-

[1] У жніўні 2011 г. М. С. Мароз налічыў у гэтай групе 39 курганоў.



Венчык (*1*) і днішча (*2*) посуду (рэканструкцыя). Гліна. XI ст. Курган № 50. Урочышча «Дзедаў лес». Капыльскі раён. Мінская вобласць. 2012 г.

жытнейшых славянскіх курганоў маглі мець і рытуальнае значэнне [8, с. 101]. Не высветлена да канца і прызначэнне перамычак у ровіках. Мелі яны толькі ўтылітарнае прызначэнне ці ім надаваліся яшчэ і пэўныя сакральныя функцыі [1, с. 15].

Пахаванне ў кургане не выяўлена. Са знаходак сустрэты два фрагменты керамікі, якія знойдзены ў запаўненні ровіка ля заходняга схілу насыпу кургана на глыбіні 80 см ад узроўню асновы кургана. Гэтыя два фрагменты керамікі маглі апынуцца ў запаўненні ровіка выпадкова, а маглі быць і слядамі жальбін, якія на думку Генрыха Татура маглі спраўляцца каля кургана ці на яго схілах [9, с. 132]. Знойдзеныя два фрагменты керамікі прадстаўлены венчыкам і фрагментам днішча.

Венчык (гл. малюнак: *1*) мае памеры 5 × 18 см, таўшчыню сценкі 5–7 мм, па колеру карычневата-шэры. На зломе шматслойны, ракавісты. У цесце відаць дамешак жарствы. Венчык моцна прафіляваны, па знешнім краі мае косы зрэз, а пасярэдзіне шыйкі – слаба выразны карнізік. Па плечыках посуду зроблены частыя і неглыбокія канелюры. Рэдкія бароздачкі назіраюцца і на зрэзе венчыка. Унутраная частка венчыка мае сляды накіпу, нагару, што сведчыць пра адносна доўгі тэрмін ужытку гэтага посуду.

Кераміка такога кшталту, дзе венчык мае са знешняга боку трохвугольны выступ (карнізік), сустракаецца на помніках Беларускага Панямоння, Тураўскага княства і ў Паўднёвых рэгіёнах Полацкай зямлі. Датавана гэта кераміка канцом X – пачаткам XI ст. [6, с. 91–145]. Сустракалася яна і ў нашых раскопках на тэрыторыі колішняга вакольнага горада Капыля [4, с. 246–256, мал. 3]. Увогуле, гэты тып посуду эсападобнага профілю з косым зрэзам венчыка і адцяжкай (трохвугольным выступам, карнізікам, псеўдавалікам) вядомы практычна на ўсіх старажытнарускіх паселішчах [2, с. 132–140]. Праўда, для кожнага рэгіёна ўсходнеславянскага абшару можа існаваць «сваё» больш вузкае ці наадварот больш шырокае датаванне. Але несумненна, што такая кераміка ўласціва для XI ст.

Фрагмент знойдзенага пры раскопках днішча (гл. малюнак: *2*) мае памеры 4 × 4 см і таўшчыню 5 мм. Колер чарапка карычневата-шэры. У зломе трохслойны, ракавісты з дамешкам жарствы. На знешнім баку днішча захаваўся фрагмент кляйма – частка круга і два промні. Відаць, у цэлым выглядзе гэта была шматпрамянёвая (6- або 8-прамянёвая) зорка, упісаная ў круг. Разглядаць гэтае кляймо можна як кляймо майстра і як салярны сімвал, вядомы па шматлікіх узорах керамічнага посуду [7, с. 58–63].

Першаснае вывучэнне могільніка сведчыць, што дадзены помнік выяўлены ўпершыню і нідзе раней у літаратурных крыніцах не фіксаваўся. Помнік даволі прадстаўнічы – налічвае 90 насыпаў. Ён цудоўна захаваўся, на ім няма слядоў якіх-небудзь разбурэнняў.

Але на падставе раскопак толькі аднаго невялікага кургана цяжка што-небудзь упеўнена гаварыць пра абрад пахавання і яго датаванне, паколькі пахаванне ў кургане не выяўлена. Знаходка венчыка глінянага посуду спецыфічнага профілю і аздаб-

лення, уласцівых для посуду X–XI ст., дазваляе ў некаторай ступені меркаваць, што курган адносіцца да гэтага часу. Тым не менш заўважым, што венчык быў знойдзены не ў насыпе кургана, а ў ровіку, дзе ён мог аказацца і выпадкова. Таму ёсць патрэба ў працягу даследаванняў на гэтым помніку.

Для атрымання дадатковай інфармацыі неабходна раскапаць яшчэ два-тры курганы ў розных частках гэтай групы. Пажаданым выглядае і пошук селішча, дзе пражывала насельніцтва, якое ўзводзіла гэтыя курганы.

Літаратура

1. Авдусин, Д. А. Ровики славянских курганов / Д. А. Авдусин // Древности Восточной Европы. МИА. – М., 1969. – № 169. – С. 11–16.
2. Горюнова, В. М. Датирующие возможности раннегончарной керамики X – начала XI в. / В. М. Горюнова // Российская археология. – М., 2009. – № 4. – С. 132–140.
3. Завитневич, В. З. Формы погребального обряда в могильных курганах Минской губернии / В. З. Завитневич // Труды IX Археологического съезда в Вильне 1893 года / под ред. Л. С. Уваровой, С. С. Слуцкого. – 1895. – Т. 1. – С. 221–235.
4. Калядзінскі, Л. Капыль–2007 : Вынікі палявых даследаванняў / Л. Калядзінскі // Гіст.-археалаг. зб. – Мінск, 2008. – Вып. 24. – С. 246–256.
5. Калядзінскі, Л. Справаздача аб археалагічных даследаваннях у Капыльскім раёне ў 2012 г. курганнай групы каля в. Дунаева–Садкі / Л. Калядзінскі // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Мінск, 2013.
6. Малевская, М. В. Керамика западнорусских городов X–XIII вв. / М. В. Малевская // Труды ИИМК РАН. – СПб., 2005. – Т. XVII. – С. 91–145.
7. Плавинский, А. Н. К вопросу о гончарных клеймах / А. Н. Плавинский // Славяне и их соседи (археология, нумизматика, этнография). – Минск, 1998. – С. 58–63.
8. Седов, В. В. Древнерусское языческое святилище в Перыне / В. В. Седов // КСИИМК. – 1953. – Вып. 50.– С. 101.
9. Татур, Г. Х. Курганы Минской губернии / Г. Х. Татур // Труды IX Археологического съезда в Вильне 1893 года / под ред. Л. С. Уваровой, С. С. Слуцкого. – 1897. – Т. 2.– С. 132.

Резюме

Л. В. Колединский, Н. С. Мороз, В. Е. Родин

Курганная группа Садки

В публикации приводятся данные о новом памятнике археологии, выявленном в 2011 г., – курганной группе у д. Садки Копыльского района Минской области. Памятник насчитывает 90 курганов, имеющих хорошую сохранность. Высота курганов – 1,0–1,8 м, диаметр основания – 6–14 м. Раскопан один из курганов. В заполняющем слое курганного ровика выявлена керамика XI в. Самого погребения в кургане не обнаружено. Предварительно памятник можно отнести к XI в. Однако для получения более достоверных сведений о его датировке и культурной принадлежности необходимо провести дальнейшие исследования.

Summary

L. V. Koledinsky, N. S. Moroz, V. E. Rodin

Kurganny group Sadky

The new monument of archeology is revealed in 2011. It is kurganny group which is placed near the village Sadky in the Kopylsky district. The monument consists of 90 barrows which have good safety. Height of barrows of 1,0–1,8 m, diameter of barrows in the basis of 6–14 m. The author explored only one barrow. The ceramics of the 11th century is revealed. The burial in a barrow it isn't revealed. Previously the monument can be carried to the 11th century. However, further researches are necessary for bigger clarity about its dating and cultural accessory.

Паступіў 23.09.2013 г.

УДК 902.21(476)

А. Ф. Касюк, *Інстытут гісторыі НАН Беларусі, аддзел археалогіі сярэдніх вякоў і Новага часу, малодшы навуковы супрацоўнік (г. Мінск, Беларусь);*
А. М. Вашанаў, *Інстытут гісторыі НАН Беларусі, аспірант (г. Мінск, Беларусь)*

Вынікі археалагічных даследаванняў на Палессі ў 2012 годзе

У 2012 г. аўтары артыкула праводзілі археалагічныя разведкі на поўдні Беларусі – ў Драгічынскім раёне Брэсцкай вобласці, Мазырскім і Калінкавіцкім раёнах Гомельскай вобласці.

У ***Драгічынскім раёне*** ў рамках працы па інвентарызацыі помнікаў археалогіі, уключаных у «Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь», былі агледжаны адзіночныя курганы XI–XIII стст. каля в. Брашэвічы і в. Ялач, гарадзішча XI–XIII стст. каля в. Старамлыны, селішча VI ст. да н. э. – VIII ст. н. э. і рэшткі былога замка Вішнявецкіх (XVII–XVIII стст.) каля в. Жабер. Падчас правядзення работ, было зафіксавана некалькі новых месцазнаходжанняў археалагічных матэрыялаў.

Закозель-1 – месцазнаходжанне з матэрыяламі каменнага–бронзавага вякоў, ранняга жалезнага веку (?) (мал. 1: *1*). Размешчана за 1,5 км на поўнач ад вёскі, на левым беразе канала Валавельскі, на ўзвышэнні даўжынёй каля 800 м. Усходняя і цэнтральная часткі ўзвышэння разворваюцца, заходняя частка выбрана кар'ерам. Культурны пласт таўшчынёй 0,35–0,40 м прадстаўлены супескам шэрага колеру. На помніку былі знойдзены медыяльная частка рэгулярнай пласціны (мал. 2: *1*), дзве лускі, сем фрагментаў сценак ляпных пасудзін, у тым ліку адзін фрагмент з адтулінамі (ранні жалезны век ?) (мал. 2: *2*) і фрагмент пасудзіны эпохі бронзы (тшцінецкае культурнае кола (?), далей – ТШК)[1], фрагмент кальцыніраванай косткі.

Ялач-1 – месцазнаходжанне з матэрыяламі фінальнага палеаліту, мезаліту–неаліту і бронзавага веку (мал. 1: *2*). Знаходзіцца за 150 м на ўсход ад в. Ялач, з левага боку ад дарогі ў в. Язвіны. На разаранай паверхні поля былі знойдзены: тры адшчэпы звычайныя, адшчэп скарыністы, пласціна падскарыністая са слядамі двухпляцовачнасці (мал. 2: *5*), медыяльная частка рэгулярнай пласціны (мал. 2: *4*), тры фрагменты сценак пасудзін ТШК (?).

Ялач-2 – месцазнаходжанне з матэрыяламі каменнага–бронзавага вякоў (мал. 1: *3*). Выяўлена за 0,8–1,0 км на поўнач ад вёскі, з правага боку ад дарогі ў Драгічын, на ўзвышэнні. Разворваецца, паўднёвая частка выбрана кар'ерам. На помніку былі знойдзены дыстальная частка пласціны, фрагмент адшчэпа, два фрагменты сценак ляпных пасудзін, на адным – арнамент з пракрэсленых ліній; ТШК (мал. 2: *3*).

Язвіны-2 – месцазнаходжанне з матэрыяламі каменнага–бронзавага вякоў (мал. 1: *4*). Размешчана за 0,5–0,7 км на поўнач ад заходняй ускраіны вёскі, з левага боку ад дарогі ў в. Ляжыткавічы, насупраць вясковых могілак. На паверхні разаранага поля былі знойдзены адшчэп падскарыністы, адшчэп звычайны з рэтушшу, фрагмент праколкі з вылучаным джалам (мал. 2: *6*).

Ліпнікі-1 – месцазнаходжанне з матэрыяламі каменнага–бронзавага вякоў (мал. 1: *5*). Знаходзіцца за 0,6 км на захад ад вёскі, з правага боку ад дарогі ў Драгічын. На паверхні разаранага поля былі знойдзены пласціна скарыністая з рэтушшу (мал. 2: *7*), скрабок на пласціне з прамой скошанай працоўнай часткай (мал. 2: *8*).

Ліпнікі-2–4 (мал. 1: *6–8*) – месцазнаходжанні з матэрыяламі каменнага веку, эпохі бронзы, жалезнага веку (?). Размешчаны за 0,8–1,5 км на захад ад вёскі, з левага боку ад дарогі ў Драгічын, на трох узвышэннях, паверхня якіх разворваецца. На помніку *Ліпнікі-2* былі знойдзены фрагмент адшчэпа і абломак дробны неазначальны з рэтушшу. *Ліпнікі-3* – скол аднаўлення пляцоўкі нуклеуса. *Ліпнікі-4* – два адшчэпы звычайныя, фрагмент адшчэпа, абломак дробны неазначальны, луска, а таксама фрагмент сценкі ляпной пасудзіны з дамешкай жарствы і шамоту.

Разведкі ў ***Мазырскім раёне*** пачаліся з агляду наваколляў г. п. Пхоў. Першыя звесткі аб помніках археалогіі каменнага веку–эпохі жалеза на тэрыторыі пасёлка і каля яго, былі атрыманы ў 1926–1927 гг. у выніку паверхневых збораў І. Р. Калодкіна і Б. І. Федаракі [11]. У 1961–1962 гг. палявыя даследаванні тут праводзіў У. Ф. Ісаенка [1, с. 77–80; 2, с. 29–30].

Пхоў-2 – паселішча з матэрыяламі каменнага–бронзавага вякоў, першай паловы I тысячагоддзя н. э. (мал. 3: *2*). Размешчана на заходняй ускраіне пасёлка Пхоў, на левым беразе р. Ненач. Даўжыня помніка – каля 300 м. Выявіў у 1926 г. Б. І. Федарака, даследаваў у 1961–1962 гг. У. Ф. Ісаенка. У 1961 г. былі зафіксаваны сляды аб'ектаў (жытлаў), на пясчаных агаленнях сабраныя знаходкі каменнага–брон-

[1] Вызначэнне керамікі эпохі неаліту–бронзавага веку і малюнкі зроблены кандыдатам гістарычных навук, старэйшым навуковым супрацоўнікам аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі Мікалаем Мікалаевічам Крывальцэвічам.



Мал. 1. Лакалізацыя помнікаў: *1* – Закозель-1; *2* – Ялач-1; *3* – Ялач-2; *4* – Язвіны-1; *5* – Ліпнікі-1; *6* – Ліпнікі-2; *7* – Ліпнікі-3; *8* – Ліпнікі-4. Драгічынскі раён. Брэсцкая вобласць. 2012 г.



Мал. 2. Крамянёвыя вырабы (*1, 4–8*) і ляпная кераміка (*2, 3*) з помнікаў Закозель-1 (*1, 2*), Ялач-1 (*4, 5*), Ялач-2 (*3*), Язвіны-1 (*6*), Ліпнікі-1 (*7, 8*)



Мал. 3. Лакалізацыя помнікаў: *1, 13–19* – Калінкавіцкі раён; *2–12* – Мазырскі раён; *1* – Рудня Горбавіцкая-3; *2* – Пхоў-2; *3* – Баравікі-2; *4* – Баравікі-6, -6А; *5* – Новікі (дачы)-1; *6* – Новікі (дачы)-2; *7* – Новікі (дачы)-2А; *8* – Лубня-7; *9* – Лубня-8; *10* – Лубня-9; *11* – Лубня-10, -10А; *12* – Лубня-6; *13* – Града-4; *14* – Шарэйкі-1; *15* – Шарэйкі-3; *16* – Юравічы-6; *17* – Юравічы-2; *18* – Слабодка-1; *19* – Абухаўшчына-2. 2012 г.

завага вякоў, першай паловы I тысячагоддзя н. э. У заходняй частцы паселішча, каля павароту р. Ненач, сустракалася славянская кераміка, у тым ліку з хвалістым арнаментам [1, с. 79–80]. Яшчэ ў 1960-х гадах адзначалася, што тэрыторыя пасёлка актыўна пашыраецца [1, с. 79]. Падчас агляду помніка ў 2012 г. было ўстаноўлена, што ён цалкам забудаваны.

Каля в. Баравікі былі агледжаны два вядомыя паселішчы.

Баравікі-2 – стаянка каменнага–бронзавага вякоў (мал. 3: *3*). Размешчана за 2 км на поўнач ад вёскі, за 0,2 км на захад ад шашы Мазыр–Калінкавічы, на паўднёвым беразе воз. Уюнец. Помнік выяўлены ў 1979 г. У. Ф. Ісаенкам, займае паўночную ўскраіну пясчанага ўзвышэння [6, с. 19].



Мал. 4. Крамянёвыя вырабы (*1–4, 10*) і ляпная кераміка (*5–9, 11, 12*) з помнікаў Баравікі-6 (*1–9*) і Баравікі-6А (*10–12*)

Паверхня помніка пашкоджана ўздзеяннем ветравой эрозіі. Падчас агляду паселішча ў 2012 г. на агаленнях культурнага пласта былі сабраны фрагмент сценкі пасудзіны шнуравой керамікі палескага тыпу (далей – ШКПТ), абломак дробны неазначальны, адшчэп звычайны.

Баравікі-6 (Мазыр) – паселішча з матэрыяламі эпохі каменнага веку–бронзы, паселішча і бескурганны могільнік (?) эпохі бронзы–жалезнага веку, селішча XVII–XVIII стст. (мал. 3: *4*). Размешчана за 0,7 км на паўднёвы ўсход ад в. Баравікі, каля геадэзічнага знака, на ўзвышэнні, якое цягнецца ўздоўж дзюннай грады. Даўжыня паселішча – каля 250 м, па ім праходзіць палявая дарога. З поўначы тэрыторыю помніка ад дзюн аддзяляе зарослая лагчына, а з поўдня падступае поплаў. Помнік выявіў у 1960-я гады У. Ф. Ісаенка, прывязаў яго да Мазыра [1, с. 76].

На момант абследавання заходняя частка помніка была пашкоджана лесапасадкай. Культурны пласт прадстаўлены супескам карычневага колеру. Месцамі трапляюцца рэшткі разбураных аб'ектаў у выглядзе плям цёмна-шэрага колеру, часам з попелам і абпаленымі камянямі. Зафіксавана вялікая колькасць ляпной керамікі і апрацаванага крэменю. Сабрана 10 фрагментаў кальцыніраваных костак.

Калекцыя крамянёвых артэфактаў налічвае 54 адзінкі: вастрыё тыпу Ставінога (мал. 4: *1*), асіметрычная трапецыя (мал. 4: *2*), яніславіцкае вастрыё са зламанай асновай (мал. 4: *3*), фрагмент наканечніка стралы з біфацыяльнай апрацоўкай (мал. 4: *4*), франтальны скол падпраўкі пляцоўкі нуклеуса, фрагмент нуклеуса, скрабок на адшчэпе, скрабач на адшчэпе, медыяльная частка пласціны з рэтушшу, тры фрагменты рэгулярных пласцін, фрагмент рабрыстай пласціны, пласціна скарыністая, два фрагменты адшчэпаў з рэтушшу, дзесяць адшчэпаў звычайных (у тым ліку два фрагменты), два адшчэпы скарыністыя (у тым ліку адзін фрагмент), адшчэп падскарыністы, сем абломкаў дробных неазначальных, тры фрагменты сколаў неазначальных, два фрагменты канкрэцый з негатывамі асобных сколаў, трынаццаць лусак.

Ляпная кераміка эпохі неаліту прадстаўлена абломкамі пасудзін усходнепалескага варыянта днепра-данецкай культуры (далей – ДДК) – 123 фрагменты, сярод якіх без арнаменту – 76 фрагментаў, з грабенчатым арнаментам – 14, з адступаючымі ямкамі і наколамі – 22, з насечкамі – 2, з пракрэсленымі лініямі – 10, а таксама 2 фрагменты сценак пасудзін ШКПТ з лінейным штампам (мал. 4: *8, 9*). Сярод знаходак таксама ёсць абломкі гаршкоў ТШК: патоў-

шчанае венца з ангабаванай паверхняй (мал. 4: *5*), фрагмент шыйкі і два фрагменты сценак з «ружанцовым» арнаментам (мал. 4: *6*, *7*), фрагмент сценкі ляпной пасудзіны са слядамі дзёгцю на ўнутранай паверхні. Паверхня пасудзін эпохі бронзы гладкая, жаўтаватага колеру, таўшчыня сценак – 0,5 см, у цесце дамешка жарствы сярэдніх і вялікіх памераў, белага і ружовага колеру. Акрамя таго, былі знойдзены два фрагменты пасудзін эпохі бронзы–ранняга жалезнага веку (?), чатыры фрагменты венцаў і шыек пасудзін мілаградскай культуры (два – з «жемчужным» арнаментам), дваццаць фрагментаў пасудзін жалезнага веку–ранняга сярэдневякоўя (?), сабрана пяць абломкаў ганчарных пасудзін XVII–XVIII стст. Таксама на помніку знойдзена медная манета, якая была вызначана як падробка пад медны шэляг Яна II Казіміра Вазы[1].

Такім чынам, на помніку можна вылучыць некалькі культурна-храналагічных кампанентаў. Ранні мезаліт – кудлаеўска-каморніцкі тэхнакомплекс; позні мезаліт – яніславіцкая культура; неаліт – ДДК, ШКПТ; бронзавы век – ТШК, ранні жалезны век – мілаградская культура. У невялікай колькасці прысутнічае ляпная кераміка жалезнага веку, культурную прыналежнасць якой вызначыць складана, а таксама ганчарная кераміка XVII–XVIII стст.

У паўднёвай частцы паселішча Баравікі-6 ад асноўнай тэрыторыі помніка вузкім ярам аддзелена невялікая паляна, на паверхні якой таксама сустракаюцца археалагічныя матэрыялы. Пункт з'яўляецца працягам помніка Баравікі-6, пазначаны намі як **«Баравікі-6А»** (мал. 3: *4*). Тут былі знойдзены медыяльная частка рэгулярнай пласціны (мал. 4: *10*), восем фрагментаў сценак пасудзін ДДК, дзевяць фрагментаў пасудзін мілаградскай культуры (мал. 4: *11, 12*).

Некалькі месцазнаходжанняў апрацаванага крэменю, ляпной і ганчарнай керамікі былі зафіксаваны з левага боку ад шашы Мазыр–Калінкавічы і моста праз Прыпяць. **Новікі (дачы)-1** – за 1,5 км на паўночны захад ад пасёлка дачнага тыпу Новікі (з правага боку ад шашы), на вузкім (да 30 м), выцягнутым дугой узвышэнні сярод поплава Прыпяці (мал. 3: *5*). На агаленнях культурнага пласта знойдзены фрагмент сценкі раннеганчарнай (?) пасудзіны.

Новікі (дачы)-2 – месцазнаходжанне з матэрыяламі каменнага–бронзавага вякоў, эпохі мезаліту (мал. 3: *6*). Размешчана за 0,7 км на паўночны захад ад пасёлка Новікі, на ўзвышэнні. На палявой дарозе былі сабраны скрабач на сколе падпраўкі пляцоўкі нуклеуса (мал. 5: *1*), скрабач на адшчэпе (мал. 5: *2*), разец двухгранны бакавы (мал. 5: *3*), адшчэп падскарыністы з участкам дробнай рэтушы па краі, 4 адшчэпы звычайныя, лушчнёвы скол, а таксама фрагмент венца і 9 фрагментаў сценак пасудзін жалезнага веку (мал. 5: *4*), фрагмент сценкі ганчарнай пасудзіны, 2 кавалкі металургічнага жужалю.

Новікі (дачы)-2А – працяг помніка Новікі (дачы)-2. За 0,2 км на ўсход, таксама на палявой дарозе, былі знойдзены дзве праксімальныя часткі пласцін, якія датаваны эпохай мезаліту–неаліту.

За 1,0–1,5 км на паўночны ўсход ад месцазнаходжанняў Новікі (дачы)-1, -2, -2А, на паўднёвы ўсход ад воз. Вялікае былі агледжаны ўзвышэнні сярод тарфянікаў, выцягнутыя ланцужком на даўжыню каля 1 км ад возера да шашы Мазыр–Калінкавічы. Паверхня ўзвышэнняў разворваецца. Упершыню наяўнасць археалагічных матэрыялаў тут адзначыў У. Ф. Ісаенка ў 1960–1961 гг. Даследчык прывязаў помнікі да в. Пеніца (Пеніца-1, -2) [1, с. 73–74]. У сувязі з тым, што ўзгаданы населены пункт знаходзіцца на тэрыторыі іншага (Калінкавіцкага) раёна, абследаваныя помнікі былі прывязаны намі да в. Лубня. У наваколлях Лубні У. Ф. Ісаенка адзначыў пяць помнікаў [1, с. 71–74], яшчэ адзін пункт, Лубня-6, быў зафіксаваны намі ў 2012 г., а разгледжаныя ўзвышэнні каля воз. Вялікае былі пазначаны (з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход) як Лубня-7, Лубня-8 (Пеніца-2), Лубня-9 (Пеніца-1), Лубня-10 і -10А.

Лубня-6 – месцазнаходжанне з матэрыяламі эпохі каменнага–бронзавага вякоў (мал. 3: *12*). Лакалізавана за 0,8 км на паўднёвы захад ад вёскі, на правым беразе р. Закаванка, на поўнач ад моста. На разаранай паверхні поля быў знойдзены разец двухгранны бакавы (мал. 5: *5*).

Лубня-7 – паселішча з матэрыяламі каменнага–бронзавага вякоў (мал. 3: *8*). Размешчана за 2,8 км на паўночны захад ад вёскі, за 0,2 км на паўднёвы ўсход ад воз. Вялікае, на невялікім пясчаным узвышэнні, паверхня якога разворваецца. На помніку былі знойдзены пласціна адыстальная скарыністая, дробны абломак невызначальны, два фрагменты пасудзін мілаградскай культуры (фрагмент венца з закругленым краем і шыйка з «жемчужным» арнаментам), 17 фрагментаў ляпных пасудзін жалезнага веку светла-чырвонага, жаўтаватага, карычневага і бежавага колеру, таўстасценных (каля 1 см) і больш тонкіх, у цесце прысутнічае дамешка жарствы, паверхня гладкая і шурпатая.

Лубня-8 (Пеніца-2) – паселішча каменнага–бронзавага вякоў, ранняга жалезнага веку (мал. 3: *9*). Знаходзіцца на паўднёвы ўсход ад воз. Вялікае, за 100 м на паўднёвы ўсход ад помніка Лубня-7. Выявіў у 1961 г. У. Ф. Ісаенка. Даследчык адзначыў перспектыўнасць пошуку тут тарфянікавай стаянкі [1, с. 73–74]. У 2012 г. на разаранай паверхні ўзвышэння былі знойдзены лушчнёвы скол з рэтушшу (можа з'яўляцца ўкладышам састаўной прылады;

[1] Вызначэнне зроблена загадчыкам лабараторыі музейнай справы гістарычнага факультэта БДУ Віталем Міхайлавічам Сідаровічам.

мал. 5: *6*), два лушчнёвыя сколы, луска, адшчэп скарыністы, адшчэп падскарыністы, два адшчэпы звычайныя. Таксама сярод знаходак апынуліся сценка пасудзіны ДДК, тры фрагменты пасудзін ШКПТ з лінейным штампам (дамешка пяску, шамоту; гладкасценныя, таўшчыня сценак 1,0–1,1 см; мал. 5: *7, 8*), 14 фрагментаў пасудзін жалезнага веку чырвонага, бежавага, чорнага колеру, з дамешкай дробнай жарствы; адзін фрагмент са штрыхоўкай (мал. 5: *9*) і 27 абломкаў ляпных пасудзін, часам, з падглянцаванай паверхняй, якія датаваны больш шырока – эпохай бронзы–жалезным векам.

Лубня-9 (Пеніца-1) – паселішча з матэрыяламі каменнага–бронзавага вякоў, ранняга жалезнага веку, селішча XI–XII стст. (мал. 3: *10)*. Размешчана за 0,4 км на паўднёвы ўсход ад воз. Вялікае, за 80 м на паўднёвы ўсход ад пункта Лубня-8 на невялікіх пясчаных узвышэннях. Вышыня над тарфянікам – 1,5–2,0 м, працягласць – да 150 м. Помнік выявіў у 1961 г. У. Ф. Ісаенка [1, с. 73]. Падчас агляду помніка ў 2012 г. на ворыве былі знойдзены адшчэп падскарыністы, фрагмент лушчня, а таксама сценка пасудзіны ДДК (мал. 5: *10*), сем фрагментаў сценак пасудзін жалезнага веку, у тым ліку са штрыхоўкай



Мал. 5. Крамянёвыя вырабы (*1–3, 5, 6, 13–15*), ляпная (*4, 7–11*) і ганчарная (*12*) кераміка з помнікаў Новікі (дачы)-2 (*1–4*), Лубня-6 (*5*), Лубня-8 (*6–9*), Лубня-9 (*10–12*), Лубня-10А (*13*), Юравічы-2 (*14, 15*)

(мал. 5: *11*), абломкі ганчарных пасудзін XI–XII стст. (мал. 5: *12*).

Лубня-10 – паселішча з матэрыяламі каменнага–бронзавага вякоў (мал. 3: *11*). Лакалізавана за 2 км на паўночны захад ад вёскі, за 100 м ад помніка Лубня-9, на пясчаным узвышэнні. У 2012 г. на разворанай паверхні помніка былі знойдзены: дзве сценкі ляпных пасудзін, адна з якіх светла-карычневага колеру, з гладкай паверхняй (бронзавы век) і шрапнэль. Помнік Лубня-10 перарэзаны меліярацыйнай канавай. Працяг помніка на ўсход ад канавы пазначаны намі як **Лубня-10А.** Тут былі знойдзены адыстальная пласціна з рэтушшу (мал. 5: *13*), фрагмент лушчня, чатыры фрагменты ляпных таўстасценных (да 1 см) пасудзін жалезнага веку, фрагмент сценкі ганчарнай пасудзіны.

У ***Калінкавіцкім раёне*** былі агледжаны помнікі, размешчаныя на ўчастку ад в. Рудня Горбавіцкая да в. Абухаўшчына. Асноўнай мэтай даследаванняў тут быў пошук новых помнікаў другой паловы 1-га тысячагоддзя н. э., а таксама абследаванне вядомых раннесярэдневяковых паселішчаў Пхоў-2, Юравічы-6, Слабодка-1 і грунтовага могільніка Шарэйкі-1. На ўсіх агледжаных помніках праводзіліся паверхневыя зборы.

Вёска Рудня Горбавіцкая знаходзіцца за 3 км на поўнач ад пасёлка Пхоў, уверх па цячэнні р. Ненач. У 1979 г. У. Ф. Ісаенка зафіксаваў два пункты з археалагічнымі матэрыяламі на захад ад вёскі [5, с. 21–22].

Рудня Горбавіцкая-3 – паселішча з матэрыяламі ранняга жалезнага веку (мал. 3: *1*). Размешчана на паўночнай ускраіне вёскі, на правым беразе р. Ненач. Каля чыгуначнага моста, у абрыве берага ракі, прасочваецца культурны пласт магутнасцю звыш 0,4 м са слядамі аб'екта ў выглядзе попельных прапласткаў з абпаленымі камянямі. Тут жа былі знойдзены два фрагменты сценак ляпных пасудзін жалезнага веку. Яны маюць светла-чырвоны колер, у цесце прысутнічае дамешка жарствы сярэдніх памераў і вялікай, паверхня шурпатая.

У басейне р. Ненач, а таксама ў міжрэччы Неначы і Іпы шмат залежаў балотнай руды, з якой раней здабывалі жалеза [8]. Гэта знайшло адбітак у назвах населеных пунктаў: Рудня Горбавіцкая, Рудня Антонаўская, Есіпава Рудня. На заняткі мясцовага насельніцтва выплаўкай жалеза ўказваюць і рэшткі печаў (рудняў), якія захаваліся ў лесе [1, с. 93]. Улічваючы арыентаванасць плямёнаў жалезнага веку–эпохі ранняга сярэдневякоўя на жалезавытворчы промысел, можна спадзявацца на выяўленне тут старажытных паселішчаў ці нават металургічных комплексаў.

Наступны агледжаны пункт знаходзіцца каля в. Града. У наваколлях вёскі У. Ф. Ісаенка адзначаў тры помнікі з матэрыяламі ад каменнага веку да эпохі сярэдневякоўя [7, с. 18].

Града-4 – месцазнаходжанне ляпной керамікі жалезнага веку–эпохі ранняга сярэдневякоўя было зафіксавана за 5 км на захад ад вёскі, на захад ад воз. Трасцяное, на левым беразе Прыпяці, насупраць в. Акулінка (правы бераг Прыпяці), на ўзвышэнні сярод поплава ракі. Помнік разбураны трасай нафтаправода. На агаленнях культурнага пласта былі знойдзены тры дробныя фрагменты сценак ляпных пасудзін.

Шарэйкі-1 – стаянка з матэрыяламі фінальнага палеаліту, неаліту, бронзавага і жалезнага вякоў, грунтовы могільнік эпохі ранняга сярэдневякоўя (мал. 3: *14*). Размешчаны за 0,5 км на поўнач ад вёскі, на двух пясчаных узвышэннях (заходняя і ўсходняя дзюны), на паўночным беразе старычнага воз. Горкі. Помнік выявіў і даследаваў у 1961, 1964, 1970 і 1973 г. У. Ф. Ісаенка [1, с. 48–49; 3, с. 31; 4, с. 10–11]. Могільнік даследаваў у 1978 г. В. Б. Пярхаўка [10].

Сёння, як і ў 1960–70-х гадах, культурны пласт на помніку актыўна разбураецца ветравой эрозіяй. Паверхня паселішча слаба задзірванелая, на агаленнях культурнага пласта сустракаюцца шматлікія дробныя фрагменты ляпных пасудзін і крамянёвыя артэфакты. У паўднёвай частцы дзюны размешчана седлавіна, у якой У. Ф. Ісаенка знаходзіў рэшткі трупаспаленняў эпохі ранняга сярэдневякоўя [1, с. 48–49].

Калекцыю археалагічных матэрыялаў, атрыманых у выніку паверхневых збораў на заходняй дзюне ў 2012 г. склалі тры фрагменты сценак пасудзін ДДК і фрагмент сценкі ШКПТ з шнуравым арнаментам. Сярод крамянёвых артэфактаў: фрагмент неазначальнай прылады, скол падпраўкі пляцоўкі нуклеуса і дзве праксімальныя часткі пласцін з рэтушшу, медыяльная частка пласціны, адшчэп скарыністы, восем лусак, два абломкі дробныя неазначальныя.

Таксама былі знойдзены 70 фрагментаў ляпных пасудзін: сем венцаў – кароткія, трохі адагнутыя вонкі, край зрэзаны прама ці закруглены (мал. 6: *1–6*), чатыры шыйкі, 59 фрагментаў сценак, у тым ліку са скразнымі адтулінамі і арнаментаваныя наколамі (мал. 6: *7*, 9). Фрагменты дробныя, крохкія, паходзяць ад пасудзін грубаляпных з шурпатай паверхняй ці больш старанна зробленых з добра загладжанай (у адным выпадку – падглянцаванай) паверхняй. Колер бежавы, жоўты, бледна-чырвоны, чырванаваты, бледна-карычневы, шэры. У цесце прысутнічае дамешка жарствы дробнай і сярэдніх памераў. Два фрагменты ашлакаваныя. У асноўным кераміка жалезнага веку (першая палова 1-га тысячагодддзя н. э.), адзін фрагмент можа адносіцца да эпохі ранняга сярэдневякоўя.

Таксама сярод знаходак трапілі 16 фрагментаў ганчарных пасудзін XI–XII стст. светла-бежавага, ружовага, чырванаватага і шэрага колеру. Адзін



Мал. 6. Ляпная (*1–7, 9, 12–20*) і ганчарная (*8*) кераміка, крамянёвы выраб (*10*), шкляная пацерка (*11*), фрагмент жалезнага вырабу (*21*) з помніка Шарэйкі-1; *1–10* – знаходкі з паверхневых збораў (*1–9* – Шарэйкі-1, заходняя дзюна; *10* – Шарэйкі-1, усходняя дзюна); *11–21* – знаходкі з шурфа-1 на помніку Шарэйкі-1, заходняя дзюна

фрагмент – з лінейным арнаментам, яшчэ адзін – з арнаментам з ліній і наколаў (мал. 6: *8*).

У паўднёвай частцы заходняй дзюны, каля дарогі, быў закладзены шурф плошчай 9 м^2. Паверхня ў месцы шурфоўкі слаба задзірванелая, паніжаецца з поўначы на поўдзень. Пад пластом супеску светашэрага колеру (0,05–0,15 м) залягаў больш насычаны цёмна-шэры супясчаны пласт, які меў таўшчыню 0,15 м каля ўсходняй сценкі і да 0,25 м у паўднёва-заходняй частцы. У гэтым пласце траплялася дробнае вуголле і фрагменты кальцынірваных костак. На глыбіні 0,10–0,15 м у паўночна-ўсходнім куце прасочана попельна-вугальная пляма памерамі 0,5 × 1,0 м, таўшчынёй да 10 см. У цэнтры шурфа (кв. 5) сустракаліся камяні невялікіх, да 15 см даўжынёй, памераў. Ніжэй ішоў пласт супеску цёмна-жоўтага колеру, які ў паўднёва-заходнім куце паказаўся ўжо на глыбіні першага пласта. На глыбіні 0,3–0,4 м залягаў мацерыковы пясок светла-жоўтага колеру. У кв. 1 расчышчана яма акруглай у плане формы, дыяметрам 0,26 м і глыбінёй 0,25 м, з чашападобным профілем. Запаўненне ямы – цёмна-жоўты супесак. Знаходак не зафіксавана.

Культурны пласт у месцы шурфоўкі часткова апоўз па схіле з больш высокай часткі помніка. У шурфе былі знойдзены шкляная пацерка сіняга (кобальтавага) колеру, шарападобнай формы. Яе дыяметр – 0,6 см, вышыня –0,5 см, адтуліна – прамая, дыяметр адтуліны – 0,15 см (мал. 6: *11*). Згодна з класіфікацыяй М. Маньчыньскай, пацерка адносіцца да групы 1, тыпу 23, храналагічныя рамкі – 160–375 гг. н. э. [6]. Таксама ў шурфе знойдзена

шэсць крамянёвых артэфактаў, сярод якіх прысутнічае фрагмент скрабка з дугападобнай працоўнай часткай, скрабач на адшчэпе, два фрагменты адшчэпаў, фрагмент адшчэпа з рэтушшу, луска. Ляпная кераміка – 85 фрагментаў, прадстаўлена вельмі дробнымі абломкамі пасудзін, пераважна першай паловы 1-га тысячагоддзя н. э. (мал. 6: *12–20*). Кераміка такая ж, як і з паверхневых збораў. Сустрэты некалькі фрагментаў неалітычных пасудзін. Сярод знаходак таксама моцна каразіраваны, выгнуты фрагмент жалезнага вырабу, магчыма, лязо нажа (мал. 6: *21*).

На ўсходняй дзюне помніка Шарэйкі-1 таксама былі праведзены паверхневыя зборы. Калекцыю склалі пласціна звычайная са слядамі двухпляцовачнасці (фінальны палеаліт; мал. 6: *10*), два дробныя абломкі неазначальныя, дробны фрагмент скола неазначальнага, а таксама фрагмент сценкі ляпной пасудзіны ДДК з накольчатым арнаментам, венца ляпной пасудзіны жалезнага веку з арнаментам з пальцавых уціскання па краі, чатыры фрагменты сценак ляпных пасудзін жалезнага веку. Знаходкі датаваны фінальным палеалітам, неалітам, каменным–бронзавым векам, раннім жалезным векам.

Шарэйкі-3 – помнік з матэрыяламі каменнага–бронзавага вякоў, ранняга жалезнага веку (мал. 3: *15*). Размешчаны на ўзгорках уздоўж паўднёвага берага старычнага воз. Пясчанка. Даўжыня – 140 м. Выявіў у 1961 г. У. Ф. Ісаенка, які аднёс яго да ДДК. На паўночным беразе былі знойдзены рэшткі рудні па выпрацоўцы крычнага жалеза [1, с. 48–49].

Абследаванні 2012 г. паказалі, што паверхня помніка слаба задзірванелая, на агаленнях культурнага пласта былі знойдзены: адшчэп, два фрагменты сценак ляпных таўстасценных пасудзін жалезнага веку светла-чырвонага і шэрага колеру, абломак ганчарнай пасудзіны.

Юравічы-2 – стаянка з матэрыяламі каменнага–бронзавага вякоў (мал. 3: *17*). Лакалізавана за 1,0–1,5 км на паўднёвы захад ад цэнтра вёскі, на пясчаных узгорках. Помнік адкрылі і абследавалі ў 1929–1931 гг. К. М. Палікарповіч і А. Дз. Каваленя, у 1960–1965 гг. даследаваў У. Ф. Ісаенка [9; 1, с. 42–43; 2, с. 4–5].

Абследаванне 2012 г. паказала, што помнік парос лесам, культурны слой парушаны дарогамі, якія вядуць з вёскі да пашы. На паверхні адной з дарог былі сабраны 23 крамянёвыя артэфакты: нуклеус аднапляцовачны ад пласцін без афармлення бакоў і контрфронта (мал. 5: *15*), дзве медыяльныя часткі пласцін (мал. 5: *14*), пласціна звычайная, праксімальная частка пласціны з рэтушшу, сем адшчэпаў, чатыры дробныя абломкі неазначальныя, сем лусак. Таксама былі знойдзены чатыры фрагменты сценак ляпных пасудзін бронзавага веку (?).

Агледжана таксама стаянка каменнага веку, паселішча эпохі жалеза–ранняга сярэдневякоўя Юравічы-6 (мал. 3: *16*). Помнік размешчаны за 1,2 км на захад ад вёскі, на заходнім беразе старычнага воз. Ліцвін, у паўночнай частцы паселішча **Юравічы-4**. Выявіў у 1962 г. У. Ф. Ісаенка [2, с. 4–5], у 1976 г. В. Б. Пярхаўка даследаваў рэшткі двух жытлаў «VI–VIII стст.» [10].

Уніз па цячэнні Прыпяці, на поўдзень ад в. Юравічы былі агледжаны помнікі паміж в. Слабодка і в. Абухаўшчына. Тут, па берагах старычных воз. Грыбное, Бернатова, Буян і Млін, у пачатку 1960-х гадоў У. Ф. Ісаенка зафіксаваў паселішчы з раннеславянскімі матэрыяламі [3, с. 12–16; 1, с. 50]. Сёння паверхня большасці помнікаў задзірванелая, знаходкі былі выяўлены толькі на адным з іх.

Абухаўшчына-2 – помнік з матэрыяламі каменнага–бронзавага вякоў (мал. 3: *19*). Знаходзіцца за 1 км на паўночны ўсход ад вёскі, каля вясковых могілак, на полі, якое з усходу абмежавана лагчынай. Выявіў у 1961 г. У. Ф. Ісаенка [1, с. 50]. У 2012 г. на агаленнях культурнага пласта былі знойдзены дробны фрагмент скола неазначальнага, фрагмент сценкі ляпной пасудзіны ШКПТ з лінейным штампам (таўшчыня 0,9 см, гладкая, дамешка шамоту).

У выніку разведак, праведзеных вясной–летам 2012 г. у Драгічынскім раёне, было выяўлена восем месцазнаходжанняў матэрыялаў, у асноўным каменнага веку–эпохі бронзы. У Мазырскім і Калінкавіцкім раёнах абследаваны ўчастак левабярэжжа Прыпяці, агледжаны вядомыя помнікі (Пхоў-2, Баравікі-6, Юравічы-2, 6 і інш.), а таксама выяўлена сем новых (Новікі (дачы)-1, -2; Лубня-6, -7, -10; Рудня Горбавіцкая-3; Града-4). Сярод адкрытых помнікаў 1-га тысячагоддзя н. э. для правядзення далейшых даследаванняў найбольш перспектыўным выглядае паселішча жалезнага веку Рудня Горбавіцкая-3. У выніку паверхневых збораў і шурфоўкі (9 м^2), праведзеных на помніку Шарэйкі-1, была сабрана прадстаўнічая калекцыя археалагічных матэрыялаў каменнага–бронзавага вякоў і эпохі жалеза.

Літаратура

1. Исаенко, В. Ф. Отчет о полевых исследованиях, проведенных в 1961 г. в бассейне р. Припять / В. Ф. Исаенко // ААНД «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Спр. № 159, 137 (альбом). – 101 с. : 232 ил., 1 карта.

2. Исаенко, В. Ф. Отчет о полевых исследованиях в 1962 г. / В. Ф. Исаенко // ААНД «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Спр. № 158, 158а (альбом). – 60 с. : 49 ил.

3. Исаенко, В. Ф. Отчет о полевых исследованиях за 1964 г. / В. Ф. Исаенко // ААНД «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Спр. № 233, 233а (альбом). – 52 с. : 40 рис.

4. Исаенко, В. Ф. Отчет о полевых исследованиях в Полесье в 1970 году / В. Ф. Исаенко // ААНД «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Спр. № 375. – 30 с.

5. Исаенко, В. Ф. Отчет о полевых исследованиях 1979 года на территории Полесья / В. Ф. Исаенко // ААНД «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Спр. № 638. – 44 с.

6. Исаенко, В. Ф. Отчет о полевых исследованиях памятников каменного и бронзового веков на территории Полесья в 1980 году / В. Ф. Исаенко // ААНД «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Спр. № 680. – 22 с. : 84 рис.

7. Исаенко, В. Ф. Отчет Припятского отряда о полевых работах в 1987 году / В. Ф. Исаенко // ААНД «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Спр. № 1035. – 22 с.

8. Крукоўскі, А. Я. Жалезная руда на Мазыршчыне / А. Я. Крукоўскі // Наш край. – Менск, студзень 1928. – № 1 (28).– С. 24–27.

9. Палікарповіч, К. М. Досьледы культур каменнага і бронзавага пэрыодаў у БССР у 1930–1931 гг. / К. М. Палікарповіч // Працы сэкцыі археолёгіі. – Менск, 1932. – Т. 3. – С. 227–228.

10. Перхавко, В. Б. О раннесредневековых памятниках V–VIII вв. в Центральной части Левобережья Припяти / В. Б. Перхавко // Археологічні студії / Інститут археології НАН України, Буковинський центр археологічних досліджень при Чернівецькому державному університеті ім. Ю. Федьковича. – Київ ; Чернівці : Прут, 2000. – Вип. 1. – С. 163–173.

11. Федарака, Б. Помнікі старасьветчыны у Мазыршчыне / Б. Федарака // Наш край. – Менск, 1926. – № 4–5. – С. 51–52.

Резюме

Е. Ф. Касюк, А. Н. Вашанов

Результаты археологических исследований на Полесье в 2012 году

В 2012 г. разведки проводили на территории Дрогичинского района Брестской области, Мозырского и Калинковичского районов Гомельской области. В Дрогичинском районе было выявлено восемь местонахождений каменного–бронзового веков (Закозель-1; Ялоч-1, -2; Язвины-1; Липники-1, -4). В Мозырском и Калинковичском районах по левому берегу Припяти обследовано 11 известных памятников (Пхов-2; Боровики-2, -6; Юровичи-2, -6; Слободка-1 и др.) и восемь новых (Новики (дачи)-1, -2; Лубня-6, -7, -10; Рудня Горбовичская-3; Гряда-4). На памятнике Шарейки-1 проведена шурфовка (9 м^2), найдено 236 артефактов. Археологический материал, полученный в ходе разведок, относится в основном к каменному–бронзовому векам, эпохе железа.

Summary

A. F. Kasjuk, A. N. Vashanau

The results of archaeological research in Paljessje in 2012

In 2012 the authors conducted archeological investigations on the territory of Drahičyn district of Brest region, Mazyr, and Kalinkavičy districts of Homel region. 8 sites of Stone – and Bronze Ages (Zakoziel-1; Jalač-1, -2; Jazviny-1; Lipniki-1, -4) was found in Drahičyn district. 11 known sites (Pkhoŭ-2; Baraviki-2, -6; Juraviču-2, -6; Slabodka-1 and others) and 8 new sites (Noviki-1, -2; Lubnja-6, -7, -10; Rudnja Horbavickaja-3; Hrada-4) were examined on the left bank of Prypjać in Mazyr and Kalinkaviči districts. A test pits (9 sq. m) was excavated on Šarejki-1 site and 236 artifacts was found. Archaeological material obtained in the course of investigations refers mainly to the Stone–Bronze and Iron Ages.

Паступіў 17.05.2013 г.

УДК [902/904+903.4](476.5)

***М. В. Клімаў**, Інстытут гісторыі НАН Беларусі, аддзел захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны, кандыдат гістарычных навук (г. Мінск, Беларусь)*

Археалагічныя доследы на помніках Полацкага Падзвіння ў 2012 годзе

У 2012 г. археалагічныя доследы на помніках Полацкага Падзвіння праводзілі ў некалькіх накірунках. Першы з накірункаў быў спалучаны з дадатковым абследаваннем помнікаў каля воз. Лепельскае, берагавой лініі паўднёвага берага возера ў г. Лепель і замчышча, селішча XIV–XVI стст. каля в. Стары Лепель Лепельскага раёна (мал. 1: *6*) з мэтай вызначэння межаў зоны аховы культурнага пласта ў межах выканання дзяржаўнай праграмы «Замкі Беларусі». Другі накірунак доследаў быў звязаны з выкананнем планавай пяцігадовай дзяржаўнай тэмы (раздзел № 1.5.11) і прадугледжваў археалагічныя раскопкі на селішчы № 2 каля воз. Ворань Лепельскага раёна (мал. 1: *1*). Трэці накірунак адпавядаў задачы абследавання помнікаў, якія знаходзіліся у зоне будаўніцтва Полацкай ГЭС каля в. Лучна Полацкага раёна (мал. 1: *5*). Чацверты накірунак датычыўся асобных разведак на тэрыторыі Полацкага Падзвіння (мал. 1: *2–4*). На шэрагу помнікаў у археалагічных працах актыўны ўдзел прыняў малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі П. М. Кенька.

Папярэдняе абследаванне паўднёвага берага воз. Лепельскае ў г. Лепель праводзілі з мэтай вызначэння перспектыўных участкаў для будучых археалагічных раскопак у сувязі з праблемай храналогіі ўзнікнення г. Лепель на месцы паселішча Белае. У выніку было праведзена абследаванне часткі паўднёвага берага воз. Лепельскае на тэрыторыі г. Лепель, якая знаходзілася за 100 м на захад ад гарадскога парку (мал. 2, *А: II*) на прысядзібных прыватных участках была засведчана наяўнасць керамічнага посуду XVI–XVIII стст. і больш пазнейшага часу, частка з якога мела паліву (мал. 2, *Б*). У зрэзах абрынутага берага возера быў зафіксаваны вялікі культурны пласт, які перавышаў 0,6–0,8 м.

Пасля абследавання берагавой лініі ў г. Лепель была праведзена праца і на замчышчы, селішчы каля в. Стары Лепель, якія змяшчаліся на паўвыспе Лепельскага возера (мал. 2, *А: I*). Да пачатку археалагічных прац у 2012 г. на паўвыспе каля в. Стары Лепель, дзе змяшчалася замчышча, два селішчы і гарадзішча перыяду ранняга жалезнага веку, у другой палове XX – пачатку XXI ст. даследаванні былі праведзены Г. В. Штыхавым, М. А. Ткачовым, А. Г. Мітрафанавым, Ю. А. Заяцам і З. А. Харытановіч [2, с. 322; 6, с. 300]. Праца на замчышчы ўскладнялася тым, што існавала праблема ідэнтыфікацыі месцазнаходжання раскопак М. А. Ткачова на плошчы 444 м^2, аб чым аўтарам артыкула ўжо паведамлялася ў адной з ранейшых публікацый [4, с. 25–28].

Для вызначэння межаў зоны аховы культурнага пласта на той частцы замчышча, якую не ахапілі археалагічныя працы, было закладзена пяць шурфоў агульнай плошчай 8 м^2 (мал. 3, *А*). Асноўны вынік археалагічнай дзейнасці ў 2012 г. на замчышчы датычыўся ўдакладнення наяўнасці культурнага пласта ў паўднёвай, цэнтральнай і ўсходняй частках паўвыспы, аб чым сведчылі матэрыялы шурфоў № 1–5. Закладанне шурфоў № 1, 2 паказала адсутнасць культурнага пласта ва ўсходняй частцы паўвыспы, побач з могілкамі. Культурны пласт адсутнічаў і ў іншых месцах паўвыспы, што пацвердзіла выснову Ю. А. Заяца аб тым, што культурны пласт на паўвыспе размеркаванны нераўнамерна, плямамі [2, с. 323]. Цікавыя матэрыялы былі прадстаўлены ў шурфе № 4. Запаўненне шурфа складалася з шэрага супеснага пласта магутнасцю да 0,42–0,45 м, у якім былі выяўлены цвікі (мал. 3, *Б: 1, 2*), частка іголкі (мал. 3, *Б: 3*), фурнітурная пяцелька (мал. 3, *Б: 4*), фрагменты керамічнага посуду XIV–XVII стст., некаторыя з якіх мелі паліву (мал. 3, *Б: 5–11*), фрагмент ваконнага шкла з моцным следам іррызацыі, што дазволіла зрабіць выснову аб тым, што шурф № 4 патрапіў на частку аднаго з паселішчаў, дзе знаходзілася жытло заможнага мешчаніна



Мал. 1. Карта асноўных помнікаў, на якіх праводзілі доследы ў 2012 г.: *1* – Ворань; *2* – Лісна; *3* – Бешанковічы; *4* – Лужасна, Бібярэўка; *5* – Лучна-2, Лучна-3; *6* – Лепель, Стары Лепель



Мал. 2. Карта археалагічнага абследавання возера Лепельскае (*А*): *I* – замчышча, селішча в. Стары Лепель; *II* – частка берагавой лініі, дзе былі ажыццёўлены паверхневыя зборы. Керамічныя матэрыялы з паўднёвага берага возера (*Б*): *2* – цёмна-зялёная паліва, *3* – салатавая паліва

ці шляхціча [5, с. 12]. У шурфе № 5 адзін з венцаў керамікі па форме быў блізкі па храналогіі да перыяду XII–XIII ст. (мал. 3*, Б: 12*) У выніку археалагічных доследаў на замчышчы, селішчы XIV–XVI стст. каля в. Стары Лепель Лепельскага раёна было праведзена вызначэнне межаў зоны аховы культурнага пласта і зроблена выснова аб павелічэнні храналогіі гэтага помніка да XVII ст., бо пасля перанясення цэнтра паселішча на месца Белае, жыццядзейнасць на паўвыспе не перапынілася.

Другі накірунак археалагічнай дзейнасці ў 2012 г. звязваўся з мікрарэгіёнам воз. Ворань, які часткова вывучаўся ў другой палове XX ст. Тут было вядома гарадзішча, курганны могільнік, стаянка I, стаянка II (даследаваў Э. М. Зайкоўскі) і селішча I, якое было датавана VI–VIII стст., IX–XI стст. (абследавалі Л. В. Аляксеяў, Ю. А. Заяц) [1, с. 10, 14; 3, с. 277–278]. У маі 2012 г. пры ажыццяўленні археалагічнай разведкі аўтарам было выяўлена селішча-2, на якім і былі спланаваны археалагічныя



Мал. 3. План археалагічных прац на паўвыспе каля в. Стары Лепель (*А*): *I, II, III, 1, 2* – месцы прац Ю. А. Заяца; *В* – гарадзішча і селішча, месца працы З. Харытановіч, 2008 г.; × – адсутнасць культурнага пласта. Матэрыялы з шурфоў (*Б*): *1–4* – чорны метал; *5–12* – кераміка

раскопкі, што праходзілі ў жніўні 2012 г. Для археалагічных раскопак была абрана частка селішча, якая знаходзілася за 40–55 м ад берага воз. Ворань. Плошча раскопу склала 80 м^2. Агульная магутнасць культурнага пласта, які складаўся з цёмна-шэрай супесі, вагалася ў межах 0,33–0,42 м. Верхні раскопачны пласт (0–0,2 м ніжэй дзённай паверхні) быў пашкоджаны разворваннем. На ўзроўні другога раскопачнага пласта былі зафіксаваны рэшткі былой печы, аб чым сведчыла вялікая прапластка абпаленай гліны, магутнасцю да 0,3 м (яна ж запаўняла і падпечкавую мацерыковую яму), камяні, кавалкі абпаленага дрэва. Пры далейшай расчыстцы аб'екта былі выяўлены вялікія кавалкі глінянай абмазкі са слядамі вапны. У межах аб'екта «печ» быў знойдзены нож (мал. 4: *13*), накладка (мал. 4: *10*), рыбалоўны кручок і добра захаваны паплавок для рыбалоўных сетак, зроблены з бяросты. Пераважаючая большасць фрагментаў венцаў, выяўленых побач з аб'ектам і ў аб'екце, належала па храналогіі да XIV ст. (мал. 4: *2–4*). У мацерыку было выяўлена і вывучана 15 мацерыковых ям, адна з якіх адносілася да аб'екта «печ» і з'яўлялася падпечкавай, астатнія ямы – слупавыя, падфундаментныя ровікі і гаспадарчага прызначэння. І ў гэтых ямах пераважаючую колькасць фрагментаў складалі венцы гаршкоў, якія былі датаваны ў межах XIV – пачатку XV ст.

Для ўдакладнення памераў паселішча акрамя раскопу I былі закладзены тры шурфы, памерамі 1 × 1 м, два з іх ліку патрапілі на невялікія мацерыковыя ямы.

Асноўнымі артэфактамі з помніка з'яўляліся фрагменты керамікі, сярод якіх адзначаецца пры-



Мал. 4. Матэрыялы з селішча-2 на беразе воз. Ворань: *1–4* – кераміка; *5–10* – сплавы на аснове бронзы; *11, 12* – камень; *13* – метал (нож)



Мал. 5. План месцазнаходжання археалагічных помнікаў Лучна-2, Лучна-3 (*А*), выгляд «геадэзічных маякоў» (*Б;* стрэлкамі ўказаны рэшткі культурнага пласта) і матэрыялаў (*В*) з помніка Лучна-2: *1–5* – сплавы на аснове бронзы; *6* – свінец, *7* – падкова з ухналём; *8–12* – кераміка

сутнасць аднаго ляпнога венца X ст. (?), венцаў, звернутых унутр і датаваных канцом XI – першай паловай XIII ст. (мал. 4: *1*). Пераважная колькасць керамічных матэрыялаў датавана ў шырокім храналагічным дыяпазоне: ад XIII да XVI ст. Акрамя керамікі на селішчы-2 былі выяўлены бронзавыя пярсцёнкі дротавыя і са шчытком (мал. 4: *8*), часткі бранзалетаў (мал. 4: *5*), крыжыкі-цельнікі (мал. 4: *7*), прывескі, у тым ліку ў выглядзе коніка (мал. 4: *6*), накладкі (мал. 4: *10*), спражкі (мал. 4: *9*), двушыпны наканечнік стралы, частка матыкі і сякеры, шыферныя праселкі (мал. 4: *11*), асялок (мал. 4: *12*).

Вельмі важнай знаходкай з'яўлялася частка дзірхема, выяўленая па-за межамі закрытага комплекса. Вызначэнне знаходкі было праведзена Вячаславам Куляшовым (Эрмітаж), які датаваў манету ў шырокіх храналагічных межах: другая–трэцяя чвэрць X ст. Зрабіўшы супастаўленне гэтай знаходкі з некаторымі фрагментамі керамікі і рэчамі, характэрнымі для культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў (мал. 4: *5*), магчыма казаць з дапушчэннем аб існаванні селішча-2 у X ст., але комплексы гэтага перыяду ў межы даследаванай плошчы не патрапілі.

Археалагічныя матэрыялы сведчаць аб тым, што была вывучана частка паселішча, заснаваная ў канцы XIII ст. (пачатку XIV ст.), якая актыўна існавала ў XIV ст. (пачатку XV ст.). На гэта ўказваюць як керамічныя матэрыялы, так і індывідуальныя знаходкі. Пераважная колькасць керамічных вырабаў і вырабаў з металаў адносілася да XIV ст.

У межах трэцяга накірунку археалагічнай дзейнасці ў 2012 г. быў спланаваны археалагічны нагляд (III) на помніках Лучна-2, Лучна-3, якія былі размешчаны па правым беразе р. Заходняя Дзвіна ў месцы будаўніцтва Полацкай ГЭС (мал. 5: *А*). Нягледзячы на існаванне ў будаўнікоў схемы месцазнаходжання археалагічных помнікаў, без паведамлення археолагаў, селішча Лучна-3 было амаль поўнасцю засыпана часова складзеным грунтам, а селішча Лучна-2 амаль поўнасцю знішчана будаўнікамі. Ад селішча засталіся толькі, часткова, усходняя і паўночна-усходняя часткі, культурны пласт бліжэй да ручаіны. На знішчанай частцы селішча праводзілі зачыстку рэшткаў плямаў культурнага пласта. Асаблівасцю селішча з'яўлялася яго заснаванне на суглінкавым мацерыку, што выключала знаходжанне гаспадарчых і падпечкавых ям. Па гэтай прычыне ямы на селішчы амаль не былі зафіксаваны. Акрамя таго, былі зачышчаны «геадэзічныя маякі» (мал. 5, *Б*), якія дазволілі скласці ўражанне аб стратыграфіі і магутнасці напластаванняў на селішчы Лучна-2. Магутнасць культурнага пласта «па маяках» складала ад 0,40 да 0,55 м. У стратыграфіі пласта селішча было зафіксавана мелкае вуголле, фрагменты абпаленай гліны, камяні, некаторыя з якіх мелі абпалены стан. Фіксацыя вуголляў пры зачыстцы профіляў «маякоў» не з'яўлялася выпадковасцю, як гэта засведчылі працы ў іншых частках плошчы былога паселішча. У паўднёва-заходняй частцы селішча была зачышчана пляма культурнага пласта, якая захавалася на перадмацерыку. Гэта пляма складалася з цёмна-шэрага пласта з вялікімі, да 1–3 см, украпінамі абпаленай гліны, вуголлямі і вялікімі кавалкамі сценак керамічнага посуду. Пры зачыстцы другой плямы культурнага пласта на перадмацерыку ў паўднёвай частцы селішча Лучна-2 таксама былі зафіксаваны мелкія вугольчыкі і раструшчаны ад уздзеяння пажару камень.

Такім чынам, была абследавана ўся пляцоўка селішча Лучна-2 на глыбіні не болей за 0,1 м, сабраны пад'ёмны матэрыял. Відавочна, што ў ніжняй частцы пласта селішча былі зафіксаваны сляды пажару. Акрамя фрагментаў бытавой керамікі XVI–XVII стст. (мал. 5: *8–12*) на пляцоўцы селішча былі выяўлены два грузілы для сетак, манета XVII ст. (?), спражкі (мал. 5: *1–3*), пярсцёнак (мал. 5: *4*), накладка на торбу (мал. 5: *5*), круглая свінцовая куля (мал. 5: *6*). У выніку магчыма было зрабіць выснову аб тым, што рэшткі культурнага пласта і матэрыялы (фрагменты керамікі, манета, спражкі) сведчылі на карысць таго, што асноўны перыяд жыццядзейнасці на паселішчы Лучна-2 неабходна звязваць з перыядам другой паловы XVI ст. – першай паловы XVII ст. Сляды пажару ў ніжняй частцы пласта селішча дакладна датаваць не ўдалося.

Акрамя археалагічных раскопак былі праведзены лакальныя разведкі на вясковых селішчах побач з Бешанковічамі (мал. 1: *3*), у Верхнядзвінскім раёне – на помніку Лісна (мал. 1: *2*), і ў Віцебскім раёне – на селішчах Лужасна і Бібярэўка (мал. 1: *4*). На помніках былі выяўлены керамічныя матэрыялы і індывідуальныя знаходкі ў невялікай колькасці. У в. Лісна была зафіксавана наяўнасць сякеры-кліна.

Прыведзеныя даныя адлюстроўваюць шырокія храналагічныя межы і разнастайнасць матэрыялаў, што вынікае з агляду розных храналагічных перыядаў вясковых паселішчаў Полацкага Падзвіння, на якіх былі праведзены археалагічныя працы ў 2012 г.

Літаратура

1. Зайкоўскі, Э. М. Першабытныя помнікі Паўночнай Беларусі / Э. М. Зайкоўскі. – Мінск : Беларус. навука, 1991. – 41 с.

2. Заяц, Ю. А. Полевые исследования 2008 г. (работы в Старом Лепеле и Минске) / Ю. А. Заяц // МАБ. – 2011. – Вып. 20. – С. 322–328.

3. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭН, 1985. – 496 с. : іл.

4. Клімаў, М. В. Невядомыя матэрыялы з замчышча Лепеля ў фондзе сярэднявечча і новага часу / М. В. Клімаў // Лепельскія чытанні : матэрыялы III навук.-практ. канф., Лепель, 10 кастр. 2008 г. – Віцебск : ВЦ ГСУВО, 2008. – С. 25–29.

5. Клімаў, М. В. Дадатковыя археалагічныя даследаванні на паўвыспе каля в. Ст. Лепель у сувязі з праблемай вызначэння ахоўнай зоны помніка археалогіі «замчышча, селішча XIV–XVI стст.» / М. В. Клімаў // Лепельскія чытанні : матэрыялы V навук.-практ. канф., Лепель, 21–22 верас. 2012 г. – Віцебск : Віцебская абласная друкарня, 2012. – С. 9–15.

6. Харытановіч, З. А. Археалагічныя даследаванні на гарадзішчы і селішчы Стары Лепель у 2008 г. / З. А. Харытановіч // МАБ. – 2011. – Вып. 20. – С. 300–307.

Резюме

М. В. Климов

Археологические исследования на поселениях Полоцкого Подвинья в 2012 году

Представлены основные материалы и предварительные выводы относительно старых и новых археологических памятников. На памятнике Старый Лепель определена зона охраны археологического слоя. Впервые проведены археологические раскопки на средневековом сельском поселении (№ 2) на озере Ворань. Приведены сведения о разрушении сельского поселения Лучно-2 в результате строительства Полоцкой электростанции.

Summary

M. V. Klimau

Archaeological research in the settlements of Polatsk Podzvinne in 2012

The article presents the basic materials and preliminary conclusions regarding the old and new archaeological sites. On the monument Old Lepel was defined area of archaeological layer. Were first carried out archaeological excavations at the medieval village settlement (N 2) Lake Voran. The article presents data on the destruction of the rural settlement Luchna-2 as a result of the construction of Polatsk plant.

Паступіў 16.05.2013 г.

УДК 903.4(476.6)

А. В. Колосов, *Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова, исторический факультет, заместитель декана по учебной и научной работе, кандидат исторических наук, доцент (г. Могилев, Беларусь)*

Археологические работы 2012 года в Посожье[1]

В 2012 г. было продолжено изучение неолитической стоянки Старый Дедин-4 в Климовичском районе. Памятник был открыт автором и местным краеведом М. П. Дуктовым в 2006 г. [2, с. 37–41, 120–121]. Раскопки стоянки проводили на мысовидном участке берега, на котором в 2010 г. было обнаружено новое скопление материалов эпохи неолита. Там же впоследствии были проведены небольшие стационарные работы на площади 30 м^2 [4].

За полевой сезон 2012 г. была вскрыта площадь 172 м^2, которая являлась продолжением исследованного в 2010 г. раскопа в западном и южном направлениях. Раскоп был ориентирован по сторонам света. Длинная сторона сетки квадратов со стороной равной 1 м была вытянута с севера на юг и получила цифровое обозначение от 16 до 11, 1 до 10 и 17 до 20 включительно, с востока на запад – буквенное (А, Б, В, Д, Е, Ж, З, И, К, Л).

Стратиграфия основной части памятника аналогична стратиграфии раскопа 2010 г.:

1) дерн – 0–0,07 (0,10) м. Переход в нижележащий слой заметный;

2) подзолистый горизонт темно-серого цвета с затеками в нижней части – 0,10–0,20 (0,25) м. Горизонт нарушен процессами эоловой дистурбации, о чем свидетельствует видимые локализации желтого песка в его структуре. Переход в нижележащий слой нечеткий;

3) мелкозернистый песок желтого цвета – 0,20 (0,25) м. Прокопан на глубину до 0,6 м. Единственно отличие от стратиграфии раскопа 2010 г. наблюдалось на северном участке раскопа в пределах кв. Г–Л-3–14. Здесь квадратами раскопа был затронут пониженный котлообразный участок террасы, на котором подзолистый горизонт на гл. 0,30–0,45 м перекрывался тонкой (0,10–0,15 м) прослойкой темно-серой супеси плотной комковатой структуры.

В ходе раскопок на гл. 0,41–0,57 м были выявлены нарушения почвенного горизонта, четко выделявшиеся на фоне желтого песка пятнами темно-серого цвета (их порядковая нумерация дана с учетом остатков очага изученных нами в 2010 г., которому мы условно дали название *«объект № 1»*). Пятно *объекта № 2* было зачищено в пределах кв. Г–З-1–5 на гл. 0,42–0,43 м. В плане структура имела неправильную форму, похожую на цифру «восемь», и была вытянута с юго-востока на северо-запад на 4,83 м, при ширине от 2,02 м в юго-восточной части (кв. Г–Е-4) до 3,42 м в северо-западной (кв. Г-З-1). Заполнение объекта представлено темно-серым песком, профиль линзовидный. Мощность – от 0,63 м (кв. Г–Е-4) до 0,77 м (кв. Г–Е-4).

Основная часть находок, особенно фрагментов лепной керамики эпохи неолита, была сконцентрирована в юго-восточной части объекта. Значительное число артефактов собрано в пределах кв. Г-4 и Д-3. Среди изделий из кремня обнаружены осколки кремня без видимых следов обработки (3 ед.), одно- и двухплощадочные нуклеусы и их обломки (4 ед.), отщепы (111 ед.), пластины (15 ед.), мелкие осколки (6 ед.). Орудия труда (23 ед.) представлены концевыми и двойным скребками (4 ед.), скреблами (2 ед.), долотовидными изделиями (2 ед.), пластинами-вкладышами (2 ед.), резцом на сломе заготовки, ретушным резцом, изделием с выемкой, отщепами (7 ед.) и пластинами (2 ед.) с ретушью.

Керамический материал представлен 131 фрагментом лепной неолитической керамики, большая часть которой украшена вдавлениями ямок и гребенки, «лапчатым» орнаментом, и тремя обломками лепной посуды эпохи бронзы, на поверхности которой сохраняются горизонтальные пояса оттисков веревочки. Полностью изучить объект в северо-западном направлении нам не удалось. В кв. Г–Л-11–14, где исследования вели на пониженном участке берега, на гл. 0,30–0,45 м почвенный слой был перекрыт плотной и комковатой темно-серой супесью и, контуры объекта, его форму, проследить оказалось невозможным.

Объект № 3 обнаружен в кв. Ж–З-4–5 на гл. 0,51 м. Представлял собой овальное пятно размером 1,64 × 1,05 м. Заполнение – темно-серый песок. Мощность – 0,46 м. Профиль линзовидный. В заполнении найдены 15 изделий из кремня (12 отщепов, тесло, фрагмент трапеции, обломок бифасиального наконечника стрелы).

Объект № 4 зачищен в кв. И–Л-3–6 на гл. 0,54–0,57 м. Представлял собой размытое скопление пятен неправильных очертаний темно-серого цвета, размером с юга на север 3,86 м, с востока на запад –

[1] Исследования проводили в рамках выполнения задания «Динамика развития и взаимодействия культур финального палеолита–мезолита Белорусского Поднепровья и Посожья в контексте восточноевропейских культурно-исторических процессов», включенного в Государственную комплексную программу научных исследований «История, культура, общество, государство» на 2011–2015 гг. (№ госрегистрации 20112350 от 08.08.2011 г.).

2,12 м. Профиль линзовидный. Находок не обнаружено.

Объект № 5 исследован частично в кв. Б–В-20. Часть пятна была ограничена южной стенкой раскопа. Зачищен на глубине 0,41 м. Имеет неправильные подовальные очертания. Размеры пятна составляют 1,13 × 1,00 м, мощность заполнения (темно-серый песок) равна 0,43 м. Профиль линзовидный. Среди находок: 12 изделий из кремня (два осколка кремня без видимых следов обработки, семь отщепов, два мелких осколка, отщеп с ретушью) и 45 фрагментов лепной керамики эпохи неолита, украшенных ямочно-гребенчатым орнаментом.

Объект № 6 локализован в кв. Г-17 на глубине 0,43 м. Имел неправильную подовальную форму. Размеры пятна 1,20 × 1,00 м, мощность заполнения (темно-серый песок) равна 0,08 м. Профиль линзовидный. Обнаружена только стенка от лепного сосуда эпохи неолита.

Генезис изученных объектов остается не ясным. Возможно, объект № 2 может представлять собой остатки неолитического жилища, о чем свидетельствует восьмиобразная форма пятна («жилище с тамбуром» ?), состав собранных в его пределах находок, характер их распределения. Эпохой неолита, видимо, следует датировать и остатки двух ям (объекты № 3 и 5). Относительно остальных объектов № 4 и 6 сказать что-либо сложно. Нельзя исключать, что выделенные нами структуры могут являться примером естественных и/или антропогенных нарушений почвы в более позднее время. С учетом дистурбации слоя, который условно можно назвать «культурным» по уровню вертикального распространения находок, верхние границы профиля отдельных объектов проследить не удалось.

В результате раскопок на стоянке Старый Дедин-4 собрано 8728 находок. Основная их часть относится к изделиям из кремня (6332 ед.), остальные представлены фрагментами лепной керамики эпохи неолита (2160 ед.), лепной керамики бронзового века (35 ед.) и гончарной керамики (198 ед.), тремя обломками косточек. Первые находки были встречены уже в слое дерна (340 ед.), в том числе: три осколка кремня и осколок кварцита без следов искусственной обработки, два обломка нуклеусов, 201 отщеп, 24 пластины, 59 мелких осколков, 25 орудий труда (три скребка, четыре изделия с выемкой, четыре вкладыша, две проколки, две трапеции, шесть отщепов и четыре пластины с ретушью), а также 19 фрагментов лепной неолитической керамики и шесть обломков гончарной посуды.

Анализ послойного распространения всех находок (изделия из кремня, фрагменты лепной и гончарной керамики, обломки костей) в раскопе показывает максимальную их концентрацию на глубине 0,10–0,35 м. При этом в слое 1 был найден 1441 артефакт, в слое 2 – 2350, в слое 3 – 3046, в слое 4 – 999, в слое 5 – 162, в слое 6 – 3 артефакта. Следовательно, заметна связь значительного числа вещевого материала с подзолистым горизонтом и верхней частью слоя песка желтого цвета.

Изделия из кремня и фрагменты лепной керамики были равномерно распределены по всей площади раскопа. В качестве сырья для производства орудий на стоянке служил кремень серого и светло-серого цвета со слабым голубоватым оттенком, имеющий вкрапления мела и пятнистую структуру. Свидетельством первичного расщепления кремня на месте стоянки является наличие нуклеусов и полученных с них сколов, в том числе и первичных. Для этих целей использовали уплощенно-овальные желваки и куски кремня – 61 ед. (1%)[1], принесенные на место древнего поселения. Судя по пренуклеусам и нуклеусам, преимущественно использовали кремневые желваки небольших размеров: их длина в среднем достигает 40–50 мм, диаметр – 40 мм.

Среди находок преобладают продукты расщепления кремня – 90,8%, а среди них доминирующее положение занимают отщепы – 4044 ед. (63,9%), мелкие осколки и чешуйки кремня – 1118 (17,7), пластины – 555 (8,8) и пренуклеусы и нуклеусы – 25 ед. (0,4%). Нуклеусы представлены одноплощадочными (14 ед.) и аморфными формами и их обломками (7 ед.), при подчиненном положении двухплощадочных (2 ед.) и пренуклеусов (2 ед.).

Снятие заготовок осуществляли преимущественно в одной плоскости нуклеуса. Огранка скалывающих поверхностей ядрищ сохраняет преимущественно негативы отщепов и пластинчатых сколов. Площадки формировали одним сколом с последующей подправкой в процессе расщепления. Угол между ударной площадкой и скалывающей поверхностью составляет 70–90°.

В орудийный комплекс входит 501 изделие (7,9%), на котором присутствуют элементы вторичной обработки: крутого, полукрутого и плоского ретуширования, техники резцового скола, обивки, шлифования (рис. 1). Морфологически выраженных орудий – 278 ед., остальные представлены отщепами (151 ед.), пластинами (62 ед.) и мелкими осколками (2 ед.) с ретушью, изделиями неизвестного назначения, их преформами и обломками (8 ед.).

В качестве заготовок для основной части орудий были использованы отщепы, естественные осколки кремня и конкреции, реже пластины. В группе морфологически выраженных орудий количественно преобладают скребки (82 ед., или 29,5% внутри группы орудий), а среди них – изделия концевых форм с дугообразным лезвием, при наличии не-

[1] Здесь и далее дается суммарное количество находок в раскопе, заполнениях объектов и просеянном дерне.



Рис. 1. Кремневый инвентарь стоянки: *1–3* – наконечники стрел и дротика; *4–6* – трапеции; *7–8, 14* – скребки; *9, 13* – проколки; *10–12* – изделия с выемкой; *15* – нож. Стоянка Старый Дедин-4. 2012 г.

значительного числа двойных (8 ед.), подокруглых (6 ед.), боковых (3 ед.) и трех обломков скребков.

Среди остальных орудий необходимо указать: изделия с выемкой (32 ед.), вкладыши (29 ед.), средневысокие и высокие трапеции (20 ед.), проколки (20 ед.), скребловидные орудия (15 ед.), ретушные, двугранные и на сломе заготовки резцов (13 ед.), ножи и их обломки (12 ед.), острия (5 ед.), развертки (2 ед.), рубящие орудия в виде топоров, тесел и долот (11 ед.), микропластины с затупленным краем (2 ед.), пластины со скошенным концом (3 ед.), зубчато-выемчатое орудие и комбинированные орудия (4 ед.). Группа предметов вооружения представлена наконечниками стрел и дротиков ромбовидной, листовидной, треугольно-черешковой и треугольной форм, заданной путем двухсторонней обработки (27 ед.). Интересны находки каменных терочников (8 ед.), отбойников (4 ед.) и ретушеров (16 ед.).

На памятнике обнаружено 2160 фрагментов лепной неолитической керамики (рис. 2). Это обломки серого или желтого цвета от сосудов с прямым или слегка отогнутым наружу венчиком и толщиной стенок от 4 до 13 мм. В тесте керамики визуально определяются примеси песка и растительности, которая после обжига оставила на стенках сосудов характерные отпечатки.

Поверхность керамики украшена разнообразным орнаментом, преимущественно поясами из оттисков гребенки, сочетающихся с ямочными вдавлениями. Отдельные фрагменты украшены оттисками палочки с накрученной на конце ниткой, горизонтальными поясами из коротких сегментовидных наколов. Венчиковая часть сосудов по краю обычно подчеркивается рядом разреженных глубоких ямочных вдавлений, оставляющих негативы с обратной стороны, так называемые сопочки, или жемчужины. Внутренняя поверхность стенок сосудов тщательно заглажена, на некоторых фрагментах сохранились следы от расчесов гребенки. Фрагменты лепной посуды бронзового века (35 ед.) имеют



Рис. 2. Лепная керамика эпохи неолита (фрагменты) (*1–5*). Стоянка Старый Дедин-4. 2012 г.

темно-красный или желтый цвет. Толщина стенок составляет 5–6 мм. Отдельные фрагменты украшены горизонтальными поясами из оттисков веревочки и линейным орнаментом.

Таким образом, материалы исследованной нами стоянки типологически следует датировать неолитическим временем (верхнеднепровская культура) и началом бронзового века (среднеднепровская культура). Сходство по керамике и кремневому инвентарю неолитический комплекс стародединского поселения проявляет с материалами стоянок второго этапа верхнеднепровской культуры – Гронов (поселения в ур. Курганье и Стров) [1, с. 46–116] и Рудня-1 [2, с. 58–72]. Присутствие в коллекции среднеднепровской керамики со шнуровыми оттисками позволяет отнести основной (неолитический) фон материалов стоянки Старый Дедин-4 к финалу развития верхнеднепровской культуры в Посожье.

Кроме раскопок в 2012 г. нами были проведены разведки на территории Климовичского и Костюковичского районов Могилевской области. В итоге был обследован 31 памятник археологии, 20 из которых являются новыми, ранее неизвестными в литературе. В Климовичском районе был продолжен поиск и обследование памятников, расположенных в бассейне р. Остер и р. Лобжанка. Были осмотрены отдельные археологические местонахождения в окрестностях д. Вознесенск, Старый Дедин, Роськов и Хотовиж. В окрестностях последнего населенного пункта были открыты две стоянки каменного и бронзового веков и селище раннего железного века и эпохи средневековья.

Повторно обследована мезолитическая стоянка Хотовиж-1. В 2011 г. нами на песчаной возвышенности правого берега р. Сосновка (левый приток р. Остер), в 0,7 км северо-восточнее д. Хотовиж было обнаружено и изучено путем сборов компактное скопление находок из сожского мелового кремня. В 2012 г. удалось собрать достаточно представительную коллекцию артефактов (рис. 3): отщепы (1150 ед.), пластины (201 ед.), мелкие осколки и чешуйки кремня (219 ед.), нуклеусы (8 ед.), ретушер на отщепе, отщепы (22 ед.) и пластины с ретушью (5 ед.), скребловидные орудия (4 ед.), концевые, мысовидные и двойной скребки, пластины с резцовыми сколами, черешковые наконечники стрел и их фрагменты (3 ед.), заготовка тесла, а также фрагмент лепной неолитической керамики, орнаментированной наколами и оттисками ямок (7 ед.), обломки сосудов, отдельные из которых украшены глубокими ямками по краю, нанесенными с внутренней стороны (9 ед.), гончарная керамика (8 ед.). Внимание привлекают находки острия с микрорезцовым сколом, подправленным ретушью (рис. 3: *3*). Изделие создано на дистальном конце пластины и напоминает острие яниславицкого типа с ретушированным основанием. Для данного памятника находка острия подобной формы, но с естественным основанием, является второй (сборы 2011 г.). Учитывая то, что ближайшие для этого региона памятники с находками яниславицкого типа встречены пока только в низовьях р. Сож [3], местонахождение Хотовиж-1 открывает новые перспективы в изучении миграций древнего населения, обитавшего на территории Посожья в позднем мезолите.

Новые памятники археологии были открыты возле д. Роськов – три стоянки каменного и бронзового веков и три селища раннего железного века и эпохи средневековья. Особое внимание привлекли находки стоянки-4 и селища-3. Памятники расположены на возвышенном участке берега, большая часть которого разрушена карьером и, вследствие чего, продолжает подвергаться ветровой эрозии. В обнажениях берега собрана представительная коллекция находок: осколки кремня (4 ед.), нуклеусы двухплощадочные (4 ед.), отщепы (114 ед.), пластины (23 ед.), мелкие осколки (5 ед.), пластина-вкладыш, пластина с затупленным краем, скребок концевой на пластине, отщепы (6 ед.) и пластины (3 ед.) с ретушью по краю, а также фрагменты гончарной керамики (38 ед.).

Работы на территории Костюковичского района в 2012 г. открыли для нас новый этап в изучении

археологических памятников Могилевщины, расположенных в бассейне р. Беседь. Основное внимание в районе было уделено изучению памятников каменного века. Маршрут разведок был ограничен участком по р. Беседь от д. Белая Дуброва до д. Витунь, так как ниже по течению реки проводить исследования в настоящее время небезопасно. Здесь на территории района начинается зона отчуждения с достаточно высоким фоном радиоактивного загрязнения в результате аварии на Чернобыльской АЭС.

Вместе с тем нам не везде удалось посетить, казалось бы, доступные для обследования археологические памятники. За 18 лет после разведок В. Ф. Копытина в Костюковичском районе (работы 1995 г.) [5], участки правого и левого берегов р. Беседь и ее притоков, на которых расположена основная часть памятников, оказались облесены. С одной стороны, складывается благоприятная ситуация по консервации культурного слоя археологических объектов, с другой – возможности проведения здесь полевых работ ограничены. Однако это не помешало нам изучить некоторые археологические памятники и открыть ряд новых.

В частности, во время обследования окрестностей д. Белая Дуброва были открыты две новые стоянки каменного века и средневековое поселение. Наиболее плодотворными оказались результаты обследования памятников южнее д. Витунь. Здесь на первой надпойменной террасе правого берега р. Беседь, юго-восточнее карьера, расположенного южнее деревни, обнаружены три новых памятника археологии. Два из них – стоянка каменного века (пункт 5А) и селище-4, расположены на береговой террасе, высота которой над меженным уровнем воды в реке составляет до 4–5 м. Находки стоянки каменного века (пункт 5Б) собраны в 100 м восточнее пункта 5А, в песчаных раздувах поймы реки.

На стоянке Витунь-5А на площади 30 × 100 м были собраны 404 артефакта, в том числе: нуклеусы одноплощадочные (4 ед.), нуклеусы двухплощадочные (2 ед.), отщепы (260 ед.), пластины (68 ед.), мелкие осколки и чешуйки кремня (20 ед.), отбойник из кварцита, ретушер на отщепе, скребки концевые на отщепах (9 ед.), резцы ретушные (5 ед.), резцы двугранные (4 ед.), резец на сломе пластины, изделия с выемкой на отщепах (3 ед.), проколка на отщепе,



Рис. 3. Кремневый инвентарь (*1–10*). Стоянка Хотовиж-1. 2012 г.

пластина-вкладыш, трапеция высокая, долотовидное орудие (нуклеус ?), отщепы с ретушью по краю (6 ед.), пластины с ретушью по краю (2 ед.). Кремневый комплекс стоянки Витунь-5Б представлен отщепами (33 ед.), пластинами (7 ед.), концевыми скребками (3 ед.), резцовым сколом подправки лезвия скребка, изделием с выемкой, скребловидным изделием, резцом на сломе пластины. Новые данные получены в результате обследования известной по литературным источникам стоянки Витунь-4. На площади памятника удалось собрать коллекцию кремневых артефактов от эпохи мезолита до бронзового века включительно. Керамический материал отражает более широкий диапазон заселения памятника: неолит (верхнеднепровская культура), поздний неолит/бронзовый век (среднеднепровская культура), эпоха средневековья.

Литература

1. Калечиц, Е. Г. Памятники каменного и бронзового веков Восточной Белоруссии / Е. Г. Калечиц. – Минск, 1987. – 158 с.

2. Колосов, А. В. Археологические древности Могилевского Посожья : по материалам экспедиций 2002–2008 гг. / А. В. Колосов. – Могилев, 2009. – 264 с.

3. Колосов, А. В. Финальный палеолит и мезолит Посожья / А. В. Колосов // Матэрыялы па археалогіі Беларусі : зб. навук. артыкулаў / Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 2010. – Вып. 21. – С. 77–89.

4. Колосов, А. В. Археологические работы 2010 года в междуречье Сожа и Остра / А. В. Колосов // Матэрыялы па археалогіі Беларусі : зб. навук. арт. / Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 2012. – Вып. 23. – С. 220–225.

5. Копытин, В. Ф. Археологические памятники Костюковичского района Могилевской области / В. Ф. Копытин. – Могилев, 1996. – 152 с.

Рэзюмэ

А. У. Коласаў

Археалагічныя работы 2012 года ў Пасожжы

Падведзены вынікі археалагічных работ у 2012 г. на тэрыторыі Клімавіцкага і Касцюковіцкага раёнаў Магілёўскай вобласці. Абследаваны 31 помнік археалогіі. Матэрыялы аб помніках прадстаўлены знаходкамі ад фінальнага палеаліту да позняга сярэдневякоўя ўключна. 20 помнікаў з'яўляюцца новымі, раней невядомымі ў літаратуры. На стаянке Стары Дзедін-4 у Клімавіцкім раёне (басейн р. Асцёр) праведзены раскопкі на плошчы 172 м^2. Асноўны фон знаходак (звыш 8,7 тыс. адз.) характарызуе верхнедняпроўскую культуру позняга неаліту. Таксама прысутнічаюць матэрыялы сярэднедняпроўскай культуры бронзавага веку і ганчарная кераміка эпохі сярэдневякоўя.

Summary

A. V. Kolosov

Archaeological Works in Posozhie District in 2012

The article summarizes the results of archaeological works on the territory of Klimovichi and Kostyukovichi districts of Mogilev Region in 2012. The author researched 31 archaeological monuments which belong to different ages from the Late Paleolithic Age to the Late Middle Ages inclusively. 20 monuments of them have not been mentioned in the scientific literature before. The excavations were made on the site Staryi Dedin-4 in Klimovichi district (the Oster basin). The area of these excavations is 172 sq. km. The main volume of the discovered material which includes 8.7 thousand items characterizes the Upper Dnieper culture of the Late Neolith. The author also discovered artifacts which belong to Mid-Dnieper culture of the Bronze Age as well as medieval pottery.

Поступила 15.05.2013 г.

УДК 903.4(476–11)

В. І. Кошман, *Інстытут гісторыі НАН Беларусі, загадчык аддзела сярэдніх вякоў і Новага часу, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (г. Мінск, Беларусь)*

Даследаванні 2012 года на гарадзішчы Свіслач

Згодна з Дазволам № 2400 па форме № 1, выданага Інстытутам гісторыі НАН Беларусі, аўтарам былі праведзены археалагічныя раскопкі на гарадзішчы Свіслач Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці.

Гарадзішча размешчана на высокім мысе, які ўтвораны ўпадзеннем р. Свіслач ў р. Бярэзіна. З поўдня, захаду і ўсходу гарадзішча мае высокія стромкія схілы вышынёй 10–12 м. Пляцоўка гарадзішча блізкая да трохвугольнай, яе памеры складаюць каля 70 × 70 м. З боку вёскі (з поўначы) умацавана ровам глыбінёй да 2 м і шырынёй да 13–17 м, а таксама валам вышынёй каля 2,2–2,5 м і шырынёй каля падэшвы 8,5–9,0 м. Уезд на гарадзішча размешчаны ў разрыве вала з напольнага боку (з вул. Кліменка).

Першае апісанне гарадзішча адносіцца да 1882 г. Экспедыцыяй С. С. Шутава і М. М. Улашчыка складзены план гарадзішча і праведзены збор пад'ёмнага матэрыялу на помніку. У 1962 г. і 1969–1971 гг. археалагічнымі экспедыцыямі БДУ імя В. І. Леніна пад кіраўніцтвам Э. М. Загарульскага была вывучана плошча каля 720 м^2. Даследаванне было працягнута ў 2000 г. (А. У. Ільцюцік, В. І. Кошман), затым у 2005–2008 гг. і 2011 г. (204 м^2) (В. І. Кошман). Культурны слой на гарадзішчы мае магутнасць 1,7–2,3 м. Верхнія пласты (гл. 0,2–0,4 м) перамешаны і плотныя, маюць шэрую афарбоўку з шматлікімі дамешкамі бітай цэглы, шкла, вапны. Паступова слой набывае інтэнсіўна чорную афарбоўку (гл. 0,4–0,6 м) і да мацерыка прадстаўлены гумусіраваным, насычаным вуголлем, часам вільготным слоем з невялікімі ўкрапінамі гліны, пяску, які добра захоўвае косткі рыб і жывёл, часам абпаленае дрэва. Верхнія пласты стратыграфічна можна датаваць XVI–XVII стст., асноўная колькасць культурных адкладанняў звязана з XII–XIII стст. (пачаткам XIV ст. ?), у перадмацерыковым пласце сустракаюцца матэрыялы ранняга жалезнага веку (культура штрыхаванай керамікі) і калочынскай культуры (?).

У 2012 г. было вырашана распачаць вывучэнне абарончых збудаванняў гарадзішча. Для ажыццяўлення раскопачных работ быў абраны ўчастак у паўночнай частцы гарадзішча, у месцы разрыву вала з боку вёскі (вул. Кліменка). Перад пачаткам работ была ажыццёўлена таксацыя кустоў і дрэваў. Пасля ачысткі пляцоўкі і вала высветлілася, што на ўнутраннім і знешнім схілах вала маюцца пашкоджанні – яма памерамі 3,0 × 2,4 м і глыбінёй 0,6–0,8 м на ўнутраннім схіле і яма памерамі 3,0 × 3,5 м глыбінёй 0,5–1,0 м на знешнім схіле.

Першапачаткова была разбіта траншэя шырынёй 2,0 м і даўжынёй 12 м, якая праходзіла праз разрыў вала і яго грэбень. Траншэя была арыентавана перпендыкулярна накірунку вала (накірунак на поўнач, з адхіленнем 30º на захад). Такім чынам, пры распрацоўцы траншэі планавалася атрымаць профіль вала з заходняга і ўсходняга бакоў, а таксама прасачыць сувязь вала і яго мяркуемых падсыпак з культурнымі напластаваннямі гарадзішча. У выніку распрацоўкі траншэі прыйшлося падкарэкціраваць аб'ёмы работ. Так, прыйшлося адмовіцца ад распрацоўкі кв. 5, 6 на знешнім баку вала з-за дрэваў і іх карэнняў, а таксама магутных выкідаў шлаку з качагаркі. У далейшым з-за абрушэння земляного насыпу вала была прырэзана яшчэ паласа шырынёй 1,0 м з усходняга боку траншэі (кв. 1А, 2А, 3А, 4А).

Археалагічныя артэфакты ўтрымліваліся выключна ў кв. 3, 4, якія былі размешчаны на знешнім баку вала. Кв. 3, 4 былі запоўнены амаль цалкам цёмнашэрым слоем, які, хутчэй за ўсё, уяўляе з сябе слой, які скідваўся на знешні схіл вала падчас рамонтаў і земляных работ на пляцоўцы гарадзішча. Такая падсыпка мусіла пашырыць шырыню вала і дадаць яму стромкасці.

Для зручнасці і лепшага ўсведамлення асаблівасцей будовы вала апісанне падаецца згодна тых асаблівасцей вала, якія і былі выяўлены ў сезоне 2012 г. (мал. 1).

1. Ядро вала. Складаецца з светла-жоўтага пяску з карычневым адценнем. Гэтае запаўненне выразна адрозніваецца як сваёй кансістэнцыяй, так і колерам. Вышыня даследаванага ядра вала склала да 0,65 м, шырыня – да 3,40 м. Мяркуецца, што гэта і ёсць першапачатковы вал Свіслацкага гарадзішча. Матэрыялаў, якія дазволілі б адназначна прадатаваць гэтае збудаванне, не выяўлена.

2. Праслойка з вугольчыкаў і гумуса (магутнасць да 3–4 см). Паўтарае профіль ядра вала.

3. Падсыпка з светла-жоўтага, месцамі белаватага рассыпчатага пяску. Магутнасць падсыпкі – 0,4–1,0 м. Па меры паглыблення траншэі магутнасць праслойкі павялічваецца, што сведчыць аб распаўзанні (спаўзанні) з вяршыні вала.

4. Праслойка з вугольчыкаў і гумуса (магутнасць – да 3–4 см). Паўтарае профіль вала.

5. Падсыпка з жоўтага пяску. Магутнасць падсыпкі – ад 1,0 м. Месцамі (кв. 1а, 2а) яна перарываецца праслойкай з вугольчыкаў і гумуса (магутнасць – да 3–4 см). Дакладную яе магутнасць пакуль



Мал. 1. Профіль заходняй сценкі траншэі разрэзу вала на гарадзішчы Свіслач

устанавіць немагчыма з-за абмежаванасці даўжыні траншэі. Відавочна, што гэтая падсыпка (дакладней яе спаўзанне ўнутр пляцоўкі гарадзішча) будзе фіксавацца на даволі значнай адлегласці.

6. Са знешняга (паўночнага/напольнага) боку ядро вала з светла-жоўтага пяску з карычневым адценнем і падсыпка з светла-жоўтага пяску былі ўмацаваны слоем абпаленай чырвона-карычневай гліны. Магутнасць гэтай глінянай праслойкі складае каля 0,20–0,23 м. Відавочна, што гэтая канструкцыя фіксуе першапачатковы і завершаны на пэўны час (жалезны век ?, эпоха Старажытнай Русі ?) вал. Рэканструяваць яго магчыма наступным чынам: аснову вала складалі тры паслядоўныя падсыпкі з пяску розных адценняў, якія з знешняга (паўночнага/напольнага) боку былі ўмацаваны ад спаўзання абпаленай глінай. Адметна, што профіль гэтай глінянай праслойкі мае як «ніспадаючы», так і амаль вертыкальны профіль. З боку пляцоўкі вал, відаць, утрымліваў нейкія драўляныя канструкцыі. Так, у кв. 1 паўднёвая і заходняя сценкі (слой светла-жоўтага рассыпчатага пяску) было зафіксавана вуголле і спаленыя бярвенні (плашкі). Так, у кв. 1 у заходняй сценцы былі адзначаны сляды двух спаленых бярвенняў (дыяметр – каля 10 см), якія былі пакладзены фактычна паралельна трасіроўцы вала. Іх нешматлікасць, безумоўна, напрамую не сведчыць аб тым, што яны ўтваралі нейкую канструкцыю, якая трывала насып вала. Не выключана, што яны скаціліся з яго вяршыны падчас яго разбурэння (спалення, распаўзання). Цікавасць выклікае размяшчэнне вуголля і абпаленых бярвенняў у паўднёва-заходнім вугле кв. 1. Магутнасць гэтага прапластка вагаецца ад 15 да 35–37 см і павялічваецца ва ўсходнім напрамку. Пры зачыстцы таксама выразна зафіксаваны сляды спаленых вертыкальных слупоў (даўжыня – каля 2,0 м). Адназначную функцыянальную інтэрпрэтацыю пакуль прапанаваць складана.

7. Цікавасць выклікае і светла/цёмна-шэры слой, які меўся толькі ў паўночнай частцы траншэі (знешні/напольны бок вала) (кв. 3, 4, 3А, 4А). Слой ўтрымліваў таксама праслойкі з наяўнасцю значнай колькасці дробных абпаленых кавалкаў гліны, чорнага гумуса (з вуголлем ?), а таксама светлага гравію, які



Мал. 2. Керамічны матэрыял (*1–6*) з падсыпкі знешняга схілу вала



Мал. 3. Керамічны матэрыял (*1–6*) з падсыпкі знешняга схілу вала

ўтрымліваўся як у якасці самастойнай праслойкі, так і ў складзе светла-шэрага слою (у кв. 4). Зафіксавана слупавая яма, якая была размешчана пасярэдзіне кв. 3 (заходні профіль). Яе запаўненне – цёмна-шэры слой з карычневым адценнем. Яма пераразае як праслойку светлага гравію, так і светла-шэры слой. Не выключана, што гэты аб'ект фіксуе рэшткі драўлянага бервяна ад тыну (паркана), які знаходзіўся паміж вежамі. Інвентар 1560 года адзначае, што паміж вежамі быў пастаўлены паркан або тын з тоўстага бярвення (пераважна дубовага), якое ўзвышалася не меней як сажні на тры. Драўляныя брусы ў паркане былі завостраны зверху. На жаль, гэты цікавы элемент быў у хуткім часе страчаны ў выніку абрушэння заходняй сценкі.

Тым не менш менавіта гэтыя светла/цёмна-шэрыя прапласткі ўтрымлівалі фрагменты ганчарнага кругавога посуду (мал. 2, 3) і астэалагічны матэрыял. Магутнасць гэтага слоя ў траншэі дасягае 2,0–2,2 м. Верагодна, што гэты слой – гэта дастаткова позняя падсыпка, якая ўтварылася падчас рамонтаў (ачысткі, выраўноўвання) пляцоўкі гарадзішча. Гэта скінуты на знешні схіл вала культурны слой з пляцоўкі. Не выключана, што мэта гэтых работ заключалася не толькі ў «добраўпарадкаванні» замкавай пляцоўкі, але і ў павышэнні шырыні і стромкасці замкавых умацаванняў. Згодна з керамічным матэрыялам, яго можна датаваць не раней XVI ст.

Усяго ў траншэе была сабрана калекцыя з 1694 экз., сярод якіх прадстаўлена ганчарная кругавая кераміка (венчыкаў – 239 экз., сценак – 1132 экз. і донцаў/прыдонных частак – 40 экз.), тры фрагменты ляпной керамікі (венчык і дзве сценкі), астэалагічны матэрыял (косткі, зубы), адзінкавыя знаходкі ваконнага шкла (ад ваконных шыб дыскападобнай формы (XVI–XVII стст.)), лязо жалезнага нажа, фрагмент асялка.

На жаль з-за недахопу працоўнай сілы і неаднаразовых абвалаў заходняй і паўднёвай сцен траншэя не была даведзена да канца і, адпаведна, даследаванне вала гарадзішча Свіслач нельга лічыць скончаным. Траншэя была закансервавана з дапамогай поліэтыленавай плёнкі.

Резюме

В. И. Кошман

Исследования 2012 г. на городище Свислочь

Преведены предварительные результаты изучения оборонительного вала городища Свислочь. Представлено описание городища, структуры вала и полученных при исследовании находок.

Summary

V. I. Koshman

Investigations in 2012 on the hill-fort Svislach

Introduces the preliminary results of the investigation of defensive fortification on the hill-fort Svislach. Provides a description of the settlement, the structure of the rampart and different artifacts.

Паступіў 14.05.2013 г.

УДК 902/904(476.6)

В. Л. Лакіза, *Інстытут гісторыі НАН Беларусі, намеснік дырэктара па навуковай рабоце, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (г. Мінск, Беларусь)*

Вынікі археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Астравецкага раёна ў 2011–2012 гадах (зона будаўніцтва газаправода да Беларускай АЭС)

Прыступаючы да археалагічнага вывучэння зоны будаўніцтва газаправода ад г. п. Астравец да пляцоўкі Беларускай АЭС мы ведалі, што тэрыторыю Астравецкага раёна ўжо нельга разглядаць як «белую пляму» на археалагічнай карце Гродзенскай вобласці, хоць мэтанакіраванае суцэльнае абследаванне рэгіёна, як і ў цэлым тэрыторыі Беларусі, яшчэ не праводзілася [1–4].

Пачынаючы з восені 2008 г. у сувязі з будаўніцтвам Беларускай АЭС (і аб'ектаў яе інфраструктуры) у археолагаў з'явілася дадатковая магчымасць для ажыццяўлення комплексных даследаванняў па выяўленні, вывучэнні і ахове археалагічнай спадчыны Астравецкага раёна, аб чым мы ўжо пісалі [2, 3]. З абследаваннем кожнай чарговай новабудоўлі ўдасканальваліся метады археалагічных даследаванняў, а самае галоўнае – прымнажаўся вопыт такой навукова-пошукавай дзейнасці. Менавіта таму і ў 2011 г. у нас былі пэўныя спадзяванні на адкрыццё новых помнікаў археалогіі, якія маглі быць размешчаны каля сучасных населеных пунктаў Астравецкага раёна, а таксама на пясчаных узвышшах і тэрасах прытокаў р. Віліі.

Археалагічныя палявыя працы ў зоне будаўніцтва газаправода пачаліся ў чэрвені 2011 г. адразу пасля атрымання ад ДУ «Дырэкцыя будаўніцтва атамнай электрастанцыі» зыходных даных і праектнай дакументацыі, а скончыліся ў жніўні 2012 г., пасля абследавання практычна ўсіх участкаў непасрэднага будаўніцтва газаправода[1] (мал. 1). У тэхнічным заданні ў адпаведнасці з праектнай дакументацыяй была вызначана папярэдняя плошча палявых асбледаванняў (папярэднія работы), якая складала да 24 га (каля 24 км даўжыні пры шырыні да 10 м), а таксама аб'ёмы земляных работ для археалагічнага нагляду[2] [5]. Пасля азнаямлення з першапачатковым праектам 2011 г., данымі геалагічных і картаграфічных матэрыялаў, вывучэння гістарычна-археалагічнай літаратуры і архіўнай дакументацыі, было ўстаноўлена, што у непасрэдную зону земляных работ па будаўніцтве газаправода вядомыя помнікі археалогіі не трапляюць.

Адзін з важнейшых этапаў любых археалагічных палявых прац у зонах новабудоўляў – разведкі ўсёй тэрыторыі будаўніцтва, а таксама абследаванне прылягаючай да яе мясцовасці, пошукі і паверхневыя зборы артэфактаў, зачысткі агаленняў, сценак ям і кар'ераў, месцаў выбаркі грунту. Падчас разведак выкарыстоўвалася методыка археалагічных даследаванняў, заснаваная на суцэльным візуальным аглядзе паверхні і пошуках пад'ёмнага археалагічнага матэрыялу (метад суцэльнага «прачэсвання», калі ў полі зроку аднаго чалавека знаходзілася паласа шырынёй некалькі метраў). Перыядычна, асабліва побач з сучаснымі населенымі пунктамі (Астравец, Кавалі, Ліпнішкі, Едаклані, Малі, Стаўбуры, Варняны, Больнікі, Загазь, Газа), былымі хутарамі (фальваркамі), выкарыстоўваўся металадэтэктар[3]. Асабліва дэтальнаму абследаванню падвяргаліся ўчасткі будучых земляных работ у тых месцах, якія разглядаліся намі як найбольш перспектыўныя для выяўлення археалагічных аб'ектаў – ваколіцы в. Малі, Варняны, Загазь, Газа, тэрасы сучасных рэчак Лоша, Кавалёўка, Малька, Газаўка і пясчаныя павышэнні. У такіх месцах праводзілася і дадатковая шурфоўка [5].

З мэтай аблягчэння фіксацыі даных і вядзення дакументацыі ўся зона будаўніцтва газаправода ад Астраўца да Беларускай АЭС была падзелена на восем умоўных участкаў: спачатку паводле першапачатковага праекта 2011 г. на пяць участкаў (уч. 1–5), прывязаных да існуючых населеных пунктаў і палявых ці грунтовых дарог, а затым дадаткова яшчэ на тры участкі (уч. 6–8, паводле новага праекта 2012 г.) (больш падрабязна глядзі ў працы [5]). У 2011 г. былі зафіксаваны і некалькі месцаў для больш грунтоўных пошукаў археалагічных аб'ектаў ужо непасрэдна падчас пракладкі спецыяльнай тэхнікай траншэй пад газаправод. Яны ў 2012 г. дадаткова абследаваліся, праводзіліся шматлікія зачысткі сценак траншэй, фотафіксацыя, агляд земляных адвалаў.

У выніку археалагічнага вывучэння зоны будаўніцтва на *ўчастку 1 ад Астраўца да в. Малі* (ад газаразмеркавальнай падстанцыі ў г. п. Астравец, побач з аўтазапраўкай у г. п. Астравец, уздоўж аўта-

[1] Аўтар выказвае удзячнасць ДУ «Дырэкцыя будаўніцтва атамнай электрастанцыі» за разуменне важнасці справы вывучэння і аховы археалагічнай спадчыны, а таксама Макс. М. Чарняўскаму, С. Б. Ліневічу, К. В. Лакізу, З. А. Харытановіч і А. М. Вашанаву, якія прымалі ўдзел у палявых даследаваннях на працягу 2011–2012 гг.

[2] На спадарожнікавай карце (maps.google.com – доступ у снежні 2013 г.) выразна прасочваецца ўся траса будаўніцтва газаправода.

[3] Пра большасць згаданых населеных пунктаў Астравецкага раёна ёсць звесткі ў пісьмовых крыніцах XV–XVI стст., а ўзнікнуць яны маглі яшчэ раней [5].

Мал. 1. Адзін з участкаў будаўніцтва газаправода ад Астраўца да в. Ліпнішкі

мабільнай дарогі Р-48 Варона–Ашмяны–Юрацішкі–Іўе–Астравец, побач з в. Кавалі, да ваколіц в. Малі), які быў часткова забудаваны, прыпадаў на ўскрайкі лесу, ворнае поле і на значным адрэзку прымыкаў да асфальтавай шашы, зафіксавана месцазнаходжанне позняй ганчарнай керамікі каля в. Кавалі і новы археалагічны помнік – Малі-1 (мал. 2).

Малі-1 размешчаны прыкладна праз 0,3 км на захад ад вёскі, адразу на захад і паўднёвы захад ад моста праз р. Малька на аўтамабільнай дарозе Р-48, на ўчастку, абмежаваным правым берагам р. Малькі, дарогай і лесам (мал. 2: *2*; 3, *А*). На разаранай паверхні былі выяўлены фрагмент сценкі ганчарнага посуду, крамянёвая канкрэцыя, а самае галоўнае – крамянёвая ножападобная пласціна правільнай формы (мал. 3, *Б*). Шурфоўку на помніку не праводзілі. У адпаведнасці з канчатковым варыянтам праекта будаўніцтва газаправода, месцазнаходжанне Кавалі-1 помнік Малі-1 у зону земляных работ не трапілі.

На *ўчастку 2 ад в. Малі ўздоўж грунтовай дарогі (левабярэжжа р. Малька) і затым праз лес і ворнае поле да грунтовай дарогі каля в. Стаўбуры,* былі лакалізаваны чатыры новыя археалагічныя аб'екты – *Малі-2, Малі-3 і Малі-4* (мал. 2: *3–5*). Найбольш цікавым з іх з'яўляецца *Малі-4*, які размешчаны прыкладна праз 2,5 км на поўнач ад паўночнай ўскраіны в. Малі бліз адзіночнага вялікага дуба паміж левым берагам р. Малька і грунтовай дарогай. На паверхні, якая інтэнсіўна разворваецца, былі знойдзены акрамя дробных фрагментаў ганчарнай керамікі і рэшткаў цэглы яшчэ жалезная падкова і лёзавая частка жалезнай сякеры (мал. 4: *3*). Аднак падчас назіранняў за пракладкай траншэі газаправода, зачыстак яе сценак, нерухомых аб'ектаў археалогіі і выразнага культурнага пласта не зафіксавана [5].

Мал. 2. Карта абследаванага ўчастка каля в. Ліпнішкі і в. Малі з лакалізацыяй ужо вядомага (*1*) і новых археалагічных аб'ектаў (*2–6*): *1* – Трэцінішкі; *2* – Малі-1; *3* – Малі-4; *4* – Малі-2; *5* – Малі-3; *6* – Ліпнішкі-1

Мал. 3. Выгляд новага помніка Малі-1 (*А*) з фотафіксацыяй месцазнаходжання крамянёвай пласціны (*Б*)



Мал. 4. Артэфакты з помніка Малі-4: *1* – жалезная падкова; *2* – жалезная сякера

На *ўчастку 2* выклікае цікавасць і патрабуе далейшых даследаванняў тэрыторыя каля в. Стаўбуры (мал. 5, *А*). Падчас візуальнага абследавання яе паўднёва-ўсходніх ваколіц рухомых археалагічных артэфактаў не выяўлена. Аднак у траншэі газаправода прыкладна праз 0,1–0,13 км на паўднёвы ўсход ад апошніх хат паўднёвай ускраіны вёскі, бліз ЛЭП, былі зафіксаваны два аб'екты, запоўненыя цёмнашэрай чарнаватай зямлёй з уключэннямі чарнаватых вугальных і карычневатых гліністых прапласткаў. Яны пачыналіся пад ворным пластом з узроўня 0,3–0,4 м і паглыбляліся да 0,7–0,8 м. (мал. 5, *Б, В*). Знаходкі у іх не ўтрымліваліся. Дадзены ўчастак, на нашу думку, перспектыўны і з пункта гледжання выкарыстання такой методыкі даследаванняў, як паветраная археалогія. Калі ўважліва прааналізаваць спадарожнікавы здымак (зроблены ў 2012 г.), то можна заўважыць, што вакол выяўленых у траншэі аб'ектаў (яны абазначаны літарай *А*) назіраецца своеасаблівае колападобнае пацямненне – магчыма, больш буйны археалагічны аб'ект, які практычна па сярэдзіне перараразаецца трасай газаправода (мал. 5, *А*).

На *ўчастку 3 на поўнач ад грунтовай дарогі каля в. Стаўбуры да в. Варняны,* які цалкам прыпадаў на ворнае поле, ні падчас візуальнага абследавання, ні падчас будаўніцтва траншэй, аб'ектаў археалогіі не выяўлена.

Мал. 5. Спадарожнікавы здымак лакалізацыі археалагічнага помніка каля в. Стаўбуры (*А*) з фотафіксацыяй у будаўнічай траншэі двух выяўленых аб'ектаў (*Б, В*)

На *ўчастку 4 ад в. Варняны да в. Загазь (тэрасы і пойма р. Газаўка)*, які таксама прыпадаў на ворнае поле і ўскраіны в. Загазь, зафіксаваны яшчэ адзін археалагічны аб'ект – селішча *Загазь-1* (мал. 6: *2*). Яно было выяўлена метадам шурфоўкі. У шурфе зафіксаваны культурны пласт шэрага колеру таўшчынёй да 0,4–0,5 м з невялікай колькасцю артэфактаў – фрагментаў ганчарнай керамікі (мал. 7).

На *ўчастку 5 ад в. Газа да Беларускай АЭС,* які праходзіць праз ворныя палі за паўднёва-ўсходняй ускраінай в. Газа (мал. 6: *3*), акрамя рэдкіх дробных фрагментаў ганчарнай керамікі, быў знойдзены медальён «M. Boska Ostro Bramska» [5].

На *ўчастку 7 ад новага археалагічнага помніка Малі-4 праз лес і поле побач з в. Едаклані да в. Ліпнішкі і р. Кавалёўка (паводле новага праекта) практычна на ўсёй яго тэрыторыі* аб'ектаў археалогіі не трапілася. Толькі за паўднёвай ускраінай в. Ліпнішкі на правабярэжнай тэрасе р. Кавалёўка быў лакалізаваны новы археалагічны помнік – *Ліпнішкі-1* (мал. 2: *6*). Ён размешчаны прыкладна праз 0,10–0,15 км на паўночны ўсход ад асфальтавай дарогі Астравец–Смілгі , праз 0,1–0,2 км на захад ад новых дамоў в. Ліпнішкі [5]. Тут, у траншэях пад газаправод, былі знойдзены фрагменты ганчарнай керамікі і крамянёвы адшчэп.

На *ўчастку 6 ад хут. Баброўнікі побач з в. Больнікі да в. Варняны і ўчастку 8 ад асфальтавай дарогі*



Мал. 6. Карта абследаванага ўчастка каля в. Загазь і в. Газа з лакалізацыяй ужо вядомага (*1*) і новых археалагічных аб'ектаў (*2, 3*): *1* – Баброўнікі; *2* – Загазь-1; *3* – Газа-1



Мал. 7. Ганчарны посуд (фрагменты) з шурфа на селішчы Загазь-1

Астравец-Смілгі (каля в. Ліпнішкі) да асфальтавай дарогі Р-48 Астравец–Гудагай–Ашмяны, якія былі абследаваны ў 2012 г., аб'ектаў археалогіі не выяўлена.

Такім чынам, на працягу 2011–2012 гг. была візуальна абследавана ўся тэрыторыя будучага будаўніцтва газаправода ад г. п. Астравец да Беларускай АЭС, а таксама зафіксаваны новыя месцазнаходжанні асобных фрагментаў ганчарнай керамікі і іншых артэфактаў каля в. Кавалі, Газа, Загазь, Малі, новыя археалагічныя помнікі з крамянёвымі матэрыяламі *Малі-1 і Ліпнішкі-1*. З-за адсутнасці на іх выразных культурных напластаванняў і дастатковай колькасці артэфактаў, дадатковыя мерапрыемствы па ахове гісторыка-культурнай спадчыны (раскопкі) у 2012 г. не ажыццяўліся.

Важна, што за два гады выканання археалагічных прац па дагаворы ўдалося ажыццявіць у поўнай меры ўсе этапы даследаванняў: ад візуальнага абследавання і шурфоўкі да нагляду за непасрэдным будаўніцтвам практычна на ўсім адрэзку газаправода. У выніку сёння мы маем своеасаблівы 20-кіламетровы «разрэз» тэрыторыі Астравецкага раёна па лініі поўдзень–поўнач (поўная інфармацыя з 237 ілюстрацыямі змешчана ў навуковай справаздачы [5]).

Па-ранейшаму застаецца складаным для канчатковага вырашэння пытанне аб засяленні Астравецкага раёна ў першабытны час. Нават мэтанакіраваныя абследаванні даволі значных тэрыторый у зоне будаўніцтва Беларускай АЭС і шэрагу аб'ектаў яе інфраструктуры амаль не павялічылі колькасць вядомых стаянак і паселішчаў каменнага і бронзавага вякоў у левабярэжным басейне р. Віліі (да раней вядомых помнікаў і асобных месцазнаходжанняў каменных шліфаваных далучаны стаянкі (?) Малі-1, Ліпнішкі-1).

Літаратура

1. Зайкоўскі, Э. М. Справаздача аб выкананні навуковых археалагічных даследаванняў (папярэдняе абследаванне, разведак і шурфоўкі) у зоне аб'екта «Будаўніцтва аўтамабільнай дарогі ад Р-45 (Газа)–АЭС–Астравец» у Астравецкім раёне Гродзенскай вобласці ў 2009 г. // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 2719. – Мінск, 2010.

2. Лакіза, В. Л. Вынікі археалагічных даследаванняў у зонах новабудоўляў на тэрыторыі Ашмянскага раёна : новыя помнікі і матэрыялы / В. Л. Лакіза, З. А. Харытановіч, Макс. М. Чарняўскі // Ашмяншчына : праблемы рэгіянальнай гісторыі Беларусі : зб. навук. арт. / рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – С. 11–22.

3. Лакіза, В. Л. Археалагічныя даследаванні ў зоне будаўніцтва Беларускай АЭС і аб'ектаў яе інфраструктуры ў 2009–2010 гг. / В. Л. Лакіза, Э. М. Зайкоўскі, З. А. Харытановіч, Макс. М. Чарняўскі // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск : Беларус. навука, 2012. – Вып. 23 : Археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Беларусі ў 2009–2010 гадах. – С. 337–341.

4. Лакіза, В. Л. Справаздача № 1 аб правядзенні археалагічных абследаванняў пляцоўкі будаўніцтва Беларускай АЭС у рамках рэалізацыі дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы па аб'екту «Будаўніцтва АЭС (якая ўключае праектна-пошукавыя работы (г.п. Астравец Гродзенскай вобласці)» у 2010 г. // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 2750. – Мінск, 2010.

5. Лакіза, В. Л. Справаздача аб правядзенні археалагічных даследаванняў у зоне будаўніцтва газаправода ад г. п. Астравец да АЭС на тэрыторыі Астравецкага раёна – «Внеплощадочное газоснабжение» по объекту «Атомная станция в Республике Беларусь» // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Мінск, 2013.

Резюме

В. Л. Лакиза

Итоги археологических исследований на территории Островецкого района в 2011–2012 годах (зона строительства газопровода к Белорусской АЭС)

В 2011–2012 гг. автором проведены охранные археологические исследования в зоне строительства газопровода от г. п. Островец к Белорусской АЭС протяженностью около 24 км при ширине более 10 м. За два полевых сезона данная территория была изучена методами визуального обследования и поверхностных сборов, шурфовки и наблюдений за

прокладкой траншей для газопровода на части территории Островецкого района в левобережном бассейне р. Вилии (небольших рек Лоши, Ковалёвки, Мальки, Газовки). Были локализованы несколько разновременных археологических объектов около д. Гоза, Загозь, Ставбуры, Мали, Ковали, Липнишки, в том числе и с кремневыми материалами каменного века Мали-1 и Липнишки-1.

Summary

V. L. Lakiza

Results of archaeological research in the territory of Ostrovets district in 2011–2012 (construction area of a gas pipeline to Belarus nuclear power station)

In 2011–2012 the author carried out saving archaeological research in a construction area of a gas pipeline from Ostrovets to Belarus NPP (the length made about 24 km and width more than 10 m). During two field seasons we carried out investigations using methods of visual survey, gathering of surface material, pitting and also surveyed making ditches for the gas pipeline in the part of the territory of Ostrovets district (left-bank basin of the Viliya river – near small rivers the Losha, the Kovalevka, the Malka, the Gazovka). We localized some archaeological objects dating to different times near villages Goza, Zagoz', Stavbury, Mali, Kovali, Lipnishki, including those with fint material of Stone Age (Mali-1 and Lipnishki-1).

Паступіў 13.05.2013 г.

УДК 902.21(476.2)(045)

***Д. Н. Линденков**, Государственное историко-культурное учреждение «Гомельский дворцово-парковый ансамбль», сектор археологии, научный сотрудник (г. Гомель, Беларусь)*

Археологические разведки в Гомельском и Лоевском районах на Гомельщине

Летом-осенью 2012 г. под руководством автора проведены археологические обследования памятников археологии Гомельского и Лоевского районов Гомельской области. На территории Гомельского района были осмотрены памятники у д. Рассветная, Терюха и Якубовка, а также возле д. Ильич, Романовичи и Ченки; на территории Лоевского района – памятники в окрестностях д. Абакумы, д. Городок Бывальковского с/с, д. Мохов, г. п. Лоев и д. Щитцы.

Деревня Рассветная, Большевистский сельсовет. Расположена в 11 км к северо-западу от окраины г. Гомеля, рядом с железной дорогой Гомель–Жлобин. Местонахождение 1 расположено на правом берегу мелиорированной р. Беличанка. Здесь расположен песчаный холм, занятый под пашню и с севера обрезанный дорогой на деревню. На юго-восточной его окраине были найдены обломки керамической и стеклянной посуды XVIII–XIX вв. и несколько осколков кремня. Керамическая посуда вся сделана при помощи гончарного круга и имеет сероватый цвет (см. рисунок: *1–3*). Местонахождение 2 расположено по правую сторону железнодорожного полотна Гомель–Жлобин. На пахотном поле были найдены несколько осколков кремня, плоское донце и стенка лепного сосуда светлого теста с примесью дресвы (см. рисунок: *4*). Ранее эти песчаные всхолмления возвышались над Кобыльим болотом. Вокруг него, по сообщению Е. Р. Романова, было найдено множество кремневых орудий и топоров [8, с. 101]. Нужно полагать, что в районе д. Рассветная были расположены стоянки каменного–бронзового веков и деревня XVIII–XIX вв. В литературе сведений о памятниках в окрестностях д. Рассветная не имеется.

Деревня Терюха, Терюхский сельсовет. Комплекс археологических памятников у д. Терюха находится в левобережье р. Сож между деревней и восточным берегом оз. Казара. Часть памятников выявлена и обследована О. А. Макушниковым в 1991 г. [6, с. 27–35]. Терюха-I – поселение эпохи неолита-бронзы и селище XIII–XIV вв. расположены на левом берегу р. Сож и левом берегу оз. Казара в 2,5 км юго-западнее деревни. Памятник занят преимущественно сосновым лесом и незначительно лиственными деревьями. В 0,2 км южнее в ур. Марковицкое Поле на луговом незатопляемом участке поля расположен памятник Терюха-II. Ранее здесь отмечен материал, который принадлежит селищу XI–XIII вв. Памятники Терюха-III и Терюха-IV представлены остатками двух курганных групп конца X – начала XII в., которые были почти полностью раскопаны М. М. Филоновым в XIX в. Они расположены в 0,2 км северо-восточнее памятника Терюха-II. Осмотр восточного берега оз. Казара позволил выделить местонахождение 1. Юго-западнее памятника Терюха-II, на мысовом участке высотой около 4–5 м над урезом воды, в кротовинах было обнаружено несколько фрагментов круговой керамики. В коллекцию отобрано пять венчиков и донце кругового сосуда. Судя по моделировке венчиков, они, вероятнее всего, относятся к XIV–XVI вв. (см. рисунок: *5–9*). Площадка топографически выделяется (см. рисунок: *I*). Она занята лугом, боковые овражки подтапливаются половодьями и заросли кустами. С южной стороны с северо-востока на юго-запад через останец проходит грунтовая дорога.

Деревня Якубовка, Покалюбичский сельсовет. Недалеко от устья р. Ипуть возле д. Якубовка (с 1957 г. в черте г. Гомель) обследованы песчаная дюна и курганы. Песчаная дюна частично срезана строящейся дорогой «Восточный объезд». В литературе есть сведения о наличии здесь нескольких памятников эпохи бронзы [5, с. 80]. На поверхности обнаружены многочисленные кремневые осколки, среди которых есть обработанные. Часть подъемного материала было любезно предоставлено преподавателем УО «БелГУТ», краеведом Е. Маликовым. На срезанном северо-восточном участке дюны зачищено обнажение, в котором отчетливо просматривается слой золы и угля мощностью до 0,2 м. Подъемный материал с местонахождения 1 можно разделить на три группы. Во-первых, здесь были найдены поздние невыразительные фрагменты круговой керамики (в коллекцию не взяты). Во-вторых, это лепная керамика (см. рисунок: *10–15*). В коллекции она представлена двумя венчиками, один из которых орнаментирован штампованным и жемчужным орнаментом, неорнаментированными (9 шт.) и орнаментированными (9 шт.) стенками лепных сосудов, миниатюрным донцем лепного сосудика. В-третьих, здесь собраны многочисленные изделия из кремня – отщепы, ножевидные пластины, микролиты, неопределенные орудия, скребок (?) и осколки кремня.

В 0,7 км юго-восточнее местонахождения 1,0 и в 0,5 км восточнее Якубовского кладбища осмотрены три кургана, которые расположены на луговом участке и в непосредственной близости от строящейся дороги (см. рисунок: *II*). Курганы расположены рядом на расстоянии 6–8 м. Два из них слились полами. Следов ровиков нет. У всех среза-



Планы и подъемный материал: *I* – план местонахождения 1 у д. Терюха; *II* – план курганов у д. Якубовка Гомельского района; *1–3* – местонахождение 1, д. Рассветная Гомельского района; *4* – местонахождение 2, д. Рассветная Гомельского района; *5–9* – д. Терюха Гомельского района; *10–15* – д. Якубовка Гомельского района; *16–22* – д. Городок Бывальковского сельсовета Лоевского района; *23–36* – ур. Грегорово Поле, г. п. Лоев Лоевского района; *1–3, 5–9, 16–36* – круговая керамика; *4, 10–15* – лепная керамика

на верхушка и читаются следы «колодцев». В литературе есть сведения о наличии в районе бывшей д. Якубовки курганов [9, с. 152]. Их культурно-историческая атрибуция неизвестна. Учитывая тот факт, что строительство «Восточного объезда» еще не закончено, а после окончания будет благоустроена прилегающая территория, памятникам у д. Якубовка грозит полное уничтожение.

Деревня Ильич, Улуковский сельсовет. В отчетном полевом сезоне осмотрены курганный могильник и селище эпохи Киевской Руси, которые в литературе привязаны то к д. Ильич [4, с. 137], то к д. Романовичи [6, с. 53; 9, с. 101]. Памятники расположены в левобережье р. Сож в ур. Боровая (Боровица) на южном берегу озера-старицы р. Сож. Все имеющеея в литературе привязки памятников нуждаются в корректировках, так как населенные пункты, к которым они привязаны, являются зонами застройки. Курганный могильник в ур. Боровая известен с XIX в. В 1890 г. М. М. Филонов раскопал 10 насыпей. Могильник очень сильно пострадал от старых раскопок, застройки дачного поселка и лесных дорог. В настоящее время он насчитывает до 15 остатков насыпей. Селище периода Древней Руси расположено севернее могильника. Впервые выявлено и обследовано О. А. Макушниковым в 1991 г. [6, с. 55–56]. Селище примыкает к разрастающемуся дачному поселку.

Деревня Романовичи, Улуковский сельсовет. В 0,45 км к востоку от д. Романовичи по левому берегу мелиорированного водотока, который впадал в Ипуть в ур. Курганье, расположен курганный могильник. Он известен как Могильник-1 и был обследован экспедицией ГГУ им. Ф. Скорины под руководством О. А. Макушникова в 2011 г. Памятник насчитывает свыше 100 курганных насыпей, поросших деревьями. Диаметр курганов составляет 4–15 м, высота – 0,3–1,5 м. Осенью 2012 г. памятник был осмотрен повторно. В ноябре 2012 г. после осмотра памятника нами были получены сведения о разрушении одной насыпи «любителями металлодетекторного поиска». Информация получена от местного жителя и студента-историка УО «ГГУ им. Ф. Скорины» А. А. Писаренко. В центре одной из насыпей были зафиксированы две подквадратные ямы размерами около 1,0 × 0,9 м и 0,7 × 0,6 м при глубине до 0,4 м.

Деревня Ченки, Ченковский сельсовет. У д. Ченки Гомельского района было осмотрено болотное городище для последующей установки охранного знака. Городище известно науке и в литературе привязано к д. Бобовичи [7, с. 178]. Расположено оно в пойме левобережья р. Сож на левом берегу оз. Узкое в 0,3 км северо-западнее строящегося дачного кооператива. Ранее городище распахивалось, теперь оно покрыто лесом. По центру площадку городища прорезает лесная дорога. Городище имеет две площадки. Сохранились два периметральных вала высотой до 2 м и на некоторых участках остатки рва.

Деревня Абакумы, Карповский сельсовет. Курганный могильник у д. Абакумы известен с рубежа XIX/XX в. Он расположен в 1 км на юго-запад от деревни на песчаном выступе террасы Сожа и Днепра. Раскопки проводили Г. Ф. Соловьёва (2 кургана) и О. А. Макушников (17 курганов) [1, с. 11]. Могильник насчитывает 26 курганов, на которых растет сосновый лес. На части насыпей видна плантажная вспашка, которая могла уничтожить часть курганов. Курганный могильник расположен на месте поселения эпохи неолита и бронзового века [1, с. 10–11]. На западной и юго-западной окраине могильника, вне леса на дороге были найдены придонная часть позднего кругового сосуда, стенка лепного сосуда с примесью дресвы в тесте, кремневая ножевидная пластина и несколько обломков кремня.

Деревня Городок, Бывальковский сельсовет. У д. Городок обследовано городище раннего железного века, селище раннего железного века и древнерусского времени, одиночный курган. Городище расположено в 0,3 км восточнее и юго-восточнее деревни за яблоневым садом на правом берегу р. Днепр в ур. Грудка (Груд). Площадка городища размерами 80 × 70 м плотно задернована и наклонена к склону. С напольной стороны расположен вал высотой до 5 м и остатки заплывшего рва. Городище известно науке, и в разные годы его обследовали Ю. В. Кухаренко, Л. Д. Поболь и О. Н. Мельниковская [4, с. 237; 7, с. 128]. Рядом в 0,1–0,2 км северо-восточнее его между деревней и яблоневым садом расположено селище раннего железного века и эпохи Древней Руси [9, с. 112]. Впервые выявил в 1977 г. М. И. Лошенков [4, с. 237]. На одной части селища расположен сад, другая используется под пашню. Здесь было собрано семь венчиков круговых сосудов XI–XII вв. (см. рисунок: *16–20*), одна стенка кругового сосуда с волнистым орнаментом, шесть стенок круговых сосудов с линейным орнаментом (см. рисунок: *21, 22*) и одиннадцать стенок круговых сосудов. Также были собраны очень мелкие стенки лепных сосудов, которые не брали в коллекцию. В 1,0 км западнее-юго-западнее городища на правом берегу Днепра, в 0,25 км юго-юго-западнее юго-восточной окраины деревни на пахотном поле расположен одиночный курган. Его диаметр превышает 8–10 м при высоте свыше 1,5 м. Со всех сторон его опахивают.

Между д. Мохов и г. п. Лоев обследованы курганный могильник и селище эпохи Древней Руси. Они привязаны к Лоеву. Могильник расположен юго-юго-восточнее д. Мохов в 1,2 км от нее и в 3,8 км от Лоева. Он находится на залесенном участке рядом с селищем в ур. Грегорово Поле вдоль дороги из

д. Мохов в г. п. Лоев, которая пролегает по террасе правого берега р. Днепр. Могильник известен с конца XIX в. Раскопки проводил В. З. Завитневич [3, с. 11–13]. Могильник насчитывал 70 насыпей, 15 из которых раскопаны В. З. Завитневич в 1890 г. В настоящее время сохранилось 53 насыпи [2, с. 23]. Судя по имеющимся сведениям, могильник относится к XI–XII вв. Селище расположено в 0,2 км юго-восточнее курганного могильника в ур. Грегорово Поле. Оно частично занято под пашню. На площадке, не занятой под пашню, было зафиксировано более пяти кладоискательских ям размером 0,2–0,5 м при глубине до 0,15–0,20 м. Фактически культурный слой ямы не затрагивают, нарушая только дерновый горизонт. Селище обследовали В. З. Завитневич в 1890 г. и А. Г. Тимофеенко в 2004 г. На поверхности нами были собраны материалы, относящиеся к XI–XII вв. Весь материал представлен обломками круговой керамики (см. рисунок: *23–36*). В коллекцию был отобран 31 фрагмент: 1 венчик с косыми чередующимися насечками по краю, 22 венчика без орнамента, 7 фрагментов донышек и одна стенка кругового сосуда с волнистым орнаментом. Вся керамика, насколько можно судить по обломкам, принадлежит горшкам, кроме одного венчика (крышка).

Рядом с Грегоровым Полем было обследовано *городище,* которое известно в литературе как Второе Моховское городище и относится к раннему железному веку. Оно находится в 1,5 км на юго-восток от деревни на мысу правого берега р. Днепр. Образовано оно двумя оврагами. Площадка плотно задернована, с напольной стороны имеется вал высотой до 5 м. В 1952–1953 гг. городище исследовал П. Н. Третьяков. Здесь обнаружены материалы милоградской и зарубинецкой культур. При осмотре площадки городища в кротовинах были обнаружены одно донце лепного чернолощеного сосуда, две стенки лепных сосудов с ямочным орнаментом, две стенки лепных сосудов без орнамента и три стенки круговой керамики (одна с остатками линейного орнамента). Факт наличия материалов древнерусского времени на городище подтверждается и сведениями Л. Д. Поболя [7, с. 180–181].

Обследования памятников у д. Терюха, Ильич, Ченки проведены совместно с О. А. Макушниковым.

Таким образом, в отчетном полевом сезоне автором обследовано в Гомельском районе: у д. Рассветная – два местонахождения (бронзовый век ? и XVIII–XIX вв.), у д. Терюха – четыре памятника (неолит-бронза, XIII–XIV вв., два могильника X–XII вв.) и одно местонахождение (XIV–XVI вв.), у д. Якубовка – два памятника (неолит-бронза и курганы), д. Ильич – два памятника (X–XII вв.), у д. Романовичи – один памятник (курганы) и у д. Ченки – один памятник (ранний железный век), в Лоевском районе: у д. Абакумы – два памятника (бронзовый век и X–XII вв.), у д. Городок Бывальковского с/с – четыре памятника (ранний железный век, XI–XII вв. и курган), у г. п. Лоев – два памятника (X–XII вв.) и у д. Мохов – два памятника (ранний железный век и X–XII вв.).

Литература

1. Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1 : А–К. – 496 с. : іл.

2. Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. /рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2 : Л–Я. – 464 с. : іл.

3. Завитневич, В. З. Вторая археологическая экскурсия в Припятское Полесье / В. З. Завитневич // Чтения в историческом обществе Нестора-летописца. – Киев, 1892. – Кн. VI. – С. 11–74.

4. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гомельская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. сав. энцыкл., 1985. – 383 с. : іл.

5. Исаенко, В. Ф. Археологическая карта Белоруссии / В. Ф. Исаенко. – Минск : Полымя, 1976. – Вып. 3 : Памятники бронзового века / под ред. Ф. В. Борисевича. – 152 с.

6. Макушников, О. А. Отчет об археологическом обследовании территории Гомельского района в 1991 г. / О. А. Макушников // Архив сектора археологии ГИКУ «Гомельский дворцово-парковый ансамбль». – Гомель, 1992. – 103 с.

7. Поболь, Л. Д. Славянские древности Белоруссии (свод археологических памятников раннего этапа зарубинецкой культуры – с середины III в. до н.э. до II в. н.э.) / Л. Д. Поболь ; под ред. Ю. В. Кухаренко. – Минск : Наука и техника, 1974. – 424 с. : ил.

8. Романов, Е. Р. Археологический очерк Гомельского уезда / Е. Р. Романов // Зап. Северо-западного отд. Императорского Русского археолог. общества. – Вильна, 1910. – Кн. 1. – С. 97–128.

9. Штыхов, Г. В. Археологическая карта Белоруссии / Г. В. Штыхов. – Минск : Полымя, 1971. – Вып. 2 : Памятники железного века и эпохи феодализма / под ред. Ф. В. Борисевича. – 276 с.

Рэзюмэ

Д. М. Ліндзянкоў

Археалагічныя разведкі ў Гомельскім і Лоеўскім раёнах на Гомельшчыне

У 2012 г. пад кіраўніцтвам аўтара былі праведзены археалагічныя разведкі ў Гомельскім і Лоеўскім раёнах. Абследаваны 20 помнікаў эпохі неаліту, бронзавага і жалезнага вякоў, перыяду сярэдневякоўя. Значны навуковы інтарэс прадстаўляюць сярэдневяковыя паселішчы і могільнікі каля г. Лоеў і в. Цяруха Гомельскага раёна.

Summary

D. N. Lindenkov

Archaeological exploration in Gomel district and Loyev district

In 2012 archaeological exploration in Gomel District and Loyev District was held under the direction of the author. Twenty archaeological sites dating back to the Neolith, the Bronze Age, the Iron Age, the Middle Ages were studied. Medieval settlements and cemeteries near the town of Loyev and the village of Teryukha are of great academic interest.

Поступила 24.09.2013 г.

УДК 902/904«20»(476)=161.3

І. У. Магалінскі, *Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, старшы навуковы супрацоўнік (г. Полацк, Беларусь)*

Археалагічныя даследаванні ў Полацку ў 2012 годзе[1]

У артыкуле прадстаўлены асноўныя вынікі археалагічных даследаванняў у Полацку ў 2012 г. Прыводзіцца характарыстыка культурнага слоя і матэрыялаў, атрыманых падчас археалагічных работ на трох аб'ектах: 1) нагляд за землянымі работамі на аб'екце «Аднакватэрны жылы дом па адрасу вул. Ф. Скарыны, побач з домам № 15»; 2) нагляд за пракладкай каналізацыі да дома № 23 па вул. Ніжне-Пакроўскай; 3) археалагічнае назіранне за работамі на аб'екце «Газазабеспячэнне жылога дома № 5 па 4-му завулку Ф. Міронавай». У ходзе прац былі удакладнены даныя аб характары і ступені захаванасці культурнага слоя на розных участках горада, пацверджаны асобныя высновы папярэдніх даследчыкаў Полацка.

У 2012 г. на падставе Дазволаў № 2409, № 2469 і № 2416 (форма № 4), якія былі выдадзены Інстытутам гісторыі НАН Беларусі старшаму навуковаму супрацоўніку Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка І. У. Магалінскаму, праводзіліся археалагічныя даследаванні на трох аб'ектах у горадзе Полацку. Вывучалі культурныя напластаванні ў межах Вялікага і Запалоцкага пасадаў.

1. Археалагічны нагляд за правядзеннем земляных работ на аб'екце **«Аднакватэрны жылы дом па адрасе вул. Ф. Скарыны, побач з домам № 15»** праводзіўся ў чэрвені–ліпені 2012 г. Акрамя нагляду за землянымі работамі з мэтай атрымання найбольш поўнай інфармацыі па стратыграфіі дадзенай часткі пасада на аб'екце былі даследаваны два шурфы.

Земляныя работы зводзіліся да распрацоўкі васьмі сумежных траншэй агульнай працягласцю 51 м, якія прызначаліся для заліўкі стужкавага фундаменту (мал. 1). Даўжыня заходняй траншэі – 14 м, усходняй – 12, паўднёвай – 13, агульная працягласць паўночнай траншэі – 12 м. Максімальная глыбіня траншэй – 1,3 м, шырыня – 1,2 м. Стужкавыя фундаменты дома на момант пачатку археалагічных работ былі ўжо часткова завершаныя, што не дазволіла прасачыць стратыграфію культурных напластаванняў у межах усіх траншэй.

Шурф 1 агульнай плошчай 4 м^2 быў закладзены ўнутры стужкавых фундаментаў будучага дома ў яго паўднёва-заходнім куце пасля зняцця верхняга баластнага пласта будаўнічай тэхнікай (мал. 1). Шурф 1 (2 × 2 м) арыентаваны па баках свету. Яго плошча падзелена на квадраты памерам 1 × 1 м. Раскопкі ажыццяўлялі ўручную, па пластам 0,2 м. Максімальная магутнасць культурнага пласта ў шурфе 1 – 0,58 м, а сярэдняя – 0,2 м.

Шурф 2 агульнай плошчай 12 м^2 быў закладзены на адлегласці 11 м ад паўночна-заходняга вугла стужкавага фундаменту будучага дома (мал. 1). Шурф 2 (6 × 2 м) арыентаваны па баках свету. Яго плошча падзелена на квадраты памерам 1 × 1 м. У ходзе работ да перашапачатковага памеру шурфа 2 (4 × 2 м) была зроблена прырэзка 2 м^2 (паўночная сценка). Раскопкі ажыццяўлялі ўручную, па пластам 0,2 м. Максімальная магутнасць культурнага пласта ў шурфе 2 дасягае 0,8 м, пры сярэдняй – 0,3–0,4 м. Пляцоўка, абраная для даследавання, істотна паніжаецца ў напрамку поўдзень–поўнач (да 0,75 м).

Земляныя работы праводзілі на тэрыторыі гістарычнага цэнтра Полацка, які з'яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю і ўваходзіць у межы зоны аховы культурнага слоя. У непасрэднай блізкасці ад месца даследаванняў праводзіўся археалагічны нагляд за землянымі работамі падчас будаўніцтва дзіцячага садка ў 1962 г. (Г. В. Штыхаў). Даследчык адзначаў, што найстаражытнейшыя напластаванні ў катлаване ўтрымліваюць матэрыялы XI–XII стст. Сярод знаходак, выяўленых падчас нагляду, трэба адзначыць кераміку, праселкі, арнаментаваны касцяны грэбень [1, с. 8]. У 1992 г. недалёка археалагічныя даследаванні праводзілі пад кіраўніцтвам С. В. Тарасава (раскопкі каля Воданапорнай вежы – сучасны экалагічны музей). Даследчык адзначыў, што перадмацерыковыя напластаванні звязаны з XI–XII стст. (кераміка), аднак пляцоўка раскопу ў XVI–XVII стст. трапіла пад шчыльную забудову, што значна пашкодзіла ранейшыя напластаванні [2, с. 3]. У 2009–2010 гг. выратавальныя археалагічныя даследаванні праводзіліся пад кіраўніцтвам М. В. Клімава. Даследчык прыходзіць да высновы, што ў развіцці паўночнай часткі Вялікага пасада назіралася некалькі этапаў, самы ранні з якіх датаваны канцом X – першай паловай XIII ст. Нягледзячы на тое што культурны пласт XIV–XVIII стст. быў амаль поўнасцю знішчаны ў выніку актыўнай будаўнічай дзейнасці, атрыманыя матэрыялы сведчылі аб наяўнасці ў гэтай частцы пасада пабудоў простых гараджан і магнатаў [3, с. 63].

Магутнасць культурнага пласта ў межах будаўнічых траншэй дасягае 1,3 м. Культурны пласт неаднародны, утрымлівае сляды розначасовай будаўнічай і гаспадарчай актыўнасці. Адразу пад дзірванам фіксуецца прапластка баласту (цёмна-карычневая,

[1] Артыкул напісаны ў межах выканання навукова-даследчай работы «Сацыяльная тапаграфія, гаспадарка, культура і антрапалогія насельніцтва Полацка і Полацкай зямлі ў X–XVIII стст.», № 20111102 ад 30.05.2011 г.



Мал. 1. План размяшчэння будаўнічых траншэй і шурфоў. Вул. Ф. Скарыны, побач з д. 15. Полацк. 2012 г.

сухая, дробнакамкаватая глеба з уключэннем цэглы, каменьчыкаў і будаўнічага смецця). Гэты слой аддзелены ад ніжняй прапласткі чорнай, сухой, дробнакамкаватай глебы пластом бітай цэглы, які зафіксаваны ў профілях практычна ўсіх траншэй. Мацярык зафіксаваны не ва ўсіх траншэях. Ён уяўляе сабой вільготны, светла-жоўты, дробнакамкаваты пясок.

Культурны слой у межах шурфа 1 часткова пашкоджаны ў выніку гаспадарчай дзейнасці. Большая частка верхніх баластных пластоў на абраным для даследаванняў участку была знята ў ходзе будаўнічых работ. У сувязі з гэтым агульная магутнасць культурнага слоя ў шурфе 1 (разам з мацерыковымі ямамі) не перавышае 0,58 м. Верхні слой у шурфе 1 прадстаўлены прапласткай чорнай, сухой, дробнакамкаватай глебы, якая ўключае ў сябе фрагменты бітай цэглы і дробныя каменьчыкі. Магутнасць слоя – 0,2–0,3 м. У заходняй сценцы шурфа 1 у межах кв. 1–2 гэтая праслойка мяжуе з чорнай, сухой, дробнакамкаватай глебай моцна перамяшанай са светла-жоўтым, сухім, дробнакамкаватым пяском. Тут жа, у кв. 1 зафіксавана магутная лінза гліны (0,8 × 0,2 м). Такім чынам, заходняя сценка шурфа 1 моцна пашкоджана ў выніку будаўнічай дзейнасці. Сярод знаходак з верхняга слоя варта назваць фрагменты керамічных начынняў, пераважна XVII–XVIII стст. Ніжні перадмацерыковы пласт прадстаўлены шэрай, вільготнай, дробнакамкаватай глебай. Гэты слой зафіксаваны ў паўднёвай, паўночнай і часткова ўсходняй сценках шурфа 1. Магутнасць слоя дасягае 0,4 м. У яго межах сустракаюцца невялікія лінзы жоўтага, вільготнага, дробнакамкаватага пяску і чырвонай гліны (кв. 1–2).

Культурны слой у межах шурфа 2 дастаткова добрай захаванасці і складаецца з двух асноўных пластоў. Верхні слой прадстаўлены чорнай, сухой, дробнакамкаватай глебай з уключэннямі бітай цэглы, каменьчыкаў і будаўнічага смецця. Праслойка істотна пашкоджана карэннямі дрэў і кустарнікаў. Магутнасць слоя дасягае 0,6 м, пры сярэдняй магутнасці 0,2–0,3 м. Сярод знаходак з верхняга пласта трэба адзначыць шматлікія фрагменты керамічных начынняў XVII–XVIII стст. Ніжні слой ў шурфе 2 прадстаўлены шэрай, вільготнай, дробнакамкаватай глебай. Пласт фіксуецца толькі ў межах кв. 9–12. Яго магутнасць дасягае 0,4 м. Знаходкі з ніжняга слоя прадстаўлены фрагментамі керамічных начынняў XI–XIII стст., а таксама нарыхтоўкай рогавага грэбеня XII ст. Непасрэдна пад ніжнім слоем на некаторых участках шурфа 2 зафіксавана прапластка светла-шэрай, вільготнай, дробнакамкаватай глебы магутнасцю да 0,3 м (кв. 4). Археалагічных знаходак у межах гэтай праслойкі не выяўлена.

Калекцыя археалагічных знаходак з археалагічнага нагляду за будаўнічымі траншэямі, а таксама з шурфоў 1 і 2 налічвае 247 пазіцый. Найбольш распаўсюджанымі масавымі знаходкамі з'яўляюцца рэшткі керамічных начынняў. Пераважная большасць з іх захавалася ў фрагментаваным выглядзе, што абумоўлена актыўным выкарыстаннем участка, на якім праводзіліся даследаванні, для гаспадарчых патрэб. Асноўная колькасць керамічнага матэрыялу

прадстаўлена фрагментамі тэракотавых гаршкоў. Найбольш ранняе венца гаршка прадстаўлена часткай ляпнога начыння, падпраўленага на ганчарным крузе, што характэрна для другой паловы X–XI ст. (мал. 2: *4*) [4]. У адной мацерыковай яме з гэтым венцам выяўлены яшчэ некалькі верхніх частак керамічных гаршкоў, тыповых для XI–XII стст. (мал. 2: *1–3*). Тыпалагічна блізкія артэфакты Г. В. Штыхаў адносіў да тыпу IA, які бытаваў у X–XI стст, але сустракаўся і ў матэрыялах XII ст. [5, с. 81]. Сярод гаршкоў XI–XIII стст. пераважаюць вырабы са складаным венцам, край якога загнуты ўнутр у форме літары «S» (мал. 2: *5–8*). Аналагічныя гаршкі з полацкага гарадзішча аднесены Д. У. Дукам да тыпу А. Паводле падлікаў даследчыка, асноўная колькасць венцаў дадзенага тыпу прыпадае на XIII ст., аднак сустракаюцца яны ў пластах XI–XIII стст. [6]. На тэрыторыі Запалоцкага пасада падобная кераміка датавана XI–XIII стст. [4]. Венцы гаршкоў XVII–XVIII стст. прадстаўлены фрагментамі керамічных начынняў з валікападобным, пастаўленым прама верхнім краем, з невысокай шыйкай і пакатым плечуком (мал. 3: *12–17*). Падобныя керамічныя начынні з'яўляюцца характэрнымі для культурных напластаванняў Полацка XVI–XVII стст. [7, с. 101]. Акрамя гаршкоў былі зафіксаваны фрагменты талерак XVII–XVIII стст., а таксама дробныя фрагменты плінфы другаснага



Мал. 2. Археалагічныя знаходкі X–XVIII стст.: *1–8, 10–13* – кераміка; *9* – шыфернае праселка. Шурф 1. Вул. Ф. Скарыны, побач з д. 15. Полацк. 2012 г.



Мал. 3. Археалагічныя знаходкі XII–XVIII стст. (*1–18*). Шурф 2. Вул. Ф. Скарыны, побач з д. 15. Полацк. 2012 г.



Мал. 4. План размяшчэння траншэі. Вул. Ніжне-Пакроўская, д. 23. Полацк. 2012 г.

выкарыстання, якія знойдзены падчас нагляду за будаўнічымі траншэямі на ўчастку Е–Е1. Сярод індывідуальных знаходак трэба адзначыць фрагмент шыфернага праселка XI–XIII стст., а таксама апрацаваны з двух бакоў рог, які можа з'яўляцца нарыхтоўкай грэбеня (мал. 2: *9*). Прадмет знойдзены ў слоі XII ст. Падчас нагляду была таксама выяўлена моцнакаразіраваная абутковая падкоўка XVII–XVIII стст., якая развалілася падчас рэстаўрацыі. Захаванасць вырабу не дазваляе адназначна аднесці яго да пэўнага тыпу. Найбольш верагодна, што падкоўка адносілася да групы трохшыпных прыстасаванняў для абароны абцаса абутку ад сцірання [8].

Такім чынам, археалагічныя даследаванні на аб'екце «Аднакватэрны жылы дом па адрасе вул. Ф. Скарыны, побач з д. № 15» дазволілі ўдакладніць даныя аб характары культурных напластаванняў у дадзенай частцы горада. Характар атрыманых падчас даследавання матэрыялаў дазваляе сцвярджаць, што першыя пасяленні з'явіліся тут напрыканцы X – XI ст. Пра гэта сведчыць знаходка венца ляпнога гаршка, падпраўленага на ганчарным крузе, а таксама ганчарная кераміка XI–XII ст. Насельнікі гэтай часткі Вялікага пасада маглі займацца рамеснай вытворчасцю, пра што сведчыць выяўленне ў межах шурфа 2 апрацаванага рогу, які мог з'яўляцца нарыхтоўкай грэбеня. У цэлым напластаванні старажытнарускага часу моцна пацярпелі ў выніку актыўнай гаспадарчай дзейнасці XVII–XIX стст. і найбольш поўна захаваліся на ўзроўні мацерыковых ям. Рэшткі позняй (XVII–XIX стст.) будаўнічай актыўнасці зафіксаваны ў выглядзе пласта бітай цэглы, які прасочваецца на ўсёй даследаванай тэрыторыі і маркіруе межы цаглянай пабудовы, якая была разбурана не раней за XIX ст. Гэтая пабудова магла быць звязана з драўляным езуіцкім касцёлам, які зафіксаваны на гістарычных картах горада ў гэтым месцы. Такім чынам, далейшае археалагічнае вывучэнне дадзенай тэрыторыі мае вялікія перспектывы і можа асвятліць новыя пытанні ў гістарычнай тапаграфіі старажытнага Полацка.

2. Археалагічны нагляд за правядзеннем земляных работ на аб'екце **«Пракладка каналізацыі да дома № 23 па вул. Ніжне-Пакроўскай у г. Полацку»** праводзілі ў ліпені 2012 г. Земляныя работы на аб'екце былі зведзены да распрацоўкі адной траншэі, канцы якой завяршаліся калодзежамі. Даўжыня траншэі – 20 м, шырыня – 0,4–0,5, глыбіня – 0,7 м. Памеры калодзежаў – 1,4 × 1,3 м, глыбіня – 0,8 м.

Земляныя работы праводзілі на тэрыторыі гістарычнага цэнтра Полацка, які з'яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю і ўваходзіць у межы зоны аховы культурнага слоя (мал. 4). Дадзеная тэрыторыя дастаткова добра вывучана ў археалагічным плане. У непасрэднай блізкасці ад месца земляных работ даследаванні праводзілі ў другой палове 1980-х гадоў – пачатку 90-х гадоў пад кіраўніцтвам Н. І. Здановіч і Г. М. Сагановіча. У 2008 г. археалагічны нагляд за будаўніцтвам офіснага будынку па вул. Ніжне-Пакроўскай каля дома № 26 праводзіў Д. У. Дук. Быў выяўлены культурны пласт з матэрыяламі XI–XX стст., сляды забудовы XVII–XVIII стст. Асаблівую цікавасць уяўляюць вынікі археалагічных даследаванняў 1991–1992 гг., якія праводзілі пад кіраўніцтвам Н. І. Здановіч на месцы будучага катлавана пад жылы дом (Ніжне-Пакроўская, 33а). У выніку былі выяўлены артэфакты XIV–XVIII стст., асобныя матэрыялы XII ст., а таксама рэшткі некалькіх пабудоў канца XVIII – першай паловы XIX ст. [9–12]. Археалагічны нагляд за землянымі работамі ў 2010 г. на вул. Ніжне-Пакроўскай, каля дома № 35А ажыццяўляў І. У. Магалінскі. У ходзе работ быў зафіксаваны культурны пласт XVII–XIX стст., а таксама асобныя матэрыялы XII–XIII стст. Адсутнасць выразнага культурнага слоя старажытнарускага



Мал. 5. Археалагічныя знаходкі XVII–XIX стст.: *1–5* – кераміка; *6, 7* – шкло. Вул. Ніжне-Пакроўская, д. 23. Полацк. 2012 г.

часу тлумачылася аўтарам даследавання нівеліроўкай дадзенага ўчастка ў ходзе будаўнічых работ у XVII–XIX стст. [13].

Культурны пласт у межах траншэі залягае на ўсю яе глыбіню (да 0,8 м). Мацярык не выяўлены. Культурны слой дастаткова неаднародны і ўтрымлівае сляды розначасовай будаўнічай і гаспадарчай актыўнасці. Пад слоем асфальту і шчэбню залягае верхні баластны пласт, які ўяўляе з сябе цёмна-шэрую, сухую, дробнакамкаватую глебу з уключэннямі бітай цэглы і будаўнічага смецця. У ніжняй частцы зафіксавана каменная кладка, складзеная з валуноў памерам да 0,15 м. Пад каменнай брукоўкай зафіксаваны пласт карычневай, сухой, дробнакамкаватай глебы з уключэннямі бітай цэглы, каменьчыкаў, керамікі. Пад пластом карычневай глебы зафіксаваны некрануты слой чорнай, сухой, дробнакамкаватай глебы.

Падчас археалагічных даследаванняў на аб'екце «Пракладка каналізацыі да дома № 23 па вул. Ніжне-Пакроўскай у г. Полацку» была сабрана калекцыя археалагічных знаходак, якія датаваны пераважна

ў межах XVII–XIX стст. Большасць знаходак прадстаўлена фрагментамі керамічных начынняў (гаршкоў, талерак, місак). Акрамя таго, падчас археалагічнага нагляду за землянымі работамі былі выяўлены фрагменты шклянога посуду XVII–XIX стст. Усяго калекцыя археалагічных знаходак складаецца з 84 пазіцый. Венцы гаршкоў прадстаўлены фрагментамі керамічных начынняў з валікападобным, пастаўленым прама верхнім краем, з невысокай шыйкай і пакатым плечуком. Падобныя керамічныя начынні з'яўляюцца найбольш характэрнымі для культурных напластаванняў Полацка XVI–XVII стст. [7, с. 101]. Акрамя гаршкоў падчас археалагічнага нагляду былі зафіксаваны фрагменты паліваных талерак, місак, куфляў (мал. 5: *1–5*). Фрагментамі канічных таўстасценных стопак прадстаўлены вырабы са шкла. Аналагічныя артэфакты былі сустрэты падчас даследаванняў Магілёва і Віцебска ў слаях XVI–XVIII стст. [14].

Археалагічныя даследаванні на аб'екце «Пракладка каналізацыі да дома № 23 па вул. Ніжне-Пакроўскай у г. Полацку» дазволілі ўдакладніць даныя аб характары культурных напластаванняў у дадзенай частцы горада. У сувязі з тым, што падчас земляных работ была парушана толькі верхняя частка культурных напластаванняў, часткова пераадкладзеная ў ходзе актыўнай гаспадарчай і будаўнічай дзейнасці на дадзеным участку ў старажытнасці і ў найноўшы час, устанавіць час засялення даследаванай тэрыторыі не ўяўляецца магчымым. Вялікая колькасць керамічных матэрыялаў XVII–XIX стст. з траншэі дазваляе казаць пра высокую інтэнсіўнасць гаспадарчага жыцця на гэтай тэрыторыі ў адзначаны перыяд. Такім чынам, далейшае вывучэнне характару культурных напластаванняў у паўднёвай частцы былога Вялікага пасада дазволіць удакладніць даныя па гістарычнай тапаграфіі Полацка.

3. Археалагічны нагляд за правядзеннем земляных работ на аб'екце **«Газазабеспячэнне жылога дома № 5 па 4-му завулку Ф. Міронавай у г. Полацку»** праводзіўся ў верасні 2012 г. Земляныя работы на аб'екце зводзіліся да распрацоўкі трох сумежных траншэй. Агульная даўжыня траншэі – 80 м, глыбіня – 1,6, шырыня – 1,0 м (мал. 6).

Археалагічныя даследаванні праводзілі на тэрыторыі гістарычнага цэнтра Полацка, які з'яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю і ўваходзіць у межы зоны аховы культурнага слоя. Дадзеная частка старажытнага горада слаба вывучана ў археалагічным плане. Асобныя даследаванні на гэтай тэрыторыі ажыццяўляў навуковы супрацоўнік НПГКМЗ А. А. Салаўёў у 2005–2006 гг. Яны зводзіліся да археалагічнага нагляду за пракладкай камунікацый па вул. Ф. Міронавай. У 2005 г. даследчык правёў нагляд за пракладкай газаправода па вул. Ф. Міронавай у раёне д. 26–34. Агульная працягласць траншэі склала 160 м, пры сярэдняй магутнасці культурнага слоя 1,4 м. У мацерыковых ямах ці перадмацерыковым слоі выяўлены матэрыялы XI–XIII стст. Сярод зна-



Мал. 6. План размяшчэння траншэі. 4-ы зав. Ф. Міронавай, д. 5, 8. Полацк. 2012 г.



Мал. 7. Археалагічныя знаходкі XI–XIII стст.: *1–8* – кераміка, *9* – жалеза. 4-ы зав. Ф. Міронавай, д. 5. Полацк. 2012 г.

ходак пераважаюць керамічныя вырабы. Выяўлена таксама некалькі фрагментаў ружовага шыфернага сланца са слядамі апрацоўкі. У 2006 г. ажыццяўляўся нагляд за пракладкай траншэі пад водаправод (агульная працягласць – 700 м) уздоўж усёй вул. Ф. Міронавай. У выніку была зафіксавана наяўнасць культурнага слоя XI–XII стст. у межах мацерыковых ям. Акрамя таго, знойдзены і асобныя матэрыялы XVIII ст. (геральдычная кафля) [15]. У 2008 г. археалагічныя даследаванні гэтай часткі пасадскай тэрыторыі праводзіла экспедыцыя Інстытута гісторыі НАН Беларусі пад кіраўніцтвам М. В. Клімава. У выніку праведзеных раскопак была зроблена выснова, што плошча паўночна-усходняй часткі Запалоцкага пасада вагалася ў залежнасці ад перыяду і мела найбольшае пашырэнне ў канцы XI – першай палове XIII ст. – 12 га. [4]. У 2010 г. археалагічны нагляд за пракладкай газаправода па 5-му зав. Ф. Міронавай праводзіў старшы навуковы супрацоўнік НПГКМЗ І. У. Магалінскі. Агульная працягласць траншэі склала 180 м пры максімальнай магутнасці культурнага слоя 1,3 м. Сярод матэрыялаў, атрыманых падчас археалагічных прац, пераважае кераміка XII–XIII стст., акрамя таго, сустракаюцца фрагменты кафлі і венцаў гаршкоў XVII–XVIII стст. У 2011 г. І. У. Магалінскі ажыццяўляў археалагічны нагляд за землянымі работамі, а таксама праводзіў шурфоўку ў двары дома № 27. У выніку была выяўлена невялікая па магутнасці праслойка чорнай зямлі, насычаная керамічнымі матэрыяламі пераважна XII–

XIII стст., што ўказвае на існаванне тут пасяленняў на працягу кароткага адрэзка часу [16].

Культурны пласт ў межах траншэі дасягае 1,2 м пры сярэдняй магутнасці 0,45–0,50 м. Ён дастаткова аднародны і ўяўляе з сябе цёмна-карычневую і цёмна-шэрую, сухую, дробнакамкаватую, сухую глебу. У выніку актыўнай будаўнічай і гаспадарчай дзейнасці на значнай частцы траншэі культурны слой знаходзіцца ў пераадкладзеным стане.

Падчас археалагічных даследаванняў на аб'екце «Газазабеспячэнне жылога дома № 5 па 4-му завулку Ф. Міронавай у г. Полацку» была сабрана калекцыя археалагічных знаходак, якая складае 36 пазіцый. Усе артэфакты з'яўляюцца часткамі керамічных начынняў. Сярод гаршкоў пераважаюць вырабы са складаным венцам, край якога загнуты ўнутр у форме літары «S» (мал. 7: *3–7*). Аналагічныя гаршкі з полацкага гарадзішча аднесены Д. У. Дукам да тыпу А. Паводле падлікаў даследчыка, асноўная колькасць венцаў дадзенага тыпу прыпадае на XIII ст., аднак сустракаюцца яны ў пластах XI–XIII стст. [6]. Асобна трэба адзначыць два венцы гаршкоў, якія можна датаваць XI ст. (мал. 7: *1, 2*). Тыпалагічна блізкія артэфакты Г. В. Штыхаў адносіў да тыпу IA, які бытаваў у X–XI стст., але сустракаўся і ў матэрыялах XII ст. [5, с. 81]. Акрамя керамікі з мацерыковай ямы 1 паходзіць моцнакаразіраваны фрагмент скабянога вырабу, які паводле спадарожных матэрыялаў можна датаваць XII–XIII стст. (мал. 7: *9*).

Такім чынам, археалагічныя даследаванні на аб'екце «Газазабеспячэнне жылога дома № 5 па 4-му завулку Ф. Міронавай у г. Полацку» дазволілі ўдакладніць даныя аб характары культурных напластаванняў у дадзенай частцы горада. Самыя раннія матэрыялы дазваляюць выказаць меркаванне адносна першага засялення тэрыторыі ўжо ў XI ст. Найбольш верагодна, што ў XII–XIII стст. гэтыя тэрыторыі адносіліся да сельскага паселішча – спадарожніка Полацка, а таксама выконвалі функцыю агародаў гарадскога насельніцтва. На гэты факт указвае дастаткова бедная матэрыяльная культура мясцовага насельніцтва, прадстаўленая ў археалагічным матэрыяле толькі фрагментамі керамічных начынняў. Практычна поўная адсутнасць матэрыялаў больш позняга часу дазваляе сцвярджаць аб тым, што гэтая частка горада пасля XIII ст. не была заселена. Супастаўленне даных археалагічных даследаванняў, а таксама картаграфічных матэрыялаў прыводзіць нас да высновы, што жыццё на гэтай тэрыторыі працягвалася толькі ў XVII–XVIII стст., прычым дастаткова вузкай паласой уздоўж берага р. Палата.

Літаратура

1. Штыхов, Г. В. Отчет о раскопках на Полоцком городище и на мысах вдоль Полоты в 1962 г. / Г. В. Штыхов // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – № 129.

2. Тарасаў, С. В. Справаздача аб археалагічных доследах у Полацку і полацкай акрузе ў 1992 г. / С. В. Тарасаў // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – № 1422.

3. Клімаў, М. В. Асобныя аспекты развіцця паўночнай часткі Вялікага пасада г. Полацка (па выніках археалагічных даследаванняў 2009 г. на вул. Ф. Скарыны) / М. В. Клімаў // Беларускае Падзвінне : вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : у 2 ч. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Ч. 1. – С. 55–64.

4. Клімаў, М. В. Новыя даныя аб Запалоцкім пасадзе ў Полацку (па выніках раскопак 2008 г.) / М. В. Клімаў // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – Вып. 21 : Вывучэнне археалагічных помнікаў на тэрыторыі Полацкай зямлі (да 1150-годдзя Полацка). – С. 74–98.

5. Штыхов, Г. В. Древний Полоцк / Г. В. Штыхов. – Минск : Наука и техника, 1975. – 136 с.

6. Дук, Д. У. Археалагічныя раскопкі на старажытным полацкім гарадзішчы ў 2007 г. / Д. У. Дук // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – Вып. 21 : Вывучэнне археалагічных помнікаў на тэрыторыі Полацкай зямлі (да 1150-годдзя Полацка). – С. 30–60.

7. Дук, Д. У. Полацк XVI–XVIII стагоддзяў : нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада / Д. У. Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2007. – 268 с.

8. Магалінскі І. У. Абутковыя падкоўкі XIV–XVIII стагоддзяў (па матэрыялах археалагічных даследаванняў у г. Полацку ў 2000–2008 гг.) // Беларускае Падзвінне : вопыт, методыка і вынікі палявых даследаванняў (да 80-годдзя пачатку археалагічных раскопак у г. Полацку). – Наваполацк : Выдавецтва УА «ПДУ», 2009. – С. 50–55.

9. Сагановіч, Г. М. Справаздача аб правядзенні археалагічных даследаванняў у г. Полацку ў жніўні 1986 г. / Г. М. Сагановіч // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – № 975.

10. Дук, Д. У. Справаздача аб археалагічных даследаваннях на аб'екце «Узвядзенне офіснага будынка па вул. Ніжнепакроўскай (Леніна), 26» у 2008 г. / Д. У. Дук // «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – № 2890.

11. Здановіч, Н. І. Справаздача пра археалагічныя даследаванні па вул. Леніна, 35 у г. Полацку ўлетку 1992 г. / Н. І. Здановіч // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Кн. 1. – № 1450.

12. Здановіч, Н. І. Справаздача пра архітэктурна-археалагічныя раскопкі летам 1991 г. / Н. І. Здановіч // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – № 1373.

13. Магалінскі, І. У. Археалагічныя даследаванні ў Полацку ў 2010 годзе / І. У. Магалінскі // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск : Беларус. навука, 2012. – Вып. 23 : Археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Беларусі ў 2009–2010 гадах. – С. 342–348.

14. Бубенько, Т. С. Стеклянная посуда из витебской корчмы XVII–XVIII вв. (типология и хронология) / Т. С. Бубенько // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск : Бела-

рус. навука, 2012. – Вып. 23 : Археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Беларусі ў 2009–2010 гадах. – С. 135–149.

15. Салаўёў, А. А. Да вынікаў археалагічных даследаванняў на вуліцы і завулках Ф. Міронавай у 2005–2006 гг. / А. А. Салаўёў // Беларускае Падзвінне : вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : у 2 ч. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Ч. 1. – С. 114–124.

16. Магалінскі, І. У. Справаздача аб археалагічных даследаваннях на тэрыторыі Запалоцкага пасада г. Полацка ў 2011 г. / І. У. Магалінскі // (на зацвярджэнні ў палявым камітэце).

Резюме

И. В. Магалинский

Археологические исследования в Полоцке в 2012 году

Представлены основные результаты археологических исследований в Полоцке в 2012 г. Проводится характеристика культурного слоя и материалов, полученных во время археологических работ на трех объектах: 1) надзор за земляными работами на объекте «Одноквартирный жилой дом по адресу ул. Ф. Скорины, рядом с домом № 15»; 2) надзор за прокладкой канализации к дому № 23 по ул. Нижне-Покровской; 3) археологическое наблюдение за работами на объекте «Газоснабжение жилого дома № 5 по 4-му переулку Ф. Мироновой». В результате были уточнены данные о характере и степени сохранности культурного слоя на разных участках города, подтверждены отдельные выводы исследователей Полоцка.

Summary

I. V. Mahalinski

Archaeological researches in Polotsk in 2012

In this article there are the main results of the archaeological researches in Polotsk in 2012. The cultivated layer and the materials of the archaeological studies of three objects are characterized in the article. As a result the information about the character and degree of preservation of the cultivated layer at different places of the town was specified. Also some conclusions of the researchers of Polotsk were confirmed.

Паступіў 14.05.2013 г.

УДК 902/904(476.2)

Т. В. Маслюкоў, *настаўнік гісторыі вышэйшай катэгорыі (г. Светлагорск, Беларусь)*

Археалагічныя абследаванні ў Жлобінскім і Светлагорскім раёнах у 2012 годзе

У 2012 г. праведзены археалагічныя абследаванні ў Жлобінскім і Светлагорскім раёнах Гомельскай вобласці: у Жлобінскім раёне – у г. Жлобін, у Светлагорскім – у г. Светлагорск і в. Краснаўка (Краснаўскі сельскі савет). Агульнай мэтай было папаўненне гісторыка-археалагічных звестак па гэтых раёнах.

Жлобін у апошнія гады стаў трэцім па колькасці насельніцтва горадам Гомельскай вобласці, што павышае актуальнасць вывучэння ўсіх гістарычных этапаў яго развіцця. Ранняя гісторыя Жлобіна пакуль даследавана мала, у тым ліку не высветлены абставіны заснавання паселішча. Аб'ектамі абследаванняў з'яўляліся замчышча (мал. 1) і селішча ў межах горада.

Падчас вайны Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай 1654–1667 гг. наказны гетман Войска Запарожскага І. Н. Залатарэнка, які ваяваў на маскоўскім баку, у лісце ад 15 ліпеня 1654 г. паведаміў, што яго войскі спалілі «замак Злобін» (разам з замкамі Рэчыца, Стрэшын, Рагачоў, Горваль) [1, с. 137]. Іншых пісьмовых звестак пра замак не маецца [2, с. 152]. Замак Злобін суадносяць з сучасным г. Жлобін. У такім разе гэту дату можна лічыць першай пісьмовай згадкай аб Жлобіне. У шэрагу іншых дакументаў 1654–1655 гг., якія тычацца ваенных дзеянняў, Злобін згадваецца як мястэчка, ці нават сярод гарадоў [1, с. 83, 100, 137, 424, 433, 710]. Такім чынам, у сярэдзіне XVII ст. гэта было паселішча гарадскога тыпу. Аднак магчыма, што у XVIII ст. Злобін зменшыўся да памераў сяла, таму што пасля далучэння да Расійскай дзяржавы статус мястэчка быў нададзены яму толькі ў 1818 г.

На картах 1772, 1776, 1799 г. ёсць Вышні Жлобін і Ніжні Жлобін: Vysz. Ziobyn, Nis. Ziobyn (параўн. з сучасн. польск.: niski – нізкі). Адзін з іх паказаны ніжэй г. Рагачоў па р. Дняпро і суадносіцца з сучасным г. Жлобін; другі – вышэй Рагачова. Відавочна, укладальнікі пераблыталі «Вышні» і «Ніжні», таму што пункт вышэй Рагачова пазначаны як «Nis.», і наадворот (памылка магла ўзнікнуць у выніку таго, што карты выдавалі ў Заходняй Еўропе) [3; 4, с. 121; 5]. Акрамя таго, у 1772, 1776 г. паказаны

Мал. 1. Замчышча. Выгляд з паўднёва-усходняга боку. г. Жлобін. Гомельская вобласць. 2012 г.

таксама Жлобін (Ziobyn) на р. Бярэзіна, вышэй Горвалі, сучаснай вёскі Рэчыцкага раёна. Гэта значыць, картаграфічныя крыніцы не даюць адназначнага пацвярджэння таму, дзе мог знаходзіцца Злобін, які згадваецца ў 1654–1655 гг.

Буйнамаштабныя карты 1853, 1899, 1913 г. (па рэкагнасцыроўцы 1866 г.) і фота пачатку XX ст. паказваюць, што гістарычная частка Жлобіна размешчана паміж Свята-Траецкім саборам, р. Дняпро, ранейшым ручаём Чорначка (прыток Дняпра, цяпер у калектары) і шляхам Рагачоў–Рэчыца (зараз вул. Маркса) [6–8]. Паводле вынікаў апытання мясцовых жыхароў, гэта тэрыторыя была забудавана (пераважна аднапавярховымі дамамі) і па сваім значэнні з'яўлялася цэнтрам горада аж да Вялікай Айчыннай вайны. Падчас вайны забудова тут была разбурана, а ў далейшым закладзены гарадскі парк культуры і адпачынку «Прыдняпроўскі».

На гэтай тэрыторыі ў 1983 г. М. А. Ткачоў выявіў і абследаваў замчышча і селішча. На замчышчы размешчаны сучасны будынак – спартыўная школа, і школьны стадыён. Селішча знаходзіцца паміж замчышчам і р. Дняпро, на ім размешчаны парк. На селішчы М. Ткачоў выявіў культурны слой таўшчынёй да 1 м і кераміку XIV–XVII стст. [9, с. 407–408].

Мал. 2. Камень-валун з крыжом. Выгляд з паўднёва-усходняга боку. в. Краснаўка. Краснаўскі сельсавет. Светлагорскі раён. Гомельская вобласць. 2012 г.

У 2012 г. на селішчы абследаваны ўчастак паверхні культурнага слоя агульнай плошчай каля 5150 м^2 і сабраны паверхневы матэрыял. Найбольш раннія знаходкі – ляпная кераміка железнага веку. Яна выяўлена ў Жлобіне ўпершыню. На некаторых фрагментах маецца арнамент у выглядзе штрыхоўкі, якая нанесена па ўсёй паверхні. Гэтыя знаходкі адносяцца да канца 1-га тысячагоддзя да н. э. – пачатку I тысячагоддзя н. э.

Асноўная частка знаходак адносіцца да XVI – пачатку XX ст. Найбольш частыя знаходкі – ганчарная непаліваная кераміка XVI–XVIII стст., цёмнашэрага колеру, які атрыманы задымліваннем. Паверхня неглянцаваная, таўшчыня сценак 0,1–0,8 см, донцаў – да 0,9 см. Сустракаецца паліваная кераміка жоўтага, зялёнага, карычневага і шэрага колераў. Профілі фрагментаў сценак маюць таўшчыню 0,1–0,4 см, донца – да 0,7 см. Радыус буйнога фрагмента донца – 7,4 см. Вылічаны знешні дыяметр двух венчыкаў – 8,7 см (куфаль, карычневы) і 13 см (міска, жоўта-зялёная).

На селішчы знойдзены фрагменты глінабітных збудаванняў. Яны маюць плоскую паверхню з аднаго боку без слядоў апрацоўкі, у тоўшчы – шматлікія сляды саломы, з унутранага боку – сляды абпальвання. Верагодна, адносіліся да глінабітных печаў, магчыма – да печак-домніц, што суадносіцца са шматлікімі знаходкамі жужалю. На тэрыторыі селішча часта сустракаецца жужла, што паказвае на існаванне мясцовай металургічнай вытворчасці.

Сярод знаходак – фрагменты глінянай абмазкі сцен, якія маюць плоскую роўную паверхню з абодвух бакоў, без слядоў абпальвання і дамешак саломы. На некаторых фрагментах – сляды апрацоўкі, якая рабілі, верагодна, пучком сена па знешнім баку, па ўсёй паверхні. Таўшчыня фрагментаў – да 1,8 см. Магчыма, абмазку наносілі на замкавыя сцены. Па пісьмовых крыніцах вядома, што гліняную абмазку мелі, у прыватнасці, драўляныя замкі Гомель, Рэчыца, Стрэшын, якія існавалі ў адзін час з замкам Злобін. Знойдзены таксама невялікія фрагменты кафлі (румпы).

Абследаваны і адхілы замчышча. Паверхневы матэрыял на іх аналагічны матэрыялу з селішча. Знойдзены таксама каваны цвік-ухналь даўжынёй 2,5 см.

Атрыманыя матэрыялы дазваляюць зрабіць наступныя высновы. Паселішча на месцы Жлобіна існавала яшчэ ў жалезным веку. Знаходкі, якія суадносяцца з г. Жлобін, належаць у асноўным да часу, пачынаючы з XVI ст. Абранню месца для заснавання Жлобіна спрыялі, відавочна, прыблізна аднолькавая адлегласць да суседніх замкаў па Дняпры – Рагачова і Стрэшына, і зручны ўчастак для прыстані (вышэй і ніжэй па беразе – працяглая забалочанасць). Незабудаваная тэрыторыя селішча дае

магчымасць працягваць даследаванні, у тым ліку праводзіць шурфоўку і раскопкі.

Абследаванне ў г. Светлагорску (да 1961 года г. п. Шацілкі) выконвалася на селішчы Шацілкі як працяг аналагічнай працы, праведзенай у 2011 г. Задачай з'яўлялася вызначэнне тэрыторыі паселішча з XVII ст., пасля яго выхаду за межы першапачатковай забудовы – маёнтка Шацілінскі Востраў. Паміж каналам ад р. Бярэзіна і сядзібнай забудовай па вул. Новая сабраны паверхневы матэрыял. Знойдзены фрагменты непаліванага посуду XVII–XVIII ст., у асноўным цёмна-шэрага колеру, які атрыманы задымліваннем. Знаходкі паказваюць, што пасля пашырэння паселішча за межы Шацілінскага Вострава сяло Шацілавічы, пазней Шацілкі, забудоўвалася паміж пратокай ад р. Бярэзіна (сучасны канал) і Горвальскім трактам (сучасная вул. Савецкая).

У 2012 г. ад мясцовых жыхароў былі атрыманы звесткі пра тое, што ў в. Краснаўка, у двары індывідуальнага жылога дома, маецца камень з выявай крыжа (мал. 2). У сувязі з гэтым было праведзена абследаванне ў Краснаўцы. Вёска згадваецца ў 1844 г. ў Парыцкай воласці; адносілася да прыходу Каралеўская Слабада. У наш час размешчана ўздоўж правага берага старычнай затокі, якая па картаграфічных даных 1866 г. была рэчышчам Бярэзіны (сучаснае рэчышча насупраць вёскі знаходзіцца далей на ўсход). Каля Краснаўкі У. П. Ксяндзоў у 1974 г. выявіў і ў 1977 і 1981 г. даследаваў два паселішчы эпохі мезаліту; у 1983 г. Н. М. Дубіцкая абследавала курган [10, с. 340]. У вёсцы і наваколлях шмат валуноў, якія выкарыстоўваюць, у прыватнасці, для ўпрыгожвання тэрыторыі.

Пры абследаванні ад уладальніка ўчастка, на якім знаходзіцца камень з крыжом, атрыманы таксама фрагмент глінянага сасуда, які быў знойдзены некалькі гадоў таму на гэтым двары. Фрагмент належыць да ляпнога посуду, з арнаментам у выглядзе дыяганальных насечак; адносіцца да сярэднедняпроўскай культуры бронзавага веку, другая палова 3-га – першая палова 2-га тысячагоддзя да н. э.

Па словах уладальніка, ён набыў дом у 2005 г., і валун знаходзіўся на гэтым самым месцы. Камень ляжыць на ускрайку двара, большая частка знаходзіцца ў зямлі; даўжыня – 65–70 см, шырыня – 50, таўшчыня – 25–30 см. Крыж высечаны на ўсю даўжыню і шырыню паверхні валуна.

Вясковыя могілкі знаходзяцца за 1 км ад валуна з крыжом, за 0,7 км ад ускрайку вёскі. У іх ёсць старая частка, дзе на месцы пахаванняў усталяваны валуны, на адным з іх надпісаны, верагодна, год (прачытаць не атрымалася). Выяў крыжоў на могілкавых валунах няма; верагодна, побач з імі былі драўляныя крыжы. Улічваючы адлегласць ад вёскі і дастатковую наяўнасць валуноў у мясцовасці, няма падстаў меркаваць, што камень з крыжом быў узяты з могілак для другаснага выкарыстання.

Суадносячы валун з крыжом, з гістарычнымі і тапаграфічнымі данымі, якія маюцца па гэтай мясцовасці, можна меркаваць, што выява крыжа адносіцца да часу ўтварэння вёскі – XVIII – пачатку XIX ст. Яна магла быць высечана ў памяць аб падзеі – напрыклад, аб заснаванні паселішча, альбо пры закладцы валуна ў падмурак пабудовы. Такім чынам, Краснаўскі валун можна аднесці да памятных камянёў з крыжамі.

Варта адзначыць, што раней два падмуркавыя валуны з крыжамі былі знойдзены пры раскопках у в. Каралева Слабада-2, за 6 км ад Краснаўкі. У в. Здудзічы, за 22 км ад Краснаўкі, у 1993 г. быў выяўлены каменны крыж, які С. Я. Рассадзін адносіць да X–XI стст. Усе адзначаныя паселішчы знаходзяцца ля р. Бярэзіны. Магчыма, шэраг гэтых знаходак указвае на існаванне мясцовай традыцыі каменных выяў.

Матэрыялы абследаванняў перададзены адпаведна ў Жлобінскі і Светлагорскі гісторыка-краязнаўчыя музеі.

Літаратура і крыніцы

1. Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией : в 15 т. – СПб., 1863–1892. – Т. 14 : 1654–1655 [гг.] (Дополнения к т. 3). – СПб., 1889. – 902 с.

2. Ткачов, М. А. Замкі і людзі / М. А. Ткачоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 184 с.

3. Carte de la Pologne divisée par provinces et Palatinats et subdivisée par districts / construite d'après quantité d'arpentages d'observations par J.A.B. Rizzi Zannoni. – Paris, 1772.

4. Гістарычны атлас Беларусі. – Варшава ; Мінск : EEDC, 2008. – Т. 1. – 164 с.

5. A Map of the Kingdom of Poland and the Grand Duchy of Lithuania including Samogitia and Curland. – London, 1799.

6. Старая карта. Рогачев и окрестности. 1853 // Karty.by [Электронны рэсурс]. – 2011. – Рэжым доступу : http://www.karty.by/2011/03/03/rogachew. – Дата доступу : 20.02.2013.

7. Blatt 48–53 der Generalkarte von Mitteleuropa 1:200.000 der Franzisco-Josephinischen Landesaufnahme, Цsterreich-Ungarn. Die Blattmitte liegt bei 53° n.Br. und 48° ö. L. (östlich von Ferro). – 1899. – Рэжым доступу : http://upload.wikimedia.org/wikipedia/commons/1/11/Rogaczew_-_48-53.jpg. – Дата доступу : 20.02.2013.

8. Военно-Топографическая карта западной части Российской империи. Рядъ 17. Листъ 8. Г. Могилевской и Минской. – 1913. – Рэжым доступу : http://kartolog.ru/2010/01/trexverstnaya-voennaya-topograficheskaya-karta-rossijskoj-imperii. – Дата доступу : 20.02.2013.

9. Ткачев, М. А. Изучение средневековых памятников Белоруссии / М. А. Ткачев // Археологические открытия 1983 г. – М., 1985.

10. Ксяндзоў, У. П. Вёска Краснаўка, цэнтр сельсавета / У. П. Ксяндзоў // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гомельская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал. С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Сав. Энцыкл., 1985. – 383 с.

Резюме

Т. В. Маслюков

Археологические обследования в Жлобинском и Светлогорском районах в 2012 году

При археологическом обследовании в г. Жлобин обнаружена керамика железного века и находки, относящиеся ко времени, начиная с XVI в. В Светлогорском районе уточнена территория села Шатиловичи (сейчас г. Светлогорск) в XVII–XVIII вв., а также обнаружен камень-валун с изображением креста в д. Красновка.

Summary

T. V. Maslyukov

Archaeological studying in Zhlobin and Svetlogorsk districts in 2012

When an archaeological survey in the town Zhlobin found Iron Age pottery and finds from the time since the 16th century. In Svietlahorsk District specified area of the village Shacilavichy (now town Svietlahorsk) in 17th–18th centuries, also found boulder with a cross in the village Krasnauka.

Паступіў 15.05.2013 г.

УДК 904=623.1(476.6)

А. А. Метельский, *Институт истории НАН Беларуси, отдел истории средних веков и раннего Нового времени, старший научный сотрудник, кандидат исторических наук (г. Минск, Беларусь)*

Археологические исследования фортификационных сооружений Новогрудского замка в 2011 году

Фортификационные сооружения Новогрудского замка давно привлекают внимание исследователей. На них обращали внимание польские консерваторы в 1920–30-е годы, их изучали Ф. Д. Гуревич, М. А. Ткачев, В. Е. Соболь [1, s. 181–188; 2, с. 15–21; 3, с. 44–52; 4] но, к сожалению, не все материалы археологических исследований введены в научный оборот и не все фортификационные объекты Новогрудского замка получили должное внимание исследователей.

В связи с начавшейся подготовкой к консервации Новогрудского замка, включенного в Государственную программу «Замки Беларуси», для разработки проектно-сметной документации, решено было провести археологические исследования на объектах, которые еще не были исследованы, и сделать уточнения на уже исследованных объектах.

Одним из таких объектов является Дозорная башня. Она расположена на северо-западном углу замка. Еще в 1920-е годы польские консерваторы шурфовками оконтурили ее внешние размеры – около 14 × 14 м.

Практически до исследований 2011 г. этим и ограничивались сведения о Дозорной башне. Кроме того, некоторое представление о ней дает акварель начала XIX в. А. Алешчинского [2, с. 19], на которой показано, что на прямоугольном в плане основании Дозорной башни возвышается восьмерик и вроде бы просматриваются две бойницы напольного боя или два окна. Но насколько это отвечает реальности, тяжело было сказать, так как отсутствуют инвентарные описания Новогрудского замка.

Археологические исследования показали, что внутренний объем Дозорной башни имел размеры 9,75 × 9,15 м, а сама она длинной стороной была ориентирована по оси север–юг.

Башня сохранилась на высоту до 2,8 м, наиболее был разрушен ее северо-западный угол, который сохранился лишь на уровне фундаментов. Стены башни были разной ширины; от 2,6 м западная и южная стена, до 2,8 м северная стена и 3,0 м восточная стена. Стены башни были сложены из камней на известковом растворе, ряды между которыми зачеканивали кирпичом-пальчаткой размером 28–29 × 7–8 × 14,5–15,0 см с горизонтальными бороздами, в так называемой смешанной кладке [5, с. 83].

В южной стене башни был выявлен вход в нее, который представлял собой проем шириной 2 м, оформленный двумя рядами колонн-пилястр. С внешней стороны колонны имели ширину 90 см и выступали во внутреннюю часть прохода на 15 см, а с внутренней стороны колонны имели ширину 40 см и выступали также на 15 см. На правом от входа портале сохранился нижний металлический пробой для двери, выкованный из железа и имеющий штырь диаметром 3 см, а высоту 7 см.

Вход выложен из кирпича-пальчатки размерами 28–29 × 7–8 × 14–15 см в технике чередования тычков и ложков. Пол на входе (он же фундамент в проеме входа) был выложен из кирпича, который был уложен рядами по всей ширине проема. Судя по нивелировочным отметкам, за входом располагалась ступенька.

На правом портале входа в башню, на высоте 90 см от уровня порога, прослеживается начало арки свода, существовавшего над входом в башню. Она имела ширину 1,5 кирпича – 42–44 см.

Для доставки к башне снаряжения и другого имущества, между входом в Дозорную башню и валом был организован проход шириной до 4 м.

Пол в Дозорной башне был деревянный. Он сохранился в виде тлена лаг, которые лежали по оси восток–запад. Ширина лаг достигала 30 см. Причем пол в башне ремонтировали. Под первым (верхним) полом залегал слой строительного мусора толщиной 5–7 см, под которым просматривались следы еще одного пола в виде древесного тлена от лаг, которые лежали на глиняном основании вала.

Дозорной башня была крыта плоской черепицей, о чем свидетельствует находка ее фрагмента.

Начиная с 5-го пласта в заполнении культурного слоя Дозорной башни начинают встречаться камни размером до 40 × 70 см. Периодически это каменное заполнение составляло сплошной массив, но без какой-либо перевязки между камнями. Эти камни, вероятно, являются упавшими элементами верхних этажей Дозорной башни.

Учитывая наличие в заполнении Дозорной башни значительного количества кирпичей, которые применяли для выполнения нервюр ребер раннеготических сводов, можно утверждать, что башня имела как минимум один этаж, перекрытый сводом. Подобные кирпичи известны по находкам в Старом замке Гродно, во Вселюбском костеле под Новогрудком [5, с. с. 97, рис. 51: *12*; 6, с. 40, рыс. 19; 7, мал. 37: *1–2*; 8, с. 440, мал. 214: *3*].

Учитывая тот факт, что даже на сохранившемся на высоту 2,8 м юго-восточном углу Дозорной башни не прослеживалось начало сводов, можно ут-

верждать, что первый этаж башни имел высоту не менее 3 м.

Изучение места стыковки юго-западного угла башни с замковой стеной, обращенной на Малый замок, показало, что Дозорная башня не была перевязана со стеной. Тут ясно читается шов шириной до 2 см.

На акварели А. Алешчинского, на которой изображены остатки Дозорной башни в начале XIX в., в ее нижней части прослеживаются две бойницы напольного боя (или окна – А. А. Метельский), на что указывал М. А. Ткачев [2, с. 19].

Однако в ходе археологических исследований на западной стене башни была зафиксирована только одна амбразура от бойницы напольного боя. Она размещалась по центру западной стены башни и имела ширину проема 1,1 м. Бойница башни по бокам была обрамлена рядом из кирпича-пальчатки. Она начиналась на уровне 1,2 м от приблизительного уровня пола в башне. Высота бойницы достигала не менее 1,0 м, хотя свод арки бойницы не сохранился.

Несмотря на завершение исследования Дозорной башни не удалось выяснить, насколько акварель А. Алешчинского, с ее изображением, соответствует реалиям.

Как отмечалось выше, объем Дозорной башни был полностью заполнен камнями, что позволяет утверждать, что как минимум ее второй этаж имел такую же каменную конструкцию, как и первый.

Судя же по акварели А. Алешчинского, на квадратном основании Дозорной башни стояла круглая или восьмигранная башня. При увеличении акварели четко видны два окна (амбразуры бойниц ?) на западной стене башни, хотя при наших исследованиях было найдено только одна амбразура.

В связи с этим нельзя исключить, что до начала XIX в. остатки Дозорной башни, взорванной в середине XVII в., были гораздо выше и сохранялись на два этажа. Второй этаж башни был жилой, о чем говорит найденный археологический материал.

В заполнении культурного слоя Дозорной башни в основном встречались фрагменты керамики и изразцов, причем коробчатые изразцы – исключительно в верхних пяти пластах.

Ниже также встречались коробчатые изразцы, но гораздо более архаичного типа. Они имели пластину размером 16,0 × 16,5 см и 15,0 × 16,0 см с глубоким рельефным орнаментом, характерным для начала XVI в.

Однако большинство найденных в Дозорной башне фрагментов изразцов относится к типу мискообразных, характерных для второй половины XV – начала XVI в.

Относительно размещения находок фрагментов мискообразных изразцов бросалось в глаза, что довольно много их попадалось прямо возле входа в башню. Последнее позволяет предполагать, что на втором этаже башни печь размещалась где-то над входом или в прилегающем к нему пространстве второго этажа, и что верхние этажи Дозорной башни использовали как жилое помещение.

Время разрушения Дозорной башни довольно хорошо датировано не только общими рассуждениями о истории Новогрудского замка, но и конкретным археологическим материалом.

Керамика из заполнения Дозорной башни не выходит за середину XVII в. На уровне пола башни были найдены шпоры с острогой, завершенной звездочкой с мелкими лучами, характерные для XVI–XVII вв. Тут же найдена монета солид 1652 г. Кристины Августы Вазы из прибалтийских владений Швеции. Все это позволяет датировать время уничтожения Дозорной башни серединой XVII в. и связывать его с московским погромом Новогрудка 1655 г.

Несмотря на то что Дозорная башня сохранилась фрагментарно, она по своим размерам близка башне Щитовка Новогрудского замка и, вероятно, имела такую же конструкцию. Судя по названию, ее использовали в качестве наблюдательной, и она должна была иметь несколько этажей.

Относительно показанного на акварели А. Алешчинского восьмерика, возвышающегося над квадратным основанием Дозорной башни, то можно только утверждать, что судя по размерам Дозорной башни его диаметр был не более 6–8 м. Судя по размещению окон на восьмерике, он имел винтовую лестницу, ведущую на верх. А на его верху была открытая наблюдательная площадка. Когда был возведен восьмерик, точно неизвестно. Но, судя по тому, что кирпичи, характерные по размерам для XVIII в., не были найдены, можно предполагать, что время его сооружения также не выходит за пределы XVI – начала XVII в.

Восьмерик, вероятно, вместе со вторым этажом Дозорной башни был разобран в XIX в., когда в 1802 г. гродненский губернатор Бенигсон дал указание новогрудскому городничему Скалову разобрать остатки замковых башен и стен с условием, что камень будет использован для бруковки улиц Новогрудка.

Эти работы были выполнены до 1828 г., когда в донесении Литовско-Гродненскому губернскому правлению сообщалось, что в Новогрудском замке еще есть «… две башни довольно… крепкие, немного вверху поврежденные, состоящие в ведомстве Новогрудской экономии» [2, с. 21].

О возможности такого развития событий свидетельствует и тот факт, что сегодняшние склоны Замковой горы Новогрудка на месте Дозорной башни сильно отличаются от показанных на акварели А. Алешчинского. На ней видно, что башня до уровня двух окон обсыпана землей.

Таким образом, археологические исследования Дозорной башни Новогрудского замка, проведенные в 2011 г., дали новый материал, относящийся к истории этой фортеции.

Одновременно в 2011 г. проводили археологические исследования и Посадской башни с прилегающими к ней стенами.

Исследования показали, что Посадская башня имела внутренние размеры 3 × 3 м при ширине стен от 1,8 до 2,0 м. Причем внутреннее пространство башни было неправильной формы – несколько скошенное. Сама башня была сложена из камней, лежащих на известковом растворе, между которыми были зачеканены кирпичи размерами 28,0–29,0 × 13,5–14,0 × 7,5–8,0 см, в так называемой смешанной кладке. Вход в Посадскую башню имел ширину 1,3 м и был выполнен в виде трех каменных ступенек.

Наличие такого узкого дверного проема на входе в Посадскую башню и отсутствие выхода в ее западной стене, обращенной в сторону Малого замка Новогрудка, позволяют утверждать, что эта башня не была проездной, как это неоднократно пытались показать на разных реконструкциях Новогрудского замка [9, с. 80–81].

Сама башня была пристроена к стене замка несколько позднее, чем были построены стены замка, об этом свидетельствуют широкие швы между западной стеной замка и стенами башни.

Исследование внутреннего заполнения Посадской башни не выявило тут никаких археологических находок, не были тут обнаружены и следы отопительных сооружений.

Стена, на которой располагался вход в Посадскую башню, имеет четко выраженный цоколь, оформленный в виде двух рядов кирпичей размером 8,0–8,5 × 12,0–13,0 см, уложенных в технике тычковой кладки. Цоколь фиксируется на отметках 319,45–319,50. Ниже цоколя начинается каменный фундамент на известковом растворе, который исследован до отметки 318,95. С правой стороны от входа в Посадскую башню на стене сохранился небольшой фрагмент стены, замазанный известковым раствором и побеленный, хотя на остальной части стены следов побелки не замечено.

Ширина стен, идущих от Малой входной и Дозорной башен к Посадской, достигает 2 м. К юго-востоку от Посадской башни, практически вплотную к ней, на стене замка лежит арка, сложенная из кирпича. Это позволило утверждать предшествующим исследователям о существовании «форты» в стене замка.

Однако расчистка стены под аркой показала, что никакой «форты» тут никогда не существовало. Стена под аркой была сплошной, а сама арка, хотя и лежит на стене, вероятно, упала сюда сверху. Сегодня арка имеет длину 1,0 м (в начале 1920-х годов – 1,3 м) и высоту 0,3 м, и она сложена из двух рядов кирпичей размером 8 × 15 × ? см, лежащих в тычковой кладке. Общая ширина сохранившейся арки – 1,6–1,7 м.

Исследования показали, что современный уровень дневной поверхности на уровне замковых стен залегает на 145–175 см выше первоначального. Первоначальный уровень дневной поверхности на уровне гребня вала фиксируется на отметках 319,65–320,00, тогда как современный уровень залегает на отметках 321,05–321,40.

Приблизительно на этом же уровне (319,76) тут фиксируется и цоколь стены, который оформлен в виде выступающего вперед на 3 см горизонтального ряда камней. Исследования в траншеи вдоль этой стены продолжались до уровня 319,24–319,44. Сама стена сложена из камней на известковом растворе, между которых зачеканивали кирпич-пальчатку размером 28,0–29,0 × 13,0–13,5 × 7,5–8,0 см.

Первоначальный уровень вала перекрывает культурный слой темно-коричневого цвета мощностью до 30–35 см. Его, в свою очередь, перекрывает слой строительного мусора толщиной 30–40 см, отражающий, вероятно, строительство каменных стен замка.

Его перекрывает глиняная прослойка мощностью 40 см, которую перекрывает культурный слой темно-серого цвета с материалами XVI–XVIII вв.

Внутренний цоколь стены, ведущей от Посадской башни в сторону входа на замок, фиксируется на уровне 319,76. С внешней стороны стены (обращенной в сторону Малого замка) он также фиксируется на этом уровне (319,71) и оформлен в виде выступающих вперед на 3–5 см двух рядов кирпичей. Под этими рядами кирпичей начинается каменный фундамент стены, который расчищался нами только до отметки 319,02.

Прорезка склона Замковой горы вдоль Посадской башни показала, что сама башня стоит на самом крае площадки, которая была увеличена, вероятно, в XIX в. Во всяком случае, прорезка склона вдоль северной стены Посадской башни показала, что первоначальная дневная поверхность склона Замковой горы, до начала строительства Посадской башни, фиксируется на отметках 319,30. Над этим уровнем залегает слой строительного мусора мощностью до 75–80 см, который отражает этап строительства каменных фортификационных сооружений Новогрудского замка.

Сверху его перекрывает слой красной глины толщиной до 55 см (отметка 320,00–320,30) сверху которой залегает 30-сантиметровый культурный слой темно-серого цвета, который отложился за время функционирования фортификационных сооружений.

Этот дерновый слой перекрывает мощный (1,3–1,5 м) слой строительного мусора который, вероят-

но, отложился за время разборки замковой фортификации и организации на замке городской свалки в XIX в. На такой вывод наводит и тот факт, что в этом слое практически не встречаются находки. Этот слой перекрывает современный дерновой слой мощностью до 20 см.

Небольшая зачистка склона Замковой горы, сделанная возле Дозорной башни, показала такую же стратиграфическую картину. Это позволяет утверждать, что по всей длине замковой фортификации между этими башнями (48 м) существует такая же стратиграфическая картина – мощная отсыпка строительного мусора.

Таким образом, исследования 2011 г. на Новогрудском замке позволили уточнить размеры Дозорной и Посадской башен и выяснить их конструктивные элементы.

Литература

1. Gūrtner, R. Roboty konserwatorskie na gyrze Zamkowej w Nowogrydku (sprawozdanie ogylne) / R. Gūrtner // Ochrona zabytkyw sztuki. Czasopismo poświęcone opiece nad zabytkami inwentaryzacii i geografji zabytkyw.– Warszawa, 1930–1931. – Zeszyt 1–4 : Część pierwsza. – S. 181–188.

2. Ткачоў, А. М. Замкі Беларусі / А. М. Ткачоў. – Мінск : Беларусь, 1977. – 64 с.

3. Ткачоў, А. М. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII–XVIII стст. / А. М. Ткачоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 144 с.

4. Гурэвіч, Ф. Д. Летапісны Новгородок (старажытнарускі Навагародак) / Ф. Д. Гурэвіч. – СПб. : Агенство «РДК-принт», 2003. – 324 с.

5. Трусов, О. А. Памятники монументального зодчества Беларуси XI–XVII вв. архитектурно-археологический анализ / О. А. Трусов. – Минск : Наука и техника, 1993. – 156 с.

6. Кушнярэвіч, А. М. Культавае дойлідства Беларусі XIII–XVI стст. Гістарычнае і архітэктурна-археалагічнае даследаванне / А. М. Кушнярэвіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 146 с.

7. Трусаў, А. А. Стары замак у Гродне XI–XVIII стст. Гісторыка-археалагічны нарыс / А. А. Трусаў, В. Е. Собаль, Н. І. Здановіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 140 с.

8. Археалогія Беларусі : у 4 т. / В. М. Ляўко [і інш.] ; пад рэд. В. М. Ляўко [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – Т. 4 : Помнікі XIV–XVIII стст. – 597 с.

9. Краўцэвіч, А. К. Рыцары і дойліды Гародні / А. К. Краўцэвіч. – Вроцлаў, 2009. – 108 с.

Рэзюмэ

А. А. Мяцельскі

Археалагічныя даследаванні фартыфікацыйных збудаванняў Навагрудскага замка ў 2011 годзе

У 2011 г. на Навагрудскім замку XIV–XVII стст. былі даследаваны Дазорная і Пасадская башні.

Даследаваннямі выяўлены ўваход ў Дазорную башню шырыней да 2 м, выкананы ў выглядзе калон, і байніца ніжняга бою шырынёй 1 м. Башня захавалася ў вышыню да 2,8 м. Перакрыцце першага паверха было зводчатым. Другі паверх башні быў жылы, аб чым сведчаць знаходкі кафлі ў запаўненні башні.

Пасадская башня была прыбудавана да існуючай каменнай сцяны, аб чым сведчыць шво, якое знаходзіцца паміж імі.

Summary

A. A. Miacelski

Archaeological research fortifications of the castle Nowogrudok in the 2011

In 2011 in the Nowogrudok castle XIV–XVII centuries was investigated the Patrol and Posadskaya tower.

Studies have found the entrance to the watch tower and 2 meters wide, designed in the form of columns, and battlements of the lower bout width of 1 m. Tower is preserved to a height of 2.8 m overlap the ground floor was vaulted. The second floor of the tower was living, as evidenced by the findings of tiles to fill in the tower.

Posadskaya tower was added to the existing stone wall, as evidenced by the joint between them.

Поступила 16.05.2013 г.

УДК [902/904+908](476)

Н. А. Пачобут, *УК «Гродзенскі Дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей», вядучы навуковы супрацоўнік (г. Гродна, Беларусь)*

Археалагічныя даследаванні ў Карэліцкім раёне (гарадзішчы Беразавец і Сёгда)

Археалагічныя даследаванні ў Карэліцкім раёне праводзілі летам і восенню 2012 г. па Адкрытым лісце, выдадзеным па форме № 3 за № 2403. Дазвол быў зарэгістраваны ва Упраўленні па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь за № 1968. Мэтай нашых даследаванняў было абследаванне двух помнікаў археалогіі – гарадзішча Беразавец і гарадзішча Сёгда (мал. 1). Задачамі нашых работ былі праверка стану захаванасці гэтых помнікаў, складанне іх апісання, здымка планаў, фотафіксацыя помнікаў. Работы праводзіла сама аўтар, пасільную дапамогу якому аказаў раённы аддзел культуры ў асобе С. І. Комар.



Мал. 1. Карэліцкі раён. Карта

Карэліцкі раён размешчаны на ўсходзе Гродзенскай вобласці. Плошча раёна 1,1 тыс. км^2, падзелена на 12 сельсаветаў [9, с. 471–472]. Паводле даных «Збора помнікаў» на тэрыторыі Карэліцкага раёна меліся шэсць помнікаў археалогіі [7, с. 210, 214, 220–222, 224]. Па стане на 24.10.2012 г. аддзелам культуры Карэліцкага райвыканкама ў адпаведнасці з «Дзяржаўным спісам гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь» узяты на ўлік шэсць гісторыка-культурных каштоўнасцей археалогіі, у складзе якіх сем аб'ектаў археалогіі[1].

Археалагічныя помнікі раёна даследавалі В. С. Астапаў (1951, 1952), Ф. Д. Гурэвіч (1957), П. А. Рапапорт (1959), М. М. Чарняўскі (1962–1963, 1965), У. Ф. Ісаенка (1974), Л. У. Калядзінскі (1982), У. У. Хартановіч (1985–1989). Інвентарызацыю помнікаў археалогіі, уключаных у «Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь» па Карэліцкіму раёне, правялі В. Л. Лакіза, З. А. Харытановіч (2011).

Вынікі гэтых работ у Карэліцкім раёне ў большай ці меншай ступені знайшлі адлюстраванне ў навуковых, навукова-папулярных і даведачных выданнях [5, с. 170, 173, 175, 213; 6, с. 210–224; 11, с. 8; 19, с. 7; 20, с. 323–324; 22, с. 146; 23, с. 675; 24, с. 5–9; 25, с. 141].

Найбольшы ўнёсак у вывучэнне археалагічнай спадчыны Карэліцкага раёна зрабіў У. У. Хартановіч. На працягу пяці палявых сезонаў ён праводзіў у гэтым раёне разведкі і раскопкі [1, с. 456–457, 487]. Праўда, не ўсе помнікі Карэліцкага раёна аказаліся ў поўнай ступені аднолькава зафіксаваны. Некаторыя з іх вымагаюць больш поўнага апісання і складання плана, што ўласна і выклікала неабходнасць у правядзенні дадатковага абследавання гэтага раёна. Правядзенню палявых абследаванняў папярэднічалі азнаямленне з літаратурнымі крыніцамі (публікацыі і справаздачы), апытанне мясцовага насельніцтва.

Гарадзішча Беразавец размешчана за 10 км на поўдзень ад г. п. Карэлічы, на левым беразе р. Сэрвач праз 0,35 км на захад ад в. Беразавец Турэцкага сельсавета, праз 0,42 км на паўднёвы захад ад моста праз р. Сэрвач, які знаходзіцца побач з паўночна-ўсходнім ускрайкам в. Беразавец, за 1,3 км на паўночны захад ад в. Крынкі.

Гарадзішча займае прыродную выспу, якая ўзвышаецца прыкладна на 10 м над балоцістым поплавам р. Сэрвач (мал. 2, *а*; 3). Па словах мясцовых жыхароў, яшчэ гадоў 20–30 таму каля ўсходняга схілу гарадзішча мелася невялікае возера. Цяпер наўкола гарадзішча – палеткі. Да гарадзішча, перайшоўшы па мосце праз рэчку, вядзе грунтовая дарога. Пляцоўка гарадзішча мае форму прамавугольніка з акругленымі вугламі (мал. 4, *а*) Яе памеры па лініі поўнач–поўдзень – 45 м, па лініі захад–усход – 95 м. Паводле даных У. Ф. Ісаенкі за 1974 г. памеры пляцоўкі гэтага гарадзішча складаюць 60 × 95 м [20, с. 323–324].

Пляцоўка гарадзішча задзірванелая, у паўднёвай частцы расце груша-дзічка. На пляцоўцы відаць сляды ям даўняга паходжання. Схілы гарадзішча даволі стромкія, прыкладна 30–45º, нават 60º. Дзенідзе абапал гарадзішча захаваліся рэшткі абарончага рова, глыбінёй ад 0,5 да 0,7 м і шырынёй да

[1] Колькасць помнікаў археалогіі, прычым толькі адных селішч у Карэліцкім раёне, паводле Л. Д. Побаля, складае 164 [19, с. 7]. Гэта лічба выклікае недавер, бо ўсіх помнікаў археалогіі, што маюцца на ўліку ва ўпраўленні культуры Гродзенскага аблвыканкама, налічваецца 440 аб'ектаў.

а

б

Мал. 2. Фота са штучнага спадарожніка: *а* – гарадзішча, в. Беразавец, в. Крынкі; *б* – в. Сёгда і гарадзішча

3 м. З заходняга боку глыбіня рова дасягае 1,5 м. Месцамі, па перыметры пляцоўкі гарадзішча захаваліся рэшткі моцна аплыўшага абарончага вала вышынёй 0,5–0,7 м. Паўночна-заходні край пляцоўкі пашкоджаны земляными работамі. Тут, па словах жыхаркі в. Беразавец Філіповіч Марыі Герасімаўны (69-і гадоў) у 1960-я гады бралі пясок для будаўнічых работ. На гарадзішчы ўстаноўлены ахоўны знак новага ўзору.

Цікавая інфармацыя была атрымана ад Санюты Марыі Ігнацьеўны (80-і гадоў), жыхаркі в. Беразавец, д. 26. Па яе словах, мясцовыя школьнікі праводзілі тут свае «раскопкі». У ходзе гэтых «раскопак» яны знаходзілі пячную кафлю, посуд гліняны і фарфоравы, манеты польскія і рускія.

Па інфармацыі былога дырэктара Карэліцкага раённага краязнаўчага музея Шыбута Івана Аляксеевіча ў 1982 г. на гарадзішчы земляныя работы праводзілі «некія геолагі». У час гэтых работ таксама знаходзілі кераміку [10, с. 31]. М. І. Санюта паведаміла, што на поўдзень ад гэтага гарадзішча ёсць выспа пад назвай «Замак». Мясцоваму люду гарадзішча Беразавец сёння вядома пад назвай «Замкавая гара князя Кміты» [25, с. 141, 245]. Па словах мясцовага жыхара Андрэя Трыбуця, князь Кміта быў шведам. Узнікае пытанне: «Хто такі Кміта?» Наша гістарычнае даследаванне прывяло да добрых вынікаў, падцвердзіла народнае паданне.

На нашу думку, найбольш верагодным уладальнікам двара, арганізатарам будаўніцтва зам-

а

б

Мал. 3. Гарадзішча Беразавец: *а* – выгляд з поўдня; *б* – выгляд з усходу

ка (або умацаванага феадальнага двара) Беразавец можна лічыць Івана Кміціча Стрэтовіча, які займаў высокую дзяржаўную пасаду падскарбія земскага пры каралі Казіміры IV Ягелоне. На «вкладных записях» Лаўрышаўскага Евангелія Іван Стрэтовіч выступае ў якасці ахвяруючага, які шчодра перадае царкве Лаўрышаўскага манастыра 10 коп жыта са свайго маёнтка Беразавец і раіць нашчадкам гэтага прытрымлівацца. Дадзены дакумент *«писан у Березовцы лета 1486 10 августа Иваном Александровичем Стретовичем, подскарбием господаря великого короля Казимира»* [6, с. 295; 21, с. 244]. Пакуль што гэта самы ранні вядомы нам па пісьмовым крыніцам успамін пра маёнтак Кміты Беразавец. Адпаведна іншаму дакументу, датаванаму 1541 г., маёнтак (не названы які) Івана Стрэтовіча межаваў з Шчарсоўскімі ўладаннямі Юрыя Фёдаравіча Храбтовіча. Івана Кміціч Стрэтовіч названы сярод найбольш уплывовых суседзяў Храбтовіча [16, с. 130–132].

Трэба адзначыць, што сярод першых папячыцеляў манастыра ва ўкладных запісах на старонках Лаўрышаўскага Евангелія разам з Іванам Стрэтовічам згадваецца яшчэ адзін Кміта – Грынко (Грышка) Мікуліч [21, с. 243]. У Інвентары Лаўрышаўскага манастыра *(«Зводный акт с обмежеванием земель, принадлежащих Лавришевскому монастырю, данном митрополиту Ипатию Потею», 1601 г.*) запісана, што пан Грышка Мікуліч перадаў манастыру дзесяціну з маёнтка свайго Беразавец: *«Также с десятиною, лежащей около Березовца,*



Мал. 4. План і профілі: *а* – гарадзішча Беразавец; *б* – гарадзішча Сёгда

даром пана Гришки Микулича Кмиты, где принадлежат монастырю Лавришевскому, по тридцать коп жита за каждый год» [15, л. 1727–1735]. У дакументах другой паловы XVI ст. зафіксаваны маёмасныя спрэчкі Лаўрышаўскага манастыра з панамі Кмітамі. У 1544 г. польскі король Сігізмунд I Стары нагадаў панам Кмітам аб неабходнасці вярнуць манастыру дзесяціну з маёнтка Беразавец. Пазней тую ж спрэчку намагаўся рассудзіць король Сігізмунд II Аўгуст, аднак судовая справа не была канчаткова вырашана. Апошні дакумент па гэтай справе датаваны 1595 г. [12].

Замак Беразавец узгадваецца у крыніцах XVII ст. У фальварак Беразавец у 1639 г. уваходзілі *двор і замак Беразавец*, сёлы Вялікая Слабада, Тарасевічы – усяго 190 дымоў [3, с. 625]. Вядома, што маёнтак Беразавец у XVII ст. перайшоў ва ўласнасць Радзівілаў, а менавіта князю Сігізмунду Каралю Радзівілу, 4-му Нясвіжскаму ардынату, сыну Мікалая Радзівіла Сіроткі, падчашаму літоўскаму (1638–1642), ваяводзе наваградскаму (1642) [27, s. 75; 14].

Паміж іншым, у Вялікім Княстве Літоўскім найбольш вядомы тры асобы з рода Кмітаў. Адзін з іх Кміта Чарнабыльскі, ваенны дзеяч (каля 1530 – да 25.03.1587), аршанскі стараста, ваявода Смаленскі, намеснік у Вялікіх Луках, паходзіў з Валыні. Другі – віленскі намеснік пан Сямён Кміта (Кміціч Сямён), подпісы якога захаваліся на шматлікіх судовых дакументах за 1528 і 1541 г. [13, с. 52, 53, 197, 203, 204]. Трэці – Кміта Пётр Бластус, пісьменнік, выдавец, друкар (? – паміж 1629 і 1632), звязаны з антытрынітарскім рухам у ВКЛ. У Любчы пад пратэкцыяй гетмана Крыштафа Радзівіла ён выдаў з 1612 па 1629 г. 52 кнігі аб'ёмам 280 аркушаў [4, с. 111]. Больш поўныя звесткі аб Пятры Кміце можна знайсці ў Польскім слоўніку біяграфічным [28, s. 100–101]. Пётр Кміта выдаваў кнігі на польскай і лацінскай мовах па гісторыі, медыцыне, літаратуры, філасофіі і інш. Падпісваўся Пётр Бластусовіч (сын Бластуса). Ён вядомы як паэт і аўтар прадмовы да выдадзенага ім зборніка «Апафегматы» Сымона Буднага [28, s. 100–101; 14, с. 358]. Яго сын Ян Кміта (1606–1611 – каля 1646) жыў і працаваў у Любчы (знаходзіцца ў 25 км ад Беразаўца) пад апякунствам таго ж К. Радзівіла ў 1632–1646 гг. пасля смерці бацькі. Ён выдаў у Любчы 23 кнігі аб'ёмам 202 аркушы. Друкарня пры кальвінскім зборы ў Любчы была буйнейшай на Беларусі, дзейнічала да 1655 г. [28, s. 94; 8, с. 141]. Пакуль што не вядома, у якім сваяцтве былі ўсе вышэй названыя Кміты.

Наступны помнік археалогіі, які быў даследаваны ў 2012 г. – ***гарадзішча каля в. Сёгда*** ў Райцаўскім сельсавеце Карэліцкага раёна. Размешчаны ва ўрочышчы Замак на правабярэжжы р. Нёўда, за 1,5 км на паўднёвы захад ад краю гэтай вёскі, праз прыкладна 0,8 км ад жылога хутара, які знаходзіцца на захад ад в. Сёгда (мал. 2, *б*). Пляцоўка гарадзішча мае авальную форму, выцягнута па восі поўнач–поўдзень. Памеры пляцоўкі 68 × 32 м (мал. 4, *б*). Схілы вельмі стромкія (60–45º). Больш палогі, з тэрасай, паўночна-ўсходні схіл гарадзішча. На паўночным краі пляцоўкі гарадзішча захаваліся рэшткі аплыўшага вала 2 м у вышыню, 6 м у шырыню. З напольнага боку паўночна-ўсходняга схілу прасочаны роў, шырыня якога 3 м, глыбіня 0,5 м. На паўднёвым краі пляцоўкі таксама захаваўся ўчастак вала на вышыню каля 1,5 м. Пляцоўка і схілы гарадзішча параслі дрэвамі і хмызняком, на ўсходнім краі пляцоўкі – яма чатырохвугольнай формы 0,8 × 1,5 м.

Гарадзішча было выяўлена і ўпершыню даследавана Славяна-Літоўскім атрадам пад агульным кіраўніцтвам Ф. Д. Гурэвіч у 1957 г. [5, с. 175, мал. 34]. Культурны слой на пляцоўцы гарадзішча Сёгда не быў зафіксаваны. У падножжа гарадзішча з усходняга боку супрацоўнікамі атрада быў закладзены шурф памерамі 2 × 2 м[1]. Раскопкі на гарадзішчы Сёгда ніколі не праводзілі.

Навуковыя раскопкі на помніку ***гарадзішча Беразавец*** таксама не праводзілі. Папярэдне яго можна датаваць канцом XV – XVIII ст., улічваючы знаходкі (кафля, цэгла пальчатка, манеты). Для вызначэння наяўнасці культурнага слоя на гэтым помніку, яго таўшчыні і датавання неабходна правесці папярэднія раскопкі. Таксама трэба высвятліць прыналежнасць да помнікаў археалогіі выспы, што знаходзіцца паблізу ад гарадзішча. Неабходнасць выклікае і правядзенне шурфоўкі на ***гарадзішчы Сёгда*** з мэтай выяўлення культурнага слоя на ім, а таксама папярэдняга датавання гэтага помніка.

Літаратура і крыніцы

1. Археалогія Беларусі. Паказальнік літаратуры за 1976–1990 гг. / Ін-т гісторыі АН Беларусі, Цэнтр. навук. бібліятэка імя Я. Коласа ; склад. А. У. Ільюцік ; навук. рэд. Т. М. Каробушкіна. – Мінск : Ін-т гісторыі АН Беларусі. – № 3542–3545, 3733. – С. 456–457, 487.

2. Будзько, У. Дз. Гарадзішча в. Сёгда. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобласць / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1986. – С. 222.

3. Бянько, У. У. З гісторыі населеных пунктаў / У. У. Бянько, У. А. Палуян // Памяць. Карэліцкі раён / рэдкал.: В. К. Кунашка [і інш.]. – Мінск : Ураджай, 1996. – С. 588–639.

4. Вялікае княства Літоўскае : энцыклапедыя : у 3 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2006. – Т. 2. – С. 111.

5. Гуревич, Ф. Д. Древности Белорусского Понеманья / Ф. Д. Гуревич. – М. ; Л. : АН СССР, 1962.

6. Данная Ивана Стретовича Лаврашеву монастырю на 30 коп жита // Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России. – СПб. : В типографии Эдуарда Праца, 1863. – Т. 1. – С. 295.

7. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобласць / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1986. – С. 210–224.

8. Іванова, Л. Рэфармацыйны рух на Наваградчыне ў другой палове XVI – першай палове XVII ст. / Л. Іванова // Памяць. Навагрудскі раён ; рэдкал.: Э. Н. Гнеўка [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1996. – С. 138–142.

9. Карэліцкі раён // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. / рэдкал.: П. У. Броўка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1972. – Т. 5 : Зуйкі–Кішы. – С.471–472.

10. Колединский, Л. В. Отчет о полевых работах в Витебске, Кореличском районе Гродненской области и Узденском районе Минской области в 1982 году // Архив археологической научной документации Института истории НАН Беларуси. – Мінск, 1983. – Спр. № 808.

11. Корбут, В. Грабят древние курганы / В. Корбут // Беларусь сегодня. – 17 янв. – 2012. – С. 8.

12. Котельников, Алексий. Вклады в Лавришевский монастырь от основания (ок. 1250 г.) до принятия унии в 1596 г. [Электронный ресурс] / А. Котельников. – Режим доступа : http://www.bogoslov.ru/text/2973415.html. – Дата доступа : 23.04.2013. Цит. по: Институт рукописи Национальной библиотеки Украины им. В. И. Вернадского. – Ф. 160. – Д. 301. – Summaryusz dokumentow, klasztorowi Ławryszowskiemu słuzacych. – Л. 15.

27. Литовская Метрика (1528–1547). 6-я книга судных дел (копия – конец XVI в.) / Вильнюсский университет ; редкол.: А. Бумблаускас [и др.]. – Вильнюс : Из-во Вильнюс. ун-та, 1995. – 337 с.

13. Литовский государственный исторический архив. – Ф. 1280. Радзивиллы. Ч. 1 (1416–1922 гг.). – Д. 376. Контрольная книга ежемесячных денежных доходов Радзивилловских имений … с 01.07.1833 г. по 01.07.1834 г. – 178 лл. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://archives.gov.by/Radzivily/Data/LT_LVIA_1280_1.xml. – Дата доступа : 23.04.2013.

14. Национальный исторический архив Беларуси. – Ф. 147. – Оп. 2. – Д. 175. Инъвенътаръ албо списаніе монастира Лавришовского. – Л. 1727–1735.

[1] У культурным слоі магутнасцю да 0,45 м трапілася ляпная і ганчарная кераміка. Аскепкі таўстасценнага, дрэнна абпаленага посуду ўтрымлівалі дамешку буйной жарствы ў цесце. Былі знойдзены і аскепкі добра апрацаваных танкасценных начынняў і фрагмент ляпнога мініяцюрнага начыння з дамешкай пяску ў цесце. Кругавая кераміка прадстаўлена танкасценнымі начыннямі, арнаментаванымі лініяй і шматраднай хваляй, радзей – адбіткам пальцаў. Венчык гэтых начынняў рэзка адагнуты вонкі, з жалабком з сярэдзіны; у цесце зроблена нязначная дамешка слюды і дробнай жарствы. На падставе знаходак помнік быў датаваны другой паловай 1-га тысячагоддзя н. э. – XII–XIII ст. [5, с. 175; 2, с. 222].

15. Памяць. Навагрудскі раён / рэдкал.: Э. Н. Гнеўка [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1996. – 559 с.

16. Парэцкі, Я. І. Кміта Пётр Бластус / Я. І. Парэцкі // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1999. – Т. 8 : Канто–Кулі. – С. 358.

17. Пастанова Маршалкоўскага суда па іску паноў Храбтовічаў да пані Мікалаевай Мікалаевіча Кезгайлавай – Ганны Янаўны Радзівілаўны аб парушэнні межаў Шчорсаўскай пушчы. 1541, 19 лютага // Памяць. Навагрудскі раён / рэдкал.: Э. Н. Гнеўка [і інш]. – Мінск : Беларусь, 1996. – С. 130–132.

18. Побаль, Л. Археалагічная спадчына Карэліцкага краю / Л. Побаль // Веды. – 2000. – Кастр. – № 11. – С. 7.

19. Поболь, Л. Д. Археологические памятники Белоруссии. Железный век / Л. Д. Поболь. – Минск : Наука и техника, 1983. – С. 323–324.

20. Семянчук, А. Лаўрышаўскае Евангелле / А. Семянчук // Silva rerum nova. – Мінск : Atenaeum, 2009. – С. 244.

21. Хартановіч, У. У. Варонча / У. У. Хартановіч // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Белова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1 : А–К. – С. 146.

22. Чарняўскі, М. М. Ярэмічы / М. М. Чарняўскі // Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыклапедыя / Беларус. Энцыкл. ; рэдкал.: В. Гетаў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 675.

23. Шаблюк, В. У. Двор у Туганавічах / В. У. Шаблюк. – Мінск : Полымя, 1995.

24. Штыхов, Г. В. Археологическая карта Белоруссии. Памятники железного века и эпохи феодализма / Г. В. Штыхов. – Мінск : Полымя, 1971. – Вып. 2.

25. Шышыгіна-Патоцкая, К. Нясвіж і Радзівілы. – Мінск : Беларусь, 2007. – 240 с.

28. Herbarz polski Kaspra Niesieckiego S. J. powiększony dodatkami późniejszych autorów, rękopismów, dowodów urzędowych : w 10 t. – Lipsk : Wydanie Jana Nep. Bobrowicza, 1839–1845. – T. VIII (1841). – S.75.

26. Kowecka-Gryczowa, Alodia. Kmita Piotr Blastus (Blast) / A. Kowecka-Gryczowa, Kmita Jan // Polski słownik biogroficzny.– Wrocław ; Warszawa ; Kraków : PAN, 1967–1968. – T. XIII. – S. 94, 100–101.

Резюме

Н. А. Почобут

Археологические исследования в Кореличском районе (городища Березовец и Сёгда)

В 2012 г. были проведены археологические разведки в Кореличском районе Гродненской области, в ходе которых обследованы городище эпохи железного века Сёгда и позднесредневековое городище Березовец. Автор выдвигает гипотезу, что городище Березовец в XVI – начале XVII в. являлось замком либо укрепленным феодальным двором Ивана Кмитича Стретовича, подскарбия земского короля Казимира IV Ягеллона.

Summary

N. A. Pochobut

Archaeological researches in the Korelichsky district (settlements Berezovets and Syogda)

In 2012 archaeological investigations in the Korelichsky district of the Grodno region during which the ancient settlement of an era of the Iron Age of Syogda and the late medieval settlement Berezovets are surveyed were carried out. The author makes a hypothesis that the ancient settlement Berezovets in 16th – the beginning of the 17th century was the hillfort or strengthened feudal yard Ivan Kmitich Stretovich's, a podskarbiya of king Kazimir IV Yagellon.

Паступіў 25.09.2013 г.

УДК [903.53+902.21](476)

М. А. Плавінскі, *Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, старшы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі, нумізматыкі і зброі, кандыдат гістарычных навук (г. Мінск, Беларусь);*
Э. А. Астаповіч, *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, геаграфічны факультэт, студэнт III курса (г. Мінск, Беларусь);*
М. І. Сцяпанава, *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, гістарычны факультэт, студэнтка V курса (г. Мінск, Беларусь)*

Раскопкі курганнага могільніка Наўры і разведкі на Мядзельшчыне і Браслаўшчыне ў 2012 годзе

Летам 2012 г. на падставе дазволу № 2373 (па форме № 1) экспедыцыяй Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам аўтара былі праведзены археалагічныя разведкі на тэрыторыі Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці і Мядзельскага раёна Мінскай вобласці (мал. 1). Асноўнай мэтай экспедыцыі сталі раскопкі курганнага могільніка Наўры[1].

Разведкі ў Браслаўскім раёне. Увесну 2012 г. былі атрыманы звесткі аб выяўленні чалавечых костак і ўпрыгажэнняў у в. Крывасельцы Браслаўскага раёна. У выніку агляду месца знаходкі было вызначана, што пахаванне знойдзена на пагорку, на паўночнай ускраіне вёскі прыкладна за 200–300 м ад заходняга берага воз. Снуды падчас забудовы пляцоўкі новай сядзібы. Чалавечыя косткі былі выяўлены на глыбіні да 1 м. Разам з імі знаходзіліся бронзавая шыйная грыўня і бранзалет, а таксама металічная падвеска ці манета, якая пасля была згублена. Але шыйная грыўня і бранзалет былі перададзены аўтару.

Грыўня зроблена з дзвюх перакручаных пруткоў, перавітых дзвюма скручанымі тонкімі драцінкамі, якія завяршаюцца пласцінкавымі канцамі з замком (мал. 2: *1*). Пласцінкавы трохгранны ў сячэнні бранзалет з зааморфнымі канцамі ўпрыгожаны геаметрычным арнаментам «у елачку» (мал. 2: *2*). Можна меркаваць, што жаночае пахаванне, пры якім былі знойдзены гэтыя артэфакты, варта датаваць XI–XII стст. [6, с. 45; 13, с. 112; 14, с. 71–73; 16, p. 167–176, 287–288].

Разведкі ў Мядзельскім раёне. У чэрвені 2012 г. былі праведзены разведкі ў цэнтральнай і паўночна-ўсходняй частках Мядзельскага раёна. Асноўнай мэтай разведак стаў маніторынг стану захаванасці курганных могільнікаў рэгіёну. Падчас разведак абследаваны курганныя могільнікі Навасёлкі, Мілты I і Наўры. Значная частка насыпаў могільніку Навасёлкі, у першую чаргу самыя вялікія з іх, вельмі моцна пашкоджаны і фактычна



Мал. 1. Археалагічныя помнікі, абследаваныя археалагічнай экспедыцыяй Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь у міжрэччы Заходняй Дзвіны і Віліі ў 2012 г.: *1* – пахаванне па абраду інгумацыі на паўночнай ўскраіне вёскі Крывасельцы Браслаўскага раёна; *2* – курганны могільнік Навасёлкі; *3* – курганны могільнік Мілты I Мядзельскага раёна; *4* – курганны могільнік Наўры

[1] Раскопкі праводзіліся сіламі валанцёраў з Мінску, Гродна, Полацку і Брэста. Актыўную дапамогу ў арганізацыі і правядзенні раскопак аказала выкладчык кафедры археалогіі і этналогіі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Ю. В. Юркавец. Функцыі лабарантаў экспедыцыі выконвалі Э. А. Эстаповіч, У. А. Плавінскі, А. С. Арабей і У. В. Грыб.



Мал. 2. Інвентар пахавання на паўночнай ўскраіне вёскі Крывасельцы: *1* – шыйная грыўня, *2* – бранзалет. Малюнак М. А. Плавінскага

знішчаны рабаўнічымі ямінамімі. Курганы могільніка Мілты I моцна зараслі маладым падлескам, слядоў «свежых» рабаўнічых ям у насыпах не прасочваецца.

Раскопкі курганнага могільніка Наўры. Курганны могільнік Наўры Сваткаўскага сельскага савета Мядзельскага раёна ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь як помнік катэгорыі 3 пад нумарам 613В000446. Ён вядомы ў навуковай літаратуры з канца XIX ст. [12, с. 22]. У 1934 г. раскопкі могільніка правяла экспедыцыя пад кіраўніцтвам А. Цэгак-Галубовіч. Супрацоўнікі экспедыцыі знялі план могільніка і даследавалі 29 насыпаў. У 1987 г. даследаванні ў Наўрах ажыццявілі В. Н. Рабцэвіч і А. М. Плавінскі. Былі раскапаны дзевяць курганоў і зняты новы план асноўнай курганнай групы – група I [10].

У 2012 г. намі быў зняты інструментальны план абедзвюх курганных груп могільніка Наўры (працу па здымцы плану праводзіў Э. А. Астаповіч). Варта адзначыць, што здымка плану могільніка да нас ажыццяўлялася ўжо двойчы. На жаль, з усёй дакументацыі, выкананай падчас прац 1934 г., быў апублікаваны толькі фрагмент плана асноўнай курганнай групы [17, рис. 1]. План 1987 г., зняты А. М. Плавінскім, ахоплівае толькі асноўную курганную групу.

Група I – асноўная курганная група могільніка знаходзіцца за 750 м на поўдзень–паўднёвы ўсход ад вёскі Наўры і за 400 м на поўнач–паўночны ўсход ад трасы Мінск–Калачы–Мядзель (мал. 3). На план групы I курганнага могільніка Наўры было нанесена 84 насыпы, якія атрымалі нумары з 32 па 115. Практычна ўсе яны моцна пашкоджаны розначасовымі рабаўнічымі ямамі. Адпаведна, курганы, даследаваныя ў 1934 г., атрымалі нумары 1–22, а насыпы, раскапаныя ў 1987 г., – нумары 23–31. На жаль, суаднясенне плана 2012 г. з папярэднімі выявіла, што яны маюць падабенства ў агульных рысах, аднак цалкам не супадаюць. Пры гэтым нам ўдалося надзейна лакалізаваць на новым плане ўсе курганы, даследаваныя ў 1987 г.

У выніку зняцця новага плана групы I і суаднясення яго з данымі папярэдніх даследаванняў можна сцвярджаць, што першапачаткова тут налічвалася не менш за 117 насыпаў. Але, калі ўлічыць звесткі А. Цэгак-Галубовіч аб знішчэнні часткі курганоў падчас пашырэння тракту на Княгінін, то можна меркаваць, што іх колькасць магла быць і прыкметна большай [17, s. 5].

Група II – складаецца з 12 моцна пашкоджаных насыпаў і знаходзіцца за 400 м на поўдзень–паўднёвы ўсход ад вёскі Наўры. Сем насыпаў размешчана ў лесе ля развілкі прасёлачнай дарогі, што ідзе з Наўраў уздоўж усходняга берага аднайменнага возера і разыходзіцца ў бок Сватак і ў бок Гарадзішча. Яшчэ пяць насыпаў знаходзяцца ўздоўж дарогі, якая ідзе ў бок Гарадзішча.

У 2012 г. экспедыцыяй Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь былі даследаваны чатыры курганы.

Курган 32. З мэтай даследавання кургана 32 быў закладзены Раскоп I памерам 8 × 8 м. Звонку курган выглядаў паўсферычным, некалькі выцягнутым па лініі паўночны захад–паўднёвы ўсход. Вышыня насыпу ў сённяшнім выглядзе – 0,75–0,80 м. У выніку раскопак вызначана, што аснаванне кургана мела авальную форму, выцягнутую з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход даўжынёй – 6,5–7,0 м і шырынёй – 5,5 м. Насып неаднаразова падвяргаўся рабаўнічым раскопкам.

Курган змяшчаў жаночае пахаванне па абраду інгумацыі на аснаванні, арыентаванае галавой на захад з адхіленнем да поўначы. Яно было пашкоджана перакопам, магчыма неаднаразова (мал. 4, *а*). У некранутым стане засталася толькі частка костак ног. Усе знаходкі пахавальнага інвентару выяўлены ў пераадкладзеным стане. Яны прадстаўлены двума фрагментамі жалезнага нажа і 11 цэлымі і фрагментаванымі пацеркамі (мал. 4, *б*):

– бочачкападобныя золаташкляныя – 7 адзінак;
– срэбрашкляная цыліндрычная – 1 экзэмпляр;
– золаташкляная рабрыстая – 1 экзэмпляр;
– срэбрашкляная рабрыстая – 1 экзэмпляр;
– прызматычная чатырохгранная з барвовага непразрыстага шкла, паверхня якой упрыгожана кроплямі жоўтага паставага шкла.



Мал. 3. План групы I: *а* – курган; *б* – курган даследаваны ў 1987 г.; *в* – магчымыя рэшткі кургана, даследаванага ў 1934 г. Курганны могільнік Наўры. 2012 г. Інструментальная здымка Э. А. Астаповіча



Мал. 4. План пахавання па абраду інгумацыі (*а*) і пахавальны інвентар (*б*): *1–11* – пацеркі; *12* – нож (*а; б: 12* – малюнкі М. А. Плавінскага; *б: 1–11* – фота М. І. Сцяпанавай). Група I. Курган 32 (раскоп I). Курганны могільнік Наўры. 2012 г.

Набор пацерак можа быць датаваны часам ад канца X ст. да канца XI ст., але найбольш верагодным часам яго складання падаецца сярэдзіна XI ст. (вызначэнне М. І. Сцяпанавай). Адпаведна, гэтым жа часам датавана і само пахаванне.

Рытуальныя дзеянні, праведзеныя падчас узвядзення кургана 32, можна рэканструяваць наступным чынам. Нябожчыца была пакладзена на дзённую паверхню (дзірван), пасля гэтага над целам быў узведзены насып кургана. Грунт для гэтага быў часткова (?) узяты з раўчукоў, размешчаных па бакам свету з адхіленнем да ўсходу (наяўнасць раўчука з заходняга боку застаецца гіпатэтычнай). Насып кургана, верагодна, быў умацаваны ля аснавання драўлянай канструкцыяй (абшыўкай ?), якая складалася з дошак і калоў.

Курган 33. З мэтай даследавання кургана 33 быў закладзены Раскоп II памерам 8 × 10 м. Звонку насып выглядаў паўсферычным, некалькі выцягнутым па лініі паўночны захад–паўднёвы ўсход. Яго вышыня ў сённяшнім выглядзе – 0,95 м. У выніку раскопак вызначана, што аснаванне кургана мела акруглую форму: даўжыня па лініі захад–усход – 7,2 м, па лініі поўнач–поўдзень – каля 7,5 м. Насып кургана шматразова падвяргаўся рабаўнічым раскопкам.



Мал. 5. План пахавання па абраду інгумацыі (*а*) і пахавальны інвентар (*б*): *1–16* –пацеркі; *17–23* –бранзалетападобныя скроневыя колцы (фрагменты); *24* – нож (*а; б: 17–24* – малюнкі М. А. Плавінскага; *б: 1–16* – фота М. І. Сцяпанавай). Група I. Курган 33 (раскоп II). Курганны могільнік Наўры. 2012 г.

Курган змяшчаў жаночае пахаванне па абраду інгумацыі на аснаванні, арыентаванае на захад з адхіленнем да поўначы. Яно было пашкоджана перакопам, магчыма неаднаразова, у выніку не пераадкладзенымі засталіся толькі косткі ног. Частка выкапаных рабаўнікамі костак таза і рэбраў была ссыпана ў кучу пад пасунутым чэрапам (мал. 5, *а*). Вакол чэрапа і грудной клеткі пахаванай былі выяўлены шматлікія пацеркі і сем фрагментаў бронзавых скроневых колцаў. Набор пацерак складаўся з 444 адзінак бісеру розных тыпаў, у тым ліку (мал. 5, *б*):

– блакітны сечаны бісер, выраблены з цягнутай трубачкі – 224 адзінкі;

– белы паставы бісер – 181 экзэмпляр, у тым ліку трохчасткавая і 10 двухчасткавых пранізак, выробленыя у тэхніцы навіўкі;

– жоўты паставы бісер, выраблены ў тэхніцы навіўкі, – 38 адзінак.

Набор пацерак можа быць датаваны ў межах XI ст., а найбольш верагодна – часам да сярэдзіны гэтага стагоддзя (вызначэнне М. І. Сцяпанавай).

Фрагменты скроневых колцаў належалі не менш як да двух бранзалетападобных экзэмпляраў, завязаных на адзін ці два канцы.

Непадалёк ад левага калена быў знойдзены жалезны нож.



Мал. 6. План пахавання па абраду інгумацыі (*а*) і знаходкі (*б*): *1* – кругавы гаршчок; *2* – венца кругавога гаршка; *3* – пярсцёнак; *4* – сякера. Група I. Курган 34 (раскоп III). Курганны могільнік Наўры. 2012 г. Малюнак М. А. Плавінскага

На падставе выяўленага інвентару, датаванне кургана можа быць вызначана ў межах XI ст. [4, с. 16; 5, с. 134], прычым не выключана, што насып быў узведзены ў яго першай палове.

Рытуальныя дзеянні, праведзеныя падчас узвядзення кургана 33, можна рэканструяваць наступным чынам. Нябожчыца была пакладзена на дзённую паверхню (дзірван), пасля чаго над целам быў узведзены насып кургана. Грунт для гэтага быў часткова (?) узяты з кальцавога раўчука, які з-за асаблівасцей рэльефу мясцовасці з заходняга і паўднёва-заходняга бакоў кургана выглядаў, хутчэй, як эскарп.

Курган 34. З мэтай даследавання кургана 34 быў закладзены Раскоп III памерамі 10 × 10 м. Звонку насып выглядаў паўсферычным. Яго вышыня ў сённяшнім выглядзе – 1,05 м. У выніку раскопак вызначана, што аснаванне кургана мела памер 5,7 м з поўначы на поўдзень і 6,1 м з захаду на ўсход. Насып кургана неаднаразова падвяргаўся рабаўнічым раскопкам.

Курган змяшчаў непашкоджанае перакопамі мужчынскае пахаванне па абраду інгумацыі на аснаванні, якое было арыентавана галавой на захад. Касцяк захаваўся дастаткова добра – выяўлены косткі ног і таза, пазванкі, чэрап, а таксама левая лапатка і плечавыя косткі. Мяркуючы па іх размяшчэнні, рукі пахаванага былі скрыжаваныя на грудзях (мал. 6, *а*). На чэрапе добра прасочваюцца сляды не менш як двух верагодных сякучых удараў. Пры пахаванні былі выяўлены (мал. 6, *б: 1–4*):



Мал. 7. План пахавання па абраду інгумацыі (*а*) і знаходкі (*б*): *1* – кругавы гаршчок; *2* – кап'ё; *3* – сякера; *4* – нож; *5* – крэсіва; *6* – фібула. Група I. Курган 34 (раскоп IV). Курганны могільнік Наўры. 2012 г. Малюнак М. А. Плавінскага

– бронзавы ложнавіты пярсцёнак (на пальцы правай рукі);

– сякера тыпу IVA, паводле А. М. Кірпічнікава, якая размяшчалася за 0,2 м ад левай нагі лязом да пахаванага і тапарышчам да яго галавы;

– развал кругавога гаршка, які меў канічнае тулава, акруглы плячук і адагнутае вонкі венца з акруглым краем (на поўдзень ад правай нагі).

Верагодна, у нагах нябожчыка, знаходзіўся яшчэ адзін кругавы гаршок, пашкоджаны перакопам, ад якога захаваўся толькі фрагмент венца, выяўлены ў запаўненні ўсходняга раўчука.

На падставе знойдзенага інвентару, пахаванне варта датаваць у межах сярэдзіны–другой паловы XI ст. [1, с. 115; 2, с. 37–38; 6, с. 51; 9, с. 195–196; 11, с. 30; 15, рис. 42: *17*]. Магчыма, яно было змешчана ў нейкай драўлянай канструкцыі.

Рытуальныя дзеянні, праведзеныя падчас узвядзення кургана 34, можна рэканструяваць наступным чынам. Аснаванне кургана перад яго ўзвядзеннем было ачышчана агнём, пасля чаго на яго было змешчана цела нябожчыка, якое, магчыма, знаходзілася ў нейкай драўлянай канструкцыі. Пасля гэтага над пахаваннем быў узведзены насып, грунт для якога быў часткова (?) узяты з чатырох раўчукоў, размешчаных па баках свету.

Курган 35. З мэтай даследавання кургана 35 быў закладзены Раскоп IV памерамі 12 × 9 м. Звонку насып выглядаў паўсферычным. Яго вышыня ў сённяшнім выглядзе – 1 м. У выніку раскопак вызначана, што аснаванне кургана мела акруглую фор-

му памерам прыблізна 6,4 м з поўначы на поўдзень і 6,5 м з захаду на ўсход. Насып, відавочна, неаднаразова быў пашкоджаны перакопамі.

Курган змяшчаў мужчынскае пахаванне па абраду інгумацыі на аснаванні, якое было арыентавана галавой на паўднёвы ўсход. Косткі захаваліся дастаткова добра – раструшчаны чэрап, косткі рук, пазваночнік і коскі ног. Левая рука ляжала ўздоўж цела, а правая, напэўна, была пакладзена на ніз жывата (мал. 7, *а*). Пры пахаванні выяўлены (мал. 7, *б: 1–6*):

– жалезная фібула, верагодна, са спіральнымі канцамі (на грудзях справа);

– сякера тыпу IV, паводле А. М. Кірпічнікава, якая была пакладзена на косткі перадплечча абухом да пахаванага і тапарышчам да галавы;

– крэсіва, форма якога гіпатэтычна вызначаецца як калачападобная з язычком (у раёне костак таза, з левага боку);

– побач з крэсівам выяўлены тры кавалкі крэменю для яго;

– нож (з унутранага боку левай бедранай косткі, бліжэй да таза);

– пастаўлены кругавы гаршчок, на венцы якога маецца своеасаблівы (адносна дэградзіраваны) карнізік (над тазам пахаванага з левага боку);

– пад косткамі голені знаходзіўся наканечнік кап'я тыпу III, паводле А. М. Кірпічнікава, пакладзены вастрыём да ступака.

На падставе знойдзенага інвентару, пахаванне можна датаваць XI ст. [2, с. 12–13, 36–37; 3, с. 163; 7, с. 33; 8, с. 152; 11, с. 29, 48; 15, с. 81].

Рытуальныя дзеянні, праведзеныя падчас узвядзення кургана 35, можна рэканструяваць наступным чынам. Нябожчык быў пакладзены на дзённую паверхню (дзірван). Пасля гэтага над целам быў узведзены насып кургана, грунт для якога быў часткова (?) узяты з чатырох раўчукоў, размешчаных па лініях паўночны захад–паўднёвы ўсход і паўночны ўсход–паўднёвы захад.

Шурфы I і II на тэрыторыі курганнай групы I. З мэтай пошуку рэшткаў курганоў, даследаваных ў 1934 г., і далейшага суаднясення плану 1934 г. са зводным планам 1987 і 2012 г. на тэрыторыі групы I былі закладзены шурфы I і II. Шурф I меў форму літары Г і агульную плошчу 28 м^2, шурф II – квадратную форму і агульную плошчу 16 м^2. Слядоў аснаванняў раней даследаваных курганоў ці іх раўчукоў у абодвух шурфах выяўлена не было.

Такім чынам, у выніку прац, праведзеных у Наўрах у 2012 г., быў зняты план могільніка і даследаваны чатыры курганы (№ 32–35) у яго асноўнай групе. Агульная ўскрытая плошча склала 396 м^2. Ва ўсіх вывучаных курганах былі выяўлены інгумацыі XI ст., якія могуць быць інтэрпрэтаваны як пахаванні крывічоў, што добра стасуецца з раней атрыманымі данымі экспедыцый 1934 і 1987 г.

Шурфы I і II на ўсходнім беразе возера Наўры. З мэтай пошуку селішча, сінхроннага часу функцыянавання курганнага могільніка Наўры, у лесе, размешчаным на ўсходнім беразе воз. Наўры, былі закладзены два шурфы.

Шурф I быў закладзены за 120 м ад прасёлачнай дарогі, якая ідзе ў бок в. Гарадзішча. Шурф памерамі 1 × 4 м быў выцягнуты з поўначы на поўдзень. У ім знойдзены два дробныя фрагменты ляпной керамікі. Можна меркаваць, што ў шурфе выяўлены вельмі слаба насычаны культурны слой перыферыі селішча ці яго гаспадарча асвоенага наваколля.

Шурф II памерамі 2 × 2 м закладзены за 100 м ад прасёлачнай дарогі, якая ідзе з Наўраў уздоўж усходняга берага возера. У ім выяўлены апрацаваны крэмень.

Літаратура

1. Заяц, Ю. А. Керамическая посуда Заславля X–XVIII вв. / Ю. А. Заяц // Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі : Новыя матэрыялы і даследаванні. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – С. 107–118.

2. Кирпичников, А. Н. Древнерусское оружие. Вып. 2. Копья, сулицы, боевые топоры, булавы, кистени IX–XIII вв. / А. Н. Кирпичников // Свод археологических источников. – Вып. Е1–36. – М. ; Л. : Наука, 1966. – 216 с. : ил.

3. Колчин, Б. А. Хронология новгородских древностей / Б. А. Колчин // Ногородский сборник. 50 лет раскопок Новгорода. – М. : Наука, 1982. – С. 156–177.

4. Левашева, В. П. Височные кольца / В. П. Левашева // Очерки по истории русской деревни X–XIII вв. – Труды ГИМ. – М., 1967. – Вып. 43. – С. 7–54.

5. Лесман, Ю. М. Погребальные памятники Новгородской земли и Новгород (проблема синхронизации) / Ю. М. Лесман // Археологическое исследование Новгородской земли. – Л. : Изд-во Ленинград. ун-та, 1984. – С. 118–153.

6. Лесман, Ю. М. Хронология ювелирных изделий Новгорода (X–XIV вв.) / Ю. М. Лесман // Материалы по археологии Новгорода 1988. – М., 1990. – С. 29–98.

7. Малевская-Малевич, М. В. Керамика западнорусских городов X–XIII вв. / М. В. Малевская-Малевич. – СПб. : Нестор, 2005. – 160 с. : ил.

8. Мальм, В. А. Подковообразные и кольцевидные застежки-фибулы / В. А. Мальм // Очерки по истории русской деревни X–XIII вв. – Труды ГИМ. – М., 1967. – Вып. 43. – С. 149–190.

9. Плавінскі, А. М. Кераміка курганнага могільніка Навасёлкі / А. М. Плавінскі, М. А. Плавінскі // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі / матэрыялы IV Міжнар. навук. канф., Полацк, 2003. – Полацк : НПГКМЗ, 2003. – С. 194–206.

10. Плавінскі, М. А. Наўры / М. А. Плавінскі, А. М. Плавінскі // Археалогія Беларусі : энцыкл. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2 : Л–Я. – С. 127.

11. Плавінскі, М. А. Узбраенне беларускіх земляў X–XIII стагоддзяў / М. А. Плавінскі. – Мінск : Галіяфы, 2013. – 106 с. : іл.

12. Покровский, Ф. В. Археологическая карта Виленской губернии / Ф. В. Покровский. – Вильна : Типография А. Г. Сыркина, 1893. – 182 с. : ил.

13. Седова, М. В. Ювелирные изделия древнего Новгорода (X–XV вв.) / М. А. Седова. – М. : Наука, 1981. – 196 с. : ил.

14. Фехнер, М. В. Шейные гривны / М. В. Фехнер // Очерки по истории русской деревни X–XIII вв. – Труды ГИМ. – М., 1967. – Вып. 43. – С. 55–87.

15. Штыхов, Г. В. Древний Полоцк (IX–XIII вв.) / Г. В. Штыхов. – Минск : Наука и техника, 1975. – 136 с. : ил.

16. Bliuenė, A. Vikingų epochos kuršių papuošalų ornamentica: istorijos mokslo leidinys). – Vilnius : Diemedis, 1999. – 300 p. : il.

17. Cehak-Hołubowiczowa, H. Meteriał i zagadnienia cmentarzyska kurhanowego koło wsi Nawry w powiece Postawskim / H. Cehak-Hołubowiczowa // Rocznik arheologiczny. – Wilno, 1937. – T. 1. – S. 5–49.

Резюме

Н. А. Плавинский, Э. А. Астапович, М. И. Степанова

Раскопки курганного могильника Навры и разведки на Мядельщине и Браславщине в 2012 году

Летом 2012 г. экспедицией Национального исторического музея Республики Беларусь была обследована северная окраина деревни Кривосельцы Браславского района, где в ходе строительства весной 2012 г. было случайно найдено женское погребение XI–XII вв., совершенное по обряду ингумации.

В результате работ, проведенных на могильнике Навры Мядельского района, был снят план могильника и исследовано четыре кургана в его основной группе. Общая вскрытая площадь составила 396 м^2. Во всех изученных курганах были обнаружены ингумации XI в., которые могут быть интерпретированы как погребения кривичей, что хорошо соотносится с данными предыдущих исследований.

Summary

M. A. Plavinski, E. A. Astapovich, M. I. Stsiapanava

Archaeological Excavations of Naury Barrow Cemetery and Surface Surveys in Miadzel and Braslau Districts

The expedition of the National Historical Museum of the Republic of Belarus carried out its fieldwork in summer of 2012. It examined the northern outskirts of Kryvaselcy village (Braslau district) where a female inhumation burial of 11th–12th centuries had been accidentally found during construction work in spring of 2012. We also excavated the area of 396 sq. m and investigated four mounds in the central part of the Naury barrow cemetery (Miadziel district). A layout plan of the whole cemetery was drawn as well. All excavated barrows contained inhumations dated back to 11th century. These burials might be interpreted as belonging to Kryvichy people. Such conclusion corresponds well to the results of previous investigations here.

Паступіў 17.05.2013 г.

УДК 902.2

А. А. Соловьёв, *Национальный Полоцкий историко-культурный музей-заповедник, старший научный сотрудник (г. Полоцк, Беларусь)*

Наблюдения за земляными работами на территории строительства дома по ул. Краснова, 12 в г. Полоцке в 2012 году

В 2011 г. на ул. Краснова, 12 было начато строительство жилого дома. В июле–августе 2012 г. археологический надзор проводил научный сотрудник НПИКМЗ А. А. Соловьёв на основе Открытого листа № 2473, выданного Институтом истории НАН Беларуси по форме № 4. В результате проведенных исследований было выяснено, что мощность культурного слоя на участке с учетом глубины материковых ям может достигать глубины 3,0 м. Территория, на которой велось археологическое наблюдение, входит в охранную зону НПИКМЗ и расположена в восточной части бывшего Заполоцкого посада возле продовольственного магазина.

Сам посад возник на рубеже X/XI вв. С этого же времени начала осваиваться и изучаемая нами территория. Будучи расположена в юго-восточной части Заполоцкого посада, которая прилегала к р. Полота и улице, ведущей на Верхний замок, она была наиболее привлекательна для заселения. Поэтому в 1498 г. именно в этой части Заполотья привилеем великого князя Александра был основан первый в Полоцке католический бернардинский монастырь. После его уничтожения И. Грозным территория вновь застраивается домами горожан [1, с. 89]. Застройка Заполотья частично показана и на рисунках С. Пахоловицкого 1579 г. Это ряды 1–2-этажных домов с двухскатными крышами [2, с. 14]. К середине XVII в. на Заполотье вновь существует развитая уличная сеть, названия некоторых из них зафиксированы в магистратских книгах. Согласно реконструкции уличной сети того времени, проведенной Д. В. Дуком, на Заполотье было продолжение ул. Великой, которая шла у подножия Верхнего замка и пересекала с запада на восток весь Великий посад, кроме нее был ряд других улиц (Еглявинская, Выгонная, Заречная, Ярмолова).

С XVIII в. уличная сеть Заполотья зафиксирована на планах Полоцка. Так, на планах 1707 и 1720 г. схематично показаны размещение участков (пляцев ?) и деревянной застройки посада. На планах конца XVIII в. зафиксирована сложившаяся уличная сеть в прошлом столетии: предложение по ее реконструкции по планам 1778, 1788 [1, мал. 31] и 1793 г. [3, с. 170, рис. 102; с. 171, рис. 103; с. 276, рис. 190] сводится в основном к регулярному размещению и спрямлению имевшихся улиц и созданию площади. Именно с этого времени начинается формирование современной сети улиц.

Археологическое изучение данной части Заполотья началось с 1961 г. Заложенный тогда Г. В. Шты-



Рис. 1. Ситуационный план котлована: *а* – до выборки грунта с указанием траншей и уложенных блоков на начало работ с привязкой участков исследования; *б* – после выборки культурного слоя с размещением шурфов (пунктиром отмечены контуры постройки из склепа)

ховым раскоп 1 расположен наиболее близко к изучаемой нами территории (ул. Краснова, 12).

Началом новых исследований данной территории стал 2006 г., когда в ходе археологического надзора А. А. Соловьёвым возле дома № 12 был обнаружен изразцовый набор первой половины XVI в., который косвенно может относиться к одной из печей сгоревших построек бернадинского монастыря. Позднее, в 2010 и 2011 г., Д. В. Дуком были заложены раскопы на ул. Краснова на месте дома № 9 (напротив дома № 12). Таким образом, им была вскрыта часть монастырской постройки первой половины XVI в. Так же непосредственно на участке дома № 12 возле магазина И. В. Магалинским был заложен шурф и обнаружено скопление человеческих костей от переотложенных захоронений [4, с. 532].

Данная территория начала осваиваться с XI в., об этом свидтельствуют находки венчиков горшков и днищ с клеймами того времени. Значительные перекопы и повреждения поверхности материковой породы на участках 1–3, 7, 9 и шурфе 3 позволяют полагать, что здесь могли быть огороды (рис. 1). Изученный культурный слой сформировался на протяжении XII в., этому времени принадлежит большинство керамики. Первым значительным обьектом, возникшим на данном участке, является большая материковая яма. Она была вырыта в конце XI в., продолжала (судя по керамике) использоваться весь XII в., и на протяжении всего столетия ее заполняли землей. Большинство найденных артефактов относится именно к этому времени. Судя по характеру находок и составу прослоек культурного слоя, заполнявшего ее, в яме была деревянная конструкция, обмазанная глиной (ее обломки найдены вместе с керамикой), и часто горел огонь. Там же были найдены редкие обломки стенок горшков, деформированных в огне, и шлак (крица ?) в виде лепешки (рис. 2). Таким образом, можно полагать, что данная яма имела производственное назначение и может быть связана с плавкой железа или обжигом керамики.

Следующим обьектом является слой сырой и обожженной глины, в котором встречен обломок горшка XII в. Он выявлен в нетронутом культурном слое на участке 7. Возможно, это часть развала печи и там некогда располагалась постройка, остатки которой были уничтожены в XVII–XVIII вв.

Находки стенок амфор и амфоровидных сосудов позволяют предположить, что владельцы данной территории могли быть связаны с торговлей.

Культурный слой XIV–XVI вв. почти полностью уничтожен. Только на участке 7 его небольшой фрагмент сохранился в виде угольной прослойки. О его наличии свидетельствуют отдельные находки фрагментов горшков и макотры. Последняя найдена на участке 7, где уцелел фрагмент непотревоженного культурного слоя, насыщенного углями. Существование культурного слоя XIV–XVI вв. подтвердил и археологический надзор на данной территории, проведенный в 2006 г. между старым домом и забором со стороны улицы [5, с. 215–221].



Рис. 2. Керамика из ямы: *1, 2* – орнаментированные стенки горшков; *3* – горло кувшина (фрагмент); *4* – стенка амфоравидного сосуда; *5* – вогнутое донце горшка; *6* – донце в клеймом; *7* – крышка горшка

Наиболее активное освоение изучаемой нами территории началось с конца XVI в. С ним связана материковая яма, найденная на участках 4 и 5. Крупные куски обожженной глины, обломки половых плиток и плинфы могут относиться к уничтоженной печи из мисковых (горшковых ?) изразцов. Использованная в печи плинфа может принадлежать некогда стоявшему на Заполотье каменному храму или быть привезена с Верхнего замка с разрушенных или перестроенных в то время храмов, находившихся там.

Позднее, с середины XVII в., возводится новая постройка. Данная постройка была заглублена в материк. Часть северо-западной стенки вырытой под нее ямы прослежена при изучении участка 8. При изучении участка 7 был прослежен профиль северо-восточной стенки ямы в данном месте. Внешняя стена дома здесь была глубоко врезана в материк. Таким образом, длина северо-западной стенки дома была от 5 до 6 м. Повторные обследования внешней западной стенки котлована под строящийся дом показали, что дальнейшего продолжения стен найденной постройки не выявлено. Длину северо-восточной и юго-западной стенки также можно определить в границах 5–6 м. На это указывает концентрация артефактов XVII–XVIII вв. именно в центральной и северной части котлована (обломки изразцов и посуды). Находки ямок от кольев позволяют полагать, что нижняя часть дома представляла собой ряд столбов (по углам) и кольев, а пролеты межу ними могли иметь заполнение в виде досок,



Рис. 3. Печные изразцы (фрагменты): *1, 2*– лицевые пластины с «иезуитской» символикой (реконструкция); *3* – лицевой изразец с «ковровым» орнаментом (реконструкция); *4* – угловой изразец с «конхой»; *5* – лицевая пластина изразца с мотивом «кованного металла»; *6* – угловой карнизный изразец; *7* – карнизный изразец. XVII в.

врезанных в пазы, или плетня. Материковая яма, контуры которой прослежены в шурфах 1 и 2, являлась подпольным склепом (рис. 1, *б*). Результаты исследования в шурфе 3 показали, что южная стенка ямы под склеп расположена за его пределами. Пространство между стенкой склепа и ямы было засыпано землей с песком. Сам склеп (исходя из материалов шурфа 2) имел вид сруба 4,0 × 2,5–3,0 м из бревен диаметром 0,12–0,15 м, вход в него мог располагаться с северо-восточной части на участке 7 там стены дома и склепа расположены наиболее близко друг к другу. Его стенки были обложены досками, от которых остались углубления в материковом песке. Пол склепа был обложен красной глиной. Печь в доме могла располагаться в южной части и устанавливаться на точечных опорах (ножках или арочках) для избежания перегрева деревянных лаг и балок [6, с. 62–63]. Нижняя часть печи на уровне топки могла быть кирпичной с включениями кирпича с продольными бороздами и плинфой. При этом нижняя часть была из «ковровых» изразцов, а верх – из «иезуитских» (рис. 3). Этому же дому могут принадлежать и обломки плоской черепицы.



Рис. 4. Круглая печь (план): *а* – стратиграфия развала печи на участке до устройства врезки; *б* – развала печи в стене фундаментной траншеи (вид сверху) и начала врезки вдоль ее западной стороны; *в* – вид печи (сверху) после окончательной врезки до начала разборки развала. Середина–вторая половина XVIII в.

Данная постройка, вероятно, была уничтожена в годы русско-польской войны 1654–1667 гг.

Вновь здание на этой территории возводится только во второй половине XVIII в. От этой постройки сохранился развал печи (рис. 4). Состав материалов в забутовке ее подушки свидетельствует, что для нее широко использовался брак кирпичного производства. Происхождение его можно связать с масштабным культовым (в частности иезуитского коллегиума) строительством в этот период. Более ранний кирпич XVII в. мог быть использован от печи предшествовавшей постройки. Источником плинфы мог быть как развал каменного храма на Заполотье, так и разборка завалов взорванного Софийского собора. Фрагмент выкладки внешней поверхности подушки (она же фундамент) под печь, как и заложенный в ее центре жернов выбоиной на юг, указывает, что она была круглой в плане и имела вид цилиндра из стеновых изразцов с пятнистой глазурью. Возможно, что ее нижняя часть на уровне топки была усилена кирпичной кладкой. Жернов, заложенный в котлован под ее фундамент, был точкой отсчета и привязки циркуля для получения правильного очертания окружности диаметром 1,2–1,3 м. Топка данной печи располагалась с южной стороны. Как и низ, она могла состоять из целого кирпича, который в ходе разборки ее был полностью выбран. При этом подушка и под топки печи (которая могла располагаться в нижней части печи) были уничтожены. На ее месте остался только развал из плинфы и пальчатки. Там же был найден и обломок печной дуги (рис. 5). Судя по нему, внутренний диаметр арки устья топки был 0,45–0,50 м. Таким образом, она близка к топочным отверстиям, выявленным на корпусах иезуитского коллегиума середины–второй половины XVIII в. [7, с. 44].

Рис. 5. Находки (фрагменты) из постройки: *1, 2* – изразцы; *3* – печная дуга; *4* – белоглиняная курительная трубка. Середина–вторая половина XVIII в.

С конца XVIII – XIX в. данная территория подвергалась сплошным нивелировкам, из-за чего следов более поздних построек не найдено. Это могло быть связано с начавшейся тогда перепланировкой и реконструкцией всего городского центра, в том числе и Заполотья. На планах 1778, 1788 и 1793 г. показана как фиксация существующего расположения участков и домов в Заполотье, так и предполагаемая реконструкция. Благодаря этому хорошо читается древняя трассировка ул. Великой, которая имела изогнутые дугообразные очертания, и проектируемая, современная ул. Краснова, которая полностью оформилась только в начале XIX в. [4, с. 170, рис. 102; с. 171, рис. 103; с. 276, рис. 190]. Это обьясняет почему остатки найденного дома середины XVII в. ориентированы углами по сторонам света и не увязываются с современной планировкой Заполотья.

Литература

1. Дук, Д. В. Полацк і палачане (IX–XVIII стст.) / Д. В. Дук. – Наваполацк, 2010. – С. 89.

2. Тарасаў, С. В. Полацк IX–XVII стст. : гісторыя и тапаграфія / С. В. Тарасаў. – Мінск, 1998. – С. 24.

3. Чантурия, Ю. В. Градостроительное искусство Беларуси второй половины XVI – первой половины XIX в. : Средневековое наследие. Реннесанс. Барокко. Классицизм / Ю. В. Чантурия. – Минск, 2005.

Местонахождения каменного века также были найдены и в окрестностях д. Чернилово и д. Селец. Недалеко от д. Чернилово, на левом берегу р. Черная, в поле, были обнаружены немногочисленные отщепы и пластина. Некоторые из них патинированы. Юго-восточнее д. Селец, на дюнном всхолмлении левого берега р. Черная Натопа, были обнаружены отщеп, пластина с ретушью по краю и скребок на отщепе.

Кроме этого, единичные артефакты из кремня были найдены в окрестностях д. Коськово, Космыничи, Заречье (бассейн р. Белая Натопа), Путяты, Сутоки. У д. Коськово на террасе, по которой проходит улица Лесная, было найдено скребло-резец ретушный на отщепе (рис. 3: *4*), фрагменты керамики и стекла. Данные находки указывают на возможное существование здесь памятников каменного века и позднесредневекового времени, которые, вероятно, были уничтожены во время разработки карьера. В обнажении западной стенки карьера наблюдался культурный слой светло-серого цвета мощностью 0,6 м (местами до 1,3 м).

В окрестностях д. Космыничи был найден кварцитовый, а около д. Заречье кремневый отщеп. Эти местонахождения являются вторыми по счету с учетом прежних открытий [6, с. 207]. Юго-восточнее д. Путяты и северо-западнее д. Сутоки были обнаружены концевой скребок на отщепе и кремневая пластина соответственно.

Вдоль песчаной дороги-улицы, проходящей по д. Каменка (бассейн р. Ремествлянка), были собраны изделия из кремня: отщепы, резец ретушный на отщепе (рис. 3: *5*), нуклеусы (рис. 3: *7*), изделие с выемкой и отщепы с ретушью. Все находки имеют архаичный облик. Особый интерес представляет сырье, из которого изготовлены предметы – полосатый кремень серого цвета. По словам местных жителей д. Каменка, песок для подсыпки дороги был привезен с находящегося недалеко от деревни карьера. С целью поиска местонахождения источников сырья, из которого изготовлены артефакты, и стоянки, связанной с ними, автором было проведено обследование обнажений карьера, что не дало положительных результатов.

Отдельное внимание было уделено изучению уже известных памятников каменного века. В частности, была обследована мезолитическая стоянка Коробчино (бассейн р. Вихра) [2, с. 135]. Во время обследования стоянки были найдены отщеп с ретушью и черешковый наконечник стрелы на регулярной пластине (рис. 3: *3*).

Также были изучены окрестности д. Колотовино. Еще в 2004 г. А. В. Колосовым здесь были обнаружены единичные находки из кремня [2, с. 132–133]. Сегодня, как и раньше, берег задернован, что не позволяет проводить сбор подъемного материала. В кротовинах берега удалось поднять только отщеп с ретушью и фрагмент гончарной керамики, что может свидетельствовать о наличии здесь культурного слоя и определяет перспективу дальнейших исследований.

В 2012 г. нами были осмотрены стоянки, расположенные у д. Космыничи и д. Заречье (бассейн р. Белая Натопа). Памятники были случайно открыты нами еще в 2010 г. [6, с. 207]. Повторное обследование стоянки-1 у д. Космыничи в 2012 г. не дало результатов. Лишь южнее памятника был найден массивный отщеп. Однако на стоянке-1 у д. Заречье удалось собрать подъемный материал: семь отщепов, пластину и скребок-проколку.

Кроме местонахождений каменного века, район характеризуется наличием немалого количества городищ эпохи раннего железного века и Древней Руси. Такие памятники были осмотрены в северо-восточной части г. Мстиславль (Девичья Гора), у д. Курковщина (Татарщина), Мазолово (Тарелка), Подлужье, Осмоловичи (Митехоровка).

Следует обратить внимание и на те неукрепленные поселения эпохи Древней Руси и средневековья, которые заметно преобладают в рассматриваемом районе. Напомним, что в результате работ было обследовано 28 пунктов, 22 из которых были обнаружены в ходе исследования. Они выявлены в окрестностях д. Гуторовщина, Заречье (бассейн р. Белая Натопа) (четыре пункта), Космыничи, Мазолово (три пункта), Митьковщина, Осмоловичи (два пункта), Путяты, Рожево, Сутоки, Старое Село, Сычевка, Чернилово (два пункта), Шумяничи, а также в окрестностях Мстиславля. На многих селищах получены представительные коллекции материалов, которые в сопоставлении с письменными источниками дают новые и дополняют уже известные сведения относительно расселения на территории региона в эпоху средневековья.

Известные ранее селища были изучены около д. Заречье (бассейн р. Белая Натопа), Коробчино, Космыничи, Мазолово, Шамовщина, а возле д. Осмоловичи осмотрен одиночный курган.

Нельзя оставить в стороне и сохранность памятников. При работах удалось установить факт разрушения археологических объектов в ходе разработки карьера у д. Коськово. О том же свидетельствуют и кремневые находки, обнаруженные на песчаной дороге д. Каменка, насыпанной из карьера. Культурный слой многих селищ разрушен в ходе хозяй-

ственной деятельности, а также из-за рытья многочисленных ям кладоискателями.

Таким образом, в 2012 г. на территории Кричевского и Мстиславского районов нами было изучено 83 археологических памятника и местонахождения отдельных находок, в том числе 51 памятник открыт в результате экспедиционных работ. Увы, несмотря на столь значительное число материалов, проблема заселения Мстиславского района в каменном веке остается открытой. Известные ранее памятники и новые сведения, полученные на территории района в 2012 г., хотя и дополняют наши представления относительно решения данной проблемы, однако не решают ее.

Литература

1. Калечиц, Е. Г. Памятники каменного и бронзового веков Восточной Белоруссии / Е. Г. Калечиц. – Минск : Наука и техника, 1987. – 158 с.

2. Колосов, А. В. Археологические древности Могилевского Посожья (по материалам экспедиций 2002–2008 гг.) / А. В. Колосов. – Могилев : «МГУ им. А. А. Кулешова», 2009. – 264 с.

3. Колосов, А. В. Мезолитические стоянки Кричевского Посожья / А. В. Колосов // Романовские чтения : сб. трудов Междунар. конф. / под ред. О. В. Дьяченко. – Могилев : «МГУ им. А. А. Кулешова», 2005. – С. 150–154.

4. Колосов, А. В. Отчет об археологических работах 2010 г. в междуречье Сожа и Остра (Могилевская область) // Архив археологической научной документации ГНУ «Институт истории НАН Беларуси». – № 2740. – Могилев, 2011 г. – 26 с., 57 с. колл. оп., 77 с. ил.

5. Копытин, В. Ф. Археологические памятники Кричевского района Могилевской области / В. Ф. Копытин. – Могилев : «МГУ им. А. А. Кулешова», 1999. – 109 с.

6. Хомченко, Я. Л. Новые средневековые памятники Мстиславльского района / Я. Л. Хомченко // Середньовічні старожитності Центрально-Східної Європи : матеріали доповідей X Міжнар. студент. археолог. конф., Чернігів, 15–17 квітня 2011 р. – Чернігів : ЧНПУ імя Т. Г. Шевченка, 2011. – С. 207.

Рэзюмэ

Я. Л. Хомчанка

Вынікі археалагічных работ на тэрыторыі Крычаўскага і Мсціслаўскага раёнаў у 2012 годзе

Артыкул прысвечаны археалагічным работам у 2012 г. на тэррыторыі Крычаўскага і Мсціслаўскага раёнаў Магілёўскай вобласці (басейн р. Сож). Были вывучаны 83 помнікі археалогіі, 51 з якіх адкрыты ў выніку экспедыцыйных работ. Прапанавана кароткая характарыстыка розначасовых матэрыялаў, у першую чаргу каменнага веку, з іх культурнай і храналагічнай інтэрпрэтацыяй, праблемай захаванасці асобных месцазнаходжанняў.

Summary

Ya. L. Khomchenko

The Results of Archaeological Works in Krichev and Mstislavl Districts in 2012

The article deals with the results of excavations on the territory of Krichev and Mstislavl Districts of Mogilev Region (the Sozh basin) in 2012. 83 archaeological sites were studied, among them 51 were discovered during archaeological field survey. The author gives concise characteristics of the discovered material which belongs to the Stone Age, interprets it culturally and chronologically and raises the problem of preservation of some places.

Поступила 30.09.2013 г.

УДК 726.82+351.853/04/4/(476)

В. У. Чараўко, *УА «Полацкі дзяржаўны універсітэт», старшы выкладчык (г. Наваполацк, Беларусь)*

Археалагічныя раскопкі на могільніку каля вёскі Івесь Глыбоцкага раёна ў 2012 годзе

Артыкул прысвечаны апісанню археалагічных раскопак на грунтовым могільніку каля в. Івесь Глыбоцкага раёна ў 2012 г. Мэтай раскопак стаў працяг вывучэння пахавальных помнікаў, пачатага ў 2010 г. Былі закладзены два раскопы, якія прымыкалі да шурфоў 2010 і 2011 г. Былі даследаваны пяць пахаванняў, у тым ліку тры жаночыя, мужчынскае і дзіцячае. Чатыры пахавальных комплекса былі абазначаны каменнымі надмагіллямі, адно пахаванне не мела ніякіх надмагільных канструкцый на ўзроўні дзённай паверхні. Касцякі арыентаваны галавой на захад з невялікімі адхіленнямі да поўначы і поўдня. Выяўлены пахавальны і памінальны інвентар (пярсцёнак, фрагменты керамікі) дае магчымасць датаваць пахаванні XIV–XVI стст.

У ліпені–жніўні 2012 г. археалагічная эспедыцыя Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта працягвала раскопкі на грунтовым (жальнічным) могільніку каля в. Івесь Глыбоцкага раёна, пачатыя ў 2010 г. [1, 2]. Інфармацыя аб могільніку была атрымана ў 2009 г. ад дацэнта УА «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт», кандыдата гістарычных навук Уладзіміра Аляксандравіча Лобача. У 2009 г. на помніку намі была праведзена візуальная разведка. Была зафіксавана наяўнасць чатырох каменных крыжоў, каменных надмагільных канструкцый. У 2010–2011 гг. на могільніку былі закладзены шурфы, якія прымыкалі адзін да аднаго. У 2012 г. на могільніку каля в. Івесь былі закладзены два раскопы, якія прымыкалі да шурфоў 2010 і 2011 г. Раскоп 1 першапачатковай плошчай 16 м^2 прымыкаў з заходняга боку да шурфа 2010 г. (мал. 1). Паколькі ў ходзе раскопак было выяўлена пахаванне, якое выходзіла за межы раскопу 1, да паўднёва-заходняга кута была зроблена прырэзка плошчай 1,25 м^2. Такім чынам, плошча раскопу 1 склала 17,25 м^2. Раскоп 2 плошчай 20,5 м^2 прымыкаў з паўночнага боку да шурфа 2011 г. Неправільная канфігурацыя раскопу 2 абумоўлена наяўнасцю вялікіх дрэў, якія растуць у кв. Б6 паміж шурфом 2011 г. і раскопам 2 2012 г. Выступ раскопу 2 з паўднёвага боку, які парушае геаметрычна правільную канфігурацыю раскопу, будзем называць прырэзкай да раскопу 2. Ускрытая ў 2012 г. плошча склала 37,75 м^2, агульная ўскрытая плошча – 72,25 м^2.

У 2012 г. была працягнута нумарацыя квадратаў, пачатая ў 2010 г. У межах раскопу 1 размяшчаліся кв. А´1, А´2, Б´1, Б´2 цалкам, а таксама Б´1´, В´1, В´1´ часткова. У межах раскопу 2 размяшчаліся кв. А6, А7, Б7 цалкам, а таксама кв. А5, Б6, А8, Б8 часткова. Пахаванні атрымалі двайную нумарацыю – скразную, пачатую ў 2010 г., ад № 12 па № 16, і з дадаткам года – ад 2012-1 да 2012-5. Усяго было выяўлена пяць пахаванняў.

Візуальны агляд і нівеліроўка дзённай паверхні раскопаў выявілі нязначны перапад вышынь (розніца ў 0,1–0,2 м).

Размяшчэнне камянёў надмагільных канструкцый у межах раскопу 1 дазваляла меркаваць аб наяўнасці там 1–2 пахаванняў, пры гэтым валунныя камяні маглі разглядацца як маркёры галавы/ног пахавання (мал. 2). На самой справе было выяўлена адно пахаванне ў раскопе 1 і адно пахаванне ў прырэзцы да яго з паўднёва-заходняга боку. Апошняе не было пазначана каменным надмагіллем. Размяшчэнне камянёў надмагільных канструкцый у межах раскопу 2 дазваляла меркаваць аб наяўнасці там 2–3 пахаванняў. У ходзе раскопак былі выяўлены тры пахаванні.

У межах раскопу 1 стратыграфія мела наступны выгляд (мал. 3, 4). Пад слоем дзёрну на глыбіню ад 0,15 да 0,30 м ішоў пласт шэра-жоўтага, попелападобнага па структуры пяску, падзолу. Глыбей ішоў пласт жоўтага пяску магутнасцю 0,3–0,5 м. Пад ім ішоў пласт чырвонай гліны. У паўднёвай частцы раскопу 1 у гліне трапляліся каменьчыкі памерам да 1 см. Магутнасць пласта гліны вагалася ад 0,05 м у паўночнай частцы раскопу і да 0,4 м у паўднёвай яго частцы. На глыбіні 0,5–0,8 м ад дзённай паверхні знаходзіўся слой мацерыковага бледна-жоўтага шчыльнага пяску. Магільныя ямы былі запоўнены шэрым пяском.

У межах раскопу 2 стратыграфія мела наступны выгляд (мал. 5, 6). Зверху пад слоем дзёрну на глыбіню ад 0,15 да 0,50 м ішоў пласт шэра-жоўтага, попелападобнага па структуры пяску, падзолу. Глыбей ішоў пласт жоўтага пяску магутнасцю 0,1–0,4 м. Пад ім на глыбіні каля 0,6 м ад дзённай паверхні пачынаўся мацярык – бледна-жоўты шчыльны пясок. Пласты і прапластак чырвонай гліны ў раскопе 2 не прасочвалася. Магільныя ямы былі запоўнены шэрым (пахаванне 15) або жоўтым пяском (пахаванні 14 і 16) – гэта значыць, не вылучаліся па колеры.

Стратыграфія раскопаў 1 і 2 суадносіцца са стратыграфіяй шурфоў 2010 і 2011 г. адпаведна.

Пахаванне 12 (2012-1) (мал. 7) было размешчана ў раскопе 1 у кв. А´1 (асноўная частка касцяка) і Б´1 (чэрап). На ўзроўні дзённай паверхні яно было пазначана надмагільнай канструкцыяй, што



Мал. 1. Нівеліровачны план. Размяшчэнне раскопаў 1 і 2 (Р. 1 і Р. 2) адносна шурфоў 2010 і 2011 г. адпаведна. Могільнік каля вёскі Івесь Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці. 2012 г.



Мал. 2. Каменныя надмагільныя канструкцыі на ўзроўні дзённай паверхні. Могільнік каля вёскі Івесь Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці. 2012 г.



Мал. 3. Паўднёвы (*а*), паўночны (*б*) і заходні (*в*) профілі. Раскоп 1. Могільнік каля вёскі Івесь Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці. 2012 г. Умоўныя адзнакі: *1* – дзёран; *2* – камень; *3* – шэры, попелападобны пясок, падзол; *4*– жоўты пясок; *5* – мацерыковы светла-жоўты пясок; *6* – чырвоная гліна



Мал. 4. Усходні (*а*), паўднёвы (*б*), заходні (*в*) і паўночны (*г*) профілі прырэзкі ў паўднёва-заходнім куце раскопу 1. Умоўныя адзнакі тыя ж, што і на мал. 3



Мал. 5. Паўночны (*а*), заходні (*б*), усходні (*в*) і паўднёвы (*г*) профілі. Раскоп 2. Могільнік каля вёскі Івесь Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці. 2012 г. Умоўныя адзнакі тыя ж, што і на мал. 3



Мал. 6. Усходні профіль. Прырэзка з паўднёвага боку раскопу 2. Могільнік каля вёскі Івесь Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці. 2012 г.

складалася з валуннага каменя памерам ~ 0,7 м і вышынёй 0,56 м ў нагах пахавання і валуннага каменя памерам ~ 0,7 м і вышынёй 0,6 м на адлегласці 0,3 м на паўночны захад ад галавы пахавання. Акрамя таго, да надмагілля пахавання 12 маглі адносіцца камяні памерамі ~ 0,4 м справа і злева (з поўдня і поўначы) ад пахавання. На глыбіні да 0,2 м ад узроўню дзённай паверхні было выяўлена яшчэ 13 камянёў памерамі ад 0,15 да 0,6 м (мал. 8). На глыбіні ад 0,2 да 0,4 м ад узроўню дзённай паверхні было выяўлена яшчэ пяць камянёў. Глыбей было выяўлена яшчэ пяць камянёў, якія адносіліся да каменнай канструкцыі пахавання 12, у тым ліку два з іх – на мацерыку. Камяні складалі канструкцыю, пераходную ад выбрукоўкі да абкладкі (у форме няправільнага авала) з вялікім валуном у нагах пахавання.

Касцяк быў размешчаны на адлегласці 1,2 м ад паўднёвай сцяны раскопу. Арыенціроўка – галавой на захад. Рукі былі складзены на жываце, правая на левай. Пахаванне безынвентарнае. Рэшткі труны адсутнічалі. У адпаведнасці з высновамі антрапалагічнай экспертызы, праведзенай В. А. Емяльянчык,[1] пахаванне належала жанчыне ва ўзросце 18–20 гадоў.

У паўночнай палове раскопу 1, у кв. А´2 Б´2, зыходзячы з камянёў на дзённай паверхні, магло быць размешчана пахаванне або нават два. Гэта пацвярджалася наяўнасцю нязначнай колькасці камянёў на глыбіні да 0,6 м ад узроўню дзённай паверхні і дзвюма плямамі ад перакопу ў гэтых квадратах, аднак ні рэшткаў пахаванняў, ні контураў касцяка або труны не было выяўлена.

Пахаванне 13 (2012-2) (мал. 7) было размешчана ў раскопе 1 у прырэзцы, зробленай у паўднёва-заходнім куце раскопу. Пахаванне не было пазначана камянямі і было выяўлена зыходзячы са стратыграфіі раскопу (паўднёвага профілю). Пахаванне было размешчана ў кв. Б´1´ (асноўная частка касцяка) і В´1´ (чэрап) на мяжы з кв. Б´1 і В´1. Пахаванне арыентавана галавой на захад з невялікім адхіленнем да поўначы. Левая рука выцягнута ўздоўж цела, правая пакладзена на таз. Пахаванне безынвентарнае. Рэшткі труны адсутнічалі. У адпаведнасці з высновамі антрапалагічнай экспертызы, пахаванне належала жанчыне ва ўзросце 50–60 гадоў.

Пахаванне 14 (2012-3) (мал. 7) было размешчана ў раскопе 2 у кв. Б6 на мяжы з кв. А6. На ўзроўні дзённай паверхні яно, магчыма, было пазначана валунным каменем памерамі 0,4–0,7 м і вышынёй ~ 0,2 м. Гэты камень быў размешчаны на адлегласці 0,5 м на поўнач ад чэрапа ў пахаванні і мог адносіцца да яго надмагілля. Яшчэ адзін камень памерамі ~ 0,6 м і вышынёй ~ 0,2 знаходзіўся на адлегласці каля 0,4 м на паўднёвы захад ад чэрапа ў пахаванні і таксама мог адносіцца да яго надмагілля. На адлегласці каля 0,8 м на усход ад чэрапа быў размешчаны камень памерамі ~ 0,4 м і вышынёй ~ 0,3 м, які мог як маркіраваць ногі ў пахаванні (ад якога захаваўся толькі чэрап), так і адносіцца да пахаванняў у недаследаванай пакуль частцы могільніка.

Пад слоем дзёрну на глыбіню да 0,2 м ад узроўню дзённай паверхні над пахаваннем 14 былі выяўлены яшчэ шэсць камянёў памерамі ад 0,15 да 0,20 м. Адзін з іх быў размешчаны непасрэдна над чэрапам, астатнія утваралі абкладку злева над касцяком. На глыбіні ад 0,2 да 0,4 м ад узроўню дзённай паверхні быў размешчаны яшчэ адзін камень у галавах і тры – у нагах пахавання (два справа ад касцяка, адзін – злева) памерамі 0,2–0,4 м. На глыбіні ад 0,4 да 0,6 м ад узроўню дзённай паверхні былі выяўлены яшчэ чатыры камяні ў нагах пахавання і адзін – каля галавы. Каменная канструкцыя з'яўляецца абкладкай з вялікімі камянямі ў галавах і нагах пахавання.

Касцяк пахавання быў прадстаўлены выключна чэрапам, запаўненне магільнай ямы па колеры не адрознівалася ад грунта вакол, таму рэканструкцыя каменнай канструкцыі гіпатэтычная. Пахаванне безынвентарнае. Рэшткі труны адсутнічалі. У адпаведнасці з высновамі антрапалагічнай экспертызы, пахаванне належала дзіцяці. Пол і ўзрост вызначыць немагчыма з прычыны адсутнасці костак посткраніяльнага шкілета і дрэннай захаванасці чэрапа.

Пахаванне 15 (2012-4) (мал. 7) было размешчана ў раскопе 2 на мяжы кв. А6-А7 і Б6. На ўзроўні дзённай паверхні яно было пазначана валунамі ў галавах і нагах пахавання. У галавах знаходзіліся два валуны памерамі ~ 0,4–0,8 м і вышынёй да 0,25 м над узроўнем дзённай паверхні. У нагах (злева) знаходзіўся камень памерам ~ 0,5 м і вышынёй ~ 0,4 м. Акрамя таго, яшчэ два камяні памерамі да 0,2 м знаходзіліся злева ад пахавання. Раскопкі выявілі магутную ўнутрымагільную канструкцыю-выбрукоўку, якая складалася з камянёў, складзеных у некалькі слаёў. Пад дзёрнам на глыбіні да 0,2 м ад узроўню дзённай паверхні знаходзілася 39 камянёў памерамі 0,1–0,6 м, якія складалі суцэльную выбрукоўку над пахаваннем (мал. 8). На глыбіні ад 0,2 да 0,4 м ад узроўню дзённай паверхні былі размешчаны тры камяні памерамі да 0,5 м. На глыбіні ад 0,4 да 0,6 м ад узроўню дзённай паверхні былі выяўлены яшчэ тры камяні памерам да 0,4 м, якія адносіліся да пахавання 15. Каменная канструкцыя з'яўлялася выбрукоўкай з вялікім валуном у галавах пахавання.

Касцяк быў арыентаваны галавой на захад з невялікім адхіленнем ў паўночны бок. Рукі складзены

[1] Аўтар удзячны кандыдату біялагічных навук, старшаму выкладчыку УА «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт» Вользе Антонаўне Емяльянчык за праведзеную антрапалагічную экспертызу.



Мал. 7. План размяшчэння пахаванняў. Могільнік каля вёскі Івесь Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці. 2012 г.



Мал. 8. Сумяшчэнне планаў надмагільных і ўнутрымагільных каменных канструкцый. Могільнік каля вёскі Івесь Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці. 2012 г.

на жываце, правая на левай. Пахаванне безынвентарнае. Рэшткі труны адсутнічалі. У адпаведнасці з высновамі антрапалагічнай экспертызы, пахаванне належала мужчыне ва ўзросце 30–40 гадоў.

Пахаванне 16 (2012-5) (мал. 7) было размешчана ў раскопе 2 ў паўночна-усходнім куце ў кв. Б8. На ўзроўні дзённай паверхні пахаванне было маркіравана каменем памерамі ~ 0,7 м і вышынёй 0,25 м, які быў размешчаны ў галавах. На глыбіні ад 0,2 да 0,4 м ад узроўню дзённай паверхні былі выяўлены 22 камяні, якія стваралі выбрукоўку над пахаваннем (а дакладней, справа, на поўдзень каля яго) (мал. 8). Памеры камянёў вагаліся ад 0,15 да 0,50 м. Глыбей, на ўзроўні 0,6 м ад узроўню дзённай паверхні, знаходзіліся яшчэ тры камяні памерамі 0,2–0,3 м. Каменная канструкцыя з'яўлялася суцэльнай выбрукоўкай з вялікім каменем у галавах пахавання.

Касцяк быў арыентаваны галавой на захад з невялікім адхіленнем на поўдзень. Правая рука была пакладзена на грудзях, левая знаходзілася на жываце. У адпаведнасці з высновамі антрапалагічнай экспертызы, пахаванне належала жанчыне ва ўзросце 20–25 гадоў. Пахаванне мела інвентар: бронзавы вузкапласцінчаты пярсцёнак з двайным рыфленнем, характэрны для XIV–XV (XVII) стст. (мал. 9) [3]. Акрамя таго, у магільнай яме выяўлены жалезныя цвікі ад труны ў колькасці 12 шт., па шэсць у галавах і нагах пахавання.

У раскопе 1 у кв. А′1, А′2, Б′1 і Б′2 на глыбіні да 0,4 м ад узроўню дзённай паверхні былі выяўлены фрагменты сценак і венца керамічнага гаршка. Фрагмент венца ў сячэнні тоўсты, паверхня няроўная, дрэнна загладжаная (мал. 10: *3*). Выраблена неахайна. У цесце ў вялікай колькасці прысутнічае жарства. Шыйка кароткая. Гаршчок можа быць датаваны XV–XVI стст.



Мал. 9. Пярсцёнак. Бронза. XIV–XV (XVII) стст. Пахаванне 16. Могільнік каля вёскі Івесь Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці. 2012 г. Прарысоўка А. Л. Коца

У раскопе 2 у кв. А5, А6, А7, А8, Б6 на глыбіні да 0,4 м ад узроўню дзённай паверхні былі выяўлены фрагменты сценак і венцаў керамічнага гаршка. Большасць фрагментаў была выяўлена ў пласце 2 (на глыбіні ад 0,2 да 0,4 м ад узроўню дзённай паверхні). Асноўная частка фрагментаў керамікі, у тым ліку два фрагменты венцаў, сканцэнтравана ў кв. Б6. Фрагмент венца, які мае манжэту (мал. 10: *1*), датаваны XII–XIII стст. У цесце ў вялікай колькасці прысутнічае жарства, паверхня фрагмента няроўная, дрэнна загладжаная, шурпатая. Гэта можа тлумачыцца мясцовай недасканалай вытворчасцю. Фрагмент, які занесены ў Вопіс масавых знаходак пад № 18, мае на плечыку лінейны арнамент (мал. 10: *2*). Шыйка кароткая. Паверхня няроўная, шурпатая, дрэнна загладжана. У цесце ў вялікай колькасці прысутнічае жарства. Венца можа быць аднесена да XV ст.



Мал. 10. Венцы ад керамічнага начыння (фрагменты) (*1–3*). Могільнік каля вёскі Івесь Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці. 2012 г.

Фрагменты керамікі, выяўленыя на невялікай глыбіні, могуць быць інтэрпрэтаваны як памінальны інвентар. У такім разе адно венца XV–XVI стст. адносіцца да пахавання 12, а яшчэ адно XV ст. – да пахавання 14 або да пахавання 15. Пахаванне 16 датавана XIV–XV стст. на падставе знаходкі пярсцёнка.

Літаратура

1. Чараўко, В. У. Археалагічныя разведкі на грунтовым могільніку каля в. Івесь Глыбоцкага раёна ў 2010 годзе / В. У. Чараўко // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2012. – Вып. 23. – С. 379–383.

2. Чараўко, В. У. Археалагічнае вывучэнне могільніка каля в. Івесь Глыбоцкага раёна ў 2010–2011 гг. / В. У. Чараўко // Полацк у гісторыі і культуры Еўропы : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Полацк, 20–23 мая 2012 г. ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.] ; навук. рэд., уклад. В. М. Ляўко. – Мінск : Беларус. навука, 2012. – С. 417–426.

3. Svetikas, E. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės christianizacija XIV a. pab. – XV a. : archeologiniai radiniai su krikščioniškais simboliais. – Vilnius : Diemedžio leidykla, 2009. – T. 1. – 659 p. : il.

Резюме

В. В. Черевко

Археологические раскопки на могильнике возле деревни Ивесь Глубокского района в 2012 году

Приведено описание археологических раскопок на грунтовом могильнике возле деревни Ивесь Глубокского района Витебской области в 2012 г. Цель раскопок – продолжить изучение погребальных памятников, начатое в 2010 г.

В 2012 г. были заложены два раскопа, которые примыкали к шурфам 2010 и 2011 г. Вскрытая в 2012 г. площадь составила 37,75 м^2, общая вскрытая площадь – 72,25 м^2. Стратиграфия раскопов соотносится со стратиграфией шурфов 2010 и 2011 г. В 2012 г. были исследованы пять погребений, в том числе три женских, мужское и детское. Четыре погребальных комплекса были обозначены каменными надмогильными конструкциями (в двух случаях – сплошная каменная вымостка с крупными камнями в головах, в одном – переходная от вымостки к обкладке конструкция к крупным камнем в ногах, в одном – обкладка с крупными камнями в головах и ногах), одно погребение не имело никаких конструкций на уровне дневной поверхности. Костяки ориентированы головой на запад с небольшими отклонениями к северу и югу.

В четырех погребениях погребального инвентаря и следов гроба не выявлено. В одном женском погребении найдены бронзовый перстень, характерный для XIV–XV вв., а также гвозди от гроба. Находки вне могил представлены фрагментами керамики. Особенности формы и орнаментации двух венчиков, формовочной массы позволяют датировать их XV и XV–XVI вв. Выявление фрагментов керамики на небольшой глубине дает возможность интерпретировать их как поминальный инвентарь.

Summary

V. V. Charauko

The archaeological excavations at the cemetery near Ives village of Gluboksky district in 2012

The article describes archaeological excavations at the ground cemetery near Ives village of Gluboksky district in Vitebsk region in 2012. The aim of the excavations is to continue the investigation of the funerary burials, which were started in 2010.

In 2012, 2 excavations were made, which were connected with the pits of 2010 and 2011. The area opened in 2012 was 37.7 sq. m, the total opened area – 72.2 sq. m. The stratigraphy of excavation pits correlats with the stratigraphy of pits of 2010 and 2011. In 2012 five burials were investigated, including 3 female, 1 male and 1 children's grave. Four funerary complexes were marked with gravestone constructions (in two cases – a solid stone pavement with large stones near the heads, in one case – a construction with transition from the pavement to the turfing with a large stone near the feet, and in another case – the turfing with large stones near the heads and feet), one burial had no constructions on the level of daily surface. The heads of skeletons are oriented to the West, with small deviations to the north and south.

Four burials have no burial objects and no traces of any coffins. A bronze ring typical for the 14th–15th centuries, as well as coffin nails have been found in the female grave. Among the objects found outside the graves are fragments of ceramics. The characteristic features of shape and ornamentation of the two funeral headbands and some peculiarities of the molding mass allow us to think that they date back to the 15th and 15th–16th centuries. As ceramic fragments have been found at a shallow depth, it makes it possible to interpret them as memorial inventory.

Паступіў 30.09.2013 г.

УДК 902/904(476)

Макс. М. Чарняўскі, *Інстытут гісторыі НАН Беларусі, аддзел археалогіі першабытнага грамадства, кандыдат гістарычных навук (г. Мінск, Беларусь)*

Даследаванні на Беларускім Паазер'і ў 2012 годзе

У 2012 г. аўтар дадзенага артыкула праводзіў разведкі ў Мядзельскім раёне Мінскай вобласці (сумесна з Міхалам Чарняўскім), Лепельскім і Ушацкім раёнах Віцебскай вобласці (сумесна з Зояй Харытановіч), раскопкі на паселішчах Асавец-2 Бешанковіцкага і Бярэшча-2 Лепельскага раёнаў Віцебскай вобласці.

Разведкі

Вёска Зані. Мядзельскі раён. Мінская вобласць. Катлавіна Дзягільскага возера ўяўляе з сябе выцягнуты з усходу на захад прыплюснуты авал з крыху зрэзанымі краямі (мал. 1, *а*). У заходняй частцы маецца выток р. Кубля (упадае ў воз. Баторына), а крыху на поўнач у тую ж заходнюю ўскраіну возера з паўночнага боку ўпадае крыніца Сцюдзяніца (Сцюдзёнка), якая і дала назву аднайменнай вёсцы. Праз вузкі перашыек паміж карэннымі берагамі, па якім бяжыць крыніца, на поўначы пачынаецца яшчэ адзін тарфянік, які цягнецца ў паўночным кірунку да вёскі Суднікі, і дзе, неўзабаве пасля перашыйку, Э. М. Зайкоўскім было выяўлена месцазнаходжанне каменнага веку [2, с. 7].

З поўначы ў сучаснае возера ўдаецца невялікі мыс, сучасная «купеля» в. Дзягілі. На гэтым мысе аўтарам у 1999 г. быў закладзены шурф, у якім былі выяўлены фрагменты керамікі культуры штрыхаванай керамікі [4, с. 4, 5]. У самой вёсцы маецца гарадзішча, абследаванае шурфоўкай ў 1980 г. Э. М. Зайкоўскім, з матэрыяламі штрыхаванай керамікі [1, с. 4].

У 2012 г. па ініцыятыве Міхала Чарняўскага былі праведзены невялікія разведачныя работы на поўдзень ад сучаснага возера, на разлеглым востраве пасярод «Дзягельскага моху», які добра чытаецца на спадарожнікавай карце. Згодна з гэтымі здымкамі масіў, які вылучаецца залесеннем сярод імшыстага наваколля, выцягнуты з паўднёвага захаду на паўночны ўсход. Непасрэдны абход выспы па самой мяжы з тарфянікам з выкарыстаннем GPS даў абрысы, пазначаныя шэрым (мал. 1, *а*). Пры гэтым паўночна-заходнія і паўночныя межы (ад вады) больш высокія, выразныя, відавочна падмыты хвалямі ў старажытнасці. Паўднёвыя і паўднёва-усходнія межы блага чытаюцца на месцы і пры паўнавартаснай тапаграфічнай здымцы могуць адрозніваццa ад пададзеных у справаздачы. Адпаведна, трэба разумець абрысы выспы на фотаздымку з космасу, якія не супадаюць з рэальнымі, як блізкі выхад мінеральнага дна возера (падтопленага востра-ва), дастатковы для змены расліннасці (росту сасновага лесу).

Шурф памерамі 1 × 1 м быў закладзены бліжэй да заходняга краю выспы, у паўночнай яго частцы. Грунт выбіраўся рыдлёўкай пластамі па 20 см і прасейваўся на металічным сіце з вочкам памерам 5 мм.

Стратыграфія шурфа:

0–5, 0–7 см – лясны дзёран з імхом, падасланы тонкім, да 1 см, чорным/цёмна-карычневым паўраскладзеным прапласткам яго ж (дзёрну);

далей 2–3 см попельна-сіваватага, светла-шэрага пяску. У ім сустракаюцца самыя першыя знаходкі;

наступны пласт, каля 8 см – шэра-карычневы, плямісты пясок. Асноўная колькасць артэфактаў была размешчана ў ім;

ніжэй размешчаны мацярык, руды пясок з артзандамі. Апошнія сустракаліся ў меншай колькасці і ў вышэйшых прапластках пяску.

Матэрыял: фрагмент керамікі, сценка. Вонкавая паверхня падгарызантальна заштрыхаваная, са знайніцы падштрыхоўка набывае вертыкальны характар. Дамешак мінеральны, пясок, дробная жарства. Таўшчыня – 7 мм. Без арнаменту. Адносіцца да культуры штрыхаванай керамікі, мяжа новай эры; адзін скол крамянёвы падскарыністы, неапрацаваны; адна медыяльная частка пласцінкі трапецападобнага сячэння, 19,0 × 12,0 × 3,2 мм; адна праксімальная частка мікрапласцінкі падскарыністай, 14,5 × 7,2 × 1,7 мм; адзін мікраадшчэп менш 0,5 см^2; адзін адшчэп падскарыністы, больш 2 см^2; адзін адшчэп каля 1 см^2; адзін адшчэп менш 1 см^2, перапалены.

Такім чынам, на падставе матэрыялу месцазнаходжанне можна прадатаваць каменным–жалезным векам. Для ўдакладнення як храналогіі, так і ўласна ідэнтыфікацыі месцазнаходжання неабходныя дадатковыя даследаванні.

На захад ад вострава, па другі бок ад ракі Ворнач (назва паступова знікае, для мясцовага насельніцтва ўжо больш характэрна казаць «рака» або «канал»), было праведзена бурэнне тарфяніка. Глыбіня торфу да мацерыка (светла-шэры да шэрага дробны азёрны пясок) склала 163 см.

Вёска Верабкі. Лепельскі раён. Віцебская вобласць. Разведкі праводзілі з паўднёвага боку ад р. Бярэшча (мал. 2).

«Малы Чухан 1-ы» (Бярэшча-4) – месцазнаходжанне размешчана на кроплепадобнай верацеі даўжынёй каля 250 м у лясным масіве за 1550 м на паўднёвы захад ад моста праз р. Бярэшча ў в. Ве-



а



б

Мал. 1. Месцы правядзення разведак: *а* – Мядзельскі раён; *б* – Ушацкі раён



Мал. 2. Помнікі мікрарэгіёна: *1* – Бярэшча-1; *2* – Бярэшча-2; *3* – Бярэшча-3; *4* – Бярэшча-4

рабкі (мал. 2: *4*). Тут, у зачыстцы сасновага вываратня, выяўлены крамянёвы адшчэп.

Стратыграфія зачысткі: падзол лясны, сіваватакарычневы – 20 см, ніжэй пясок чырванавата-цагляны, да 40 см. У ім і быў выяўлены адшчэп. Таксама ў ім прысутнічае шмат дробнага камення.

Праз 350 м на паўднёвы захад ад «Чухана 2-га» і праз 2150 м ад моста ў в. Верабкі, размешчана вялікае ўзвышша (мал. 2: *3*). У старажытнасці яно было разлеглым востравам складанай канфігурацыі. На лясной дарозе на заходнім схіле гэтай выспы, на агаленні і ў кратавінах сабраны дробныя фрагменты керамікі неаліту–бронзавага веку, тры крамянёвыя адшчэпы.

Вёскі Кугоні і Заазер'е. Ушацкі раён. Віцебская вобласць. У 2012 г. сумесна з Зояй Харытановіч былі праведзены невялікія разведкі ва Ушацкім раёне (мал. 1, *б*). Адной з мэт была праверка інфармацыі пра масавае выяўленне каменных свідраваных сякер і сякер-кліноў на заходнім узбярэжжы воз. Чарсцвяты паміж і ў ваколіцах в. Славені і в. Ляхі [3, с. 202, карта, табл. 1: *1, 2, 4–10*]. Падрабязнае абследаванне трох участкаў не прынесла ніякага матэрыялу, акрамя спарадычных фрагментаў позняй ганчарнай керамікі. Адзіны пункт, зафіксаваны намі, знаходзіўся на усход ад в. Ляхі, амаль на самім беразе, на усходнім схіле пагорка (урочышча «Мяцёлка») – невялікая канцэнтрацыя фрагментаў позняга ганчарнага посуду. Другой, і асноўнай мэтай разведак ва Ушацкім раёне, была праверка стану захавання верагодных тарфяніковых стаянак каля в. Заазер'е і в. Кугоні на воз. Аталова. Цікавая для нас тэрыторыя ўяўляе з сябе ўтарфаванае возера, асушанае ў XX ст. і пакрытае сеткай міліярацыйных канаў (мал. 1, *б*). Тут у 1978 г. Э. М. Зайкоўскім у выкідах з канаў былі выяўлены фрагменты керамікі паўночнабеларускай культуры. Адначасова ў аўтара была вусная інфармацыя Міхала Чарняўскага пра знаходкі керамікі ў выкідах з канала ля суседняй в. Заазер'е. На жаль, падчас разведкі высветлена, што азначаная тэрыторыя забалочана праз запруджванне магістральнага канала бабрамі: узровень вады



Мал. 3. Матэрыялы паселішча Асавец-2: *1–5* – костка; *6–8* – крэмень; *9, 11* – камень; *10* – гліна

амаль вярнуўся да першаснага, дамеліярацыйнага стану. Правядзенне даследаванняў на верагоднай тэрыторыі размяшчэння стаянак сёння з'яўляецца немагчымым.

Раскопкі

Вёска Асавец (Асавец-2, «паўднёвы раскоп»). Бешанковіцкі раён. Віцебская вобласць. Паселішча Асавец-2 размешчана за 1,2 км на паўднёвы ўсход ад вёскі ва ўр. Дражня. Даследуецца аўтарам з 2008 г. У 2012 г працягнуты працы на паўднёвым раскопе, кв. 415–426. Былі ўскрыты чатыры умоўныя пласты: 90–100, 100–110, 110–125, 125–130 см. Напрыканцы даследаванняў ва ўсіх квадратах дасягнуты мацярык.

Культурны пласт моцна насычаны арганікай – дрэвам, карой, аднак стан яе захаванасці вельмі благі. Амаль ніводны фрагмент дрэва, за выключэннем паляў і шэрагу гарызантальных палак, не быў зачышчаны дакладна па абрысах: працэс раскладання дасягнуў такога развіцця, што ў мокрым грунце пры зачыстцы іх паверхня згладжваецца і здымаецца, як свежазамешаная гліна.

Усяго падчас даследаванняў 2012 г. выяўлены 6132 артэфакты: 44 індывідуальныя знаходкі і 6088 адзінак масавага матэрыялу. З крамянёвых вырабаў гэта два фрагменты наканечнікаў стрэл (мал. 3: *6*), скол са слядамі выкарыстання, пяць скрабкоў (мал. 3: *7*), адшчэп ад шліфаванай сякеры, шэсць фрагментаў неазначальных вырабаў (мал. 3: *8*). Касцяныя вырабы налічваюць чатыры наканечнікі стрэл (разам з абломкамі), тры праколкі, рыбны нож, сякеру рагавую, адціскальнік, выраб з пашчэнкі бабра, кінжал з лакцявой косткі, наканечнік гарпуна пашкоджаны (мал. 3: *5*), тры зробленыя з зубоў падвескі (мал. 3: *4*), пацерку (мал. 3: *2*), пранізку (мал. 3: *3*), касцяную накладку (мал. 3: *1*), лішкавы фрагмент ад вырабу пацерак, пяць фрагментаў неазначальных вырабаў. Выяўлены таксама і два каменныя вырабы – цёрачнік і пашкоджанае падавальнае грузіла са змешчанай адтулінай (мал. 3: *9, 11*). Гліняныя артэфакты прадстаўлены грузілам (мал. 3: *10*) і скрабком з фрагмента керамікі.

Выяўлена таксама шалупінне лясных арэхаў (460 экз.), жалуды (7), ядры (432) і шалупінне чылімаў (235 экз.), адзін неазначальны плод.

Асноўную колькасць знаходак складаюць фрагменты керамікі. Усяго выяўлена 1399 фрагментаў, з іх 119 венцаў, дзевяць донцаў і 665 сценак, 32 ад развалаў начынняў, 574 фрагменты друзу керамічнага. Да паўночнабеларускай культуры адносіцца 308 фрагментаў, да усвяцкай – 454, да кола культур шнуравой керамікі – 56, да неазначальных і гібрыдных – 7 фрагментаў.

У раскопе 2012 г. было выяўлена таксама 857 костак млекакормячых, птушак і паўзуноў, з іх 262



Мал. 4. Крамянёвыя вырабы з паселішча Бярэшча-2 (*1–7*)

перапаленыя (або са слядамі ўздзеяння агню). Косткі рыб налічваюць 2489 экзэмпляраў, з іх 20 перапаленых.

Вёска Верабкі (Бярэшча-2, «Прыгожая Верацея). Лепельскі раён. Віцебская вобласць. Размешчана за 3 км на паўднёвы захад ад моста праз р. Бярэшча ў в. Верабкі і за 800 м на поўдзень–паўднёвы ўсход (адхіленне ў пару градусаў) ад стаянкі Бярэшча-1 (мал. 2: *2*). Навакольная тэрыторыя моцна забалочана. Назва ўрочышча, са слоў мясцовых жыхароў, паходзіць ад таго, што пляцоўка пагорка ніколі не парастае лесам.

Форма пагорка разам са схіламі нагадвае класічны прамакутнік, катэты якога з'арыентаваны на поўдзень і ўсход. Схілы парослыя лесам. Уласна пляцоўка, занятая стаянкай, уяўляе з сябе авал нерэгулярных абрысаў, выцягнуты з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад, з «выпукласцямі» ў цэнтральнай і паўднёвай частках у заходнім кірунку. Па восі паўночны усход–паўднёвы захад даўжыня пагорка складае 180 м (уласна пляцоўка – 150 м); шырыня па восі паўночны захад–паўднёвы ўсход – 160 м (пляцоўка – 70 м).

У 2012 г. ў працягу мінулагодняга шурфа быў закладзены шурф 1 плошчай 6 м^2, а ў паўночнай аканечнасці пляцоўкі – шурф 2 памерамі 1 × 1 м.

На месцы выпрацоўкі шурфа 1 было ўсталявана стацыянарнае металічнае сіта з вочкам памерам 3 мм, праз якое прасейвалі ўвесь грунт. Першы пласт (пласты па 10 см) здымалі цалкам квадратамі (з улікам глыбіні разворкі плугамі), пры распрацоўцы астатніх пластоў (2 і 3) кожны квадрат дадаткова падзялялі на сектары А, Б, В, Г для больш дакладнай фіксацыі матэрыялу. Па завяршэнні даследавання кожны пласт зачышчалі. Даследаванне шурфа 1 × 1 м праводзілі, выкарыстоўваючы пераноснае сіта з вочкам памерам 5 мм.

Стратыграфія шурфа 1 (6 м^2):

0–10 см – дзярновы пласт;

10–30 см – шэры гумусаваны супесак;

30–45 см – кантактная зона;

45–60 см – мацярык, светла шэры/рудаваты супесак.

Стратыграфія шурфа 2 аналагічная.

Матэрыял прадстаўлены крамянёвымі, касцянымі і керамічнымі артэфактамі. Сярод вырабаў найбольш прадстаўлены крамянёвыя наканечнікі стрэл: ранненарвенскі (кундскі) чаранковы наканечнік на пласціне (мал. 4: *1*), два трохкутныя наканечнікі позняга неаліту–бронзавага веку (мал. 4: *4*), два абломкі, верагодна, лістападобных наканечнікаў стрэл (мал. 4: *2, 3*).

Сярод іншых крамянёвых вырабаў выяўлены пракрутка (мал. 4: *7*), скрабок (мал. 4: *5*), разец, пяць фрагментаў неазначальных вырабаў. Прадукты першаснага расшчаплення прадстаўлены 493 адшчэпамі, васьмю пласцінамі, пяццю мікрапласцінамі, пяццю сколамі. Выяўлена таксама 289 лускавін.

Выяўлены 144 фрагменты костак млекакормячых, сярод якіх абсалютна дамінуюць перапаленыя. Тры косткі аднесены да рыб, у тым ліку фрагмент перапаленай пашчэнкі шчупака.

Крыху большую па колькасці за крамянёвыя артэфакты групу складаюць фрагменты керамікі – ўсяго 830 экзэмпляраў. 688 артэфактаў праз свае памеры неазначальныя. Астатнія прадстаўлены фрагментамі начынняў нарвенскай, усвяцкай, паўночнабеларускай культур і культуры шнуравой керамікі. Невялікая колькасць фрагментаў можа быць аднесена да керамікі позняга бронзавага–жалезнага веку.

Літаратура

1. Зайкоўскі, Э. М. Справаздача аб археалагічных даследаваннях ў Паўночнай Беларусі ў 1980 г. / Э. М. Зайкоўскі ; ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 693. – 1981.

2. Зайкоўскі, Э. М. Справаздача аб палявых даследаваннях у 1981 г. / Э. М. Зайкоўскі ; ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 771. – 1982.

3. Сербаў, І. А. (Менск). Археолёгічныя помнікі Ушацкага раёну, Полацкае акругі (З матар'ялаў, сабраных экспэдыцыяй краязнаўчага т-ва Беларускага Дзяржаўнага Ўніверсітэта ў 1928 г.) / І. А. Сербаў // Зап. аддз. гуманіт. наук. – Менск, 1930. – Кн. 11 : Працы археолёгічнай камісіі. пад агульнай рэд. археолёг. камісіі. – С. 199–212.

4. Чарняўскі, Макс. М. Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях у 1999 г. / Макс. М. Чарняўскі ; ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». – Арх. № 1815. – 2000.

Резюме

Макс. М. Чернявский

Иследования на Белорусском Поозерье в 2012 году

В 2012 г. автор проводил раскопки на поселениях Асавец-2 Бешенковичского района Витебской области и Береща-2 Лепельского района Витебской области. Также им были проведены разведки в Мядельском районе Минской области, Лепельском и Ушачском районах Витебской области, в результате которых были выявлены новые памятники каменного–железного века Зани-1 и Береща-3, -4.

Summary

Max. M. Chernyavski

Investigations in the Belarusian Lakes Region in 2012

In 2012 the author excavated the settlements Asavets-2 (Beshankovichy district of Vicebsk region) and Biareshcha-2 (Lepel district of Vitebsk region). New sites of the Stone – Iron Ages (Zani-1, Biareshcha-3, -4) were found during the explorations in Miadzel district of Minsk region, Lepel and Ushachy districts of Vitebsk region.

Паступіў 21.05.2013 г.

Навуковае выданне

МАТЭРЫЯЛЫ ПА АРХЕАЛОГІІ БЕЛАРУСІ

MATERIALS ON THE ARCHAEOLOGY OF BELARUS

Зборнік навуковых артыкулаў

Выпуск 25

Вынікі даследавання першабытных і сярэдневяковых старажытнасцей Беларусі ў 2011–2012 гадах

Results of the investigations of pre-historic and medieval antiquities of Belarus in 2011–2012

Рэдактар *Н. Т. Гаўрыленка*
Мастацкі рэдактар *В. А. Жахавец*
Тэхнічнае афармленне *В. А. Тоўстая*
Камп'ютарная вёрстка *М. Э. Малярэвіч*

Падпісана да друку 24.02.2014. Фармат $60 \times 84^{1}/_{8}$. Папера афсетная. Друк лічбавы.
Ум. друк. арк. 46,27. Ул.-выд. арк. 42,4. Тыраж 150 экз. Заказ 32.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі дом «Беларуская навука».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/18 ад 02.08.2013. Вул. Ф. Скарыны, 40, 220141, г. Мінск.